Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

Установа адукацыі
«Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт»

У. С. Філіпенка

# ГІСТОРЫЯ НАВЕЙШАГА ЧАСУ

Вучэбна-метадычны комплекс
для студэнтаў спецыяльнасці 1-21 03 01 «Гісторыя»
гісторыка-філалагічнага факультэта

У дзвюх частках

Частка 2

Наваполацк
ПДУ
2012

УДК 94(4/7)"19"(075.8)
ББК 63.3(4/8)я73
Ф53

Рэкамендавана да выдання метадычнай камісіяй
гісторыка-філалагічнага факультэта ў якасці вучэбна-метадычнага комплекса
(пратакол № 6 ад 30.06.2011)

РЭЦЭНЗЕНТЫ:

д-р гіст. навук, праф., заг. цэнтра гісторыі даіндустрыяльнага перыяду
ДНУ «Інстытут гісторыі НАН Беларусі» В. М. ЛЯЎКО;
канд. гіст. навук, дац. каф. айчыннай і ўсеагульнай гісторыі
УА «Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт» А. В. СУМКО

**Філіпенка, У. С.**
Ф53 Гісторыя навейшага часу : вучэб.-метад. комплекс для студэнтаў спецыяльнасці 1-21 03 01 «Гісторыя». У 2 ч. Ч. 2 / У. С. Філіпенка. – Наваполацк : ПДУ, 2012. – 356 с.
ISBN 978-985-531-303-9.

Змяшчае канспект лекцый па гісторыі навейшага часу перыяду ад 1945 г. да нашых дзён, тэматыку практычных заняткаў.
Прызначаны для студэнтаў спецыяльнасці 1-21 03 01 «Гісторыя» гісторыка-філалагічнага факультэта.

**ISBN 978-985-531-303-9 (Ч.2)** **УДК 94(4/7)"19" (075.8)**
**ISBN 978-985-531-301-5** **БК 63.3(4/8)я73**

© Філіпенка У. С., 2012
© УА «Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт», 2012

# ЛЕКЦЫЙНЫ КУРС

## РАЗДЗЕЛ II. ГІСТОРЫЯ НАВЕЙШАГА ЧАСУ, 1945 – 2010-я гг.

## Тэма 1. Сацыяльна-эканамічнае развіццё краін Еўропы і Паўночнай Амерыкі ў другой палове XX - пачатку XXI стст.

*Заходняя Еўропа і Паўночная Амерыка*

### Аднаўленне эканомікі пасля Другой сусветнай вайны. Асаблівасці дзяржаўна-манапалістычнага капіталізму ў розных краінах. Эканамічныя рэформы 1940-х – пачатку 1950-х гг. Нацыяналізацыя, яе характар і вынікі. Роля плана Маршала ў аднаўленні эканомікі Заходняй Еўропы

Другая сусветная вайна мела беспрэцэдэнтныя маштабы і наступствы. Дзяржавы-ўдзельніцы (звыш 60) панеслі аграмадныя чалавечыя страты – загінула каля 60 млн. чалавек. Яшчэ прыкладна столькі ж, па розных прычынах, былі вымушаны развітацца з радзімай. Вайна, якая вялася на тэрыторыі 40 дзяржаў, выклікала катастрафічныя разбурэнні жыллёвага фонду, прамысловай інфраструктуры і транспартнай сеткі. Вельмі моцна пацярпеў сельскагаспадарчы сектар. Неабходнасць вялікіх вайсковых выдаткаў і рост унутранага доўгу падчас вайны правакавалі некантраляваную грашовую эмісію, што спарадзіла небывалую інфляцыю. Агульныя матэрыяльныя страты набліжаліся да $316 млрд.

Амаль паўсюдна адбылося значнае падзенне вытворчасці. На пачатак 1946 г. выпуск прамысловай прадукцыі ў еўрапейскіх краінах складаў каля 70 % ад даваеннай, а ў Германіі і Італіі нават менш за 50 %. Шмат дзе складвалася крытычная сацыяльна-эканамічная сітуацыя.

У асаблівым становішчы апынуліся ЗША. Рост ВНП за перыяд з 1939 па 1945 гг. склаў 65 %! Нацыянальны даход за гады вайны ўзрос удвая. У 1945 г. на долю Злучаных Штатаў прыпадала 60 % прамысловай прадукцыі, 2/3 залатога запасу і 1/3 экспарту капіталістычнага свету. Гэта, а таксама эфектыўнае дзяржаўнае кіраванне, праграмы рэканверсіі для дэмабілізаваных салдат, хуткі рост прыватнага спажывання і г. д., дазволіла ЗША хутка перавесці эканоміку на мірныя рэйкі.

Паспяхова ішлі справы Канады і дзяржаў-нейтралаў – Швецыі і Швейцарыі. Гэтыя дзве малыя еўрапейскія краіны па росту ВНП за перыяд 1938 – 1948 гг. выйшлі на 2-е і 3-е месцы ў свеце (адпаведна 33 % і 25 %). Гэткім чынам, Другая сусветная вайна паглыбіла дыспрапорцыі ў эканамічным развіцці дзяржаў Заходняй Еўропы і Паўночнай Амерыкі.

У пасляваенны перыяд умяшанне дзяржавы ў эканоміку і сацыяльныя адносіны, якое ў даваенны перыяд насіла надзвычайны характар і ажыццяўлялася галоўным чынам у перыяды крызісаў і войн, стала пастаянным элементам функцыянавання капіталістычнай вытворчасці. У краінах Захаду замацавалася сацыяльна эканамічная сістэма, якая спалучала рынача эканоміку з дзяржаўным рэгуляваннем, – **дзяржаўна-манапалістычны капіталізм** (**ДМК**; у гістарыяграфіі таксама сустракаюцца альтэрнатыўныя гэтаму марксісцкаму тэрміну – дзяржаўна-карпаратыўна-канкурэнтны капіталізм і **«змешаная эканоміка»**).

Ступені і формы дзяржаўнага рэгулявання ў розных краінах былі адрозныя. У некаторых краінах Заходняй Еўропы пасля вайны правялі частковую нацыяналізацыю прамысловасці і банкаў. Найбольшы размах яна набыла ў Аўстрыі, Вялікабрытаніі і Францыі. У канчатковым выніку частковая нацыяналізацыя прывяла да пашырэння дзяржаўнага сектару і стварэння «змешанай эканомікі».

У Злучаных Штатах Амерыкі, дзе пазіцыі прыватнага прадпрымальніцтва былі больш трывалымі, чым у Еўропе, нацыяналізацыя не праводзілася, і дзяржаўная ўласнасць заставалася невялікай (дарогі, парты, аэрадромы). Дзяржаўнае рэгуляванне амерыканскай эканомікі ажыццяўлялася пераважна ўскоснымі метадамі: шляхам пераразмеркавання нацыянальнага даходу праз бюджэт, пры дапамозе дзяржаўных кантрактаў, заказаў і закупак, крэдытнай і падатковай палітыкі. Важную ролю адыгрывала паўдзяржаўная банкаўская арганізацыя – Федэральная рэзервовая сістэма.

У Заходняй Германіі (ФРГ) і Японіі, дзе былі скасаваны ўсталяваныя падчас вайны формы ваенна-бюракратычнага рэгулявання эканомікі, дзяржава кантралявала частку банкаў і ўдзельнічала ў прадпрыемствах са змешаным (дзяржаўным і прыватным) капіталам. У эканоміцы ФРГ панавала канцэпцыя «сацыяльнай рыначнай гаспадаркі», якая прадугледжвала абмежаванае ўмяшанне дзяржавы ў эканоміку і прадастаўленне сацыяльных гарантый маламаёмасным слаям насельніцтва.

Важнейшым складовым элементам палітыкі аднаўлення эканомікі ў большасці краін Заходняй Еўропы сталі грашовыя рэформы 1946 – 1948 гг. Іх галоўнымі задачамі былі: поўнае канверсаванне нацыянальнай валюты, яе частковая дэвальвацыя і аздараўленне банкаўскага сектару. Адным з найбольш паспяховых узораў пераўтварэнняў у грашова-фінансавай сферы стала грашовая рэформа Людвіга Эрхарда ў Заходняй Германіі.

Пасляваенныя рэформы прадугледжвалі далейшае пашырэнне сацыяльных гарантый насельніцтву. Лейбарысцкія пераўтварэнні ў Вялікабрытаніі, напрыклад, забяспечылі ўніверсальнае пенсійнае забеспячэнне, стварэнні адзінай сістэмы аховы здароўя, маштабныя мерапрыемствы ў га-

ліне адукацыі і жыллёвага будаўніцтва. Падобны ж характар насіла стварэнне сістэмы дзяржаўнага страхавання ў Францыі.

Яшчэ адной характэрнай рысай аднаўленчай дзейнасці ўрадаў з'яўлялася палітыка нацыяналізацыі. Гэтак на працягу 1945 – 1947 гг. была нацыяналізавана 1/5 французскай прамысловасці. Яна не закранула ўсіх асноўных галін прамысловасці, але спрыяла абмежаванню панавання манаполій і павелічэнню прытоку капіталаў у нацыянальную прамысловасць.

Магчымасць правядзення настолькі «дарагой» палітыкі тлумачылася ўдзелам заходнееўрапейскіх краін у рэалізацыі **плана Маршала** – «праграмы адраджэння Еўропы», заснаванай не толькі на чыста эканамічнай, але і ваенна-палітычнай логіцы.

План дапамогі ЗША Еўропе быў упершыню агучаны 5 чэрвеня 1947 г. ў прамове дзяржаўнага сакратара Джорджа Ма́ршала ў Гарвардзе. Юрыдычна-прававой базай для яго рэалізацыі стала прыняцце Кангрэсам «Закону аб дапамозе замежным дзяржавам». Згодна яму, ў перыяд з 1948 па 1952 гг. Злучаныя Штаты выдаткавалі $17 млрд. (прычым 2/3 гэтай сумы патрапілі Вялікабрытаніі, Францыі, Германіі і Італіі). Для ажыццяўлення плану – падтрымкі заходнееўрапейскага капіталізму і замацавання ў рэгіёне амерыканскага ўплыву – была створана Арганізацыя еўрапейскага эканамічнага супрацоўніцтва (АЕЭС; з 1961 г. – Арганізацыя эканамічнага супрацоўніцтва і развіцця – АЭСР).

У выніку ўжо ў 1949 г. у Заходняй Еўропе наступіла фінансавая стабілізацыя, у 1951 – 1952 гг. быў дасягнуты даваенны ўзровень прамысловай і сельскагаспадарчай вытворчасці, а на сярэдзіну 1950-х гг. перавышэнне даваенных паказчыкаў дасягнула ўзроўню 60 – 70 % у прамысловасці, а ў сельскай гаспадарцы – 20 – 30 %.

### Эканамічнае развіццё ў 1950-х – пачатку 1970-х гг. Змякчэнне эканамічных праблем. Рэцэсіі. Навукова-тэхнічная рэвалюцыя (НТР)

Развіццё эканомікі краін Заходняй Еўропы ў 1950-я гг. характарызавалася яе бурным ростам. Сярэднегадавыя тэмпы росту эканомікі Германіі і Італіі, напрыклад, узраслі за гэты перыяд ў чатыры разы і выклікалі г. зв. германскае і італьянскае «**эканамічныя дзівы**», Францыі – больш чым удвая, а Вялікабрытаніі – амаль удвая. Дынамічнае сацыяльна-эканамічнае развіццё рэгіёну тлумачылася не толькі рэалізацыяй плану Маршала, але таксама пашырэннем ёмістасці ўнутранага рынку, ростам міжнароднага гандлю, эрай таннай нафты з краін Персідскага заліву (у кастрычніку 1973 г. барэль каштаваў толькі $3), якаснай перабудовай прамысловасці на базе ўкаранення піянерскіх навуковых і тэхнічных распрацовак часоў вайны, мэтанакіраванай дзяржаўнай палітыкай стымулявання эканамічнага росту. У 1960-х гг., нягледзячы

на пэўнае запавольванне тэмпаў эканамічнага развіцця, краіны Заходняй Еўропы і ЗША працягвалі дастаткова ўпэўнена прагрэсіраваць.

Што датычыцца палітыкі актыўнага дзяржаўнага рэгулявання, то да пачатку 1950-х гг. пераважна ажыццяўлялася пасіўнае **антыцыклічнае рэгуляванне** (сістэма спосабаў і метадаў уздзеяння не гаспадарчую кан'юнктуру і эканамічную дзейнасць, накіраваная на змякчэнне эканамічных ваганняў). У 1950-х гг. яна скіроўвалася на забеспячэнне стабільнага эканамічнага росту праз дэфіцытнае фінансаванне. Асноўныя намаганні прыкладаліся да нарошчвання вытворчых інвестыцый ў сферы **навукова-даследчых і вопытна-канструктарскіх распрацовак (НДВКР)**, транспартнай інфраструктуры, для сродкаў сувязі, развіцця энергасістэмы і навукаёмістых галін.

У выніку нацыяналізацыі пад кантроль дзяржавы пераходзілі найменш рэнтабельныя галіны, важныя для гаспадарчага комплексу ў цэлым. Да канца 1960-х гг. дзяржаўны сектар даваў у агульным аб'ёме ВНП: 14 % – у Італіі, па 12 % – у Францыі і Вялікабрытаніі, 11 % – у Германіі.

Упэўнены эканамічны рост працягваўся да пачатку 1970-х гг. Амерыканскае лідарства станавілася ўжо не такім відавочным: у 1955 г. – сукупны ВУП шасці вядучых дзяржаў свету складаў толькі 74 % ад амерыканскага, а ў 1970 г. – ужо 114 %. Сапраўды, Заходняя Еўропа і Японія зрабілі за два дзесяцігоддзі ўражальны развіццёвы скачок.

Паспяховае выкарыстанне дзяржаўнай палітыкі, дасягненні НТР і станоўчая сусветная кан'юнктура забяспечылі змякчэнне эканамічных праблем як у маштабах сусветнай эканомікі, гэтак і ў рамках нацыянальных. На змену перыяду **«дзелавых цыклаў»**, калі развіццё ішло па «хвалістай лініі» (эканамічны рост – крызіс перавытворчасці – ...), прыйшоў **«цыкл эканамічнага росту»** (паскарэнне тэмпаў эканамічнага росту – запавольванне тэмпаў эканамічнага росту – ...). Замест «крызісаў перавытворчасці» са змяншэннем дзеючых вытворчых магутнасцяў і спадам інвестыцыйнай актыўнасці, ростам беспрацоўя і падзеннем попыту прыходзяць **«рэцэсіі»** – плаўнае зніжэнне асноўных макраэканамічных паказчыкаў пры захаванні агульнага станоўчага вектару развіцця. Гэткім чынам, ад урадаў патрабавалася правядзенне не антыкрызіснай палітыкі, а «кропкавага рэгулявання» для стымулявання паскарэння эканамічнага росту і змякчэння рэцэсіі.

Першыя рэцэсіі адбыліся ў 1948 – 1949 і 1951 – 52 гг. Яны былі звязаныя з ростам напружанасці міжнародных адносін (Берлінскі крызіс і Карэйская вайна) і бояззю суб'ектаў эканомікі наконт перарастання канфліктаў у новую сусветную вайну. Іх асаблівасцю было тое, што пераважна яны закранулі краіны Заходняй Еўропы і практычна не праявілі сябе ў ЗША. Рэцэсія 1957 – 1958 гг. была выклікана інфляцыйнай трывогай пасля Суэцкага крызісу. Яе маштабы былі куды большымі, чым дзвюх папярэдніх. Рэцэсія ахапіла і ЗША з

Японіяй. Да выхаду з яе Заходняй Еўропы спрычынілася стварэнне ЕЭС. Рэцэсія 1967 – 1968 гг. характарызавалася ўстойлівым ростам інфляцыі і ўзрастальна слабай эфектыўнасцю традыцыйных метадаў – дэфіцытнага фінансавання і падатковай палітыкі.

Важнейшым фактарам эканамічных поспехаў Заходней Еўропы і ЗША ў пасляваенныя дзесяцігоддзі стала **навукова-тэхнічная рэвалюцыя (НТР)** – радыкальная перабудова тэхналагічнай базы вытворчасці на глебе фундаментальных навуковых адкрыццяў. Яе падмуркі былі закладзены прарывам фундаментальнай навукі першай паловы XX ст. (у галіне ядзернай фізікі і квантавай механікі, дасягненнямі кібернетыкі, мікрабіялогіі, біяхіміі і г. д.) і высокім тэхнічным узроўнем развіцця вытворчасці, здольным увасобіць гэтыя дасягненні ў жыццё. Другая сусветная вайна з актыўнейшай роляй дзяржавы ў фінансаванні і ўкараненні ў вытворчасць НДВКР паслужыла каталізатарам хуткага пераходу да НТР.

У пачатку першай хвалі навукова-тэхнічнай рэвалюцыі (сярэдзіна 1940-х – пачатак 1950-х гг.) адбыўся якасны зрух у сферы эканамічнай інфраструктуры. Узніклі новыя навукаёмістыя, праца- і энергазахавальныя галіны эканомікі (авіякасмічная, радыётэлевізійная, робататэхнічная і г. д.). Тады ж складваецца і набывае велізарнае эканамічнае значэнне ваенна-прамысловы комплекс.

Дасягненні НТР моцна паўплывалі на сельскую гаспадарку. У галіне пачынаецца г. зв. «другая аграрная рэвалюцыя» або **«зялёная рэвалюцыя»**. Адбываецца актыўнае вывядзенне больш прадуктыўных і ўстойлівых да складаных прыродна-кліматычных умоў гатункаў раслін, лепшых парод хатняй жывёлы, выкарыстанне новых відаў угнаенняў, пестыцыдаў, гербіцыдаў і г. д. Таму, напрыклад, у перыяд з 1950 па 1985 гг. тэмпы росту аб'ёмаў вытворчасці збожжа сталі апярэджваць тэмпы росту колькасці насельніцтва планеты. Асабліва вялікае значэнне вынікі «зялёнай рэвалюцыі» мелі для краін, якія развіваліся.

**Узмацненне нераўнамернасці эканамічнага развіцця ў пачатку 1970-х гг. Структурныя крызісы 1970-х – пачатку 1980-х гг. Неакансерватызм, яго праявы ў краінах Заходняй Еўропы. Эканамічны ўздым у другой палове 1980-х гг. Вынікі неакансерватыўнай рэвалюцыі**

Яшчэ з 1971 г. ў эканоміцы краін Захаду сталі праяўляцца элементы фінансавага крызісу. Пасля кастрычніка 1973 г. наступіў энергетычны крызіс.

Восенню 1973 г. адбылося чарговае абвастрэнне араба-ізраільскага канфлікту і на Блізкім Усходзе ўспыхнула новая вайна – «Ём Кіпур» («Вайна суднага дня»). Традыцыйная падтрымка краінамі Заходняй Еўропы (найперш Вялікабрытаніяй і Нідэрландамі) Ізраілю спарадзіла арганізаваную акцыю **Арганізацыі краін экспарцёраў нафты (ОПЕК)**, дзе важ-

нае месца займалі дзяржавы мусульманскага Ўсходу. Было праведзена павышэнне цэн на нафту ўдвая, потым яшчэ ўдвая. Кошт нафты за барэль узрос з $3 да $11,65. Нягледзячы на ўрэгуляванне палітычных аспектаў праблемы (Кэмп-Дэвідскія пагадненні 1979 г.), у 1982 г. нафта на сусветным рынку каштавала ўжо $34 за бараль.

**«Нафтавы шок»** (энергетычны крызіс) у 1974 – 1975 гг. выклікаў сапраўдны эканамічны крызіс, а не рэцэсію, як раней. Аб'ём прамысловай вытворчасці ў свеце знізіўся на 5 %, а міжнароднага таваразвароту – на 4 %. Паколькі многія галіны (машынабудаванне, хімічная і сталеліцейная галіны, металургія і г. д.) засноўваліся на энергастратных тэхналогіях, шматразовы рост цэн на паліва меў катастрафічныя наступствы. Эканамічны крызіс прынёс фінансавыя страты, падзенне вытворчасці, скарачэнне інвестыцый і цэлы комплекс іншых праблем.

Падзенне вытворчасці змянілася крызісам перавытворчасці, што здарылася ўпершыню за ўвесь пасляваенны час. Рост беспрацоўя вёў да далейшага зніжэння плацежаздольнага попыту. Асаблівасцю гэтага крызісу стала тое, што ў адрозненне ад Вялікай дэпрэсіі, дзе найбольш пацярпелі «старыя галіны», зараз асноўны ўдар прыпадае на самыя перадавыя навука- і капіталаёмістыя галіны. Адсюль – агульная доўгачасовая стагнацыя ўсёй індустрыяльнай сістэмы.

Нягледзячы на пэўны ўздым 1976 – 1979 гг. (сярэдні рост эканомікі склаў 2,4 %), карэнных змен практычна не здарылася. Па-ранейшаму высокімі заставаліся інфляцыя і беспрацоўе, бюджэтны дэфіцыт. Ісламская рэвалюцыя ў Іране і пачатак ірана-іракскай вайны, абвастрэнне «халоднай вайны» пасля ўвядзення савецкіх войск у Афганістан спарадзілі новы віток крызісу ў 1980 – 1981 гг. Гэта таксама была не рэцэсія: зніжэнне вытворчасці складала 7 – 8 %. У адрозненне ад папярэдняга крызісу, цяпер больш пацярпелі краіны, якія развіваліся. Асноўнымі праявамі крызісу было змяншэнне прадукцыйнасці працы, рост выдаткаў вытворчасці і, галоўнае, зніжэнне нормы прыбытку (пэўны час не праяўлялася з-за ўмяшання дзяржавы ў эканоміку). Кампенсаванне зніжэння эфектыўнасці вытворчасці паскораным ростам яго аб'ёму і выклікала гэткія эканамічныя цяжкасці.

Структурныя эканамічныя крызісы сусветнай эканомікі 1970-х – пачатку 1980-х гг. былі таксама абумоўлены зніжэннем эфектыўнасці «змешанай эканомікі» заснаванай на трыядзе «масавая вытворчасць – манапалістычная канкурэнцыя – кейнсіянскае рэгуляванне». Калі ў час Вялікай дэпрэсіі дзяржаўнае ўмяшанне стала лекам, то зараз пераўтварылася ў адзін з асноўных негатыўных фактараў. Напрыклад, яно спарадзіла **стагфляцыю** – некласічную эканамічную з'яву, калі стагнацыя вытворчасці спалучалася з высокімі тэмпамі інфляцыі.

Крызіс «змешанай эканомікі» патрабаваў адмовы ад кейнсіянскіх рэцэптаў антыкрызіснага рэгулявання. Іх выкарыстанне прэзідэнтам-сацыялістам Ф. Мітэранам ў Францыі напачатку 1980-х гг. паказала поўную іх неэфектыўнасць. Рухнула таксама і ўся стратная эканамічная мадэль, заснаваная на пастаянным нарошчванні рэсурсавай базы. Гэта быў канец класічнай мадэрнізацыі «па-капіталістычнаму», што паслядоўна прайшла стадыі мануфактурнага капіталізму, фабрычна-завадскога акцыянернага капіталізму, манапалістычнага капіталізму. Структурныя крызісы выпукла выявілі слабасці «дзяржавы дабрабыту». Абвастрыліся многія міжнароднаэканамічныя праблемы. Распалася міжнародная валютна-фінансавая сістэма (Брэтан-Вудская), заснаваная на «залатым стандарце».

Структурныя крызісы сусветнай эканомікі 1970-х – пачатку 1980-х гг. выявілі банкруцтва панаваўшых эканамічных ідэй. Пераадоленне крызіснай сітуацыі было звязана з абнаўленнем тэарэтычнай базы эканамічнай палітыкі і актыўнага выкарыстання манетарысцкай тэорыі (манетарызму) і тэорыі прапановы.

**Манетарызм** быў свайго роду грашовай тэорыяй, спробай макраэканамічнага аналізу на аснове праблем грашовага абарачэння. У аснове манетарысцкай тэорыі ляжалі пастулаты пра безумоўную эфектыўнасць рыначнай мадэлі, свабоднай канкурэнцыі і базавым характары прынцыпу рацыянальных паводзін чалавека ва ўмовах рыначнай эканомікі, палажэнне пра вядучую ролю грашовага фактара ў развіцці сучаснай эканомікі. Стратнае дзяржаўнае рэгуляванне (бюджэтнае пераразмеркаванне даходаў, падаўленне інфляцыі адміністрацыйнымі метадамі, антыцыклічнае рэгуляванне і г. д.), уласцівае кейнсіянскай мадэлі, і своекарыслівая дзейнасць прафсаюзаў, на думку манетарыстаў, наадварот разбуралі і дэфарміравалі рыначную структуру. На думку манетарыстаў, нармальнае становішча эканомікі залежыць ад стабільнасці, прадказальнасці, пераемнасці працэсаў, якія адбываюцца ў грашовай сферы. Забеспячэнне гэтай сітуацыі – асноўная задача доўгатэрміновага дзяржаўнага рэгулявання. Адно з цэнтральных месцаў у тэорыі заняла ідэя «натуральнага беспрацоўя», якое з’яўляецца рэальным адлюстраваннем сапраўднага стану фактараў узнаўлення.

**Тэорыя прапановы**, у сваю чаргу, забяспечвала комплексную праграму макраэканамічнай палітыкі ва ўмовах крызісу кейнсіянскай сістэмы. Дзяржаўнае рэгуляванне лічылася непазбежным злом, якое дэфармуе натуральныя механізмы рыначнай эканомікі. Галоўная задача дзяржаўнага рэгулявання заключалася ў пераносе акцэнтаў са стымулявання попыту на дзяржаўнае доўгатэрміновае рэгуляванне фактараў сукупнай прапановы (фактараў вытворчасці).

Найбольш эфектыўнымі рэцэптамі прыхільнікі тэорыі прапановы лічылі: скарачэнне падаткаў для стымулявання прыватных інвестыцый (адмаўленне ад прагрэсіўнага падаткаабкладання, зніжэнне падатковых ставак на даходы, капі-

тал, дывідэнды, заробкі); ліквідацыя бюджэтнага дэфіцыту (з пэўнымі адрозненнямі ў дэталях ад манетарыстаў); скарачэнне сацыяльных праграм (яны стрымліваюць працоўную актыўнасць насельніцтва і толькі павялічваюць расходную частку бюджэту); шырокая прыватызацыя дзяржаўнага сектара для павелічэння эфектыўнасці вытворчасці і атрымання дадатковых бюджэтных сродкаў.

Манетарызм і тэорыя прапановы леглі ў навукова-тэарэтычны падмурак **неакансерватыўнай эканамічнай канцэпцыі**. Класічным прыкладам неакансерватыўнай палітыкі сталі рэформы кабінету міністраў Маргарэт Тэтчар у Вялікабрытаніі («тэтчарызм») і рэспубліканскай адміністрацыі Рональда Рэйгана ў ЗША («рэйганоміка»). Распачатая гэтымі выдатнымі лідарамі **«неакансерватыўная рэвалюцыя»** хутка знайшла прыхільнікаў у іншых краінах Захаду – ФРГ, Францыі, Італіі, Іспаніі.

Цэнтральнае месца ў праграмах неакансерватыўных сіл занялі ўстаноўкі на скарачэнне ролі дзяржавы ў эканоміцы, дэнацыяналізацыю, прыватызацыю, адраджэнне прыватнай ініцыятывы, канкурэнцыі, рыначных прынцыпаў у эканамічнай і сацыяльнай сферах. Іх рэалізацыя ў спалучэнні з традыцыйнымі ліберальнымі і кансерватыўнымі каштоўнасцямі (гл. тэму «Палітычнае развіццё краін Еўропы і Паўночнай Амерыкі пасля Другой сусветнай вайны») дазволілі неакансерватарам забяспечыць вывад Захаду з паласы структурных крызісаў і здзейсніць новы сацыяльна-эканамічны рывок. Неакансерватыўная рэвалюцыя спрыяла мабілізацыі стваральнага патэнцыялу рыначнай сістэмы, інтэнсіфікацыі працэсу ўзнаўлення. Праз перагляд прынцыпаў дзяржаўнага рэгулявання эканомікі знізіліся тэмпы інфляцыі, актывізаваўся інвестыцыйны рынак і стабілізаваўся ўзровень занятасці.

Тым не менш, неакансерватыўныя рэформы выклікалі неадназначную рэакцыю грамадства і, выканаўшы сваю «выратавальную» місію, напачатку 1990-х гг. сталі саступаць месца новаму эканамічнаму курсу, параўнальна менш рыначнаму і больш сацыяльна скіраванаму.

*Цэнтральная і Паўднёва-ўсходняя Еўропа*

### Аднаўленне разбуранай гаспадаркі. Сацыяльна-эканамічныя рэформы 1940-х гг. Пераход да будаўніцтва савецкай мадэлі сацыялізму. Пачатак усходнееўрапейскай інтэграцыі

Аднаўленне ў Цэнтральнай і Паўднёва-ўсходняй (Усходняй) Еўропе набыло іншы характар і скіраванасць. Значныя матэрыяльныя страты ў ходзе Другой сусветнай вайны разам з традыцыйнай адсталасцю рэгіёну выклікалі неабходнасць фарсіраванай мадэрнізацыі. Надзвычай складанай заставалася палітычная абстаноўка ў гэтых краінах.

Недахоп уласных развіццёвых рэсурсаў, асабліва фінансавай базы, вымагў пошуку «спонсараў» эканамічнага абнаўлення і прарыву. З пачаткам

«халоднай вайны» выбар паміж капіталістычным і сацыялістычным шляхам развіцця не без «падказак» з боку СССР быў прадвызначаны. Савецкі Саюз і сам адмовіўся ад амерыканскай дапамогі па лініі плану Маршала, і забараніў удзел у яго рэалізацыі ўсім ўсходнееўрапейскім краінам, кампенсуючы іх страты сваімі ільготнымі пастаўкамі прадуктаў харчавання і сыравіны.

Пачынаецца пабудова «асноў сацыялізму». Прычым у чэрвені 1948 г. на пасяджэнні Камінфарма (Інфармацыйнага бюро камуністычных і рабочых партый – міжнароднай камуністычнай арганізацыі – пераемніцы Камінтэрна, што існавала з 1947 па 1956 гг.) была прызнаная ўніверсальнасць савецкай мадэлі сацыялізму. Асноўныя задачы, якія вырашаліся новымі ўсходнееўрапейскімі рэжымамі, заключаліся ў сацыялізацыі ўсёй грамадскай структуры, нацыяналізацыі (да пачатку 1950-х гг. доля дзяржаўнай уласнасці ў рэгіёне перавышала 90 %), індустрыялізацыі, калектывізацыі, адмаўленні ад рынку і стварэнні каманднa-адміністрацыйнай сістэмы кіравання эканомікай.

Ужо на сярэдзіну 1950-х гг. краіны Цэнтральнай і Паўднёвай Еўропы дасягнулі ўражальных поспехаў у «даганяючым развіцці». Гэтак меў месца небывалы рост эканамічнага патэнцыялу, была праведзена мадэрнізацыя сацыяльнай структуры (напрыклад, адбыўся рост занятасці ў прамысловай сферы, хуткімі тэмпамі ішла урбанізацыя), быў забяспечаны пераход да індустрыяльна-аграрнага тыпу грамадства (і ў асобных найбольш развітых краінах, і ў рэгіёне ў цэлым).

Тым не менш, з’явілася нямала новых праблем: штучнасць эканамічнага механізму (не ўлічвалася рэгіянальная і нацыянальная спецыфіка), аграмадныя галіновыя дыспрапорцыі і перакосы, развіццёвая экстэнсіўнасць (разлік выключна на выкарыстанне большага аб’ёму працоўнай сілы, энергіі, сыравіны і г. д.), малая прадукцыйнасць працы, бюракратызацыя і ад гэтага неразваротлівасць эканамічнага кіравання і, самае галоўнае, нізкая сацыяльная аддача сталінскай эканамічнай мадэлі (яна праяўлялася ў паранейшаму скрайне сціплых жыццёвых стандартах).

Найбольш негатыўна гэтыя цяжкасці адбіліся на грамадствах, якія да пачатку сацыялістычных эксперыментаў мелі адносна высокі ўзровень сацыяльна-эканамічнага развіцця. Параўнанні з даваеннымі часамі былі не на карысць пасляваенных рэалій. Як вынік, у 1953 г. – у ГДР, а ў 1956 г. – у Польшчы і, асабліва, Венгрыі, сталінская мадэль сацыялізму была пастаўлена пад пытанне (у Чэхаславакіі сістэмны крызіс прыйшоў пазней – у 1968 г.). Аднак для значнай часткі грамадзян найменш развітых краін рэгіёну – Албаніі, Балгарыі і Румыніі – сацыялістычныя пераўтварэнні не надта моцна дысаніравалі з іх чаканнямі, а таму ў гэтых краінах абышлося без асаблівых узрушэнняў.

У 1949 г. для садзейнічання арганізацыі планамернага эканамічнага і культурнага супрацоўніцтва дзяржаў, што знаходзіліся пад уплывам СССР, быў створаны **Савет Эканамічнай Узаемадапамогі (СЭУ)**. У практычным

сэнсе арганізацыя павінна была забяспечыць пераарыентацыю знешняга гандлю з Германіі (галоўнага гандлёвага партнёру краін рэгіёну ў перадваенны і ваенны час) на СССР і стварыць канал савецкай эканамічнай дапамогі братэрскім краінам. У арганізацыю ўвайшлі Албанія (толькі да канца 1961 г.), Балгарыя, Венгрыя, ГДР (з 1950 г.), Румынія, СССР, Чэхаславакія. На момант фарміравання гэта было скрайне штучнае ўтварэнне: да 90 % тавараздвароту краін-удзельніц рэалізоўвалася па-за межамі новаўтворанага рэгіёну, а доля гандлю з СССР ледзьве перавышала 1 % (з нееўрапейскіх краін у СЭУ пазней увайшлі Манголія (1962), Куба (1972) і В’етнам (1978)).

### Сацыяльна-эканамічныя пераўтварэнні другой паловы 1950-х – 1960-х гг. Прычыны тармажэння і адыходу ад рэформ

У другой палове 1950-х – напачатку 1960 гг. у найбольш эканамічна развітых краінах Цэнтральнай і Паўднёва-ўсходняй Еўропы скіраванасць рэформ была некалькі скарэкціравана. Напрыклад, было прызнана існаванне розных эканамічных укладаў, абмежаваны дробязны дзяржаўны кантроль пры павелічэнні інвестыцый і ўдасканаленні тэхнічнай і тэхналагічнай базы. Найбольшых поспехаў у пошуках новай эканамічнай мадэлі, у якой бы ўлічваліся законы рынку, дасягнулі Венгрыя і Чэхаславакія. Далейшае паглыбленне сацыяльна-эканамічных пераўтварэнняў патрабавала пэўных перамен у грамадска-палітычнай сферы. Прынцыповая немагчымасць гэтага вяла да тармажэння палітыкі рэформ і паступовага адыходу ад яе. У самых адсталых краінах рэгіёну, наадварот, зрухаў практычна не адбылося, і сталінскія метады, практыка і скіраванасць эканамічнай палітыкі працягвалі дамінаваць.

Яшчэ ў 1960-я гг. былі збольшага вычарпаныя асноўныя крыніцы экстэнсіўнага эканамічнага росту, і выявілася нямала новых цяжкасцяў. Галоўная – падзенне тэмпаў росту прамысловасці. У канцы 1960-х гг. узнікла яўная неабходнасць правядзення новых народнагаспадарчых рэформ. У Венгрыі, Чэхаславакіі і Югаславіі іх праводзілі з выкарыстаннем рыначных механізмаў стымулявання вытворчасці. Рэформы не закраналі формы ўласнасці. Санкцыянаваны рыначны сектар не меў дастатковай прасторы для развіцця, а адмаўленне ад дзяржаўнай манаполіі ў сацыяльна-эканамічнай сферы азначала б поўны крах самога сацыялізму. Адсюль ізноў згортванне рэформ напачатку 1970-х гг. У ГДР і Польшчы рэформы ажыццяўляліся праз мадэрнізацыю існаваўшых адміністрацыйна-камандных механізмаў. Румынія з Балгарыяй, тым больш Албанія, пра гэта практычна не клапаціліся. Але яшчэ і ў першай палове 1970-х гг. у краінах рэгіёну па-ранейшаму захоўваліся ўстойлівыя тэмпы росту прамысловай вытворчасці (6 – 8 % у год). Працягвалі расці важнейшыя колькасныя паказчыкі эканамічнага развіцця – выпрацоўка электрычнасці, выплаўка сталі, выпуск прадукцыі машынабудавання і г. д.

Тым не менш, пачатак новага этапу навукова-тэхнічнай рэвалюцыі паставіў перад сацыялістычнымі краінамі новыя праблемы. Патрабавалася рашучае пераўтварэнне эканомікі на базе навейшай тэхнікі і тэхналогіі, ломка састарэлай галіновай структуры народнай гаспадаркі, змена метадаў кіравання эканомікай. Адсутнасць адэкватнага рэагавання на выклікі новай эпохі не дазволіла сацыялістычным краінам уключыцца ў новы этап НТР, а гэта непазбежна вяло да прыкметнага скарачэння ўдзельнай вагі сацыялістычных краін у сусветнай вытворчасці і гандлі. Цэнтральная і Паўднёва-ўсходняя Еўропа следам за Савецкім Саюзам пагружаецца ў эпоху «застою».

### Спробы правядзення частковых рэформ у другой палове 1980-х гг. ды іх няўдача

Прыкметнае запавольванне тэмпаў эканамічнага росту ў Цэнтральнай і Паўднёва-ўсходняй Еўропе асабліва адчувалася ў сферы вытворчасці тавараў шырокага спажывання. Па сваёй якасці і асартыменце большасць тавараў гэтай катэгорыі (легкавыя аўтамашыны, тэлевізары, радыёпрыёмнікі, бытавая тэхніка, тканіны, абутак, мэбля і г. д.) не вытрымлівалі канкурэнцыі з аналагічнай прадукцыяй краін Захаду і Японіі. У 1980-х гг. адставанне толькі павялічвалася. У Румыніі нават стала востра адчувацца харчовая праблема. Усе гэта надзвычай негатыўна адбівалася на жыццёвым узроўні ўсходнееўрапейцаў і, галоўнае, моцна ўплывала на крытычнасць ацэнкі паспяховасці ўсёй існаваўшай сістэмы. Спробы падтрымання жыццёвых стандартаў насельніцтва з разлікам на знешнія пазыкі ад Захаду давалі толькі часовую палёгку і вялі краіны да фінансавага тупіку і крызісу існаваўшай сістэмы ў цэлым. Ужо напачатку 1980-х гг. гэтая тэндэнцыя праявіла сябе ў поўнай меры ў Польшчы.

Апошняя хваля рэформ, што ладзіліся пад уплывам савецкай перабудовы, прыпадае ўжо на другую палову 1980-х гг. Першапачаткова іх асноўнай мэтай з’яўлялася паскарэнне сацыяльна-эканамічнага развіцця: выкарыстанне рыначных механізмаў, дэцэнтралізацыя дзяржаўнага кіравання эканомікай, самафінансаванне і самаакупнасць. Да гэтага часу на Захадзе ўжо паспелі перайсці да новай развіццёвай мадэлі, у якой стаўка рабілася на гнуткае інвестыцыйнае развіццё тэхніка-тэхналагічнай базы вытворчасці, эфектыўнае спалучэнне буйнога і сярэдняга бізнесу, пераход да рэсурса- і энергазберагальных тэхналогій, вызначаючы контуры новага постіндустрыяльнага (інфармацыйнага) грамадства. «Даганяючая мадэль» індустрыяльнай эпохі не проста не працавала, а вяла ў нікуды.

Аб’ектыўныя складанасці працэсу рэфарміравання запатрабавалі такія ж касметычныя рэформы ў палітычнай сферы: дэмакратызацыя, плюралізм, галоснасць. Падзенне эканамічнай эфектыўнасці сістэмы ў спалучэнні з магут-

нейшай палітызацыяй грамадства далі самы разбуральны вынік. Грамадзяне нарэшце адчулі сябе народам і вынеслі свой вердыкт: усходнееўрапейскі «рэальны сацыялізм» быў адпраўлены на звалку гісторыі.

*Краіны Еўропы і Паўночнай Амерыкі ў 1990-я – 2000-я гг.*

**Запавольванне тэмпаў эканамічнага развіцця ў пачатку 1990-х гг. Галоўныя дасягненні і праблемы развіцця ў сярэдзіне 1990-х – 2000-я гг. Значэнне глабалізацыі. Змены сацыяльнай структуры сучаснага заходняга грамадства**

У 1990 – 1991 гг. сусветная эканоміка зведала новую рэцэсію (гадавы эканамічны рост складаў толькі 1,5 – 2 %). І гэтым разам пэўную негатыўную ролю адыграў міжнароднапалітычны фактар. Іракскі напад на Кувейт і рашучая ўзброеная акцыя супраць агрэсара кааліцыі дзяржаў на чале з ЗША (аперацыя «Бура ў пустыні») выклікалі рэзкі скачок коштаў на нафту. Заканчэнне рэцэсіі, стомленасць насельніцтва ад неакансерватыўнай палітыкі, выхад на авансцэну новай плеяды лідараў (Біл Клінтан, Леанэль Жаспэн, Тоні Блэр, Герхард Шродэр, Рамана Продзі), а таксама распад біпалярнага свету і адмаўленне ад ідэалагічнай канфрантацыі паспрыялі абнаўленню тэарэтычнай базы і праграмных лозунгаў заходняй палітычнай эліты.

Адмова ад неакансерватыўнай спадчыны не азначала поўную рэанімацыю ранейшых прынцыпаў і практыкі «сацыяльнай дзяржавы» і змешанай эканомікі. У новую постіндустрыяльную эпоху эканамічная палітыка магла засноўвацца толькі на інавацыйных пачатках. Гэтак Злучаныя Штаты ў час дзейнасці дэмакратычнай адміністрацыі Б. Клінтана надавалі прыярытэтнае значэнне фінансаванню вырашэння сацыяльных праблем і развіцця высокіх тэхналогій.

У 1997 г. здарыўся біржавы крах у Паўднёва-ўсходняй Азіі. У наступным годзе ён выклікаў сусветны фінансавы крызіс. Асабліва пацярпелі важныя для сусветнага рынку, але недастаткова моцныя эканомікі. Расія, напрыклад, была вымушана абвясціць дэфолт, г. зн. прызнала немагчымасць разліку за пазыкі перад крэдыторамі.

Тэрарыстычная атака супраць ЗША 11 верасня 2001 г. аказала на сусветную эканоміку скрайне негатыўны ўплыў. Жах перад новымі падобнымі выпадамі з боку ісламскіх фундаменталістаў моцна падарваў гэткія важныя галіны, як турызм, авіяперавозкі, самалётабудаванне. Тэмпы эканамічнага развіцця стрымліваў пастаянны рост коштаў на нафту.

Становішча сусветнай эканомікі заставалася нестабільным. Першыя сур’ёзныя сімптомы яе нездароўя праявіліся ў 2006 г., калі ў ЗША сталі падаць продажы дамоў. У 2007 г. у гэтай краіне пачаўся іпатэчны крызіс: частка заёмшчыкаў сутыкнулася з праблемай аплаты крэдытаў, атрыманых пад заклад нерухомай маёмасці, а банкаўскія ўстановы неслі значныя страты і былі

вымушаныя згортваць крэдытаванне. Паступова крызіс з іпатэчнага стаў перарастаць у фінансавы і напачатку 2008 г. набыў сусветныя маштабы. Паўсюдна зніжаўся попыт і кошты на сыравіну, расло беспрацоўе.

Важнейшымі прычынамі сусветнага фінансавага (эканамічнага) крызісу 2008 – 2009 гг. сталі агульная цыклічнасць эканамічнага развіцця, перагрэў крэдытнага (з-за залішняга, у т. л. незабяспечанага, крэдытавання) і фондавага (з-за рызыкоўных укладанняў у каштоўныя паперы) рынкаў у сітуацыі чаканняў далейшага працягу эканамічнага росту, а таксама высокія кошты на сыравіну, асабліва нафту і прадукты харчавання.

Крызіс закрануў практычна ўсе сферы сусветнай эканомікі. У ЗША збанкрутавалі пяць вядучых інвестыцыйных банкаў. Амерыканскаму ўраду прыйшлося пайсці на беспрэцэдэнтныя захады па нармалізацыі сітуацыі на банкаўскім рынку. Вельмі паказальнай аказалася сітуацыя ў аўтамабільнай прамысловасці. Іпатэчны крызіс моцна ўдарыў па банках, якія практычна спынілі выдачу крэдытаў на набыццё аўтамабіляў. Скарачэнне аб’ёмаў продажаў (некаторыя еўрапейскія дылеры аўтамабільных гігантаў былі нават вымушаныя прадаваць 2 машыны па кошце адной!) непазбежна выклікала спад вытворчасці не толькі аўтапрамысловасці, але таксама цэлага шэрагу сумежных галін прамысловасці.

Вельмі адмоўна на сусветную эканоміку працягвала ўплываць аграмаднае падаражанне нафты. Напачатку 2008 г. барэль ужо каштаваў $100, а праз паўгода падабраўся да гістарычнага максімуму амаль у $150! Далейшы абвал кошту да $51 напрыканцы таго ж году не толькі не даў палёгкі, а нават выклікаў дадатковыя цяжкасці.

Устойлівы эканамічны рост, бум спажывання, які ахапіў свет з пачатку 2000-х гг., імклівае павелічэнне насельніцтва краін, якія развіваюцца, у тым ліку самых бедных, некаторыя негатыўныя прыродна-кліматычныя фактары паўплывалі на значны рост коштаў на прадукты харчавання. Пачынаючы з 2006 г. назіраецца іх бесперапынны рост. Эканамісты нават загаварылі пра гэткую з’яву як **агфляцыя** (аграрная інфляцыя) – працэс апераджальнага павелічэння цэн на прадукты харчавання і тэхнічныя культуры сельскагаспадарчага паходжання ў параўнанні з агульным ростам коштаў або ростам коштаў у несельскагаспадарчай сферы. Напрыклад, у 2008 г., калі рэальныя (з улікам інфляцыі) кошты на харчы дасягнулі максімуму за апошнія трыццаць гадоў, рыс і збожжа толькі за перыяд са студзеня па красавік узляцелі адпаведна на 54 % і 84 %! Эксперты ў адзін голас сцвярджаюць, што задзел «зялёнай рэвалюцыі» вычарпаны, чалавецтву неабходна шукаць новыя рэсурсы і механізмы падтрымання харчовай бяспекі і барацьбы з голадам.

Ужо на зыходзе XX ст. скончылася фарміраванне матэрыяльна-тэхнічнай базы сучаснага грамадства, якое вызначаецца камп’ютарызацыяй, комплекснай аўтаматызацыяй, інфармацыйнай сеткавай тэхнікай, паскораным

ростам транснацыянальнага капіталу, глабалізацыяй эканомікі. Сарцавінай якасных змен сталі інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі (мікраэлектроніка, інфармацыя, тэлекамунікацыі).

У апошнія дзесяцігоддзі XX ст. прыкметна знізілася вызначальная роля вытворчасці індустрыяльнага тыпу. Таму новае грамадства называюць **постіндустрыяльным**. У развітых краінах адбываўся зрух ад матэрыяльнай вытворчасці да дзейнасці па вытворчасці інфармацыі. Дамінуючае становішча ў эканоміцы заняў сектар паслуг, найперш інфармацыйных. Пачала складвацца **«інфармацыйная эканоміка»**. У постіндустрыяльным грамадстве трансфармуюцца крыніцы эканамічнага росту. У сучасных умовах рост прадукцыйнасці працы найбольш забяспечвае інфармацыя ў выглядзе новых ведаў. Інфармацыя набывае вырашальнае значэнне ў структуры вартасці тавару і, ў сваю чаргу, становіцца адным з галоўных тавараў у глабальнай эканоміцы. Змяняецца структура працэсу вытворчасці ў цэлым. Абазначыўся пераход ад стандартнай масавай прадукцыі да гнуткай індывідуалізаванай дробнасерыйнай прадукцыі.

Адным з важнейшых фактараў развіцця на сучасным этапе з'яўляецца глабалізацыя – працэс сусветнай эканамічнай, палітычнай і культурнай інтэграцыі і ўніфікацыі. Важнейшыя яе наступствы ў сацыяльна-эканамічнай сферы – гэта паглыбленне сусветнага падзелу працы, свабодны гандаль, міграцыя ў маштабах усёй планеты капіталу, чалавечых і вытворчых рэсурсаў, стандартызацыя заканадаўства, эканамічных і тэхналагічных працэсаў, сціранне нацыянальнай прыналежнасці прадукцыі, узмацненне ролі транснацыянальных карпарацый.

Уражальныя эканамічныя поспехі, дасягнутыя пасля Другой сусветнай вайны, не маглі не выклікаць глыбокую трансфармацыю сацыяльнай структуры ў краінах Захаду. Пад уплывам навукова-тэхнічнага прагрэсу адбываецца скарачэнне долі ў агульнай колькасці насельніцтва тых, хто быў непасрэдна заняты ў традыцыйных сферах вытворчасці – прамысловасці і сельскай гаспадарцы. Гэты працэс асабліва паскараецца падчас другой хвалі НТР (з другой паловы 1970-х гг.), калі пачынаецца пераход ад індустрыяльнага да постіндустрыяльнага (інфармацыйнага) грамадства, пераважная вытворчасць тавараў саступіла першынство вытворчасці паслуг.

Акрамя таго, меў месца небывалы рост адукацыйнага і кваліфікацыйнага ўзроўню працоўнай сілы, беспрэцэдэнтнае ўзрастанне месца і ролі працаўнікоў разумовай працы, спецыялістаў з розных сфер дзейнасці, экспертаў, навукова-тэхнічных кадраў, інжынернага персаналу. Укараненне навейшых навукаёмістых, праца- і энергазберагальных галін спрыяла з'яўленню новых прафесій (камп'ютаршчыкаў, праграмістаў, біятэхнолагаў і г. д.). Неабходнасць вырашэння новых складаных праблем сацыяльна-эканамічнага развіцця дыктавала пашырэнне кола працаўнікоў разумовай працы ў інстытуцыях дзяржаўнай улады і кіравання. Падрыхтоўка спецыялістаў падобнага ўзроўню па-

трабавала далейшага росту колькасці установу вышэйшай адукацыі і перакваліфікацыі працоўных кадраў. Працаўнікі разумовай працы – **«новага сярэдняга классу»** паступова пачынаюць складаць значны пласт насельніцтва («стары» сярэдні клас у свой час быў пераважна рэпрэзентаваны фермерамі, дробнымі прадпрымальнікамі і акцыянерамі).

Няўхільная тэндэнцыя да ўзрастання колькаснай, эканамічнай і грамадскай значнасці гэтых сацыяльных слаёў абумовіла змену сацыяльнай структуры ў краінах Захаду. Замест класічнай структуры капіталістычнага грамадства з класамі буржуазіі і пралетарыяту складваецца моцна дыферэнцыраваная, шмат'ярусная сацыяльная структура. Большую частку яе ўзроўняў занялі акурат прадстаўнікі «новага сярэдняга классу». Былая пірамідальная сацыяльная структура грамадства, дзе нешматлікая буржуазна-арыстакратычная эліта супрацьстаяла аграмаднай пралетарскай масе, саступіла месца ромбападобнай мадэлі з яўнай перавагай сярэдніх слаёў і параўнальна малалікімі вышэйшымі і ніжэйшымі катэгорыямі насельніцтва. Больш акрэсленымі сталі межы паміж аднатыпнымі сацыяльнымі групамі – стратамі.

Важна адзначыць, што, у адрозненне ад традыцыйных класаў індустрыяльнага грамадства, сучасныя страты ўтвараюцца не толькі па месцу і ролі ў грамадскай вытворчасці, але і па ўзроўні даходаў, згодна з меркаваннямі сацыяльнага прэстыжу і г. д. Характэрнай асаблівасцю шматмернай структуры сучаснага заходняга грамадства стала высокая ступень сацыяльнай мабільнасці і адносная лёгкасць перасоўвання ўверх-уніз па прыступках сацыяльнай іерархіі.

## Тэма 2. Палітычнае развіццё краін Еўропы і Паўночнай Амерыкі ў другой палове XX - пачатку XXI стст.

*Еўропа і Паўночная Амерыка*

### Уплыў вынікаў Другой сусветнай вайны на палітычнае жыццё краін Заходняй Еўропы. Пасляваенны дэмакратычны ўздым, дэмакратызацыя дзяржаўнага ладу і палітычнага жыцця. Рост уплыву левых партый і рухаў, крызіс традыцыйных кансерватыўных партый

Другая сусветная вайна ўнесла істотныя карэктывы ў палітычнае развіццё Заходняй Еўропы. Пацярпелі паражэнне ў вайне і поўны гістарычны крах антыдэмакратычныя таталітарныя і аўтарытарныя рэжымы. Былі дыскрэдытаваныя правыя палітычныя партыі, якія заплямілі сябе супрацоўніцтвам з нацызмам і фашызмам і не бралі ўдзелу ў руху Супраціўлення. Наадварот, заваявалі нямала новых прыхільнікаў палітычныя сілы,

што адыгралі важную ролю ў вызваленчай барацьбе і прапанавалі сваім суайчыннікам праграмы глыбокага абнаўлення грамадства – камуністы, сацыял-дэмакраты і хрысціянскія дэмакраты. Падобная логіка выклікáла неабходнасць значнага абнаўлення ці нават поўнай замены, як у Германіі і Італіі, палітычнай эліты.

Палітычныя зрухі знайшлі сваё юрыдычна-інстытуцынае ўвасабленне ў пасляваенных канстытуцыях – Францыі (1946), Італіі (1947), ФРГ (1949), Даніі (папраўкі 1953 г. да арыгінальнай канстытуцыі, прынятай у 1848 г.). Французская канстытуцыя аднавіла ліквідаваныя падчас вайны палітычныя свабоды, а італьянская – зафіксавала факт скасавання манархіі і абвясціла рэспубліку. У гэтых дакументах поруч з палітычнымі свабодамі былі зафіксаваны і сацыяльныя правы – права на працу, адпачынак, сацыяльнае забеспячэнне і адукацыю. Канстытуцыя ФРГ абвясціла ФРГ «дэмакратычнай і сацыяльнай федэратыўнай дзяржавай».

Усе новыя канстытуцыі прызнавалі роўнасць грамадзян перад законам, роўнасць правоў мужчын і жанчын, свабоды палітычнай і прафсаюзнай дзейнасці, права на стачку. Органы ўлады фарміраваліся шляхам свабодных выбараў на шматпартыйнай аснове з усеагульным тайным галасаваннем. Прадугледжвалася магчымасць абмежавання прыватнай уласнасці ў грамадскіх інтарэсах, у тым ліку нацыяналізацыя крыніц сыравіны, энергіі і буйных прадпрыемстваў. Канстытуцыі Італіі, Францыі і ФРГ абвяшчалі адмову ад вайны як спосабу вырашэння міжнародных канфліктаў.

Важная роля ў палітычнай сістэме прадстаўнічай дэмакратыі належала парламенту і палітычным партыям. У паўночнаамерыканскіх дзяржавах і шэрагу краін Заходняй Еўропы – ЗША, Канадзе, Вялікабрытаніі, Аўстрыі – пераважна захоўвалася ўстойлівая двухпартыйная сістэма. Прычым толькі ў ЗША (дэмакраты і рэспубліканцы) і Канадзе абодва яе кампаненты былі буржуазнымі партыямі. Што ж датычыцца Вялікабрытаніі і Аўстрыі, то там адным з важнейшых удзельнікаў партыйнай сістэмы з'яўляліся сацыял-дэмакраты (адпаведна, Лейбарысцкая і Сацыялістычная партыі). Блізкая да падобнай сітуацыя склалася і ў ФРГ. Аднак дзве вядучыя палітычныя партыі гэтай краіны (Хрысціянска-дэмакратычны саюз/Хрысціянска-сацыяльны саюз і Сацыял-дэмакратычная партыя Германіі) звычайна не дасягалі парламенцкай большасці і для стварэння ўраду былі вымушаныя абапірацца на падтрымку малодшага партнёру (Партыі свабодных дэмакратаў, СвДП). У літаратуры падобная партыйная сістэма (або варыянт двухпартыйнай) атрымала назву «двухспалавіннай». У Скандынаўскіх краінах, краінах Бенілюксу (Бельгія, Нідэрланды і Люксембург), у Швейцарыі і Ірландыі дзейнічала ўстойлівая шматпартыйная сістэма. Менш трывалая шматпартыйнасць мела месца ў Італіі, Францыі і Грэцыі.

**Асноўныя ідэалагічныя плыні ў палітычным жыцці еўрапейскіх краін пасля Другой сусветнай вайны. Стварэнне новых палітычных сіл, заснаваных на ідэях буржуазнага рэфармізму. Неалібералізм і неакансерватызм у палітычным жыцці Заходняй Еўропы. Еўракамунізм. Крызіс і крах дыктатарскіх рэжымаў у Іспаніі, Партугаліі і Грэцыі ў канцы 1960-х – сярэдзіне 1970-х гг.**

У першыя пасляваенныя гады дэмакратычны ўздым і настойлівая неабходнасць пашырэння ролі дзяржавы ў важнейшых сферах жыццядзейнасці грамадства вывелі на лідарскія пазіцыі ў палітычным жыцці Заходняй Еўропы сацыял-дэмакратычныя партыі. Практычна паўсюдна яны стварылі моцныя парламенцкія фракцыі, а ў цэлым шэрагу краін нават прыйшлі да ўлады аднаасобна ці ў кааліцыі.

Адначасова пад уздзеяннем вопыту палітычнага развіцця Захаду ў міжваенны перыяд і пачатку «халоднай вайны», адбываецца прынцыповы перагляд праграмных установак еўрапейскай сацыял-дэмакратыі ў накірунку да прызнання безумоўнай каштоўнасці прававой дзяржаўнасці. У 1951 г. Сацыялістычны інтэрнацыянал прыняў сваю праграму прынцыпаў – Франкфурцкую дэкларацыю, у якой была сфармулявана сутнасць ідэй дэмакратычнага сацыялізму. Важнейшае значэнне ў справе абнаўлення сацыял-дэмакратычных каштоўнасцей мела прыняцце Венскай праграмы Сацыялістычнай партыі Аўстрыі (1958 г.) і Годэсбергскай праграмы Сацыял-дэмакратычнай партыі Германіі (1959 г.), якія адкінулі асноватворныя пастулаты марксізму аб дыктатуры пралетарыяту, класавай барацьбе, ліквідацыі прыватнай уласнасці, абагульненні сродкаў вытворчасці і г. д. Сацыял-дэмакратычныя партыі сталі прэтэндаваць не толькі на прадстаўніцтва інтарэсаў рабочых, але і ўсяго грамадства (Годэсбергская праграма, напрыклад, ставіла задачу пераўтварыць СДПГ з пралетарскай у «народную партыю»). Паступова гэтым шляхам пайшлі ўсе сацыял-дэмакратычныя партыі Заходняй Еўропы.

У першыя пасляваенныя дзесяцігоддзі ў палітычным жыцці развітых капіталістычных дзяржаў, асабліва ў Італіі і Францыі, немалаважную ролю таксама адыгрывалі камуністычныя партыі. У 1950 – 1960-я гг. іх дзейнасць моцна паўплывала на прыняцця сацыяльнага заканадаўства, ажыццяўленне нацыяналізацыі, пашырэнне рэгулюючых і кантралюючых функцый дзяржавы.

Тым не менш, для значнай часткі грамадства па-ранейшаму захоўвалі сваю прыцягальнасць неаліберальныя ідэі. Яшчэ напачатку ХХ ст. сацыяльны лібералізм засведчыў абмежаванасць індывідуалісцкай трактоўкі свабоды і святасці прыватнай уласнасці. Была прызнана адказнасць грамадства за дабрабыт сваіх членаў і права дзяржавы, як прадстаўніка грамадскіх інтарэсаў, на ўмяшанне ў сферу ўласніцкіх адносін дзеля забеспячэння кансенсусу паміж асобнымі сацыяльнымі групамі. Пасля Другой сусветнай вайны на базе сацы-

яльнага лібералізму была распрацавана канцэпцыя **дзяржавы дабрабыту**. Важнейшым механізмам забеспячэння паспяховасці сацыяльна-эканамічнага развіцця лічылася стварэнне сацыяльна арыентаванай змешанай эканомікі. Яе прынцыпы, што прадугледжвалі эфектыўнае спалучэнне рыначных механізмаў і сістэмы дзяржаўнай сацыяльнай палітыкі, стымуляванне спажывання і рост занятасці, інтэнсіўнае выкарыстанне дасягненняў навукова-тэхнічнага прагрэсу, сталі арыенцірам для палітыкі вядучых краін Захаду ў 1950 – 1960-х гг.

Тым не менш, палітычны ўплыў традыцыйных ліберальных партый пасля вайны стаў скарачацца. Вельмі паказальны прыклад Ліберальнай партыі Вялікабрытаніі, якая ўжо так ніколі і не здолела вярнуцца ва ўладу, а ў 1988 г. спыніла сваё існаванне. Дэмакратычная партыя ЗША ва ўмовах амерыканскай двухпартыйнасці і адсутнасці ўплывовай рабочай партыі з часоў «новага курсу» становіцца носьбітам ідэй і рэалізатарам сацыяльнага рэфармізму ў краіне.

Большая частка кансерватыўных сіл (памяркоўныя правыя) таксама прызнала неабходнасць сацыяльных рэформаў. У некаторых выпадках яны не проста працягвалі курс левых і цэнтрысцкіх сіл на стварэнне дзяржавы дабрабыту, а нават ішлі на пашырэнне праграм дзяржаўнага ўмяшання і сацыяльнай дапамогі.

Пасля Другой сусветнай адной з найбольш уплывовых сіл у Заходняй Еўропе становіцца хрысціянская дэмакратыя. Яе ідэйнай базай становіцца сінтэз традыцыйных хрысціянскіх гуманістычных каштоўнасцей, ідэй салідарызму і субсідыярнасці, палітычныя ідэалы ліберальнай дэмакратыі. Найбольш паспяховымі партыямі сталі заходнегерманскія ХДС і ХСС, італьянская Хрысціянска-дэмакратычная партыя, французскі Народна-рэспубліканскі рух (МРП), бельгійская Сацыяльна-хрысціянская партыя. Хаця гэтыя партыі захоўвалі шчыльныя сувязі з каталіцкім касцёлам, па сутнасці яны з’яўляліся міжканфесійнымі партыямі. Іх праграмы грунтаваліся на свецкіх ідэях і каштоўнасцях, былі арыентаваныя на сістэму прадстаўнічай дэмакратыі і канстытуцыйную мадэль прававой дзяржавы.

Гэткім чынам, на фоне відавочных эканамічных поспехаў, зніжэння сацыяльнай напружанасці і «халоднай вайны» напрыканцы 1940-х – 1960-х гг. у краінах Захаду склаўся прынцыповы кансенсус паміж сацыял-дэмакратамі, лібераламі і памяркоўнымі правымі адносна прынцыпаў дзяржаўна-палітычнага ўладкавання і дзяржаўнага ўмяшання. Менавіта ў гэты час дасягае росквіту дзяржава дабрабыту. Яўнаму зніжэнню градусу ідэалагічнага супрацьстаяння на Захадзе таксама спрыяла разрадка напружанасці міжнародных адносін у перыяд з канца 1950-х да канца 1970-х гг.

Сярод заходніх інтэлектуалаў набываюць папулярнасць ідэі **«канца ідэалогіі»** як паступовага адмірання традыцыйных ідэалогій, што зарадзіліся ў XIX ст. на хвалі станаўлення індустрыяльнай цывілізацыі, і **«канвергенцыі»** як працэсу сыходжання, набліжэння падабенства паміж рознымі грамадствамі

(напрыклад, капіталістычным і сацыялістычным), якія стаяць на адной стадыяльнай прыступцы гістарычнага развіцця. Гэтак Дэніэл Бэл, выдатны амерыканскі сацыёлаг і публіцыст, аўтар праграмнай працы «Канец ідэалогіі: аб вычэрпванні палітычных ідэй у пяцідзясятых» (1960 г.) (ён таксама набыў славу як стваральнік тэорыі постіндустрыяльнага (інфармацыйнага) грамадства), напрыклад, вызначаў сябе як «сацыяліста ў эканоміцы, ліберала ў палітыцы і кансерватара ў культуры».

Тым не менш, падобная ідылія захоўвалася нядоўга. Узрастанне сацыяльна-эканамічных праблем, якія асабліва выпукла сталі праяўляць сябе з сярэдзіны 1970-х гг., рост палітычнага радыкалізму і экстрэмізму, а таксама крах палітыкі разрадкі спрыялі значнаму ідэйна-палітычнаму абнаўленню на Захадзе. Адным з яго вынікаў стала **«неакансерватыўная рэвалюцыя»**. Цэнтральнае месца ў праграмах правых і неакансерватыўных сіл занялі традыцыйныя ліберальныя каштоўнасці (дэмакратыя, свабода, рынак, прававыя прынцыпы сацыяльнага рэгулявання, а не сацыяльны лібералізм неалібералаў), сямейныя і рэлігійныя каштоўнасці, прызнанне неабходнасці ўліку нацыянальнай адметнасці, тонкае спалучэнне індывідуалізму і этатызму, сацыяльнай адказнасці асобы і дзяржаўнага ўмяшання ў сацыяльна-эканамічную сферу. Статус адной з асноўных праблем нацыянальнай і міжнароднай палітыкі набывае абарона правоў чалавека.

Электаральны поспех неакансерватараў Вялікабрытаніі, Злучаных Штатаў, ФРГ, Італіі і Францыі ў 1980-х гг. сведчыў пра сугучнасць гэтых ідэй спадзяванням значнай часткі грамадства, а таму аказаў магутнае ўздзеянне на абнаўленне ідэйна-палітычнага арсеналу іх канкурэнтаў, у тым ліку сацыял-дэмакратычных, сацыялістычных і нават камуністычных партый.

Еўрапейскія левыя і самі добра разумелі неабходнасць перагляду сваіх ідэалагічных прыярытэтаў. На фоне абвастрэння крызісных з'яў у сусветнай сацыялістычнай сістэме напрыканцы 1970-х – напачатку 1980-х гг. у Заходняй Еўропе складваецца новая ідэйна-палітычная плынь – **еўракамунізм**. Рэпрэзентуючы сябе як новую мадэль «трэцяй ідэалогіі», альтэрнатыўнай як у дачыненні заходняга варыянту мадэрнізацыйнага развіцця, гэтак і савецкаму вопыту сацыялістычнага будаўніцтва, еўракамуністы адмаўлялі неабходнасць вядучай ролі правячай камуністычнай партыі і універсальнасць савецкага вопыту, прызнавалі эфектыўнасць нацыянальных мадэляў будаўніцтва сацыялізму, шматпартыйнай дэмакратыі і сацыяльнага плюралізму. У палітычных адносінах еўракамунізм абапіраўся на стратэгію рэфармізму ва ўмовах капіталістычнай сістэмы, адмову ад рэвалюцыйных гвалтоўных метадаў абнаўлення грамадства. Гэткім чынам, функцыянальна ён заняў ідэйна-палітычную нішу рэфармісцкага пралетарскага руху, якая ўтварылася падчас эвалюцыі сацыял-дэмакратычных партый у накірунку ліберальнага прагрэсізму.

Важнай асаблівасцю палітычнага развіцця Еўропы ў канцы 1960-х – сярэдзіне 1970-х гг. стаў крызіс дыктатарскіх рэжымаў Паўднёвай Еўропы – у Іспаніі, Партугаліі і Грэцыі. У красавіку 1974 г. партугальская рэвалюцыя «чырвоных гваздзікоў» паклала канец рэжыму А. Салазара і яго пераемніка М. Каэтану. Канстытуцыя 1976 г. замацавала дэмакратычныя заваёвы, а таксама цэлы шэраг сацыяльных правоў працоўных. Неўзабаве, у тым жа 1974 г., быў ліквідаваны антыдэмакратычны рэжым «чорных палкоўнікаў» у Грэцыі. Ухваленая на рэферэндуме Канстытуцыя 1975 г. замацавала ў краіне дэмакратычную прэзідэнцкую рэспубліку. Смерць у 1975 г. шматгадовага дыктатара Іспаніі Ф. Франка адкрыла гэтай краіне, дзе лібералізацыя ў эканамічнай сферы ажыццяўлялася ўжо напрыканцы жыцця дыктатара, выдатныя перспектывы пераходу да дэмакратыі. Відавочная бесперспектыўнасць захавання франкісцкага рэжыму, схільнасць асноўных палітычных сіл краіны да кампрамісу і выразна прадэмакратычная пазіцыя караля Хуана Карласа I дазволілі хутка рэалізаваць гэты патэнцыял. Гібель дыктатарскіх аўтарытарных рэжымаў на Поўдні Еўропы стаў праявай доўгачасовай тэндэнцыі – у свеце пачалася новая хваля дэмакратызацыі, якая трыумфальна скончылася падзеннем Берлінскай сцяны і крахам Савецкага Саюзу.

### З'яўленне новых палітычных сіл. Абвастрэнне нацыянальна-этнічных праблем. Праварадыкальныя партыі і рухі ў Заходняй Еўропе. Фарміраванне сучаснай партыйна-палітычнай сістэмы

На фоне пачатку сістэмнага крызісу індустрыяльнага грамадства ўзрастальная плюралізацыя грамадскага жыцця, з'яўленне субкультур з уласнымі каштоўнаснымі і светапогляднымі ўстаноўкамі на працягу 1960-х гг. спрыяюць фарміраванню ў краінах Захаду пратэстных рухаў. Адным з найбольш уплывовых і паспяховых аказаўся **экалагічны («зялёны») рух**. Практычна ад пачатку арганізацыйнага афармлення «зялёныя» распадаюцца на дзве плыні. Увасабленнем першай, больш радыкальнай, стаў «Грынпіс» (*Green Peace*, «Зялёны мір», 1971 г.). Актывісты арганізацыі аддавалі перавагу адчайным, часам эксцэнтрычным, разлічаным на грамадскі і медыйны розгалас, дзеянням. Другую, больш памяркоўную плынь, рэпрэзентавалі экалагічныя партыі. Яны рабілі стаўку на парламенцкія метады барацьбы.

Першыя партыі «зялёных» з'явіліся у Аўстраліі, Новай Зеландыі і Вялікабрытаніі напачатку 1970-х гг. Заснаваныя на г. зв. «зялёных прынцыпах», якія ўключаюць: сацыяльную справядлівасць, дэмакратыю знізу (палітычны працэс, у межах якога прынясце рашэнняў максімальна «апускаецца» на мясцовы ўзровень, англ. – *grassroot democracy*), негвалтоўнасць і акцэнтаванне інвайранменталізму (тэорыя кіравання сацыяльна-эканамічным развіццём і навакольным асяроддзем, якая лічыць чалавецтва неад'емнай часткай біясферы і

сцвярджае неабходнасць пераўтварэння прыроды на карысць чалавека пры яе максімальным захаванні). У 1979 г. была заснаваная «партыя зялёных» ФРГ – самая паспяховая сярод экалагічных партый. Да сярэдзіны 1980-х гг. партыі «зялёных» сфарміраваліся ў большасці краін Заходняй і Паўночнай Еўропы.

Тэндэнцыі да рэгіяналізацыі ў Бельгіі, Канадзе, Вялікабрытаніі, Іспаніі, Італіі выклікалі да жыцця рэгіянальныя партыі: ХСС у Баварыі, амаль усе бельгійскія партыі, Паўночнай Лігі ў Італіі, брытанскіх незалежніцкіх партый – ШНП (Шатландыя), Плайд Кімру (Уэльс), партыю «Рэспубліканскія левыя Каталоніі» і г. д.

Новай з'явай палітычнага жыцця Заходняй Еўропы стаў пачатак кансалідацыі асобных палітычных плыняў у межах усяго рэгіёну. Базай гэтага працэсу стала развіццё палітычнай надбудовы еўрапейскай эканамічнай інтэграцыі – Еўрапейскага парламенту. У яго сценах склалася Еўрапейская народная партыя (хрысціянскія дэмакраты), Федэрацыя ліберальных і дэмакратычных партый, Саюз сацыял-дэмакратычных партый і г. д.

Крах рэжымаў «народнай дэмакратыі» і сацыялістычнага блоку, распад СССР моцна падарвалі аўтарытэт левых партый. Найбольш пацярпелі камуністычныя партыі. Да ідэйнага крызісу дадаліся неабвержныя факты, што сведчылі пра іх шматгадовую фінансавую падтрымку з боку Савецкага Саюзу. Як вынік, некаторыя партыі камуністаў, у першую чаргу варта прыгадаць Італьянскую камуністычную партыю, зведалі цэлую серыю скандалаў і ўрэшце рэшт распаліся. Аслабленне левых партый стала адным з важных фактараў, якія выклікалі значныя змены ў партыйных сістэмах заходнееўрапейскіх дзяржаў.

На працягу 1970 – 1980-х гг. склаўся і кансерватыўны пратэстны рух – **«новыя правыя»**. З'явіліся і праварадыкальныя нацыяналістычныя тэрарыстычныя групоўкі – Ірландская рэспубліканская армія (ІРА), арганізацыі баскаў у Іспаніі (напрыклад, ЭТА) і г. д.

*Цэнтральная і Паўднёва-ўсходняя Еўропа*

### Палітычныя аспекты развіцця краін Усходняй Еўропы пасля Другой сусветнай вайны. Працэс усталявання дыктатуры пралетарыяту

Яшчэ напрыканцы Другой сусветнай вайны ў краінах Цэнтральнай і Паўднёва-ўсходняй Еўропы адбываецца працэс кансалідацыі апазіцыйных партый і рухаў, утварэння шырокіх шматпартыйных кааліцый – нацыянальных (айчынных) франтоў. У 1944 г. гэтак адбылося ў Балгарыі, Венгрыі і Румыніі, а ў Чэхаславакіі і Польшчы – у 1945 г. Выключэнне склалі толькі краіны Балтыі, для якіх вызваленне ад нацызму азначала вяртанне савецкай улады, і Югаславія з Албаніяй, дзе пракамуністычныя рухі атрымалі перамогу над унутрыпалітычнымі канкурэнтамі яшчэ ў час вайны.

Першапачатковае адзінства асноўных палітычных сіл усходнееўрапейскіх краін было перадусім звязана з наяўнасцю згоды адносна першачарговых пасляваенных пераўтварэнняў. У палітычнай сферы ў якасці асноўных задач разглядаліся: фарміраванне падмуркаў новага канстытуцыйнага ладу, ліквідацыя дыскрэдытаваўшых сябе аўтарытарных структур і правядзенне свабодных выбараў. На іх думку, прыярытэтнае значэнне для краін, большасць насельніцтва якіх па-ранейшаму складалі сяляне, мела правядзенне глыбокіх аграрных пераўтварэнняў. Левыя партыі, сацыял-дэмакраты і камуністы, нягледзячы на разыходжанні па цэламу шэрагу стратэгічных і тактычных пытанняў былі адзіныя ў прызнанні неабходнасці арыентацыі на мадэль «даганяючага развіцця».

У той час, як дэмакратычныя партыі Ўсходняй Еўропы бачылі ў пасляваенных эканамічных пераўтварэннях толькі запатрабаванае часам узмацненне дзяржаўнага рэгулявання рыначнай эканомікі, камуністы разглядалі іх як этап сацыялістычнага будаўніцтва. Новы палітычны раскол быў непазбежны і шанцы на перамогу ўласнымі сіламі ў радыкалаў выглядалі зусім мізэрнымі. Аднак нарастанне супярэчнасцяў у адносінах паміж СССР і заходнімі дзяржавамі, паступовае пагружэнне свету ў «халодную вайну» не пакінула ўсходнееўрапейскім народам выбару. Савецкі Саюз усё вырашыў за іх сам.

З канца 1946 г. пачынаецца фарміраванне левых блокаў з удзелам камуністаў, сацыял-дэмакратаў ды іх саюзнікаў. Іх мэтай абвяшчаўся мірны пераход да сацыялістычнай рэвалюцыі. Пры пэўнай дапамозе СССР левыя дамагліся значных поспехаў на дэмакратычных выбарах. У 1947 г. новыя ўрады пры непрыхаванай падтрымцы савецкай вайсковай адміністрацыі і абапіраючыся на органы дзяржаўнай бяспекі, якія ствараліся і кантраляваліся савецкімі спецыялістамі, справакавалі цэлую серыю ўнутрыпалітычных канфліктаў. Апошнія, у сваю чаргу, былі выкарыстаныя для разгрому сялянскіх і буржуазна-дэмакратычных партый і расправы над іх лідарамі.

За гэтым паследавала паглынанне камуністычнымі партыямі сацыял-дэмакратычных: 1948 г. адбыліся аб’яднаўчыя з’езды ў Румыніі, Польшчы, Балгарыі, Венгрыі і Чэхаславакіі. У выніку гістарычнага «аднаўлення палітычнага адзінства рабочага класу» камуністы зрабілі рашучы крок да аднаасобнага палітычнага панавання, а значную частку сацыял-дэмакратычных лідараў чакаў гэткі ж трагічны лёс, як крыху раней іх буржуазных калег. Гэткім чынам у 1948 – 1949 гг. камуністы святкавалі канчатковую перамогу і афіцыйна абвясцілі курс на будаўніцтва асноў сацыялізму (у ГДР аб пачатку сацыялістычнага будаўніцтва было заяўлена некалькі пазней – ў 1952 г.).

### Будаўніцтва камандна-адміністрацыйнага сацыялізму. Замацаванне пануючай ролі камуністычных партый у грамадстве. Сацыяльна-палітычныя крызісы 1950-х – 1960-х гг. у краінах Усходняй Еўропы, іх вынікі. Спробы рэфармавання палітычнага жыцця ў 1960-я гг.

Ва ўсіх краінах «народнай дэмакратыі» ўрады ўзначальвалі камуністы. Адбываўся працэс зрошчвання дзяржаўнага і партыйнага кіраўніцтва. Камуністычныя партыі станавіліся неад’емнай часткай дзяржавы, яго галоўнай кіруючай сілай. Гэтае становішча было неўзабаве юрыдычна замацаванае ў новых канстытуцыях. Усе астатнія партыі, калі асноўны закон увогуле дапускаў іх існаванне, больш не маглі прэтэндаваць на ўладу і былі вымушаныя ісці ў камуністычным фарватэры.

Пераход будаўніцтва сацыялізму ў краінах Цэнтральнай і Паўднёва-ўсходняй Еўропы пад кантроль СССР прывёў да ўлады радыкальную чыстку самога камуністычнага руху ў рэгіёне. У 1949 – 1952 гг. тут пракацілася хваля палітычных працэсаў і рэпрэсій. Яны «выкасілі» найменш падатлівых савецкаму ўплыву і найбольш самастойных палітыкаў, г. зв. «нацыянальнае» крыло, якое выступала за захаванне суверэнітэту сваёй дзяржавы і наважвалася пярэчыць грубаму ўмяшанню сталінскага кіраўніцтва ў яе справы. Усё сацыяльна-эканамічнае, грамадска-палітычнае і культурнае жыццё стала перабудоўвацца па савецкім узоры без уліку нацыянальных асаблівасцяў і традыцый.

У выніку ў краінах Усходняй Еўропы былі ўсталяваныя дыктатуры камуністычных партый (а не пралетарыяту, як дэмагагічна заяўлялі іх лідары), таталітарныя рэжымы савецкага тыпу пры захаванні асобных элементаў фасаду заходнееўрапейскага парламентарызму.

Нягледзячы на немалыя поспехі, дасягнутыя ў ажыццяўленні мадэрнізацыі, ацэнка насельніцтвам Усходняй Еўропы вынікаў сацыяльна-эканамічнага, грамадска-палітычнага і культурнага будаўніцтва істотна рознілася. Найбольш крытычна пасляваенныя дасягненні ўспрымаліся грамадствамі з параўнальна развітай рыначнай структурай, пэўнымі дэмакратычнымі традыцыямі і адносна высокім адукацыйным і культурным узроўнем. У Польшчы, Венгрыі і Чэхаславакіі сацыялістычныя рэформы суправаджаліся асабліва балючай ломкай сацыяльнай структуры, ліквідацыяй дастаткова шматлікіх і паспяховых прадпрымальніцкіх слаёў, гвалтоўнымі зменамі сацыяльнай псіхалогіі. Са смерцю І. В. Сталіна і пэўным паслабленнем кантролю з боку Масквы ў правячых колах гэтых краін стаў узрастаць уплыў палітыкаў, якія заклікалі да больш гнуткай і адпаведнай мясцовым умовам стратэгіі рэформ, павышэння іх сацыяльнай аддачы.

У чэрвені 1953 г. незадавальненне працоўных пагаршэннем умоў аплаты працы ўзняло хвалю масавых забастовак і антыўрадавых дэманстрацый у ГДР. Задушыць іх здолелі толькі пры дапамозе савецкіх танкаў,

уведзеных на вуліцы сталіцы і некаторых іншых усходненямецкіх гарадоў. Жорсткая расправа, бясспрэчна, аказала выцверажальны эфект – больш адкрытых выступленняў супраць рэжыму ў краіне не было. Аднак людзі выкарыстоўвалі любыя магчымасці для ўцёкаў на Захад. У 1961 г. было перакрытае асноўнае вакно ў свет для ўцекачоў – пабудаваная г. зв. «Берлінская сцяна». Мяжа, што падзяляла Усходнюю і Заходнюю Германію пераўтварылася ў самую ахоўваемую ў свеце.

Развянчанне культу асобы Сталіна ў 1956 г. на ХХ з’ездзе КПСС выклікала крызіс ў сусветным камуністычным руху і скрайне негатыўна адбілася на ўстойлівасці сталінісцкіх рэжымаў Цэнтральнай і Паўднёва-ўсходняй Еўропы. У многіх краінах былое кіраўніцтва, моцна павязанае з І. В. Сталіным, было вымушана пакінуць свае высокія крэслы. Толькі асцярожнасцю новых улад, абяцанкамі і рэальнымі саступкамі народу ўдалося стрымаць хвалю антыўрадавых выступленняў у Польшчы. Сітуацыя ў Венгрыі, справакаваная ў тым ліку і польскім крызісам, зайшла нашмат далей. Адхіленне ад улады мясцовых сталіністаў, разрыў саюзу з СССР і адкрыццё межаў на захадзе на фоне ўзрастальных антысавецкіх і камуністычных настрояў вылілася ў падзеі восені 1956 г.: на ўтаймаванне венграў былі накіраваныя танкавыя карпусы; колькасць ахвяр ішла на многія тысячы, а ўцекачоў у «вольны свет» – на сотні тысяч. Савецкі Саюз здолеў захаваць кантроль над усходнееўрапейскім сацыялістычнымі краінамі (за выключэннем Югаславіі), але яго маральна-палітычны аўтарытэт аказаўся моцна падарваным.

Ужо напачатку 1960-х гг. у дакументах правячых партый Цэнтральнай і Паўднёва-ўсходняй Еўропы было дэкларавана заканчэнне будаўніцтва «асноў сацыялізму». Аднак пры ўсёй арыентацыі на савецкую грамадска-палітычную мадэль з паслабленнем прамога ўплыву Масквы, усходнееўрапейскі сацыялізм паступова набываў спецыфічныя рысы, уласцівыя нацыянальным асаблівасцям асобных краін, рэальнаму ўзроўню іх развіцця.

У Чэхаславакіі з красавіка 1968 г. пачынаюцца спробы рэфармавання не толькі эканамічнай, але і сацыяльна-палітычнай сферы з адыходам ад аднапартыйнасці і адмовай ад прызнання пралетарыяту гегемонам грамадства. Размова пайшла аб глыбокай рэформе самой мадэлі сацыялізму – фарміраванні сістэмы «сацыялізму з чалавечым тварам». Нягледзячы на падкрэсліванне непарушнасці чэхаславацка-савецкага сяброўства і недатыкальнасці дзяржаўнай уласнасці – базы сацыялізму, дэмакратычны эксперымент у Чэхаславакіі быў расцэнены ў Маскве як недапушчальны. У маленькую краіну былі ўведзены звыш паўмільёны салдат СССР і яго саюзнікаў па Арганізацыі Варшаўскага Дагавору, а таксама 7 тыс. танкаў – удвая болей, чым кінуў супраць Савецкага Саюзу ў1941 г. А. Гітлер.

## Перыяд застою ў палітычным развіцці Цэнтральнай і Паўднёва-ўсходняй Еўропы ў 1970-я гг. Паглыбленне сацыяльна-палітычнага крызісу і спробы частковага рэфармавання палітычных сістэм у другой палове 1980-х гг. Фарміраванне апазіцыйных сіл. Крызіс правячых партый. Дэмакратычныя рэвалюцыі 1989 г. і стварэнне новай структуры палітычных сіл

Неўзабаве ад рэформ зусім адмовіліся. З аднаго боку, на працягу некалькіх апошніх дзесяцігоддзяў практычна прыпыніўся працэс абнаўлення ўладных эліт. Дзяржава мела вострую патрэбу ў новых асобах і свежых ідэях. Аднак апаратны механізм кадравай палітыкі, абсалютная фармальнасць выбарчага пачатку ў рэкрутаванні палітыкаў любога ўзроўню і карпаратыўнасць асобных уладных эшалонаў не пакідалі аніякіх шанцаў на яе задавальненне. Па меры старэння вышэйшага эшалону ўлады ўзмацняўся натуральны псіхалагічны кансерватызм правячай эліты. Гэткім чынам тут, як і ў Савецкім Саюзе, складваецца рэжым герантакратыі – улады старых. Энвер Ходжа кіраваў Албаніяй аж да самай смерці сорак адзін год, Нікалаэ Чаўшэску – дваццаць пяць гадоў, пакуль не быў расстраляны без суда і следства сваімі ж былымі падначаленымі, Эрых Хонэкер – да 77-гадовага ўзросту і г. д. З іншага боку, логіка рэфармавання неэфектыўнай сацыяльна-эканамічнай мадэлі на шляху далейшага пашырэння рыначнага пачатку пагражала сутнасці сацыялістычнай сістэмы і базавым для камуністычнай ідэалогіі прынцыпам роўнасці і салідарнасці, сацыяльным ідэалам эгалітарызму.

Узрастальны разрыў паміж заяўленымі ідэаламі і рэальнымі дасягненнямі рэжымаў «народнай дэмакратыі» не мог не спарадзіць апатыю і недавер да іх у шырокіх масах насельніцтва. Расчараванню ў існуючых парадках спрыяла відавочнае перараджэнне нязменнай і непадсправаздачнай свайму народу правячай эліты – са славалюбствам (у Албаніі і Румыніі нават захоўваўся культ асобы правадыра), карупцыяй, непатызмам ды іншымі заганамі. У асяродку найбольш сацыяльна і інтэлектуальна спелай часткі грамадства фарміруецца дысідэнцкі рух, які ставіць пытанні аб адсутнасці галоснасці і свабоды асобы як галоўных прычынах няўдач любых пераўтварэнняў і нават аб несумяшчальнасці дэмакратыі і сацыялізму.

Найбольшых памераў незадаволенасць дасягнула ў Польшчы: улады былі бяссільныя зладзіць з незалежным прафсаюзам «Салідарнасць». Баючыся паўтарэння пражскага сцэнарыя 1968 г. з прамым умяшаннем Савецкага Саюзу ва ўнутраныя справы ў 1981 г., яны ўвялі надзвычайнае становішча. Для нармалізацыі сацыяльна-эканамічнага становішча ў краіне прыйшлося пайсці на новыя эканамічныя рэформы.

Аднак польскі крызіс пачатку 1980-х гг. адносна мала паўплываў на палітычныя працэсы ў краінах сацыялістычнага лагеру. Для правячых партый і лідараў Цэнтральнай і Паўднёва-ўсходняй Еўропы СССР па-ранейшаму выглядаў надзейным гарантам непарушнасці існуючых парадкаў. Сітуацыя ў рэгіёне стала імкліва змяняцца ў 1985 г. з прыходам да ўлады ў Савецкім Саюзе М. С. Гарбачова.

Напрыканцы 1980-х гг. увесь рэгіён пагружаецца ў палітычны крызіс. У тых краінах, дзе ў перыяд перабудовы актывізаваліся рэформы, ідэалагічны плюралізм быў найбольшым і камуністычнае кіраўніцтва ўсведамляла непазбежнасць перамен, дэмакратычны працэс разгортваўся больш плаўна і на прававой базе. Гэтак у Польшчы апазіцыя здолела легальна ўзяць удзел у парламенцкіх выбарах 1989 г. і атрымаць права на фарміраванне некамуністычнага ўраду. У наступным, 1990 г., лідар «Салідарнасці» Л. Валенса быў абраны на пасаду прэзідэнта. Яшчэ ў 1988 г. лідар рэфармісцкай апазіцыі ў Венгерскай сацыялістычнай рабочай партыі (ВСРП) здолеў стаць старшынёй арганізацыі. Непрымірымыя рознагалоссі паміж рэфармісцкай і артадаксальнай групоўкай ВСРП прывялі да расколу партыі ў 1989 г. Гэта расчысціла дарогу да ўлады дэмакратычнай апазіцыі, якая на першых дэмакратычных парламенцкіх выбарах 1990 г. атрымала ўпэўненую перамогу.

У іншых краінах Усходняй Еўропы змена дзяржаўна-палітычнага ладу адбывалася на больш драматычным фоне. Важнейшую ролю ў канчатковым краху камуністычных рэжымаў адыгралі падзеі восені 1989 г. ў ГДР, якія скончыліся падзеннем сумна вядомай «Берлінскай сцяны» і пачаткам працэсу аднаўлення нацыянальнага адзінства Германіі.

Напрыканцы 1989 г. масавыя дэманстрацыі пратэсту і забастоўкі ў Чэхаславакіі і Балгарыі таксама мірным шляхам дазволілі вырваць уладу з нямоглых рук камуністычных партый. Толькі ў Румыніі сцэнарый мірных – **«аксамітных рэвалюцый»** – быў парушаны. Народныя выступленні супраць аднаго з найбольш адыёзных рэжымаў Цэнтральнай і Паўднёва-ўсходняй Еўропы перараслі ў крывавыя сутыкненні з сіламі дзяржаўнай бяспекі і каштавалі многіх загубленых жыццяў, у тым ліку самога дыктатара Н. Чаўшэску і яго жонкі. Без асаблівых эксцэсаў, хаця і некалькі пазней, у 1991 г., адбылося падзенне камуністычнага рэжыму ў самай адсталай краіне рэгіёну – Албаніі.

## Тэма 3. Еўрапейская інтэграцыя ў другой палове XX – пачатку XXI стст.

### Першы вопыт заходнееўрапейскай інтэграцыі. Арганізацыя еўрапейскага эканамічнага супрацоўніцтва і яе дзейнасць. «План Шумана» і стварэнне Еўрапейскай супольнасці вугалю і сталі. Стварэнне Агульнага рынку. Узнікненне Еўрапейскай асацыяцыі свабоднага гандлю

Ідэя згуртавання еўрапейскіх краін не была новай. Першы яго праект адносіўся яшчэ да XVI ст. Пасля Першай сусветнай вайны нараджаецца даволі ўплывовы пан’еўрапейскі рух, які выступаў пераважна з пацыфісцкіх пазіцый. Аднак рознагалоссі на кантыненце былі яшчэ нагэтулькі непераадольнымі, нацыяналістычнае асляпленне і няздольнасць дзяржаў да кампрамісаў настолькі моцнымі, што рэальных поспехаў, а не дэкларацый, на гэтым шляху так і не было дасягнута.

Заканчэнне Другой сусветнай вайны паставіла заходнееўрапейскія краіны перад падобнымі праблемамі. Цяпер прыйшло разуменне таго, што разам пераадолець цяжкую спадчыну мінулага і распачаць новае жыццё будзе прасцей.

У 1946 г. у сваім выступленні ў Цюрыхскім універсітэце («Цюрыхская прамова») У. Чэрчыль заклікаў заходнеўрапейцаў *«з мэтай уз'яднання еўрапейскай сям'і і надання ёй такой структуры, якая дазволіць ёй жыць і развівацца у мірных, бяспечных і свабодных умовах»* стварыць Злучаныя Штаты Еўропы. На першых парах галоўнай перашкодай для пачатку збліжэння дзяржаў і народаў Заходняй Еўропы быў падзел Германіі на акупацыйныя зоны. Абвяшчэнне ФРГ (1.10.1949 г.) дазволіла зрушыць справу з мёртвай кропкі.

З'яўляюцца канкрэтныя ініцыятывы і аб'яднанні, што выступалі ў іх падтрымку – Еўрапейскі саюз федэралістаў, Сацыялістычны рух за Злучаныя Штаты Еўропы, Еўрапейскі парламенцкі саюз. У 1948 г. скліканы імі Кангрэс у Гаазе скаардынаваў дзеянні многіх падобных структур, а яго рашэнні заклалі базу пад стварэнне Рады Еўропы.

Галоўнымі мэтамі еўрапейскай інтэграцыі на першапачатковым этапе былі: усталяванне трывалай бяспекі на кантыненце і прадухіленне канфліктаў і войнаў паміж еўрапейскімі народамі, а таксама эканамічнае адраджэнне Еўропы і паглыбленне ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва ў гэтай галіне.

Эканамічнаму збліжэнню заходнееўрапейскіх краін спрыяла супрацоўніцтва са Злучанымі Штатамі Амерыкі ў рамках «плана Маршала». У ліпені 1947 г. з удзелам 16 краін, якім ЗША аказвалі эканамічную дапамогу, быў арганізаваны Камітэт еўрапейскага эканамічнага супрацоўніцтва. У красавіку 1948 г. на яго базе была створана Арганізацыя еўрапейскага эканамічнага супрацоўніцтва (АЕЭС). АЕЭС апынулася ў цэнтры еўрапейскага руху эканамічнага супрацоўніцтва і адыграла жыццёва важную ролю ў аднаўленні эканомікі Заходняй Еўропы Станоўчае ўздзеянне аказалі агульныя правілы па лібералізацыі гандлю, што скарацілі гандлёвыя абмежаванні паміж членамі арганізацыі. У 1950 г. краіны АЕЭС арганізавалі Еўрапейскі плацежны саюз. Найбольш актыўныя ўдзельнікі арганізацыі выступалі за яшчэ больш шчыльнае эканамічнае супрацоўніцтва.

У 1949 г. у мэтах паскарэння інтэграцыйнага працэсу была створана Рада Еўропы, якая аб'яднала прадстаўнікоў парламентаў заходніх дэмакратый.

Рашэнні Рады Еўропы насілі толькі кансультацыйны характар і да стварэння агульнага еўрапейскага парламента было яшчэ вельмі далёка. Ідэйныя натхняльнікі Еўрапейскага Саюза – французы Жан Манэ і Рабер Шуман, італьянец Альчыдэ дэ Гаспэры, бельгіец Поль-Хенры Спаак і інш. – лічылі неабходным перайсці да больш прадметных крокаў.

9 траўня 1950 г. міністр замежных спраў Францыі Рабэр Шуман агучыў мемарандум – г. зв. **«План Шумана»**, у якім змяшчалася ўся палітычная і эканамічная філасофія «бацькоў-заснавальнікаў» Еўрапейскіх Супольнасцяў: усталяванне фактычнай салідарнасці, адмова ад неадкладнага федэратыўнага ўладкавання, але канкрэтныя дзеянні (г. зв. функцыянальны падыход). Як гаварылася ў дакуменце: *«Еўропа не паўстане за адзін момант і ў якасці пабудовы зверху, яна паўстане ў выніку канкрэтных дзеянняў, што створаць пачуццё «салідарнасці спраў»... Французскі ўрад прапануе перадаць усю сукупнасць франка-нямецкай вытворчасці вугалю і сталі пад агульнае Вярхоўнае Кіраўніцтва арганізацыі, адчыненай да ўдзелу іншых краін Еўропы. Салідарнасць праз вытворчасць, якая паўстане такім чынам, створыць сітуацыю, калі вайна паміж Францыяй і Германіяй будзе не толькі немажлівай, але і матэрыяльна немагчымай. [праз гэта] Адбудзецца рэалізацыя першых канкрэтных крокаў у кірунку да еўрапейскай федэрацыі, без якой немагчыма захаваць мір»*.

Пачатак рэалізацыі ідэй, агучаных у «Плане Шумана», адкрыў першы этап еўрапейскай інтэграцыі і прывёў да заключэння ў 1951 г. Парыжскай дамовы. Згодна з гэтым дакументам краіны Бенілюксу, ФРГ, Францыя і Італія стварылі **Еўрапейскую супольнасць вугалю і сталі (ЕСВС)**. Так паўстала першая еўрапейская арганізацыя, што валодала рэальнай уладай і мела наднацыянальныя інстытуты кіравання (Вярхоўнае Кіраўніцтва, а з 1967 г. – Камісія Еўрапейскіх Супольнасцяў).

У 1952 – 1954 гг. рабіліся няўдалыя спробы стварэння Еўрапейскай абарончай супольнасці. Але ізноў праявіліся старыя боязі: не жадаючы страчваць свабоду рук у распараджэнні сваімі ўзброенымі сіламі, французскі заканадаўчы сход адмовіўся ратыфікаваць дамову. Тым самым, быў нанесены першы адчувальны ўдар па інтэграцыі.

25 сакавіка 1957 г. тая ж шасцёрка дзяржаў заключыла Рымскія пагадненні. Прадугледжвалася стварэнне **Еўрапейскай эканамічнай супольнасці** (**ЕЭС**, каб аб’яднаць вытворчасць і перамяшчэнне тавараў) і **Еўрапейскай супольнасці па атамнай энергіі** (**Еўратам**, каб збудаваць «ядзерную» Еўропу і забяспечыць яе энергарэсурсамі). ЕСВС, ЕЭС і Еўратам сталі неафіцыйна называцца Еўрапейскімі Супольнасцямі. На долю ЕЭС прыпадала каля 1/3 тэрыторыі і больш за 50 % насельніцтва Заходняй Еўропы.

У межах ЕЭС узнік буйны рынак, паступова здымаліся мытныя перашкоды, узмацнілася каардынацыя эканамічнай палітыкі. Ствараліся сумесныя фінансава-эканамічныя інстытуты. Былі зроблены крокі па ўзгадненні гаспадарчага заканадаўства, бюджэтнай, падатковай і сацыяльнай палітыкі, фарміраванні агульнага рынку працоўнай сілы. Тым не менш, барацьба стыхійна-рыначнага і дзяржаўна-рэгулюючага пачаткаў, міжма-

напалістычная канкурэнцыя і міждзяржаўныя супярэчнасці ўнутры ЕЭС ускладнялі і тармазілі інтэграцыйны працэс.

У 1968 г. у рамках ЕЭС быў створаны Мытны саюз (скасаваныя мытныя пошліны і ўведзены агульныя мытныя тарыфы ў адносінах да трэціх краін). Аднак мытныя праблемы яшчэ доўга заставаліся з-за недастатковай гарманізацыі нацыянальных заканадаўстваў краін-удзельніц.

Поспехі Еўрапейскіх Супольнасцяў павялічылі прывабнасць інтэграцыі і ўжо Вялікабрытанія двойчы спрабуе далучыцца да шасцёркі (1963, 1967 гг.), але абодва разы з-за «вета» Францыі беспаспяхова.

Амаль адначасова са з'яўленнем ЕЭС намаганнямі Вялікабрытаніі была ўтворана яшчэ адна еўрапейская інтэграцыйная арганізацыя. У альтэрнатыўную арганізацыю ўвайшлі еўрапейскія дзяржавы, якія лічылі планы стваральнікаў ЕЭС занадта амбітнымі і не жадалі ці не здолелі далучыцца да «Агульнага рынку». У 1960 г. была заключана Стакгольмская канвенцыя, на аснове якой сем дзяржаў – Аўстрыя, Вялікабрытанія, Данія, Нарвегія, Партугалія, Швейцарыя і Швецыя – стварылі **Еўрапейскую асацыяцыю свабоднага гандлю (ЕАСГ)**. У наступным годзе асацыяваным членам арганізацыі стала Фінляндыя, а праз дзесяць гадоў у ЕАСГ уступіла Ісландыя.

У параўнанні з ЕЭС, ЕАСГ абмежавалася вырашэннем больш сціплых задач. Адзіная мытная палітыка распаўсюджвалася толькі на мытныя тавары, краіны-ўдзельніцы не ўводзілі адзіную тарыфную палітыку на прадукты, імпартаваныя з трэціх краін, захоўвалі нацыянальныя мытныя пошліны і г. д.

Да пачатку 1970-х гг. працэс стварэння зоны свабоднага гандлю быў завершаны. Нават намеціліся тэндэнцыі да перарастання ЕАСГ у больш развітую інтэграцыйную форму – эканамічны саюз. Аднак недастактова шчыльныя эканамічныя сувязі краін-удзельніц, далучэнне Вялікабрытаніі і Даніі да ЕЭС не дазволілі рэалізаваць гэтыя магчымасці. Хаця ЕАСГ існуе і сёння, у ёй удзельнічае ўжо толькі чатыры дзяржавы – Ісландыя, Ліхтэнштэйн, Нарвегія і Швейцарыя.

### Другі этап эканамічнай інтэграцыі ў Заходняй Еўропе. Прыняцце Адзінага еўрапейскага акту. Фарміраванне ідэі аб'яднанай Еўропы. Маастрыхцкія пагадненні 1992 г. Прыняцце агульнаеўрапейскай валюты. Уваходжанне ў Еўрапейскі саюз новых членаў. Паглыбленне еўрапейскай інтэграцыі. Правал Канстытуцыі ЕС. Лісабонскі дагавор і яго ратыфікацыя

Напачатку 1970-х гг. пачынаецца пераадоленне пэўнага застою 1960-х гг. у інтэграцыйных працэсах, да Еўрапейскіх Супольнасцяў далучыліся новыя члены. З 1973 г. у Супольнасці ўвайшлі Вялікабрытанія, Данія ды Ірландская Рэспубліка. Адначасова з тэрытарыяльным ростам было вырашана пашырыць сферу адказнасці агульнаеўрапейскіх органаў. З гэтага ча-

су яны пачалі займацца, поруч з нацыянальнымі інстытутамі, сацыяльнай палітыкай, палітыкай рэгіянальнага развіцця і аховай навакольнага асяроддзя. Дадатковым крокам у гэтым накірунку было і стварэнне Еўрапейскага фонду рэгіянальнага развіцця (1975 г.).

У 1979 г. пачала дзейнічаць Еўрапейская Грашовая Сістэма (ЕГС), якая хаця яшчэ й не прадугледжвала агульную валюту, але закладала базу для стварэння зоны грашовай стабільнасці. Таксама ў безнаяўны разлік была ўведзена грашовая адзінка – ЭКЮ (ад англ. *European Currency Unit* – Еўрапейская валютная адзінка).

Важнай вяхой у гісторыі еўрапейскага інтэграцыйнага працэсу сталі першыя непасрэдныя выбары Еўрапейскага парламенту, якія адбыліся ў 1979 г. Хаця першы правобраз гэтага інтэграцыйнага інстытута пачаў сваю дзейнасць у 1952 г., доўгі час ён не валодаў дастатковымі паўнамоцтвамі (усведамленне грамадствам малой выніковасці, калі не бессэнсоўнасці, дзейнасці Еўрапарламенту ў 1970-х гг. нават спарадзіла дасціпны жарт: «*Пашлі свайго дзядзечку засядаць у Еўрапарламент!*»).

Сусветны структурны эканамічны крызіс 1970-х – пачатку 1980-х гг. і яго наступствы не маглі не адбіцца на ходзе еўрапейскай інтэграцыі. Але ў 1981 г. да Еўрапейскіх Супольнасцяў далучаецца Грэцыя, а ў 1986 г. – яшчэ й Іспанія з Партугаліяй. Ад гэтага часу краін-удзельніц стала 12 (колькасць удзельнікаў ЕАСГ, наадварот, скарацілася).

Тым не менш, у 1985 г. Еўрапейская эканамічная супольнасць была вымушана прызнаць, што намечаная Рымскімі пагадненнямі мэта стварэння агульнага рынку яшчэ не дасягнута і трэба прыняць энергічныя захады для пераадолення эканамічных цяжкасцяў і для прыстасавання да новай эканамічна сітуацыі.

У мэтах пераадолення масавага беспрацоўя, нізкіх тэмпаў развіцця і падзення канкурэнтаздольнасці на вонкавых рынках 1986 г. была прынятая абноўленая версія Рымскіх пагадненняў у **Адзіны Еўрапейскі Акт (АЕА)**, які ахапіў усе Еўрапейскія Супольнасці (ЕЭС, ЕСВС, Еўраатам). Ён паклаў пачатак прарыву ў стварэнні Адзінай Еўропы і, тым самым, адкрыў трэці этап еўрапейскай інтэграцыі.

Дакумент вызначыў тэрмін заканчэння стварэння «Агульнага рынку» – 1.1.1993 г. Да гэтага часу трэба было забяспечыць існаванне агульнага рынку тавараў, працы, капіталаў і паслуг. Паводле палажэнняў АЕА узмацнялася роля Еўрапарламенту, спрашчалася працэдура прыняцця рашэнняў на агульнаеўрапейскім узроўні, аднародныя еўрапейскія арганізацыі зліваліся ў адну структуру.

З 1 чэрвеня 1990 г. пачаўся новы этап стварэння валютна-фінансавага і эканамічнага саюзу краін ЕЭС. У васьмі найбольш развітых краінах (Бельгіі, Вялікабрытаніі, Даніі, Італіі, Люксембургу, Нідэрландах, Францыі

і ФРГ) быў уведзены рэжым вольнага пераліву капіталаў і адкрыцця любых валютных рахункаў грамадзянамі гэтых краін (астатнія ўдзельнікі – Грэцыя, Ірландыя, Іспанія і Партугалія – яшчэ не былі гатовыя да гэткай адкрытай эканомікі).

У лютым 1992 г. у горадзе Маастрыхце (Нідэрланды) быў падпісаны **Маастрыхцкі дагавор** (Маастрыхцкія пагадненні), які паклаў пачатак еўрапейскай палітычнай інтэграцыі. Прадугледжвалася стварэнне **Еўрапейскага Саюзу (Еўрасаюзу, ЕС)**. У кампетэнцыю еўрапейскіх органаў увайшло вызначэнне прынцыпаў агульнай палітыкі ў галіне адукацыі, аховы здароўя, культуры, трансеўрапейскіх сетак камунікацый і абароны правоў спажыўцоў. Дзяржавы-ўдзельніцы ЕС узялі на сябе абавязак праводзіць супольную знешнюю палітыку і палітыку бяспекі. Былі пашыраны і ўзмоцнены паўнамоцтвы Еўрапарламенту і ўведзена грамадзянства ЕС. Назва «Еўрапейскі Саюз» замяніла назву «Еўрапейскія супольнасці». Адказнасць за грашова-крэдытную палітыку Еўрасаюзу ўскладалася на Еўрапейскую сістэму нацыянальных банкаў, у складзе Еўрапейскага цэнтральнага банку і нацыянальных цэнтральных банкаў дзяржаў ЕС. Наступствам Маастрыхцкіх пагадненняў стала стварэнне Еўрапейскага валютнага саюзу (ЕВС) і ўвядзенне у якасці еўрапейскай валюты еўра. 1 студзеня 1993 г. у адпаведнасці з Адзіным Еўрапейскім актам стаў дзейнічаць паўнавартасны Агульны Рынак, а 1 лістапада пасля ратыфікацыі краінамі ўдзельніцамі набылі моц Маастрыхцкія пагадненні. Гэткім чынам быў створаны адзіны рынак, што ахапіў амаль 4000 млн. чалавек. Магутны імпульс атрымала зрошчванне нацыянальных гаспадарак краін-членаў ЕС.

Заканчэнне «халоднай вайны» дало новы штуршок інтэграцыйным працэсам у Еўропе. З 1995 г. да ЕС далучыліся Аўстрыя, Фінляндыя і Швецыя. Еўрапейская інтэграцыя ўзяла новы рубеж – колькасць членаў Еўрасаюзу дасягнула 15. У тым жа годзе набыло моц Шэнгенскае пагадненне, заключанае яшчэ ў далёкім 1985 г. Гэта азначала з’яўленне празрыстых межаў у рамках ЕС, правядзенне адзінай візавай палітыкі і больш актыўнае супрацоўніцтва паліцыі краін-удзельніц.

У 1995 г. на паседжанні Еўрапейскай Рады ў Мадрыдзе было прынята рашэнне аб стварэнні Гаспадарчага і Валютнага Саюзу ЕС, што азначала пачатак паступовага пераходу на адзіную валюту – еўра. Праз два гады Амстэрдамскім дагаворам (1997) былі ўведзены больш жорсткія патрабаванні для ўваходжання ў валютны і эканамічны саюз, вызначаліся тэрміны ўвядзення адзінай еўрапейскай валюты – 1 студзеня 1999 г. Акрамя таго было ўведзена адзінае еўрапейскае грамадзянства, якое дапаўняла, але не скасоўвала інстытут нацыянальнага грамадзянства.

Мэтанакіраваная рэалізацыя гэтых рашэнняў дазволіла ў 1999 г. увесці адзіную валюту – еўра – для разліковых аперацый (пакуль толькі безнаяўных

плацяжоў). Праўда, да валютнага саюзу тады далучыліся толькі 11 краін. (Вялікабрытанія адмовілася ад удзелу ў ім, бо не жадала «здаваць» сваю ўласную валюту, Данія – з прычыны шэрагу чыста палітычных меркаванняў, Швецыя вырашыла прыглядзецца, як у еўра пойдуць справы, а Грэцыя як далёка не самая развітая краіна ЕС не здолела задаволіць патрабаванні да эканамічных умоў уваходжання ў валютны саюз.

З пачатку 2002 г. нацыянальныя валюты саступілі месца еўра: манеты і банкноты канчаткова ўвайшлі ў абарачэнне ў Аўстрыі, Бельгіі, Германіі, Ірландыі, Іспаніі, Італіі, Люксембургу, Нідэрландах, Партугаліі, Фінляндыі і Францыі. На пачатак 2011 г. у «зоне еўра» ужо налічваецца 17 краін. На адзіную еўрапейскую валюту з 2001 г. перайшла Грэцыя, з 2007 г. – Славенія, з 2008 г. – Кіпр і Мальта, з 2009 г. – Славакія, а з 2011 г. – Эстонія.

У 2003 г. ЕС даў згоду на сваё самае значнае пашырэнне ў гісторыі. З 1 мая 2004 г. да Адзінай Еўропы далучыліся ажно 10 краін – Венгрыя, Кіпр, Латвія, Літва, Мальта, Польшча, Славакія, Славенія, Чэхія і Эстонія. З 2007 г. у ЕС уступілі яшчэ дзве ўсходнееўрапейскія краіны – Балгарыя і Румынія.

У Еўрапейскім Саюзе здаўна няпростымі праблемамі з’яўляліся: вызначэнне глыбіні інтэграцыі (напрыклад, асцярожная пазіцыя Вялікабрытаніі ў пытаннях палітычнай інтэграцыі і ўвядзення адзінай еўрапейскай валюты); празмерная, на думку многіх, бюракратызацыя кіраўніцтва ЕС і карупцыя ў еўраўстановах; традыцыйныя эканамічныя супярэчнасці (напрыклад, барацьба за сельскагаспадарчыя, рыбалавецкія ды інш. квоты); недастатковая згуртаванасць, калі не сказаць кволасць і бязвольнасць, у вайсковай сферы (можна прыгадаць бездапаможнасць еўрапейскіх структур падчас Баснійскага і Косаўскага крызісаў) і г. д. З ледзьве не двухразовым пашырэннем ЕС узніклі і новыя цяжкасці. Узрастаюць супярэчнасці паміж заможнымі краінамі «старой» Еўропы і небагатымі / беднымі маладымі ўдзельнікамі Еўрапейскага Саюзу – першыя вымушаны «карміць» другіх. Пры гэтым адны лічаць, што празмерна, іншыя – недастаткова.

Доўгі час трывогу выклікала і рыхласць палітычнай арганізацыі Еўрасаюзу. Пытанне неабходнасці прынцыповых змен прынцыпаў кіравання і структуры кіруючых органаў ЕС паўстала ў 1990-х гг., калі ўзнікла відавочная перспектыва яго хуткага пашырэння. Прынцып кансенсусу, які выкарыстоўваўся пры прыняцці рашэнняў у Еўрасаюзе, быў адначасова і вельмі дэмакратычным, і вельмі эфектыўным пры яго аднароднасці і нешматлікасці арганізацыі. Мала, хто верыў у тое, што пасля прыёму 10 новых членаў, пераважна небагатых краін былога сацыялістычнага лагера, сістэма будзе настолькі ж добра працаваць. У 2001 г. пачалася праца над агульнаеўрапейскай канстытуцыяй.

**Канстытуцыя ЕС** была падрыхтаваная, і ў Рыме ў 2004 г. прадстаўнікі ўсіх 25 краін Адзінай Еўропы падпісалі яе. Аднак на стадыі ратыфікацыі

дакумент правалiўся. Пасля адмоўных вынiкаў рэферэндумаў у Францыi i Нiдэрландах ад агульнаеўрапейскай канстытуцыi вырашылi адмовiцца.

Правал Канстытуцыi ЕС стаў праявай узрастальных супярэчнасцяў па пытаннях будучага ЕС. Яе быў заклiканы замянiць **Лiсабонскi дагавор 2007 г.**, канчаткова ратыфiкаваны ў лiстападзе 2009 г. Дакумент прадугледжвае далейшае паглыбленне палiтычнай iнтэграцыi краiн-удзельнiц (напрыклад, увядзенне пастаяннай пасады Старшынi Еўрапейскай Рады («прэзiдэнта ЕС»), якую ў лiстападзе 2009 г. заняў прэм'ер-мiнiстр Бельгii Херман ван Рампёй), пашырэнне функцый ЕС у сферы абароны, аховы правоў чалавека i г. д.).

## Тэма 4. Вялiкабрытанiя ў 1945 – 1960-я гг.

### Сацыяльна-эканамiчныя i палiтычныя вынiкi Другой сусветнай вайны для Вялiкабрытанii. Прычыны эканамiчнага адставання ад iншых краiн Захаду. Устойлiвасць палiтычнай сiстэмы. Рэформы лейбарысцкага ўрада ў 1945 – 1951 гг.

Як i ўсе iншыя еўрапейскiя краiны (за выключэннем нейтральных), Вялiкабрытанiя выйшла з Другой сусветнай вайны аслабленай. Брытанская зямля не была тэатрам буйнамаштабных ваенных дзеянняў. З лiпеня па кастрычнiк 1940 г. ў небе вялася «Бiтва за Брытанiю», яе тэрыторыя зведала ўдары германскiх бамбардзiровак. Людскiя страты аказалiся параўнальна невялiкiмi: загiнула каля 93 тыс. чалавек цывiльнага насельнiцтва i 264 тыс. вайскоўцаў.

А вось матэрыяльныя страты былi значнымi. Вайна выклiкала дэстабiлiзацыю фiнансавай сiстэмы краiны. Вiной гэтаму ў значнай ступенi сталi аграмадныя вайсковыя выдаткi – каля £25 млрд. У тры разы вырасла запазычанасць дзяржавы, а знешнi доўг – у сем разоў. Упершыню з канца XVIII ст. Вялiкабрытанiя ператварылася з краiны-крэдытора ў краiну-даўжнiка. Моцна пацярпелi знешнегандлёвыя сувязi, асаблiва еўрапейскi i каланiяльны гандаль. Нягледзячы на iстотны рост вайсковага сектару, прамысловая вытворчасць у цэлым скарацiлася. Працягваўся застой ў працэсе абнаўлення сродкаў вытворчасцi. Вялiкабрытанiя трапляе ў моцную эканамiчную залежнасць ад Злучаных Штатаў.

З наблiжэннем перамогi над Германiяй падыходзiлi да заканчэння паўнамоцтвы кааліцыйнага ўраду. Яшчэ ў кастрычнiку 1944 г. прэм'ер-мiнiстр Вялiкабрытанii У. Чэрчыль паабяцаў, што адразу пасля заканчэння вайны ў Еўропе будуць праведзены новыя парламенцкiя выбары (апошнiя адбылiся яшчэ ў 1935 г.).

Як і паўсюдна ў Еўропе, у Вялікабрытаніі з сярэдзіны 1940-х гг. адбываецца моцны зрух улева – узрастае папулярнасць лейбарыстаў і нават, хаця і не ў гэткай ступені, камуністаў. У шэрагах Лейбарысцкай партыі на той час знаходзілася больш за 3 млн. членаў. Але ўнутрыпалітычная сітуацыя ў вельмі традыцыйнай і кансерватыўнай Вялікабрытаніі адрознівалася ад той, што склалася ў сярэднім па Еўропе, куды большай стабільнасцю і прадказальнасцю. Шчыра антысістэмныя і ваяўніча рэфармісцкія сілы знаходзіліся ў значнай колькаснай меншасці.

У вышэйшых палітычных колах Вялікабрытаніі некаторы час абмяркоўвалася ідэя працягу кааліцыйнага супрацоўніцтва асноўных палітычных партый. Правае крыло лейбарыстаў схілялася да захавання «ваеннага кабінету». Аднак на партыйнай канферэнцыі выразна выявілася агульнае палявенне настрояў і левае крыло разам з шараговымі членамі прагаласавала за прывядзенне да ўлады самастойнага лейбарысцкага ўраду.

У. Чэрчыль пагражаў неадкладнымі выбарамі, калі лейбарысты і лібералы не пагодзяцца на стварэнне кааліцыі. У траўні 1945 г. яго асабісты рэйтынг у брытанцаў складаў астранамічныя для дэмакратычнай краіны 83 %! Таму у інтарэсах У. Чэрчыля было правядзенне выбараў да таго, як яго яркі арэол пераможцы згасне. Лідар лейбарыстаў Клемент Этлі прапаноўваў адкласці іх правядзенне на кастрычнік. Але У. Чэрчыль настаяў на сваім. У канцы траўня 1945 г. прэм'ер-міністр склаў з сябе паўнамоцтвы, кабінет быў расфармаваны. Апошнім распараджэннем У. Чэрчыля было стварэнне пераходнага ўраду, куды ўвайшлі выключна правыя кансерватары. Выбары былі прызначаныя на 5 ліпеня 1945 г.

Лейбарыстам прыйшлося змірыцца. Яны выступілі з праграмай рэформ «**Тварам да будучыні**» (англ. *Let Us Face the Future*), якая прадугледжвала нацыяналізацыю шэрагу галін брытанскай эканомікі, карэнную рэарганізацыю сістэмы сацыяльнага страхавання, а таксама шырокае развіццё жыллёвага будаўніцтва. Былая каланіяльная імперыя мусіла пераўтварыцца ў сацыялістычную Садружнасць Вялікабрытаніі. Лейбарысцкая партыя заяўляла аб сваёй рашучасці пакласці канец пяці «вялікім ліхам»: нястачы, галечы, хваробам, непісьменнасці, беспрацоўю. Галоўнай мэтай лейбарыстаў з'яўлялася стварэнне «дзяржавы дабрабыту». У сферы знешняй палітыкі лейбарысты рабілі акцэнт на важнасці захавання на пасляваенны перыяд альянсу пераможных дзяржаў.

Кансерватары, галоўныя фаварыты, дапусцілі ў ходзе выбарчай кампаніі нямала памылак. Негатывісцкі стыль вядзення агітацыі, перадусім выпады ў адрас канкурэнтаў, асабліва лейбарыстаў, ужо прыносіў плён у 1924 і 1931 гг., але аказаўся занадта прамалінейным для 1945 г. Пазітыўная праграма перспектыўнага развіцця дзяржавы і грамадства практычна ад-

сутнічала. Галоўныя спадзяванні партыя ўскладала на асобу У. Чэрчыля, бясспрэчнага нацыянальнага лідара. Дрэнную службу кансерватарам саслужыў пераходны ўрад: грамадства, якое хацела перамен, убачыла ў ім магчымую пасляваенную перспектыву і сказала сваё рашучае «не».

Незаангажаваныя палітыкі і назіральнікі прадказвалі Кансерватыўнай партыі ўпэўненую перамогу. Разыходзіліся яны толькі ў тым, якой акажацца перавага партыі торы над асноўнымі канкурэнтамі. Але здарылася нечаканае. Ліпеньскія выбары прынеслі ашаламляльны поспех лейбарыстам. Яны заваявалі абсалютную большасць ў Палаце абшчын – 393 месцы (на 239 болей, чым у 1935 г.!). Кансерватары задаволіліся 197 мандатамі, а лібералы – толькі 12. У парламент былі абраныя нават 2 камуністы. Напрыканцы ліпеня быў сфарміраваны першы лейбарысцкі ўрад большасці, які ўзначаліў К. Этлі (1945 – 1951).

Для ажыццяўлення абяцаных лейбарыстамі рэформ быў абраны спрыяльны час. У першыя пасляваенныя гады брытанская эканоміка развівалася дастаткова хуткімі тэмпамі (асабліва ў параўнанні з «таптаннем на месцы» ў міжваенны перыяд). Напрыканцы 1947 г. краіна выйшла на свае даваенныя паказчыкі прамысловай вытворчасці. Да пачатку 1950-х гг. больш як на 50 % адносна 1937 г. узрастае брытанскі экспарт.

Росту брытанскай эканомікі садзейнічала палітыка істотнага пашырэння дзяржаўнага сектару. Яна з’яўлялася адным з краевугольных элементаў сацыяльна-эканамічнай праграмы лейбарыстаў. Ужо напрыканцы 1945 г. у дзяржаўныя рукі быў перададзены Англійскі банк. Напачатку 1946 г. была праведзена нацыяналізацыя вуглездабывальнай галіны, у сярэдзіне 1947 г. – чыгуначнага транспарту і электраэнергетыкі. Потым прыйшла чарга ўнутранага воднага транспарту, шэрагу авіякампаній, значнай долі радыё- і тэлекамунікацый.

Галіновы выбар ураду быў невыпадковым. Пад адзяржаўленне ў першую чаргу траплялі тыя галіны і прадпрыемствы, якія забяспечвалі нармальнае функцыянаванне ўсяго вытворчага комплексу краіны ў цэлым. Многія з іх здаўна заставаліся стратнымі, а некаторыя згубілі эфектыўнасць і інвестыцыйную прывабнасць за час вайны. Дзяржава брала на сябе адказнасць за падтрыманне аптымальных умоў для развіцця ўзнаўлення і сацыяльнай стабільнасці (ад паспяховасці функцыянавання гэтых галін залежаў дабрабыт многіх соцень тысяч працоўных, у тым ліку, гэткага іх «баявога атрада», як гарнякі).

Парламенцкая апазіцыя і прадпрымальніцкія колы Вялікабрытаніі адрэагавалі на нацыяналізацыю досыць спакойна. Яна ажыццяўлялася на аплатнай аснове, прычым, выкупныя сумы, як правіла, нават перавышалі рынкавы кошт набытых дзяржавай кампаніяў. Буйны бізнес атрымаў знач-

ную матэрыяльную выгоду не толькі ад гэтага. Пераход пад дзяржаўнае крыло стратных прадпрыемстваў ды інфраструктуры вызваліла бізнес ад часткі выдаткаў і сродкі для больш выгодных камерцыйных праектаў. Зусім іншая рэакцыя паследавала, калі ў 1948 г. гаворка зайшла пра нацыяналізацыю прадпрыемстваў чорнай металургіі, якія давалі каля 97 % чыгуна і сталі краіны. Адпаведны законапраект загруз у Палаце лордаў і быў прыняты толькі ў 1949 г., а пачатак яго дзеяння быў адкладзены да 1951 г.

Актыўнасць лейбарысцкага ўраду не абмяжоўвалася прамысловым сектарам. Дзеля вырашэння праблемы харчовай бяспекі (Вялікабрытанія вельмі моцна залежала ад харчовага імпарту і асабліва яўна гэта праявілася ў гады вайны) у 1947 г. лейбарысты прынялі чатырохгадовую праграму развіцця сельскай гаспадаркі, якая прадугледжвала фіксаванне мінімальных коштаў і выдачу субсідый фермерам за павышэнне ўрадлівасці палёў і прадукцыйнасці жывёлагадоўлі.

Другім важнейшым элементам лейбарысцкай праграмы стала ўзмацненне ролі дзяржавы ў рэгуляванні сацыяльных працэсаў. У 1946 г. была створана **Нацыянальная сістэма сацыяльнага забеспячэння**. Яе прызначэннем стала назапашванне сродкаў на выплаты дапамог па мацярынству, інваліднасці, старасці, на выпадак смерці, на бясплатную медыцынскую дапамогу для малазабяспечаных і г. д. Фінансаванне яе часткова забяспечвалася страхавымі выплатамі наймальнікаў і наёмных работнікаў, але ў асноўным за кошт падаткаў. Сістэма сацыяльнага страхавання ахапіла звыш 23 млн. чалавек. У тым жа годзе пачалося стварэнне асобнай **Нацыянальнай сістэмы аховы здароўя**. Упершыню ў брытанскай гісторыі ўводзіўся прынцып дзяржаўнай бясплатнай медыцынскай дапамогі насельніцтву. Хаця неўзабаве пачалі з'яўляцца новыя і новыя платныя паслугі, напрыклад, афтальмолагаў і дантыстаў, у цэлым даступнасць медыцынскай дапамогі была палепшана на парадак. Дзяржаўная сістэма аховы здароўя Вялікабрытаніі стала ці не найбольш перадавой у заходнім свеце. Абедзве гэтыя праграмы сталі рэалізоўвацца з 1948 г.

Вялікае значэнне для краіны, нямала жыхароў якой страцілі дах над галавой у час вайны, мела беспрэцэдэнтная па сваіх маштабах праграма жыллёвага будаўніцтва. Пэўныя паляпшэнні зазнала сістэма народнай адукацыі. Нарэшце, важным дасягненнем арганізаванага рабочага руху стала скасаванне ў 1946 г. закону аб прафсаюзах 1927 г. Важным крокам у справе паглыблення дэмакратызацыі палітычнай сістэмы Вялікабрытаніі стала **рэформа Палаты лордаў 1949 г.**: права верхняй палаты на «адтэрміноўваючае вета», блакіраванне законапраектаў, ухваленых Палатай абшчын, было абмежавана адным годам замест двух.

Ажыццяўленне гэтай грандыёзнай праграмы патрабавала значных асігнаванняў. А тым часам эканамічныя і фінансавыя праблемы краіны вырашаліся слаба. У сувязі з заканчэннем вайны з Японіяй Злучаныя Штаты спынілі пастаўкі па ленд-лізу. Рацыяніраванне прадуктаў харчавання ў 1945 – 1947 гг. стала яшчэ больш жорсткім, чым у гады вайны. Краіна была вымушана запрасіць у ЗША і Канады заем на суму $4,5 млрд., за якi прыйшлося аднавіць свабодны курс фунта і знізіць прэферэнцыйныя тарыфы. Ужо за год гэтыя грошы былі растрачаныя, а дэстабілізацыя фінансавай сферы пераадолена не была. У 1947 г. урад К. Этлі быў вымушаны ісці на дэвальвацыю фунта. Адначасова ўлады пайшлі на скарачэнне імпарту прадуктаў харчавання, што выклікала іх далейшае падаражанне.

Лейбарысцкі ўрад бачыў выйсце з гэтага няпростага становішча ў далучэнні краіны да плану Маршала. У ліпені 1948 г. было падпісана адпаведнае двухбаковае пагадненне з ЗША. У перыяд дзеяння гэтага плану Вялікабрытанія атрымала звыш $2,3 млрд. у выглядзе паставак і яшчэ $337 млн. у якасці заёмаў, што, безумоўна, аказала станоўчы эфект на эканоміку. З пачаткам у 1950 г. Карэйскай вайны за кошт паставак ваеннастратэгічнай сыравіны і размяшчэння часткі амерыканскіх заказаў на брытанскіх заводах эканамічнае становішча краіны палепшылася і Вялікабрытанія нават датэрмінова адмовілася ад дапамогі па плану Маршала. Аднак фінансавыя праблемы вырашаныя не былі – у 1949 і 1951 гг. урад ізноў праводзіў дэвальвацыю.

Фінансавы крызіс вельмі адмоўна адбіўся на папулярнасці лейбарыстаў. З-за недахопу сродкаў на рэалізацыю амбіцыйных, але шматлікіх і дарагіх сацыяльных праграм урад быў вымушаны замарозіць частку з іх. Гэта не толькі падрывала давер выбаршчыкаў да правячай партыі, але таксама выклікала нарастанне супярэчнасцяў унутры яе кіруючага ядра.

Гэтыя праблемы не маглі не адбіцца на выступленні правячай партыі на чарговых парламенцкіх выбарах у 1950 г. Лейбарысты здолелі захаваць лідарства ў Палаце абшчын (заваявана 315 мандатаў) і і права на фарміраванне ўраду. Аднак кансерватары ў ніжняй палаце ўжо маглі разлічваць на 297 галасоў. З улікам дэпутатаў, што прымыкалі да апазіцыі, атрымлівалася што большасць лейбарыстаў грунтавалася толькі на 6(!) галасах.

У настолькі няўстойлівай сітуацыі ўрад К. Этлі быў вымушаны ісці на новыя непапулярныя рашэнні з далейшым скарачэннем сацыяльных выдаткаў. У выніку раскол у лагеры лейбарыстаў дасягае самага высокага ўзроўню. Неўзабаве апасля адстаўкі міністра аховы здароўя і лідара левых лейбарыстаў Эньюрына Бівэна правячая партыя наважылася на правядзенне датэрміновых парламенцкіх выбараў. 25 кастрычніка 1951 г. перамогу святкавалі кансерватары – ім дастаўся 321 мандат супраць 295 – у лейбарыстаў.

### Праблемы эканамічнага развіцця ў 1950 – 1960-я гг. Унутраная палітыка кансерватыўных урадаў (1951 – 1964 гг.). Перамога на выбарах 1964 г. лейбарыстаў. Унутрыпалітычны курс Г. Вільсана. Пачатак Ольстэрскага канфлікту

1950-я гг. былі часам параўнальна павольнага (адносна кантынентальных дзяржаў Еўропы), але дастаткова стабільнага росту брытанскай эканомікі. За дзесяцігоддзе рост прамысловай вытворчасці склаў 18 %, прычым толькі ў 1952 г. было зафіксаванае яе падзенне (3 %), звязанае з сусветнай рэцэсіяй. Краіна ўтрымлівала 2-е месца ў эканоміцы капіталістычнага свету следам за ЗША, але доля Вялікабрытаніі ў сусветнай вытворчасці скарацілася з 12 да 10 %, і да яе сталі падбірацца больш паспяховыя канкурэнты, асабліва Заходняя Германія. Для эканамічнага развіцця краіны былі ўласцівы хранічны знешнегандлёвы дэфіцыт і непамерны рост вайсковых выдаткаў (14 млрд. фунтаў у 1950-х і каля 20 млрд. – у 1960-х гг.). Фінансавыя праблемы краіны былі звязаныя з пастаянным бюджэтным дэфіцытам і адтокам капіталаў за мяжу. Апошні таксама негатыўна ўплываў на ўнутраныя інвестыцыі і стрымліваў мадэрнізацыю брытанскай вытворчай базы. Дадатковыя складанасці для эканамічнага развіцця Вялікабрытаніі ствараў паступовы развал Брытанскай каланіяльнай імперыі. Найбольш паспяхова развіваліся навукаёмістыя навейшыя галіны прамысловасці – электраэнергетыка, машынабудаванне, хімічная прамысловасць.

У параўнанні з кантынентальнымі дзяржавамі Заходняй Еўропы павольна падвышаліся рэальныя даходы брытанцаў. Тым не менш, нельга не адзначыць пазітыўную тэндэнцыю да скарачэння беспрацоўя: у 1953 г. яго ўзровень складаў каля 500 тыс. чалавек, а ў 1955 г. – ўжо 298 тыс. Значнае зніжэнне нараджальнасці на працягу апошніх дзесяцігоддзяў, дэмаграфічныя наступствы вайны, натуральнае старэнне насельніцтва абумоўлівалі недахоп працоўнай сілы. Гэта падштурхнула ўлады да пачатку палітыкі заахвочвання працоўнай іміграцыі. У Вялікабрытанію ахвотна ехалі з Вест-Індыі, Індыі і Пакістану, краін афрыканскага кантыненту. Хаця ўжо напачатку 1960-х гг. змена сітуацыі на працоўным рынку прадыктавала неабходнасць правядзення больш суровай іміграцыйнай палітыкі, практыка ўз’яднання сем’яў і высокі ўзровень нараджальнасці сярод новых брытанцаў пачалі з кожным годам моцна змяняць расавае, нацыянальнае і канфесійнае аблічча гарадоў Злучанага Каралеўства.

У 1960-х гг. назіраецца падзенне асноўных эканамічных паказчыкаў Вялікабрытаніі. За дзесяцігоддзе сярэднегадавы прырост валавога нацыянальнага прадукту складаў толькі 2,9 % (у Японіі – 11 %, у Францыі – 5,8 %, ФРГ – 4,8 %). Адбывалася далейшае скарачэнне долі краіны ў капіталістычнай вытворчасці: з 8,3 % – у 1960 г. да 7,2 % – у 1965 г. Падобная тэндэнцыя назіралася і ў дачыненні брытанскай долі ў сусветным экспарце – яна ўпала да 8,9 % (1970). Нягледзячы на адчувальныя поспехі пасляваенных дзесяцігоддзяў, прамысловасць

Вялікабрытаніі значна саступала амерыканскай, заходнегерманскай і японскай па ўзроўні спецыялізацыі, тэхналагічнага аснашчэння і апярэджвала па сабекошце тавараў. Былыя лідары брытанскай эканомікі – каланіяльна-сыравінныя манаполіі – імкліва гублялі свае пазіцыі. Напрыканцы 1960-х г. Вялікабрытанія была адсунутая з пазіцыі другой прамысловай дзяржавы капіталістычнага свету на чацвёртую. Яе апярэджвалі не толькі ЗША, а ўжо і ФРГ, і Японія. Эканамічныя і фінансавыя праблемы краіны паглыбляліся высокім узроўнем інфляцыяй.

З другой паловы 1960-х гг. абазначыўся пачатак пераарыентацыі Вялікабрытаніі ў знешнім гандлі. Гэта было звязана з глабальнымі сацыяльна-эканамічнымі працэсамі, перадусім, – з распадам каланіяльнай сістэмы. Калі ў 1950 г. на краіны Брытанскай Садружнасці прыпадала каля 40 % знешнегандлёвага звароту Вялікабрытаніі, то ў 1970 г. – толькі 23 %. У дачыненні Заходняй Еўропы назіралася адваротная тэндэнцыя – у той жа перыяд адбыўся рост з 23 да 41 %. Вялікі інтарэс да заходнееўрапейскіх рынкаў быў таксама звязаны з пачаткам інтэграцыйных працэсаў на кантыненце.

Перамога кансерватараў на датэрміновых парламенцкіх выбарах 1951 г. адкрыла новую эру ва ўнутрыпалітычным жыцці Вялікабрытаніі. Торы заставаліся ўрадавай партыяй на працягу 13 гадоў (1951 – 1964 гг.). За гэты час пры ўладзе змянілася чатыры ўрады – Уінстана Чэрчыля (1951 – 1955), Энтані Ідэна (1955 – 1957), Гаральда Макмілана (1957 – 1963) і Алека Дугласа-Х'юма (Дугласа-Хоўма) (1963 – 1964).

Другі ўрад пад кіраўніцтвам У. Чэрчыля збольшага склалі прадстаўнікі «старой гвардыі». Тым не менш, нягледзячы на крытыку лейбарысцкіх рэформ, новы кабінет адмовіўся ад рашучага перагляду заканадаўства першых пасляваенных гадоў. У духу лозунга «цярпімасць і канструктыўнасць» У. Чэрчыль нават не пайшоў на змены сацыяльнай палітыкі. Адным з асноўных накірункаў дзейнасці ўраду стала далейшае вырашэнне жыллёвай праблемы. Прычым, у адрозненне ад лейбарыстаў, кансерватары надавалі значэнне не толькі павелічэнню жыллёвага фонду і забеспячэнню яго даступнасці, але таксама прыярытэтнаму развіццю прыватнаўласніцкага сектара. Не зазнала істотных змен палітыка ўраду ў галіне аховы здароўя і адукацыі. Згодна са сваімі перадвыбарчымі абяцаннямі кансерватары ажыццявілі частковую дэнацыяналізацыю: у прыватныя рукі былі перададзены сталеліцейная галіна і аўтадарожны транспарт.

У той жа час урад пазбягаў актывізацыі дзяржаўнага рэгулявання эканомікі і адмовіўся ад выпрацоўкі абноўленай стратэгіі развіцця вытворчасці. Унутрыпалітычная, асабліва сацыяльна-эканамічная праблематыка зусім мала займала У. Чэрчыля. Яшчэ з часоў Другой сусветнай прыярытэтнай сферай яго інтарэсаў была знешняя палітыка. Акрамя таго, не маглі не браць сваё гады – у лістападзе 1954 г. У. Чэрчылю споўнілася 80 гадоў! Пераемнікі «вялікага прэм'ера» таксама не здолелі ў поўнай меры выкарыстаць палітычны, фінансавы,

інтэлектуальны патэнцыял дзяржавы для максімальнага спрыяння навукова-тэхнічнаму прагрэсу. Пасіўнасць кансерватараў у галіне дзяржаўнага рэгулявання эканомікі дазволіла іх крытыкам заяўляць аб 13 гадах «перыяду застою», «змарнаваных гадах».

У красавіку 1955 г. У. Чэрчыля ўсё ж пераканалі сысці ў адстаўку і яго месца заняў даўні прэтэндэнт на партыйнае лідарства, «прагрэсіўны кансерватар» Энтані Ідэн (1955 – 1957). Ужо ў наступным месяцы новы лідар прывёў торы да перамогі на парламенцкіх выбарах. Кансерватары заваявалі на 24 месцы болей, чым чатырма гадамі раней (мелі ўсяго 345 мандатаў). Прэм'ерства Э. Ідэна атрымалася непрацяглым і ў цэлым няўдалым. Суэцкі крызіс, агрэсія супраць Егіпта і яе поўны правал вымусілі яго зысці з палітычнай арэны, хаця і з фармулёўкай «па стану здароўя». Новым прэм'ер-міністрам стаў яшчэ адзін «памяркоўны» Гаральд Макмілан (1957 – 1963).

Эканамічнае ажыўленне, праблемы Лейбарысцкай партыі і паляпшэнне міжнароднай абстаноўкі напрыканцы 1950-х гг. стваралі для партыі торы ідэальную сітуацыю для правядзення датэрміновых выбараў. Пазітыўную ролю для кансерватараў павінна была адыграць рэформа Палаты лордаў 1958 г.: з'явіўся тытул пажыццёвага пэра, якім пра прадстаўленню прэм'ер-міністра і па загаду манарха ўдастойваліся асабліва заслужаныя грамадзяне краіны. У кастрычніку 1959 г. кансерватары ўмацавалі сваю большасць у Палаце абшчын, заваяваўшы 365 мандатаў (лейбарысты толькі 258), а Г. Макмілан захаваў за сабой прэм'ерскае крэсла.

Кансерватыўныя кабінеты і далей не ўносілі прынцыповых змен у створаную пры лейбарыстах сістэму дзяржаўнага рэгулявання эканомікі. Праз дзяржаўны бюджэт і бюджэты мясцовых органаў улады урад пераразмяркоўваў больш за палову валавога нацыянальнага прадукту краіны. А ў 1962 г. была нават створана **Нацыянальная рада эканамічнага развіцця (НРЭР)**. НРЭР з'яўлялася паўурадавай арганізацыяй для распрацоўкі планаў збалансаванага і паскоранага росту эканомікі, хаця яе рэкамендацыі насілі не абавязковы, а рэкамендацыйны (індыкатыўны) характары. Па сутнасці яна стала вышэйшым органам трохбаковага супрацоўніцтва дзяржавы, бізнесу і трэд-юніёнаў.

Напачатку 1960-х гг. сітуацыя ўнутры краіны і звонку стала змяняцца да горшага. Запаволілася эканамічнае развіццё, ударыла па аўтарытэце ўраду няўдалая спроба далучэння да ЕЭС. А самае галоўнае, грамадства стамілася ад панавання кансерватараў. Крытыку грамадства выклікалі не толькі палітычныя аспекты дзейнасці партыі торы, але таксама маральнае аблічча прадстаўнікоў кансерватыўнай эліты. Асаблівы ўдар па рэпутацыі ўраду нанесла «справа Праф'юма». Міністр абароны Джон Праф'юма быў абвінавачаны ў сувязі з маладой асобай, блізкай таксама з ваенна-марскім аташэ савецкага пасольства. Маг-

чымая пагроза нацыянальнай бяспецы і хлуслівыя апраўданні міністра ў парламенце каштавалі Дж. Праф'юму пасады. Г. Макмілан быў вымушаны зысці, хаця афіцыйная версія тлумачыла яго рашэнне пагаршэннем стану здароўя.

Новым прэм'ер-міністрам стаў Алек Дуглас-Х'юм. Яго шлях да лідарства ў кансерватыўнай партыі адбываўся пры незвычайных абставінах. Па-першае, ён быў членам Палаты лордаў і як лорд не валодаў правам доступу ў Палату абшчын, а значыць і не меў аніякіх шанцаў стаць галавой ураду. Сітуацыя для яго змянілася да лепшага толькі дзякуючы адной з апошніх заканадаўчых ініцыятыў Г. Макмілана – Акту аб пэрах 1963 г. – спадчынным пэрам было дазволена адмаўляцца ад свайго тытулу. Па-другое, традыцыі торы ніколі не прадугледжвалі дэмакратычнай працэдуры абрання лідара партыі кансерватараў. У 1963 г. ўпершыню было праведзена апытанне членаў кансерватыўнай фракцыі Палаты абшчын. Хаця кандыдатура былога лорда не сустрэла вялікага энтузіязму, і вырашальную ролю ў прызначэнні А. Дугласа-Х'юма адыграў выбар Г. Макмілана, новыя павевы бясспрэчна сведчылі пра дэмакратызацыю кансерватыўнай партыі.

На кастрычніцкіх выбарах 1964 г. лейбарысты адсвяткавалі перамогу, заваяваўшы 317 з 630 мандатаў. Пяты лейбарысцкі кабінет узначаліў Гаральд Вільсан (1964 – 1970). Напярэдадні выбараў лейбарысты абяцалі ажыццяўленне новых сацыяльна-эканамічных рэформ, у тым ліку нацыяналізацыю сталеліцейнай прамысловасці, змяншэнне коштаў на зямлю, аднаўленне ўрадавага кантролю над кватэрнай платай, правядзенне некаторых мерапрыемстваў у галіне культуры, навукі, аховы здароўя і пенсійнага забеспячэння.

Напачатку ўрад сапраўды імкнуўся дзейнічаць у гэтым рэчышчы. Сярод першых рашэнняў новага ўраду былі: скасаванне платы за выпіску рэцэптаў, стрымліванне росту арэнднай платы за жыллё, падвышэнне пенсій па старасці. Пачалося буйнамаштабнае будаўніцтва муніцыпальнага жылля. Бюджэт на 1965 г. прадугледжваў далейшае павелічэнне сацыяльных выплат. Урад Г. Вільсана таксама паспрабаваў увесці элементы планавання эканомікі – ў 1965 г. быў прыняты **«Нацыянальны эканамічны план»**.

Скарыстаўшыся спрыяльнай эканамічнай абстаноўкай і ў цэлым пазітыўнай ацэнкай значнай часткі грамадства зробленага партыяй і запланаванага на перспектыву, лейбарысты пайшлі на датэрміновыя парламенцкія выбары. У сакавіку 1966 г. яны здолелі ўмацаваць сваё палітычнае становішча, заваяваўшы на 47 дэпутацкіх месцаў болей, чым дзвюма гадамі раней (стала 364 мандаты).

Эканамічныя і фінансавыя праблемы дыктавалі ўраду Г. Вільсана правядзенне больш узважанага курсу. Таму лейбарысты пайшлі на цэлы шэраг непапулярных рашэнняў. У 1966 г., напрыклад, быў праведзены закон аб цэнах і даходах, які прадугледжваў замарожванне заробкаў рабо-

чых і служачых. Каб стрымаць незадаволенасць і актыўнасць рабочага руху, у 1969 г. урад нават паспрабаваў правесці праз парламент законапраект «Замест разладу», закліканы абмежаваць права на забастоўку. Прапанова выклікала вастрэйшыя дыскусіі ў грамадстве і ў самой правячай партыі, а таму законапраект быў адкліканы. Як адзін з важнейшых сродкаў паляпшэння плацежнага балансу краіны, разглядалася актывізацыя экспарту. Аднак паўторная спроба далучыцца да «Агульнага рынку», зробленая ў 1967 г., сутыкнулася з вета Францыі. Новы віток араба-ізраільскага канфлікту («Шасцідзённая вайна» 1967 г.) і часовае закрыццё Суэцкага каналу адмоўна адбілася на брытанскім знешнім гандлі.

У гэтых умовах дзеля падтрымання канкурэнтаздольнасці айчынных вытворцаў на сусветных рынках урад ажыццявіў дэвальвацыю фунта стэрлінгаў, але яна адначасова ўдарыла па дабрабыту насельніцтва. Для вырашэння фінансавых праблем лейбарыстам таксама прыйшлося ісці на падвышэнне існаваўшых падаткаў і нават уводзіць дадатковыя.

Кіруючыся аб’ектыўнымі нацыянальнымі эканамічнымі інтарэсамі, урад лейбарыстаў заахвочваў канцэнтрацыю банкаўскага і прамысловага капіталу. У выніку, напрыканцы 1960-х гг. 8 брытанскіх прыватных кампаній уваходзілі ў лік 20 буйнейшых у Заходняй Еўропе. Вялікабрытанія утрымлівала першую пазіцыю ў Еўропе па ўзроўні канцэнтрацыі вытворчасці. Асабліва высокія яе паказчыкі назіраліся ў ваенна-прамысловым комплексе, новых відах вытворчасці, шэрагу галін апрацоўваючай прамысловасці, экспартна-арыентаваных галінах.

Нягледзячы на слабую асабістую ўвагу прэм’ер-міністра, урад ініцыяваў правядзенне праз парламент некаторых законапраектаў, якія былі скіраваныя на далейшую лібералізацыю брытанскага грамадства. Пачалося заканадаўчае абмежаванне выкарыстання смяротнай кары, дэкрымiналізацыя (скасаванне крымінальнай адказнасці) гомасексуалізму, лібералізацыя заканадаўства адносна абортаў, спрашчэнне працэдуры разводу і г. д.

Відавочнае запавольванне тэмпаў эканамічнага развіцця краіны і нарастанне сацыяльна-эканамічных, нацыянальных, расавых супярэчнасцяў у грамадстве напрыканцы 1960-х гг. знайшло сваё найбольш поўнае ўвасабленне ў абвастрэнні грамадска-палітычнай сітуацыі ў Паўночнай Ірландыі. Пасля фактычнага адасаблення большай часткі Ірландыі ад мітраполіі ў 1921 г. у складзе Злучанага Каралеўства засталіся толькі шэсць паўночна-ўсходніх графстваў вострава. Паўночная Ірландыя, г. зв. Ольстэр (ад назвы адной з чатырох гістарычных правінцый Ірландыі), карысталася абмежаваным самакіраваннем і мела ўласны парламент – Стормант. Панавала ў Ольстэры пратэстанцкая Юніяніcцкая партыя, якая прадстаўляла, галоўным чынам, нашчадкаў англійскіх і шатландскіх каланізатараў і выступала за захаванне англа-ірландскай уніі 1800 г. Каталіцкая

меншасць была фактычна бяспраўная і з'яўлялася аб'ектам дыскрымінацыі па рэлігійнай прыкмеце.

У 1967 г. была створана Паўночнаірландская асацыяцыя барацьбы за грамадзянскія правы. Восенню адна з арганізаваных ёй мірных дэманстрацый была разагнана паліцыяй і пры гэтым пацярпела 77 чалавек. Гэта паслужыла магутным штуршком для разрастання рэлігійна-этнічных супярэчнасцяў у краі. З абодвух бакоў разгарнулі дзейнасць радыкальныя і тэрарыстычныя сілы. Найбольш актыўнай пратэстанцкай групоўкай быў «Ордэн аранжыстаў», а каталіцкай – часовая Ірландская рэспубліканская армія (ІРА). У жніўні 1969 г. урад Г. Вільсана ўвёў у Паўночную Ірландыю рэгулярныя брытанскія войскі. Гэтак пачаўся **Ольстэрскі (Паўночнаірландскі) канфлікт**, які расцягнуўся на некалькі дзесяцігоддзяў.

Да парламенцкіх выбараў 1970 г. лейбарысцкі ўрад падышоў з трывожнымі сімптомамі ў эканоміцы, стратай даверу часткі сваіх традыцыйных выбаршчыкаў, непрадказальнасцю падзей ў Паўночнай Ірландыі і шэрагам няўдач у знешняй палітыцы. Таму іх вынікі не абяцалі правячай партыі нічога добрага. Сапраўды, лейбарыстам не дапамагла нават чарговая выбарчая рэформа, што прадугледжвала зніжэнне ўзроставага цэнзу да 18 гадоў. Кансерватары здабылі ўпэўненую перамогу і атрымалі трывалую большасць у Палаце абшчын (заваявалі 330 дэпутацкіх мандатаў). Новым прэм'ер-міністрам стаў лідар кансерватараў Эдвард Хіт (1970 – 1974).

### Знешняя палітыка Вялікабрытаніі ў 1945 – 1960-я гг. Крызіс і распад Брытанскай каланіяльнай імперыі. Пераўтварэнне імперыі ў Брытанскую Садружнасць нацый

Насуперак перадвыбарным абяцанням лейбарыстаў працягнуць сяброўскае супрацоўніцтва з СССР, ў Вялікабрытаніі хутка перамагла логіка непрымірымай барацьбы і канфрантацыі з даўнім ідэалагічным праціўнікам. Стратэгічныя нацыянальныя інтарэсы дзяржавы, якая пазіцыянавала сябе як аплот свабоднага свету і дэмакратыі, дыктавалі кардынальны перагляд знешнепалітычных прыярытэтаў, прадыктаваных падчас вайны тактычнымі меркаваннямі.

Фултанская прамова У. Чэрчыля выклікала неадназначную рэакцыю брытанскага грамадства і парламента. Тым не менш, знешнепалітычны курс лейбарысцкага ўраду стаў вызначаць як раз дух «халоднай вайны». Яго ідэйным падмуркам сталі прынцыпы **«атлантычнай салідарнасці»** дзеля абароны каштоўнасцяў і ўмацавання адзінства Заходняй цывілізацыі, а таксама **«асаблівых адносін»** са Злучанымі Штатамі Амерыкі – заакіянскі саюзнік лічыўся асноватворнай сілай пасляваеннай светабудовы, а таму прызнаваўся старэйшым партнёрам. Брытанцам нават прышлося ціха змірыцца з тым, што насуперак абяцанням і нягледзячы на непасрэдны ўдзел

іх навукоўцаў у рэалізацыі Манхэтанскага праекту (стварэнне ядзернай зброі), амерыканцы адмовіліся дзяліцца з імі сваімі ядзернымі сакрэтамі. У 1946 г. Вялікабрытанія запусціла ўласную праграму стварэння атамнай бомбы.

Вялікабрытанія разам са Злучанымі Штатамі стаяла ля вытокаў стварэння НАТО (1949) і стала іх важнейшым саюзнікам у гэтай арганізацыі. Удзел Вялікабрытаніі ў Карэйскай вайне, праўда, негатыўна адбіўся на эканамічным становішчы краіны і падарваў пазіцыі правячай лейбарысцкай партыі (узважаная палітычная лінія К. Этлі не падабалася ні пацыфістам, ні прыхільнікам рашучых дзеянняў).

У духу «Цюрыхскай прамовы» У. Чэрчыля Вялікабрытанія ўключылася ў еўрапейскія інтэграцыйныя працэсы: далучылася да Брусельскага пакту аб стварэнні Заходняга саюзу (1948) і уступіла ў Раду Еўропы (1949). Тым не менш, у далейшым лейбарысцкі ўрад паступова дыстанцыяваўся ад абмеркавання планаў эканамічнай інтэграцыі і аддаў перавагу захавання шчыльных адносін з краінамі Брытанскай Садружнасці нацый.

Перамога ў Другой сусветнай вайне антыгітлераўскай кааліцыі, якая выступала пад дэмакратычнымі лозунгамі, паспрыяла стварэнню ўмоў для ўздыму нацыянальна-вызваленчага руху народаў калоній. Непасрэдны ўдзел у выгнанні чужаземных захопнікаў (перадусім, японскіх) дазволіла ім здабыць каштоўны вопыт узброенай і палітычнай барацьбы, атрымаць узброеныя арміі і неабходнае кадравае забеспячэнне, спрыяў росту нацыянальнай самасвядомасці.

Рух за свабоду заняволеных народаў не мог не закрануць і Брытанскую імперыю. Лондан быў вымушаны прызнаць далейшую немагчымасць падтрымліваць сваё панаванне над Індыяй. У 1947 г. гэтая «перліна» брытанскай кароны атрымала незалежнасць, праўда, распаўшыся пры гэтым на дзве асобныя часткі – пераважна індуісцкую Індыю і мусульманскі Пакістан.

З 1947 г. у афіцыйных дакументах лейбарысцкага ўраду тэрмін «Брытанская імперыя» быў заменены тэрмінам **«Брытанская Садружнасць нацый»**, а замест слова «дамініён» стала выкарыстоўвацца паняцце «член Садружнасці». У красавіку 1949 г. канферэнцыя прэм’ер-міністраў краін Садружнасці скасавала формулу Вестмінстэрскага статуту 1931 г. аб «адданасці кароне», што раней аб’ядноўвала яго ўдзельнікаў, і прызнала манарха «сімвалам свабоднай асацыяцыі незалежных нацый».

У 1948 г. незалежнасць была дадзена Цэйлону (зараз Шры-Ланка) і Бірме. Індыя, Пакістан і Цэйлон добраахвотна засталіся ў Брытанскай садружнасці. Тым не менш, рэалізаваць цалкам мірны і палюбоўны дэмантаж брытанскай каланіяльнай сістэмы аказалася прынцыпова нерэальнай задачай. Брытанскім урадам прыйшлося тут і там сутыкацца з магутнымі выбухамі нацыянальна-вызваленчага руху.

Перамены на нацыянальным палітычным алімпе пачатку 1950-х гг. не ўнеслі прынцыповых паправак курсу Вялікабрытаніі на міжнароднай арэне. Кансерватарамі была сфармуляваная знешнепалітычная канцэпцыя **«трох колаў»**, якая мусіла прыстасаваць глабальныя прэтэнзіі дзяржавы да рэалій пасляваеннага парадку. Згодна з яе палажэннямі брытанская знешняя палітыка павінна будавацца ў межах трох асноўных зон адказнасці («колаў») – атлантычнай супольнасці (англасаксонскі свет на чале з ЗША і Вялікабрытаніяй), Еўропы і Брытанскай Садружнасці нацый.

Вялікабрытанія неаднойчы даказвала свой уплыў і ў іншых справах. Кансерватыўны ўрад на чале з аўтарытэтным у свеце лідарам У. Чэрчылям і брытанская дыпламатыя адыгралі прыкметную ролю ва ўрэгуляванні карэйскага канфлікту ды індакітайскай праблемы, знайшлі кампраміс з іранскімі ўладамі, якія ў 1951 г. ажыццявілі нацыяналізацыю сваёй нафтавай прамысловасці. У 1955 г. пачалося стварэнне Арганізацыі цэнтральнага дагавору (СЕНТО) або Багдадскага пакту, куды апрача Вялікабрытаніі ўвайшлі Турцыя, Ірак, Іран і Пакістан.

У 1952 г. была паспяхова выканана праграма ядзернага ўзбраення Вялікабрытаніі – у кастрычніку гэтага году адбылося выпрабаванне брытанскай атамнай бомбы ў Ціхім акіяне да поўначы ад Аўстраліі. З 1954 г. была распачата работа па стварэнню ўласнай вадароднай бомбы, і ў 1957 г. яна завяршылася серыяй тэрмаядзерных выпрабаванняў. Нягледзячы на тое, што Вялікабрытанія стала ядзернай дзяржавай, у 1958 г. ўрад торы заключыў са Злучанымі Штатамі пагадненне аб размяшчэнні на брытанскіх астравах амерыканскіх ракетных сіл.

Здараліся і няўдачы. Адным з самых балючых палітычных паражэнняў Вялікабрытаніі ў пасляваенныя дзесяцігоддзі стаў Суэцкі крызіс. У ліпені 1956 г. Егіпет нацыяналізаваў Суэцкі канал, што наносіла непасрэдныя страты эканамічным інтарэсам Вялікабрытаніі. Праз гэты канал праходзіла не менш за чвэрць яе экспарту і імпарту, а таксама каля 40 % нафты, што здабывалася брытанцамі на Блізкім Усходзе. Сумесная з Францыяй ды Ізраілем агрэсія Вялікабрытаніі пацярпела поўны палітычны крах. СССР выступіў з рашучым асуджэннем вылазкі «неакаланіялістаў і сіяністаў» і прыгразіў выкарыстаннем ядзернай зброі. Паколькі амерыканская адміністрацыя Д. Эйзенхаўэра не была зацікаўленая ў эскалацыі канфлікту і, самае галоўнае, не бачыла ў рэгіёне прамых пагроз амерыканскім нацыянальным інтарэсам, Лондану і Парыжу прыйшлося прызнаць *status quo*.

Пачатак у Заходняй Еўропе інтэграцыйных працэсаў не пакінуў абыякавай і Вялікабрытанію. Спачатку брытанцы не верылі ў перспектывы «Агульнага рынку» у Еўропе. Выступаючы ў Палаце абшчын у кастрычніку 1956 г., тады яшчэ міністр фінансаў Г Макмілан заявіў: «*...Што б мы ні думалі з нагоды гэтай праблемы, мы, я мяркую, аднадушныя ў пера-*

*кананні, што для Злучанага Каралеўства няма аніякага сэнсу ўступаць у гэткі мытны саюз... Я не думаю, што Палата абшчын калі-небудзь пагадзіцца з планамі нашага ўступлення ў «Агульны рынак»*.

Потым Вялікабрытанія імкнулася супрацьпаставіць еўрапейскім супольнасцям уласны інтэграцыйны праект – Еўрапейскую асацыяцыю свабоднага гандлю. Тым не менш, створаная арганізацыя не здолела забяспечыць найбольш спрыяльныя ўмовы для брытанскіх тавараў. Гэта, а таксама аб'ектыўны інтарэс Вялікабрытаніі да рынку ЕЭС абумовілі змену брытанскай пазіцыі. Ужо ў 1961 г. брытанскі ўрад упершыню заявіў аб намеры Вялікабрытаніі далучыцца да ЕЭС. Аднак Францыя ад самога пачатку разглядала свайго паўночнага суседа толькі як «траянскага каня» Злучаных Штатаў, і таму рэалізацыі гэтых планаў прыйшлося чакаць больш за дзесяць гадоў.

У 1950-х гг. працэс распаду брытанскай каланіяльнай імперыі набывае неабарачальны характар. Гэта былі вымушаныя прызнаць і брытанскія ўлады. Упершыню гэта было зроблена адкрыта ў 1960 г. падчас афрыканскага турнэ Г. Макмілана. У прамове, вядомай пад назвай «**Вецер перамен»**, брытанскі прэм'ер падкрэсліў: *«Вецер перамен дзьме на прасторах гэтага [афрыканскага] кантыненту і, падабаецца нам тое ці не, рост нацыянальнай самасвядомасці ёсць палітычны факт. Мы павінны прыняць яго як факт і палітыка нашай дзяржавы мусіць лічыцца з гэтым»*. Некалькі пазней брытанскі ўрад абвясціў аб намеры праводзіць у дачыненні афрыканскіх краін палітыку «плаўнага і ліберальнага прагрэсу», што азначала паступовы сыход Вялікабрытаніі з Усходняй і Цэнтральнай Афрыкі. Падобная пазіцыя не ў апошнюю чаргу тлумачылася (гэта рабіў і Г. Макмілан у сваёй прамове) блокавым супрацьстаяннем з Савецкім Саюзам. Брытанскія ўлады ўсведамлялі прынцыповую важнасць захаванне Афрыкі ў лагеры заходняга «вольнага свету».

З вяртаннем лейбарыстаў да ўлады знешнепалітычны курс краіны не зазнаў кардынальных змен. Па-ранейшаму яе сутнасць вызначалася «асаблівымі адносінамі» з ЗША. Хаця брытанскія вайскоўцы і не ўзялі непасрэднага ўдзелу ў амерыканскай агрэсіі супраць В'етнаму, Вялікабрытанія аказала свайму «старэйшаму партнёру» поўную палітычную падтрымку.

## Тэма 5. Вялікабрытанія ў 1970-я - 1980-я гг.

### Крызісы 1974 – 1975 і 1979 – 1981 гг., іх наступствы. Сацыяльна-эканамічная палітыка кансерватараў і лейбарыстаў у 1970-я гг.

Напачатку 1970-х гг. эканамічныя паказчыкі Вялікабрытаніі працягвалі зніжацца. У 1972 г. яе доля ў сусветнай капіталістычнай вытворчасці ўпала да 5,8 %, а доля ў сусветным гандлі – да 6,6 %. Нягледзячы на абвяшчэнне ў тым жа годзе «антыінфляцыйнай праграмы», працягвала падаць

вартасць фунта. Паглыбленне грашова-фінансавых праблем напачатку 1973 г. прывяло да скарачэння золатавалютных рэзерваў амаль на 1 млрд. фунтаў.

Вырашэнню гэтых складаных праблем павінна было паспрыяць рашэнне ўраду Эдварда Хіта (1970 – 1974) аб уступленні ў «Агульны рынак». Гэтым разам заяўка Вялікабрытаніі была задаволена і з пачатку 1973 г. яна стала паўнапраўным членам Еўрапейскіх Супольнасцяў. Для ўступлення ў ЕЭС Вялікабрытаніі прыйшлося пайсці на цэлы шэраг значных саступак. Гэтак, пераходны перыяд для прамысловасці быў разлічаны на 4,5 гады, а для сельскай гаспадаркі – 5 гадоў. Існаваўшыя пошліны на прамысловыя тавары ў гандлі з шасцю краінамі-заснавальніцамі ЕЭС скасоўваліся паэтапна. Вялікабрытаніі прыйшлося змірыцца з новымі больш высокімі коштамі на сельгаспрадукцыю і пераглядаць свае гандлёвыя адносіны з краінамі Брытанскай Садружнасці нацый. Акрамя таго, Лондан згадзіўся з патрабаваннем адмовіцца ад фунта як рэзервовай валюты (г. зн. агульнапрызнанай ў свеце валюты, якая назапашваецца цэнтральнымі банкамі ў валютных рэзервах).

У 1974 г. у Вялікабрытаніі, як і ў іншых краінах капіталістычнага свету выбухнуў, самы магутны за ўвесь пасляваенны час эканамічны крызіс. Прамысловая вытворчасць за 1974 – 1975 гг. скарацілася на 10 %, а беспрацоўе за той жа перыяд узрасло ўдвая – да 1,4 млн. чалавек. Аграмадных маштабаў дасягнула інфляцыя: у 1974 г. рознічныя цэны ўзняліся на 19 %, а ў 1975 г. – ужо на 24 %! Дадатковыя цяжкасці для нацыянальнай эканомікі складалі паліўна-энергетычныя праблемы. Рост коштаў на нафту меў катастрафічныя наступствы. Вялікабрытанія з'яўлялася адным з буйнейшых імпарцёраў арабскай нафты. Хаця краіна валодала вялікімі запасамі вугалю, а на мяжы 1960 – 1970-х гг. былі разведаны буйныя залежы ўласнага «чорнага золата» і прыроднага газу на брытанскай частцы шэльфу Паўночнага мора, значэнне вугалю для эканомікі пастаянна падала, а здабыча сваёй нафты пачалася толькі ў 1975 г. і не магла выйсці на сур'ёзныя аб'ёмы.

У лютым 1974 г. адбыліся датэрміновыя парламенцкія выбары. Ужо адчуваўся подых крызісу, але асноўныя палітычныя партыі не здолелі прапанаваць выбаршчыкам дзейсных механізмаў паляпшэння эканамічнай сітуацыі. Брытанцы адказалі пратэстным галасаваннем. Кансерватары і лейбарысты сабралі адпаведна толькі 37,9 % і 37,2 % галасоў, страціўшы на дваіх за чатырохгадовы тэрмін 14,4 %! Упершыню з 1929 г. дзве вядучыя партыі не дацягнулі да паказчыка ў 80 %. І наадварот, утрая больш галасоў, чым на папярэдніх выбарах, атрымала ліберальная партыя (19,3 %), удвая больш – **Шатландская нацыянальная партыя (ШНП)**. У Шатландыі за ШНП прагаласавала 22 % выбаршчыкаў.

Склалася складаная сітуацыя, калі ні кансерватары, ні лейбарысты не валодалі большасцю ў Палаце абшчын – адпаведна 297 і 301 мандат. Разлік то-

ры на ўрадавы альянс з лібераламі не спраўдзіўся. Таму права на фарміраванне ўраду атрымала партыя, якая мела найбольшую парламенцкую фракцыю – лейбарысты (цікава, што прагаласавала за яе на амаль 227 тыс. чалавек меней, чым за кансерватараў). Узначаліў урад меншасці Г. Вільсан (1974 – 1976).

Лейбарысцкая партыя ў сваёй перадвыбарчай праграме заяўляла аб мэтазгоднасці нацыяналізацыі шэрагу важных прамысловых галін, усталявання дзяржаўнага кантролю за распрацоўкай нафтавых рэсурсаў у Паўночным моры, перагляду ўмоў удзелу Вялікабрытаніі ў «Агульным рынку». Прыйшоўшы да ўлады, яны неадкладна скасавалі антыпрафсаюзны закон, прыняты папярэднім кабінетам, павысілі пенсіі па старасці і замарозілі кватэрную плату.

Няўстойлівасць ураду меншасці дыктавала лейбарыстам паспытаць шчасця на хуткіх новых датэрміновых выбарах. У кастрычніку 1974 г. яны заваявалі 319 дэпутацкіх крэслы і тым самым здолелі замацаваць сваё лідарства. Вынікі выбараў выклікалі вострыя дыскусіі ў лагеры кансерватараў. Чарговае паражэнне паставіла пад сумненне лідарскія пазіцыі Э. Хіта. У лютым 1975 г. на пасады старшыні партыі торы і лідара ценявога кабінета міністраў была абраная Маргарэт Тэтчар, міністр адукацыі і навукі ў апошнім кансерватыўным урадзе.

Лейбарысты зрабілі захады па дэмакратызацыі сістэмы адукацыі, паляпшэнні сістэмы пенсійнага забеспячэння. Але зараз, калі эканамічная сітуацыя пагоршылася яшчэ больш, урад лейбарыстаў быў вымушаны перайсці да антыінфляцыйнай палітыкі, а значыць праводзіць стрымліванне росту аплаты працы, падвышэнне падаткаў на спажывецкія тавары і скарачэнне дзяржаўных выдаткаў. Г. Вільсан здолеў атрымаць ад трэд-юніёнаў згоду абмежаваць свае патрабаванні да росту заробкаў у памеры 10 % у год.

У 1975 г. адбываецца небывалая ў брытанскай гісторыі падзея. Згодна са сваімі перадвыбарчымі абяцаннямі, лейбарысты далі народу магчымасць выказацца з нагоды членства Вялікабрытаніі ў ЕЭС на рэферэндуме. Брытанцы падтрымалі ўдзел сваёй краіны ў еўрапейскай інтэграцыі.

У другой палове 1970-х гг. эканоміка Вялікабрытаніі знаходзілася ў вельмі складаным становішчы. З аднаго боку, узмацніліся галіновыя дыспрапорцыі: гіганцкія паспяховыя манаполіі ў сучасных галінах вытворчасці суіснавалі з неразваротлівым, слаба кіраваным дзяржаўным сектарам, што ахопліваў пераважна старыя традыцыйныя галіны вытворчасці. З іншага боку, узрастальныя сацыяльныя выдаткі не толькі не ўлічвалі эканамічныя магчымасці краіны, але таксама спараджалі ў грамадстве тэндэнцыі да ўтрыманства. Спробы ўтаймаваць апетыты працоўных сустракалі супраціўленне магутных і ўплывовых, у тым ліку ў лейбарысцкай партыі, трэд-юніёнаў. Гэткім чынам да канца 1970-х гг. Вялікабрытанія ператварылася ў грамадства з усімі прыкметамі застою.

Вострыя сацыяльна-эканамічныя праблемы і адсутнасць у лейбарыстаў прадуманай праграмы дзеянняў у гэтай сітуацыі рабілі становішча Г. Вільсана незайздросным. У сакавіку 1976 г. ён вырашыў скласці з сябе паўнамоцтвы прэм’ер-міністра. Пераемнікам Г. Вільсана на пасадах старшыні партыі і кіраўніка ўраду стаў Джэймс Калагэн (1976 – 1979), аўтарытэтны і вопытны палітык. Ён стаў адзіным брытанскім прэм’ер-міністрам, які на шляху да свайго піку кар’еры пабываў на ўсіх трох галоўных міністэрскіх пасадах – канцлера казначэйства (міністр эканомікі і фінансаў), міністра ўнутраных і замежных спраў.

Складанае эканамічнае становішча не пакідала новаму прэм’ер-міністру іншага выбару, як толькі перайсці да палітыкі бюджэтнай эканоміі і стрымлівання інфляцыі, адмовіцца ад планаў нацыяналізацыі. Гэтыя цалкам лагічныя захады ўраду не маглі дадаць яму папулярнасці. Ужо ў 1977 г. лейбарысты пацярпелі паражэнне і на давыбарах у Палату абшчын, і на муніцыпальных выбарах. Галоўны саюзнік Лейбарысцкай партыі – рабочы рух – пераўтвараецца ў самага прынцыповага і непрымірымага апанента. Расчараванне палітыкай ураду спарадзіла магутнейшы забастовачны рух. Свайго піку ён дасягае зімой 1978 – 1979 гг. – г. зв. **«зімой незадаволенасці»** (англ. – *Winter of Discontent*).

Па меры набліжэння да новых парламенцкіх выбараў няздольнасць правячай лейбарысцкай партыі зладзіць з цэлым комплексам складаных сацыяльна-эканамічных праблем запатрабавала ад ураду Дж. Калагэна пошуку нестандартных спосабаў аднаўлення сваіх палітычных пазіцый. Гэткім сродкам магло б стаць ажыццяўленне **«дэвалюцыйнай рэформы»** – дэлегавання Лонданам часткі сваіх паўнамоцтваў новаўтвораным заканадаўчым сходам Уэльса і Шатландыі. Аднак разлік на кансалідацыю падтрымкі ў рэгіёнах не спраўдзіўся. У 1979 г. валійцы і шатландцы на рэферэндумах не выказалі вялікай зацікаўленасці ў пашырэнні сваіх правоў. Правал «дэвалюцыі» азначаў поўнае фіяска лейбарысцкага кабінету. І гэта красамоўна праілюстравалі травеньскія парламенцкія выбары 1979 г.

У 1980 – 1982 гг. Вялікабрытанія сутыкнулася з новым эканамічным крызісам. Агульнае падзенне прамысловай вытворчасці ў гэты перыяд склала каля 12 %, у апрацоўваючай прамысловасці – 16 %, а ў галінах лёгкай прамысловасці – нават да 27 %. Эканамічны крызіс суправаджаўся высокім узроўнем інфляцыі (у сярэднім – 13 % у год). Колькасць беспрацоўных узрасла з 1,5 да 3,3 млн. чалавек і да 1986 г. не апускалася ніжэй за 3-мільённы рубеж. Тым не менш, новыя ўлады, – кансерватыўная партыя, якая вярнулася да ўлады ў 1979 г., – здолелі знайсці адэкватныя рашэнні гэтых і многіх іншых праблем і даллі новы штуршок для сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны.

**Умацаванне ўплыву неакансерватыўных ідэй у канцы 1970-х гг. Прыход да ўлады М. Тэтчэр, яе сацыяльна-эканамічная палітыка. Тэтчарызм. Парламенцкія выбары 1983 і 1987 гг. ды іх вынікі. Аслабленне лейбарысцкай партыі, яе раскол у пачатку 1980-х гг. Утварэнне Ліберальна-дэмакратычнай партыі. Рознагалоссі ў Кансерватыўнай партыі. Адстаўка М. Тэтчар**

У той час, як лейбарыстам заставалася толькі спадзявацца на нейкі цуд у сусветнай эканоміцы і заклікаць брытанцаў «перачакаць цяжкія часы», кансерватары на працягу 1976 – 1978 гг. распрацавалі праграму глыбокіх сацыяльна-эканамічных пераўтварэнняў. Электаральныя поспехі торы ў 1977 гг., няхай пакуль што лакальныя, ужо сведчылі, аб гатоўнасці краіны да перамен.

На 3 траўня 1979 г. былі прызначаны новыя парламенцкія выбары. Пераканаўчую перамогу на іх атрымала Кансерватыўная партыя. Упершыню ў брытанскай гісторыі у прэм'ер-міністрам краіны стала жанчына – 53-гадовая Маргарэт Тэтчар. Перад новым кансерватыўным урадам стаялі вельмі складаныя задачы, а найважнейшымі з іх былі пераадоленне эканамічнага крызісу і стварэнне новай эфектыўнай сацыяльна-эканамічнай мадэлі.

М. Тэтчар прапанавала новую эканамічную праграму развіцця, якая прынцыповым чынам адрознівалася ад папярэдніх. Новы ўрад прааналізаваўшы характар эканамічных праблем прыйшоў да высновы, што для вываду краіны з крызісу неабходна выправіць шэраг недахопаў у сацыяльна-эканамічнай сістэме. Прапанаваная стратэгія, якая адмаўляла жорсткае дзяржаўнае рэгуляванне эканомікі, г. зн. кейнсіянства, атрымала назву **неакансерватызм**. Яна прадугледжвала наступныя крокі. Неабходна было абмежаваць празмерную ўладу ў краіне лідараў трэд-юніёнаў (яны часта кіраваліся асабістымі інтарэсамі і шантажавалі буйных прадпрымальнікаў пагрозамі забастовак), знізіць падаткі (у той час у Вялікабрытаніі стандартная стаўка на асабісты даход складала 33 %, але у асобных выпадках нават даходзіла да 83 %) і інфляцыю. Асобнай праблемай з'яўлялася залішняя ўлада ў руках дзяржавы, а значыць – засілле неразваротлівай і неэфектыўнай бюракратыі. Навукова-тэарэтычнай базай брытанскіх неакансерватыўных рэформ – г. зв. **«тэтчарызму»** – сталі манетарызм і тэорыя прапановы. У падмурку ідэалогіі кансерватыўнага ўраду знаходзіліся: свабоднае прадпрымальніцтва, асабістая ініцыятыва, скрайні індывідуалізм і віктарыянскія каштоўнасці.

У 1980, 1982 і 1984 гг. былі прынятыя законы, якія значна абмяжоўвалі права трэд-юніёнаў на забастоўкі. Гэтыя і іншыя ўрадавыя захады выклікалі актыўны забастовачны рух: у 1984 – 1985 гг. баставалі шахцёры, а ў 1986 г. – друкары. Тым не менш, цвёрдасць пазіцыі дазволіла М. Тэтчар дасягнуць пастаўленай мэты.

Іншым важным напрамкам дзейнасці кансерватыўнага ўраду стала прыватызацыя абагульненага сектару. На 1979 г. на долю нацыяналізаваных галін прамысловасці прыпадала каля 10 % ВНП. Пры гэтым многія з гэтых галін сталі класічным узорам слабай прадукцыйнасці працы і малой эканамічнай эфектыўнасці. У перыяд з 1984 па 1987 гг. у прыватную ўласнасць перайшлі 9 дзяржаўных канцэрнаў (1/3 усёй уласнасці дзяржавы), напрыклад, тэлекамунікацыі і прадпрыемствы газавай прамысловасці. Напрыканцы 1987 г. пачаўся продаж акцый нафтавай кампаніі «Брыціш петролеум». Потым прыйшла чарга сталеліцейнай прамысловасці, а пасля – электраэнергетыкі і водазабеспячэння.

У выніку прыватызацыі адбылася адчувальная **«дэмакратызацыя капіталу»**. Калі ў 1979 г. доля акцыянераў у Вялікабрытаніі складала толькі 7 % дарослага насельніцтва, то ў 1988 г. ужо 20 %. З гэтым паказчыкам брытанцы выйшлі на другое месца ў свеце і саступалі цяпер толькі амерыканцам. Яшчэ адным важным накірункам дзейнасці кансерватыўнага ўраду М. Тэтчар дзеля ўмацавання «грамадства ўласнікаў» з'яўлялася спрыянне развіццю малога і сярэдняга бізнесу. У выніку, добра тэхнічна ўзброеныя дробныя і сярэднія фірмы аказаліся здольнымі своечасова рэагаваць на змены гаспадарчай кан'юнктуры, чаго нельга было сказаць пра многіх гігантаў прамысловай вытворчасці.

Адначасова ўрад актыўна падтрымліваў і абараняў транснацыянальныя карпарацыі, у якіх брытанскі капітал адыгрываў важную ролю. Адной з важнейшых спецыфічных асаблівасцяў брытанскай эканомікі была высокая ступень інтэрнацыяналізацыі ў вядучых галінах вытворчасці. Толькі нямногія сферы прамысловай вытворчасці абапіраліся на трывалы ўнутраны рынак, мелі высокі ўзровень капіталаўкладанняў і развітую базу НДВКР. У першую чаргу гэта хімічная і аэракасмічная галіны, астатнія збольшага былі шчыльна звязаныя з міжнароднымі карпарацыямі.

Вялікая ўвага ў працэсе перабудовы брытанскай эканомікі надавалася прыватызацыі жылля. Значная яго частка належала муніцыпальнай уладзе, а таму патрабавала новых і новых дзяржаўных грашовых асігнаванняў. М. Тэтчар паставіла перад урадам задачу зрабіць большую частку брытанцаў уласнікамі свайго жылля. У выніку продажу дамоў па ільготным коштам жыхарам-арандатарам колькасць домаўладальнікаў узрасла да 66 %. Яшчэ адным важным спосабам зніжэння нагрузкі на дзяржаўны бюджэт стала скарачэнне дзяржаўнага апарату і выдаткаў на яго ўтрыманне. Напрыклад, колькасць міністэрстваў была скарочаная да 16, а галіновых, цалкам звычайных для развітых краін, практычна не засталося. Важнейшым захадам, што стымуляваў развіццё эканомікі Вялікабрытаніі, таксама стала зніжэнне стаўкі падаходнага падатку. Урад напружана змагаўся з інфляцыяй. Калі ў 1980 г. яна складала 16 %, то ў 1983 г. яе ўдалося знізіць да 3 % і ў далейшым яна ўжо не перавышала 6 %.

Станоўчыя вынікі дзесяцігоддзя рэформ пад кіраўніцтвам М. Тэтчар не маглі б стацца рэальнасцю, каб не падтрымка яе курсу значнай часткай насельніцтва краіны. Паступовае адступленне крызісу 1980 – 1982 гг. і пераможная вайна за Фалклендскія астравы (гл. далей) стваралі для кансерватараў зручныя ўмовы для правядзення датэрміновых парламенцкіх выбараў.

У чэрвені 1983 г. правячая партыя замацавала свой поспех чатырохгадовай даўнасці. Падчас сваёй перадвыбарчай кампаніі кансерватары абяцалі даць рады беспрацоўю, забяспечыць хуткі эканамічны рост і трывалую абароназдольнасць краіны, прапаноўвалі для дасягнення гэтага адпаведныя механізмы. Праграма лейбарыстаў выглядала занадта авантурыстычнай. У прыватнасці, яны абяцалі вывесці Вялікабрытанію з ЕЭС, ліквідаваць Палату лордаў і адмовіцца ад сіл ядзернага стрымлівання. Хаця кансерватары атрымалі на 1,5 % галасоў меней, чым на папярэдніх выбарах (усяго 42,4 %), з пункту гледжання колькасці дэпутацкіх мандатаў яны выступілі проста бліскуча. Гэтым разам яны заваявалі на 58 месцаў болей (усяго 397). Лейбарысты ж выбары правалілі, страціўшы каля 10 % галасоў і 60 месцаў. М. Тэтчар справядліва расцаніла гэтыя вынікі як дэманстрацыю крэдыту даверу і яшчэ больш актыўна ўзялася за рэфармаванне брытанскай сацыяльна-эканамічнай сістэмы.

Пачатак упэўненага эканамічнага росту, што пачаўся з сярэдзіны 1980-х гг., ізноў падказваў кансерватарам мэтазгоднасць датэрміновага правядзення выбараў. Іх перадвыбарчая праграма рабіла акцэнт на зніжэнні падаткаў і аздараўленні эканомікі, а таксама імкнулася выкарыстоўваць любыя прамашкі сваіх асноўных апанентаў. Напрыклад, кансерватары дасціпна паіранізавалі з прапановы лейбарыстаў пайсці на аднабаковую адмову ад ядзернай зброі. На адным з плакатаў торы быў намаляваны брытанскі салдат з узнятымі да гары рукамі, а надпіс на ім гаварыў: «*Labour's Policy On Arms*» («Палітыка Лейбарысцкай партыі ў галіне ўзбраенняў» ці «Палітыка лейбарысцкай партыі адносна рук»; «arms» – адначасова азначае і «ўзбраенні», і «рукі»). Тактыка не падвяла торы, і ўжо ў трэці раз запар яны адсвяткавалі перамогу. Гэтым разам падтрымка кансерватараў з боку выбаршчыкаў аказалася крыху меншай (– 0,2 %) ды іх фракцыя зменшылася на 21 дэпутата. Аднак больш чым камфортная перавага над лейбарыстамі ў Палаце абшчын была захаваная – адпаведна 376 супраць 229 мандатаў.

Паражэнне лейбарыстаў на парламенцкіх выбарах 1979 г. абвастрыла ўнутрыпартыйныя супярэчнасці. Пасля вымушанага зыходу з пасады старшыні партыі Дж. Калагэна яго пераемнікам быў абраны лідар левацэнтрысцкага крыла – Майкл Фут. У выніку значнага палявення лейбарысцкай партыі адкалолася правая групоўка. У Палаце абшчын яе падтрымалі 27 дэпутатаў, у краіне колькасць прыхільнікаў новай партыі ацэньвалася ў 70 тыс. чалавек. Лідары гэтай групоўкі неўзабаве абвясцілі аб стварэнні

**Сацыял-дэмакратычнай партыі (СДП)**. У ходзе падрыхтоўкі да выбараў 1983 г. СДП заключыла альянс з Ліберальнай партыяй аб сумесным высоўванні кандыдатаў і адзінай парламенцкай тактыцы. Хаця з пункту гледжання заваявання дэпутацкіх мандатаў поспехі альянсу на гэтых выбарах цяжка назваць здавальняючымі (не быў абраны ў парламент нават лідар СДП), па колькасці атрыманых галасоў выбаршчыкаў ён выступіў някепска, набраўшы толькі на 700 тыс. галасоў меней за другую па папулярнасці партыю ў краіне – лейбарыстаў.

Пасля парламенцкіх выбараў 1987 г. у СДП, якая ізноў выступіла слаба і правяла ў Палату абшчын толькі 5 дэпутатаў, узмацняюцца настроі ў падтрымку поўнага зліцця з Ліберальнай партыяй. У сакавіку 1988 г. было афіцыйна абвешчана аб стварэнні новай Сацыял-ліберальна-дэмакратычнай партыі. У 1989 г. яна была перайменаваная ў **Ліберальна-дэмакратычную партыю**. На першых парах яна сутыкнулася з цэлым шэрагам праблем – адтокам членаў, недахопам сродкаў і г. д., аднак паступова здолела ператварыцца ў дастаткова моцную трэцюю сілу краіны.

На мяжы 1980-х – 1990-х гг. пазіцыі М. Тэтчар сталі патроху слабець. Упершыню пасля эканамічнага крызісу 1980 – 1982 гг. сярэднегадавы ўзровень інфляцыі перавысіў 10 %. Вялікае незадавальненне шырокіх колаў грамадства выклікала правядзенне вясной 1990 г. рэформы мясцовага падатковага заканадаўства. Яна прадугледжвала ўвядзенне **«падушнага падатку»**, які павінен быў выплачвацца па аднолькавай стаўцы, незалежна ад маёмаснага статусу падаткаплацельшчыка. Нягледзячы на адносна нязначныя грашовыя дывідэнды ўраду ад гэтага новаўвядзення, прэм’ер-міністр у сваёй жорсткай і безапеляцыйнай манеры адмаўлялася ісці на любыя саступкі. А тым часам грамадская думка пачынала ўсё больш і больш крытычна ацэньваць не толькі саму «Жалезную лэдзі», але і ўсю яе партыю. Гэта не магло не выклікаць актывізацыю ўнутрыпартыйнай апазіцыі М. Тэтчар. Напачатку лістапада 1990 г. у знак пратэсту супраць яе катэгарычнага нежадання далучыцца да абмеркавання перспектыў агульнай еўрапейскай валюты падаў у адстаўку намеснік прэм’ер-міністра Джэфры Хаў. Неўзабаве адкрыты выклік М. Тэтчар кінуў міністр абароны Майкл Хэзлтайн, заявіўшы пра жаданне ўзначаліць партыю. Выбары лідара партыі прадэманстравалі дастаткова трывалыя пазіцыі дзеючага прэм’ер-міністра. Але не здолеўшы атрымаць перамогу ў першым туры, пакрыўдзіўшыся на недавер да сябе з боку аднапартыйцаў, але пры гэтым не жадаючы паглыбляць раскол у партыі новым вітком барацьбы за лідарства, М. Тэтчар нечакана вырашыла скласці з сябе паўнамоцтвы. На новых выбарах 28 лістапада 1990 г. пераможцам стаў яе паплечнік і міністр фінансаў яе кабінету, 47-гадовы Джон Мэйджар.

### Ольстэрская праблема ў 1970 – 1980-я гг.

Напачатку 1970-х гг. сітуацыя ў Паўночнай Ірландыі пачынае выходзіць з-пад кантролю Лондана. Хаця летам 1971 г. ў правінцыі ўжо знаходзілася каля 15 тыс. брытанскіх салдат, а сілы «аховы правапарадку» атрымалі практычна неабмежаваныя магчымасці, беспарадкі працягваліся. Брытанскі кантынгент успрымаўся каталіцкай меншасцю як акупацыйнае войска, і стаўленне да яго было адпаведным. У сапраўдную мішэнь для тэрарыстычных актаў вайскоўцы ператварыліся пасля падзей **«крывавай нядзелі»** 30 студзеня 1972 г., калі войскі адкрылі агонь па католіках у Дэры, забіўшы пры гэтым 13 чалавек (сярод іх 6 непаўналетніх і адзін святар). 30 сакавіка 1972 г. брытанскі парламент прыпыніў дзейнасць Стормента і ўвёў рэжым прамога лонданскага праўлення, што па сутнасці азначала ўвядзенне надзвычайнага становішча.

Правядзенне праз год, у сакавіку 1973 г. паўночнаірландскага рэферэндуму па пытанні знаходжання ў складзе Злучанага каралеўства і чаканы поспех на ім юніяністцкіх сіл аніяк не здолелі паспрыяць урэгуляванню крызіса. Гэтак жа не змяніла сітуацыю і заключэнне вядучымі юніяністцкімі і нацыяналістычнымі (каталіцкімі) партыямі, пры ўдзеле брытанскага ды ірландскага ўраду, Санінгдэйльскага пагаднення (снежань 1973 г.). Мала плёну дало абранне ў 1975 г. Канстытуцыйнага канвенту. Юніянсцкая большасць, зацікаўленая ў захаванні status-quo, завяла дзейнасць сходу ў тупік, таму кіраванне правінцыяй па-ранейшаму ажыццяўлялася з Лондана.

Тым часам, гвалтоўныя акцыі як з боку пратэстантаў, гэтак і з боку каталікоў множыліся. Улады не знаходзілі нічога лепшага за ўзмацненне рэпрэсій супраць сепаратыстаў. Паступова увага да Ольстэрскага канфлікту выходзіць далёка за межы Злучанага Каралеўства. Сістэматычныя парушэнні правоў чалавека ў Ольстэры нават вымусілі Еўрапейскі суд прыняць у студзені 1978 г. рашэнне, якое ўскладала на брытанскую паліцыю адказнасць за «бесчалавечнае і прыніжальнае абыходжанне са зняволенымі».

Рэпрэсіі не маглі спыніць гвалт. Наадварот, ірландскія радыкалы паступова сталі скочвацца да тактыкі індывідуальнага тэрору супраць брытанскіх палітычных дзеячаў. У 1979 г. баявікі з Ірландскай нацыянальна-вызваленчай арміі (ІНВА; выступала за незалежнасць Ольстэру з мэтай усталявання там «марксісцка-ленінскай рабоча-сялянскай рэспублікі») забілі прадстаўніка каралеўскай фаміліі, апошняга віцэ-караля Індыі лорда Маўнтбэтэна, а часовая ІРА расправілася з вядомым дэпутатам брытанскага парламенту ад кансерватыўнай партыі Эйры Нівам.

Шырокі розгалас у свеце набывае галадоўка 1981 г. зняволеных праціўнікаў брытанскага ўладарання ў Паўночнай Ірландыі, якія патрабавалі, каб да іх ставіліся не як да крымінальнікаў, а як да ваеннапалонных або палі-

тычных вязняў. Для дзесяці з іх яна скончылася трагічна, у тым ліку для 27-гадовага члена ІРА Роберта Сэндса, незадоўга да гэтага абранага дэпутатам Палаты абшчын. М. Тэтчар у звычайным для сябе жорсткім і бескампрамісным стылі адрэагавала на гэта наступным чынам: *«Суд прызнаў містэра Сэндса злачынцам. Ён вырашыў пазбавіць сябе жыцця. Яго арганізацыя многім сваім ахвярам гэткага выбару не пакідала»*. Тым не менш, нямала людзей у Паўночнай Ірландыі і па ўсім свеце бачылі ў пазіцыі брытанскага ўраду адкрытую непавагу да правоў чалавека, а Р. Сэндса і яго паплечнікаў лічылі барацьбітамі за грамадзянскія правы каталіцкай меншасці.

Чарговы правал арганізацыі паўночнаірландскай асамблеі (1982) ізноў засведчыў глыбіню расколу грамадства мяцежнай правінцыі. У кастрычніку 1984 г. ІРА ажыццявіла гучны тэрарыстычны акт у гатэлі горада Брайтана, дзе спыніліся дэлегаты канферэнцыі Кансерватыўнай партыі, у тым ліку М. Тэтчар. Выбух амаль 50-кілаграмовай бомбы забраў жыцці 2 чалавек, яшчэ 34 былі параненыя.

Змякчэнню супрацьстаяння павінна было паспрыяць заключэнне **Англа-ірландскага пагаднення 1985 г.** Злучанае каралеўства ды Ірландская рэспубліка дамаўляліся аб тым, што апошняя атрымлівала дарадчую ролю ў паўночнаірландскім парламенце, але прызнавала брытанскую юрысдыкцыю над Ольстэрам да таго часу, пакуль большасць яго насельніцтва не выкажацца за далучэнне да рэспублікі.

Пагадненне 1985 г. не здолела ні спыніць палітычны гвалт, ні прымірыць дзве варагуючыя этнаканфесійныя супольнасці. Тым не менш, з пункту гледжання доўгатэрміновай перспектывы яно мела важнейшыя наступствы. Галоўнае з іх палягала ў тым, што намецілася відавочнае збліжэнне пазіцый Лондана і Дубліна. Яно, у сваю чаргу, стала адным з важнейшых фактараў урэгулявання паўночнаірландскага канфлікту напрыканцы 1990-х гг.

У другой палове 1980-х гг. гэты эфект аднак яшчэ адчувацца не мог. Дзейнасць ІРА толькі актывізуецца. Сваю ролю ў гэтым адыграў лівійскі рэжым Муамара Кадафі, які помсцячы Вялікабрытаніі за яе падтрымку амерыканскіх авіяўдараў Лівіі ў 1986 г., шчодра фінансаваў антыбрытанскія тэрарыстычныя групоўкі ў Паўночнай Ірландыі.

## Знешняя палітыка Вялікабрытаніі ў 1970 – 1980-я гг. Адносіны да інтэграцыйных працэсаў у Еўропе. Англа-аргенцінская вайна. Стаўленне брытанскага кіраўніцтва да перабудовы ў СССР і дэмакратызацыі ў краінах Усходняй Еўропы

Авантурныя дзеянні ЗША на міжнароднай арэне (найперш, вайна ў В'етнаме) ды ігнараванне Вашынгтонам інтарэсаў Лондана ў свеце з сярэдзіны 1960-х гг. выклікалі пэўнае ахаладжванне брытана-амерыканскіх адносін. Гэтая тэндэнцыя толькі ўзмацнялася за кошт узрастання інтарэсу Вялікабрытаніі да еўрапейскай палітыкі. Найбольш яркай праявай гэтага стала яе далучэнне ў 1973 г. да ЕЭС.

З вяртаннем да ўлады ў 1974 г. лейбарыстаў у адносінах паміж Лонданам і Вашынгтонам адбылося яўнае пацяпленне. Гэтаму спрыяла і агульная міжнароднапалітычная атмасфера той пары – дасягае свайго апагею «эпоха разрадкі». 1 жніўня 1975 г. прэм’ер-міністр Г. Вільсан бярэ ўдзел у падпісанні Заключнага акту Хельсінкскай нарады па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе. У час дзейнасці кабінета Дж. Калагэна курс Вялікабрытаніі на падтрымку палітыкі раззбраення, забеспячэння агульнаеўрапейскай бяспекі і актывізацыі супрацоўніцтва з СССР узмацняецца.

Важнейшым напрамкам знешняй палітыкі Вялікабрытаніі таксама заставаліся справы Брытанскай Садружнасці. Вялікае значэнне для вызначэння агульнай філасофіі і прынцыпаў яе дзейнасці мела **Сінгапурская дэкларацыя**, прынятая ў 1971 г. Садружнасць вызначалася гэтым дакументам як «добраахвотная асацыяцыя незалежных суверэнных дзяржаў, кожная з якіх адказвае за сваю ўласную палітыку, але ўсе яны кансультуюцца і супрацоўнічаюць паміж сабой у агульных інтарэсах сваіх народаў і ў мэтах садзейнічання міжнароднаму паразуменню і міру».

З’яўленне М. Тэтчар на Даўнінг-стрыт, 10 (рэзідэнцыя брытанскіх прэм’ер-міністраў) практычна супала з аднаўленнем «халоднай вайны». Вялікабрытанія актыўна ўключылася ў яе як актыўная і прынцыповая антыкамуністычная сіла. Разам са Злучанымі Штатамі ды іх саюзнікамі яна байкатавала Алімпіяду-80 у Маскве, брытанскія ўлады пагадзіліся на размяшчэнне на тэрыторыі краіны 160 амерыканскіх ракет сярэдняй дальнасці і ажыццяўленне праграмы мадэрнізацыі атамных падводных лодак. М. Тэтчар пазітыўна сустрэла амерыканскі праект Стратэгічнай Абарончай Ініцыятывы, г. зв. праграмы «зорных войн», што прадугледжвала перанос гонкі ўзбраенняў у касмічную прастору. Падобны курс на дастаткова крытычным фоне яе ўнутранай палітыкі не мог не выклікаць масавыя пратэсты брытанскай грамадскасці. Значных маштабаў у першай палове 1980-х гг. дасягае антываенны і антыядзерны рух.

Адной з найбольш значных перамог знешняй палітыкі М. Тэтчар стала адносна хуткая (ішла 11 тыдняў) і не крывавая (брытанцы страцілі забітымі каля 250 чалавек) вайна з Аргенцінай з-за Фалклендскіх (Мальвінскіх) астравоў.

Невялікі і зусім малазаселены архіпелаг у водах Атлантыкі ўжо даўно быў прадметам спрэчак паміж Лонданам і Буэнас-Айрэсам. На працягу амаль 150 гадоў ім распараджаліся брытанцы. Аднак у красавіку 1982 г. аргенцінскі вайсковы рэжым вырашыў аднавіць «гістарычную справядлівасць», а заадно здабыць народную падтрымку, і высадзіў на Фалклендскія астравы дэсант. Рэакцыя М. Тэтчар і брытанскага ўраду аказалася імгненнай і рашучай: адносіны з Аргенцінай былі разарваныя і для аднаўлення брытанскага суверэнітэту над архіпелагам была накіраваная ваенна-марская эскадра ў складзе 40 караблёў. Актыўныя і ўзгодненыя дзеянні флоту і

ваенна-паветраных сіл Злучанага Каралеўства не пакінулі Аргенціне аніякіх шанцаў на поспех. Гэтая перамога паспрыяла ўмацаванню пазіцый М. Тэтчар як нацыянальнага лідара і ўзмацненню аўтарытэта Вялікабрытаніі на міжнароднай арэне.

Абапіраючыся на бясспрэчныя поспехі брытанскай эканомікі, кансерватары імкнуліся пашырыць адносна самастойны статус Вялікабрытаніі ў ЕЭС. Аднак скептыцызм М. Тэтчар адносна неабходнасці паглыблення еўраінтэграцыі з сярэдзіны 1980-х гг. увайшоў у супярэчнасць з пазіцыяй большасці вядучых дзяржаў ЕЭС, а напачатку 1990-х гг. ужо не знаходзіў паразумення і сярод значнай часткі брытанскай эліты, у тым ліку сярод яе аднапартыйцаў.

З прыходам да ўлады ў СССР М. С. Гарбачова і пачаткам палітыкі перабудовы адбываецца значнае паляпшэнне брытана-савецкіх адносін. Істотна пашырыліся кантакты па ўсіх накірунках міждзяржаўных і грамадскіх адносін. У многіх сферах, перш за ўсё ў вырашэнні эканамічных, палітыка-прававых, экалагічных і гуманітарных праблем, адбывалася хуткае збліжэнне пазіцый дзвюх краін. Вялікабрытанія імкнулася таксама падтрымаць працэсы дэмакратызацыі ў краінах сацыялістычнага лагеру.

## Тэма 6. Вялікабрытанія ў 1990-я - 2010-я гг.

### Дж. Мэйджар і карэкціроўка палітычнага курсу партыі торы. Палітыка «здаровага кансерватызму». «Хартыя грамадзян». Прагрэс у вырашэнні Ольстэрскай праблемы. Прычыны паражэння кансерватараў на парламенцкіх выбарах 1997 г.

Пачатак прэм'ерства Дж. Мэйджара (1990 – 1997) слаба адбіўся на персанальным складзе кансерватыўнага ўраду – ключавыя пасады засталіся за паплечнікамі М. Тэтчар. Новы кіраўнік ураду падкрэсліваў пераемнасць сваёй палітыкі. Аднак практычна адразу стаў праяўляцца яго прынцыпова адрозны палітычны стыль. Дж. Мэйджар імкнуўся дасягаць пастаўленых мэт не праз рашучасць і непахіснасць, характэрныя для «Жалезнай лэдзі», а праз дыялог і нават саступкі па непрынцыповых пытаннях. Падобная тактыка была названая **«здаровым кансерватызмам»** (кансерватызм з пэўнай доляй папулізму). Прэм'ер-міністр здолеў забяспечыць узмацненне калегіяльнасці ў прыняцці ўрадавых рашэнняў, дасягнуць паляпшэння адносін з лідарамі фінансавага свету. Вялікі прапагандысцкі эфект быў дасягнуты скасаваннем сумна вядомага «падушнага падатку».

Асцярожны і ўзважаны курс ураду торы прынёс плён на парламенцкіх выбарах 1992 г. Дж. Мэйджар і яго каманда зрабілі стаўку не на традыцыйную мабілізацыю ўстойлівага кансерватыўнага электарату, а на по-

шук падтрымкі сярод самых шырокіх слаёў грамадства. Кансерватары атрымалі 41,9 % галасоў выбаршчыкаў і зноў апярэдзілі канкурэнтаў – лейбарыстаў (34,4 %) і ліберал-дэмакратаў (17,8 %). Праўда, у асобных выбарчых акругах торы дзейнічалі не надта ўдала, а таму страцілі без малога 40 дэпутацкіх мандатаў.

Прывёўшы сваю партыю да перамогі і тым самым атрымаўшы вотум даверу брытанцаў, Дж. Мэйджар пераходзіць да рашучых дзеянняў. Агульны фон для рэалізацыі новай кансерватыўнай праграмы быў не вельмі спрыяльным. У 1990 – 1991 гг. Вялікабрытанія была закранутая сусветнай рэцэсіяй. 16 верасня 1992 г. здарылася «чорная серада» – рэзкі абвал фунта, магчыма справакаваны біржавымі спекулянтамі. Ураду прыйшлося пайсці на дэвальвацыю і выйсці з еўрапейскай валютнай сістэмы. Фінансавыя страты Вялікабрытаніі склалі каля 3,3 млрд. фунтаў. Да 1994 г. эканоміка Вялікабрытаніі перажывала перыяд зацяжной рэцэсіі: запаволіліся тэмпы вытворчасці і рост ВНП, на дастаткова высокім узроўні заставаліся беспрацоўе і інфляцыя.

Эканамічная палітыка ўраду Дж. Мэйджара па-ранейшаму захоўвала значную пераемнасць адносна курсу папярэдняга прэм'ера. Была даведзена да лагічнага заканчэння прыватызацыя электраэнергетыкі і вуглездабывальнай прамысловасці. Гэта рабілася іначай, чым магло б здарыцца пры М. Тэтчар. Каб не дапусціць разрастання працоўнага канфлікту да маштабаў выступленняў сярэдзіны 1980-х гг., урад не проста зачыніў шахты і звальняў шахцёраў, а патраціў вялікія грошы на выплату кампенсацый і выхадных дапамог, мадэрнізацыю абсталявання. Існуючыя трэнні не заўжды атрымлівалася згладжваць. Спроба прыватызацыі чыгункі і паштовай службы выклікала адмоўную рэакцыю не толькі занятых у гэтых галінах, але таксама ў значнай частцы насельніцтва краіны.

Поруч з прыватызацыяй дзяржаўнага сектару эканомікі працягваліся і іншыя накірункі тэтчарысцкіх рэформ: ільготны распродаж муніцыпальных дамоў, падтрымка малога бізнесу, заахвочванне развіцця канкурэнцыі на дзяржаўных прадпрыемствах і г. д. Неўзабаве пасля выбараў была ліквідавана Нацыянальная рада эканамічнага развіцця. Гэта фактычна азначала крушэнне пасляваеннага грамадскага кансенсусу і замацаванне дасягнутага пры М. Тэтчар новага прыніжанага статусу прафсаюзаў. Затое ўрад актывізаваў двухбаковыя кантакты з дзелавым светам.

Было працягнутае рэфармаванне падатковай сістэмы. Галоўнай яго задачай кансерватыўны ўрад лічыў істотнае аблягчэнне прамога падаткаабкладання дзеля павелічэння інвестыцыйных магчымасцяў бізнесу. Кампенсацыя страт дзяржаўнага бюджэту ажыццяўлялася за кошт некаторага росту ўскосных падаткаў. У выніку гэтая палітыка кансерватыўнага ўраду прывяла да агульнага павелічэння падатковага цяжару насельніцтва і стала адной з прычын падзення яго папулярнасці.

У сацыяльнай сферы палітыка Дж. Мэйджара была больш самастойнай і наватарскай. Яго ўрад імкнуўся ўсталяваць больш устойлівы баланс прыватнага і дзяржаўнага сектараў. Акцэнт рабіўся не толькі і не столькі на рост выдаткаў на сацыяльныя патрэбы, колькі на падвышэнне якасці абслугоўвання. Адмаўляючы мэтазгоднасць аднаўлення «дзяржавы дабрабыту», Дж. Мэйджар імкнуўся ўмацаваць прававую базу грамадзянскай супольнасці, забяспечыць спалучэнне ідэалаў спаборнасці і канкурэнцыі з прынцыпамі салідарнасці і супрацоўніцтва. Дзеля рэалізацыі гэтага на працягу 1992 – 1994 гг. урад распрацаваў цэлую серыю дакументаў пад агульнай назвай **«Хартыя грамадзян»** («Хартыя бацькоў», «Хартыя пасажыраў» і г. д.). Пэўныя зрухі адбыліся ў сферы аховы здароўя і адукацыі. Напрыклад, прыняцце Акту аб далейшай і вышэйшай адукацыі (1992) дазволіла пераўтварыць ва ўніверсітэты 35 былых політэхнічных інстытутаў.

Яшчэ адным дасягненнем ураду Дж. Мэйджара стала дасягненне прагрэсу ў вырашэнні Ольстэрскай праблемы. У выніку напружаных перамоў з лідарамі Паўночнай Ірландыі ды Ірландскай рэспублікі напачатку 1995 г. было дасягнута гістарычнае пагадненне паміж апошняй і Злучаным Каралеўствам. Урады дзвюх краін выказалі гатоўнасць пераглядзець свае заканадаўчыя акты, вытрыманыя ў канфрантацыйным духу адносна адзін аднаго. Варагуючыя групоўкі дамовіліся наконт спынення агню. Тым не менш, новая ўспышка гвалту (напрыклад, выбухі, што грымелі ў краіне падчас правядзення еўрапейскага футбольнага першынства 1996 г.) у чарговы раз не дазволілі дамагчыся замірэння асноўных бакоў паўночнаірландскага канфлікту.

Пачатак у другой палове 1990-х гг. новага эканамічнага ўздыму не выклікаў росту папулярнасці ўраду Дж. Мэйджара, яго прэстыж працягваў няўхільна падаць. Не здолелі выправіць гэтае становішча ні ратыфікацыя Маастрыхцкіх пагадненняў, ні дасягнутае ў 1995 г. пагадненне аб спыненні агню ў Паўночнай Ірландыі. За 18 гадоў кансерватыўнага праўлення насельніцтва Злучанага Каралеўства паспела стаміцца ад традыцыйнай палітыкі партыі торы і добра знаёмых па дасягненнях, злоўжываннях (шэраг высокапастаўленых торы аказаўся замешаны ў карупцыйных скандалах) і правалах палітыках (напрыклад, многія брытанцы працягвалі дакараць кансерватараў за «чорную сераду»). Аслаблялі партыю спрэчкі паміж «еўраскептыкамі» і прыхільнікамі паглыблення еўрапейскага курсу краіны.

У 1997 г. правячая партыя правяла дастаткова традыцыйную для сябе выбарчую кампанію, акцэнтуючы ўвагу на ўласных поспехах (нізкі ўзровень беспрацоўя, добры стан эканомікі) і недахопах канкурэнтаў. Гэтага аказалася недастаткова. Брытанцы жадалі абнаўлення, а найперш падвышэння сацыяльнай аддачы ад дзейнасці ўраду. Гэта і абяцалі лейбарысты.

**«Новы лейбарызм» Э. Блэра і яго практычнае ажыццяўленне. Нацыяналізм і праблема палітычнага тэрарызму. Дэвалюцыя ў Шатландыі і Уэльсе. Поспехі ў справе паўночнаірландскага ўрэгулявання. Урад .Г. Браўна і яго палітыка. Аслабленне пазіцый лейбарыстаў і паражэнне на выбарах 2010 г.**

Пачатак свайго новага ўзыходжання да ўлады лейбарысты пачалі у сярэдзіне 1990-х гг. Безнадзейнае выступленне партыі на апошніх чатырох выбарах (1979, 1983, 1987 і 1992) прымушала сур'ёзна задумацца аб прычынах няўдач і шляхах выпраўлення памылак. Аднымі з ключавых рашэнняў павінна была стаць прынцыповая ідэйная трансфармацыя лейбарызму і як адна з неабходных умоў яе ажыццяўлення – кардынальнае кадравае абнаўленне партыі.

У 1994 г. новым лідарам Лейбарысцкай партыі быў абраны прадстаўнік маладой хвалі брытанскіх палітыкаў 40-гадовы Энтані (Тоні) Блэр. Ён і яго паплечнікі, перш за ўсё Гордан Браўн і Пол Ме́ндэльсан, бачылі вострую неабходнасць у прыстасаванні Лейбарысцкай партыі да рэалій постіндустрыяльнага грамадства. Лейбарысты павінны былі развітацца з традыцыйным іміджам рабочай партыі і пераўтварыцца ў сапраўды агульнанацыянальную партыю – выказніка інтарэсаў усіх грамадзян. Пачалося фарміраванне новага аблічча партыі, яе лідараў і ўкараненне яго ў масавай свядомасці пры дапамозе найноўшых PR-тэхналогій.

Велізарнае значэнне мела пазачарговая канферэнцыя Лейбарысцкай партыі 1995 г., прысвечаная змене партыйнага статуту. Асноватворны дакумент партыі вызначыў яе як «дэмакратычную і сацыялістычную» партыю, якая арыентуецца на стварэнне «справядлівага грамадства», забяспечвае роўнасць магчымасцяў і гарантыі супраць беднасці. Са статуту былі выключаныя прынцыповыя палажэнні (г. зв. «чацвёрты пункт») аб прыярытэце грамадскай уласнасці на сродкі вытворчасці. Канцэпцыя «**новага лейбарызму»** («трэцяга шляху») ставіла мэту стварэння сацыяльна арыентаванай рыначнай эканомікі, у якой індывідуальная ініцыятыва і прадпрыемлівасць спалучаліся б з калектывізмам (па тэрміналогіі Э. Блэра – «камунітарызмам») грамадзянскай супольнасці і сацыяльнай адказнасцю дзяржавы.

Ідэалагічная перабудова партыі знайшла сваё ўвасабленне ў перадвыбарчым маніфесце 1997 г. Лейбарысты заяўлялі аб неабходнасці прававых рэформ і змены знешнепалітычнага курсу. У прыватнасці, прапаноўвалася рэформа Палаты лордаў, умацаванне ў палітычным жыцці інстытуту рэферэндуму, выбарчая рэформа, канстытуцыйная рэформа ў Паўночнай Ірландыі, Уэльсе і Шатландыі. Лейбарысты асуджалі рыначны фундаменталізм і абяцалі выправіць перакосы ў сацыяльна-эканамічнай палітыцы тэтчарыстаў. У прапанаванай праграме спалучаліся эканамічныя ідэі, блізкія да «посттэтчарызму», практыка сацыял-ліберальнага рэфарматар-

ства амерыканскіх дэмакратаў на чале з Білам Клінтанам (барацьба з беспрацоўем, увядзенне мінімуму заробкаў) і дастаткова радыкальная для Вялікабрытаніі ідэя «вяртання ў Еўропу» (далучэнне да Сацыяльнай хартыі ЕС і Еўрапейскай валютнай сістэмы).

Вынікі парламенцкіх выбараў 1997 г. перасягнулі самыя фантастычныя чаканні Лейбарысцкай партыі і яе прыхільнікаў. Партыя атрымала 43,2 % галасоў выбаршчыкаў і ў Палату абшчын былі абраныя 419 яе дэпутатаў (ніводная партыя ў гісторыі не мела больш). У вялікіх гарадах, Уэльсе і Шатландыі Лейбарысцкая партыя не пакінула кансерватарам аніякіх шанцаў. З'едлівыя палітолагі і журналісты нават адзначалі, што торы пераўтварыліся ў англійскую вясковую партыю. Кансерватары набралі крыху болей за 30 % галасоў. Менш – 29,2 % – было толькі ў далёкім 1832 г. Былі заваяваныя 165 дэпутацкіх мандатаў – на 178 дэпутацкіх мандатаў меней, чым у 1992 г. (горшы вынік быў толькі ў 1906 г.) Правалілі выбары і не былі абраныя нават некаторыя члены кабінету Дж. Мэйджара, у тым ліку міністр абароны Майк Парціла і міністр замежных спраў і па справах Садружнасці Малкальм Рыфкінд. Дастаткова паспяхова выступіла Ліберальна-дэмакратычная партыя. Хаця ў параўнанні з папярэднімі выбарамі яна заваявала менш галасоў, у парламент былі абраныя 46 яе дэпутатаў – найбольшы поспех любой трэцяй партыі з 1929 г.

Эканамічная палітыка ўраду Э. Блэра не вызначалася навізной. Сучасная эканамічная мадэль, пабудаваная двума папярэднімі кабінетамі кансерватараў працавала і патрабавала толькі нязначнай пераналадкі. Галоўным накірункам дзейнасці кабінету Э. Блэра стала канстытуцыйная рэформа. Яна прадугледжвала дэцэнтралізацыю кіравання (прадастаўленне аўтаноміі Уэльсу і Шатландыі і большай самастойнасці дзевяці рэгіёнам Англіі), рэформу выбарчага заканадаўства з частковай адмовай ад даўно крытыкаванай мажарытарнай сістэмы, пераўтварэнні верхняй палаты і ўвядзенне яе абранасці, прынядце Білю аб правах, актуальнасць якога тлумачылася адсутнасцю пісанай канстытуцыі, дзе звычайна акрэсліваюцца правы і свабоды грамадзян, і ў перспектыве нават магчымасць распрацоўкі самой канстытуцыі.

Адной з буйнейшых рэформ, праведзеных лейбарыстамі напрыканцы XX – напачатку XXI стст., стала рэформа рэгіянальнага і мясцовага кіравання. Калі лейбарысты прыйшлі да ўлады, Злучанае Каралеўства заставалася адной з найбольш цэнтралізаваных дзяржаў Еўропы. Урад Э. Блэра вярнуўся да актыўнага абмеркавання праблемы дэвалюцыі, што ў канчатковым выніку прывяло да ўсталявання ў Шатландыі, Уэльсе і Паўночнай Ірландыі заканадаўчых і выканаўчых органаў улады (гл. ніжэй). У 1998 г. быў прыняты Акт аб органах рэгіянальнага развіцця, які ў прыватнасці прадугледжваў стварэнне на тэрыторыі Англіі дзевяці рэгіянальных асамблей. Праведзеныя рэформы расчысцілі шлях для паступовага пераўтварэння Вялікабрытаніі з унітарнай у федэратыўную дзяржаву.

Рэалізацыя намераў па паступоваму пераходу да змешанай, прапарцыйна-мажарытарнай выбарчай сістэмы для парламенцкіх выбараў і выкарыстання прапарцыйнай сістэмы на выбарах у Еўрапарламент сутыкнулася з чаканымі цяжкасцямі. Урадавы законапраект чатыры разы адхіляўся Палатай лордаў і лейбарысты былі вымушаныя ад яго часова адмовіцца. У выніку прапарцыйная сістэма стала выкарыстоўвацца толькі на рэгіянальным узроўні.

Згодна з планамі лейбарыстаў павінна была да непазнавальнасці змяніцца Палата лордаў. Першы этап рэформы прадугледжваў выдаленне з верхняй палаты ўсіх спадчынных пэраў і замена іх прызначанымі пажыццёвымі. Аднак потым прыйшлося пагадзіцца з недатыкальнасцю да заканчэння ўсёй рэформы 92 пэраў. **Рэформа Палаты лордаў 1999 г.** стала не толькі важным крокам у накірунку далейшай дэмакратызацыі брытанскага парламенту, але таксама падарвала бясспрэчнае і заўсёднае дамінаванне ў верхняй палаце кансерватараў (напрыклад, да рэформы налічвалася 350 пэраў-кансерватараў і толькі 19 лейбарыстаў і 23 ліберальныя дэмакраты).

Стабільная эканамічная сітуацыя і даволі паспяховае выкананне перадвыбарчых абяцанняў дазваляла правячай партыі з упэўненасцю глядзець у будучае напярэдадні датэрміновых выбараў 2001 г. Што датычыцца кансерватараў, то партыя перажывала не лепшыя часы. Сакрушальнае паражэнне 1997 г. не спрыяла ўмацаванню ўнутрыпартыйнага адзінства. Напрыклад, кансерватары па-ранейшаму не маглі паразумецца адносна перспектыў Вялікабрытаніі ў ЕС. З пераходам лейбарыстаў на цэнтрысцкія пазіцыі торы аказаліся выціснутымі ўправа і працягвалі губляць электаральную базу.

Новыя выбары, што адбыліся ў чэрвені 2001 г., прайшлі дастаткова ціха, – яўка выбаршчыкаў не дацягнула да 60 %, – і не прынеслі нечаканасцяў. Практычна паўсюль перамаглі дзеючыя дэпутаты. Лейбарысты захавалі камфортную большасць – 40,7 % і 413 дэпутацкія мандаты, кансерватары заваявалі 31,7 % і 166 мандатаў, а ліберал-дэмакраты адпаведна – 18,3 % і 52.

Адным з галоўных напрамкаў унутранай палітыкі ўраду Э. Блэра заставалася правядзенне канстытуцыйнай рэформы. Аднак працяг мадэрнізацыі Палаты лордаў сутыкнуўся з рознагалоссямі ў лагеры саміх лейбарыстаў адносна прынцыпаў і працэдур яе фарміравання. Летам 2003 г., нягледзячы на цяжкасці, звязаныя з падзеямі вакол Іраку, Э. Блэр выступіў з новымі ініцыятывамі: ён прапанаваў скасаваць пасаду лорда-канцлера, стварыць Вярхоўны суд і незалежную камісію па прызначэнні суддзяў. Галоўная ідэя заключалася ў тым, каб праз умацаванне судовай улады забяспечыць далейшы прагрэс у стварэнні сапраўднага падзелу ўлады. Для дэмакратычнай сістэмы вельмі дзіўным было спалучэнне ў руках аднаго чалавека, лорда-канцлера, функцый члена ўраду, спікера верхняй палаты парламенту, і вярхоўнага суддзі, які аднаасобна пры-

значае суддзяў. Хаця сама пасада лорда-канцлера скасаваная не была, функцыі высокага чыноўніка былі моцна абмежаваныя пераважна сферай адказнасці выканаўчай улады.

Напярэдадні парламенцкіх выбараў 2005 г. лейбарысты акцэнтавалі ўвагу брытанцаў на моцнай эканоміцы. Але гэтым разам разлічваць на паўтарэнне бліскучых поспехаў двух папярэдніх выбараў было вельмі цяжка.

Непапулярнасць вайны ў Іраку і малазразумелая перакананасць Э. Блэра ў праваце кааліцыйных сіл на чале з ЗША адчувальна білі па папулярнасці правячай партыі і асабіста яе лідара. Лейбарысты акцэнтавалі ўвагу на выдатныя эканамічныя паказчыкі і спрабавалі мінімізаваць страты ад непапулярнага рашэння ўзяць удзел у Іракскай вайне. Кансерватары рабілі стаўку на больш жорсткае іміграцыйнае заканадаўства, змаганне са злачыннасцю і паляпшэнне якасці медыцынскага абслугоўвання. Ліберальныя дэмакраты галоўным пунктам сваёй праграмы абралі крытыку авантурыстычнай знешняй палітыкі Э. Блэра і планаў ценявога ўраду кансерватараў.

Лейбарысты страцілі 5,5 % (35,2 % найменшы паказчык для ўраду большасці ў брытанскай гісторыі) і 47 месцаў; большасць складала цяпер толькі 66 мандатаў, а не 167. Кансерватары і ліберальныя дэмакраты атрымалі адпаведна 198 і 63 месцы. Адным з вынікаў выбараў стаў прыход на пасаду старшыні Кансерватыўнай партыі і кіраўніка ценявога новага ўраду маладога лідара – 39-гадовага Дэвіда Кэмерана.

Апошнія гады прэ’мерства Э. Блэра прайшлі пад хвалямі вастрэйшай крытыкі за празмерна праамерыканскі знешнепалітычны курс і ўдзел ва ўзброеных авантурах ЗША. Узровень грамадскай падтрымкі лейбарысцкага лідара аказаўся гэткім слабым, што ставіў пад сумненне любыя спадзяванні правячай партыі на чарговую перамогу на выбарах у парламент. У чэрвені 2007 г. Э. Блэр склаў з сябе паўнамоцтвы прэм’ер-міністра і перадаў лідарства ва ўрадзе і партыі свайму паплечніку, а потым і канкурэнту Гордану Браўну.

На працягу некалькіх апошніх дзесяцігоддзяў XX ст. у Злучаным Каралеўстве назіралася ўзмацненне нацыянальнай самасвядомасці народаў брытанскіх ускраінаў – шатландцаў і валійцаў. Напрыканцы 1970-х гг. спроба дэвалюцыйнай рэформы, як вядома, не мела поспеху. Аднак на фоне росту папулярнасці нацыяналістычных партый і сепаратысцкіх настрояў (нават у былым кельцкім Карнуоле!) неабходнасць абнаўлення рэгіянальнай палітыкі станавілася відавочнай усім асноўным палітычным сілам краіны. У 1994 г. кансерватары ажыццявілі рэформу мясцовай улады ў Шатландыі: рэгіянальныя органы кіравання атрымалі больш шырокія паўнамоцтвы ў пытаннях адукацыі, аховы здароўя, дарожнага і жыллёвага будаўніцтва, экалагічнай палітыкі. Ва Ўэльсе былі ўведзеныя элементы г. зв. «карпаратыўнай аўтаноміі», заснаванай на кансалідацыі нацыянальнай моўнай прасторы. Былі нарэш-

це замацаваныя прывілеі валійскай мовы, у тым ліку абавязковае вывучэнне яго ў школах Уэльсу, стварэнні тэлеканалаў на валійскай мове, напісанне ўсіх указальнікаў і назваў на двух мовах.

Лейбарысцкая партыя мела намер пайсці яшчэ далей. У 1997 г. яна ініцыявала правядзенне паўторных рэферэндумаў па пытаннях, звязаных з **дэвалюцыйнай рэформай**. Гэтым разам і шатландцы і валійцы выказаліся ў падтрымку стварэння мясцовых заканадаўчых сходаў. Прадстаўнічы орган ва Ўэльсе атрымліваў паўнамоцтвы ў сферы рэгіянальнага эканамічнага развіцця, сельскай гаспадаркі, культуры, адукацыі і экалогіі, але права прымаць рэгіянальныя законы і вацірaваць падаткі не меў. Шатландскі заканадаўчы сход надзяляўся нашмат шырэйшымі паўнамоцтвамі і, ў тым ліку, меў магчымасць прымаць законы і падаткі. Летам 1999 г. адбылося адкрыццё валійскай Заканадаўчай Асамблеі (першы падобны орган у гісторыі краю) і Шатландскага парламенту (апошні засядаў у далёкім 1707 г.).

Адным з найбольш значных дасягненняў першага тэрміну прэм'ерства Т. Блэра стала падпісанне 10 красавіка 1998 г. **Белфасцкага пагаднення**, больш вядомага пад назвай «**пагадненне на Вялікую Пятніцу»** (англ. *Good Friday Agreement*). Большасць партый Паўночнай Ірландыі пры пасярэдніцтве ірландскага і брытанскага ўраду дамовіліся аб палітычным урэгуляванні Ольстэрскага канфлікту, за тры дзесяцігоддзі якога на той час ужо загінула каля 3600 чалавек.

Пагадненне прадугледжвала стварэнне ў правінцыі аўтаномных органаў ўлады – Паўночнаірландскай Асамблеі з заканадаўчымі паўнамоцтвамі і Выканаўчага камітэту ў складзе 12 міністраў абодвух галоўных канфесій. Дзеля надання пагадненню больш трывалай інстытуцыйнай базы была запланавана арганізацыя міністэрства міжірландскай рады як органа супрацоўніцтва Паўночнай Ірландыі ды Ірландскай Рэспублікі і міжурадавай Рады Брытанскіх астравоў з удзелам прадстаўнікоў Вялікабрытаніі, Ірландыі, Ольстэру, Шатландыі і Уэльса. Ірландская Рэспубліка абавязвалася адмовіцца ад тэрытарыяльных прэтэнзій на Паўночную Ірландыю. Важнейшым палажэннем пагаднення стала раззбраенне паўночнаірландскіх ваенізаваных груповак і вызваленне зняволеных.

Дамоўленасці атрымалі падтрымку грамадстваў абедзвюх частак Ірландыі на рэферэндумах, якія адначасова адбыліся 23 траўня 1998 г. У Паўночнай Ірландыі за рэалізацыю Белфасцкага пагаднення выказалася 71 %, а ў Ірландскай Рэспубліцы – нават 94 %. Нягледзячы на пэўныя праблемы – частыя парламенцкія крызісы і нават асобныя тэрарыстычныя вылазкі, Белфасцкае пагадненне здолела паставіць этнаканфесійныя супярэчнасці ў цывілізаваныя палітычныя межы і зняць ў грамадстве напружанне, што атручвала жыццё паўночнаірландцаў некалькі апошніх дзесяцігоддзяў. За

значны ўнёсак ў справу паўночнаірландскага ўрэгулявання каталік Джон Х'юм і пратэстант Дэвід Трымбл, ідэолагі і актыўныя ўдзельнікі перагаворнага працэсу, былі ўзнагароджаныя Нобелеўскай прэміяй міру за 1998 г.

У чэрвені 2007 г. новым прэм'ер-міністрам Вялікабрытаніі стаў Гордан Браўн (2007 – 2010), былы канцлер казначэйства ў кабінеце Э. Блэра. Ужо ў першыя тыдні прэм'ерства новы лідар выступіў з ініцыятывамі будаўніцтва новага таннага і экалагічнага жылля ў брытанскай правінцыі, новы комплекс канстытуцыйных захадаў для забеспячэння празрыстасці і адказнасці ўладаў перад народам, рэфармавання міжнародных інстытутаў, пераходу да больш стрыманых і дзелавых адносін паміж Лонданам і Вашынгтонам. Тым не менш, з рэалізацыяй агучаных планаў узніклі цяжкасці. У хуткім часе Вялікабрытанія сутыкнулася з падвойным уздзеяннем іпатэчнага крызісу ў ЗША і сусветнага фінансавага крызісу. У выніку рэкорднага ўзроўню з 1997 г. дасягнула інфляцыя, вырасла беспрацоўе. Падатковая рэформа, якая адбывалася на фоне падаражання нафтапрадуктаў і харчавання, даволі моцна ўдарыла па найбольш уразлівым сацыяльным слаям – моладзі, малазабяспечаных брытанцах, людзях сталага веку і дзяржаўных служачых.

Ужо праз год прэм'ерства Г. Браўна яго асабісты рэйтынг упаў з 65 % да 16 % і пайшлі размовы аб яго магчымай замене на пасадах кіраўніка кабінету і лідара партыі. Найлепшы спосаб умацаваць лідарскія пазіцыі ў Вялікабрытаніі – прывесці сваю партыю да электаральнай перамогі. Агучаныя прэм'ер-міністрам планы абвяшчэння ранніх датэрміновых парламенцкіх выбараў, засталіся толькі словамі, а таму далі магчымасць апанентам Г. Браўна абвінаваціць яго ў непаслядоўнасці і баязлівасці.

Парламенцкія выбары адбыліся толькі 6 траўня 2010 г. Перадвыбарчая гонка аказалася як ніколі напружанай. Сур'ёзную канкурэнцыю партыям-лідарам склалі ліберальныя дэмакраты на чале з Нікаласам (Нікам) Клэгам. Ніводная партыя не здолела заваяваць абсалютную большасць дэпутацкіх мандатаў (326): кансерватары правялі ў парламент 306 дэпутатаў (+ 97 у параўнанні з 2005 г.; 36,1 %), лейбарысты – 258 (- 91; 29 %), ліберальныя дэмакраты – 57 (- 5; 23 %). Упершыню з 1979 г. узнікла сітуацыя «падвешанага парламенту» і вядучым партыям прыйшлося заняцца пошукам саюзнікаў. У гэтай справе поспех быў за кансерватарамі, якія дамовіліся аб кааліцыі з ліберальнымі дэмакратамі. Новым прэм'ер-міністрам стаў Дэвід Кэмеран, а яго намеснікам Н. Клэг.

### Вялікабрытанія і сучасныя пытанні еўрапейскай інтэграцыі. «Асаблівыя адносіны» з ЗША. Пазіцыя Вялікабрытаніі па вастрэйшых праблемах сучаснасці. Брытанская Садружнасць нацый

У той час, як М. Тэтчар скрайне скептычна ацэньвала неабходнасць паглыблення еўрапейскай інтэграцыі, Дж. Мэйджар не проста бачыў у ёй выдатныя перспектывы для краіны, а яшчэ й здолеў выдатна абгрунтаваць

сваю пазіцыю, выступіўшы з шэрагам наватарскіх тактычных ідэй. Пазіцыя Вялікабрытаніі ў той час адыграла вялікую ролю ў адмове ад федэралісцкай канцэпцыі будаўніцтва ЕС і замацаванні паняцця «Еўрапейскі саюз», як новай якасці супрацоўніцтва еўрапейскіх краін. Дж. Мэйжар выступіў гарачым прыхільнікам **«інтэграцыі розных хуткасцяў»**. Згодна з гэтай канцэпцыяй, працэс прасоўвання дзяржаў-членаў ЕС па шляху інтэграцыі не павінны быць сінхронным і аднастайным. Гэта дазволіла Вялікабрытаніі адмовіцца ад канкрэтных абавязкаў, не абвастраючы адносін з партнёрамі па ЕС. Важнымі перамогамі прэм’ер-міністра сталі галасаванне Палатай абшчын аб далучэнні Вялікабрытаніі да Сацыяльнай хартыі ЕС і пачатку імплементацыі (ажыццяўлення) рашэнняў Маастрыхцкага пагаднення.

Дж. Мэйджар заняў пасаду прэм’ер-міністра незадоўга да таго, як пачалася вайна ў Персідскім заліве (1991). Вялікабрытанія у вайсковых аперацыях ўзяла актыўны ўдзел, а яе лідар стаў адным з ініцыятараў ідэі стварэння ў Іраку беспалётнай зоны (англ. *no-fly zone*) – прасторы, закрытай для палётаў іракскіх ваенна-паветраных сіл. Гэта дапамагло абараніць ад уладных рэпрэсіяў курдаў і мусульман-шыітаў Іраку.

Традыцыйна шчыльнае супрацоўніцтва са Злучанымі Штатамі, у чарговы раз прадэманстраванае падчас вайны у Персідскім заліве, некалькі аслабела з прыходам у Белы дом дэмакрата Біла Клінтана. Дж. Мэйджар адкрыта сімпатызаваў рэспубліканцам і ў паслявыбарчы перыяд гэтак і не здолеў усталяваць з новым амерыканскім лідарам асабістых адносін, адпаведных ступені блізасці сваіх дзяржаў. Адноснае ахаладжванне брытана-амерыканскіх адносінаў праявілася падчас міжэтнічнага канфлікту ў Босніі і Герцагавіне. Вялікабрытанія рашуча выступіла супраць уцягвання міжнародных міратворчых сіл у баявыя дзеянні. Стрыманая пазіцыя брытанскай дыпламатыі дазволіла ёй у 1995 г. выступіць пасярэднікам у арганізацыі перамоў паміж канфліктуючымі бакамі для падпісання мірнага дагавору.

Вялікабрытанія пільна сачыла за падзеямі ў СССР, аказваючы падтрымку сілам, якія выступалі за дэмакратычныя перамены. У адрозненне ад многіх сваіх заходніх партнёраў брытанскія ўлады рашуча асудзілі крывавыя студзеньскія падзеі 1991 г. у Літве і Латвіі і путч 19 жніўня 1991 г. Пасля распаду СССР Вялікабрытанія імкнулася садзейнічаць дэмакратычнаму прагрэсу ў постсавецкіх дзяржавах. Напрыклад, падчас вастрэйшага канфлікту Б. Ельцына з парламентам у кастрычніку 1993 г. Дж. Мэйджар першым з заходніх лідараў выказаў падтрымку свайму расійскаму калегу. Добра ведаючы ўсе турботы змагання з сепаратызмам брытанскі прэм’ер-міністр дастаткова стрымана адрэагаваў на пачатак Чачэнскай вайны.

Сярод найбольш яўных пралікаў брытанскай дыпламатыі часоў Дж. Мэйджара можна назваць ігнараванне вастрыні палітычных праблем Руанды. Нежаданне Вялікабрытаніі і шэрагу іншых дзяржаў Захаду павялічыць сілы ААН у гэтай афрыканскай краіне вельмі верагодна каштавала не менш за 800 тыс. жыццяў людзей, якія сталі ахвярамі генацыду.

З прыходам да ўлады лейбарысцкага ўраду на чале з Т. Блэрам адбываецца адраджэнне «асаблівых адносін» Вялікабрытаніі са Злучанымі Штатамі. У межах «новага старога» курсу у 1998 г. Вялікабрытанія падтрымала амерыканскія антытэрарыстычныя акцыі ў Судане і Афганістане, а потым ажыццявіла сумесную вайсковую аперацыю «Ліса пустыні» супраць Іраку. У 1999 г. брытанскія ўзброеныя сілы ўзялі актыўны ўдзел у вайне супраць Югаславіі. Вялікабрытанія паслядоўна выступала за пашырэнне НАТО на Усход – прыём у Паўночнаатлантычны альянс былых краін сацыялістычнага лагеру і савецкіх рэспублік.

Абвяшчэнне Дж. Бушам-малодшым вайны супраць тэрарызму аказала на брытанскую знешнюю палітыку моцны ўплыў. Вялікабрытанія стала яшчэ больш адданым саюзнікам Злучаных Штатаў ва ўсіх яе дзеяннях на міжнароднай арэне. Актыўны ўдзел у вайне ў Афганістане (з 2001 г.) і, асабліва, вайна ў Іраку (з 2003 г.) выклікалі вострую крытыку лейбарысцкага ўраду, а найперш Э. Блэра. Пры абмеркаванні ўварвання ў Ірак супраць знешнепалітычнай лініі прэм'ер-міністра выступілі 139 дэпутатаў лейбарыстаў, што з'яўлялася небывалай праявай ігнаравання партыйнай дысцыпліны. Малазразумелыя мэты вайсковых акцыяў і тым больш іх крывавыя наступствы сталі важнейшым фактарам падзення папулярнасці Э. Блэра і яго датэрміновай адстаўкі.

Еўрапейскі накірунак знешняй палітыкі Э. Блэра аказаўся не гэткім выніковым, як на тое разлічваў яе галоўны ідэолаг. «Самы еўрапейскі лідар Вялікабрытаніі ў яе гісторыі» не здолеў пераканаць еўрапейцаў у сур'ёзнасці інтэграцыйных намераў сваёй краіны, а брытанцаў у неабходнасці «вяртання ў Еўропу». Прэтэнзіі Т. Блэра на дасягненне Вялікабрытаніяй лідарства ў ЕС слаба спалучаліся з падкрэслена праамерыканскім курсам прэм'ер-міністра, а пытанні далучэння да зоны еўра і прыняцця еўраканстытуцыі выклікалі вострыя дыскусіі ў грамадстве і нават правячай партыі.

Знешнепалітычны курс Г. Браўна, нягледзячы на заяўленыя карэкціроўкі, мала чым адрозніваўся ад дыпламатыі Т. Блэра і гэта стала адным з фактараў, якія не дазволілі лейбарыстам заваяваць перамогу на парламенцкіх выбарах 2010 г.

## Тэма 7. Францыя ў 1945 – 1970-я гг.

### Эканамічнае развіццё Францыі пасля Другой сусветнай вайны. Асаблівасці эканамічнага развіцця Чацвёртай рэспублікі. Францыя і «Агульны рынак»

Вайна і чатырохгадовая акупацыя каштавалі Францыі 1440 млрд. франкаў. Вялікімі былі вайсковыя страты – каля 1,1 млн. чалавек. З улікам памерлых ад голаду і хваробаў, насельніцтва краіны зменшылася на 3,3 млн. На 62 % скарацілася прамысловая вытворчасць, яшчэ больш архаічнай стала яе структура, працяглы час не абнаўляўся машынны парк. У параўнанні з даваенным 1938 г. амаль удвая зменшылася сельскагаспадарчая вытворчасць. Краіна практычна засталася без гандлёвага і ваеннага флоту. Паколькі вайна закранула зямлю Францыі непасрэдна (пацярпелі 80 дэпартаментаў), яе разбурэнні былі аграмаднымі. Былі зруйнаваныя або моцна пашкоджаныя 210 тыс. будынкаў, 195,5 тыс. прамысловых прадпрыемстваў, 235 тыс. сялянскіх гаспадарак. Збанкрутавала больш за 100 тыс. дробных прамысловых і гандлёвых прадпрыемстваў. Вартасць франка знізілася ў 6 разоў. Краіна адчувала востры недахоп прамысловага абсталявання, сыравіны, прадуктаў харчавання. Моцна разбуранай аказалася транспартная сістэма. Нават захоўваючы фармальныя атрыбуты вялікай дзяржавы, у эканамічным і вайсковым плане Францыя далёка адставала ад вядучых дзяржаў антыгітлераўскай кааліцыі СССР, Вялікабрытаніі і, тым больш, ЗША. Значна пагоршылася матэрыяльнае становішча насельніцтва, а 3/4 французаў сутыкнуліся з голадам. У выніку нацыяналізацыі ў краінах Цэнтральнай і Паўднёва-ўсходняй Еўропы і выплаты Францыяй ваенных пазык былі канчаткова падарваныя яе пазіцыі сусветнага ліхвяра. Хутка ўздымаўся нацыянальна-вызваленчы рух у французскай каланіяльнай імперыі. Яшчэ падчас вайны пачаўся яе распад: абвясцілі незалежнасць Індакітай, Сірыя і Ліван.

Ліквідацыя пасляваеннай разрухі стала галоўнай задачай французскіх урадаў. Але разнароднасць палітычных сіл, якія прыйшлі да ўлады пасля вызвалення, абумоўлівала адсутнасць адзінства эканамічнай і фінансавай палітыкі. У той час як буржуазныя партыі рабілі стаўку на правядзенне рэформ грашова-фінансавай сістэмы, камуністы настойвалі на прыярытэтнасці нацыяналізацыі і стварэння сістэмы сацыяльнай абароны насельніцтва.

Вастрэйшыя палітычныя дыскусіі адносна эканамічных прыярытэтаў скончыліся кампрамісам. На працягу 1945 – 1947 гг. былі нацыяналізаваны электраэнергетыка, вуглездабыча, газавая прамысловасць, авіяпрамысловасць, марское суднаходства, паветраны транспарт, аўтамабільныя заводы «Рэно», цэнтральная эмісійная установа краіны – Французскі банк, а таксама чатыры буйнейшыя дэпазітныя банкі, ашчадныя касы і страхавыя кампаніі. У выніку ў дзяржаўныя рукі перайшло каля 20 % вытворчых магутнасцяў краіны. Нацыя-

налізацыя праводзілася за істотную кампенсацыю, але прадпрымальнікі-калабаранты на яе разлічваць не маглі.

Яшчэ ў 1944 – 1945 гг. адбыліся значныя змены ў галіне сацыяльнага заканадаўства. Былі адноўленыя 40-гадзінны працоўны тыдзень (звышурочная праца аплачвалася па падвышаных расцэнках), 2-тыднёвыя аплатныя адпачынкі для рабочых і 3-тыднёвыя – для служачых. Істотна павялічыліся памеры пенсій і сямейных дапамог. Была створана адна з найлепшых у свеце адзіная дзяржаўная сістэма сацыяльнага страхавання, якая распаўсюджвалася на ўсіх асоб наёмнай працы, акрамя занятых у сельскай гаспадарцы. Улады здолелі некалькі палепшыць матэрыяльнае становішча працоўных.

У 1947 г. урад прыняў першы ў гісторыі Францыі агульны дзяржаўны план мадэрнізацыі і рэканструкцыі прамысловасці – «**план Манэ**» (1947 – 1953). Пасля заканчэння яго рэалізацыі ажыццяўляўся г. зв. «другі план» (1954 – 1957), які дзейнічаў амаль да канца існавання Чацвёртай рэспублікі. Дзяржаўныя планы спачатку эканамічнага, а потым і сацыяльнага развіцця сталі пастаянным элементам французскай эканомікі. Пры гэтым французская сістэма планавання насіла не абавязковы, а індыкатыўны характар.

Патрэбы аднаўлення эканомікі прывялі да таго, што большая частка капіталаўкладанняў стала скіроўвацца ў прамысловасць. Гэта дазволіла паскорыць тэмпы прамысловай вытворчасці і ўжо ў 1948 г. дасягнуць яе даваеннага ўзроўню. Аднаўленне ў сельскагаспадарчым сектары ішло больш павольна, таму ім падобны рубеж быў узяты толькі ў 1950 г.

Пасля таго, як з ураду былі выключаны камуністы, прыпыніўся працэс нацыяналізацыі, а Злучаныя Штаты палічылі магчымым аказанне сістэматычнай эканамічнай дапамогі Францыі. 28 чэрвеня 1948 г. краіны падпісалі пагадненне аб супрацоўніцтве – Францыя далучылася да «плана Маршала». На працягу 1948 – 1951 гг. ЗША вылучылі для яе крэдыты, прадукты харчавання, сыравіну, прамысловыя тавары і абсталяванне на суму каля $2,5 млрд. Рэалізацыя гэтай праграмы суправаджалася актыўным пранікненнем амерыканскага капіталу ў эканоміку Францыі. Урад быў абавязаны даваць амерыканцам вычарпальную інфармацыю адносна ўсіх важнейшых паказчыкаў нацыянальнай эканомікі. Хаця падобнае ўмяшанне рэзка крытыкавалася многімі палітычнымі сіламі краіны, найперш камуністамі, амерыканскі бізнес аказаў прагрэсіўнае ўздзеянне на рацыяналізацыю і тэхналагічнае пераўзбраенне вытворчасці.

Удзел у «плане Маршала» разам з ліквідацыяй наступстваў вайны і буйнымі дзяржаўнымі капіталаўкладаннямі, дасягненнямі навукова-тэхнічнага прагрэсу, пачаткам заходнееўрапейскай інтэграцыі і станоўчай сусветнай кан’юнктурай спрыялі павышэнню тэмпаў развіцця эканомікі. Ужо ў 1957 г. аб’ём прамысловай вытворчасці Францыі больш як удвая перавысіў даваенны. Па тэмпах росту краіна апярэдзіла Вялікабрытанію і ЗША. Асабліва паспяхова, як

і паўсюль, развіваліся новыя галіны прамысловасці. 1950-я гг. прайшлі пад знакам мілітарызацыі эканомікі. Гэта было абумоўлена ўступленнем краіны ў НАТО, а таксама неабходнасцю весці каланіяльныя войны. Сельская гаспадарка перажывала бурны перыяд абнаўлення – у 1950-я гг. тут завяршыўся тэхнічны пераварот. Дзякуючы хуткаму росту прамысловасці, транспарту і сельгасвытворчасці французскі капіталізм страціў традыцыйны ліхвярскі характар. Хаця вядучую ролю ў эканоміцы адыгрывалі буйныя прамысловыя і фінансавыя карпарацыі, па ступені канцэнтрацыі вытворчасці Францыя адставала ад іншых буйных капіталістычных дзяржаў. Як і раней, працягвалі існаваць шматлікія дробныя і драбнюткія прадпрыемствы і крамы.

Стрымліваючымі фактарамі ў развіцці французскай эканомікі былі небывала высокія тэмпы інфляцыі і хуткі рост цэн. Да 1957 г. цэны ў 25 разоў перавысілі даваенны ўзровень. Узнікла «інфляцыйная спіраль», калі за ростам цэн, адбывалася падвышэнне заробкаў, якое ў сваю чаргу правакавала новы скачок цэн. У выніку за той жа перыяд намінальныя заробкі падняліся толькі ў 21 раз, што на практыцы азначала падаражанне кошту жыцця. Даць рады інфляцыі і дарагоўлі Францыя была няздольная: хранічная няўстойлівасць урадаў, дарагія і безвыніковыя каланіяльныя войны абыходзіліся дарагой цаной.

Прамысловы ўздым і навукова-тэхнічны прагрэс істотна паўплывалі на структуру насельніцтва Францыі. Згодна з дадзенымі перапісу насельніцтва 1954 г. у прамысловасці было занята больш за 37 % эканамічна актыўнага насельніцтва, у сферы паслуг – 35 % і толькі каля 28 % – у сельскай гаспадарцы (на 10 % менш, чым у перадваенны перыяд). Паскорыўся працэс урбанізацыі, хаця яе тэмпы і саступалі тым, што назіраліся ў ЗША, Японіі і ФРГ.

### «Часовы рэжым». Новая расстаноўка палітычных сіл. Дзейнасць Устаноўчага сходу. Канстытуцыя 1946 г. Палітычнае жыццё Чацвёртай рэспублікі ў Францыі. Выключэнне камуністаў з ураду. Кааліцыя «трэцяй сілы» і яе палітыка. Дзейнасць урада рэспубліканскага фронту. Абвастрэнне сацыяльна-палітычных супярэчнасцей. Крызіс Чацвёртай рэспублікі, яе падзенне

У ходзе вызвалення Францыі ад гітлераўскіх акупантаў улада ў краіне перайшла да створанага 9 верасня 1944 г. Часовага ўраду на чале з генералам Шарлем дэ Голем. Ва ўрадзе бралі ўдзел усе асноўныя групоўкі Супраціўлення, у тым ліку камуністы. Гэтак быў усталяваны Часовы рэжым, праіснаваўшы да прыняцця ў 1946 г. канстытуцыі Чацвёртай рэспублікі.

Становішча Францыі было катастрафічным. Яго вельмі красамоўна апісаў Ш. дэ Голь: «*Усё на месцы, не хапае толькі дзяржавы*». З падзеннем рэжыму Вішы рухнулі існаваўшыя ўладныя інстытуты, былі дарэшты зруйнаваныя апошнія фрагменты канстытуцыйнай сістэмы Трэцяй рэспублікі. Згодна з надзвычайнымі ўрадавымі арданансамі аднаўлялася сістэма прэфектур і му-

ніцыпалітэтаў. Новыя ўлады неадкладна прыступілі да сацыяльна-эканамічных пераўтварэнняў. Хуткія і рашучыя дзеянні дазволілі ў самыя кароткія тэрміны спыніць далейшую палітычную дэцэнтралізацыю, ліквідаваць «вакуум улады» і нармалізаваць жыццё ў краіне.

Бясслаўны крах Трэцяй рэспублікі, акупацыя, дзейнасць калабарацыянісцкага рэжыму Вішы, разгортванне магутнага руху Супраціўлення і ўзрастанне аўтарытэту Савецкага Саюзу аказалі аграмадны ўплыў на расстаноўку палітычных сіл у Францыі. Большасць правых партый дыскрэдытавала сябе і страціла ранейшы ўплыў. На вядучыя пазіцыі высунуліся антыфашысцкія, патрыятычныя групоўкі, шчыльна звязаныя з Супраціўленнем. Сярод іх вылучаліся левыя сілы.

Буйнейшай палітычнай партыяй краіны стала **Французская камуністычная партыя (ФКП)**, у шэрагах якой у 1946 г. знаходзілася 900 тыс. чалавек (амаль утрая болей, чым у сацыялістаў!). Марыс Тарэз і Жак Дзюкло, лідары камуністаў, імкнуліся да пашырэння сацыяльнай базы партыі за кошт сялянства, рамеснікаў і служачых, адмовіліся ад найбольш радыкальных праграмных установак. Першачарговымі задачамі ФКП сталі дэмакратызацыя дзяржаўнага кіравання, антыманапалістычная палітыка, барацьба з ваеннай пагрозай і антыкаланіялізмам.

Па-ранейшаму трывалыя пазіцыі захоўвалі сацыялісты – **Сацыялістычная фракцыя Рабочага інтэрнацыяналу** (**СФІО**; *Section Française de l'Internationale Ouvrière*). Пакуль пасада генеральнага сакратара партыі заставалася ў Леона Блюма сацыялісты працягвалі выказвацца за адзінства дзеянняў з камуністамі і знішчэнне капіталізму. З пераходам партыйнага лідарства ў рукі Гі Мале пад уплывам неабходнасці барацьбы з ФКП за электарат і спаўзання свету да «халоднай вайны» адбываецца направенне сацыялістаў. Ідэолагі СФІО распрацоўваюць канцэпцыю «дэмакратычнага сацыялізму» і арыентуюцца на супрацоўніцтва з рэспубліканскімі буржуазнымі партыямі.

Крах Трэцяй рэспублікі адмоўна паўплываў на становішча аднаго з яе «слупоў» – **Партыю радыкалаў і радыкал-сацыялістаў**. Яе лідар Э. Эрыо ўжо не меў таго аўтарытэту, як у даваенныя гады, калі неаднаразова ўзначальваў французскі ўрад. Статус вядучай рэспубліканскай буржуазнай сілы дастаўся г. зв «памяркоўнай плыні», базу якой склалі Рэспубліканская партыя свабоды, Сялянская партыя сацыяльнага дзеяння і група «незалежных рэспубліканцаў». У яе ідэалагічным падмурку ляжалі безумоўны прыярытэт ліберальных прынцыпаў у эканоміцы і палітыцы, развіццё свабоднага рынку і атлантычная салідарнасць на міжнароднай арэне.

У 1944 г. група каталіцкіх дзеячаў руху Супраціўлення арганізавала новую партыю – **Народна-рэспубліканскі рух** (**МРП;** *Mouvement Républicain Populaire*). Адметнасцю дактрыны МРП з'яўлялася спалучэнне агульнадэмакратычных ідэй Супраціўлення з сацыяльным каталіцызмам. Гэта рабіла

партыю цалкам унікальнай з’явай у французскім палітычным жыцці: традыцыйна палітычныя партыі Францыі стаялі на свецкіх пазіцыях і крытычна ставіліся да каталіцкага касцёлу. МРП прызнавалі важнасць правядзення структурных, у тым ліку нацыяналізацыі, і сацыяльных рэформ. У адрозненне ад «памяркоўнай плыні», якая перадусім гуртавала ў сваіх шэрагах уплывовых палітыкаў міжваеннай пары і таму магла быць кваліфікаваная як «элітарная партыя» або «партыя натабляў», Народна-рэспубліканскі рух з’яўляўся масавай хрысціянска-дэмакратычнай партыяй з шырокай сацыяльнай базай – ад буржуазіі да працоўных слаёў.

У палітычным жыцці пасляваеннай Францыі актыўны ўдзел бралі невялікія групы, што выйшлі з руху Супраціўлення. На базе некаторых з іх у 1945 г. быў створаны **Дэмакратычны і Сацыяльны саюз Супраціўлення** (**ЮДСР**; *L'Union démocratique et socialiste de la Résistance*). У адрозненне ад ФКП ці МРП гэтая партыя не з’яўлялася масавай і не мела разгалінаванай рэгіянальнай структуры, а была тыповай «парламенцкай партыяй» з цэлым шэрагам моцных і амбіцыйных лідараў. Зусім не адрознівалася ЮДСР і ўнутранай аднароднасцю і згуртаванасцю. У партыі вылучыліся тры плыні. Першую склалі прыхільнікі Ш. дэ Голя, якія потым далучыліся да галісцкага руху. Цэнтрысцкую плынь, што выступала за стварэнне шырокай цэнтрысцкай кааліцыі і захаванне парламенцкай дэмакратыі, узначальваў старшыня партыі Рэнэ Плевэн, а левую, куды ўвайшлі прыхільнікі ідэі заснавання некамуністычнага левага блоку і праціўнікі дэ Голя, – Франсуа Мітэран.

Асаблівае месца ў партыйным спектры Францыі займалі прыхільнікі – галісты. Заснавальнік «Свабоднай Францыі» і галава Часовага ўраду генерал Ш. дэ Голь імкнуўся захаваць імідж агульнанацыянальнага лідара і не спяшаўся надаць руху сваіх прыхільнікаў нейкую арганізаваную форму. Дэ Голь і галісты крытыкавалі саму спробу аднавіць «рэжым партый», якія прывёў Францыю да катастрофы 1940 г. Акрамя таго Ш. дэ Голь не спяшаўся фармуляваць разгорнутую праграму сацыяльна-эканамічных пераўтварэнняў, а рабіў акцэнт на вырашэнні пытання змены канстытуцыйнага ладу, узмацненне і цэнтралізацыю дзяржаўных інстытутаў.

Адным з важных крокаў у накірунку стабілізацыі функцыянавання дзяржаўных органаў улады стала чыстка чыноўніцкага апарату ад прыхільнікаў вішысцкага рэжыму. Больш за 2 тыс. актыўных вішыстаў на чале з кіраўнікамі марыянетачнага ўрада П’ерам Лавалем і Анры Петэнам былі асуджаныя на смяротнае пакаранне, а яшчэ каля 40 тыс. атрымалі розныя тэрміны турэмнага зняволення (у сувязі з вельмі сталым узростам 89-гадоваму Петэну замянілі смяротную кару пажыццёвым зняволеннем).

21 кастрычніка 1945 г. адбыліся выбары ва Ўстаноўчы сход і аднačасова рэферэндум адносна неабходнасці яго склікання і абмежавання яго функцый

выключна пытаннямі канстытуцыйнага будаўніцтва. Выбары адбываліся па прапарцыйнай сістэме, таму іх вынікі дастаткова дакладна адлюстравалі палітычныя перавагі і настроі французаў. Важнай асаблівасцю выбараў ва Ўстаноўчы сход стала тое, што ўдзел у іх упершыню бралі жанчыны. Перамагла ФКП, якая набрала амаль 26 % галасоў, другое месца заваявала МРП – 23,9 %, трэцяе з 23,4 % – СФІО. «Памяркоўныя» і радыкалы атрымалі адпаведна 15 % і 10 %. Галісты, якія адмовіліся да арганізацыйнай кансалідацыі свайго руху, ужо ў кароткатэрміновай перспектыве рызыкавалі застацца на ўзбочыне нацыянальнага палітычнага жыцця.

Супольна камуністы і сацыялісты мелі абсалютную большасць ва Ўстаноўчым сходзе і магчымасць утварыць левы ўрад. Аднак кіраўніцтва СФІО насцярожана паставілася да гэткага супрацоўніцтва і настаяла на ўключэнне ва ўрад і МРП. У выніку ў кааліцыйны Часовы ўрад увайшлі па 5 прадстаўнікоў ад ФКП, СФІО і МРП, а таксама 6 беспартыйных прыхільнікаў Ш. дэ Голя, які і стаў прэм’ер-міністрам. Гэткі стракаты саюз – ад камуністаў да галістаў – быў асуджаны на нядоўгае існаванне. Ужо праз месяц на знак пратэсту супраць умяшання Ўстаноўчага сходу ў справы Часовага ўраду Ш. дэ Голь сышоў у адстаўку.

Увесну 1946 г. быў падрыхтаваны праект новай канстытуцыі, згодна якому Францыя павінна была стаць парламенцкай рэспублікай з поўным дамінаванне органаў прадстаўнічай (заканадаўчай) улады. Супраць праекту падчас абмеркавання рашуча выступалі толькі галісты і «памяркоўныя», але на травеньскім рэферэндуме 1946 г. большасць яго ўдзельнікаў (51,6 %) адмовіла яму ў падтрымцы. Правал рэферэндуму выклікаў неабходнасць правядзення новых выбараў і склікання новага Ўстаноўчага сходу.

Новыя выбары прынеслі даволі падобныя вынікі, што і некалькі месяцаў раней (МРП – 28,1 %, ФКП, 26,4 %, СФІО – 21,1 %). Гэтым разам пад кіраўніцтвам лідараў МРП абмеркаванне канстытуцыйнай рэформы праходзіла ў больш канструктыўным ключы. Важную ролю ў ажыццяўленні канстытуцыйнай рэформы адыграла вяртанне ў вялікую палітыку Ш. дэ Голя. У чэрвені 1946 г. выступаючы на ўрачыстасцях прысвечаных 2-гадоваму вызваленню горада Байё, генерал сфармуляваў свой канстытуцыйны праект. У яго падмурку ляжала ідэя «моцнай дзяржавы», здольнай забяспечыць веліч Францыі, нацыянальную незалежнасць і адзінства. Ш. дэ Голь выступіў супраць аднаўлення парламенцкай рэспублікі з засіллем у ёй своекарыслівых і непрымірымых партый. У якасці альтэрнатывы ён прапаноўваў прынцып «прамой дэмакратыі», заснаванай на рэферэндумах і прамых, усеагульных выбарах прэзідэнта рэспублікі, надзеленага самымі шырокімі паўнамоцтвамі. Прадугледжвалася строгае размежаванне і ўраўнаважанне заканадаўчай, выканаўчай і юрыдычнай улады.

Сутыкнуўшыся з узрастальным уплывам галістаў Установчы сход здолеў дасягнуць доўгачаканага кампрамісу і ў кастрычніку 1946 г. прад-

ставіў новы праект канстытуцыі на суд грамадзян. Гэтым разам рэферэндум даў станоўчы вынік – сказалі «да» 53,1 % яго ўдзельнікаў.

**Канстытуцыя 1946 г.** усталявала ў Францыі рэжым **Чацвёртай рэспублікі.** Асноўны закон абвяшчаў асноўныя правы і свабоды чалавека і грамадзяніна, суверэнітэт народу, рэспубліканскае ўладкаванне, законнасць нацыяналізацыі манапалістычнай уласнасці, мірны характар знешняй палітыкі. Важнейшым канстытуцыйным прынцыпам стала абвяшчэнне «сацыяльнай дзяржавы», у якой правы асобы спалучаюцца з «агульным дабром» і абмяжоўваюцца грамадскімі інтарэсамі.

Згодна з палажэннямі Канстытуцыі 1946 г. у Францыі складвалася вельмі дэцэнтралізаваная дзяржаўна-палітычная сістэма: прэзідэнт рэспублікі валодаў толькі прадстаўнічымі паўнамоцтвамі, шырокія правы атрымлівала мясцовае самакіраванне, абраны варыянт прапарцыйнай выбарчай сістэмы адкрываў доступ у парламент цэламу шэрагу дробных партый. На думку ідэолагаў рэжыму Чацвёртай рэспублікі менавіта гэткая канфігурацыя магла даць французам сапраўдную дэмакратыю. Далейшы ход падзей паказаў памылковасць гэтых разлікаў.

Першыя выбары ў Нацыянальны сход (ніжнюю палату, якая выконвала асноўныя заканадаўчыя функцыі) адбыліся ў лістападзе 1946 г. У чарговы раз сваё лідарства пацвердзіла ФКП, якая атрымала 28,6 % галасоў. Гэты вынік стаў найвышэйшым у гісторыі партыі. На другім месцы замацавалася МРП (26,33 %), а замкнула тройку пераможцаў Сацыялістычная партыя (17,9 %). Правядзенне выбараў і набыццё моцы канстытуцыяй азначалі заканчэнне Часовага рэжыму і пачатак новага перыяду – Чацвёртай рэспублікі (1946 – 1958).

Па выніках выбараў трохпартыйны кааліцыйны ўрад (ФКП, МРП і СФІО) быў захаваны. Аднак вострыя дыскусіі вакол стратэгіі і тактыкі эканамічных пераўтварэнняў, нарастанне міжнароднай напружанасці і пачатак «халоднай вайны» няўхільна вялі былых саратнікаў па Руху Супраціўлення да расколу. Напрыклад, камуністы выступалі за ўсталяванне сяброўскіх адносін з СССР і рашуча выступалі супраць развязвання каланіяльнай вайны ў В’етнаме, хрысціянскія дэмакраты і сацыялісты рабілі стаўку на ўмацаванне знешнепалітычнай арыентацыі на ЗША і Вялікабрытанію, а сыход з Індакітаю лічылі недапушчальным. Нарастанне забастовачнай барацьбы і падтрымка камуністамі патрабаванняў рабочых рабіла супрацоўніцтва партый кааліцыі немагчымым. ФКП была абвінавачана ў парушэнні прынцыпу «міністэрскай салідарнасці» і выключана з ураду.

Адносная слабасць правячай кааліцыі тлумачылася і з’яўленнем у красавіку 1947 г. новай масавай і ўплывовай палітычнай сілы на правым флангу французскай палітыкі – галісцкага «**Згуртавання французскага**

**народу»** (**РПФ**; *Rassemblement du peuple français*). Лідары партыі выступалі за адмаўленне ад тупіковай Канстытуцыі 1946 г. і фарміраванне рэжыму «моцнай улады» ў асобе незалежнага ад партый прэзідэнта (зразумела, на ўвазе меўся Ш. Дэ Голь).

Дзеля фарміравання моцнага і дзеяздольнага ўраду пры адначасовым захаванні ізаляцыі ФКП і РПФ была высунутая ідэя кааліцыі **«трэцяй сілы»** у складзе МРП, СФІО і радыкалаў. Менавіта яна і валодала парламенцкай большасцю да новых парламенцкіх выбараў 1951 г. Новы ўрад пайшоў на шчыльнае супрацоўніцтва са Злучанымі Штатамі і далучыў Францыю да рэалізацыі «плана Маршала». Імкнучыся захаваць палітычны рэжым Чацвёртай рэспублікі, напярэдадні парламенцкіх выбараў 1951 г. кааліцыя «трэцяй сілы» правяла выбарчую рэформу з увядзеннем мажарытарна-прапарцыйнай сістэмы. Асноўны сэнс пераўтварэнняў зводзіўся да таго, каб знівеляваць перавагі масавых партый – ФКП і РПФ – і ўмацаваць пазіцыі цэнтрысцкай кааліцыі. Выбарчая рэформа паспрыяла ўзбуйненню палітычных сіл. Напрыклад, у 1951 г. узнік **Нацыянальны цэнтр незалежных і сялян (СНІП;** *Centre National des Indépendants et Paysans*). Аднак да канца свайго існавання СНІП вызначаўся як выбарчае аб'яднанне і быў слаба згуртаваны, распадаючыся на практычна самастойныя арганізацыі.

Вынікі парламенцкіх выбараў 1951 г. апраўдалі спадзяванні правячай кааліцыі не ў поўнай меры. Камуністы засталіся самай папулярнай партыяй краіны. Сацыялісты і МРП страцілі ледзьве не палову выбаршчыкаў, затое ўзрос уплыў РПФ і некаторых правых партый. Ніводная дзеючая палітычная групоўка не атрымала абсалютнай большасці, таму быў утвораны правацэнтрысцкі блок у складзе правых і цэнтрыстаў (МРП і радыкалаў). Сацыялісты перайшлі ў апазіцыю. Аднак і новая палітычная канфігурацыя не здолела пазбавіць Францыю яе хранічнай хваробы – урадавай нестабільнасці. З часу заканчэння вайны і да 1958 г. змянілася 20 урадаў. У сярэднім кожны трываў толькі па паўгады, а некаторыя затрымліваліся пры ўладзе нават на некалькі дзён.

Вынікам нестабільнасці ўрадаў, з аднаго боку, і фактарам далейшага росту іх няўстойлівасці, – з другога, сталі масавыя рухі пратэсту, якія асабліва актывізаваліся ў першай палове 1950-х гг. Вялікага размаху дасягнулі выступленні супраць каланіяльных войнаў, асабліва в'етнамскай. Нягледзячы на значны прагрэс сацыяльнага і рабочага заканадаўства, актывізуецца рух працоўных. Напрыклад, летам 1953 г. у стачцы працаўнікоў дзяржаўнага сектару бралі ўдзел каля 4 млн. чалавек. На поўдні і ў цэнтры краіны ўзнікае рух крамнікаў і рамеснікаў, на чале з П'ерам Пужадам. Ва ўмовах неэфектыўнага парламентарызму **«пужадысты»** адстойвалі інтарэсы «простага чалавека», патрабавалі ўсталявання «моцнай улады» і бязлітаснага задушэння нацыянальна-вызваленчых рухаў калоній.

Парламенцкія выбары 1956 г. засведчылі рост папулярнасці левых. У чарговы раз першынство дасталася ФКП (25,4 % і 150 дэпутацкіх мандатаў – 1/4 ад агульнай колькасці). Даволі ўдала выступіла СФІО (каля 15 % і 95 дэпутатаў), якая разам з левымі радыкаламі і блізкімі да іх групоўкамі ўваходзіла ў «**Рэспубліканскі фронт**». Менавіта гэтае цэнтрысцкае аб'яднанне і атрымала права сфарміраваць урад, а лідар сацыялістаў Г. Мале стаў прэм'ер-міністрам. Тэарэтычна існавала магчымасць стварэння шырэйшай кааліцыі з удзелам камуністаў і перспектывай фарміравання ўраду большасці. Аднак у чарговы раз па зразумелых прычынах ФКП пакінулі ў ізаляцыі (Г. Мале казаў: «*Камуністы не злева, яны – на Ўсходзе*»).

Урад «Рэспубліканскага фронту» паспрабаваў ажыццявіць шырокую праграму сацыяльных рэформ. Удалося павялічыць з 2 да 3 тыдняў аплатны адпачынак, падвысіць заробкі і пенсіі. Цэнтрысты імкнуліся скарэкціраваць каланіяльную палітыку Францыі. У 1956 г. урад прызнаў незалежнасць Туніса і Марока і паабяцаў даць самакіраванне карэнным жыхарам французскіх калоній у Трапічнай Афрыцы. Вельмі актуальным быў намер уладаў нармалізаваць сітуацыю і аднавіць мір у яшчэ адной паўночна-афрыканскай калоніі – Алжыры. Аднак неўзабаве пад ціскам каланіялісцкіх колаў ураду прыйшлося адмовіцца ад сваіх планаў. Удзел Францыі ў агрэсіі супраць Егіпту канчаткова падарваў устойлівасць ураду Г. Мале і прывёў да яго адстаўкі.

Наступныя ўрады аказаліся яшчэ менш эфектыўнымі. Адсутнасць трывалага палітычнага лідарства і эфемернасць кааліцый на фоне нарастання алжырскай праблемы выклікалі рост палітычнага ўплыву французскай ваеншчыны і ультракаланіялістаў. Гэтыя сілы выступалі за ўсталяванне рэжыму «моцнай рукі» і змаганне супраць нацыянальна-вызваленчага руху алжырскага народу да пераможнага канца. Выдаткі на гэтую барацьбу ўжо ў 4 разы перавысілі выдаткі на, таксама не танную, вайну ў Індакітаі. У Алжыр была накіраваная вялікая 500-тысячная армія.

13 траўня 1958 г. Нацыянальны сход прызначыў новым прэм'ер-міністрам П'ера Пфлімлена – прыхільніка пагаднення з алжырскімі незалежнікамі. Ультракаланіялісты лічылі недапушчальнай «здачу Французскага Алжыра» і ў той жа дзень узнялі мяцеж. Мяцежнікі адхілілі ад улады цывільную каланіяльную адміністрацыю ў алжырскай сталіцы г. Алжыры і выступілі з патрабаваннем перадачы ўлады ў Францыі Ш. дэ Голю, пагражаючы высадкай ваенна-паветранага дэсанту ў Парыжы.

Апынуўшыся перад пагрозай вайсковага перавароту і грамадзянскай вайны французскія ўлады палічылі за лепшае абаперціся на аўтарытэт бясспрэчнага нацыянальнага лідара часоў вайны. Прэзідэнт рэспублікі звярнуўся да Ш. дэ Голя з просьбай сфарміраваць урад нацыянальнага выратавання. Генерал адказаў згодай пры ўмове атрымання паўнамоцтваў для перагляду

канстытуцыі. 1 чэрвеня 1958 г. быў створаны ўрад шырокай кааліцыі (увайшлі прадстаўнікі ўсіх вядучых партый краіны, апрача камуністаў), а на наступны дзень ён атрымаў надзвычайныя паўнамоцтвы. Ш. дэ Голь, новы прэм'ер-міністр узначаліў працэс распрацоўкі новага асноўнага закону, а рэжым Чацвёртай рэспублікі спыніў сваё існаванне.

### Знешняя палітыка Францыі ў другой палове 1940-х – 1950-я гг. «План Шумана», «План Плевэна». Пачатак распаду каланіяльнай імперыі. Паражэнне ў Індакітаі. Вынікі каланіяльных войнаў

Пасля прыніжальнай капітуляцыі ў чэрвені 1940 г. Францыі трэба было зрабіць нямала для аднаўлення свайго міжнароднага аўтарытэту і вяртання статусу вялікай дзяржавы. Часовы ўрад на чале з Ш. дэ Голем выступаў за ўмацаванне сувязяў з усімі удзельнікамі антыгітлераўскай кааліцыі. У снежні 1944 г. ён заключыў Дагавор аб саюзе і ўзаемнай дапамозе з СССР – першы дагавор вызваленай Францыі з вялікай дзяржавай. Падтрымліваліся вельмі шчыльныя сувязі з Вялікабрытаніяй і ЗША. Вялікае месца ў знешняй палітыцы Часовага ўраду заняла пытанне аб лёсе пераможанай Германіі. Францыя марыла пра далучэнне Саара, адасабленні ад Германіі Рэйнскай вобласці, настойвала на наданні асаблівага «міжнароднага» статусу Руру. Аднак падобныя амбіцыі не знайшлі падтрымкі іншых вялікіх дзяржаў.

Каланіяльная палітыка часовага ўраду прадугледжвала цэлы шэраг саступак мясцоваму насельніцтву з мэтай захавання каланіяльнай імперыі. Яно абяцала дапусціць карэннае насельніцтва да некаторых адміністрацыйных пасад і нават даць яму прадстаўніцтва ў французскім парламенце.

Напрыканцы 1940-х – напачатку 1950-х гг. французская дыпламатыя адыграла важнейшую ролю ў разгортванні заходнееўрапейскай інтэграцыі. У сакавіку 1948 г. Францыя стала адным з сузаснавальнікаў Заходняга саюзу, а праз год узяла ўдзел у стварэнні Еўрапейскай рады. У 1951 г. па ініцыятыве французскага міністра замежных спраў Рабэра Шумана – **«план Шумана»** – было створана Еўрапейскае таварыства вугалю і сталі. У 1950 г. прэм'ер-міністрам Францыі Р. Плевэнам быў высунуты план стварэння аб'яднаных еўрапейскіх узброеных сіл, з перспектывай іх пераўтварэння ў ядро Еўрапейскай абарончай супольнасці. Пасля правалу рэалізацыі **«плану Плевэна»** у другой палове 1950-х гг. з прычыны ўнутрыпалітычных і каланіяльных цяжкасцяў Францыі ініцыятыва ў паглыбленні інтэграцыйных працэсаў у Заходняй Еўропе стала пераходзіць да ФРГ і краін Бенілюксу. Францыя, якая пераўтварылася ў гэты час у плацдарм амерыканскага ўплыву сярод еўрапейскіх членаў НАТО, імкліва губляла самастойнасць і ўплыў на міжнароднай арэне.

Слабыя ўрады Чацвёртай рэспублікі аказаліся няздольнымі вырашыць праблему нацыянальна-вызваленчага руху заняволеных народаў калоній палітычнымі сродкамі і толькі ўцягвалі краіну ў бессэнсоўныя і безвыніковыя каланіяльныя канфлікты. Напрыклад, Францыя адмовілася прызнаць страту Індакітаю і ў 1946 г. развязала супраць в’етнамскага народу бясслаўную вайну, якая зацягнулася да 1954 г. Не паспела закончыцца гэтая вайна, як пачалася другая – у Алжыры (1954 – 1962). У 1956 г. урад «Рэспубліканскага фронту» пайшоў на прызнанне незалежнасці Тунісу і Марока. Тады ж карэнным жыхарам французскіх калоній Трапічнай Афрыкі было паабяцана мясцовае самакіраванне.

Гэты ўрад таксама заяўляў і аб рашучасці пакінуць Алжыр. Аднак разарваць цэлы комплекс повязяў з гэтай калоніяй было зусім не проста. Там жылі каля мільёна французаў (каля 10 % ад усяго насельніцтва), для якіх алжырская зямля была радзімай. Не лягчэй адмовіцца ад Алжыру было палітыкам і вайскоўцам (вельмі паказальнае ў гэтым кантэксце выказванне тагачаснага міністра ўнутраных спраў Ф. Мітэрана: «*Алжыр – гэта Францыя*»). Поўны вайскова-палітычны тупік у Алжыры, у якім апынулася Чацвёртая рэспубліка прывяла да яе поўнага краху.

### Усталяванне Пятай рэспублікі. Канстытуцыя 1958 г. Пашырэнне дзяржаўна-манапалістычнага рэгулявання эканомікі і сацыяльных адносін. Палітычная барацьба ў перыяд рэжыму асабістай улады Ш. дэ Голя. Травеньска-чэрвеньскі эканамічны крызіс 1968 гг., яго вынікі. Адстаўка Ш. дэ Голя

Вярнуўшыся да ўлады, генерал Ш. дэ Голь узначаліў працу па распрацоўцы новай канстытуцыі Францыі. 28 верасня 1958 г. яе праект быў вынесены на рэферэндум. Асноўныя палітычныя сілы і падаўляючая большасць грамадзян (79 %) падтрымала Ш. дэ Голя. Многія французы не пагаджаліся з новай канстытуцыяй і канцэптуальна, і па асобных яе палажэннях, не расцэньвалі кандыдатуру дэ Голя як найлепшую. Але адзінай альтэрнатывай ім лічылі толькі спаўзанне краіны ў хаос і грамадзянскую вайну. Паслядоўна выступалі супраць Ш. дэ Голя толькі камуністы і частка сацыялістаў.

Прыняцце **Канстытуцыі 1958 г.** юрыдычна замацавала стварэнне **Пятай рэспублікі** ў Францыі. Замест парламенцкай рэспублікі ствараласяя рэспубліка, у цэнтры ўладнай сістэмы якой знаходзіўся прэзідэнт. Новы асноўны закон значна пашыраў паўнамоцтвы галавы дзяржавы: ён старшынстваваў у Радзе міністраў, прызначаў прэм’ер-міністра і міністраў, з’яўляўся галоўнакамандуючым, ажыццяўляў прызначэнні на ўсе вышэйшыя цывільныя і вайсковыя пасады, карыстаўся правам заканадаўчай ініцыятывы, мог вярнуць любы закон на паўторны разгляд ці нават вынесці яго на рэферэндум. Акрамя таго

прэзідэнт меў права абвясціць надзвычайнае становішча і ўзяць у свае рукі ўсю паўнату ўлады ў выпадку пагрозы рэспубліцы або незалежнасці нацыі. Паўнамоцтвы парламенту, які складаўся з дзвюх палат – Нацыянальнага сходу і Сенату – былі істотна меншымі, чым у Чацвёртай рэспубліцы. Парламент прымаў законы і бюджэт, зацвярджаў праграму ўраду, але не мог ні кантраляваць, ні, тым больш, змясціць прэзідэнта.

У лістападзе 1958 г. адбыліся выбары ў Нацыянальны сход. Згодна з канстытуцыяй выбары праходзілі па мажарытарнай сістэме ў два кругі. Калі ў першым туры ніхто не набіраў абсалютнай большасці галасоў – 50 % + 1 голас, прызначаўся другі тур, куды выходзілі кандыдаты, якія набралі не менш за 8 % галасоў. У другім туры пераможцу было дастаткова набраць адносную большасць галасоў – апярэдзіць іншых кандыдатаў.

Перамогу атрымалі прыхільнікі Ш. дэ Голя, якія незадоўга да выбараў стварылі новую партыю – **Саюз за новую рэспубліку** (**ЮНР**; *Union pour la nouvelle République*). Важнейшым фактарам поспеху стала новая выбарчая сістэма. Прадстаўнікі гэтай партыі набралі ў першым туры толькі 3,6 млн. галасоў (17,6 % ад узяўшых удзел у галасаванні), але па выніках двух тураў заваявалі 189 месцаў (34,6 % дэпутацкіх крэслаў). Палітычныя сілы, што падтрымлівалі Ш. дэ Голя (г. зв. **«Большасць за Пятую рэспубліку»**) абсалютна дамінавалі ў ніжняй палаце – 534(!) мандата з 546. А вось за ФКП хаця і галасавалі ў першым туры 3,8 млн. чалавек, пашчасціла патрапіць у Нацыянальны сход толькі 10 дэпутатам-камуністам. Перамога галістаў была замацаваная на выбарах прэзідэнта рэспублікі. 21 снежня 1958 г. Ш. дэ Голь быў абраны галавой дзяржавы калегіяй выбаршчыкаў, куды ўваходзілі дэпутаты Нацыянальнага сходу і сходаў заморскіх тэрыторый, мэры гарадоў ды іх намеснікі, члены муніцыпалітэтаў (разам каля 80 000 чалавек). Пераможца атрымаў 78,5 % галасоў. Прэзідэнт прызначыў новым прэм’ер-міністрам свайго паплечніка, аднаго з лідараў ЮНР, Мішэля Дэбрэ. Ва ўтвораным ім урадзе былі прадстаўлены ўсе галоўныя партыі за выключэннем камуністаў і сацыялістаў.

З усталяваннем рэжыму Пятай рэспублікі галоўным зместам эканамічнай палітыкі стала заахвочванне прамысловасці шляхам далейшай канцэнтрацыі вытворчасці, утварэння буйных манаполій і ўзмацненне іх сувязяў з дзяржавай. Прадугледжвалася развіццё практычна ўсіх галін прамысловасці. Пазней гэтая лінія атрымала назву «**прамысловага імператыву»** (прапарцыйнае развіццё ўсіх галін эканомікі). Вялікая роля ў гэтым адводзілася навукова-тэхнічнай рэвалюцыі. На яе базе адбывалася структурная перабудова прамысловасці. Хуткае развіццё атрымліваюць авіяцыя, хімічная і аўтамабільная галіны. Ствараюцца новыя галіны ваенна-прамысловага комплексу: атамная, ракетная, аэракасмічная. Развіццё НТР прывяло да паскарэння тэмпаў прамысловага развіцця краіны. За перыяд 1958 – 1968 гг. аб’ём прамысловай вытвор-

часці ўзрос больш чым на 60 %, а тэмпы эканамічнага росту ў сярэднім складалі 5,5 % у год. Галісцкаму ўраду ўдалося стабілізаваць фінансавую сістэму краіны. Радыкальная дэвальвацыя франка (1 да 100) дазволіла стварыць цвёрдую нацыянальную валюту.

Удзел Францыі ў заходнееўрапейскай інтэграцыі толькі ўзмацніў дзяржаўна-манапалістычныя тэндэнцыі ў эканоміцы. Клапоцячыся пра канкурэнтаздольнасць фірм, дзяржава рознымі сродкамі заахвочвала манапалістычную канцэнтрацыю. У выніку на працягу 1960-х гг. з'явіліся гіганцкія фінансавыя групы, якія сталі галоўнай арганізацыйнай формай манапалістычных аб'яднанняў у Францыі. Тым не менш, і ў 1960-я гг. ступень канцэнтрацыі прамысловасці у Францыі была ніжэйшай, чым у іншых высокаразвітых краінах.

Пашырэнне маштабаў прамысловай вытворчасці і НТР паскорылі інтэнсіфікацыю ды індустрыялізацыю сельскай гаспадаркі. Значныя капіталаўкладанні дазволілі павялічыць за 1958 – 1968 гг. вытворчасць сельгаспрадукцыі на 60 %, што дазволіла Францыі стаць другім пасля ЗША экспарцёрам прадуктаў харчавання, буйнейшым пастаўшчыком малака і віна, а таксама адзінай заходнееўрапейскай краінай-экспарцёрам збожжавых. Пры гэтым працягвала скарачацца доля насельніцтва, занятага ў сельскай гаспадарцы. Напачатку 1970-х гг. на вёсцы пражывала толькі 12 % эканамічна актыўнага насельніцтва.

На працягу 1960-х гг. адбываецца істотная актывізацыя знешняга гандлю Францыі. Гэтаму, галоўным чынам, спрыялі паспяховы ход развіцця заходнееўрапейскіх інтэграцыйных працэсаў і распад французскай каланіяльнай імперыі. У 1960 – 1963 гг. Францыя заключыла амаль з усімі сваімі былымі калоніямі пагадненні аб эканамічнай, тэхнічнай і вайсковай дапамозе. Аднак заходнееўрапейскі напрамак стаў прыярытэтным: калі яшчэ ў 1958 г. гандаль з калоніямі пераважаў над гандлем з краінамі «Агульнага рынку», то ў 1967 г. яе знешнегандлёвы абарот у межах ЕЭС быў утрая большым, чым з былымі французскімі калоніямі.

Важным дасягненнем Пятай рэспублікі аказалася ліквідацыя да 1965 г. французскай запазычанасці перад ЗША. Францыя зноў стала краінай-крэдыторам і выйшла на трэцяе месца (пасля Злучаных Штатаў і Вялікабрытаніі) у свеце па экспарту капіталу. Працягваў расці жыццёвы ўзровень насельніцтва. Тэрмін штогадовага аплатнага адпачынку быў павялічаны з 3 да 4 тыдняў.

Заняўшы пасаду прэзідэнта, Ш. дэ Голь засяродзіў у сваіх руках асноўныя рычагі дзяржаўнага кіравання. Рашэнні па ўсіх важнейшых пытання прымаў прэзідэнт, часта нават не абмяркоўваючы іх з урадам. Нягледзячы на тое, што выбары былі, бясспрэчна, свабоднымі, дзяржава трымала манаполію на радыё і тэлебачанне. Манаполія не была абсалютнай толькі дзякуючы франкамоўнаму вяшчанню з суседніх краін – Манака, Люксембургу і ФРГ. Аўтарытарны стыль кіравання стаў вызначальнай рысай яго праўлення і заслугоўваў нямала крытыкі з боку апазіцыі.

Найбольш паслядоўнымі крытыкамі прэзідэнта былі камуністы, якія абвінавачвалі яго ва ўсталяванні дыктатарскага рэжыму і заклікалі народ змагацца «за аднаўленне і абнаўленне дэмакратыі». У падрыве нармальных рэспубліканскіх механізмаў абвінавачвалі Ш. дэ Голя сацыялісты і блізкія ім партыі. Лідар ЮДСР Ф. Мітэран нават выдаў у 1964 г. скрайне крытычную, ў дачыненні прэзідэнта, кнігу с красамоўнай назвай «Перманентны дзяржаўны пераварот». Левыя і левацэнтрысцкія сілы асуджалі курс главы дзяржавы на празмерную мілітарызацыю Францыі, асабліва нарошчванне ядзерных арсеналаў.

Паступова апазіцыя прэзідэнту стала пашырацца. Напачатку 1960-х гг. у апазіцыю да Ш. дэ Голя перайшлі таксама правыя і цэнтрысцкія партыі, якія абвінавачвалі прэзідэнта ў здрадзе прынцыпам «атлантызму» і «еўрапеізму». У траўні 1962 г. шырокая галісцкая кааліцыя распалася – міністры з МРП і частка прадстаўнікоў СНІП пакінулі ўрад. У выніку галісты страцілі большасць у Нацыянальным сходзе і Ш. дэ Голь вырашыў яшчэ больш узмацніць ролю прэзідэнта ў сістэме дзяржаўнай улады.

Згодна з палажэннямі першапачатковага варыянту Канстытуцыі 1958 г. абранне прэзідэнта ажыццяўляла выбарчая калегія. Гэта была яўная саступка сілам, якія непакоіліся наконт аўтарытарных ці банапартысцкіх схільнасцяў Ш. Дэ Голя (прамыя ўсенародныя выбары прэзідэнта ў Францыі праходзілі толькі аднойчы ў гісторыі і скончыліся абраннем у 1848 г. Луі-Напалеона Банапарта, які выкарыстаў дэмакратычны механізм толькі як трамплін да ўлады і неўзабаве пераўтварыў сваю ўладу ў фактычна бестэрміновую, а потым і спадчынную). Тым не менш, згодна з перакананнямі самога Ш. дэ Голя непасрэднае дэлегаванне народам часткі свайго суверэнітэту абранаму лідару складала аснову рэспубліканскай формы праўлення.

Гэтак прэзідэнт пайшоў на правядзенне першай значнай канстытуцыйнай рэформы ў гісторыі Пятай рэспублікі. У тым жа 1962 г. французам было прапанавана выказацца на рэферэндуме па пытанні магчымага абрання галавы дзяржавы на прамых, усеагульных выбарах. Паколькі новая працэдура абрання галавы дзяржавы азначала далейшае абмежаванне парламенцкага кантролю над прэзідэнцкай уладай, супраць прапановы Ш. дэ Голя выказвалася большая частка палітычных партый. Рашучую падтрымку прэзідэнту аказалі толькі галісты з **Саюзу за новую рэспубліку-Дэмакратычнага саюзу працы** (**ЮНР-ЮДТ**; *Union pour la nouvelle République-Union démocratique du travail*) – партыі, якая ўварылася пасля далучэння да партыі-лідара яшчэ адной галісцкай групоўкі. Нягледзячы на крытычны настрой французскіх палітычных элітаў, звыш 61 % узяўшых удзел у рэферэндуме французаў станоўча адрэагавалі на прапанову Ш. дэ Голя.

Палітычная барацьба вакол рэферэндуму па працэдуры абрання прэзідэнта садзейнічала згуртаванню антыгалісцкай апазіцыі. У прыватнасці,

упершыню за доўгі час камуністы і сацыялісты дамовіліся аб супрацоўніцтве падчас правядзення другога тура парламенцкіх выбараў (разумны тактычны ход, які дазваляў аб'ядноўваць рэсурсы дзвюх партый для заваявання першынства ў выбарчай акрузе).

Парламенцкія выбары 1962 г. прынеслі перамогу галістам. Найбольш папулярнай партыяй стала партыя ЮНР-ЮДТ заваявала 229 месцаў у Нацыянальным сходзе. Праўрадавай парламенцкай групоўцы «**незалежных рэспубліканцаў»** Валеры Жыскар д'Эстэна дасталася 32 месцы. (групоўка ўзнікла пасля нядаўняга расколу СНІП і ў 1966 г. пераўтварылася ў партыю **Нацыянальная Федэрацыя незалежных рэспубліканцаў** (**ФНРІ**; *Federation nationale des republicains independants*)).

Удала выступілі левыя. СФІО правяла ў Нацыянальны сход 67 дэпутатаў, а ФКП – 61. А вось цэнтрысцкія партыі паступова страчвалі падтрымку. Радыкалы, МРП і СНІП, аб'яднаныя ў блок «Дэмакратычная згода», здабылі на траіх толькі 108 мандатаў (адпаведна 44, 36 і 28). Вынікі гэтых выбараў прадэманстравалі важнейшую тэндэнцыю французскай палітыкі наступных дзесяцігоддзяў: галоўная барацьба за ўладу будзе адбывацца паміж правацэнтрысцкімі (галісты ды іх спадкаемцы) і левацэнтрысцкімі (сацыялісты і камуністы) сіламі. Радыкалам, МРП і СНІП, наадварот, было ў хуткім часе наканавана сысці з палітычнай арэны.

Гэтая тэндэнцыя праявілася і на першых прамых, усеагульных выбарах прэзідэнта Пятай рэспублікі, якія адбыліся ў снежні 1965 г. Дзеючы прэзідэнт не здолеў атрымаць пераканаўчую перамогу ўжо ў першым туры: Ш. дэ Голь набраў толькі 44,6 %. Другое месца у першым туры заняў лідар ЮДСР, кандыдат ад Федэрацыі сацыялістычных і дэмакратычных левых сіл (акрамя ЮДСР у згуртаванне ўваходзілі СФІО і левыя радыкалы) і падтрыманы таксама ФКП Ф. Мітэран – 31,7 %. Кандыдат цэнтрыстаў Жан Леканюэ здабыў толькі 15,6 % галасоў.

У другім туры Ш. дэ Голь без вялікіх праблем адолеў Ф. Мітэрана – 55,2 % на 44,8 % – і быў пераабраны на наступны 7-гадовы тэрмін. Вынік яго саперніка таксама ўражваў. Даўні апанент Ш. дэ Голя, Ф. Мітэран пераўтвараецца ў буйнейшага апазіцыйнага лідара Францыі і праз 16 гадоў здолее стаць «гаспадаром» Елісейскага палацу (галоўнай рэзідэнцыі прэзідэнта Францыі).

Нягледзячы на значныя дасягненні Ш. дэ Голя ў эканамічнай і знешнепалітычнай сферах, напрыканцы 1960-х гг. унутрыпалітычнае становішча Францыі станавілася ўсё больш і больш напружаным. Па выніках выбараў 1967 г. галісты разам з саюзнікамі захавалі ў Нацыянальным сходзе толькі 244 мандаты. Затое павялічылі сваё прадстаўніцтва левыя. Камуністы, напрыклад, правялі ў ніжнюю палату парламенту 73 дэпутаты, а сацыялісты і радыкалы, па-ранейшуму аб'яднаныя ў ФСДЛ – 116. Пад час

выбараў актывізаваліся леварадыкальныя («левацкія») групоўкі або **«гашысты»** (ад франц. *gauche* – «левы»). У межах «гашызму» вылучаліся два накірункі – анархічны і трацкісцкі. Сацыяльнай базай руху былі французскія студэнты, а метады, якія выкарыстоўваліся на працягу 1960-х – пачатку 1970-х гг. зачастую былі экстрэмісцкімі і часам нават тэрарыстычнымі.

Незадаволенасць галісцкім рэжымам дасягнула свайго апагею ў траўні 1968 г. Пачалося ўсё з выступленняў студэнцкіх экстрэмісцкіх груповак. Потым пачаліся вулічныя сутыкненні моладзі з паліцыяй, а буйнейшыя прафсаюзы выступілі ў падтрымку і нават абвясцілі ўсеагульную забастоўку салідарнасці. На працягу траўня – чэрвеня 1968 г. па краіне баставала каля 10 млн. – амаль увесь рабочы клас, значная частка інтэлігенцыі і служачых. Напрыканцы траўня 1968 г. асноўныя патрабаванні працоўных прыйшлося задаволіць: мінімальны заробак быў падвышаны на 35 %, сярэдні заробак – на 10 %, а дапамогі па беспрацоўю – на 15 %.

Для перагрупоўкі ўрадавых сіл быў распушчаны Нацыянальны сход і праведзеныя новыя парламенцкія выбары. Іх зыход азнаменаваў сабой заканчэнне канфлікту. Прэм’ер-міністр Жорж Пампіду, які заклікаў ў перадвыбарчай кампаніі да «абароны рэспублікі» перад пагрозай «камуністычнай небяспекі» і звяртаўся да «маўклівай большасці», каб тая падтрымала парадак і стабільнасць, здолеў дасягнуць значнага поспеху. Галісцкая партыя **Саюз дэмакратаў за Пятую рэспубліку** (**ЮДСР**, *Union pour la défense de la Cinquiéme République*) новая назва перайменаванай ЮНР) атрымала абсалютную большасць месцаў у парламенце і стала першай партыяй у гісторыі Пятай рэспублікі ўзяўшай гэткі высокі рубеж.

Ш. дэ Голь і яго паплечнікі былі далёкія ад пераацэнкі значэння апошняй электаральнай перамогі. Яны разумелі, што раскол у грамадстве пераадолены не быў, і патрабаваліся значныя намаганні для змякчэння класавай барацьбы і згуртавання французскай нацыі. Пачатак рэформам быў павінен пакласці законапраект аб рэформе Сенату і органаў мясцовага самакіравання. Новыя рэгіянальныя інстытуты ўлады задумваліся як прылада класавага супрацоўніцтва паміж прадстаўленымі ў іх «сацыяльна-прафесійнымі групамі» (рабочымі, сялянамі, рамеснікамі, прамыслоўцамі, прадстаўнікамі вольных прафесій). Каб падкрэсліць значнасць прапанаванай рэформы, здабыць ніколі не лішнюю народную падтрымку і, нарэшце, у чарговы раз паказаць у дзеянні мадэль прамой дэмакратыі, Ш. дэ Голь вырашыў вынесці законапраект аб гэтай рэформе на рэферэндум і прыгразіў французам у выпадку іх нязгоды сысці ў адстаўку. Усенароднае волевыяўленне станавілася галасаваннем адносна даверу дзеючаму прэзідэнту.

Супраць законапраекту выказаліся практычна ўсе палітычныя партыі Францыі за выключэннем ЮДСР. Як вынік, на красавіцкім рэферэндуме

1969 г. 53,2 % французаў, што прыйшлі на ўчасткі для галасавання адкінулі план прэзідэнцкай рэформы. Першы прэзідэнт Пятай Французскай рэспублікі неадкладна склаў з сябе паўнамоцтвы і пайшоў у адстаўку.

**Знешняя палітыка Ш. дэ Голя.**
**Курс на адраджэнне нацыянальнай велічы Францыі.**
**Прызнанне незалежнасці калоній у Афрыцы**

Пасля заканчэння вайны ў Алжыры Ш. дэ Голь стаў праводзіць актыўную знешнюю палітыку, сутнасць якой складалася ў адмове ад ідэі атлантычнай салідарнасці і імкненні адрадзіць **«нацыянальную веліч»** Францыі. Мяркуючы, што толькі валоданне ядзернай зброяй можа стаць гарантыяй гэтага, французскія ўлады ўзяліся за стварэнне ўласных стратэгічных ядзерных сіл. У 1960 г. Францыя выпрабавала сваю першую атамную бомбу і стала чацвёртай дзяржавай, якая валодала новай суперзброяй. Францыя не падпісала Маскоўскі дагавор аб забароне выпрабавання ядзернай зброі ў трох асяроддзях. Ш. дэ Голь лічыў, што раззбраенне павінна датычыцца толькі звышдзяржаў – ЗША і СССР.

Французская дыпламатыя абвясціла, што Францыя будзе рыхтавацца да **абароны «па ўсіх азімутах»**, г. зн. будзе гатовая даць адпор не толькі ворагам з Усходу, але і з Захаду. Каб пакласці канец залежнасці ад Злучаных Штатаў, у 1966 г. Ш. дэ Голь абвясціў аб выхадзе сваёй краіны з вайсковай арганізацыі НАТО (яна засталася ў палітычных структурах Паўночнаатлантычнага альянсу), на яе тэрыторыі былі ліквідаваныя амерыканскія вайсковыя базы. Францыя асудзіла амерыканскую інтэрвенцыю ў В'етнаме, выказвалася ў падтрымку разрадкі міжнароднай напружанасці і развіццё міжнароднага супрацоўніцтва. Пазіцыянуючы сябе як краіну, здольную стаць пасярэднікам у дыялогу паміж Захадам і Ўсходам, Францыя пайшла на значнае паляпшэнне франка-савецкіх адносін. У 1960 г. М. С. Хрушчоў упершыню наведаў Францыю, а ў 1966 г. Ш. дэ Голь нанёс візіт у адказ. Пашыраліся адносіны з краінамі сацыялістычнага лагеру. Напрыклад, Францыя першай сярод заходніх дзяржаў прызнала ГДР.

Вялікая ўвага надавалася супрацоўніцтву Францыі з краінамі «Агульнага рынку», асабліва двухбаковым адносінам з ФРГ. У 1963 г. паміж краінамі быў падпісаны дагавор аб супрацоўніцтве ў галіне знешняй палітыкі, абароны, асветы і выхавання моладзі. Выступаючы за развіццё еўрапейскай інтэграцыі Ш. дэ Голь, як вядома, рашуча адмаўляў мэтазгоднасць допуску ў Еўрапейскія супольнасці Вялікабрытаніі і планаў ваенна-палітычнай інтэграцыі Заходняй Еўропы ў адзіную дзяржаву. Ідэі «Злучаных Штатаў Еўропы» ён супрацьпастаўляў праект **«Еўропы дзяржаў»** (таксама ў літаратуры выкарыстоўваюцца назвы «Еўропа нацый» або «Еўропа Айчын») – міждзяржаўнага саюзу, у якім усе яго члены захоўвалі б нацыянальны суверэнітэт.

Важнейшае значэнне для будучага Францыі і яе месца на міжнароднай арэне мелі трансфармацыя яе каланіяльнай імперыі і наладжванне адносін з яе былымі калоніямі – цяпер новымі незалежнымі дзяржавамі. У адпаведнасці з Канстытуцыяй 1958 г. Французскі Саюз быў пераўтвораны ў Супольнасць. Яе удзельнікі атрымлівалі права на вольны выхад з аб'яднання і атрыманне поўнай незалежнасці. Толькі на працягу 1960 г. («года Афрыкі») скарысталіся гэтай магчымасцю і набылі самастойнасць 14 былых афрыканскіх калоній Францыі. Але, дзякуючы разважлівай і гнуткай палітыцы Ш. дэ Голя, яна здолела захаваць значны эканамічны і палітычны ўплыў на кантыненце. Важнейшае значэнне для закладвання новай базы пад ўзаемавыгаднае супрацоўніцтва былых метраполіі і калоній, умацавання маральнага аўтарытэту Францыі мела падпісанне ў сакавіку 1962 г. **Эвіянскіх пагадненняў**, што паклалі канец алжырскаму канфлікту.

### Эканоміка Францыі ў 1970-я гг. Праявы крызісу 1974 – 1975 гг. Эканамічная палітыка Ж. Пампіду і В. Жыскар д'Эстэна. Палітычная барацьба ў 1970-я гг. Перагрупоўка партыйна-палітычных сіл. Супярэчнасці ў левым лагеры

З абраннем у 1969 г. прэзідэнтам Ж. Пампіду была зменена валютна-фінансавая палітыка Францыі – было абвешчана пра дэвальвацыю франка на 12,5 % адносна долара. На мяжы 1960-х і 1970-х гг. яна забяспечыла краіне значныя перавагі ў галіне знешняга гандлю, што ў сваю чаргу стымулявала прамысловасць. Рашэнне аб дэвальвацыі было часткай плану аздараўлення эканомікі, якое таксама складалася з ураўнаважання бюджэту і гандлёвага балансу, абмежавання спажывання.

Зробленыя крокі дазволілі стабілізаваць эканоміку краіны. Аднак прамысловы ўздым аказаўся нядоўгім. З пачаткам восенню 1973 г. энергетычнага крызісу Францыя апынулася ў вельмі складаным становішчы, бо яна ўвозіла амаль усю спажываную ёю нафту і на 80 – 90 % залежала ад нафтавага імпарту з арабскіх краін. **«Слаўнае трыццацігоддзе» (1945 – 1975)**, якое характарызавалася агульным эканамічным уздымам, некантраляванай інфляцыяй, пастаянным падвышэннем заробкаў і ростам ВУП падышло да свайго заканчэння. Францыя, як і іншыя капіталістычныя краіны ўступае ў паласу працяглага эканамічнага і сацыяльнага крызісу.

Рэзкі скачок паліўных коштаў прывёў да значнага росту знешнегандлёвага дэфіцыту. Пахіснуліся пазіцыі французскай валюты і сталі зніжацца тэмпы прамысловага росту. Па выніках 1975 г. упершыню за ўвесь пасляваенны перыяд адбылося зніжэнне аб'ёму прамысловай і сельскагаспадарчай вытворчасці – адпаведна на 8 % і 3 %. У адрозненне ад даваенных крызісаў падзенне вытворчасці не суправаджалася зніжэннем цэн. Наадварот, яны ўвесь час

працягвалі расці. За 1974 – 1976 гг. ў 2,5 разы павялічылася беспрацоўе. Яшчэ больш узрастае сацыяльная няроўнасць.

Французскія ўлады шукалі выйсце ў ажыццяўленні **палітыкі «прамысловай пераарыентацыі»**, абвешчанай VII планам эканамічнага і сацыяльнага развіцця на 1976 – 1980 гг. Яе сутнасць зводзілася да прыстасавання гаспадарчай структуры краіны да новых умоў сусветнай інтэграцыі, стварэння транснацыянальных карпарацый, узмацнення сувязяў з міжнародным рынкам. Прынцып універсальнай нацыянальнай гаспадаркі, які быў закладзены ў галісцкім курсе «індустрыяльнага імператыву», быў заменены арыентацыяй на падтрымку дзяржавай найбольш канкурэнтаздольных экспартных галін – аўтамабільнай, авіяракетнай, хімічнай, электратэхнічнай, вытворчасці сельгаспрадуктаў. У гэтых галінах пачынаецца зліццё манаполій на міжнародным узроўні. Ў выніку, магутнасць французскіх трэстаў ў другой палове 1970-х гг. яшчэ больш узмацнілася. Працягвалася скарачэнне дробных сялянскіх гаспадарак і далейшае ўзрастанне значэння буйных. Менавіта за іх кошт да пачатку 1980-х гг. Францыя становіцца адным з сусветных лідараў па вытворчасці пшаніцы, ячменю, ільновалакна і цукровых буракоў. Па выніках 1970-х гг. Францыя трывала ўваходзіла ў лік буйнейшых эканамічных дзяржаў і ў эканамічных адносінах заняла становішча другой, пасля ФРГ, заходнееўрапейскай дзяржавы.

Тым не менш, нягледзячы на прадуманы і дастаткова паспяховы эканамічны курс, у другой палове 1970-х гг. захоўваўся высокі ўзровень інфляцыі і пагражальных памераў дасягнулі ўцёкі капіталу за мяжу. Нязменна пасіўным заставаўся гандлёвы баланс краіны. Скасаванне мытных тарыфаў у гандлі паміж краінамі «Агульнага рынку» яшчэ больш павялічыла гандлёвы дэфіцыт Францыі.

Пасля нечаканай адстаўкі Ш. дэ Голя ў чэрвені 1969 г. прыйшлося правесці датэрміновыя прэзідэнцкія выбары. Галістаў прадстаўляў папулярны і вопытны Ж. Пампіду. Левыя і левацэнтрысцкія сілы гэтым разам не здолелі дамовіцца аб адзіным кандыдаце і дзейнічалі паасобку. У першым туры Ж. Пампіду набраў 44,5 % галасоў і апярэдзіў старшыню Сената і аднаго з лідараў антыгалісцкай кампаніі падчас рэферэндуму 1969 г. цэнтрыста Алена Паэра (23,3 %) і камуніста Ражэ Дзюкло (21,3 %). У другім туры галісты святкавалі ўпэўненую перамогу і Ж. Пампіду стаў новым прэзідэнтам Францыі (1969 – 1974).

Няўдалае выступленне сацыялістаў на прэзідэнцкіх выбарах (іх кандыдат набраў толькі 5 % галасоў) падштурхнула іх да радыкальнай арганізацыйнай ды ідэалагічнай перабудовы партыі. Ужо ў 1969 г. СФІО была перайменаваная ў **Французскую сацыялістычную партыю (ФСП)**. Рэарганізаваная партыя канчаткова адмаўлялася ад тактыкі блакіравання з цэнтрысцкімі сіламі і пачала барацьбу за кансалідацыю вакол сябе саюзнікаў. Гэткім чынам у 1971 г. да ФСП далучыўся шэраг левых груп і на аб’яднаўчым з’ездзе новым лідарам сацыялістаў быў абраны Ф. Мітэран.

У красавіку 1974 г. нечакана памёр прэзідэнт Ж. Пампіду. Ужо ў траўні адбыліся выбары новага галавы дзяржавы. Як і ў 1965 г. у якасці адзінага кандыдату ад левых выступіў сацыяліст Ф. Мітэран. Правацэнтрысцкія сілы былі прадстаўленыя Жакам Шабан-Дэльмасам (ЮДР) і В. Жыскар д'Эстэнам (ФНРІ). У першым туры лідарства захапіў лідар сацыялістаў (43,2 %), аднак у другім туры ён прайграў Жыскар д'Эстэну крыху больш за 400 тыс. галасоў выбаршчыкаў (толькі каля 1,5 %). Гэткім чынам галісты страцілі прэзідэнцкую пасаду, большасць важнейшых міністэрстваў і маглі суцяшаць сябе толькі тым, што засталіся ў складзе ўрадавай кааліцыі, а крэсла прэм'ер-міністра заняў іх малады і перспектыўны лідар – Жак Шырак.

Цэнтральнай ідэяй, вакол якой будавалася ўнутраная палітыка трэцяга прэзідэнта пятай рэспублікі В. Жыскар д'Эстэна (1974 – 1981), было будаўніцтва «перадавога ліберальнага грамадства». Прэзідэнцкія выбары 1974 г. адбываліся ўжо ў той час, калі французская эканоміка ўцягвалася ў паласу глыбокага крызісу. Урад абвясціў аб далейшай лібералізацыі эканомікі. Аднак, паколькі жорсткая эканамічная палітыка «жыскардызму» магла быць падтрымана толькі паловай французаў, а другая палова галасавала на выбарах за далейшае паглыбленне сацыяльных рэформ, ураду прыйшлося захаваць цэлы шэраг сацыяльных праграм. Аднак пэўны час скарачэнне выдаткаў на барацьбу з беспрацоўем спалучалася з ростам асігнаванняў на адукацыю, ахову здароўя, культуру, інфарматызацыю, экалогію ды іншыя артыкулы, якія вызначаліся ў якасці базавых для «сацыяльнага і маральнага прагрэсу». Прэзідэнт пайшоў на рэфармаванне дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі ОРТФ: з яе складу былі вылучаны 7 асобных вяшчальных устаноў. Але да сапраўднай лібералізацыі радыё і тэлебачання Францыя дойдзе толькі напачатку 1980-х гг. Палітыка В. Жыскар д'Эстэна паспрыяла далейшаму разняволенню нораваў. Менавіта ў гэты час быў дазволены развод па ўзаемнай згодзе і штучнае перарыванне цяжарнасці.

У 1970-х гг. на фоне глыбокага эканамічнага крызісу і нарастання сацыяльных праблем адбываецца біпалярызацыя палітычнай барацьбы ў Францыі: выбарчай сацыялістычна-камуністычнай кааліцыі звычайна супрацьстаяла групоўка правацэнтрысцкіх партый. Левыя выступалі на базе адзінай выбарчай праграмы, але электаральны ўнёсак дзвюх партый не быў аднолькавым. У адрозненне ад рэфармаваных сацыялістаў папулярнасць камуністаў расла павольна. Каб спыніць гэтую тэндэнцыю, у сярэдзіне 1970-х пачынаецца радыкальная перабудова камуністычнай партыі. **XXII з'езд ФКП (1976)** абвясціў неабходнасць мірнай пабудовы дэмакратычнага «сацыялізму па-французску», адмовіўся ад ідэі «дыктатуры пралетарыяту» і прыняў новую фармулёўку – «улада рабочага класу ды іншых катэгорый працоўных». Тым самым ФКП пайшла па шляху «еўракамунізму».

Аднак выкарыстаць сваё абнаўленне ўжо ў другой палове 1970-х гг. левыя партыі не здолелі. Рознагалоссі па пытанні сумеснай выбарчай праграмы і спадзяванні камуністаў на аднаасобны прыход да ўлады прывялі да часовага распаду левай кааліцыі, і на парламенцкія выбары 1978 г. дзве вядучыя партыі левых пайшлі паасобку.

Важныя змены адбываліся і на супрацьлеглым флангу. Некалі магутная ЮДР перажывала востры крызіс. Таму ў снежні 1976 г. на надзвычайным з'ездзе было вырашана на базе гэтай партыі стварыць новую палітычную арганізацыю – **Згуртаванне за рэспубліку** (**РПР**; *Rassemblement pour la Republique*). Старшынёй партыі быў абраны Ж. Шырак, а яе ідэалагічным ядром сталі «асноўныя каштоўнасці галізму».

Падобная рэарганізацыя адбылася і ў лагеры правячай партыі незалежных рэспубліканцаў: у 1977 г. яны ўзялі назву Рэспубліканская партыя, а ўжо ў 1978 г. аб'яднаўшыся з рэшткамі былой правацэнтрысцкай апазіцыі былі пераіменаваныя ў **Саюз за французскую дэмакратыю (ЮДФ**; *Union pour la démocratie française*). Старшынёй партыі быў абраны В. Жыскар д'Эстэн.

Парламенцкія выбары 1978 г. прадэманстравалі пэўную раўнавагу сіл і прывялі да ўзнікнення своеасаблівай **«чатырохпартыйнай» сістэмы**. Чатыры вядучыя партыі не сустрэлі практычна аніякай канкурэнцыі і здабылі амаль аднолькавую падтрымку. У першым туры за РПР Прагаласавала 22,62 %, за ФСП – 22,58 %, за ЮДФ – 21,45 % і за ФКП – 20,55 % (упершыню ў пасляваеннай гісторыі сацыялісты набралі больш галасоў выбаршчыкаў і правялі ў Нацыянальны сход больш дэпутатаў, чым камуністы). Парламенцкая большасць засталася за правымі. Новая хваля структурнага эканамічнага крызісу, што абрынецца на Францыю напачатку 1980-х гг. лёгка разбурыць гэты хісткі расклад сіл і ўпершыню ў гісторыі Пятай рэспублікі прывядзе на палітычны Алімп левыя сілы.

У 1972 г. была заснаваная скрайне правая партыя **Нацыянальны фронт** на чале з былым пужадыстам і ультракаланіялістам Жан-Мары Ле Пэнам. Выступаючы з экстрэмісцкіх і расісцкіх пазіцый (галоўны лозунг – «Французы перадусім»), гэтая партыя звязвала масавае беспрацоўе і некаторыя іншыя сацыяльныя праблемы выключна з наплывам імігрантаў, а таму патрабавала іх высылкі з Францыі. Да канца 1970-х гг. партыя заставалася маргінальнай і не карысталася колькі-небудзь прыкметнай электаральнай падтрымкай.

### Знешняя палітыка Францыі ў 1970-я гг.

### Умацаванне праатлантычных тэндэнцый у знешняй палітыцы

Знешняя палітыка Ж. Пампіду вызначалася значнай доляй пераемнасці адносна палітыкі Ш. дэ Голя (формула «пераемнасці і абнаўлення»). Падтрымліваўся курс на разрадку міжнароднай напружанасці і раззбраенне. Паспяхова развіваліся адносіны Францыі з Савецкім Саюзам і краінамі «сацыялістычнай садружнасці». Разам з тым у постгалісцкі перыяд французская дыпла-

матыя імкнулася палепшыць адносіны з ЗША і Вялікабрытаніяй. Было аднаўленае знешнепалітычнае і вайсковае супрацоўніцтва з заакеанскай супердзяржавай. Ж. Пампіду адмовіўся ад далейшага блакіравання ўступлення Вялікабрытаніі ў «Агульны рынак». У красавіку 1972 г. быў нават праведзены рэферэндум, на якім французам прапанавалі выказацца наконт магчымага ўдзелу ў ЕЭС Вялікабрытаніі, Даніі ды Ірландыі. 2/3 выбаршчыкаў далі свой станоўчы адказ. Францыя адмовілася ад канцэпцыі глабальнай абароны «па ўсіх азімутах» і вызначала **«тры колы абарончай палітыкі»** – метраполію, Заходнюю Еўропу і Міжземнамор’е. Самастойную, актыўную палітыку праводзіла Францыя і ў краінах трэцяга свету. У межах новай французскай дактрыны Паўночная Афрыка была афіцыйна абвешчана «сферай жыццёвых інтарэсаў».

В. Жаскар д’Эстэн радыкальна змяніў галісцкую формулу аб вялікадзяржаўнасці Францыі, адводзячы ёй месца на чале дзяржаў, якія непасрэдна ідуць следам за дзвюма звышдзяржавамі. Замест «велічы» высоўваўся лозунг «уплыў». Адной з важнейшых мэт знешняй палітыкі ўраду новага прэзідэнта было далейшае развіццё адносін з ЗША і заходнееўрапейскімі дзяржавамі. Французскія войскі аднавілі ўдзел у манеўрах НАТО, хаця ў вайсковую арганізацыю Паўночнаатлантычнага альянсу Францыя не вярнулася. Насуперак лініі дэ Голя, новыя ўлады выказаліся за пашырэнне наднацыянальных еўрапейскіх установаў, прапанавала ўвесці адзіны еўрапейскі пашпарт, пагадзілася абіраць дэпутатаў Еўрапейскага парламенту прамым усеагульным галасаваннем. Францыя ўвайшла ў еўрапейскую валютную сістэму і прыняла адзіную еўрапейскую плацежную адзінку (экю).

Сярод знешнепалітычных інтарэсаў французскай дыпламатыі заставалася захаванне добрых адносінаў з СССР. Летам 1975 г. В. Жыскар д’Эстэн ад імя Францыі падпісаў Заключны акт Нарады па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе, які прадугледжваў непарушнасць граніц і далейшую разрадку міжнароднай напружанасці.

У перыяд прэзідэнцтва В. Жыскар д’Эстэна значна актывізавалася палітыка Францыі ў краінах трэцяга свету. Згодна з дактрынай **«цьермандызму»** Францыя прызнае неабходнасць глабальнай далучанасці як «абавязацельстваў і адказнасці» за свае падмандатныя тэрыторыі і садзейнічанне ў развіцці сваім былым калоніям.

Вялікую ўвагу французскія ўлады надавалі развіццю сваёй ядзернай зброі. Напачатку 1970-х гг. Францыя валодала ўсімі асноўнымі відамі ядзернай зброі і сродкамі іх дастаўкі: балістычнымі ракетамі, ракетнымі караблямі і падводнымі лодкамі, самалётамі-ракетаносцамі. Па магутнасці французскія ядзерныя сілы апярэдзілі ядзерныя сілы Вялікабрытаніі, хаця й вельмі моцна саступалі ЗША і СССР.

## Тэма 8. Францыя ў 1980-я – 2010-я гг.

### Эканамічны крызіс 1979 – 1981 гг. і яго наступствы. Стварэнне ўрада левых сіл, яго палітыка. План Дэлора. Канцэпцыя «самакіраванага сацыялізму» ФСП і перамога левай кааліцыі на прэзідэнцкіх і парламенцкіх выбарах 1981 г.

Новае абвастрэнне сусветнай эканамічнай абстаноўкі напачатку 1980-х гг. нанесла Францыі сур'ёзныя страты. Французскі франк ператварыўся ў адну з найслабейшых еўрапейскіх валют, расло беспрацоўе, абвастраліся сацыяльныя праблемы. Гэта ў значнай ступені абумовіла падзенне папулярнасці памяркоўных правых і перамогу на прэзідэнцкіх выбарах 1981 г. сацыялістаў на чале з Франсуа Мітэранам.

На працягу першага году дзейнасці новая правячая адміністрацыя правяла больш за 200 рэформ. Былі падвышаныя заробкі, да 39 гадзін скарочаны працоўны тыдзень, прыняты закон аб выхадзе на пенсію з 60 гадоў і праведзена дэвальвацыя франка. Аднак фінансавае становішча краіны заставалася настолькі цяжкім, што ўраду прыйшлося ўпершыню за ўвесь пасляваенны перыяд на 4 месяцы замарозіць цэны і заробкі.

Вялікія спадзяванні сацыялісты ўскладалі на нацыяналізацыю (праводзілася з 1982 г.), якая як па сваіх маштабах, гэтак і па галіноваму спектру выходзіла далёка за рамкі звычайнага адзяржаўленне ў заходніх краінах. У выніку гэтай рэформы Францыя атрымала ў сваё распараджэнне найбуйнейшы сярод капіталістычных краінаў дзяржаўны сектар, які ахопліваў каля 25 % прамысловых рабочых, забяспечваў чвэрць экспарту і складаў трэць ўсяго аб'ёму французскай прамысловай прадукцыі. Доля дзяржавы ў сферы фінансавання і крэдыту была на парадак большай – 95 %.

Нягледзячы на вялікія спадзяванні, заснаваныя на састарэлых неакейнсіянскіх прынцыпах рэформы сацыялістаў былі няздольныя забяспечыць вырашэння самых надзённых эканамічных праблем краіны. Застой у эканоміцы працягваўся, не адступала дарагоўля. Левыя запаволілі рост беспрацоўя, але стабілізаваць сітуацыю на рынку працы ўсё адно не здолелі. Заставаўся слабым французскі франк. Вельмі глыбокім заставалася сацыяльнае расслаенне. Ужо ў 1983 г. левым прыйшлося перайсці да рэжыму «жорсткай эканоміі», зафіксаванаму ў г. зв. **«плане Дэлора»** (Жак Дэлор – тагачасны міністр эканомікі, фінансаў і бюджэту). Праводзілася дэвальвацыя франка, былі падвышаныя падаткі і камунальныя плацяжы, замарожаныя асігнаванні на сацыяльныя патрэбы і г. д.

Рэзкая змена эканамічных прыярытэтаў сацыялістаў дала толькі часовую эканамічную палёгку. У выніку на парламенцкіх выбарах перамога дасталася правай апазіцыі і прэм'ер-міністрам стаў Жак Шырак (1986 –

1988). Новым урадам была распрацаваная праграма найбольшага спрыяння прыватнаму капіталу. Яе важнейшым стрыжнявым накірункам стала прыватызацыя. У адрозненне ад тэтчарысцкага варыянта рэформ, Ж. Шырак пакінуў у недатыкальнасці дзяржаўную форму ўласнасці ў гэткіх галінах, як вытворчасць і размеркаванне электраэнергіі, газазабеспячэнне і тэлекамунікацыі. Другім накірункам трансфармацыі гаспадарчага механізму стала скарачэнне маштабаў падаткаабкладання. І, нарэшце, яшчэ адным прыярытэтам новага ўраду стала дэрэгламентацыя розных сфер эканамічнай дзейнасці. Дзякуючы, галоўным чынам, гэтым неакансерватыўным захадам, у 1986 – 1989 гг. у Францыі назіраўся эканамічны ўздым. Ураду Ж. Шырака ўдалося збіць інфляцыю. Тым не менш, на дастаткова высокім узроўні заставалася беспрацоўе.

Прыблізная раўнавага асноўных палітычных сіл на парламенцкіх выбарах 1978 г. абяцала вельмі напружаную барацьбу на парламенцкіх выбарах 1981 г. Асноўнымі кандыдатамі правых партый былі дзеючы прэзідэнт В. Жыскар д'Эстэн, а таксама заснавальнік РПР і на той час мэр Парыжу Ж. Шырак. Камуністы высунулі кандыдатуру свайго лідара Жоржа Маршэ, а сацыялісты – Ф. Мітэрана.

Абноўленая дактрына ФСП стаяла на трох важнейшых прынцыпах: самакіраванне, «класавы фронт працоўных» і саюз левых сіл. Самакіраванне прадугледжвала стварэнне прынцыпова новага тыпу грамадскіх адносін, заснаваных на вяршэнстве грамадзянскіх інстытутаў, максімальным развіцці ініцыятывы і адказнасці грамадзянскіх супольнасцяў, у тым ліку працоўных калектываў, рэгіянальных структур, этнічных, канфесійных і культурных груп. Самакіраванне разглядалася як база французскай мадэлі сацыялізму – «**самакіраванага сацыялізму**». Сацыяльным апірышчам сістэмы самакіравання быў закліканы стаць «класавы фронт працоўных». Прычым разлік быў на стварэнне самай шырокай кааліцыі грамадскіх сіл (не толькі прафсаюзаў, але таксама жаночых, экалагічных, антываенных ды іншых арганізацый), гатовых да падтрымкі праграмы левых. У сваю чаргу, ў якасці палітычнага авангарду «класавага фронту» разглядаўся «саюз левых сіл», г. зн. левых палітычных партый.

Як і чакалася, перамогу ў першым туры не здолеў атрымаць ніхто. Лідарства захапілі Жыскар д'Эстэн (28 %) і Мітэран (25,5 %). У другім туры лідар сацыялістаў і кандыдат ад усіх левых сіл (камуністы заклікалі сваіх прыхільнікаў выступіць адзіным лагерам супраць правых) набраў амаль 52 % і стаў новым прэзідэнтам.

Упершыню ў гісторыі Пятай рэспублікі пасада галавы дзяржавы апынулася ў руках сацыяліста – Ф. Мітэрана (1981 – 1995). Гэта была ўвогуле першая электаральная перамога левых пасля 1958 г. Паколькі большасць у Нацыянальным сходзе па-ранейшаму належала правым партыям,

склалася беспрэцэдэнтная сітуацыя – у Пятай рэспубліцы парламенцкая большасць заўжды была «прэзідэнцкай». Ф. Мітэран не стаў эксперыментаваць, спрабуючы прыстасавацца да Нацыянальнага сходу: ён распусціў парламент і прызначыў новыя выбары.

Напярэдадні парламенцкіх выбараў ФСП і ФКП заключылі пагадненне аб выбарчым саюзе: у другім туры партыі абяцалі падтрымліваць аднаго – самага моцнага – са сваіх кандыдатаў. Разлік Ф. Мітэрана на стварэнне левай большасці ў Нацыянальным сходзе цалкам спраўдзіўся. Сацыялісты паказалі небывалы вынік. У першым туры яны набралі 37,5 %, а ў другім – нават звыш 49 % галасоў, заваявалі абсалютную большасць дэпутацкіх мандатаў і ўпершыню з 1947 г. атрымалі права сфарміраваць урад. ФКП, наадварот, выступіла як ніколі слаба (толькі 16 %), але 4 камуністы былі запрошаныя ва ўрад. Хаця колькасць прыхільнікаў РПР і ЮДФ скарацілася нязначна, у Нацыянальны сход прабілася амаль удвая менш дэпутатаў, чым трыма гадамі раней (адпаведна 85 і 62 мандаты супраць 148 і 137).

Разварот французскіх выбаршчыкаў улева тлумачыўся жаданнем большасці французаў нарэшце адолець зацяжны крызіс. Памяркоўныя правыя партыі і лідары не здолелі дасягнуць хуткага поспеху, а ФСП выступіла з прывабнай праграмай дзеяння. Падзенне папулярнасці камуністаў тлумачылася далейшым статыстычным змяншэннем іх традыцыйнага электарату – рабочага класу – і недастатковым пільнаванні прынцыпаў еўракамунізму з боку іх лідараў (напрыклад, Ж. Маршэ ў адрозненне ад кіраўніцтва італьянскіх камуністаў нават не наважыўся выступіць з асуджэннем савецкага ўварвання ў Афганістан).

**«Левы эксперымент» і яго правал. Парламенцкія выбары 1986 г. Палітычны курс ураду Ж. Шырака: французскі варыянт неакансерватыўнай палітыкі. Выбары 1988 г. і перабудова палітычных сіл у краіне. Крызіс традыцыйных партый. Зніжэнне палітычнай ролі ФКП. Нацыянальны Фронт у палітычным жыцці Францыі. Палітычнае жыццё Францыі ў першай палове 1990-х гг.**

Новым прэм’ер-міністрам Францыі стаў буйны дзеяч ФСП П’ер Маруа (1981 – 1984). Урад левых прыступіў да рэалізацыі буйнамаштабных сацыяльна-эканамічных рэформ. Акрамя таго пашырыліся правы прафсаюзаў, былі забароненыя звальненні за палітычную і прафсаюзную дзейнасць. Урад пайшоў на пашырэнне паўнамоцтваў мясцовых органаў улады, правёў амністыю і скасаваў смяротнае пакаранне. Прабуксоўванне рэформ і нарастанне новых эканамічных цяжкасцяў вымусіла сацыялістаў перайсці да палітыкі «жорсткай эканоміі». Расчараванне і незадавальненне шырокіх колаў насельніцтва дзеяннямі ўраду не маглі не адбіцца на адзінстве левых. У ліпені 1984 г. ФКП выйшла з ураду. Гэта, у сваю чаргу, прывяло да адстаўкі П. Маруа.

Новым прэм’ер-міністрам Францыі быў прызначаны 37-гадовы Ларан Фаб’юс (1984 – 1986). Самы малады прэм’ер у гісторыі Пятай рэспублікі выступаў за «новы» французскі сацыялізм, адкрыты рыначнай эканоміцы. Непапулярны сацыяльна-эканамічны курс П. Маруа быў працягнуты. Л. Фаб’юс здолеў дамагчыся нязначнага эканамічнага росту. Згодна з палітыкай самакіравання для выбараў у мясцовыя органы ўлады была ўведзена прапарцыйная выбарчая сістэма. У 1985 г. быў прыняты закон пра ўкараненне гэтай сістэмы на выбарах дэпутатаў Нацыянальнага сходу.

Неабходнасць выбарчай рэформы для правячай ФСП у значнай ступені тлумачылася заклапочанасцю ФСП адносна вынікаў будучых парламенцкіх выбараў. Для гэтага былі ўсе падставы. РПР і ЮДФ у 1982 г. перамаглі на рэгіянальных выбарах, у 1983 г. – на муніцыпальных, а ў 1984 г. – у Еўрапарламент.

Рэформа выклікала гнеўную крытыку з боку дзвюх вядучых правых апазіцыйных партый. Яны небеспадстаўна абвінавачвалі сацыялістаў у тым, што прапанаваная прапарцыйнасць найперш закліканая паслабіць пазіцыі памяркоўных правых праз узмацненне экстрэмісцкага Нацыянальнага фронту (шанцы скрайне правых прабіцца ў Нацыянальны сход праз мажарытарныя выбары выглядалі мізэрнымі).

Разлік ФСП не спраўдзіўся. Сацыялісты страцілі каля 7 % галасоў і больш за сем дзясяткаў мандатаў. Працягваўся заняпад ФКП. Камуністы не здолелі набраць нават 10 % галасоў і правялі ў Нацыянальны сход толькі 35 дэпутатаў. Нацыянальны фронт паказаў практычна ідэнтычны вынік, і для іх гэта быў ашаламляльны поспех! Падобны сыход не быў нечаканым. Электарат камуністаў працягваў звужацца, а праблемы, звязаныя з іміграцыяй і імігрантамі, толькі нарасталі. Кааліцыя правых партый узяла рэванш за паражэнні 1981 г. і заваявала абсалютную, няхай толькі ў два дэпутаты, большасць.

Як і пасля прэзідэнцкіх выбараў 1981 г., Елісейскі палац (рэзідэнцыя прэзідэнта) і Бурбонскі палац (будынак, дзе засядае Нацыянальны сход) атрымалі гаспадароў-канкурэнтаў: у першым зараз панаваў левы лідар, у другім – памяркоўныя правыя. Мінулым разам Ф. Мітэран меў магчымасць распусціць парламент і паспрабаваць заваяваць для сябе парламенцкую большасць. Пераможныя РПР і ЮДФ адправіць у адстаўку дзеючага прэзідэнта не мелі права. Заклікі аднаго з лідараў ЮДФ Раймона Бара да Ф. Мітэрана зысці ў адстаўку выглядалі зусім нерэалістычнымі. Больш канструктыўнай выглядала пазіцыя лідара РПР Ж. Шырака, які лічыў магчымым сумесную працу парламенту і створанага на яго базе ўраду з дзеючым прэзідэнтам. Менавіта Жаку Шыраку, лідару найбольш папулярнай партыі правых, Ф. Мітэран і даручыў пасаду прэм’ер-міністра. РПР і ЮДФ стварылі кааліцыйны ўрад. Гэтак была адчынена новая старонка ў гісторыі Пятай рэспублікі – пачалося першае **«суіснаванне»** або **«сужыццё»** (франц. *cohabitation*), сумеснае праўленне краінай дзвюма кан-

курэнтнымі палітычнымі сіламі. Тады ж адбыўся падзел паўнамоцтваў паміж прэзідэнтам і ўрадам: за першым заставаўся прыярытэт у пытаннях нацыянальнай бяспекі (у тым ліку ў вайсковай галіне) і знешняй палітыкі, а за другім – кантроль над сацыяльна-эканамічнай сферай.

Рэалізацыя новым французскім урадам Ж. Шырака неакансерватыўнай праграмы не мела гэткага ж поспеху, як тое было ў Вялікабрытаніі ці ЗША. Тут сваю ролю адыграла французская спецыфіка (ад французаў, напрыклад, было нашмат цяжэй патрабаваць жыць «зацягнуўшы паясы»; існавалі глыбокія дырыжысцкія традыцыі) і адносна нязначны тэрмін эканамічных рэформ – крыху больш за два гады. Галоўнай палітычнай навінкай кароткага прэм’ерства Ж. Шырака стала чарговая выбарчая рэформа, якая вярнула нядаўна скасаваную мажарытарную сістэму.

Перспектывы далейшага працягу неакансерватыўных рэформ у Францыі павінны былі высветліцца па выніках чарговых прэзідэнцкіх выбараў. Фаварытам прэзідэнцкай гонкі 1988 г. выглядаў дзеючы прэзідэнт. У адрозненне ад выбарчай кампаніі 1981 г. Ф. Мітэран выступаў не толькі і не столькі як лідар сацыялістаў і, шырэй, усіх левых, а як агульнанацыянальны лідар, які рэпрэзентуе «аб’яднаную Францыю», а не своекарыслівы «клан» (намёк на РПР). Прэзідэнт прапанаваў стрыманую сацыяльна-эканамічную праграму, якая не прадугледжвала «ні нацыяналізацыі, ні прыватызацыі».

Характэрнай рысай прэзідэнцкіх выбараў 1988 г. стала яўная дэідэалагізацыя палітычнай барацьбы. Вопыт кіравання вядучых партый краіны – ЮДФ, ФСП і РПР, паслядоўна трымаўшых уладу і спрабаваўшых рэалізаваць глабальныя ідэалагічныя праекты – аказаўся малапераканаўчым. Як і ў выпадку з Ф. Мітэранам, гару над ідэалагічнымі схільнасцямі і перавагамі бралі прагматызм і асцярожнасць. Ідэйна-палітычны крызіс традыцыйных партый і самой «чатырохпартыйнай» сістэмы, адсутнасць яркіх ідэй вялі да рэзкага зніжэння грамадскага інтарэсу да выбараў, паслаблення сімпатый і даверу да партый (па апытаннях, давер да іх адчувалі толькі 2 % (!) французаў).

Вынікі выбараў прадэманстравалі расчараванасць большасці французаў палітыкай ўраду правых. У другі тур разам з Ф. Мітэранам (у першым набраў 34 %) выйшаў Ж. Шырак (20 %). Але там прэзідэнт пакінуў няшмат шанцаў канкурэнту, набраўшы 54 % галасоў французаў, што ўзялі ўдзел у галасаванні. Чарговае паражэнне пацярпелі камуністы. Палітычныя працэсы, што разгортваліся ў СССР і краінах сацыялістычнага лагеру ў другой палове 1980-х гг. яшчэ больш абвастралі ўнутраны крызіс ФКП. Ж. Маршэ, генеральны сакратар партыі, нават не выставіў сваю кандыдатуру. Кандыдатаў-камуністаў аказалася двое, але лепшы з іх, Андрэ Лажуані, не здолеў дацягнуць і да 7 %. Ужо ў другі раз даказаў сваю папулярнасць Нацыянальны фронт, чый нязменны лідар Ж-М. Ле Пэн набраў звыш 14 % і заняў у першым туры галасавання чацвёртае месца.

Перамога Ф. Мітэрана дазваляла ФСП разлічваць і на поспех ў датэрміновых парламенцкіх выбарах. Нацыянальная асамблея была распушчана, і ў чэрвені 1988 г. прайшлі новыя выбары. Як і чакалася, перамогу атрымалі сацыялісты (35 %). Некалькі выправілі сваё незайздроснае становішча камуністы (11 %). Памяркоўныя правыя партыі на дваіх набралі менш за 38 % (дэпутацкая фракцыя ЮДФ аказалася крыху большай за фракцыю РПР) і былі вымушаны вярнуцца ў апазіцыю. Нацыянальны фронт не здолеў зрабіць яшчэ адзін крок наперад набраўшы менш за 10 % і здолеўшы правесці ў парламент толькі аднаго дэпутата. Поспех Ж-М. Ле Пэна на прэзідэнцкіх выбарах насцярожыў французаў; вельмі крытычную пазіцыю адносна скрайне правых занялі французскія СМІ.

На працягу наступных пяці гадоў ФСП захоўвала кантроль над Нацыянальным сходам і разам з левымі радыкаламі фарміравала ўрад. Спачатку прэм'ерскае крэсла займаў М. Ракар (1988 – 1991), потым першая жанчына прэм'ер-міністр Францыі Эдыт Крэсон (1991 – 1992) і, нарэшце, П'ер Берагавуа (1992 – 1993). Паколькі камуністы, традыцыйныя саюзнікі ФСП, страчвалі папулярнасць М. Ракар ініцыяваў стварэнне больш шырокай правячай кааліцыі за кошт ЮДФ, але падобны палітычны саюз аказаўся няўстойлівым і ў 1991 г. распаўся.

Перадвыбарчая праграма Ф. Мітэрана пад лозунгам «ні нацыяналізацыі, ні прыватызацыі» па сутнасці азначала адмаўленне сацыялістаў ад усялякіх глыбокіх сацыяльна-эканамічных рэформ. А тым часам эканамічная сітуацыя ў Францыі не вызначалася асаблівым здароўем і стабільнасцю. Паступова падаў прэстыж сацыялістаў. З аднаго боку, пасля краху камуністычных рэжымаў адбываўся крызіс усёй сістэмы сацыялістычных ідэй і каштоўнасцей. З іншага, рэпутацыі сацыялістаў моцна нашкодзіў цэлы шэраг скандалаў, у якія аказаліся ўцягнутыя іх некаторыя міністры і нават прэм'ер-міністры. Напрыклад, Л. Фаб'юс і шэраг міністраў яго кабінету апынуліся ў цэнтры судовых разглядаў у справе заражэння французскіх пацыентаў СНІДам праз пераліванне крыві. Усё выглядала так, што адпаведныя кіраўнікі наўмысна адмаўляліся ад закупак сучасных амерыканскіх прэпаратаў тэсціравання крыві, каб дачакацца выхаду на рынак французскіх аналагаў, і, магчыма, былі зацікаўленыя прамыслоўцамі матэрыяльна. Паляпшэнню палітычных пазіцый ФСП мала дапамагалі нават несумненныя знешнепалітычныя поспехі краіны, асабліва ў справе паглыблення еўрапейскай інтэграцыі. Акрамя таго, не дадавала ФСП сілы барацьба патэнцыйных пераемнікаў Ф. Мітэрана за яго палітычную спадчыну.

Падзенне папулярнасці сацыялістаў засведчылі ўжо парламенцкія выбары 1993 г. ФСП страціла 207 месцаў у Нацыянальным сходзе і здолела заваяваць толькі 53(!) дэпутацкія мандаты. Катастрафічныя вынікі выбараў урадавай партыі і далучанасць да фінансавага скандалу скончыліся трагедыяй для прэм'ер-міністра П. Берагавуа. Сын украінскіх белаэмі-

грантаў (укр. *Береговий,* рус. *Береговой*) сышоў у адстаўку і неўзабаве скончыў жыццё самагубствам (адзіны самазабойца сярод прэм'ер-міністраў Францыі). Сацыялісты перайшлі ў апазіцыю. Камуністаў ужо апярэдзіў не толькі Нацыянальны фронт, але таксама блок «зялёных».

Парламенцкую большасць заваявала кааліцыя памяркоўных правых РПР-ЮДФ, якая завалодала 84 % ад усіх дэпутацкіх мандатаў. Паражэнне сацыялістаў было настолькі сакрушальным, што Ж. Шырак, лідар РПР – найбольш папулярнай партыі – нават запатрабаваў адстаўкі Ф. Мітэрана і адхіліў яго прапанову ўзначаліць урад. Важнейшай прычынай, якая падштурхнула Ж. Шырака да гэтага дэмаршу, было жаданне сканцэнтравацца на падрыхтоўцы да наступных прэзідэнцкіх выбараў. Новым прэм'ер-міністрам Францыі стаў яшчэ адзін прадстаўнік РПР – Эдуард Баладзюр (1993 – 1995). Прычым Ж. Шырак, чыім стаўленікам быў гэты палітык, нават запатрабаваў ад свайго паплечніка абяцанне не ўмешвацца ў будучую прэзідэнцкую гонку. Новае «сужыццё» працягвалася да 1995 г., калі адбыліся чарговыя прэзідэнцкія выбары.

### Асноўныя тэндэнцыі сацыяльна-эканамічнага развіцця Францыі ў 1990-я – 2010-я гг.

У 1990-я гг. у Францыі працягваўся працэс фарміравання постіндустрыяльнага (інфармацыйнага) грамадства. Як і ў іншых высокаразвітых краінах, у Францыі асабліва бурна развіваліся электроніка, інфарматыка і звязаныя з імі галіны прамысловасці. І наадварот, некалі квітнеючыя галіны індустрыяльнага грамадства – металургія і вуглездабыча – прыходзілі ў заняпад. Там, дзе раней панавалі падобныя прадпрыемствы з'яўляліся дэпрэсіўныя раёны.

Працягваліся змены сацыяльнай структуры насельніцтва. За перыяд з 1975 г. па 1995 г. колькасць рабочых скарацілася на 2 млн. чалавек. Працягвала расці сельскагаспадарчая вытворчасць – Францыя заставалася адным з найбуйнейшых вытворцаў прадуктаў харчавання ў свеце. Пры гэтым доля сельскіх жыхароў працягвала зніжацца і ў 1990 г. складала толькі 4 %.

Сацыяльная рыначная гаспадарка з элементамі этатызму згладжвала адмоўнае ўздзеянне капіталістычнай эканомікі ў Францыі, дзяржава стаяла на абароне інтарэсаў працоўных. Але сучасная эканоміка краіны развіваецца ў прынцыпова новым асяроддзі. Глабалізацыя сусветнай эканомікі і далейшае паглыбленне інтэграцыйных працэсаў у Еўропе аказваюць значны ўплыў на нацыянальную эканоміку. Цяпер для паспяховага развіцця патрабавалася яе лібералізацыя, скасаванне ўнутранага рэгулявання, а таксама новыя тэхналогіі, якія могуць служыць навукова-тэхнічнай базай эканамічнага росту. Тормазам для эканамічнага развіцця Францыі ў 1990-я гг. былі: сістэма шырокіх сацыяльных гарантый, «уцечка мазгоў» і праблема дзяржаўных фінансаў.

У гэтых умовах узнікала неабходнасць у рэфармаванні сацыяльна-рыначнай мадэлі эканомікі Францыі. Першы этап пераўтварэнняў быў звязаны са спробай прэм’ер-міністра Алэна Жупэ (1995 – 1997) укараніць у эканоміку неакансерватыўныя прынцыпы. Сярод галоўных задач важнейшымі былі: пераадоленне крызісу гіпертрафіраванай сацыяльнай сістэмы эканомікі, знізіць шэраг сацыяльных гарантый, выйсці на ўзровень крытэрый Маастрыхцкага пагадненне аб стане дзяржаўных фінансаў краін, якія рыхтаваліся ўводзіць еўра, правесці падатковую рэформу, весці барацьбу з беспрацоўем, узмацняючы пры гэтым гнуткасць рынку працы.

Дадзеная праграма рэформ найперш датычылася дзяржаўных служачых і азначала для іх страту былых высокіх сацыяльных гарантый. Дзяржаўныя служачыя, натуральна, былі супраць рэформ. Гэта выклікала хвалю пратэстаў па ўсёй краіне. Рэформы былі прыпыненыя. Ажыццяўлялася толькі прыватызацыя, праводзіліся падатковыя рэформы, і ўводзіўся новы парадак іміграцыі.

Другі этап рэфармавання быў звязаны з дзейнасцю левага ўраду Леанэля Жаспэна (1997 – 2002). На думку лідараў сацыялістаў, неакансерватыўныя рэформы па амерыкана-брытанскім узоры для Францыі былі непрымальнымі (гэта прадэманстравалі і вынікі прэм’ерства Ж. Шырака ў 1986 – 1988 гг.). Замест хуткіх і рашучых пераўтварэнняў пачынаецца паступовая і кропкавая замена элементаў старога механізму новымі неакансерватыўнымі. Рэформы Л. Жаспэна атрымалі назву «ціхая рэвалюцыя». Вяртанне памяркоўнымі правымі поўнага кантролю над выканаўчай і заканадаўчай уладай у 2002 г. забяспечыла далейшы працяг гэтага курсу. Тым не менш, у Францыі роля дзяржавы ў эканоміцы застаецца вельмі значнай, асабліва на фоне іншых вядучых заходніх эканомік. Гэта, у прыватнасці, змякчыла ўздзеянне сусветнага фінансавага крызісу 2008 – 2009 гг.: краіна аказалася адносна пазней закранутая ім і раней выйшла з яго.

Сёння эканоміка Францыі займае 5-е месца ў свеце і 2-е ў Еўропе (пасля ФРГ). Гэта сучасная постіндустрыяльная эканоміка, у якой значна пераважае сектар паслуг: у 2009 г. ён забяспечваў 79 % ВНП і аб’ядноўваў 72 % усёй працоўнай сілы краіны (паказчыкі прамысловасці і сельскай гаспадаркі адпаведна – 2 % і 4 %, 19 % і 24 %).

Асноўнымі галінамі французскай прамысловасці з’яўляюцца: энергетыка (у галіне атамнай энергетыкі яна – сусветны лідар), тэлекамунікацыі (у тым ліку, спадарожнікавыя), аэракасмічная, абарончая (4-е месца сярод дзяржаў-экспарцёраў узбраенняў і 3-ці вайсковы бюджэт у свеце), фармацэўтыка, судна- і аўтамабілебудаванне (у 2005 г. было выпушчана 3,5 млн. машын). Францыя з’яўляецца 6-ай сельскагаспадарчай дзяржавай свету і захоўвае 2-е месца (пасля ЗША) сярод дзяржаў-экспарцёраў сельгаспрадукцыі. Велізарная значэнне для эканомікі Францыі мае турыстыч-

ная галіна. Самае разнастайнае прыроднае асяроддзе, багацейшая архітэктурная спадчына, выдатнейшыя калекцыі сусветнага мастацтва, знакамітая французская кухня і нязменна высокі ўзровень абслугоўвання робяць Францыю самай прыцягальнай турыстычнай кропкай у свеце. У 2007 г. яе наведала амаль 82 млн. замежных турыстаў – на 23 млн. болей, чым другую краіну ў гэтым спісе – Іспанію!

### Далейшая перагрупоўка палітычных сіл і прэзідэнцкія выбары 1995 г. Палітычны курс Ж. Шырака. Л. Жаспэн і абнаўленне сацыялістычнай партыі. Вынікі парламенцкіх выбараў 1997 г. і новы перыяд «сужыцця». Мадэрнізацыя Пятай рэспублікі: рэферэндум па прэзідэнцтве 2000 г. Прэзідэнцкія і парламенцкія выбары 2002 г. Крызіс сацыялістычнай партыі. Палітыка ўраду Ж.-П. Рафарэна

Канстытуцыйных абмежаванняў на колькасць прэзідэнцкіх тэрмінаў на той час не існавала. Але палітычная эпоха Ф. Мітэрана набліжалася да свайго фіналу – 78-гадовы ўзрост і кепскае здароўе палітыка (ён быў смяротна хворы на рак) не пакідалі іншага выбару. Сацыялісты спадзяваліся на тое, што пераемнікам 78-гадовага патрыярха французскай палітыкі на прэзідэнцкай пасадзе павінны стаць адзін з кіраўнікоў ФСП Ліанэль Жаспэн. У лагеры памяркоўных правых не абышлося без нечаканасцяў. Прэм’ер-міністр Э. Баладзюр набыў дастаткова шырокую папулярнасць і вырашыў паспытаць шчасця ў барацьбе за прэзідэнцкае крэсла насуперак абяцанню не пераходзіць дарогу Ж. Шыраку. У выніку у РПР адбыўся раскол і на выбары ад партыі пайшлі два кандыдаты. ЮДФ, у сваю чаргу, вырашыў падтрымаць Э. Баладзюра. Менавіта паміж гэтымі трыма палітыкамі і разгарнулася барацьба за прэзідэнцкае крэсла.

Палітычныя праграмы Л. Жаспэна, Э. Баладзюра і Ж. Шырака былі вельмі падобнымі і адрозніваліся, галоўным чынам, толькі стылістычна. Тры вядучыя кандыдаты абяцалі змагацца з беспрацоўем ды інфляцыяй, забяспечыць эканамічны ўздым, давесці да лагічнага заканчэння распачатыя ў Заходняй Еўропе інтэграцыйныя працэсы.

У першым туры перамаглі Л. Жаспэн і Ж. Шырак, якія набралі адпаведна 23 % і 21 % галасоў і выйшлі ў другі тур. Э. Баладзюр застаўся толькі трэцім – 18,5 %. У чарговы раз прадэманстраваў стабільнасць сваёй электаральнай падтрымкі Ж-М. Ле Пэн – ізноў 15 %. У другім туры перамога дасталася Ж. Шыраку (звыш 52,5 %). Лідар РПР і стаў пятым прэзідэнтам Пятай рэспублікі (1995 – 2007). Новым прэм’ер-міністрам быў прызначаны паплечнік Ж. Шырака па РПР Алэн Жупэ (1995 – 1997). Другі перыяд «сужыцця» скончыўся.

Новы кіраўнік ураду выступіў з пазіцыяў жорсткай бюджэтнай эканоміі з праграмай рэфармавання сістэмы сацыяльнага забеспячэння

(«план Жупэ»). Правядзенне гэткай непапулярнай лініі выклікалі гнеўную рэакцыю прафсаюзаў. Выбухнуў найвастрэйшы з траўня 1968 г. сацыяльны канфлікт. У забастоўках і дэманстрацыях пратэсту, якія працягваліся амаль месяц, бралі ўдзел каля 2 млн. чалавек. Прэм'еру нічога не заставалася, як адмовіцца ад свайго плану. Тым не менш, гэта ніколькі не выратавала рэпутацыю А. Жупэ, які і дагэтуль носіць лаўры аднаго з самых непапулярнага прэм'ера ў гісторыі Пятай рэспублікі. Баючыся горшага – далейшага падзення папулярнасці сваёй партыі, Ж. Шырак вырашыў правесці парламенцкія выбары на год раней – у 1997 г.

Левыя партыі стварылі шырокую кааліцыю на чале з ФСП і ФКП (у яе таксама ўваходзілі «зялёныя» і некаторыя іншыя партыі) і прапанавалі выбаршчыкам прывабную праграму дзеяння, галоўнымі палажэннямі якой павінны былі стаць барацьба з беспрацоўем і скарачэнне працоўнага тыдню да 35 гадзін. У выніку, аб'яднаныя левыя атрымалі ўпэўненую перамогу, а сацыялісты сталі галоўнымі трыумфатарамі выбараў, заваяваўшы на 172 дэпутацкія мандаты больш, чым у 1993 г. Памяркоўныя правыя партыі чакаў правал. Фракцыі РПР і ЮДФ зменшыліся на 198 дэпутатаў! Адной з прычын няўдачы гэтых партый стала небывала паспяховае выступленне Нацыянальна фронту. У першым туры скрайне правыя набралі без малага 15 % галасоў і занялі трэцяе месца сярод партый (яны прайгралі толькі 0,71 % РПР і на 0,72 % абышлі ЮДФ). У другім туры Нацыянальны фронт здолеў адцягнуць ад памяркоўных правых нямала выбаршчыкаў. Праўда, паколькі з партыяй Ж.-М. Ле Пэна ніхто блакавацца ў другім туры па-ранейшаму не хацеў, то і прадстаўніцтва гэтай партыі ў трэці раз запар аказалася абмежаваным толькі адным дэпутатам. Ж. Шыраку нічога не заставалася, як прапанаваць лідару ФСП Ліанэлю Жаспэну (1997 – 2002) узначаліць урад. Гэткім чынам пачалося чарговае – ужо трэцяе – «сужыццё». Сабраны Л. Жаспэнам урад стаў кааліцыйным. Акрамя сацыялістаў у яго былі ўключаны таксама камуністы, левыя радыкалы ды інш.

Выконваючы свае перадвыбарчыя абяцанні, Л. Жаспэн забяспечыў увядзенне 35-гадзіннага працоўнага дня. На фоне спрыяльнай эканамічнай абстаноўкі гэтае і некаторыя іншыя ўрадавыя мерапрыемствы дазволілі скараціць беспрацоўе амаль на 900 тыс. чалавек. Нягледзячы на даўні імідж бескампраміснага сацыяліста, урад Л. Жаспэна таксама, як і папярэдні, мусіў азірацца на інтэграцыйныя абавязацельствы Францыі. Праводзілася дэнацыяналізацыя прадпрыемстваў, адбылося зніжэнне падаходнага падатку, падаткаў на дабаўленую вартасць і на прыбытак.

24 верасня 2000 г. па прапанове прэзідэнта Ж. Шырака быў праведзены рэферэндум аб скарачэнні тэрміну прэзідэнцкіх паўнамоцтваў з 7 да 5 гадоў. З аднаго боку, тэмпы сацыяльна-эканамічных і грамадска-палітычных працэсаў на пачатку XXI ст. сталі настолькі імклівымі, што патрабавалі магчымасці

больш аператыўнага абнаўлення вышэйшай эліты краіны. З іншага боку, 5-гадовы тэрмін прэзідэнцтва дазваляў сінхранізаваць прэзідэнцкі і парламенцкі выбарчыя цыклы. Правядзенне важнейшых нацыянальных выбараў на працягу аднаго году павінна было знізіць магчымасць падзеленага кіравання, а значыць узмацніць эфектыўнасць выканаўчай галіны ўлады. 73 % французаў падтрымалі прапанову прэзідэнта. 5-гадовым быў павінны стаць ужо наступны прэзідэнцкі тэрмін. Гэткім чынам была ўнесена важнейшая канстытуцыйная змена ў гісторыі Пятай рэспублікі.

Самае працяглае ў гісторыі Пятай рэспублікі «сужыццё» аказалася вельмі паспяховым. Аднак шляхі Ж. Шырака і Л. Жаспэна не маглі не разысціся. Абодва палітыкі, лідары буйнейшых у краіне партый, уяўляліся галоўнымі канкурэнтамі на прэзідэнцкіх выбарах, што меліся адбыцца ў 2002 г. Фаварыты выступілі з розным поспехам. Л. Жаспэн не здолеў выкарыстаць передвыбарчую кампанію на сваю карысць. Па-першае, спрэчкі кандыдатаў ды іх каманд галоўным чынам абарочваліся вакол праблемаў законнасці і парадку, а значыць галоўнай мішэнню для крытыкі станавіўся дзеючы прэм’ер і яго ўрад. Гэта звужала магчымасці для пашырэння Л. Жаспэнам традыцыйнага электарату сваёй партыі. Па-другое, ён не здолеў згуртаваць вакол сябе «левую Францыю». На думку многіх левых палітыкаў і актывістаў, стрыманая палітыка Л. Жаспэна супярэчыла сацыялістычным прынцыпам і не адпавядала спадзяванням шырокім народных мас. Апошні фактар для палітыка аказаўся ў першым туры фатальным. Дробныя левыя кандыдаты адцягнулі ад дзеючага прэм’ера столькі выбаршчыкаў, што той набраў толькі 16,18 % галасоў і не здолеў «зачапіцца» нават за другое месца. Расчараванне было настолькі моцным, што Л. Жаспэн не толькі склаў з сябе паўнамоцтвы галавы ўраду і старшыні ФСП, але й заявіў, што назаўжды пакідае палітычную арэну. Паколькі частка ЮДФ выказвалася ў падтрымку Ж. Шырака, зусім слаба выступіў кандыдат гэтай партыі – Раймон Байру (6,84 %), а сама яе палітычная будучыня станавілася вельмі няпэўнай.

Сапраўдным трыумфатарам першага тура стаў Ж.-М. Ле Пэн. Лідар скрайне правых разыгрываючы ксенафобскую карту, перадусім моцную ўстрывожанасць грамадства высокім ўзроўнем злачыннасці ў іміграцкім асяроддзі, набраў рэкордныя для сябе 16,68 % і стаў сапернікам дзеючага прэзідэнта ў другім туры!

Ж. Шырак таксама наўрад ці мог занесці ў свой актыў першы тур: ён не здолеў нават перасягнуць 20 %-вы рубеж. Але у другім туры за ім была вымушаная пайсці літаральна ўся Францыя, расчараваная і прысаромленая тым, што палітык кшталту Ле Пэна ўжо стаяў за адну прыступку ад нацыянальнага палітычнага Алімпу. Вынік другога тура быў прадказальным – за Ж. Шырака прагаласавала 82 % выбаршчыкаў, што ўзялі ўдзел у галасаванні.

Ужо праз месяц пасля другога тура прэзідэнцкіх выбараў адбыліся чарговыя парламенцкія выбары. Прыхільнікі новаабранага прэзідэнта на базе РПР і шырокага спектру іншых партый, у тым ліку пры ўдзеле часткі лідараў ЮДФ, стварылі новую партыю – **Саюз за прэзідэнцкую большасць** (**ЮМП**; *Union pour la majorité présidentielle*). ЮМП, у якой былі аб'яднаныя прадстаўнікі галісцкай, ліберальнай (рэспубліканскай), хрысціянска-дэмакратычнай і радыкальнай палітычных традыцый, прэтэндавала на трывалае аднаасобнае лідарства на правай палове палітычнага спектру Францыі.

Новы палітычны праект Ж. Шырака аказаўся вельмі ўдалым. ЮМП набрала ў першым туры 33 %, а пасля другога здолела правесці ў парламент 357 дэпутатаў (усяго ў Нацыянальнай асамблеі іх было 577). Праз пяць месяцаў пасля выбараў, на якіх мэта стварэння прэзідэнцкай большасці была паспяхова дасягнутая, партыя была перайменаваная ў **Саюз за народны рух** (таксама **ЮМП**; *Union pour un mouvement populaire*).

Дэмаралізаваная правалам свайго кандыдата на прэзідэнцкіх выбарах, ФСП не вытрымала канкурэнцыі з боку ЮМП і страціла 115 мандатаў. Тым не менш, сацыялісты трывала замацавалі за сабой статус другой партыі ў краіне і станавіліся адным з асноватворных элементаў новай двухпартыйнай сістэмы, якая нараджалася. У другім туры кандыдаты ад ЮМП і ФСП набралі звыш 80 % галасоў (47 % і 35 % адпаведна). Тым часам працягваўся заняпад аслабленай расколам ЮДФ. Яна ўжо не набрала і 5 % галасоў і паказала практычна такі ж самы вынік, як і ФКП. Трэцяй па папулярнасці партыяй стаў Нацыянальны фронт. Але пасля масіраванай атакі на скрайне правых падчас прэзідэнцкай кампаніі лепэнаўцы ў параўнанні з выбарамі 1997 г. страцілі мільён галасоў і наогул засталіся без прадстаўніцтва ў Нацыянальным сходзе.

Кіраўніком новага французскага ўраду стаў Жан-П'ер Рафарэн (2002 – 2005). Памяркоўны ліберальна-рыначны сацыяльна-эканамічны курс, асабліва пенсійная рэформа, выклікалі масавую незадаволенасць працоўных. Небывалая спёка лета 2003 г. каштавала Францыі амаль 15 тыс. жыццяў. Запозненая рэакцыя ўраду на гэтую праблему выклікала цэлы шквал крытыкі на адрас Ж.-П. Рафарэна. У выніку ў 2004 г. была распачатая рэформа дзяржаўнай сістэмы аховы здароўя. Сур'ёзнай праблемай ураду з'яўляліся частыя спрэчкі паміж міністрамі, што стварала новыя і новыя падазрэнні наконт слабых лідарскіх якасцяў Ж.-П. Рафарэна, не здольнага згуртаваць сваю палітычную каманду. Трывожным сігналам для правячай партыі стала яе паражэнне на рэгіянальных выбарах 2004 г. Пасля правалу рэферэндуму па пытанні ратыфікацыі праекту Канстытуцыі ЕС (2005) Ж.-П. Рафарэн пайшоў у адстаўку.

**Крызіс палітыкі мультыкультуралізму.**
**«Вайна прадмесцяў» 2005 г. Прэзідэнцкія і парламенцкія выбары 2007 г. Палітычнае жыццё Францыі на сучасным этапе**

Пасля распаду Французскай каланіяльнай імперыі ў 1950 – 1960-я гг. частка лаяльных мітраполіі жыхароў калоній перабралася з Азіі (галоўным чынам з Індакітаю) і Афрыкі (найперш, Паўночнай Афрыкі) на тэрыторыю Францыі. Падаўляючая большасць з іх атрымала французскае грамадзянства, а ўжо іх дзеці сталі французскімі грамадзянамі па нараджэнні. Акрамя таго, ў перыяд эканамічнага ўздыму ў 1960-х гг. у краіну прыехала нямала жыхароў былых калоній у якасці таннай працоўнай сілы. Частка іх таксама атрымала грамадзянства. Ужо ў 2005 г. удзельнікі гэтых перасяленчых хваляў ды іх патомкі налічвалі каля 5,5 млн. чалавек, што складала без малога 10 % насельніцтва Францыі.

У адрозненне ад ЗША, дзе інтэграцыя імігрантаў ажыццяўлялася на базе канцэпцыі «плавільнага катла» (англ. *melting pot*), г. зн. зліцця ўсіх культур у адну, у Францыі і шэрагу іншых заходніх дзяржаў (Канада, Германія) была абраная палітыка **мультыкультуралізму**. Мультыкультуралізм прадугледжваў прызнанне правоў не толькі за індывідамі (палітычны лібералізм), але і калектыўнымі суб'ектамі: этнічнымі і культурнымі групамі. Гэта азначала прызнанне нармальнасці паралельнага існавання культур у мэтах іх узаемнага пранікнення, узбагачэння і развіцця ў агульначалавечым рэчышчы масавай культуры.

Да пары да часу ізаляванасць іміграцкіх супольнасцяў ды іх праблемы заставаліся на перыферыі грамадскага інтарэсу і выклікалі толькі нездаровую заклапочанасць экстрэмістаў з Нацыянальнага фронту. Аднак ужо напачатку 2000-х гг. нарастанне маргіналізацыі расавых і канфесійных меншасцяў стала вельмі сур'ёзна пагражаць парадку і стабільнасці ў Францыі. У прадмесцях французскіх гарадоў, дзе, як правіла, пражывалі імігранты ды іх патомкі, лютавалі беспрацоўе і злачыннасць. У сацыяльна няшчасным асяроддзі ўзмацніліся пазіцыі радыкальных ісламісцкіх арганізацый і груповак: адасобленасць дзяржавы і рэлігіі ў Францыі не дазваляла афіцыйным уладам аказваць падтрымку мусульманскім супольнасцям і гэтым карысталіся экстрэмісты. Узрастальна напружанымі становяцца адносіны паміж моладдзю з «каляровых ускраін», з аднаго боку, і паліцыяй і прадстаўнікамі сярэдняга класу, з другога.

Напрыканцы кастрычніка – лістападзе 2005 г. гэтыя праблемы вырваліся вонкі. Гібель двух падлеткаў паўночнаафрыканскага паходжання ў трансфарматарнай будцы, дзе яны хаваліся ад паліцыі, выклікала масавыя беспарадкі – г. зв. **«вайну прадмесцяў»**. На ўскраінах Парыжу, цэлым шэрагу іншых гарадоў і мястэчак Францыі раз'юшаная моладзь паліла аўтамашыны і аўтобусы, нават нападала на паліцэйскія ўчасткі. Толькі рашучыя дзеянні міністра ўнутраных спраў Нікаля Сарказі і ўвядзенне прэзі-

дэнтам надзвычайнага становішча здолелі ізаляваць, а потым і загасіць гэтыя выступленні. Аднак самі праблемы неінстытуцыялізаванай дыскрымінацыі і няроўнасці, слабай інтэграванасці французаў нееўрапейскага паходжання ў тканіну французскага соцыуму засталіся далёкімі ад вырашэння. Праз 2 гады, у лістападзе 2007 г. падобныя, хаця меншыя маштабам беспарадкі, успыхнулі ізноў.

Незадоўга да заканчэння другога прэзідэнцкага тэрміну Ж. Шырак выступіў з чаканым зваротам, у якім абвясціў аб сваім рашэнні не змагацца за чарговае пераабранне. Прыходзіла пара палітыкаў новай генерацыі – тых, хто быў народжаны пасля заканчэння Другой сусветнай вайны і не браў удзел у палітычным жыцці Францыі галісцкай эпохі. Галоўнымі прэтэндэнтамі на перамогу сталі 52-гадовы Нікаля Сарказі (ЮМП) і 53-гадовая Сегален Руаяль (ФСП) (С. Руаяль не была першай жанчынай, якая ўдзельнічала ў прэзідэнцкіх выбарах. Але да яе ніводная жанчына не прэтэндавала на сур'ёзны поспех. Увогуле, выбары 2007 г. прайшлі пад знакам небывалай актыўнасці жанчын-лідараў: з 12 кандыдатаў у прэзідэнты іх было 4). Н. Сарказі, як вядома, былы міністр ўнутраных спраў ва ўрадах Ж.-П. Рафарэна і Д. дэ Вільпэна, галоўны акцэнт у сваіх праграмных выступленнях рабіў на пытаннях грамадскага парадку і бяспекі. Цэнтральнае месца ў праграме С. Руаяль займала сацыяльна-эканамічная праблематыка.

У адрозненне ад прэзідэнцкіх выбараў 1997 г. фаварыты даказалі ў першым туры свае прэтэнзіі на прэзідэнцкае крэсла. Н. Сарказі набраў 31 %, а С. Руаяль – 26 %, Р. Байру – 19 %, Ж.-М. Ле Пэн – толькі 10 %. Лідар ФСП магла выступіць яшчэ больш паспяхова. Але падтрымка яе з боку роднай партыі была далёка не аднадушнай, а іншыя левыя партыі высунулі сваіх кандыдатаў. У другім туры перамога дасталася кандыдату ЮМП. Н. Сарказі стаў шостым прэзідэнтам Пятай рэспублікі (2007). На наступны дзень пасля свайго абрання ён прызначыў новага кіраўніка ўраду – блізкага паплечніка па партыі – Франсуа Фіёна (2007). Прэм'ер-міністру было даручана павесці ЮМП на парламенцкія выбары.

Як і ў 2002 г., прэзідэнцкая партыя атрымала даволі ўпэўненую перамогу. Нават страціўшы каля чатырох дзясяткаў мандатаў, ЮМП ізноў заваявала абсалютную большасць дэпутацкіх мандатаў. Сацыялісты, наадварот выступілі больш паспяхова. У другім туры яны далі партыі-лідару сапраўдны бой, набраўшы 42 % галасоў супраць 46 % у ЮМП.

Неўзабаве пасля першага туру прэзідэнцкіх выбараў спыніла сваё існаванне ЮДФ. Яе лідар, Р. Байру, набраўшы вартыя павагі 19 %, планаваў развіць поспех праз рэарганізацыю партыі і адмову ад традыцыйнага блакіравання на парламенцкіх выбарах з ЮМП. Але гэта выклікала раскол партыі на палітычныя арганізацыі яго прыхільнікаў – **Дэмакратычны рух** і яго пра-

ціўнікаў, якія выступалі за захаванне саюзу з прэзідэнцкай партыяй і памяркоўнымі правымі – **Новы цэнтр**. Першая партыя пацярпела поўны крах – заваявала толькі некалькі мандатаў, другая, дзякуючы супрацоўніцтву з ЮМП, здолела паказаць трэці вынік па колькасці дэпутатаў і далучылася да прэзідэнцкай большасці ў Нацыянальным сходзе.

З прыходам на пасаду прэзідэнта Н. Сарказі істотна змяніўся парадак узаемадзеяння галавы дзяржавы і прэм'ер-міністра, які на пэўны час быў пазбаўлены сваіх традыцыйных функцый і ўплыву. Фактычным прэм'ерам становіцца кіраўнік адміністрацыі Прэзідэнта Францыі. Пры гэтым у 2008 г. з ініцыятывы Н. Сарказі быў прыняты спецыяльны канстытуцыйны закон, якім забаранялася абірацца на пасаду прэзідэнта два разы запар (г. зн., што максімальная працягласць прэзідэнцтва абмяжоўвалася 10 гадамі). З канца 2010 г., калі Ф. Фіён быў перапрызначаны прэм'ер-міністрам, яго асабісты ўплыў і роля значна ўзрастаюць і зараз імя прэм'ера нават называецца сярод верагодных кандыдатаў ад памяркоўных правых для ўдзелу ў прэзідэнцкіх выбарах 2012 г.

## Знешняя палітыка Францыі ў 1980-я - 2010-я гг.

Знешнепалітычная праграма ўраду Мітэрана – Маруа абвяшчала неабходнасць разрадкі міжнароднай напружанасці і падтрымання добрасуседскіх адносін з усімі краінамі. Разам з тым, насуперак чаканням многіх, сацыялісты падкрэслівалі адданасць Францыі НАТО і настойвалі на ўзмацненні французскіх узброеных сіл, асабліва ўдасканаленні ракетна-ядзернай зброі. Ва ўмовах вяртання ад палітыкі разрадкі да «халоднай вайны» і пачатку новага вітку гонкі ўзбраенняў Францыя падтрымала размяшчэнне ў Еўропе амерыканскіх ядзерных ракет сярэдняй дальнасці і паслядоўна займала жорсткую антысавецкую пазіцыю (патрабаванне вываду савецкіх войск з Афганістану, скарачэнне савецкіх кантынгентаў у краінах сацыялістычнага лагеру і г. д.).

Напачатку другога тэрміну свайго прэзідэнцтва Ф. Мітэран некалькі змясціў акцэнты нацыянальнай бяспекі на карысць еўрацэнтрызму, але не настолькі, каб адмовіцца ад шчыльнага супрацоўніцтва з НАТО. Напрыклад, у студзені 1990 г. французскія войскі ўзялі ўдзел у вайсковай аперацыі «Бура ў пустыні».

Пасля заканчэння «халоднай вайны», аб'яднання Германіі, распаду СССР і Югаславіі Ф. Мітэран бачыў галоўную задачу французскай знешняй палітыкі ў збліжэнне з Германіяй і аб'яднанні Заходняй Еўропы. Францыя разам з ФРГ выступіла ініцыятарам Маастрыхцкага дагавора. Абмежаванне нацыянальнага суверэнітэту, якое прадугледжвалася пагадненнем, прыйшлося не даспадобы многім французскім палітыкам. Рашучы пратэст Маастрыхту заяўлялі камуніс-

ты, Нацыянальны фронт і частка галістаў. У выніку пытанне аб ратыфікацыі Маастрыхцкага пагаднення было вынесена на рэферэндум. Французскае грамадства аказалася моцна палярызаваным, але 51 % выбаршчыкаў выказаўся ў падтрымку пагаднення. Пасля гэтага яно было ратыфікавана Нацыянальным сходам і набыло моц.

З прыходам у Елісейскі палац Ж. Шырака Францыя працягвала заставацца дзейсным членам Еўрапейскага Саюзу і Паўночнаатлантычнага пакту. З 1 студзеня 1999 г. у Францыі, як і ў іншых краінах ЕС, увайшла ў зварот, пакуль што яшчэ толькі безнаяўны, еўрапейская валюта – еўра. Летам таго ж году Францыя ўзяла ўдзел у вайсковай аперацыі НАТО супраць Сербіі ў Косава, хаця ў адрозненне ад падзей 1990 г. на Блізкім Усходзе яна праводзілася без санкцыі ААН. У 2003 г. Францыя далучылася да кааліцыі на чале са Злучанымі Штатамі ў Афганістане.

Разам з тым Францыя спрабавала прапанаваць новыя знешнепалітычныя ідэі, у тым ліку палітычную і эканамічную шматпалярнасць і шматвектарнасць і пераўтварыць Еўрасаюз у новы палітыка-эканамічны і сілавы полюс. Гэткім чынам, у 2005 г. Ж. Шырак адмовіўся ад удзелу ў Іракскай вайне. Аднак партнёры Францыі па ЕС скептычна паставіліся да падобнай перспектывы і не падтрымалі яе. Яшчэ адным правалам еўрапейскай знешняй палітыкі Францыі сталі вынікі рэферэндуму 2005 г. па пытанні ратыфікацыі еўрапейскай канстытуцыі. Французы выказаліся супраць яе, чым па-сутнасці канчаткова пахавалі сам праект.

Пралікі знешняй палітыкі папярэдняга французскага кіраўніцтва паспрабаваў выраўнаць новы прэзідэнт Н. Сарказі. Адным з важнейшых пунктаў яго знешнепалітычнай праграмы стаў лозунг «Вяртання ў Еўропу». Гэтая лінія ярка праявілася ў значнай ролі, якую адыграла Францыя ў вырашэнні крызіса з канстытуцыяй ЕС. Н. Сарказі рашуча падтрымаў ідэю і практычнае ўвасабленне Лісабонскага дагавору. Гэткім чынам ЕС здолеў выйсці з палітычнага і інтэграцыйнага тупіку.

Важнае значэнне надавалася ўмацаванню французскага ўплыву ў краінах «Новай Еўропы» – краінах былога сацыялістычнага лагеру і Савецкага Саюзу (для гэтага ў Н. Сарказі меліся і персанальныя матывы. Яго продкі па мужчынскай лініі належалі да венгерскай арыстакратыі). Н. Сарказі быў нават гатовы пайсці на магчымае ахалоджванне адносін з Германіяй – відавочным канкурэнтам у гэтай справе. Затое французскі прэзідэнт імкнуўся да далейшага ўмацавання знешнепалітычных повязяў з англасаксонскімі краінамі, перадусім – з ЗША. У красавіку 2009 г. Францыя вярнулася ў вайсковую арганізацыю Паўночнаатлантычнага альянсу.

Адным з найбольш амбіцыйных знешнепалітычных праектаў Н. Сарказі стала ідэя стварэння Міжземнаморскага саюзу, які б злучыў у адзіную міжнародную структуру Еўропу, Паўночную Афрыку і Блізкі Ўсход. Гэта б не толь-

кі дазволіла узмацніць ролю Еўропы і Францыі ў традыцыйна важным для сябе рэгіёне, але таксама абмяжоўваць міграцыю, стрымліваць ісламізацыю, забяспечваць энергетычную бяспеку і, зразумела, захоўваць тут мацнейшы эканамічны і культурны ўплыў. Важным дасягненнем у гэтым накірунку стала правядзенне Парыжскага саміту Міжземнаморскага саюзу ў ліпені 2008 г. У склад арганізацыі ўвайшлі 43 краіны – 27 членаў ЕС і 16 краін з Балканаў, Блізкага Ўсходу і Паўночнай Афрыкі.

## Тэма 9. Заходняя Германія і ФРГ ў 1945 – 1980-я гг.

### Вынікі Другой сусветнай вайны для Германіі. Акупацыйная палітыка ЗША, Вялікабрытаніі і Францыі ў Заходняй Германіі. Палітыка «чатырох Д». Адраджэнне палітычных партый і арганізацый

Германія панесла падчас Другой сусветнай вайны аграмадныя чалавечыя страты. 4,3 млн. салдат і афіцэраў вермахту загінулі ці прапалі без вестак, а яшчэ звыш 6 млн. былі параненыя. Напрыканцы вайны ў палоне саюзнікаў знаходзілася ад 10 да 11 млн. нямецкіх салдат. Прычым, калі амерыканцы і брытанцы намагаліся хутчэй адправіць палонных дадому і зняць з сябе выдаткі на іх утрыманне, то Францыя і СССР імкнуліся выкарыстоўваць іх як мага даўжэй ў якасці бясплатнай працоўнай сілы. У савецкім палоне апынулася каля 3 млн. немцаў, і апошнія з іх здолелі вярнуцца дадому толькі ў 1955 г. Страты сярод цывільных асоб склалі яшчэ каля 1,5 млн. чалавек. Гэткім чынам, у гады вайны Германія страціла каля дзясятай часткі свайго насельніцтва.

Многія германскія гарады, асабліва ва ўсходняй частцы краіны, ляжалі ў руінах. Большая частка прамысловага абсталявання была знішчаная бамбардзіроўкамі ці пазней дэманціраваная пераможцамі. Транспартная інфраструктура ды энергасістэма былі амаль цалкам разбураныя. Каласальныя матэрыяльныя страты дапаўняліся поўнай дэзарганізацыяй грашова-фінансавай сістэмы. Агульныя фінансавыя страты дасягнулі сумы ў $300 млрд.

Не менш разбуральныя наступствы меў псіхалагічны шок, які ахапіў грамадства пераможанай Германіі. Вельмі складанай праблемай было адраджэнне нацыянальнай самасвядомасці і высвятленне прычын катастрофы, што здарылася з краінай.

Патсдамская канферэнцыя дзяржаў антыгітлераўскай кааліцыі вызначыла новыя межы Германіі: Усходняя Прусія перадавалася СССР, тэрыторыя да Одэра і Нэйсэ на ўсходзе – Польшчы, Судэцкая вобласць вярталася Чэхаславакіі, аднаўляўся суверэнітэт Аўстрыі. Немцы, якія пражывалі ў Венгрыі, Польшчы, Чэхаславакіі, падлягалі дэпартацыі ў Германію. Краіну чакалі буйныя рэпарацыйныя выплаты.

З моманту падпісання акту аб безагаворачнай капітуляцыі ад 8 траўня 1945 г. і да восені 1949 г. у Германіі не існавала дзяржавы. Саюзнікі па антыгітлераўскай кааліцыі падзялілі яе на чатыры акупацыйныя зоны – амерыканскую, брытанскую, савецкую і французскую – і ўзялі вярхоўную ўладу ў краіне.

Амерыканская акупацыйная зона займала каля 30 % тэрыторыі; у ёй знаходзілася самае буйное пагалоўе хатняй жывёлы і выдатныя сельскагаспадарчыя ўгоддзі. Паколькі гэтая зона была адрэзаная ад мора, то пазней для лепшага забеспячэння да яе была далучаная частка брытанскай зоны з горадам Брэменам. Брытанская зона была самай значнай. Яна з'яўлялася найбуйнейшай па колькасці насельніцтва (тут пражывала 22 з 66 млн. немцаў) і найважнейшай па прамысловаму патэнцыялу. У яе склад, напрыклад, уваходзіла Рурская вобласць – індустрыяльнае сэрца Германіі. Французская акупацыйная зона, якая была вылучана з першапачатковых амерыканскай і брытанскай, была самай маленькай па плошчы (15 %) і насельніцтву (12 %). Праўда, у яе склад увайшла прамыслова важная Саарская вобласць. Савецкая зона была найбуйнейшай, не надта густанаселенай і да таго ж вельмі моцна пацярпелай ад ваенных дзеянняў (гл. тэму «Усходняя Германія і ГДР у 1945 – 1990 гг.»). Берлін таксама быў падзелены на чатыры адпаведныя сектары, прычым савецкі займаў 46 % тэрыторыі горада, дзе пражывала звыш 30 % насельніцтва.

Уся паўната ўлады на нямецкіх землях засяроджвалася ў руках вайсковых адміністрацый Вялікабрытаніі, ЗША, СССР і Францыі. 5 чэрвеня 1945 г. была створаная **Саюзная Кантрольная рада** (**СКР**; афіцыйная назва – «Кантрольная рада па Германіі») у складзе чатырох галоўнакамандуючых акупацыйнымі войскамі. СКР была ўніверсальным органам, чые законы, загады, дырэктывы, інструкцыі і звароты датычыліся ўсіх сфераў жыцця і распаўсюджваліся на ўсе чатыры акупацыйныя зоны.

Галоўнай праблемай дзейснасці СКР было тое, што галоўнакамандуючыя фактычна падпарадкоўваліся не Радзе, а сваім урадам, кіраваліся іх указаннямі, а не клопатам аб вырашэнні агульнагерманскіх праблем. Рашэнні ў СКР павінны былі прымацца толькі на базе кансэнсусу, г. зн. аднагалосна, дзейнічала права вета. Таму рознагалоссі толькі нарасталі і ўсё часцей вайсковыя губернатары ў заходніх зонах і савецкі галоўнакамандуючы ў сваёй дзейнічалі, выходзячы з уласных уяўленняў пра дэмакратыю, рэпарацыі, пакаранне нацысцкіх злачынцаў і г. д.

Па меры нарастання «халоднай вайны» разыходжанні паміж заходнімі саюзнікамі і СССР станавіліся ўсё больш і больш прынцыповымі. Рэальная ўлада ўзрастальна засяроджвалася ў руках занальных вайсковых адміністрацый. Роля СКР падала, і ў сакавіку 1948 г. адбылося яе апошняе пасяджэнне.

Згодна з рашэннямі Патсдамскай канферэнцыі акупацыйныя ўлады бачылі сваю галоўную задачу ў правядзенні г. зв. **палітыкі «чатырох Д»** – непарыўна звязаных паміж сабой дэнацыфікацыі, дэмілітарызацыі, дэмакратызацыі і дэкартэлізацыі.

Праблемы **дэнацыфікацыі** – ліквідацыі нацызму, уплыву нацысцкай ідэалогіі, скасавання законаў Трэцяга рэйху, выдаленне нацыстаў з грамадскіх пасад, школ і ўніверсітэтаў і г. д. былі ў першыя гады акупацыі самымі актуальнымі. Гэта была вельмі няпростая задача, паколькі напрыканцы вайны ў НСДАП налічвалася каля 8,5 млн. членаў, а ў даччыных і прымыкаючых да яе арганізацыях – яшчэ блізу 10 млн. немцаў.

Хаця дэнацыфікацыя знаходзілася ў цэнтры ўвагі акупацыйных улад з першых дзён дзейнасці, толькі ў снежні 1946 г. СКР прыняў закон аб забароне НСДАП і ўсіх яе арганізацый. Дырэктыва «Арышт і пакаранне ваенных злачынцаў, нацыянал-сацыялістаў, мілітарыстаў ды інтэрнаванне, кантроль і назіранне за магчыма небяспечнымі злачынцамі» была прынятая толькі па заканчэнні Нюрнбергскага працэсу над галоўнымі ваеннымі злачынцамі (лістапад 1945 г. – кастрычнік 1946 г.), які адыграў важнейшую ролю ў дэнацыфікацыі і дэмакратызацыі Германіі. Усё гэта прывяло не толькі да вольнага трактавання праблем дэнацыфікацыі ў розных зонах, але і да выкарыстання розных метадаў у яе ажыццяўленні.

Для брытанскай і амерыканскай зон была характэрная моцная бюракратызацыя гэтага працэсу, што рабіла ўсе працэдуры зацягнутымі і малаэфектыўнымі. Акрамя таго для заходніх саюзнікаў – у найменшай ступені гэта датычылася французаў – галоўным у дэнацыфікацыі было ўсё ж не пакаранне вінаватых, а спраўнае функцыянаванне эканамічнага, фінансавага, адміністрацыйнага ды інш. механізмаў. Гэтак, напрыклад, адзін з буйнейшых банкіраў Трэцяга рэйху Герман Абс за саўдзел у нацысцкіх злачынствах быў асуджаны на 15 гадоў, адсядзеў толькі 3 месяцы, а потым быў прызначаны дарадцам брытанскай акупацыйнай адміністрацыі па фінансавай палітыцы. У выніку гэткай дэнацыфікацыі ў многіх немцаў і за мяжой складвалася ўражанне, што нацыянал-сацыялізм быў справай аднаго фюрэра і яго найбліжэйшага атачэння, а не мільёнаў немцаў. У савецкай акупацыйнай зоне палітыка дэнацыфікацыі праводзілася, мякка кажучы, менш ліберальнымі метадамі, але больш паслядоўна. Аднак і тут улады пры неабходнасці не саромеліся прыцягваць да службы былых нацыстаў. Некаторыя нават здолелі ўпісацца ў жыццё «новай», сацыялістычнай Германіі – Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі – і заняць там адказныя дзяржаўныя і партыйныя пасады (правячую Сацыялістычную адзіную партыю Германіі простыя немцы нават сталі цішком называць «партыяй дробных нацыстаў»).

**Дэмілітарызацыя** разглядалася як шырокі комплекс захадаў: роспуск нямецкіх вайсковых фарміраванняў і дэмабілізацыя салдат і афіцэраў; ліквідацыя ўсіх вайсковых збудаванняў; дэмантаж прадпрыемстваў ваеннай прамысловасці; забарона на выраб зброі і боепрыпасаў, будаўніцтва самалётаў і ваенна-марскіх суднаў; абмежаванне вытворчасці металаў, хімікатаў, прадукцыі

машынабудавання; выкараненне мілітарысцкіх традыцый. Выкананне праграмы дэмілітарызацыі ішло не без праблем. Акупацыйныя ўлады імкнуліся дзейнічаць, найперш, у сваіх інтарэсах. Напрыклад, справядлівая савецкая крытыка на адрас заходніх саюзнікаў за вельмі павольны дэмантаж ваенных прадпрыемстваў не перашкаджала самому СССР выкарыстоўваць нямецкі ваенны патэнцыял для вытворчасці ўласнай зброі, у тым ліку атамнай. Галоўным вынікам палітыкі дэмілітарызацыі стала тое, што да моманту свайго расколу Германія стала абсалютна мірнай краінай – без войска, авіяцыі і флоту, ваеннай прамысловасці і ваенных збудаванняў.

**Дэкартэлізацыя** мела на ўвазе драбненне нямецкіх манаполій. Ёй падлягалі канцэрны з колькасцю занятых звыш 10 тыс. чалавек, а таксама буйныя банкі і прадпрыемствы, якія належалі ваенным злачынцам. Тым не менш, у заходніх зонах акты СКР па дэкартэлізацыі фактычна выкананыя не былі. Манапалістычныя аб’яднанні, распушчаныя ў першыя гады акупацыі, хутка пачалі функцыянаваць ізноў, часам нават пад старымі назвамі. Гэтак былі адноўленыя канцэрны Крупа, Манэсмана, Цісэна, працягнулі сваю дзейнасць буйнейшыя банкі, звязаныя з гітлераўскім рэжымам – «Дойчэ банк», «Камерц банк» ды інш. Рашэнні аб дэкартэлізацыі засталіся толькі на паперы. У савецкай акупацыйнай зоне палітыка дэкартэлізацыі была выкарыстаная як нагода для нацыяналізацыі прамысловасці і фінансавых устаноў.

Слабыя дэмакратычныя традыцыі, неадназначны вопыт Веймарскай рэспублікі і, асабліва, 12 гадоў нацысцкага панавання рабілі ажыццяўленне **дэмакратызацыі** Германіі надзвычай складанай задачай. Кіраўніцтва амерыканскай і брытанскай акупацыйных зон не верылі ў гатоўнасць немцаў да дэмакратычных пераўтварэнняў. Быў уведзены «палітычны каранцін»: забараняліся ўсе палітычныя партыі, распускаліся стыхійна ўзнікшыя пасля вайны антыфашысцкія камітэты. Толькі з канца 1945 г. – пачатку 1946 г. было дазволена стварэнне палітычных арганізацый – спачатку на мясцовым узроўні, а потым – толькі ў занальным маштабе. Наступным этапам дэмакратызацыі Заходняй Германіі стала правядзенне ў першай палове 1946 г. выбараў усіх узроўняў улады. Затым у другой палове 1946 г. адбылося прыняцце ландтагамі канстытуцый зямель (праўда, зацвярджаліся яны акупацыйнымі ўладамі).

Асаблівую ролю ў планах па дэмакратызацыі заходніх акупацыйных зон адыгрывалі галоўныя канфесіі Германіі – каталіцкая і пратэстанцкая. Іх актыўная дзейнасць павінна была, на думку акупацыйных улад, паспрыяць адыходу немцаў ад ідэалогіі нацызму. Не менш значнае месца адводзілася радыё, кіно і прэсе.

Гэткім чынам ужо на пачатковым этапе ажыццяўлення палітыкі «чатырох Д» намеціліся сур’ёзныя рознагалоссі паміж заходнімі акупацыйнымі дзяржавамі і СССР. Таму віною былі не столькі недасканаласць падпісаных у Патсдаме пагадненняў, колькі адрозныя мэты, якія пераследавалі былыя саюзнікі па антыгітлераўскай кааліцыі ў вырашэнні германскага пытання.

З самага пачатку заходнія акупацыйныя ўлады праводзілі палітыку жорсткага вайсковага адміністравання і дробязнай рэгламентацыі гаспадарчага жыцця. Вытворчыя магутнасці выкарыстоўваліся толькі часткова, таму ўзровень прамысловай вытворчасці ў 1945 г. склаў толькі 12 % ад узроўню 1936 г. На 30 гадоў назад аказалася адкінутая сельская гаспадарка Германіі. Нягледзячы на невялікі ўздым 1946 – 1947 гг. сітуацыя з забеспячэннем таварамі і прадуктамі харчавання заставалася крытычнай.

У заходніх акупацыйных зонах квітнеў «чорны рынак». Германія ператварылася ў грамадства прымітыўнага натуральнага абмену – галоўнай універсальнай «валютай» з'яўляліся амерыканскія цыгарэты. Сітуацыю ўскладняла аграмадная колькасць уцекачоў і эвакуіраваных ў апошнія месяцы вайны, а таксама выселенага з Польшчы, Чэхаславакіі і Венгрыі нямецкага насельніцтва. Да 1947 г. агульная колькасць вымушаных перасяленцаў складала ўжо каля 12 млн. чалавек. З-за маштабных разбурэнняў і перасяленчай хвалі вельмі востра паўстала жыллёвая праблема.

Баючыся за тое, што ва ўмовах голаду і галечы шырокія масы могуць пайсці за камуністамі, Злучаныя Штаты вырашылі аказаць краінам Еўропы, найперш Германіі, значную дапамогу. 5 чэрвеня 1947 г. быў агучаны план Маршала. Яго эфектыўнасць у значнай ступені залежала ад стану фінансавай сістэмы, але адносна даваеннага часу інфляцыя ў Германіі складала 600 %! Паўстала вострая неабходнасць у правядзенні грашовай рэформы. Яна насіла шчыра канфіскацыйны характар. 20 – 21 чэрвеня 1948 г. кожны немец у абмен на 60 старых абясцэненых рэйхсмарак атрымліваў 60 новых дойчмарак. Астатнія грошы абменьваліся з разліку 10 да 1.

Нягледзячы на захады ўлад па змякчэнні «абменнага шоку», многія немцы былі пастаўлены рэформай у вельмі цяжкія матэрыяльныя ўмовы. Тым не менш, грашовая рэформа літаральна за лічаныя дні вырашыла праблему дэфіцыту і «чорнага рынку», забяспечыла спрыяльныя ўмовы для эканамічнага адраджэння краіны. У заходнія акупацыйныя зоны пайшлі амерыканскае харчаванне, абсталяванне і сыравіна. Да 1957 г. па лініі плана Маршала ды іншых праграм амерыканская дапамога склала $1,7 млрд., а разам з матэрыяльнымі пастаўкамі – $4 – 4,5 млрд.

Працэс дэнацыфікацыі і дэмакратызацыі спалучаўся з фарміраваннем абноўленай нямецкай палітычнай эліты. У заходніх і ўсходняй акупацыйных зонах партыйнае будаўніцтва набыло значную спецыфіку. Савецкая адміністрацыя дазволіла стварэнне палітычных партый амаль адразу. У заходніх зонах пэўны час захоўваўся «палітычны каранцін». Тым не менш, некаторыя лідары даваеннай партыі каталіцкага Цэнтру цвёрда ўзялі курс на стварэнне біканфесійнай партыі, г. зн. з удзелам і каталікоў, і пратэстантаў. Гэткім чынам у 1946 г. у брытанскай зоне з'ўляецца **Хрысціянска-дэмакратычны саюз (ХДС)**

на чале з былым обер-бургамістрам Кёльну Конрадам Адэнаўэрам (1917 – 1933). Практычна адначасова ў Баварыі, якая знаходзілася пад амерыканскім кантролем, быў створаны каталіцкі (потым – міжканфесійны) **Хрысціянска-сацыяльны саюз (ХСС)**. Неўзабаве дзве ідэйна блізкія партыі – агульнагерманская ХДС і баварская ХСС – падпішуць парламенцкую унію: у перадвыбарчых кампаніях і парламенцкай дзейнасці яны будуць выступаць як блок **ХДС/ХСС**.

Некалькі пазней, у 1948 г. лібералы веймарскіх часоў заснавалі **Свабодную дэмакратычную партыю** (**СвДП**; таксама называецца «Партыяй свабодных дэмакратаў»). Лідары СвДП вызначалі яе як «антымарксісцкую, антыклерыкальную і антыаўтарытарную партыю», якая імкнецца згуртаваць буйных прадпрымальнікаў, сярэдніх і дробных буржуа, інтэлігенцыю.

Аднаўленне дзейнасці левых партый сутыкалася ў Заходняй Германіяй з пэўнымі цяжкасцямі. З аднаго боку, гэта было звязана з агульнай падазронасцю акупацыйных улад, з другога, – радыкалізмам саміх левых, асабліва камуністаў. У адрозненне ад створаных нанова прыгаданых вышэй буржуазных партый, **КПГ** і **СДПГ** аднавілі сваю дзейнасць на старой арганізацыйнай ды ідэалагічнай базе. У 1945 – 1948 гг. у заходніх акупацыйных зонах быў створаны і шэраг іншых палітычных партый, аднак даволі хутка яны сышлі з палітычнай сцэны. З восені 1945 г. пачынаецца аднаўленне прафсаюзных арганізацый. У 1949 г. значная частка з іх аб'ядналася ў Аб'яднанне нямецкіх прафсаюзаў.

Ад скасавання «палітычнага каранціну» да ўтварэння ФРГ прайшло чатыры гады. За гэты час у заходніх зонах удалося ўсталяваць плюралістычную палітычную сістэму; стварыць дэмакратычную сістэму ўладных структур ад мясцовага самакіравання да ландтагаў; праз рэферэндумы прыняць зямельныя канстытуцыі.

### Утварэнне ФРГ і ГДР. Канстытуцыя ФРГ 1949 г.

Нягледзячы на рашэнні Патсдамскай канферэнцыі, пераможныя вялікія дзяржавы антыгітлераўскай кааліцыі не збіраліся ахвяраваць сваімі інтарэсамі на карысць абстрактнай для іх ідэі германскага дзяржаўнага адзінства. Нарастанне супярэчнасцяў паміж імі, неабходнасць вырашэння складаных сацыяльна-эканамічных праблем і фактычна самастойная акупацыйная палітыка ў сваіх зонах стваралі ўсе ўмовы для новага расколу Германіі.

ЗША і Вялікабрытанія распачалі перамовы аб эканамічным зліцці сваіх акупацыйных зон. 2 снежня 1946 г. было падпісана пагадненне аб стварэнні амерыкана-брытанскай зоны – **Бізоніі**. Прыняцце дактрыны Трумэна (1947), а потым плана Маршала рабілі адасабленне Заходняй Германіі незваротным. У лютым 1948 г. да Бізоніі далучылася французская акупацыйная зона – з'явілася аб'яднаная **Трызонія**. Акрамя таго, на Лонданскай канферэнцыі па германскаму пытанню (люты – чэрвень 1948 г.)

дэлегацыі заходніх краін (СССР у Лондан запрошаны не быў) прынялі рашэнне аб стварэнні асобнай заходнегерманскай дзяржавы са сваёй канстытуцыяй, парламентам, урадам і валютай.

Пачатак сепаратнай грашовай рэформы абвастрыў адносіны паміж саюзнікамі да мяжы, за якой нават стала праглядацца магчымасць прамога ўзброенага канфлікту. Хваля абясцэненых грошай з Заходняй Германіі пагражала ўдарыць па савецкай зоне, выклікаць інфляцыю і дэзарганізацыю эканомікі. У ноч на 24 чэрвеня1948 г. савецкія войскі блакіравалі Заходні Берлін, перарваўшы чыгуначныя, водныя і аўтамабільныя шляхі, якія звязвалі яго з Заходняй Германіяй. Было спынена забеспячэнне гораду электраэнергіяй і прадуктамі харчавання. Савецкі бок адзначыў, што «тэхнічныя цяжкасці» будуць працягвацца да таго часу, пакуль заходнія саюзнікі не адмовяцца ад ідэі стварэння «трохзоннага ўраду». У савецкай зоне была ўведзена «свая» марка.

Гэтак пачаўся **Берлінскі крызіс 1948 г.** Магчымасць сілавых варыянтаў разгортвання падзей разглядалася абодвума канфліктуючымі бакамі, але заходнія дэмакратыі адказалі толькі стварэннем «паветранага моста». На працягу 318 дзён транспартнымі самалётамі ў Заходні Берлін было дастаўлена каля 1,5 млн. т. харчавання, медыкаментаў, будматэрыялаў і шмат чаго іншага. 12 траўня 1949 г. савецкая паветраная блакада была знятая, але распачатая «халодная вайна» зрабіла сваю справу. У Германіі з'явіліся дзве валюты, склаліся адрозныя цэны, знікалі нармальныя ўмовы для вольнага перасоўвання насельніцтва і тавараў, разбураліся традыцыйныя эканамічныя сувязі. Гэтую карціну дапаўнялі ўражальная адметнасць сацыяльна-эканамічных умоў і грамадска-палітычных парадкаў.

Восенню 1948 г. па патрабаванні заходніх дзяржаў з прадстаўнікоў ландтагаў была створана Парламенцкая рада, якой даручалася распрацоўка канстытуцыі або «Асноўнага закону», як для асцярожнасці, каб не трывожыць Савецкі Саюз, называлі гэты дакумент. 8 траўня 1949 г. Парламенцкая рада зацвердзіла **«Асноўны закон Федэратыўнай Рэспублікі Германіі»**, а 23 траўня 1949 г. гэты дакумент быў абвешчаны афіцыйна і набыў моц.

Ствараючы новую нямецкую дзяржаву «бацькі-заснавальнікі» ФРГ (пры падтрымцы вялікіх заходніх дзяржаў) імкнуліся не паўтарыць памылкі Веймарскай рэспублікі. У Асноўным законе быў зафіксаваны прынцып строгага падзелу заканадаўчай, выканаўчай і судовай улады. Заканадаўчая ўлада засяроджвалася ў руках двухпалатнага парламенту. Верхняя яго палата – **бундэсрат** (федэральная рада) – прызначаецца ўрадамі зямель са свайго складу, г. зн. з'яўляецца органам прадстаўніцтва зямель. Дэпутаты ніжняй палаты – **бундэстагу** (федэральнага сходу) – абіраюцца грамадзянамі на 4-гадовы тэрмін і галоўным чынам займаюцца законатворчасцю. Акрамя таго, яны абіраюць федэральнага канцлера і кантралююць дзейнасць ураду.

Галавой дзяржавы Асноўны закон абвяшчаў **федэральнага прэзідэнта** (бундэспрэзідэнт), які ў адрозненне ад прэзідэнта Веймарскай рэспублікі абіраецца спецыяльным «федэральным сходам» (складаецца з дэпутатаў бундэстагу і выбаршчыкаў ад ландтагаў) і выконвае пераважна прадстаўнічыя функцыі. Першай асобай у дзяржаве фактычна з’яўляецца кіраўнік ураду – **федэральны канцлер** (бундэсканцлер). Менавіта ён мае права вызначаць асноўныя накірункі ўнутранай і знешняй палітыкі, прызначаць і звальняць міністраў. Яго адстаўка магчымая толькі праз вынясенне бундэстагам «канструктыўнага вотуму недаверу»: адначасова ніжняя палата павінна прагаласаваць і за новага бундэсканцлера (дадзенае палажэнне Асноўнага закону мусіла забяспечыць дадатковую ўрадавую стабільнасць, якой гэтак не хапала ў Веймарскую эпоху).

Федэратыўная Рэспубліка Германія абвяшчалася дэмакратычнай і сацыяльнай федэратыўнай дзяржавай. Прынцып федэралізму рэалізоўваўся праз дэлегаванне землям шырокіх аўтаномных правоў: уласная канстытуцыя, ландтаг (зямельныя сходы) і ўрад. У кампетэнцыю зямель траплялі развіццё народнай адукацыі і культуры і, часткова, – праблемы аховы грамадзянскага парадку і навакольнага асяроддзя. Часовай сталіцай ФРГ – Берліну ў тагачасных умовах нельга было надаць гэткі статус – быў абвешчаны прырэйнскі горад Бон. Гэтак пачалася гісторыя г. зв. **«Бонскай рэспублікі»** (пасля аб’яднання Германіі ёй на змену прыйшла **«Берлінская рэспубліка»**).

Тым не менш, заходнія акупацыйныя інстытуты захоўвалі свой моцны ўплыў і пасля прыняцця Асноўнага закону ФРГ. Напачатку красавіка 1949 г. міністры замежных спраў Вялікабрытаніі, ЗША і Францыі прынялі Акупацыйны статут, які рэгуляваў узаемаадносіны дзяржаўных органаў ФРГ і акупацыйных улад. Першыя захоўвалі за сабой кантроль над знешняй палітыкай, Рурскай вобласцю і г. д. Новая германская дзяржава займала тэрыторыю ў 248,2 тыс. км$^2$, з насельніцтвам на 1950 г. у 48,7 млн. чалавек.

14 жніўня 1949 г. адбыліся першыя выбары ў бундэстаг. Яны праходзілі згодна з новай змешанай (мажарытарна-прапарцыйнай) выбарчай сістэмай, якая была заклікана адначасова забяспечваць і дастатковую шырыню палітычнага спектру партый, прадстаўленых у ніжняй палаце, і магчымасць стварэння буйных фракцый, важных для забеспячэння ўстойлівасці ўраду. Для абмежавання доступу ў парламент дробных экстрэмісцкіх партый прадугледжваўся адмысловы механізм адсеву: на прапарцыйнае прадстаўніцтва маглі разлічваць толькі тыя партыі, якія набралі 5 % і болей галасоў выбаршчыкаў альбо правялі не менш за трох дэпутатаў праз аднамандатныя выбарчыя акругі.

Перамогу атрымаў блок ХДС/ХСС, які заваяваў 139 мандатаў (31 %). Крыху меней месцаў дасталася СДПГ – 131 (29 %). Трэцяй стала СвДП – 52

мандаты (12 %). Усяго ў першы бундэстаг прабіліся 11 партый. Адначасова, з прадстаўнікоў ландтагаў быў сфарміраваны бундэсрат. У верасні 1949 г. прайшлі першыя пасяджэнні бундэстагу. Былі абраныя прэзідэнт і канцлер ФРГ. Кіраўніком ураду стаў Конрад Адэнаўэр (1949 – 1963). У кааліцыйны кабінет увайшлі прадстаўнікі ХДС/ХСС, СвДП і Нямецкай партыі.

### Эканамічнае развіццё ФРГ у 1950 – 1960 гг. Сутнасць тэорыі «сацыяльнай рыначнай гаспадаркі». Прычыны хуткага эканамічнага развіцця, ператварэнне ФРГ у магутную індустрыяльную дзяржаву. Рост эканамічнай няўстойлівасці, крызісы 1974 – 1975 і 1980 – 1982 гг. Эканамічная палітыка сацыял-ліберальнай кааліцыі і канцлера Г. Коля

Напрыканцы 1940-х гг. эканоміка Заходняй Германіі, потым ФРГ, яшчэ знаходзілася ў няпростым становішчы. Праз нейкае дзесяцігоддзе краіну было ўжо не пазнаць. ФРГ пераўтварылася і застаецца дагэтуль адной з магутнейшых эканомік свету. Якім чынам, за кошт чаго быў здзейснены гэты развіццёвы рывок?

Галоўным ідэолагам і архітэктарам германскага «эканамічнага дзіва» быў прафесар Людвіг Эрхард. Пад яго кіраўніцтвам быў распрацаваны праект грашовай рэформы 1948 г. Ва ўрадзе К. Адэнаўэра ён заняў пасаду міністра народнай гаспадаркі. На базе тэарэтычных распрацовак нямецкага эканаміста Вальтэра Ойкена, зробленых яшчэ ў 1930-х гг., Л. Эрхард распрацаваў і потым бліскуча рэалізаваў на практыцы канцэпцыю «**сацыяльнай рыначнай гаспадаркі**».

Мадэль сацыяльнай рыначнай гаспадаркі сыходзіць з патрабавання, што ні дзяржава, ні прыватны бізнес не ўправе мець поўны кантроль над эканомікай, а павінны служыць людзям. Як і ў рыначнай, у сацыяльнай рыначнай эканоміцы толькі рашэнні саміх спажыўцоў, пастаўшчыкоў рэсурсаў і прыватных фірм вызначаюць структуру размеркавання рэсурсаў. Пры гэтым эканамічна больш моцныя павінны падтрымліваць больш слабых. Роля дзяржавы заключаецца ў развіцці пачуцця ўзаемнай адказнасці ўсіх удзельнікаў рынку і мінімізацыі несправядлівых тэндэнцый у канкурэнцыі, гандлі і размеркаванні даходаў. Гэтая разнавіднасць змешанай эканомікі разглядалася як альтэрнатыва і ліберальна-рыначнаму капіталізму, і сацыялізму.

Дзяржава, што бярэ на ўзбраенне гэтую мадэль імкнецца да забеспячэння поўнай занятасці насельніцтва, сацыяльнай бяспекі, сацыяльнай справядлівасці і сацыяльнага прагрэсу. Сацыяльная рыначная гаспадарка прадугледжвае прыватную ўласнасць на сродкі вытворчасці і свабоднае цэнаўтварэнне, стварае ўмовы для канкурэнцыі і г. д.

Менавіта ў гэтым духу была вытрыманая грашовая рэформа 1948 г., заканадаўчыя акты аб крэдытнай і падатковай палітыцы, аб захадах супраць адвольнага завышэння цэн, антыманапольныя і антыкартэльныя ўказы 1948 – 1949 гг. Ужо напрыканцы 1949 г. валавы аб'ём прамысловай вытворчасці наблізіўся да ўзроўню 1936 г. (98,4 %), а да канца 1950 г. нашмат перавысіў яго (114,4 %). Адбывалася паскоранае развіццё машына- і прыборабудавання, оптыкі, вытворчасці электраэнергіі.

На працягу 1950-х гг. эканоміка ФРГ развівалася хуткімі тэмпамі. У сярэднім прамысловая вытворчасць ў гэты перыяд штогод прырастала на 9 % (у 1953 – 1956 гг. нават часам даходзіла да 15 %). На 1956 г. узровень 1936 г. быў ужо перавышаны больш чым удвая, а ў некаторых галінах – нават больш за тое (аўтамабілебудаванне – у 4,5 разы!). У сярэдзіне 1950-х гг. па аб'ёму прамысловай вытворчасці ФРГ выйшла на 3-е месца ў свеце. Стабільна ўзрастаў экспарт, і з 1952 г. ён ужо перавышаў імпарт.

У падмурку «эканамічнага дзіва» ляжалі рэальныя аб'ектыўныя прычыны. Удзел у рэалізацыі «плана Маршала», а потым актыўнае ўнутранае інвесціраванне (гэтаму спрыяла прадуманая палітыка дзяржавы) стваралі трывалую фінансавую базу пад значнае абнаўленне асноўнага капіталу. Вялікую ролю адыгрываў адкладзены попыт. Доўгія гады рацыянаванага размеркавання ў Нацысцкай Германіі (да гэтага яшчэ магутнейшы эканамічны крызіс!), нястача першых пасляваенных гадоў, страты маёмасці падчас вайны абумовілі неабходнасць значных аб'ёмаў прадуктаў харчавання, абутку, адзення, тавараў працяглага карыстання. Спажыванне тавараў павялічвалася яшчэ хутчэй у выніку падвышэння заробкаў. Высокі попыт, у сваю чаргу, стымуляваў рост вытворчасці. Вялікае значэнне адыграла наяўнасць кваліфікаванай рабочай сілы, гатовай працаваць за малыя заробкі (асабліва з ліку вымушаных перасяленцаў). Карэйская вайна і гонка ўзбраенняў выклікалі рост попыту на машыны і абсталяванне на сусветным рынку. ФРГ гэтай сітуацыяй выдатна скарысталася. Немалаважным фактарам эканамічнага поспеху стаў мінімальны ўзровень вайсковых выдаткаў. Важную ролю адыграў удзел ФРГ у заходнееўрапейскай інтэграцыі.

Тым не менш, напачатку 1960-х гг. асноўныя крыніцы эканамічнага росту ФРГ былі вычарпаныя. У першай палове 1960-х гг. заходнегерманскі неалібералізм стаў сутыкацца з першымі сур'ёзнымі праблемамі. Пра гэта сведчылі частковыя крызісы 1958 і 1963 гг. Расла дарагоўля, больш частымі станавіліся працоўныя канфлікты. У 1966 – 1967 гг. здарыўся першы цыклічны крызіс перавытворчасці ў гісторыі ФРГ. Ён закрануў амаль усе галіны. Прамысловая вытворчасць скарацілася на 3 %, а ў некаторых галінах спад даходзіў нават да 10 – 20 %. Небывалых памераў (да 300 тыс.) дасягнула беспрацоўе. Эканамічныя цяжкасці запатрабавалі ад ураду правядзення спецыяльных антыкрызісных захадаў.

Прыход да ўлады сацыял-ліберальнай кааліцыі на чале з СДПГ (1969) азначаў узмацненне дзяржаўнага рэгулявання на макраэканамічным узроўні. Сацыял-дэмакраты сталі распрацоўваць доўгатэрміновыя мэты і арыенціры эканамічнага развіцця на дзесяцігоддзе. Неаліберальная палітыка саступіла месца неакейнсіянству. Новая мадэль рыначнай гаспадаркі захоўвала недатыкальнасць прыватнай уласнасці, эканамічную самастойнасць прадпрымальнікаў, сацыяльную абароненасць насельніцтва, мадэрнізавала канкурэнцыю і цэнаўтварэнне. Стала праводзіцца палітыка свядомага фарсіравання пастаяннага эканамічнага росту.

Праблемы і цяжкасці заходнегерманскай эканомікі 1960-х гг. аказаліся толькі прэлюдыяй. Сапраўдны ўдар яна атрымала ў сярэдзіне 1970-х гг., калі сышліся ў часе структурны, валютна-фінансавы крызіс і цыклічны спад. Які паўсюль у заходніх эканоміках, спад вытворчасці (у прамысловасці – 7,5 %, а па некаторых галінах – нават 15 – 20 %) суправаджаўся інфляцыяй (7 %). Беспрацоўе перавысіла 1 млн. чалавек. У цэлым ФРГ пацярпела ў гады крызісу значна менш, чым астатнія вядучыя капіталістычныя дзяржавы. Прычынамі таму сталі і агульная эфектыўнасць заходнегерманскай эканомікі, і ўдалыя антыкрызісныя мерапрыемствы ўраду.

З 1976 г. ФРГ пачала выходзіць з крызісу, аднак стагфляцыя – спалучэнне застою ці хранічна нізкіх тэмпаў эканамічнага росту з інфляцыяй і беспрацоўем – заставаліся характэрнай рысай эканамічнай сітуацыі ў краіне і ў другой палове 1970-х, і напачатку 1980-х гг. Калі на пачатковай стадыі НТР з'яўленне прынцыпова новых тэхналогій запатрабавала новыя працоўныя месцы, то ў 1970-я гг. пачалося структурнае скарачэнне занятасці – сталі знікаць цэлыя прафесіі. Напрыклад, у паліграфічнай прамысловасці пераход на фотадрук зрабіў непатрэбнай працу наборшчыкаў. Дэфіцыт працоўных месцаў дазваляў прадпрымальнікам у гэты час падтрымліваць жорсткі рытм і рэжым працы, не павышаць заробкі. У выніку ў другой палове 1970-х – пачатку 1980-х гг. колькасць забастовак у параўнанні з 1960-мі гг. павялічылася амаль удвая.

Восенню 1980 г. пачаўся новы эканамічны крызіс. У ФРГ яго маштабы аказаліся нават большымі, чым у 1974 – 1975 гг. Ізноў скарацілася вытворчасць. Колькасць беспрацоўных да 1983 г. ўжо перавысіла 2 млн. чалавек, што складала звыш 9 % усіх асоб наёмнай працы. Крызіс суправаджаўся мноствам банкруцтваў. Звычайныя прылады дзяржаўнага рэгулявання згубілі эфектыўнасць.

Пераадоленне структурнага крызісу 1970-х – пачатку 1980-х гг. было звязана з рэалізацыяй неакансерватыўнай эканамічнай праграмы ХДС, якая на чале кааліцыі ХДС/ХСС-СвДП вярнулася да ўлады ў 1982 г. Партыя і яе лідар, Гельмут Коль, па-ранейшаму дэкларавалі адданасць сацыяльнай рыначнай гаспадарцы. Але калі раней увага акцэнтавалася на сацыяльных аспектах рыначнай эканомікі, то цяпер – «на забеспячэнні свабоды» і абме-

жаванні сацыяльных функцый дзяржавы. Тым не менш, нават падкрэсліваючы прыярытэтнасць прыватнай ініцыятывы і свабоднай канкурэнцыі, хрысціянскія дэмакраты прызнавалі неабходнасць карэкціроўкі і дапаўнення рынку актыўнасцю дзяржавы.

Эканамічная сітуацыя стала хутка мяняцца да лепшага. У сярэдзіне 1980-х гг. эканоміка ФРГ уступіла ў фазу ўздыму, які з 1988 г. нават перарос у гаспадарчы бум. Важнымі фактарамі значнага паляпшэння эканамічнай сітуацыі сталі падвышэнне прадукцыйнасці працы, рост карпаратыўных прыбыткаў, узрастанне спажывецкага попыту, адноснае зніжэнне коштаў на энерганосьбіты, актывізацыя знешняга гандлю, у тым ліку з усходнееўрапейскімі краінамі.

Тым не менш, галоўнай крыніцай эканамічных поспехаў ФРГ стала яе ўдалае прыстасаванне да ўмоў, што склаліся на новай фазе навукова-тэхнічнага прагрэсу. Былі перагледжаны прыярытэты дзяржаўнай навукова-тэхнічнай палітыкі. Даследаванні ў галіне электронікі сталі больш канцэнтравацца на распрацоўцы мікрапрацэсарнай тэхнікі. Асаблівая ўвага надавалася стварэнню сучасных сістэм сувязі ды інфармацыі. Прыярытэтнае значэнне набываюць энергазберагальныя тэхналогіі. У выніку ФРГ здолела выйсці на навукова-тэхнічны ўзровень ЗША у гэткіх галінах, як металургія, станка- і машынабудаванне, хімія, атамная энергетыка. Напрыканцы 1980-х гг. разам з Японіяй краіна дасягнула вялікіх поспехаў у стварэнні навукаёмістых галін вытворчасці і замацавалася на вядучых пазіцыях ў свеце па затратах на НДВКР.

Стабільна развівалася і сельская гаспадарка. Пастаянна расла вытворчасць сельскагаспадарчай прадукцыі (напрыклад, вытворчасць мяса за 1970 – 1980-я гг. узрасла на 20 %). Працягвалася скарачэнне занятых у сельскай гаспадарцы. Напрыканцы 1980-х гг. у гэтай галіне працавала толькі 4,5 % эканамічна актыўнага насельніцтва.

Вельмі высокага ўзроўню дасягнуў дабрабыт сярэднестатыстычнага заходняга немца. Краіна па асноўных паказчыках матэрыяльнага дастатку насельніцтва стабільна знаходзілася ў ліку сусветных лідараў.

### Палітычнае развіццё ФРГ у 1950 – 1960-я гг. Панаванне ХДС/ХСС. «Вялікая кааліцыя» і яе распад

Відавочныя поспехі ў справе аднаўлення эканомікі краіны і адраджэння дэмакратычнай Германіі дазволілі ХДС перамагчы на другіх парламенцкіх выбарах 1953 г. Партыя набрала 36,4 % галасоў выбаршчыкаў (на 11,2 % болей, чым у 1949 г.) і ўзначаліла новую шырокую кааліцыю.

Пацярпеўшы няўдачу на выбарах 1949 г. і саступіўшы ўладу канкурэнтам, СДПГ абрала курс на «непрымірымую апазіцыю» кабінету К. Адэнаўэра. Па ўсіх важных пытаннях, што абмяркоўваліся ў бундэстагу, са-

цыял-дэмакратычная фракцыя выступала з уласнай, адрознай ад урадавай, канцэпцыяй. Гэтая тактыка не прынесла поспеху. Падтрымка СДПГ засталася высокай (28,8 %), але сацыял-дэмакратычная фракцыя ўпершыню з выбараў 1907 г. (выключэнне – выбары 1932 – 1933 гг.) перастала з'яўляцца буйнейшай.

Вынікі другіх парламенцкіх выбараў сведчылі аб поспеху працэсу дэмакратызацыі ў ФРГ. Тым не менш, пераадоленне нацысцкай спадчыны было далёкае ад заканчэння. Пра гэта казалі не толькі сацыялагічныя апытанні – да сярэдзіны 1950-х гг. большасць заходніх немцаў лічыла, што, калі б не авантурыстычная знешняя палітыка нацыстаў, іх дзейнасць можна было ацаніць у цэлым станоўча. Была ўтворана і спрабавала разгарнуць актыўную палітычную дзейнасць неанацыская **Сацыялістычная імперская партыя**. У 1952 г. згодна з Артыкулам 21 Асноўнага закона, які абвяшчаў неканстытуцыйнымі палітычныя партыі, што выступаюць супраць свабоднага дэмакратычнага ладу і яго прынцыпаў, Федэральны канстытуцыйны суд вынес рашэнне аб яе забароне.

Падобны лёс у 1956 г. напаткаў і КПГ. Яе «Праграма нацыянальнага ўз'яднання», прынятая ў 1952 г., высоўвала авантурыстычны лозунг гвалтоўнага скідання ўраду К. Адэнаўэра як ураду «нацыянальнай здрады». У духу горшых часоў СДПГ і прафсаюзы адназначна трактаваліся гэтым дакументам як памагатыя ваенных планаў ХДС/ХСС і акупацыйных дзяржаў. Партыя незваротна маргіналізавалася (на парламенцкіх выбарах 1953 г. у бундэстаг не здолеў прабіцца ніводны камуніст) і пасля чатырохгадовага судовага разгляду была забароненая ў 1956 г.

Чарговыя парламенцкія выбары, якія адбыліся ў верасні 1957 г., ізноў прынеслі поспех ХДС/ХСС. Саюзнікі набралі адпаведна 43 % і 11 %. Разам са свабоднымі дэмакратамі (8,2 %) яны сфарміравалі новы кааліцыйны ўрад на чале з незаменным К. Адэнаўэрам.

Здолелі пашырыць сваю падтрымку сацыял-дэмакраты (у тым ліку за кошт былога электарату камуністаў) – 34 %, але іх шанцы на вяртанне да ўлады як і раней выглядалі вельмі цьмянымі. Выбары ўвогуле засведчылі далейшае ўзмацненне вядучых партый. Калі па выніках выбараў 1949 г. у бундэстаг прабіліся 11 партый (або 10, калі лічыць ХДС/ХСС за адну), а па выніках выбараў 1953 г. – 6, то зараз толькі 5.

Чарговая выбарчая няўдача СДПГ паставіла перад партыйным кіраўніцтвам задачу прынцыповага абнаўлення. Сацыял-дэмакраты адмовіліся ад сляпой «непрымірымасці» і перайшлі да тактыкі «умоўнай апазіцыі». А ў 1959 г. на чарговым з'ездзе партыі была прынятая Бад-Гадэсбергская праграма. СДРГ абвяшчала сябе партыяй «дэмакратычнага сацыялізму», падкрэслівала сваю павагу да права ўласнасці і заяўляла, што перадача прыватных прадпрыемстваў у дзяржаўную і грамадскую ўласнасць дапушчальная толькі у выключных вы-

падках. Крыніцамі свайго светапогляду партыя абвяшчала хрысціянскую этыку, гуманізм і класічную філасофію, што азначала прынцыповую адмову ад «марксісцкіх догмаў».

Па меры затухання «эканамічнага дзіва» кансерватызм і аўтарытарны стыль К. Адэнаўэра сталі выклікаць узрастальную крытыку. На фоне абнаўленчых працэсаў у СДПГ гэта пагражала правячай кааліцыі стратай улады. Новыя палітычныя павевы праявілі сябе ўжо на наступных парламенцкіх выбарах 1961 г.

СДПГ адступіла ад сваёй звычайнай практыкі і назвала кандыдатам на пасаду канцлера не кіраўніка партыі, а дзеючага мэра Заходняга Берліна – папулярнага і дынамічнага Вілі Бранта. Гэты тактычны ход несумненна паспрыяў выдатнаму выступленню сацыял-дэмакратаў, якія набралі адносную большасць галасоў выбаршчыкаў – 36,2 % супраць 35,8 % у ХДС – і правялі ў бундэстаг толькі на 2 дэпутаты меней за партыю сваіх галоўных канкурэнтаў.

Правячая кааліцыя ўсё ж захавала ўладу, але гэтым разам блок ХДС/ХСС ужо не валодаў абсалютнай парламенцкай большасцю, а значыць не мог абысціся без саюзу з СвДП. Акрамя таго, прымаючы да ўвагі ўзрост і падзенне папулярнасці нязменнага заходнегерманскага канцлера, выклікалі ўзрастальныя пытанні лідарскія перспектывы К. Адэнаўэра ва ўрадзе. У 1963 г. 87-гадовы (!) палітык саступіў канцлерскую пасаду малодшаму калегу па партыі – Людвігу Эрхарду (1963 – 1966).

Правячыя колы і заходнегерманскае грамадства звязвалі з Л. Эрхардам вялікія спадзяванні. Меркавалася, што бацька германскага «эканамічнага дзіва» здолее павысіць аўтарытэт ХДС/ХСС і ўмацаваць эканоміку краіны. Канцлер высунуў праграму **«сфарміраванага грамадства»** – свабоднага, адкрытага, дынамічнага і дэмакратычнага грамадства, якое будавалася б на базе сацыяльнай рыначнай гаспадаркі і свядомага творчага супрацоўніцтва яго грамадзян на карысць усяго грамадства. Тым не менш, запавольванне тэмпаў эканамічнага росту стварала значныя праблемы для яе паспяховай рэалізацыі. Ні новага сацыяльна-эканамічнага прарыву, ні ўмацавання палітычных пазіцый правячай кааліцыі, ні абнаўлення знешнепалітычнага курсу Л. Эрхард забяспечыць не здолеў.

Гэта і прадэманстравалі вынікі парламенцкіх выбараў 1966 г. ХДС/ХСС не здолела здабыць абсалютную большасць дэпутацкіх мандатаў (не хапіла толькі 4). Кааліцыя ХДС/ХСС і СвДП была захаваная. Аднак узрастальна папулярную СДПГ, якая ўжо кантралявала 40,7 % парламенцкіх крэслаў, ігнараваць было ўсё цяжэй і цяжэй.

Спрэчкі вакол бюджэту абумовілі разрыў СвДП са сваімі традыцыйнымі партнёрамі і распад правячай кааліцыі. Ва ўмовах першага пасляваеннага эканамічнага крызісу (1966 – 1967 гг.) адзінай магчымасцю захаваць дзея-

здольнасць ураду было ўтварэнне г. зв. **«вялікай кааліцыі»** з удзелам двух вядучых палітычных сіл ФРГ – ХДС/ХСС і СДПГ. Новым канцлерам краіны стаў Курт Кізінгер (1966 – 1969), лідар сацыял-дэмакратаў В. Брант заняў пасады віцэ-канцлера і міністра замежных спраў, а яго паплечнік па партыі Карл Шылер узначаліў яшчэ адно ключавое міністэрства – эканомікі.

Прабуксоўка заходнегерманскай мадэлі і нарастанне сацыяльна-эканамічных праблем адкрывалі для СДПГ, поўнай рашучасці ўзяцца за аздараўленне эканомікі на базе актыўнага дзяржаўнага ўмяшання, выдатныя перспектывы ў далейшай палітычнай барацьбе. Выспяваў сацыял-ліберальны блок. Ужо на выбарах федэральнага прэзідэнта ў сакавіку 1969 г., дзякуючы галасам большасці фракцыі свабодных дэмакратаў, галавой ФРГ быў абраны сацыял-дэмакрат Г. Хайнэман. На парламенцкіх выбарах 1969 г. блок ХДС/ХСС фармальна захаваў лідарства – 46,7 % галасоў выбаршчыкаў. Але СДПГ і СвДП, якія набралі адпаведна 42,7 % з 5,8 % і супольна здабылі нязначную – толькі ў 6 дэпутацкіх мандатаў – большасць, атрымалі магчымасць утварыць сацыял-ліберальную кааліцыю і скарысталіся ёю. Упершыню з 1949 г. ХДС/ХСС выпусціў са сваіх рук уладу. Новым федэральным канцлерам стаў лідар сацыял-дэмакратаў В. Брант (падпольны псеўданім часоў барацьбы з нацызмам; сапраўднае імя – Герберт Фрам).

Гэтыя выбары яшчэ раз прадэманстравалі, што аніводная з дзвюх вядучых палітычных сіл краіны – ні ХДС/ХСС, ні СДПГ – не маюць дастатковых рэсурсаў для таго, каб усур'ёз прэтэндаваць на аднаасобнае панаванне. «Вялікая кааліцыя», безумоўна, стала важнай старонкай у гісторыі ФРГ, але хутчэй выключэннем з нармальнай логікі палітычнай барацьбы. Разлічваць на рэгулярнасць падобнай практыкі не выпадала. Для стварэння ўстойлівага і дзеяздольнага федэральнага ўраду партыям-лідарам патрабаваўся дробны саюзнік. Яго ролю на працягу некалькіх дзесяцігоддзяў будзе выконваць СвДП. Гэткім чынам у ФРГ склалася вельмі спецыфічная **«двухспалавінная» партыйная сістэма**.

### Знешняя палітыка ў 1950 – 1960-я гг. Падпісанне Агульнага дагавору 1952 г. Уступленне ў НАТО. Нармалізацыя адносін з СССР. Дактрына Хальштэйна. Збліжэнне з Францыяй, франка-германскі дагавор 1963 г. Карэкціроўка «ўсходняй палітыкі» ФРГ

У 1945 г. Германія фактычна страціла сваю палітычную незалежнасць. Будучае краіны вызначалася вялікімі дзяржавамі пераможнай антыгітлераўскай кааліцыі. Праблемы і супярэчнасці паміж СССР, з аднаго боку, і яго заходнімі саюзнікамі, з другога, прывялі да падзелу адзінай германскай дзяржавы і ўзнікнення г. зв. «германскага пытання» пасляваеннай сусветнай палітыкі.

У перыяд праўлення К. Адэнаўэра (1949 – 1963) прыярытэтным накірункам знешняй палітыкі краіны з'яўлялася інтэграцыя ФРГ у заходнееўрапей-

скую сістэму, а таксама атлантычнае супрацоўніцтва. Прычым да сярэдзіны 1950-х гг. знешняя палітыка праводзілася дзеля ўнутранай: дзеля таго, каб забяспечыць аднаўленне заходнегерманскай эканомікі, стварэнне ўласных узброеных сіл і атрыманне міжнароднага прызнання. З сярэдзіны 1950-х гг. ужо ўнутраная палітыка служыла базай для знешняй. ФРГ імкнулася стаць не проста незалежнай, а моцнай дзяржавай.

Ужо ў лістападзе 1949 г. Вялікабрытанія, Злучаныя Штаты, Францыя і ФРГ падпісалі Петэрсбергскае пагадненне, якое дазваляла заходнегерманскай дзяржаве самастойна весці знешнія стасункі, у тым ліку перамовы аб далучэнні да міжнародных арганізацый. У 1950 г. ФРГ стала членам Рады Еўропы і распачала актыўны ўдзел у абмеркаванні праектаў еўрапейскай інтэграцыі. Пасля падпісання Парыжскага (1951) і Рымскіх пагадненняў (1957) ФРГ становіцца адным з важнейшых удзельнікаў еўрапейскіх супольнасцяў.

Далейшае паглыбленне «халоднай вайны» патрабавала ад улад ФРГ пошуку надзейных гарантый нацыянальнай бяспекі. Пад лозунгамі сумеснай абароны краін Захаду супраць «агрэсіі сусветнага камунізму» К. Адэнаўэр дамагаўся стварэння еўрапейскай арміі і ўключэння ў яе склад заходнегерманскага кантынгенту. У 1952 г. разам з Францыяй, Італіяй і краінамі Бенілюксу ФРГ падпісала дагавор аб стварэнні Еўрапейскай абарончай супольнасці (ЕАС).

Яшчэ большае значэнне для ФРГ мела падпісанне з Вялікабрытаніяй, ЗША і Францыяй **«Агульнага дагавору»** (Бонскага дагавору). 26 траўня 1952 г. бакі дамовіліся пра скасаванне «Акупацыйнага статуту», перадачу бонскаму ўраду «паўнаты ўлады» ва ўнутранай і знешняй палітыцы, ліквідацыю многіх абмежаванняў у развіцці ваеннай прамысловасці, легалізацыю заходнегерманскай масавай арміі і магчымасць удзелу краіны ў ЕАС. Тым не менш, суверэнітэт ФРГ нельга было назваць паўнавартасным: на яе тэрыторыі заставаліся замежныя войскі, краіна пазбаўлялася права валодаць многімі відамі стратэгічнай зброі (заходнія дзяржавы захоўвалі таксама некаторыя іншыя рычагі ўплыву, у тым ліку фінансавыя, на сітуацыю ў ФРГ). Пасля таго, як у 1955 г. гэты дагавор быў ратыфікаваны і набыў моц, ФРГ стала членам НАТО. З 1956 г. пачалося стварэнне рэгулярных узброеных сіл ФРГ – бундэсверу.

Нягледзячы на планы рэмілітарызацыі ФРГ адносіны з Савецкім Саюзам у паслясталінскую эпоху палепшыліся. У 1955 г. адбыліся дыпламатычнае прызнанне заходнегерманскай дзяржаўнасці з боку СССР і нават афіцыйны візіт К. Адэнаўэра ў Маскву. Тым не менш, палітыка Бону адносна усходнееўрапейскіх дзяржаў стала яшчэ больш жорсткай. У снежні 1955 г. на нарадзе паслоў ФРГ міністр замежных спраў Вальтэр Хальштэйн агучыў новую знешнепалітычную дактрыну. Згодна з **«дактрынай Хальштэйна»** ФРГ пад-

трымлівала і ўсталёўвала дыпламатычныя адносіны толькі з тымі краінамі, якія не мелі дыпламатычных адносін з Германскай Дэмакратычнай Рэспублікай. Усталяванне падобных стасункаў з Усходняй Германіяй разглядалася Бонам як недружалюбны крок і вяло да разрыву адносін з гэтай краінай. Адзіным выключэннем, якое дапускалася дадзенай дактрынай, быў Савецкі Саюз. Канфрантацыя з вялікай дзяржавай была ФРГ абсалютна непатрэбнай. У 1959 г. Жэнеўская канферэнцыя чатырох дзяржаў (Вялікабрытанія, Злучаныя Штаты, СССР, Францыя) скончылася фактычным прызнаннем існавання дзвюх нямецкіх дзяржаў: ФРГ і ГДР.

Нязменна дэманструючы адданасць прынцыпу атлантычнай салідарнасці і лаяльнасць да заакіянскай супердзяржавы, К. Адэнаўэр імкнуўся да таго, каб пазбегнуць ролі сатэліту Вашынгтону. Гэтая пазіцыя, безумоўна, паспрыяла далейшаму германа-французскаму збліжэнню пасля вяртання да ўлады Ш. дэ Голя. Абмен візітамі нацыянальных лідараў дзвюх дзяржаў стварыў магчымасць для афармлення стратэгічнага саюзу. У студзені 1963 г. быў падпісаны дагавор аб супрацоўніцтве ФРГ і Францыі ў розных сферах, каардынацыі знешнепалітычнага курсу, рэгулярных кансультацыях на ўзроўні кіраўнікоў дзяржаў (не радзей двух разоў на год) і міністраў замежных спраў (раз у тры месяцы) і г. д.

Гэткім чынам, важнымі вынікамі знешняй палітыкі ФРГ у 1949 – 1963 гг. сталі: прызнанне заходнегерманскага суверэнітэту і яе статусу важнага еўрапартнёра, пачатак фарміравання базы эканамічнай магутнасці краіны.

Знешнепалітычны курс паслядоўнікаў К. Адэнаўэра вызначаўся значнай пераемнасцю. Найбольш прынцыповыя змены датычыліся «усходняй палітыкі». Падчас прэм’ерства Л. Эрхарда былі зроблены пэўныя крокі ў напрамку збліжэння з усходнімі суседзямі. Нават не ўсталёўваючы дыпламатычныя адносіны з краінамі сацыялістычнага блоку, ФРГ падпісала з некалькімі з іх гандлёва-эканамічныя пагадненні (Румынія, Венгрыя, Балгарыя). Гэткім чынам, на змену «дыпламатыі з пазіцыі сілы» К. Адэнаўэра у адносінах з Усходам прыйшла «эканамічная дыпламатыя».

Пасля прыходу да ўлады «Вялікай кааліцыі» знешняя палітыка была скарэкціравана канцэпцыяй В. Бранта – віцэ-канцлера і міністра замежных спраў новага кабінету. Дыпламатычнае прызнанне Румыніі ў 1967 г. азначала фактычнае адмаўленне ФРГ ад строгага пільнавання «дактрыны Хальштэйна». Упершыню быў усталяваны прамы дыялог паміж Бонам і сацыялістычным Берлінам, у выніку якога ў 1968 г. дзве нямецкія дзяржавы падпісалі гандлёвае пагадненне. Пра ўсталяванне нармальных міжгерманскіх адносін гаворка пакуль што не ішла, але напрыканцы 1960-х гг. непазбежнасць перагляду «усходняй палітыкі» ФРГ стала відавочным фактам.

## Палітычнае жыццё ФРГ у час праўлення сацыял-ліберальнай кааліцыі (1969 – 1982). Новыя сацыяльныя рухі і ўтварэнне Партыі «зялёных». Пагроза тэрарызму. Унутраная палітыка кансерватыўна-ліберальнага ўраду Г. Коля ў 1982 – 1989 гг.

Абранне на канцлерскую пасаду Вілі Бранта (1969 – 1974) распачало новы этап рэформ у ФРГ. Сацыяльнае паходжанне і вопыт лідара сацыял-дэмакратаў моцна адрознівалі яго ад папярэдніх заходнегерманскіх кіраўнікоў, асабліва апошняга – антыфашыст замяніў на пасадзе канцлера былога члена НСДАП і супрацоўніка аддзела радыёпрапаганды імперскага міністэрства замежных спраў К. Кізінгера. Шчырасць у камунікацыі і адкрытасць да ўсяго новага спарадзілі ў многіх немцаў надзеі на абнаўленне. Гэтыя надзеі збольшага спраўдзіліся.

Дэвізам праграмы кааліцыі СДПГ-СвДП сталі «Пераемнасць і абнаўленне». Сацыял-ліберальны ўрад меў намер не адмаўляючыся ад дасягнутага папярэднікамі ажыццявіць глыбокія рэформы. Правячая кааліцыя разлічвала з іх дапамогай змякчыць супярэчнасці ў грамадстве і вырашыць узнікшыя ў 1960-х гг. праблемы, найперш у сферы адукацыі, рынку працы, у сістэме сацыяльнай абароны. Былі падвышаныя пенсіі, а пенсійны ўзрост – наадварот зніжаны да 63 гадоў. Былі прынятыя законы, што павялічвалі дапамогі на дзяцей, датацыі для малазабяспечаных груп насельніцтва, для набыцця жылля. Асаблівая ўвага надавалася вырашэнню праблем моладзі. Напрыклад, у 1971 г. было прынята федэральнае заканадаўства аб стыпендыяльным забеспячэнні і бясплатным навучанні (у выніку за наступныя некалькі гадоў колькасць студэнтаў павялічылася ўдвая), аб спрыянні абароне акадэмічных ступеняў. Выбарчая рэформа апусціла ўзроставы цэнз з 21 да 18 гадоў, далучаючы тым самым маладых заходніх немцаў да ўдзелу ў актыўным палітычным жыцці краіны. Справе далейшай дэмакратызацыі грамадства і дзяржавы павінна было служыць «Палажэнне аб адносінах да антыканстытуцыйных сіл на дзяржаўнай службе». Дакумент забараняў асобам з экстрэмісцкімі – няважна, левымі ці правымі – перакананнямі працаваць у навучальных установах, займаць іншыя грамадскія пасады.

Дарагія сацыяльныя пераўтварэнні моцным падатковым цяжарам клаліся на прадпрымальнікаў і вялі да ўтварэння ўстойлівага бюджэтнага дэфіцыту. Вострую крытыку з боку апазіцыі выклікáла і «новая ўсходняя палітыка» ураду В. Бранта, нацэленая на нармалізацыю адносін ФРГ з ГДР ды іншымі краінамі сацыялістычнага блоку (гл. далей). У красавіку 1972 г. апазіцыя нават паспрабавала праз вотум канструктыўнага недаверу пазбавіць яго канцлерскага крэсла. Новаму лідару ХДС Райнэру Барцэлю для абрання кіраўніком кабінету міністраў не хапіла толькі двух галасоў. Падчас галасавання бюджэту 1973 г. супраць канцлера выступіла нават частка яго паплечнікаў, таму ўрадавая кааліцыя фактычна страціла парламенцкую большасць. Канцлер скары-

стаўся сваім канстытуцыйным правам ды ініцыяваў роспуск бундэстагу і правядзенне датэрміновых парламенцкіх выбараў.

У выніку лістападаўскіх выбараў 1972 г. сацыял-ліберальнай кааліцыі ўдалося захаваць уладу. Сацыял-дэмакраты набралі амаль 46 % галасоў выбаршчыкаў і заваявалі 230 дэпутацкіх мандатаў. Свабодныя дэмакраты таксама прыкметна палепшылі свае вынікі адносна выбараў 1969 г. Гэткім чынам, сацыял-ліберальная кааліцыя павялічыла большасць да 23 мандатаў, а В. Брант захаваў пасаду бундэсканцлера.

Праграма другога кабінету В. Бранта была больш сціплай, чым у 1969 г. Па-першае, амбіцыйная знешнепалітычная праграма была ўжо збольшага выканана. Па-другое, фінансава-эканамічныя рэаліі не дазвалялі замахвацца на правядзенне маштабных і дарагіх рэформ. Пасля «нафтавага шоку» восені 1973 г. прыйшлося прыняць закон аб эканоміі энергіі, які прадугледжваў абмежаванні яе выкарыстання. Была прынятая праграма будаўніцтва каля 100 атамных рэактараў.

Не здолеўшы адужаць В. Бранта на электаральным полі, апазіцыя ў 1974 г. удала выкарыстала скандальныя выкрыцці, што кідалі цень на яго рэпутацыю. Спачатку ў цэнтры шпіёнскага скандалу апынуўся рэферэнт канцлера, а потым, ужо ў ходзе следства, высветліліся пікантныя моманты баўлення ім свайго вольнага часу падчас афіцыйнага візіту ў Нарвегію. 5 траўня 1974 г. В. Брант сышоў у адстаўку.

Новым канцлерам ФРГ і старшынёй СДПГ стаў Гельмут Шміт (1974 – 1982). Палітычны курс сацыял-ліберальнага ўраду набывае больш памяркоўны, прагматычны характар. Сапраўды, дзейнічаць прыходзілася ў надзвычай цяжкай эканамічнай сітуацыі – наступіў эканамічны крызіс 1974 – 1975 гг. Аснову ўнутрыпалітычнага курсу склалі антыкрызісныя мерапрыемствы – першая антыкрызісная праграма была прынятая ўжо ў снежні 1974 г. Пэўны час палітыка «глабальнага рэгулявання» эканомікі прыносіла карысць. Актыўная палітыка сацыял-ліберальнага ўраду і адносная мяккасць крызісу ў краіне дазволілі правячай кааліцыі атрымаць чарговую перамогу на парламенцкіх выбарах 1976 г.

Ужо вынікі выбараў 1976 г., калі Г. Шміт здолеў пераабрацца на пасаду канцлера большасцю толькі ў адзін голас, сведчылі пра пэўнае расчараванне грамадства палітыкай СДПГ. Па меры далейшага скарачэння фінансавых рэсурсаў, нарасталі рознагалоссі паміж сацыял-дэмакратамі і свабоднымі дэмакратамі (на думку апошніх, большую карысць справе аздараўлення эканомікі магло б прынесці самарэгуляванне рыначнага механізму). Захоўваючы партнёрства з СДПГ у бундэстагу, СвДП стала выступаць на выбарах у ландтагі некаторых зямель у кааліцыі з ХДС (т. зв. палітыка «размякчэння партыйных франтоў»).

Адным з важнейшых дасягненняў канцлерства Г. Шміта стала мадэрнізацыя сямейнага права. Былі прынятыя ліберальныя папраўкі адносна прычынаў для разрыву шлюбу. Быў скасаваны артыкул, які абавязваў жанчыну займацца хатняй гаспадаркай. У выніку вастрэйшых дэбатаў у бундэстагу правячай кааліцыі ўдалося дамагчыся прыняцця рашэння аб праве жанчын на перарыванне цяжарнасці на працягу першых трох месяцаў па медыцынскіх, генетычных або сацыяльных паказаннях. Разам з тым дзеля паляпшэння дэмаграфічнай сітуацыі, а таксама матэрыяльнага становішча сем'яў або маці-адзіночак з 1975 г. дзіцячая дапамога стала выплачвацца на кожнае дзіця ад нараджэння да 18 гадоў, а пры працягу адукацыі – яшчэ долей.

Парламенцкія выбары 1980 г. сталі адметныя тым, што ўзначальваў блок ХДС/ХСС гэтым разам лідар ХСС Франц-Ёзэф Штраўс, а не старшыня ХДС (Гельмут Коль), як звычайна. Тым не менш, гэта зноў не дапамагло апазіцыі вярнуцца да ўлады. Кааліцыя СДПГ-СвДП павялічыла сваю парламенцкую большасць з 5 да 23 дэпутатаў. Яшчэ адной асаблівасцю гэтых выбараў стала спроба прабіцца на агульнанацыянальную палітычную арэну маладой Партыі «зялёных» (гл. далей). На першых сваіх выбарах яна набрала звыш паўмільёны галасоў выбаршчыкаў, але не здолела ўзяць 5 % бар'ер (толькі 1,5 %).

На фоне новага цыклічнага крызісу перавытворчасці 1980 – 1982 гг. урад быў вымушаны пайсці на цэлы шэраг непапулярных крокаў. У выніку стаў шырыцца забастовачны рух, а папулярнасць правячай кааліцыі – наадварот падаць. Паглыбленне разыходжанняў паміж СДПГ і СвДП нарастала (асабліва гэта датычылася сацыяльна-эканамічных пытанняў) і распад іх некалі прагматычнага саюзу быў толькі справай часу. Непасрэднай нагодай для разрыву стала абмеркаванне бюджэту на 1983 г. Свабодныя дэмакраты выступалі за рэзкае скарачэнне бюджэтных выдаткаў, а сацыял-дэмакраты не маглі дазволіць сабе пайсці на гэткі радыкальны дэмантаж сацыяльнай палітыкі. У выніку СвДП выйшла з кабінету, а яе кіраўніцтва распачало перамовы з ХДС/ХСС аб стварэнні кааліцыі. Галасаванне канструктыўнага вотуму недаверу прывяло на канцлерскую пасаду старшыню ХДС Гельмута Коля (1982 – 1998).

У 1970-я гг. адбываліся прыкметныя зрухі ў грамадскай свядомасці, «змена каштоўнасцяў», абумоўленая фарміраваннем постіндустрыяльнага грамадства. Новыя каштоўнасці ды інтарэсы абумовілі і новыя формы грамадскай актыўнасці. Зараджаюцца і хутка набываюць уплыў «новыя сацыяльныя рухі» – экалагічны, рух супраць атамных станцый, разнастайныя грамадзянскія ініцыятывы. Становяцца папулярнымі, асабліва сярод моладзі, г. зв. «альтэрнатыўныя» рухі. Пры ўсіх іх разнароднасці агульным быў пратэст супраць «матэрыялістычнай сістэмы» і каштоўнасцяў, якія яна насаджае – кар'ера, поспех, багацце. У 1970-я гг. разгортвае сваю дзейнасць г. зв. «новы жаночы рух», які на першы план высоўваў патрабаванні не фармальнага, а фактычнага забеспячэння роўных правоў жанчын.

Асабліва паспяхова ішло развіццё экалагічнага руху. З улікам высокай інтэнсіўнасці эканомікі ФРГ, ступені яе нагрузкі на навакольнае асяроддзе, на першы план сталі выходзіць менавіта праблемы экалогіі. Не дзіўна, што многія новыя сацыяльныя рухі з часам набываюць менавіта экалагічную скіраванасць. У 1979 г. левыя радыкалы, анархісты, постмарксісты, левыя лібералы, хрысціянскія пацыфісты, а таксама некаторыя прадстаўнікі правай часткі палітычнага спектру стварылі саюз «Асаблівае палітычнае аб'яднанне – зялёныя». Некаторы час «зялёныя» рэпрэзентавалі сябе як «антыпартыя», якая адмаўляе буржуазную палітыку з яе аўтарытарнай іерархіяй. У студзені 1980 г. адбыўся ўстаноўчы з'езд федэральнай **Партыі «зялёных»** і ў тым жа годзе яна ўзяла ўдзел у парламенцкіх выбарах.

Сур'ёзнейшай праблемай для заходнегерманскага ўраду з канца 1960-х гг. стаў тэрарызм. Левыя экстрэмісты заклікалі да «узброеных акцый супраць сістэмы». Тэрарысты выкарыстоўвалі лацінаамерыканскую канцэпцыю «гарадской герыльі» – партызанскай вайны ў гарадах. Пры гэтым дзеянні невялікіх узброеных груп павінны былі падштурхнуць «прыгнечаных сістэмай» грамадзян да рэвалюцыйнай барацьбы за сваё вызваленне, а рэакцыя дзяржавы на гэтыя акцыі павінна была сарваць з яе «маску дэмакратыі» і агаліць яе сапраўдную рэпрэсіўную сутнасць.

Тактыка тэрарыстычных акцый стала галоўнай у дзейнасці г. зв. «**Фракцыі Чырвонай Арміі»** (**РАФ**; *Rote Armee Fraktion, RAF*). Банкаўскія налёты, выбухі ў ваенных і цывільных установах, замахі на высокапастаўленых асоб былі закліканыя праклaсці шлях да сусветнай рэвалюцыі. Пік яе тэрарыстычнай дзейнасці прыпадае на 1977 г., калі былі паслядоўна забітыя генеральны пракурор, старшыня праўлення «Дрэзднэр Банка», а потым пры дапамозе арабскіх тэрарыстаў захоплены самалёт заходнегерманскай кампаніі «Люфтганза» з 86 пасажырамі ў Самалі. Вельмі часта за левaрадыкальнымі групоўкамі ў ФРГ стаяла ўсходнегерманская спецслужба «Штазі».

Адначасова з левымі тэрарыстычнымі групамі дзейнічалі і праватэрарыстычныя, неанацысцкія арганізацыі. Апрача арганізацыі выбухаў у дзяржаўных установах яны здзяйснялі акты вандалізму на яўрэйскіх могілках, пагромы ў кварталах, дзе пражывалі гастарбайтэры і г. д.

Прынятцце ў 1977 – 1979 гг. цэлага шэрагу законаў супраць тэрарыстаў дало дастаткова хуткі эфект. Хаця рашучыя захады ўраду былі ў цэлым з паразуменнем успрынятыя законапаслухмянымі грамадзянамі, на іх адрас прагучала і нямала крытыкі з боку ліберальнай грамадскасці, якая сумнявалася, што дзейнасць жменькі радыкалаў апраўдвае ўмяшанне дзяржавы ў прыватнае жыццё сваіх грамадзян.

Вяртанне ХДС/ХСС да ўлады тлумачылася не толькі вонкавымі ўмовамі, якія склаліся напачатку 1980-х гг. Напрыканцы 1970-х гг. моцна абноўленае кіраўніцтва хрысціянскіх дэмакратаў ажыццявіла глыбокую

ідэйна-арганізацыйную мадэрнізацыю партыі. Германскія неакансерватары з ХДС/ХСС крытыкавалі этатызм эпохі дзяржаўна-манапалістычнага капіталізму, ідэю «дзяржавы дабрабыту», псіхалогію сацыяльнага ўтрыманства. Яны заклікалі да адраджэння традыцыйных падмуркаў грамадства, маральнаму аздараўленню, умацавання базавых элементаў сацыяльнай структуры – сям'і, царквы, уласнасці, дзяржавы.

На сакавіцкіх парламенцкіх выбарах 1983 г. кааліцыя ХДС/ХСС-СвДП атрымала шырокую падтрымку выбаршчыкаў і ўмацавала свае палітычныя пазіцыі. Першынство ў бундэстагу заваяваў блок ХДС/ХСС, які атрымаў 48,8 % галасоў. Яшчэ без малога 8 % прынеслі кааліцыі свабодныя дэмакраты. СДПГ з вынікам 38,8 % адкацілася да ўзроўню падтрымкі 1960-х гг. і, як аказалася, надоўга была адпраўлена заходнімі немцамі ў апазіцыю. Затое пасняхова выступілі «зялёныя»: набраўшы 5,6 %, яны здабылі 27 дэпутацкіх мандатаў. Гэткім чынам, упершыню з 1960 г. у бундэстаг прабілася чацвёртая (калі лічыць паасобку ХДС і ХСС, то – пятая) палітычная партыя.

Парламенцкія выбары 1987 г. пацвердзілі першынство кааліцыі ХДС/ХСС-СвДП (разам партыі набралі 53,3 %). Сацыял-дэмакраты перажывалі не лепшыя часы. Унутрыпартыйныя звады і, пакуль што, цьмяныя перспектывы «чырвона-зялёнай» кааліцыі (да саюзу СДПГ і «зялёных» да канца не былі гатовыя ні адны, ні другія) не пакідалі ім шанцаў на вяртанне да ўлады. СДПГ выступіла яшчэ горш, чым чатырма гадамі раней – 37 %. Партыя «зялёных» набрала 8,3 % галасоў, заваяваўшы 42 мандаты, і па ўзроўню выбарчай падтрымкі ўшчыльную наблізілася да ХСС (9,8 % і 49 дэпутатаў) і СвДП (9,1 % і 46 дэпутатаў). Поспех гэтай партыі тлумачыўся не толькі высокім узроўнем дабрабыту немцаў, калі грамадзяне маглі адмовіцца ад нязначнай долі свайго матэрыяльнага дастатку на карысць больш высокай якасці экалагічных умоў жыцця. Важным пунктам палітычнага парадку дня падчас выбарчай кампаніі стала абмеркаванне будучага атамнай энергетыкі ў ФРГ. На фоне нядаўняй аварыі на Чарнобыльскай АЭС (1986) яркая і бескампрамісная пазіцыя «зялёных», якія выступалі за закрыццё заходнегерманскіх атамных станцый, прынесла ім нямала галасоў. Яшчэ адной важнай прычынай росту папулярнасці «зялёных» было расчараванне часткі выбаршчыкаў у традыцыйных партыях.

### Знешняя палітыка ФРГ у 1970 – 1980-я гг. «Новая ўсходняя палітыка». Адносіны ФРГ з краінамі Захаду. Заходнегерманска-савецкія адносіны

Прыход да ўлады ўрадавай кааліцыі СДПГ-СвДП на чале з канцлерам В. Брантам і пачатак працэсу сусветнай разрадкі стварылі спрыяльныя ўмовы для карэннага перагляду палітыкі Заходняй Германіі адносна краін сацыялістычнага блоку і пераходу да **«новай усходняй палітыкі»**.

Пасля далучэння Бону да Дагавору аб нераспаўсюджанні ядзернай зброі ў 1969 г. было знята праблемнае пытанне двухбаковых адносін – аснашчэнне ФРГ ядзернай зброяй. Актывізаваўся заходнегерманска-савецкі дыялог на вышэйшым узроўні, які увянчаўся 12 жніўня 1970 г. падпісаннем Маскоўскага дагавору. Апрача іншага, пагадненне намеціла канкрэтныя крокі па нармалізацыі адносін ФРГ з ГДР ды іншымі ўсходнімі суседзямі – Чэхаславакіяй і Польшчай. У выніку 7 снежня 1970 г. быў падпісаны Варшаўскі, а 11 снежня 1973 г. – Пражскі дагавор. Удзельнікі пагадненняў прызналі непарушнасць пасляваенных межаў у Еўропе, пацвердзілі адмову ад тэрытарыяльных прэтэнзій і ўжывання сілы ў міжнародных адносінах.

У лістападзе 1971 г. Вялікабрытанія, ЗША, СССР і Францыя заключылі чатырохбаковае пагадненне па Заходнім Берліне, якое ўдакладняла яго статус з улікам інтарэсаў усіх зацікаўленых бакоў. Падпісанне гэтага кампраміснага дакумента стала штуршком да падпісання 21 снежня 1972 г. Дагавору аб асновах адносін паміж ГДР і ФРГ, які зафіксаваў узаемнае прызнанне абедзвюх дзяржаў. Бакі заяўлялі аб намеры развіваць узаемавыгадныя добрасуседскія адносіны, кіравацца прынцыпамі суверэнітэту і непарушнасці пасляваенных межаў. Абмен дыпламатычнымі прадстаўніцтвамі, а не пасольствамі быў закліканы падкрэсліць асаблівы характар адносін паміж дзяржавамі. У 1973 г. ГДР і ФРГ сталі членамі ААН.

Гэтак званыя «Усходнія дагаворы», што пацвердзілі пасляваенныя рэаліі, умацавалі падмуркі еўрапейскай разрадкі і праклалі шлях да падпісання Хельсінскіх пагадненняў 1975 г. В. Брант заслужыў сваёй «новай усходняй палітыкай» значныя міжнародны аўтарытэт і прызнанне: у 1971 г. ён быў удастоены Нобелеўскай прэміі міру.

Урад Г. Шміта імкнуўся ў міжнародных справах прытрымлівацца **«стратэгіі раўнавагі»** – балансу паміж збліжэннем з Усходам, захаваннем нацыянальнай бяспекі і атлантычнай салідарнасці. Гэта азначала адмаўленне ад празмернага, на думку новага заходнегерманскага кіраўніцтва, крэну знешнепалітычнага курсу ФРГ у бок Усходу.

Адносіны з СССР пэўны час яшчэ захоўвалі дынамізм. У 1978 г. з афіцыйным візітам Бон наведаў савецкі лідар Л. І. Брэжнеў, а ў 1980 г. Г. Шміт нанёс візіт у адказ. ФРГ напрыканцы 1970-х гг. стаў галоўным знешнегандлёвым партнёрам Савецкага Саюзу на Захадзе і губляць свой эканамічны ўплыў на гэтым важнейшым рынку не жадаў нават пасля пачатку новага вітку «халоднай вайны» і «гонкі ўзбраенняў».

Аднак неабходнасць падтрымання належнага ўзроўню бяспекі і атлантычная салідарнасць дыктавалі сваё. У снежні 1979 г., літаральна адразу пасля ўводу савецкіх войск у Афганістан, сесія НАТО прыняла рашэнне размясціць на тэрыторыі Заходняй Еўропы амерыканскія ядзерныя ракеты «Першынг-2» і

крылатыя ракеты «Тамагаўк». Г. Шміт даў сваю згоду прыняць значную частку гэтага смертаноснага арсеналу на тэрыторыі ФРГ.

Еўрапейская інтэграцыя па-ранейшаму заставалася прыярытэтным накірункам знешняй палітыкі ФРГ. У другой палове 1970-х гг. Г. Шміт актывізуе намаганні па адстойванню эканамічных інтарэсаў краіны ў ЕЭС. У 1974 г. сумесна з палітычным кіраўніцтвам Францыі заходнегерманскі ўрад ініцыяваў стварэнне новага органа – Еўрапейскай рады, а ў 1979 г. – стварэнне адзінай Еўрапейскай грашовай сістэмы і ўвядзенне разліковай адзінкі – экю. У 1981 г. ФРГ і Італія высунулі праект «Адзінага еўрапейскага акту», які стаў адным з найбольш этапных дакументаў у гісторыі еўраінтэграцыі.

Прыярытэты знешняй палітыкі Г. Коля былі сфармуляваныя яшчэ ў перыяд барацьбы за пасаду канцлера. Ён лічыў неабходным замацаваць ролю ФРГ як члена сусветнай супольнасці, які выступае за ўмацаванне дэмакратыі і міжнародна-прававой сістэмы, пільнавацца прынцыпу атлантычнай салідарнасці, змагаючыся пры гэтым за раўнапраўныя адносіны паміж членамі НАТО, актыўна спрыяць працэсу еўрапейскай інтэграцыі, прызнаючы асноватворную ролю ў ім франка-германскага саюзу.

Несумненным поспехам знешняй палітыкі ФРГ у 1980-х гг. стала пераадоленне супярэчнасці ў становішчы краіны як эканамічнага гіганта і «палітычнага карліка». Яна ператварылася ў аднаго з найбольш надзейных членаў НАТО і блізкіх саюзнікаў ЗША ў Еўропе. У 1984 г. з ФРГ былі знятыя апошнія абмежаванні на вытворчасць цяжкіх відаў узбраення, ваенных караблёў буйнога класа, бамбардзіроўшчыкаў і ракет. Забарона на вытворчасць зброі масавага паражэння, тым не менш, захоўвалася.

Г. Коль, пры падтрымцы міністра замежных спраў Ганса-Дзітрыха Геншара (СвДП), зрабіў значны ўнёсак у разгортванне новага этапу еўрапейскай інтэграцыі. Франка-германскае супрацоўніцтва, у тым ліку актыўнае ўзаемадзеянне лідараў дзвюх дзяржаў, забяспечылі прыняцце ў 1986 г. Адзінага еўрапейскага акту і пачатак яго рэалізацыі.

Знаходзячыся на пярэднім краі «халоднай вайны» і будучы зацікаўленай у нармалізацыі адносін паміж супердзяржавамі, ФРГ энергічна падтрымала палітыку перабудовы ў СССР і савецка-амерыканскі дыялог на вышэйшым узроўні. Г. Коль, у прыватнасці, паспрыяў канструктыўнаму вырашэнню пытання аб ракетах сярэдняй і малой дальнасці. Заходнегерманскае кіраўніцтва наладзіла вельмі інтэнсіўны і прадуктыўны дыялог з савецкімі калегамі. Адной з важнейшых сфер супрацоўніцтва стала пытанне аб лёсе нямецкай нацыянальнай меншасці ў СССР, забеспячэнні магчымасці выезду жадаючых на гістарычную радзіму. Высокі ўзровень адносін паміж дзяржавамі ды іх лідарамі – Г. Колям і М. С. Гарбачовым – значна спрасціў вырашэнне ў самым хуткім часе цэнтральнай задачы знешняй палітыкі ФРГ – пытання аб уз'яднанні Германіі.

## Тэма 10. ФРГ ў 1990-я – 2010-я гг.

### Аб'яднанне Германіі

Падзенне Берлінскай сцяны і агульны дэмакратычны ўздым, які ахапіў ГДР, незваротна вялі да германскага адзінства. Вялікае значэнне мела пазіцыя савецкага лідара – М. С. Гарбачова, які адмовіўся ад падтрымкі штучнай жыццядзейнасці ўсходнегерманскай дзяржаўнасці, і заклікаў кіраўніцтва ГДР прыслухоўвацца да голасу свайго народа. У значнай ступені лёс Германіі вырашаўся у сакавіку 1990 г. на выбарах у Народную палату ГДР. Іх вынікі недвухсэнсава прадэманстравалі жаданне большасці ўсхонегерманскага насельніцтва аб'яднацца з ФРГ. Народная палата зрабіла першыя захады ў гэтым накірунку (гл. тэму «Усходняя Германія і ГДР у 1945 – 1990 гг.»).

Вядучыя партыі ФРГ, акрамя «зялёных», падзялялі ідэю аднаўлення адзінства Германіі. Адрозненні былі толькі ў падыходах да тэрмінаў і тэмпу аб'яднаўчага працэсу. ХДС/ХСС і СвДП, напрыклад, выступалі за хутчэйшае аб'яднанне, наколькі гэта дазволіць няпросты працэс уладкавання міжнародных аспектаў. Заходнегерманская СДПГ, наадварот, была супраць паскоранага аб'яднання, паколькі лічыла, што дзяржаўна-палітычная інтэграцыя павінна суправаджацца сацыяльна-эканамічнай, а выроўніванне ўмоў жыцця дзвюх Германій запатрабуе шмат часу і фінансавых сродкаў.

Германа-германскае збліжэнне рабіла неабходным найхутчэйшае ўрэгуляванне міжнародна-прававых аспектаў аб'яднання Германіі, паколькі з'яўлялася не толькі ўнутранай справай дзвюх нямецкіх дзяржаў. Яно выклікала трывогу адносна захавання еўрапейскай бяспекі і гарантый непарушнасці пасляваенных межаў у Еўропе. Вызначэнне міжнародна-прававой формулы аб'яднання стала прадметам перамоў у фармаце «2 + 4» – ФРГ, ГДР і чатыры дзяржавы-пераможцы: Вялікабрытанія, ЗША, СССР і Францыя. Пачаліся яны ў лютым 1990 г. у Атаве, а працягнуліся ў Боне ў траўні таго ж году. Па выніках перамоў 12 верасня 1990 г. у Маскве быў падпісаны **«Дагавор 2 + 4»**, у якім Вялікабрытанія, Злучаныя Штаты, СССР і Францыя, а таксама прадстаўнікі абедзвюх германскіх дзяржаў пацвердзілі стварэнне аб'яднанай Германіі, а знешнія межы яе былі прызнаныя канчатковымі. З ратыфікацыяй Дагавору аб аб'яднанні і «Дагавору 2 + 4» скончылася дзеянне правоў і абавязкаў чатырох дзяржаў-пераможцаў адносна Берліну і Германіі. Германія набывала поўны суверэнітэт у сваёй унутранай і знешняй палітыцы.

Адначасова з урэгуляваннем міжнародна-прававых аспектаў германскага адзінства паміж урадамі ФРГ і ГДР вяліся перамовы па канкрэтных пытаннях і дэталях аб'яднання. Спрэчкі, напрыклад, выклікала практычная рэалізацыя пераходу да адзінай валюты. З 1 ліпеня 1990 г. набыў моц **«Дагавор аб стварэнні эканамічнага, валютнага і сацыяльнага саюзу»**, згодна якому заход-

негерманская марка станавілася адзіным сродкам плацяжоў, а эканамічная і сацыяльная сістэма ФРГ фактычна распаўсюджвалася і на ГДР.

23 жніўня 1990 г. Народная палата падала афіцыйную заяву на ўступленне ГДР у склад ФРГ на падставе Артыкула 23 Асноўнага закону, які прадугледжваў «магчымасць уваходжання ў Федэратыўную рэспубліку тэрыторый заселеных немцамі». На Ўсходзе Германіі аднаўляўся гістарычны дзяржаўна-тэрытарыяльны падзел на землі (Брандэнбург, Мекленбург-Пярэдняя Памеранія, Саксонія, Саксонія-Анхальт і Цюрынгія).

31 жніўня 1990 г. ў Боне паміж ФРГ і ГДР быў падпісаны **Дагавор аб аб’яднанні («Дагавор аб аднаўленні адзінства Германіі»)**. У верасні былі падпісаныя дадатковыя пратаколы. Гэткім чынам да канца верасня былі створаныя прававыя перадумовы для аб’яднання. У ноч з 2 на 3 кастрычніка 1990 г. набыў моц Дагавор аб аб’яднанні: пяць новых усходнегерманскіх зямель увайшлі ў склад ФРГ, а ГДР спыніла сваё існаванне. 3 кастрычніка стаў нацыянальным святам ФРГ – Днём нямецкага адзінства. Сталіца Германіі вярталася з Бону ў Берлін.

Аб’яднанне Германіі з’явілася адной з буйнейшых палітычных падзей канца XX ст. Была падведзеная канчатковая рыса пад пасляваенным урэгуляваннем, скончылася «пасляваенная эпоха». Аб’яднаная Германія стала раўнапраўным і суверэнным членам сусветнай супольнасці.

### Пераход да рыначнай эканомікі ва ўсходніх землях: эканамічныя, сацыяльныя і псіхалагічныя аспекты. Спад германскай эканомікі ў 1990-я гг. Сацыяльна-эканамічнае становішча Германіі на сучасным этапе

Аб’яднанне Германіі было палітычным актам. Цяпер паўстала задача эканамічнай інтэграцыі абедзвюх частак краіны. Раскол Германіі спарадзіў утварэнне на яе тэрыторыі дзвюх разнародных і несумяшчальных эканамічных сістэм. Уваходжанне ўсходніх зямель у склад адзінай дзяржавы адбылося на ўмовах прызнання імі прыватнай уласнасці, рыначных адносін, свабоднага цэнаўтварэння і канкурэнцыі. Працэс пераводу эканомікі былой ГДР, арганізаванай на прынцыпах камандна-адміністрацыйнай сістэмы, у сістэму сацыяльна рыначнай гаспадаркі, атрымаў назву «**эканамічнай трансфармацыі»** або «рэканструкцыі».

Перабудова ўсходнегерманскай эканомікі пачала перыяд спрыяльнай кан’юнктуры і ўстойлівага стану фінансаў. Але ў 1992 г. эканоміка Заходняй Германіі стала паступова пераходзіць у фазу спаду, які ўзімку 1992 – 1993 г. трансфармаваўся ў адзін з самых глыбокіх за пасляваенную гісторыю крызісаў. Перад эканомікай ФРГ паўсталі задачы: ажыццявіць яе структурную перабудову, прыстасавацца да новых патрэб зменлівага сусветнага рынку эпохі глабалізацыі, знайсці выйсце з крызісу і правесці сістэмную рэканструкцыю эканомікі на Ўсходзе краіны.

Напачатку працэсу трансфармацыі падаўляючая большасць жыхароў Усходняй Германіі знаходзілася ў стане эйфарыі, спадзяючыся, што шматмільярдныя інвестыцыі хутка паспрыяюць аздараўленню эканомікі былой ГДР і забяспечаць выроўніванне асноўных сацыяльна-эканамічных паказчыкаў у абедзвюх частках краіны. Аптымізм адносна хуткага поспеху трансфармацыі выказвалі і афіцыйныя асобы, у тым ліку сам канцлер Г. Коль.

Рэальныя працэсы пераводу цэнтралізавана кіраванай эканомікі ў эканоміку, якая дзейнічае па законах рынку, аказаліся куды больш складанымі, чым меркавалася. Структурная перабудова ўсходнегерманскай эканомікі насіла стыхійны характар. Мела месца пераацэнка яе рэальнага стану і магчымасцяў (канкурэнтаздольнымі, напрыклад, аказаліся толькі 10 % прадпрыемстваў). Скрайне адмоўнае ўздзеянне для вытворчасці аказала страта гарантаваных і ёмістых рынкаў усходнееўрапейскіх краін і СССР. У выніку ў 1990 – 1991 гг. многія прадпрыемствы на Ўсходзе ФРГ былі зачыненыя або зведалі драматычнае скарачэнне вытворчасці і звярнуліся да масавых звальненняў.

У рэкордна хуткія тэрміны ў новых землях была праведзена прыватызацыя. У 1990 – 1991 гг. праводзілася г. зв. «малая прыватызацыя»: у рукі галоўным чынам жыхароў былой ГДР перайшлі тысячы крамаў, гатэляў, кавярняў, рэстаранаў, аптэк ды іншых падобных аб’ектаў. Адначасова ішоў распродаж 8 тыс. буйных дзяржаўных прадпрыемстваў (спачатку – скрайне павольнымі тэмпамі). У выніку на працягу чатырох гадоў прамысловасць былой ГДР перайшла ў прыватныя рукі. Аднак матэрыяльная і сацыяльная цана гэткай імклівай прыватызацыі аказалася вельмі высокай. Былая ўласнасць ГДР прынесла мізэрныя даходы і ўсклала на дзяржаўную скарбніцу аграмадныя даўгі. Ужо ў працэсе прыватызацыі грамадзянам новых зямель ФРГ прыйшлося сутыкнуцца з даўно забытай праблемай – беспрацоўем. На працягу ўсіх 1990-х гг. доля толькі афіцыйна зарэгістраваных беспрацоўных трымалася на ўзроўні 15 – 17 % ад колькасці занятых. Для прадухілення наступстваў масавага беспрацоўя ўрад Г. Коля быў вымушаны пастаянна павялічваць выдаткі на вырашэнне сацыяльных праблем. Толькі за перыяд 1991 – 1997 гг. агульная сума грашовых трансфертаў з федэральнага бюджэту і фондаў ЕС на гэтыя патрэбы склала 1,4 трлн. марак. Гэтыя грошы давалі слабы плён. Назіраўся пастаянны адток насельніцтва з Усходу на Захад ФРГ: за 1991 – 2000 гг. у гэтым напрамку выправіліся сотні тысяч чалавек.

Тым не менш, нягледзячы на цяжкасці і памылкі ў працэсе эканамічнага выроўнівання дзвюх частак Германіі, былі дасягнутыя значныя поспехі: няхай і не гэткімі тэмпамі, як марылася раней, узрастала эфектыўнасць эканомікі Ўсходу Германіі, прадукцыйнасць працы і ўзровень жыцця жыхароў новых зямель ФРГ. Асабліва прыкметныя поспехі былі дасягнутыя ў мадэрнізацыі інфраструктуры Ўсходняй Германіі.

З прыходам ва ўрад «зялёных» (1998) у эканамічнай палітыцы Германіі стала відавочнай яе большая экалагічная скіраванасць. Улады вырашылі паступова адмовіцца ад выкарыстання ядзернай энергетыкі і павялічыць асігнаванні на развіццё ўзнаўляльных відаў энергіі. Але напрыканцы 1990-х – напачатку 2000-х гг. сацыяльна-эканамічнае становішча ФРГ было няпростым. Па-першае, зусім невысокім заставаўся прырост ВНП – з 2 – 2,3 % за год ён знізіўся да 1 – 1,5 %. Па-другое, хранічна высокім заставалася беспрацоўе – блізу 4,4 млн. чалавек (каля 10 % самадзейнага насельніцтва). Дадатковым цяжарам для сістэмы сацыяльнага забеспячэння станавілася далейшае старэнне насельніцтва краіны.

Нарастанне сацыяльна-эканамічных праблем дыктавалі неабходнасць рашучых дзеянняў з боку германскага ўраду. У 2003 г. канцлер Герхард Шродэр выступіў з планам рэформ (*Agenda 2010*), які быў скіраваны на мадэрнізацыю сістэмы сацыяльнага забеспячэння і рынку працы каб дасягнуць высокіх тэмпаў эканамічнага росту і скараціць беспрацоўе. Канкрэтная праграма дзеянняў прадугледжвала зніжэнне падаткаў, значнае скарачэнне бюджэтных выдаткаў на медыцынскае абслугоўванне, пенсійныя выплаты і дапамогу па беспрацоўю. Па многіх параметрах праграма лідара сацыял-дэмакратаў моцна нагадвала брытанскі тэтчарызм і амерыканскую рэйганоміку 1990-х гг. Вынікі рэалізацыі праграмы рэформ яшчэ застаюцца прадметам вострых дыскусій эканамістаў і палітыкаў. Тым не менш, прынамсі ў адным яна дасягнула пэўнага поспеху: ў сярэдзіне 2007 г. беспрацоўе ўдалося збіць да ўзроўню 8,8 % эканамічна актыўнага насельніцтва.

Калі з сярэдзіны 2000-х гг. адбылося прыкметнае ажыўленне сусветнай эканомікі, Германія як вядучы сусветны экспарцёр здолела палепшыць сваё эканамічнае становішча. Тым не менш, пачатак у 2008 г. сусветнага фінансавага крызісу выклікаў новыя праблемы. У студзені 2009 г. ураду Ангелы Меркель прыйшлося прыняць і ўвесці ў дзеянне план эканамічнай падтрымкі на агульную суму ў €50 млрд., які быў заклікаты абараніць асобныя сектары эканомікі ад спаду і не дапусціць далейшага росту колькасці беспрацоўных. Энергічная ўрадавая дапамога дазволіла краіне выйсці са стану рэцэсіі ўжо ў сярэдзіне 2009 г. Працягваючы палітыку папярэдніка ў справе барацьбы з беспрацоўем, урад А. Меркель дасягнуў адчувальных поспехаў: у сярэдзіне 2010 г. без працы заставалася ўжо толькі 7,6 % эканамічна актыўнага насельніцтва, а ў красавіку 2011 г. яшчэ менш – 7,1 % або 2,9 млн. чалавек – мінімальная лічба з 1992 г.

Даволі бедная прыродна-сыравіннымі рэсурсамі (у вялікіх аб’ёмах здабываюцца толькі вугаль і калійная соль), Германія моцна залежыць ад імпарту нафты і прыроднага газу. Тым не менш, краіна можа пахваліцца вельмі развітай постіндустрыяльнай структурай эканомікай. Каля 70 %

ВНП выпрабляецца ў сферы паслуг, 29 % – у прамысловасці, і толькі крыху менш за 1 % – у аграрным сектары. Большасць германскіх тавараў ствараецца ў машына- і аўтамабілебудаванні, металаапрацоўцы, хімічнай галіне. Германія з'яўляецца буйнейшым вытворцам ветравых турбін і лідарам у сферы распрацоўкі тэхналогій атрымання сонечнай энергіі. Гановер, Франкфурт-на-Майне і Берлін з'яўляюцца буйнымі фінансавымі і гандлёвымі цэнтрамі еўрапейскага кантыненту. Германія застаецца першай эканомікай Еўропы і захоўвае трывалыя пазіцыі ў свеце, займаючы 2-е месца па аб'ёму экспарту (толькі ў 2010 г. яе апярэдзіў 1,5-мільярдны Кітай) і 4-е – па памерах ВНП (саступае толькі ЗША, Кітаю і Японіі).

### Палітыка ўраду Г. Коля пасля аб'яднання Германіі. Выбары 1998 г. і паражэнне блоку ХДС/ХСС. Вынікі «эпохі Коля». Палітычная праграма СДПГ. Палітычны курс кааліцыйнага ўраду сацыял-дэмакратаў і «зялёных». Вынікі парламенцкіх выбараў 2002 г. Унутраная палітыка ўраду Г. Шродэра. «Вялікая кааліцыя» і яе распад

Першыя парламенцкія выбары аб'яднанай Германіі, якія адбыліся 2 снежня 1990 г., праходзілі пад знакам вострых дыскусій адносна праблем эканамічнай інтэграцыі. Выбарчая праграма ХДС/ХСС акцэнтавала ўвагу на неабходнасці стварэння жыццяздольных рыначных структур ва Ўсходняй Германіі і забеспячэнне сацыяльных гарантый для яе насельніцтва. Прывабныя лозунгі і папулярнасць лідараў правячага блоку – канцлера Г. Коля і яго намесніка і міністра замежных спраў свабоднага дэмакрата Г.-Дз. Геншара, галоўных «бацькоў» аднаўлення германскага адзінства, прынеслі іх партыям поспех. Блок ХДС/ХСС атрымаў 43,8 %, а СвДП – 11 %. СДПГ выступіла няўдала – толькі 33,5 %. Партыя «зялёных» зусім правяліла выбары і нават не здолела прабіцца ў бундэстаг. Затое, атрымалі прадстаўніцтва ў агульнагерманскім парламенце дзве партыі, якія дзейнічалі толькі на новых землях ФРГ – **«Альянс-90»** (усходнегерманскія «зялёныя») і **Партыя дэмакратычнага сацыялізму (ПДС)**. Гэта стала магчымым дзякуючы таму, што на гэтых выбарах галасы на Ўсходзе падлічваліся асобна.

1994 г. атрымаў у ФРГ назву «год супервыбараў». Сапраўды на гэты год былі запланаваныя выбары ў бундэстаг, прэзідэнта Германіі, у Еўрапарламент і ў ландтагі 8 зямель. Незадавальненне эканамічным крызісам, фінансавай рэформай, беспрацоўем абумовіла расчараванне значнай часткі насельніцтва новых зямель ФРГ: выбары ў ландтагі там праігнаравала амаль палова выбаршчыкаў.

Пэўнае расчараванне сітуацыяй у краіне прадэманстравалі і агульнанацыянальныя парламенцкія выбары, што адбыліся ў кастрычніку 1994 г. Перавага правячай кааліцыяй над апазіцыяй склала мікраскапічныя 0,3 %. Блок ХДС/ХСС набраўшы 41,5 % галасоў выбаршчыкаў (слабейшы вынік з

1949 г.; на долю ХДС прыйшлося 34,2 %), застаўся самай папулярнай партыяй. Немалую ролю ў гэтай перамозе адыграў Г. Коль. Станоўчы псіхалагічны эфект для яе мела і заканчэнне вываду расійскіх войск (правапераемнікаў Савецкай арміі) з нямецкай зямлі.

Слабым месцам кааліцыі стала СвДП – яе падтрымалі толькі 6,9 %. Складвалася ўражанне, што ва ўмовах германскай «двухспалавіннай» партыйнай сістэмы статус дробнага, але крытычна неабходнага партнёра паступова пераходзіць з рук свабодных дэмакратаў да «зялёных», якія заваявалі 7,3 %. Падобная трансфармацыя не ўяўлялася фантастычнай. У зямлі Ніжняя Саксонія ўжо падчас гэтых выбараў лідар мясцовых сацыял-дэмакратаў Герхард Шродэр утварыў нязвыклую для нямецкіх выбаршчыкаў «чырвона-зялёную» кааліцыю. Партнёрам СДПГ тут стала ўтвораная ў 1993 г. з заходне- («зялёныя») і ўсходнегерманскай («Альянс-90») арганізацыяў партыя **«Альянс-90/Зялёныя»**. Г. Шродэр, вядомы сваім цэнтрызмам і прагматызмам, неўзабаве стаў успрымацца як папулярны лідар, здольны кінуць выклік непераможнаму Г. Колю.

Напярэдадні выбараў у бундэстаг 1998 г. склалася некалькі іншая грамадска-палітычная сітуацыя, чым чатырма гадамі раней. Асноўныя канкурэнты – ХДС/ХСС і СДПГ – імкнуліся знайсці новыя шляхі вырашэння актуальных праблем, што стаялі перад ФРГ, і распрацаваць новыя мадэлі абнаўлення Германскага грамадства ў ХХІ ст. Блок ХДС/ХСС акцэнтаваў увагу выбаршчыкаў на ўражальныя поспехі, дасягнутыя ў 1982 – 1998 гг.: аб'яднанне Германіі, стабільнае развіццё «сацыяльнай рыначнай гаспадаркі», высокая якасць жыцця грамадзян. СДПГ рабіла стаўку не на мінулыя дасягненні, а на абнаўленне: абяцала павялічыць фінансаванне навукі і адукацыі, развіваць сучасныя тэхналогіі з мэтай падвышэння канкурэнтаздольнасці германскіх тавараў на сусветным рынку, садзейнічаць умацаванню дробнага і сярэдняга бізнесу. Больш выйгрышна выглядаў і прэтэндэнт на канцлерскую пасаду ад сацыял-дэмакратаў – маладзейшы і энергічны Г. Шродэр. Што да заслужанага дзеючага канцлера, то нават у сваёй партыі ён ужо не адчуваў былой маналітнай падтрымкі. Асабліва рэзкую крытыку выклікала яго празмернае захапленне германа-расійскімі праектамі (каля 40 % усіх замежных інвестыцый у Расіі былі нямецкімі). Абвяшчэння расійскім урадам дэфолту ў жніўні 1998 г., літаральна напярэдадні выбараў, яшчэ больш падарвала пазіцыі Г. Коля.

У выніку вераснёўскія выбары 1998 г. прынеслі перамогу СДПГ. Сацыял-дэмакраты атрымалі 40,9 %, а ХДС/ХСС – толькі 35,1 %. Здабыўшы права сфарміраваць урад, Г. Шродэр вырашыў аддаць перавагу ўтварэнню «чырвона-зялёнай» кааліцыі – з «Альянсам-90/Зялёныя», які набраў 6,7 % галасоў выбаршчыкаў. Пасады віцэ-канцлера і міністра замежных спраў дасталіся лідару «зялёных» Ёшку Фішару.

Развітанне Г. Коля, слаўнага «канцлера аб'яднання», з уладай аказалася азмрочанае скандалам. У 1999 г. высветлілася, што ХДС атрымліваў ананімныя сродкі, з якіх не плацілі падаткі, а самому Г. Колю высунулі абвінавачанні ў кАрупцыі і незаконным фінансаванні партыі. Палітык быў вымушаны скласці з сябе паўнамоцтвы старшыні ХДС і нават паўстаў перад следствам.

Цалкам у духу часу новы канцлер Германіі Г. Шродэр (1998 – 2005) імкнуўся выступаць не з пазіцый палітыка пэўнай партыйна-палітычнай арыентацыі (канкрэтна – сацыял-дэмакратычнай), а ў ролі агульнанацыянальнага лідара. Канцлер высунуў ідэю «новай сярэдзіны» («новага цэнтру»), што прадугледжвала згуртаванне працоўных і сярэдніх слаёў вакол гэткіх каштоўнасцяў, як дэмакратыя, талерантнасць, федэралізм, еўрапейская інтэграцыя і г. д. Імкненне здабыць падтрымку сярэдняга класу каштавала сацыял-дэмакратам страты былога даверу з боку традыцыйнага электарату партыі – асоб наёмнай працы, беспрацоўных, пенсіянераў. Левае крыло СДПГ на чале са старшынёй партыі і міністрам фінансаў Оскарам Лафантэнам аказалася незадаволеным гэткім разваротам. У сакавіку 1999 г. О. Лафантэн пакінуў свае пасады і абрынуўся на канцлера з крытыкай яго правальнай сацыяльнай палітыкі. Адмоўную рэакцыю левых сацыял-дэмакратаў і значнай часткі германскага грамадства выклікаў удзел ФРГ у вайсковых дзеяннях у Югаславіі (1999). Ідэалагічнае перафарматаванне і палітычная барацьба паміж «мадэрнізатарскім» (Г. Шродэр) і «традыцыяналісцкім» (О. Лафантэн) накірункамі у лагеры сацыял-дэмакратаў негатыўна адбіўся на выніках зямельных і камунальных выбараў 1999 – 2000 гг., выклікаў падзенне членства ў партыі.

На чарговых парламенцкіх выбарах 2002 г. СДПГ здолела адстаяць сваё права застацца пры ўладзе з вялікімі цяжкасцямі. Гэтаму нямала паспрыяла цвёрдая апазіцыя канцлера планам амерыканскага ўварвання ў Ірак ды эфектыўная дапамога пацярпелым ад паводкі на ўсходзе краіны. СДПГ і ХДС/ХСС набралі роўную колькасць галасоў – па 38,5 %, але дзякуючы ўдаламу выступленню «зялёных» (8,6 %) «чырвона-зялёная» кааліцыя ўсё ж здабыла большасць – атрымала 306 месцаў з 603. Г. Шродэр захаваў пасаду канцлера. СвДП атрымала толькі 7,4 %, што дало магчымасць мясцовым СМІ нават заяўляць аб уступленні германскага лібералізму ў фінальную стадыю крызісу.

Тым не менш становішча правячай кааліцыі заставалася недастаткова трывалым. Яе справы пагоршыліся пасля паражэння СДПГ у ключавой зямлі Паўночны Рэйн – Вестфалія ў траўні 2005 г., дзе сацыял-дэмакраты былі непераможныя на працягу апошніх 39 гадоў, яны страцілі большасць ў бундэсраце.

Паколькі ў адрозненне ад Вялікабрытаніі (і цэлага шэрагу іншых дзяржаў Еўропы) галава кабінету міністраў не можа па ўласным жаданні ініцыяваць роспуск парламента і тым самым наблізіць выгадныя для яго партыі датэрміновыя выбары, то дзеючаму канцлеру прыйшлося выкарыстаць новы

для Германіі палітычны прыём. Г. Шродэр ініцыяваў галасаванне аб даверы да ўраду ў бундэстагу і папрасіў частку дэпутатаў сваёй фракцыі галасаваць супраць. «Недавер» быў забяспечаны і прэзідэнт у гэтай сітуацыі – урад, нібыта, страціў падтрымку і легітымнасць – быў вымушаны распусціць бундэстаг. Спробы апазіцыі аспрэчыць не зусім сумленныя дзеянні выканаўчай улады ў канстытуцыйным судзе не мелі поспеху.

Пачалася самая кароткая ў германскай гісторыі 3-тыднёвая перадвыбарчая кампанія. Упершыню за час выбараў у бундэстаг адным з галоўных прэтэндэнтаў на канцлерскую пасаду з'явілася жанчына і да таго ж усходняя немка з «піянерска-камсамольскім» мінулым – старшыня ХДС Ангела Меркель. Блок ХДС/ХСС крытыкаваў Г. Шродэра за высокае беспрацоўе і нізкія тэмпы росту эканомікі. Пераадолець гэтыя праблемы А. Меркель планавала за кошт падвышэння падатку на дабаўленую вартасць, увядзення плоскага падаходнага падатку (яго стаўка – роўная для ўсіх падаткаплацельшчыкаў незалежна ад даходу) і агульнае змяншэнне дзяржаўнага ўмяшання ў эканамічныя працэсы, у тым ліку праз скарачэнне сацыяльных праграм. СДПГ і «зялёныя» таксама заяўлялі аб неабходнасці пэўнага перагляду пакету сацыяльных паслуг насельніцтву, але не за кошт сацыяльнай справядлівасці і рэзкага зніжэння дабрабыту немцаў.

Боязі выбаршчыкаў у дачыненні неакасерватыўнай праграмы ХДС/ХСС вялі да паступовага аслаблення яе перавагі над канкурэнтамі. Стала аднаўляць свае пазіцыі СДПГ. Акрамя таго, на левым флангу стала паўставаць яшчэ адна сур'ёзная палітычная сіла. Дастаткова папулярная на Ўсходзе Германіі ПДС уключыла ў свой выбарчы спіс прадстаўнікоў нядаўна створанай партыі **«Праца і сацыяльная справядлівасць – Выбарчая альтэрнатыва»**, утворанай О. Лафантэнам і яго прыхільнікамі пасля выхаду з СДПГ, і тым самым пашырыла свой уплыў на заходнюю частку краіны. Пакуль што аб стварэнні новай адзінай партыі гаворка не ішла (ПДС, праўда, атрымала больш асцярожную назву «Левыя. ПДС»), але перспектывы аб'яднання палітычных сіл больш левых за СДПГ выглядалі вельмі прывабна.

Галасаванне не вызначыла яўных пераможцаў. Папулярнасць абодвух вядучых палітычных сіл Германіі некалькі зменшылася: ХДС/ХСС набраў 35,2 % і заваяваў 226 дэпутацкіх мандатаў, а СДПГ – адпаведна, 34,2 % і 222. Стала ясна, што без кааліцыі будзе не абысціся. Ідэалагічна і матэматычна найбольш натуральнай была б кааліцыя з удзелам СДПГ, «зялёных» (8,3 % і 51 месца) і «левых» (8,8 % і 54 месца). Аднак асабістая непрыязнасць цалкам выключала магчымасць супрацоўніцтва Г. Шродэра і О. Лафантэна. Не былі рэалізаваныя і магчымасці стварэння г. зв. «святлафорнай» (СДПГ (колер партыі – чырвоны), СвДП (жоўты) і «зялёных») і «ямайскай» (па колерах сцягу Ямайкі; ХДС/ХСС (колер ХДС – чорны), СвДП (жоўты) і «зялёных»). У выніку ХДС/ХСС і СДПГ

дамовіліся аб утварэнні другой «вялікай кааліцыі» (першая дзейнічала ў 1966 – 1969 гг.). Кіраўніком ураду стала 51-гадовая – самы малады канцлер у гісторыі ФРГ – Ангела Меркель (2005).

Яўная ідэалагічная неаднароднасць «вялікай кааліцыі» не дазваляла разлічваць на ажыццяўленне маштабных пераўтварэнняў. Кожная з партый больш думала пра ўласныя перспектывы на будучых выбарах і баялася дапусціць фатальную памылку. Сапраўднага паразумення партнёрам па кааліцыі ўдалося дасягнуць толькі дзякуючы сусветнаму эканамічнаму крызісу 2008 –2009 гг. Запамятаўшы на рознагалоссі правячыя партыі скарысталіся сваёй парламенцкай большасцю для прыняцця пакету захадаў па ажыўленні эканамічнай кан'юнктуры ў краіне, план выратавання банкаў, новы закон, які абмяжоўваў аклады менеджэраў вышэйшага звяна, а таксама пачаць нацыяналізацыю буйнога іпатэчнага банка *Hypo Real Estate* ў мэтах выратавання яго ад банкруцтва. Беспрэцэдэнтныя захады ўраду А. Меркель па аказанні дзяржаўнай падтрымкі эканоміцы ФРГ (напрыклад, ён вылучыў €5 млрд. на абмен старых аўтамабіляў, пайшоўшых на металалом, на новыя) дазволілі германскай эканоміцы выйсці з рэцэсіі ўжо ў жніўні 2009 г.

Перадвыбарчая кампанія ў бундэстаг 2009 г. аказалася даволі сумнай. Лідары асноўных партый – А. Меркель і сацыял-дэмакрат Франк-Вальтэр Штайнмаер (віцэ-канцлер і міністр замежных спраў ураду «вялікай кааліцыі») – ніколі не вызначаліся асаблівай харызмай. Абмен крытыкай з боку ХДС/ХСС і СДПГ не мог насіць востры характар: партыі разам рэпрэзентавалі дзеючую ўладу і павінны былі ўлічваць даволі рэальную магчымасць працягу супрацоўніцтва і ў наступны чатырохгадовы тэрмін.

Не дзіва, што асноўныя прэтэндэнты на ўладу выступілі настолькі ж бляклa, наколькі праводзілі перадвыбарчую кампанію. ХДС/ХСС паказала найгоршы з 1949 г. узровень падтрымкі з боку выбаршчыкаў – 33,8 %, хаця і здабыла на 13 дэпутацкіх мандатаў болей. Электаральная падтрымка СДПГ аказалася проста беспрэцэдэнтна нізкай – 23 %. За партыю прагаласавала на 6 млн. выбаршчыкаў (11,2 %) меней, чым у 2005 г. – небывалы правал у гісторыі ФРГ! Затое найлепшыя вынік у сваёй гісторыі прадэманстравалі СвДП – 14,6 % (+ 4,8 %) і «зялёныя» – 10,7 %. У 2007 г. «Левыя. ПДС» канчаткова аб'ядналіся з саюзнікамі і стварылі партыю **«Левыя» (*Die Linke*)** і таксама дасягнулі значнага поспеху – 11,9 % (+ 3,2 %).

Парламенцкія выбары 2009 г. паказалі далейшае аслабленне пазіцый партый-лідараў пасляваеннай ФРГ і ўзрастальны ўплыў невялікіх партый (Апрача ўзгаданых партый увагі заслугоўвае **Пірацкая партыя** (2 %), якая выступае супраць існуючай абмежавальнай для грамадзян сістэмы аўтарскага права ды іншых «манаполій», умяшання дзяржавы ў прыватнае жыццё і г. д.). Сучасная сітуацыя ўжо не нагадвае тую, што існавала ў час росквіту

«двухспалавіннай» партыйнай сістэмы. Але і гэтым разам узнікла даволі звычайная для Германіі кааліцыя ХДС/ХСС-СвДП. Ангела Меркель захавала канцлерскую пасаду, яе новым намеснікам і міністрам замежных спраў стаў лідар свабодных дэмакратаў Гіда Вестэрвэле.

**Іншаземцы ў Германіі.**
**Праблемы палітыкі мультыкультуралізму**

Пасля заканчэння Другой сусветнай вайны ў Германіі па вядомых прычынах пражывала вельмі мала асоб ненямецкага паходжання. Да іншаэтнічнага насельніцтва краіны збольшага належалі лужыцкія сербы Ўсходняй Германіі і датчане Шлезвігу. У 1950-х гг. у сувязі з хуткімі тэмпамі эканамічнага развіцця – германскім «эканамічным дзівам», калі ў ФРГ стала ўзрастаць патрэба ў дадатковай працоўнай сіле, пачалася вярбоўка замежных рабочых – **«гастарбайтэраў»** (ням. – *Gastarbeiter*). Спачатку працоўная сіла запрашалася з Італіі, Іспаніі, потым з Югаславіі, Грэцыі, але найбольш – з Турцыі. Спачатку меркавалася, што гэтыя мігранты будуць працаваць абмежаваны перыяд часу (пакуль не скончыцца кантракт), а затым іх будуць заменяць новыя замежныя рабочыя. Аднак прынцып ратацыі хутка даказаў сваю эканамічную неэфектыўнасць і працадаўцы, незадаволеныя падвышэннем выдаткаў сваіх прадпрыемстваў на навучанне персаналу і, адсюль, падаражаннем прадукцыі, дамагліся яго скасавання. Замежныя рабочыя атрымалі магчымасць змяніць дазвол на часовае знаходжанне на пастаянны від на жыхарства. Таму следам за гастарбайтэрамі-мужчынамі ў ФРГ стала хутка расці іміграцыя ў краіну іх сем’яў.

У 1970 – 80-я гг. этнічны склад насельніцтва ФРГ стаў яшчэ больш стракатым за кошт прытоку асоб, якія шукалі на Захадзе палітычнага прытулку (уцекачы з Самалі, Шры-Ланкі, Ірану ды інш.). Імігранты выконвалі найбольш цяжкія і нізкааплатныя работы, займалі найменш прэстыжнае і нізкаякаснае жыллё. У гарадах на захадзе Германіі ўзніклі цэлыя турэцкія кварталы ў бедных ускраінах.

Замежныя рабочыя выкарыстоўваліся і ва Ўсходняй Германіі. Афіцыйна мэтай прыезду маладых людзей з краін сацыялістычнай арыентацыі (Кубы, Мазамбіку, Паўночнай Карэі і, асабліва, В’етнаму) называлася «атрыманне і падвышэнне прафесійнай адукацыі».

У выніку ў 1997 г. на тэрыторыі Германіі пражывала 7,4 млн. іншаземцаў. Самай шматлікай групай з’яўляліся туркі (2,1 млн.), за імі ішлі выхадцы з былой Югаславіі (0,7 млн.), італьянцы (0,6 млн.) і г. д. У 2004 г. колькасць іншаземцаў ужо складала каля 8 млн. чалавек і па-ранейшаму вылучаліся туркі, якіх па розных дадзеных налічвалася ад 2,5 да 3 млн. Тым часам, на думку дэмографаў, пры захаванні існуючых тэндэнцый у 2015 г. некарэннае

насельніцтва будзе складаць 19 % ад усіх жыхароў краіны. Пра гэта сведчаць і сучасныя міграцыйныя працэсы, што паскараюцца глабалізацыяй.

Падобная сітуацыя дыктуе правядзенне прадуманай урадавай палітыкі. З 1980-х гг. ажыццяўлялася ліберальная мультыкультурная мадэль інтэграцыі іншаземцаў у германскае грамадства. Ідэя «дамінуючай культуры» (культуры большасці – немцаў), якую прапаведавалі сацыял-дэмакраты, не карысталася папулярнасцю. Тым не менш, жыццё паставіла пад сумненне ідэалы мультыкультуралізму, у якім адрозныя культуры шчасліва суседнічаюць, супольнасці суіснуюць у талерантнасці, але не змешваюцца паміж сабой.

Праблема крызісу мультыкультуралізму асабліва выпукла праяўляецца ў становішчы мусульманскіх супольнасцяў Германіі. У той час, як на 2009 г. у краіне налічвалася 4,3 млн. мусульман (5 % насельніцтва; 2/3 ад гэтай лічбы – туркі) і палова з іх валодала нямецкім пашпартам (па пашпарце любы грамадзянін Германіі, незалежна ад паходжання, лічыцца немцам), толькі чвэрць атаясамлівала сябе з Германіяй. З другога боку, большасць г. зв. «карэнных» грамадзян не ўспрымае мусульман як частку нямецкага грамадства. Барацьба з ісламскім фундаменталізмам і тэрарызмам, грамадскія дыскусіі адносна традыцыйнай мусульманскай жаночай вопраткі і пільнавання законаў шарыяту насуперак канстытуцыі свецкай дзяржавы і яе заканадаўству, сацыяльныя праблемы, якія працей за ўсё ўвязаць з палітыкай «негасцінных» гаспадароў альбо, наадварот, з «няўдзячнасцю нахабных прыхадняў» пагражаюць нармальнаму існаванню германскага грамадства і спараджаюць новыя цяжкасці. Палітычнае кіраўніцтва Германіі было вымушанае прызнаць крах гэтай палітыкі, але што прапанаваць наўзамен яе, пакуль не зусім ясна.

### Аб'яднаная Германія ў Еўропе і свеце. ФРГ і Маастрыхцкі дагавор. Сучасныя праблемы удзелу Германіі ў інтэграцыйным працэсе. Знешняя палітыка кабінетаў Г. Коля, Г. Шродэра і А. Меркель. Пазіцыя Германіі па вастрэйшых міжнародных праблемах сучаснасці

Пасля аб'яднання Германіі ў Еўропе склалася новая геапалітычная рэальнасць. У цэнтры Еўропы ўзнік 82-мільённы эканамічны і палітычны гігант. Рэзка ўзрасла роля ФРГ як стратэгічнага партнёру Злучаных Штатаў па блоку НАТО. Абапіраючыся на сваю эканамічную магутнасць як трэцяй прамысловай дзяржавы свету, Германія з'яўляецца маторам еўрапейскай інтэграцыі. Пасля распаду сацыялістычнай садружнасці і СССР яна стала запаўняць палітычны вакуум ва Ўсходняй і Паўднёва-ўсходняй Еўропе, была адным з ініцыятараў прасоўвання Паўночнаатлантычнага альянсу на Ўсход, бо гэта фактычна азначала пашырэнне зоны германскага ўплыву.

Першым выпрабаваннем новага статусу Германіі на міжнароднай арэне стала вайна ў Персідскім заліве (1991). Нягледзячы на прапанову ЗША далучыцца да кааліцыйных сіл, яна вырашыла абмежаваць свой удзел фінансавай

дапамогай памерам у 17 млрд. марак. У сувязі з гэтай вайной, Г. Коль заявіў, што Германія больш не можа займаць староннюю пазіцыю, а павінна ўскласці на сябе долю адказнасці за падтрыманне сусветнай стабільнасці, для чаго краіне трэба змагацца за атрыманне статусу пастаяннага члена Рады Бяспекі ААН (гэты статус дагэтуль маюць толькі вялікія дзяржавы-пераможцы ў дугой сусветнай вайне – Вялікабрытанія, Злучаныя Штаты, Кітай, Расія (правапераемніца СССР) і Францыя).

Набыццё новай міжнародна-палітычнай ідэнтычнасці патрабавала вырашэння цэлага шэрагу няпростых праблем. Напрыклад, у 1994 г. разгарэлася дыскусія адносна магчымасці ўдзелу частак арміі ФРГ (бундэсверу) ў вайсковых аперацыях за межамі рэгіёну адказнасці НАТО (мелася на ўвазе Самалі і Боснія). Спрэчку паміж ХДС/ХСС, які быў гатовы пашырыць геаграфію Германскай прысутнасці, – з аднаго боку, – і СДПГ з СвДП, што выступалі катэгарычна супраць, – з другога, прыйшлося вырашаць Федэральнаму канстытуцыйнаму суду. Згодна з яго вердыктам, для адпраўкі частак бундэсверу за межы зоны НАТО патрабавалася падтрымка парламенцкай большасці.

Разам з Францыяй Германія застаецца галоўным «лакаматывам» працэсу еўрапейскай інтэграцыі. У лютым 1992 г. яна падпісала Маастрыхцкі дагавор аб стварэнні Еўрапейскага Саюзу (ЕС), які прадугледжваў далейшае палітычнае збліжэнне і замацаванне эканамічнага і валютнага саюзу 12 краін-удзельніц. У 1996 г. Парыж і Лондан выступілі з сумеснай ініцыятывай па ўдакладненні і пашырэнні шэрагу інтэграцыйных праграм, якія змяшчаліся ў Маастрыхцкім пагадненні. Пры актыўным удзеле Германіі ў 1997 г. быў выпрацаваны Амстэрдамскі дагавор. Ён пашырыў кампетэнцыі ЕС у галіне сацыяльнай, унутранай палітыкі, у сферы экалогіі, а за Еўрапарламентам замацоўваў большыя паўнамоцтвы ў фарміраванні заканадаўства Еўрапейскай супольнасці. Гэтым дагаворам была дэталізавана сумесная знешняя палітыка і палітыка бяспекі краін ЕС, пільнаванне правоў чалавека і дэмакратыі.

Прыход на канцлерскую пасаду Г. Шродэра першапачаткова не пацягнуў за сабой значных змен у знешнепалітычнай арыентацыі ФРГ. Прыярытэтнымі задачамі германскай дыпламатыі абвяшчаліся: захаванне і развіццё германа-французскага сяброўства, германа-амерыканскага партнёрства і шчыльнай германа-расійскай кааперацыі.

«Чырвона-зялёны» ўрад працягнуў актыўную еўрапейскую палітыку сваіх папярэднікаў. З ініцыятывы Германіі і Францыі быў распрацаваны і летам 2003 г. прадстаўлены праект Канстытуцыі ЕС. Напачатку 2000-х гг. Германія заставалася важнейшай эканамічнай сілай ЕС. У ФРГ выраблялася чвэрць валавога нацыянальна прадукту Еўрапейскага саюзу. Нягледзячы на фінансавыя цяжкасці, звязаныя з выдаткамі на аб’яднанне краіны і застойнымі з’явамі ў са-

цыяльна-эканамічнай сферы напрыканцы 1990-х – напачатку 2000-х гг. унёскі Германіі ў агульную скарбніцу ЕС дасягалі чвэрці яе бюджэту.

Падчас канфлікту ў Косава як частка кантынгенту НАТО туды былі адпраўленыя германскія вайсковыя фарміраванні. Гэта быў першы выпадак у пасляваеннай гісторыі Германіі, калі яе ўзброеныя сілы ўзялі ўдзел у баявых дзеяннях. Урад Г. Шродэра прадэманстраваў салідарнасць са Злучанымі Штатамі Амерыкі пасля тэрарыстычнай атакі на гэтую краіну 11 верасня 2001 г.: германскія вайскоўцы ў складзе міжнародных сіл былі скіраваныя ў Афганістан змагацца з сіламі сусветнага тэрарызму.

Тым не менш, Германія разам з Францыяй і Расіяй рашуча запярэчыла планам ЗША развязаць вайну супраць Іраку, а калі канфлікт распачаўся (2003), то выступіла з жорсткай крытыкай знешняй палітыкі амерыканскай адміністрацыі на Блізкім Усходзе. З гэтага часу германа-амерыканскія адносіны ўступаюць у паласу рэзкага ахаладжвання. Упершыню за ўвесь пасляваенны перыяд Германія паставіла пад сумненне прыярытэтнасць стратэгічнага партнёрства з ЗША.

Урад Г. Шродэра адмовіўся ад былога курсу Г. Коля, скіраванага на простае аказанне фінансавай дапамогі Расіі і перайшло да вылучэння крэдытаў пад канкрэтныя праекты пры кантролі за іх выкананнем з нямецкага боку. Адным з найбольш значных прыкладаў новага фармату супрацоўніцтва стала заключэнне ў 2005 г. пагаднення «Паўночны паток», якое прадугледжвае пракладванне па дне Балтыйскага мора газаправоду з Расіі ў Германію. Усталёўваюцца блізкія адносіны паміж лідарамі двух дзяржаў – Г. Шродэрам і У. У. Пуціным.

З абраннем на канцлерскую пасаду А. Меркель знешняя палітыка Германіі стала больш узважанай. Былі нармалізаваныя адносіны са Злучанымі Штатамі. Германскаму лідару ўдалося наладзіць добрыя асабістыя адносіны з Джорджам Бушам-малодшым, а потым і з Баракам Абамам. Расійска-грузінская вайна з непрызнаннем Германіяй самаабвешчаных Абхазіі і Паўднёвай Асеціі і газавыя канфлікты паміж Расіяй і Украінай, якія нават прывялі да зрыву паставак расійскага газу ў Заходнюю Еўропу, зрабілі германа-расійскія адносіны больш стрыманымі.

Адной з важнейшых задач знешнепалітычнага курсу А. Меркель стала пераадоленне крызісу ў еўрапейскім інтэграцыйным працэсе, які ўзнік у сувязі з правалам праекту Канстытуцыі ЕС. Германія, якая ў 2007 г. старшынствавала ў Еўрасаюзе прыклала вялікія намаганні для заключэння новага этапнага пагаднення – Лісабонскага дагавору (2007). У далейшым галоўным клопатам германскага ўраду становіцца вырашэнне шматлікіх эканамічных і фінансавых праблем, з якімі пастаянна сутыкаюцца краіны-ўдзельніцы ЕС падчас і пасля сусветнага фінансавага крызісу 2008 – 2009 гг. Неабходнасць падтрымання і

нават выратаванне эканомік слабейшых еўрапейскіх партнёраў, стабілізацыі становішча агульнай валюты еўра стварае для бюджэту ФРГ адчувальныя пагрозы і выклікае ўзрастальныя пратэсты часткі палітычных сіл і большасці грамадзян краіны.

Надзвычай вострай праблемай знешняй палітыкі Германіі на сучасным этапе застаецца лёс яе 4-тысячнага кантынгенту ў Афганістане. Сумнеўныя поспехі дзейнасці міжнародных сіл падтрымання стабільнасці ў гэтай краіне і яшчэ больш цьмяныя перспектывы ставяць пад пытанне неабходнасць германскай прысутнасці ў гэтай няпростай краіне. Большасць немцаў лічыць місію сваіх суайчыннікаў у Афганістане вычарпанай і патрабуюць адклікання іх дадому.

## Тэма 11. Італія ў 1945 – 1980-я гг.

### Вынікі Другой сусветнай вайны для Італіі. Урады Нацыянальнага адзінства пры ўладзе. Рэферэндум 1946 г. Перабудова партыйнай сістэмы краіны. Выбары ва Ўстаноўчы сход. Роля знешняга фактара ў грамадска-палітычным жыцці Італіі. Умацаванне палітычнага ўплыву мафіі. Прыняцце Канстытуцыі 1947 г. Палітыка ўрада А. Дэ Гаспэры. Парламенцкія выбары 1948 г.

Паражэнне ў Другой сусветнай вайне прынесла Італіі немалыя чалавечыя і матэрыяльныя страты. На франтах, у палоне, ад ранаў загінулі ці прапалі без вестак 374 тыс. італьянскіх салдат і афіцэраў (яшчэ каля 350 тыс. былі параненыя, а 620 тыс. патрапілі ў палон). Таксама загінулі 105 тыс. мірных жыхароў Італіі. Нацыянальнае багацце краіны зменшылася на адну трэць. У грашовым выражэнні страты Італіі склалі каля $50 млрд. Было разбурана 60 % дарог дзяржаўнага значэння, 90 % партовых збудаванняў, знішчана 60 % агульнага парку лакаматываў і таварных вагонаў, 80 % пасажырскіх вагонаў. Аграмаднымі былі страты гандлёвага флоту. Сотні тысяч італьянцаў засталіся без даху над галавой.

Аб’ём прамысловай вытворчасці ў 1945 г. быў на 60 % меншым за даваенны. У вельмі цяжкім становішчы знаходзілася і сельская гаспадарка. Вытворчасць яек, напрыклад, знізілася на 48 %, а мяса – на 40 %. На прадукты харчавання была ўведзеная карткавая сістэма. Значных памераў дасягнула спекуляцыя ды інфляцыя. Армія беспрацоўных вырасла да 2 млн. чалавек. Умовы пасляваеннага хаосу спрыялі росквіту бандытызму.

Разгром фашызму спрыў дэфашызацыі і дэмакратызацыі Італіі. Ужо на працягу 1943 – 1945 гг. былі ліквідаваныя найбольш рэакцыйныя інстытуты былога рэжыму: распушчана і забаронена фашысцкая партыя, фашысцкая

міліцыя ды іншыя падобныя арганізацыі. На поўначы Італіі ўлада на першых парах апынулася ў руках **Камітэту нацыянальнага вызвалення Паўночнай Італіі (КНВПІ)**, у якім вядучая роля належала левым антыфашысцкім партыям. Адміністратыўная ўлада на месцах ажыццяўлялася Камітэтамі нацыянальнага вызвалення (КНВ) і дэмакратычнымі джунтамі (італ. *giunta* – саюз) – органамі народнай улады на месцах. Народныя трыбуналы чынілі суд над фашыстамі. У Паўднёвай Італіі, якая была вызваленая саюзнікамі і дзе рух Супраціўлення не атрымаў шырокага развіцця, КНВ не набылі масавага характару. Тут больш трывалыя пазіцыі меў каталіцкі касцёл і традыцыйныя кансерватыўныя сілы.

Тым не менш, Італьянская дзяржава мела патрэбу ў фундаментальным абнаўленні. Амаль 20 гадоў фашысцкай дыктатуры зруйнавалі былую партыйную сістэму краіны. Найбольш уплывовай буржуазнай партыяй пасля вайны стала **Хрысціянска-дэмакратычная партыя (ХДП)**, створаная ў 1943 г. на базе даваеннай каталіцкай Народнай партыі (папалары). Адыгрываючы важную ролю ў італьянскім Супраціўленні, партыя імкнулася займаць цэнтрысцкія пазіцыі і ўлічваць інтарэсы шырокіх народных мас: сярэдніх слаёў, дробнай і сярэдняй буржуазіі, часткі рабочых. У праграмным дакуменце партыі «Пераўтваральныя ідэі хрысціянскай дэмакратыі», напісаным яе стваральнікам і лідарам Альчыдэ Дэ Гаспэры, гаварылася аб неабходнасці «назаўжды знішчыць здань беспрацоўя», выказвалася ідэя аб «знікненні пралетарыяту як класу» шляхам ператварэння яго ў клас дробных уласнікаў. У праграму былі ўключаныя і гэткія прагрэсіўныя патрабаванні, як правядзенне аграрнай, прамысловай і фінансавай рэформ, знішчэнне панавання буйнога манапалістычнага капіталу, дэмакратызацыя палітычнай сістэмы краіны. Рэжым, аб усталяванні якога ў Італіі марыла ХДП, называўся «хрысціянскай цывілізацыяй».

ХДП абвясціла сябе партыяй супрацоўніцтва паміж класамі ў рамках нацыі. Аднак хрысціянска-дэмакратычная трактоўка карпаратывізму (класавага супрацоўніцтва ў грамадстве) істотна адрознівалася ад фашысцкай. Калі фашызм імкнуўся стварыць адзіны блок народных мас і правячай эліты вакол ідэй першаснасці «дзяржавы» і «нацыі», што цалкам падаўлялі асобу, то ХДП высунула ў якасці гуртуючай дактрыны хрысціянства. Хрысціянска-дэмакратычная ідэалогія, пададзеная ў рэлігійнай абалонцы, і маштабная сацыяльная праграма дала магчымасць ХДП актыўна ўздзейнічаць на народныя масы, асабліва на сялянства. У сярэдзіне 1946 г. у шэрагах гэтай партыі налічвалася каля 1 млн. чалавек. Масавая база ХДП стварала ёй значную перавагу над буржуазнымі канкурэнтамі і дазваляла разлічваць на станоўчы зыход барацьбы з масавымі рабочымі партыямі.

З ХДП непасрэдна сапернічала **Ліберальная партыя**, адноўленая ў 1943 г. пад кіраўніцтвам выдатнага філосафа Бенедэта Крочэ. Гэтая свецкая, не

звязаная з касцёлам і каталіцкай ідэалогіяй, партыя імкнулася да аднаўлення буржуазнай дэмакратыі дафашысцкага перыяду. Аднак у адрозненне ад тых часоў большасць італьянцаў ужо не ўспрымала лібералаў як сілу, здольную забяспечыць Італіі развіццёвы прарыў. Сапраўды, пасля Другой сусветнай вайны Ліберальная партыя аб'ядноўвала найбольш кансерватыўныя колы буржуазіі і памешчыкаў. Левы фланг у лагеры буржуазных партый займалі **Італьянская рэспубліканская партыя** і **Партыя дзеяння**.

На скрайне правым флангу дзейнічаў неафашысцкі рух **«Фронт шараговага чалавека»** (італ. *Fronte dell'uomo qualunque*; г. зв. «квалюнквісты»), які стаяў на антыкамуністычных манархічных пазіцыях. Праўда, пасля з'яўлення новай больш моцнай неафашысцкай арганізацыі **«Італьянскі сацыяльны Рух» (ІСР)** куалюнкісты даволі хутка сышлі з палітычнай арэны.

Пасля перамогі над фашызмам аграмадны ўплыў набываюць яго паслядоўныя праціўнікі – камуністы і сацыялісты. Ужо на момант вызвалення краіны **Камуністычная партыя Італіі (КПІ)** аб'ядноўвала каля 400 тыс. чалавек, а да канца 1945 г. членства ў ёй вырасла да 1,7 млн., прычым каля 280 тыс. камуністаў былі працаўнікамі вёскі. Пальміра Тальяці, генеральны сакратар КПІ, не толькі карыстаўся папулярнасцю ў сваёй краіне, але таксама лічыўся адным з буйнейшых дзеячаў міжнароднага камуністычнага руху. Італьянскія камуністы выступалі з праграмай буйнамаштабных пераўтварэнняў ва ўсіх сферах жыцця грамадства, але на першых парах былі згодныя супрацоўнічаць з шырокай кааліцыяй антыфашысцкіх дэмакратычных сіл. Важным рэсурсам камуністаў быў іх магутнейшы ўплыў у асяроддзі італьянскай творчай інтэлігенцыі. Членамі партыі, напрыклад, былі класікі італьянскага і сусветнага кіно Лукіна Вісконці, Віторыа дэ Сіка і Джузэпэ дэ Сантіс.

Важнае месца ў рабочым руху таксама належала **Італьянскай сацыялістычнай партыі пралетарскага адзінства (ІСППА)** – напрыканцы 1945 г. яна налічвала 700 тыс. членаў. У першыя пасляваенныя гады ІСППА выступала з праграмай блізкай да праграмы КПІ і ў кастрычніку 1946 г. рабочыя партыі заключылі пакт аб адзінстве дзеянняў, дзе падкрэслівалася неабходнасць нацыяналізацыі манаполій і правядзення аграрнай рэформы, аб заваяванні дэмакратычным шляхам большасці выбаршчыкаў і прыходзе да ўлады працоўных класаў.

У чэрвені 1945 г. прэм'ер-міністрам стаў буйны дзеяч Супраціўлення, лідар Партыі дзеяння Феруча Пары (чэрвень – снежань 1945 г.), у яго ўрад Нацыянальнага адзінства увайшлі прадстаўнікі асноўных палітычных сіл Італіі. Тым не менш, шырокая кааліцыя хутка сутыкнулася з праблемамі і ў снежні 1945 г. яе пакінулі лібералы, нязгодныя супрацоўнічаць з камуністамі. Новым прэм'ер-міністрам стаў лідар ХДП А. Дэ Гаспэры (1945 – 1953).

Адной з важнейшых палітычных праблем пасляваеннай Італіі з'яўлялася вызначэнне формы праўлення ў краіне. Некалі слаўная італьянская манархія і яе Савойская дынастыя, прывёўшая Італію да нацыянальнага адзінства, за гады фашысцкай дыктатуры згубілі свае прывабнасць і легітымнасць у вачах значнай часткі грамадства. Левыя партыі і нават частка хрысціянскіх дэмакратаў патрабавалі абвяшчэння рэспублікі.

Разумеючы хісткасць становішча італьянскай канстытуцыйнай манархіі, Віктар Эмануіл III у траўні 1946 г. выракся трону на карысць сына – Умбэрта II. Тым не менш, гэты запознены манеўр не прынёс чаканых палітычных дывідэндаў. 2 чэрвеня 1946 г. адбыўся рэферэндум аб форме дзяржаўнага праўлення. Усенароднае галасаванне адбылося пры высокай актыўнасці выбаршчыкаў (упершыню ў гісторыі краіны да выбарчых урнаў прыйшлі жанчыны) і прынеслі перамогу рэспубліканскім сілам: 12,7 млн. (54,3 %) італьянцаў прагаласавалі за рэспубліку і толькі 10,7 млн. (45,7 %) – за захаванне манархіі (яшчэ 1,5 млн. бюлетэняў былі прызнаныя несапраўднымі). Прычым перавагі італьянцаў размеркаваліся вельмі характэрным чынам: у паўночнай палове краіны падтрымалі рэспубліканскае дзяржаўнае ўладкаванне, а ў паўднёвай – манархічнае. Умбэрта, празваны «травеньскім каралём», выказаў нязгоду з вынікамі і назаўжды пакінуў радзіму. 18 чэрвеня 1946 г. Італія была афіцыйна абвешчана рэспублікай, а дзень 2 чэрвеня, калі праходзіў рэферэндум, стаў нацыянальным святам – Днём Рэспублікі.

Адначасова з рэферэндумам па прапарцыйнай сістэме праходзілі выбары ва Ўстаноўчы сход. Перамога на іх дасталася вядучым партыям КНВ. Хрысціянскія дэмакраты атрымалі 35 % галасоў выбаршчыкаў. Сацыялісты і камуністы здабылі адпаведна 21 % і 19 % галасоў. Ліберальная партыя, якая ўзначальвала Нацыянальна-дэмакратычны саюз, выступіла няўдала: разам з партнёрамі па блоку яна атрымала менш за 7 % (усяго ва Ўстаноўчы сход прабіліся прадстаўнікі 16 партый).

25 чэрвеня 1946 г. Устаноўчы сход пачаў сваю работу. Спачатку быў абраны часовы галава дзяржавы – ліберал Энрыка дэ Нікала. Па яго даручэнні А. Дэ Гаспэры сфарміраваў новы, таксама кааліцыйны, ўрад, у якім былі прадстаўленыя ХДП, ІСППА, КПІ ды Італьянская рэспубліканская партыя. Гэткая стракатая правячая групоўка даволі хутка стала сутыкацца з праблемамі ў практычнай дзейнасці. Камуністы, напрыклад, патрабавалі ўвесці ўрадавы кантроль над вытворчасцю і пераразмеркаваннем, надзвычайны падатак на маёмасныя класы, нацыяналізацыю цэлага шэрагу прамысловых манаполій і банкаў, увесці рабочы кантроль на прадпрыемствах і распачаць радыкальную аграрную рэформу на карысць бяднейшай часткі сялянства. Гэтая радыкальная праграма была адкінутая хрысціянскімі дэмакратамі, якія звязвалі аднаўленне нацыянальнай эканомікі з выкарыстаннем традыцыйных сродкаў і механізмаў і, перадусім, з амерыканскай фінансавай дапамогай.

Падчас візіту ў Вашынгтон (студзень 1947 г.) А. Дэ Гаспэры быў запэўнены амерыканскім бокам, што Італія можа разлічваць на заем на суму $100 млн. пры ўмове выдалення з ураду камуністаў і сацыялістаў. Практычна адначасова з гэтым адбыўся раскол у ІСППА: правыя сацыялісты на чале з Джузэпэ Сарагатам патрабавалі скасавання пакту з камуністамі аб адзінстве дзеянняў і застаўшыся ў меншасці выйшлі з партыі ўтварыўшы Сацыялістычную партыю італьянскіх працоўных (з 1952 г. – **Італьянская сацыял-дэмакратычная партыя, ІСДП**). Левыя сацыялісты абралі для сваёй партыі старую назву (насілі яе да 1943 г.) – **Італьянская сацыялістычная партыя (ІСП)**. Раскол у лагеры сацыялістаў стаў нагодай для ўрадавага крызісу. Аднак выдаліць з ураду камуністаў тады не атрымалася: ІСП прыгразіла выхадам з кааліцыі, а без яе А. Дэ Гаспэры губляў большасць ва Ўстаноўчым сходзе.

Але пасля абвяшчэння дактрыны Трумэна (5 сакавіка 1947 г.) лёс кааліцыі быў прадвызначаны. Хрысціянскія дэмакраты разгарнулі масіраваную антыкамуністычную кампанію і ў траўні 1947 г. дамагліся стварэння аднапартыйнага ўраду (пазней у яго ўвайшлі рэспубліканцы і сарагатаўцы).

Антыкамуністычная істэрыя супала з актывізацыяй італьянскай мафіі. Сіцылія практычна апынулася пад кантролем мафіёзных кланаў. Адзін з яе лідараў дон Джуліяна нават выношваў планы аб далучэнні вострава да ЗША у якасці яе 49-га штату (тады іх налічвалася толькі 48). Мафія разгарнула барацьбу супраць «камунізму і бальшавізму», адкрыта выкарыстоўваючы зброю. У адным з сіцылійскіх мястэчак была расстраляная першамайская дэманстрацыя. Гэтак Італія ізноў сутыкнулася з мафіяй, здавалася б канчаткова пераможанай рэжымам Б. Мусаліні. Гэтая праблема ў наступныя дзесяцігоддзі (да пачатку 1990-х гг.) будзе заставацца адным з найбольш сур'ёзных выклікаў дэмакратыі і законнасці ў Італьянскай Рэспубліцы.

Тым часам, у гэтых складаных умовах ва Ўстаноўчым сходзе працягвалася работа над распрацоўкай канстытуцыі. 22 снежня 1947 г. канстытуцыя Італіі была ўхваленая. З 1 студзеня 1948 г. яна набыла моц, а часовы галава дзяржавы Э. Дэ Нікала стаў першым прэзідэнтам Італьянскай Рэспублікі.

**Італьянская Канстытуцыя 1947 г.** стала адной з самых дэмакратычных канстытуцый свету. У Італіі забаранялася аднаўленне ў якой заўгодна форме распушчанай фашысцкай партыі. Скасоўваліся шляхецкія тытулы, членам і нашчадкам Савойскай дынастыі забаранялася знаходжанне на тэрыторыі краіны, а іх уласнасць пераходзіла да дзяржавы. Італія абвяшчалася дэмакратычнай рэспублікай, заснаванай на працы. За ўсімі грамадзянамі прызнавалася права на працу і заахвочванне «ўмоў, якія робяць гэтае права рэальным». Канстытуцыя гарантавала дэмакратычныя правы і свабоды.

Канстытуцыя ўсталёўвала два віды ўласнасці – дзяржаўную і прыватную, прычым апошняя магла быць адчужаная ў грамадскіх інтарэсах за спра-

вядлівае ўзнагароджанне. Таксама прадугледжвалася ўсталяванне максімальных памераў зямельнай уласнасці.

Усталёўвалася парламенцкая рэспубліка. Парламент складаецца з Палаты дэпутатаў і Сената рэспублікі, якія маюць роўныя заканадаўчыя функцыі і абіраюцца ўсеагульным прамым галасаваннем на 5-гадовы тэрмін на базе прапарцыйнага прынцыпу (з 1994 па 2006 гг. дзейнічала змешаная выбарчая сістэма з перавагай мажарытарнага прынцыпу). Галава дзяржавы – прэзідэнт набываў дастаткова шырокія паўнамоцтвы (распускае парламент, прызначае рэферэндум, з'яўляецца галоўнакамандуючым і г. д.), аднак бясспрэчна першай асобай ў новай палітычнай сістэме Італіі стане віўся прэм'ер-міністр – Старшыня ўраду.

Вялікае значэнне для краіны з устойлівымі каталіцкімі традыцыямі мела ўрэгуляванне пытання ўзаемаадносін паміж касцёлам і дзяржавай. Асноўныя палітычныя сілы Італіі здолелі дасягнуць няпростага кампрамісу. Было вырашана, што адносіны паміж дзяржавай і касцёлам будуць паранейшаму вызначацца на базе Латэранскіх пагадненняў 1929 г. Гэта азначала, што рымска-каталіцкі касцёл захоўваў уплыў на сферу сямейнага заканадаўства і школьнай адукацыі.

Таксама Канстытуцыя 1947 г. усталявала адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел Італіі на 20 абласцей. Традыцыйна вылучаюцца 8 паўночных (Вале д'Аоста, П'емонт, Лігурыя, Ламбардыя, Эмілія-Раманья, Венета, Трэнціна-Альта-Адзіджэ, Фрыулі-Венецыя-Джулія), 4 цэнтральных (Таскана, Марке, Умбрыя, Лацыа,) і 8 паўднёва-астраўных (Абруцца, Малізэ, Кампанія, Апулія, Базіліката, Калабрыя, Сіцылія, Сардзінія) абласцей.

18 красавіка 1948 г. адбыліся парламенцкія выбары. Градус палітычнага напружання быў скрайне высокім. Незадоўга да італьянскіх выбараў фактычна ў выніку дзяржаўнага перавароту да ўлады ў Чэхаславакіі прыйшлі камуністы. Многія ў Італіі і за яе межамі баяліся, што тут камуністы ды іх саюзнікі могуць прыйсці да ўлады электаральным шляхам і потым уцягнуць краіну ў сферу савецкага ўплыву. Не дзіва, што адным з найбольш шчодрых фундатараў ХДП выступіла Цэнтральнае Разведвальнае Ўпраўленне (ЦРУ) Злучаных Штатаў.

У выніку хрысціянскія дэмакраты заваявалі ўпэўненую перамогу на выбарах у абедзве палаты (48 %). Іх галоўны канкурэнт – Народна-дэмакратычны фронт у складзе КПІ ды ІСП – задаволіліся толькі 31 % галасоў і, адпаведна, дэпутацкіх мандатаў (колькасць прадстаўленых у Палаце дэпутатаў партый скарацілася да 10). Гэты зыход дазволіў А. Дэ Гаспэры застацца на чале ўраду. Была сфарміраваная цэнтрысцкая кааліцыя ў складзе ХДП, лібералаў, рэспубліканцаў і сацыял-дэмакратаў Дж. Сарагата.

Поспех на выбарах антыкамуністычных сіл адкрыў для краіны магчымасць запрасіць амерыканскай фінансавай дапамогі. У чэрвені 1948 г. было

падпісана італа-амерыканскае пагадненне аб дапамозе Італіі ў рамках плану Маршала тэрмінам на 2 гады. Агульны аб'ём паставак Злучаных Штатаў (прадукты харчавання і прамысловае абсталяванне) склаў $1,5 млрд.

### Італія ў 1950 – 1960-я гг. Перадумовы хуткага эканамічнага развіцця. Дыспрапорцыі ў эканоміцы. Сацыяльна-палітычныя наступствы «эканамічнага дзіва». Палітычная барацьба. Палітыка ХДП і лева-цэнтрысцкіх урадаў у 1950 – 1960-я гг. Неафашызм. Ліпеньскія падзеі 1960 г. Становішча ў рабочым руху. Антыфашысцкі, студэнцкі рухі. Знешняя палітыка Італіі ў 1945 – 1960-я гг. Заключэнне Італіяй мірнага дагавору

У першыя пасляваенныя дзесяцігоддзі італьянская эканоміка перажывала моцны ўздым. Асабліва хуткімі тэмпамі яна развівалася ў 1950-х – пачатку 1960-х гг. падчас г. зв. **«італьянскага эканамічнага дзіва»** (італ. *il boom*). За 1950-я гг. аб'ём прамысловай прадукцыі ўзрос на 87 % і ў 2,5 разы перавысіў даваенны ўзровень. З 1959 г. італьянская прамысловасць уступіла ў паласу буму. Тэмпы прыросту прамысловай прадукцыі ў 1959 – 1962 гг. дасягнулі 14 % у год! Высокія тэмпы росту эканомікі ў 1950 – 1960-х гг. прывялі да павелічэння нацыянальнага даходу Італіі амаль удвая. За гэты час склалася мадэль паскоранага «даганяючага» развіцця, характэрная для краін Паўднёвай Еўропы. Пры гэтым «італьянскі варыянт» аказаўся сутнасна бліжэйшым да развітых краін Захаду, чым іншыя дзяржавы паўднёваеўрапейскай перыферыі. У выніку Італія пераўтварылася ў індустрыяльную дзяржаву і ўвайшла ў сямёрку буйнейшых эканомік свету.

Эканамічнаму ўздыму Італіі спрыяў цэлы шэраг фактараў: удзел у рэалізацыі плану Маршала; рост попыту на сталь падчас Карэйскай вайны (1950 – 1953); да 1950-х гг. у краіне ў цэлым скончылася мадэрнізацыя прамысловасці; распрацоўка адкрытых у краіне радовішчаў нафты, метану і гідракарбанатаў; прыток долараў у сувязі з развіццём масавага турызму; уступленне Італіі ў «Агульны рынак». Акрамя таго важнай перадумовай італьянскага «эканамічнага дзіва» аказалася актыўнае і, галоўнае, эфектыўнае ўмяшанне дзяржавы ў эканоміку. Захаваўся і працягваў адыгрываць важную ролю ў крэдытаванні прамысловасці створаны яшчэ пры фашыстах дзяржаўны **Інстытут прамысловай рэканструкцыі (IPI)**. З адкрыццём у Італіі запасаў нафты была створана дзяржаўная кампанія ЭНІ (італ. *Ente Nazionale Indrocarburi, ENI*; Нацыянальнае вуглевадароднае агенцтва), якая цалкам узяла ў свае рукі новую галіну італьянскай прамысловасці – нафтахімічную. Немалаважнае значэнне меў вялікі лішак працоўнай сілы ў Італіі і, значыць, магчымасць утрымання на нізкім узроўні заробкаў, скарачэнне выдаткаў вытворчасці і г. д.

Асабліва хуткімі тэмпамі развіваліся металургія, хімічная і аўтамабільная галіны прамысловасці. Паказальным быў поспех італьянскага аўтапрамы-

словасці. У 1957 – 1960 гг. вытворчасць аўтамабіляў вырасла на 89 %. Прычым галіновы лідар канцэрн ФІАТ (*Fabbrica Italiana Automobili Torino*) здолеў атрымаць на свае развіццёвыя патрэбы 35 % усіх італьянскіх крэдытаў па плану Маршала.

Эканамічныя перамены выклікалі значныя палітычныя і сацыяльныя зрухі, змяніліся спажывецкія стандарты, жыццёвы ўклад і нават мысленне італьянцаў. Пры гэтым цана «эканамічнага дзіва» азначала нераўнамернасць і цыклічнасць эканамічнага развіцця, залежнасць ад замежных капіталаўкладанняў і імпартных тэхналогій, адставанне сельскай гаспадаркі. Напрыклад, яно моцна паскорыла ўнутраныя міграцыйныя працэсы. Усяго на працягу 1950 – 1960-х гг. вёскі пакінула 1,8 млн. чалавек. Галоўным чынам з аграрна перанаселенага Поўдню італьянцы перабіраліся на больш развітую індустрыяльную Поўнач. Аднак часам урбанізацыя набывала ўсе рысы «несапраўднай урбанізацыі», калі імклівы рост колькасці гарадскога насельніцтва не суправаджаўся дастатковым ростам колькасці працоўных месцаў, а былое сельскае насельніцтва проста папаўняла армію беспрацоўных, і паўночнаітальянскія гарады абрасталі мноствам занядбалых трушчобных прадмесцяў.

Асабліва сур'ёзнай заставалася праблема Поўдню. 6 паўднёвых і 2 астраўных абласцей напачатку 1950-х гг. займалі 43 % тэрыторыі Італіі, там пражывала каля 1/3 насельніцтва краіны. Пры гэтым доля рэгіёну ў прамысловасці складала толькі 15 %. Нашмат больш нізкай на Поўдні была прадукцыйнасць працы, а беспрацоўе – удвая вышэйшым. У выніку рэгіён з'яўляўся шчыра датацыйным: ён атрымліваў у два разы больш сродкаў, чым даваў бюджэту. Аднак ні стварэнне ў 1950 г. Ка́сы Поўдню – дзяржаўнага фонду спецыяльнага доўгачасовага фінансавання адсталых раёнаў, ні многія іншыя ўрадавыя мерапрыемствы не здолелі карэнным чынам выправіць рэгіянальныя дыспрапорцыі сацыяльна-эканамічнага развіцця.

Няўпэўненае выступленне ХДП (партыя страціла каля 4 млн. галасоў) і поспех левых партый на муніцыпальных выбарах у 1951 і 1952 гг. выклікалі небеспадстаўную трывогу ў хрысціянскіх дэмакратаў за зыход будучых парламенцкіх выбараў. Восенню 1952 г. імі быў прадстаўлены распрацаваны міністрам унутраных спраў Марыа Шэльбам законапраект, згодна якому партыя або выбарчы блок, што набралі абсалютную большасць галасоў выбаршчыкаў (50 % + 1 голас), атрымлівалі 2/3 парламенцкіх месцаў.

Не толькі апазіцыя, але нават і некаторыя саюзнікі хрысціянскіх дэмакратаў расцанілі гэты законапраект як замах на італьянскую дэмакратыю і назвалі яго «махлярскім законам». Аўтар сумна вядомага фашысцкага выбарчага закону 1923 г. Дж. Ачэрба даў да яго наступны каментарый: «*Грамадскі абвінаваўца Вярхоўнага суда (хрысціянскі дэмакрат) сцвярджаў, што мой закон 1923 г. прывёў да разбурэння найбольш свяшчэнных заваёваў Рысар-*

*джымента, і гэтым матываваў патрабаванне вынесці мне смяротны прысуд... Але вось хрысціянскія дэмакраты зрабілі закон, што з'яўляецца дакладнай копіяй закону Ачэрба – і ён абмяркоўваецца зараз у парламенце».*

Адчайная кампанія апазіцыі прынесла поспех: урадавая кааліцыя на чале з ХДП (сацыял-дэмакраты, лібералы, рэспубліканцы і яшчэ дзве больш дробныя партыі) набралі толькі 49,9 % (хрысціянскія дэмакраты – толькі 40,1 %) і не дацягнула да планкі, якая ім гарантавала 2/3 месцаў. КПІ ды ІСП набралі адпаведна 22,6 % і 12,7 %. Правал планаў ХДП тлумачыўся не столькі выдатнымі вынікамі дзвюх вядучых рабочых партый, здолеўшых мабілізаваць левы пратэстны электарат, але таксама паспяховым выступленнем неафашыстаў з ІСР, якія здолелі адабраць нямала галасоў у ХДП на аграрным Поўдні і набралі каля 6 %.

У выніку месцы ў дзвюх палатах парламента былі размеркаваныя старым прапарцыйным спосабам. ХДП паспрабавала стварыць аднапартыйны ўрад меншасці і кіраваць з разлікам на падтрымку разнародных парламенцкіх сіл. Тым не менш, хутка стала відавочнай эфемернасць гэтых разлікаў і ў жніўні А. Дэ Гаспэры падаў у адстаўку.

З зыходам з вялікай палітыкі бацькі-заснавальніка ХДП ў гэтай партыі ўзмацняецца барацьба за ўплыў паміж яе трыма плынямі – правымі (гаспэрыстамі), левымі (падтрымлівалі ідэю шчыльнага супрацоўніцтва з сацыялістамі) і цэнтрыстамі (выступалі са стварэнне шырокай цэнтрысцкай кааліцыі).

Наступнае пяцігоддзе (1953 – 1958) прайшло пры перавазе цэнтрыстаў і пад знакам урадавай нестабільнасці – змянілася пяць прэм'ер-міністраў (яшчэ пяць узначальвалі ўрад у наступнае пяцігоддзе – з 1958 па 1963 гг.). Найбольш істотным зрухам стаў перагляд палітычнай арыентацыі ІСП. Яе кіраўніцтва на чале з П'етра Нэні пасля венгерскіх падзей 1956 г. разарвала супрацоўніцтва з камуністамі і, адмовіўшыся ад статусу апазіцыйнай партыі, узяло курс на ўдзел ва ўладзе.

Хрысціянскія дэмакраты, якія сутыкнуліся з праблемай стварэння трывалай урадавай большасці на базе цэнтрызму і былі зацікаўленыя ў пашырэнні сацыяльнай базы ўраду, пазітыўна ацэньвалі магчымасць ўзаемадзеяння з сацыялістамі. Тактыка «левага цэнтру» не выклікала прынцыповых пярэчанняў і з боку каталіцкага касцёлу. У энцыкліцы новаабранага папы рымскага Яна XXIII *Pacem in terris* («Мір на зямлі», 1958) як раз змяшчаліся заклікі да міру і супрацоўніцтва розных палітычных плыняў.

Парламенцкія выбары 1958 г. прайшлі па традыцыйнай прапарцыйнай сістэме і прынеслі партыям-удзельніцам практычна тыя ж самыя вынікі. Спачатку быў сфарміраваны кааліцыйны ўрад ХДП-ІСДП на чале з Амінторэ Фанфані (1958 – 1959). У 1959 – 1960 гг. дзейнічалі два правацэнтрыскія ўрады на чале з хрысціянскімі дэмакратамі.

Апошні правацэнтрысцкі ўрад на чале з Фернанда Тамброні быў створаны пры падтрымцы ІСР. Апірышча на неафашыстаў уваходзіла ў супярэчнасць з адным з самых базавых прынцыпаў Італьянскай Рэспублікі – г. зв. тэорыяй «канстытуцыйнага скляпення» (*Arco Costituzionale*). Паводле яе аніводная ўрадавая або кааліцыйная партыя, якая галасавала ў падтрымку Канстытуцыі 1947 г., не павінна была мець аніякіх адносінаў з неафашысцкімі або манархічнымі сіламі, што разглядаліся як антыканстытуцыйныя. Незадавальненне «правай» палітыкай ураду нарастала. Пасля таго, як напрыканцы чэрвеня 1960 г. Італьянскі сацыяльны рух паспрабаваў правесці свой санкцыяваны ўладамі з'езд у Генуі, горадзе, узнагароджаным Залатым медалём Супраціўлення, пачаліся антыфашысцкія акцыі.

У ліпені 1960 г. масавы антыфашысцкі рух, які часам набываў яўны антыўрадавы характар (урад Ф Тамброні вінавацілі ў сімпатыях да неафашыстаў), ахапіў усю краіну. У дэманстрацыях, мітынгах стачках ўзялі ўдзел каля 2,5 млн. чалавек. У сутычках антыфашыстаў з сіламі аховы правапарадку (выкарыстоўвалася матарызаваная паліцыя і нават танкі) сотні чалавек з абодвух бакоў былі параненыя, не абышлося без чалавечых ахвяр. Урад быў вымушаны адправіцца ў адстаўку.

У 1962 г. з'езд ХДП афіцыйна зацвердзіў тактыку «левага цэнтру». Неўзабаве пасля парламенцкіх выбараў 1963 г. (ХДП – 38,3 %, КПІ – 25,3 %) быў створаны першы левацэнтрысцкі ўрад на чале з новым папулярным лідарам хрысціянскіх дэмакратаў Альда Мора (1963 – 1968). Дзейнасць гэтага ўраду, больш устойлівага за папярэднія, аказалася даволі плённай. Была абноўленая сістэма дзяржаўнага рэгулявання эканомікі. Рэформа сістэмы адукацыі распаўсюджвала канстытуцыйны прынцып аб бясплатным і абавязковым навучанні на вучняў няпоўнай сярэдняй школы ва ўзросце да 14 гадоў. Значнымі аказаліся заваёвы рабочых: былі падвышаныя заробкі, ліквідаваліся занальныя адрозненні ў аплаце працы, уводзіўся 40-гадзінны працоўны тыдзень у прамысловасці, паляпшалася пенсійнае забеспячэнне. Тым не менш запавольванне тэмпаў сацыяльна-эканамічнага развіцця і нарастанне крызісных з'яў у грамадска-палітычным жыцці напрыканцы 1960-х гг. моцна абмяжоўвалі эфектыўнасць палітыкі левага цэнтру.

Скарачэнне занятасці і бесперапынны рост кошту жыцця з другой паловы 1960-х гг. выклікалі ўздым сацыяльнага пратэсту. Асаблівасцю новага этапу забастовачнай барацьбы стаў яе масавы характар і ўцягванне ў барацьбу новых слаёў – студэнтаў, служачых, чыноўнікаў, настаўнікаў, урачоў, пенсіянераў, якія раней займалі пасіўную пазіцыю. Забастовачная барацьба італьянцаў за паляпшэнне ўмоў працы і жыцця была больш інтэнсіўнай і маштабнай, чым у другіх краінах капіталістычнага свету.

У 1968 г. адбыўся бурны ўсплёск студэнцкай барацьбы не толькі за рэформу вышэйшай школы, але і пад антыкапіталістычнымі лозунгамі. Вясной 1968 г. хваляванні ахапілі ўсе 36 універсітэтаў Італіі. Студэнтаў падтрымалі прафсаюзы і камуністычная партыя. У 1968 і 1969 гг. адбыліся дзве буйнейшыя агульнанацыянальныя забастоўкі за правядзенне пенсійнай рэформы і вырашэнне жыллёвай праблемы. Урад быў вымушаны пайсці на саступкі і вылучыў значныя сродкі на будаўніцтва «народных кватэр». «Спякотнай восенню» 1969 г. выступаючы за больш выгодныя ўмовы калектыўных дагавораў баставалі некалькі мільёнаў чалавек. У выніку ў 1970 г. быў прыняты Статут правоў працоўных, які замацаваў становішча прафсаюзаў на прадпрыемствах і абмежаваў магчымасць прадпрымальнікаў на звальненне рабочых. Дасягненні забастовачнай барацьбы выклікалі рост шэрагаў прафсаюзаў і павелічэнне іх уплыву. З 1969 г. пастаяннай становіцца практыка сустрэч і перамоў паміж прафсаюзамі і ўрадам.

Важнейшай падзеяй у галіне знешняй палітыкі першых пасляваенных гадоў стала заключэнне мірнага дагавору. Умовы перамір'я, падпісаныя пры капітуляцыі Італіі, давалі магчымасць амерыкана-брытанскім прадстаўнікам умешвацца ва ўнутраныя справы краіны. 10 лютага 1947 г. быў падпісаны **Парыжскі мірны дагавор**. Сухапутныя межы Італіі вызначаліся збольшага ў адпаведнасці з існаваўшымі на 1 студзеня 1938 г. Італія адмаўлялася ад прэтэнзій на калоніі ў Афрыцы (Лівія, Эрытрэя, Італьянскае Самалі), прызнавала суверэнітэт Албаніі і Эфіопіі і вяртала Грэцыі Дадэканезскія астравы. Горад Трыест з акругай быў вылучаны ў асобную тэрыторыю, губернатар якой прызначаўся ААН (у далейшым г. зв. «вольная тэрыторыя Трыест» была падзеленая паміж Італіяй і Югаславіяй. Трыест з 1954 г. адышоў да Італіі). Дагавор вызначаў абмежаванні для ўзброеных сіл краіны і вызначаў, што яна павінна выплаціць рэпарацыі СССР, Югаславіі, Грэцыі і Албаніі – краінам, тэрыторыі якіх пацярпелі ад італьянскай фашысцкай агрэсіі. У верасні 1947 г. Парыжскі дагавор быў ратыфікаваны Ўстаноўчым сходам Італіі і набыў моц. А праз тры месяцы, як тое і прадугледжвалася тэкстам пагаднення, яе тэрыторыя была вызваленая ад акупацыйных войск.

Праамерыканскі знешнепалітычны курс А. Дэ Гаспэры знайшоў свой далейшы працяг у далучэнні Італіі 4 красавіка 1949 г. да блоку НАТО – яна стала адным з сузаснавальнікаў паўночнаатлантычнага альянсу. Гэтае рашэнне выклікала актыўны пратэст з боку значнай часткі італьянскага грамадства. Пад народнай петыцыяй з патрабаваннем адмовы ад удзеле ў НАТО было сабрана 8 млн. подпісаў. Тым не менш, у ліпені 1949 г. абедзве палаты італьянскага парламенту прагаласавалі «за» ўдзел у Паўночнаатлантычным пакце, і ўступленне Італіі ў гэты блок было ратыфікаванае. Неўзабаве ўрад даў дазвол на

будаўніцтва амерыканскіх вайсковых баз і размяшчэнне саюзніцкіх штабоў на тэрыторыі краіны. У партах Неапаля, Ліворна і некаторых іншых гарадоў размясціліся караблі 6-га амерыканскага флоту.

Італія і яе першы пасляваенны лідар А. Дэ Гаспэры адыгралі значную ролю на пачатковым этапе еўрапейскай інтэграцыі. Італія была ў ліку 6 краін, якія ў 1951 г. падпісалі пагадненне аб стварэнні ЕАВС, а ў 1952 г. – дагавор аб Еўрапейскай абарончай супольнасці. Бясспрэчным сведчаннем узрастальнага аўтарытэту краіны стала тое, што менавіта ў італьянскай сталіцы ў 1957 г. адбылася цырымонія падпісання дакументаў, якія заклалі аснову для Еўрапейскай Эканамічнай Супольнасці.

Ужо з 1955 г. адбываецца прыкметнае паляпшэнне адносін паміж Італіяй і сацыялістычнымі краінамі, у тым ліку з СССР. У 1960-я гг. гэтая тэндэнцыя атрымала далейшае развіццё. Значным поспехам з’явілася італьянска-савецкае міжурадавае пагадненне 1967 г. аб эканамічным і навукова-тэхнічным супрацоўніцтве. Пры ўдзеле непасрэдным удзеле італьянскай фірмы ФІАТ у Савецкім Саюзе ажыццяўлялася будаўніцтва Волжскага аўтамабільнага заводу (ВАЗ) у горадзе Тальяці, названым так у гонар лідара італьянскіх камуністаў. Італія становіцца адным з важнейшых гандлёва-эканамічных партнёраў СССР.

### Запавольванне тэмпаў эканамічнага росту ў 1970 – 1980-я гг. Эканамічныя крызісы 1974 – 1975 і 1980 – 1983 гг. Абвастрэнне сацыяльнага становішча. Палітычная барацьба ў 1970 – 1980-я гг. Выбары 1976 г. Палітыка ўрада Дж. Андрэоці. ІКП у 1970 – 1980-я гг., пошукі новага курсу. Ажыўленне левага і правага экстрэмізму. Крызіс улады на мяжы 1970 – 1980-х гг. Актывізацыя мафіі. Карупцыйныя скандалы. Знешняя палітыка Італіі ў 1970 – 1980-я гг. Італія і міжнародная разрадка. Адносіны з краінамі ЕЭС і СССР

Ужо ў сярэдзіне 1960-х гг. італьянская эканоміка ўпершыню ў пасляваенны перыяд сутыкнулася з крызіснымі з’явамі. Напачатку 1970-х гг. тэмпы эканамічнага росту запаволіліся, але на агульнаеўрапейскім фоне яшчэ выглядалі нядрэнна. «Нафтавы шок» 1973 г. негатыўна адбіўся на італьянскай вытворчасці і фінансах і ў 1974 – 1975 гг. Італія апынулася ва ўладзе сусветнага эканамічнага крызісу. Цяжкасці былі звязаныя не толькі з агульнымі вонкавымі ўмовамі (найперш, з ростам сусветных коштаў на паліва і сыравіну), але таксама з абвастрэннем праблем структуры і механізмаў узнаўлення і з новай сацыяльна-эканамічнай абстаноўкай (павелічэннем уплыву прафсаюзаў, ростам заробкаў рабочых і г. д.).

Дастаткова значная глыбіня крызісу 1974 – 1975 гг. (падзенне прамысловай вытворчасці склала 14 %) і захаванне пэўнага патэнцыялу экстэнсіўнага развіцця эканомікі абумовілі скрайне павольнае абнаўленне гаспадарчых механізмаў італьянскай эканомікі. Прыход новага цыклічнага крызісу

1980 – 1983 гг. запатрабаваў ад італьянскіх улад больш рашучых дзеянняў. Важным накірункам палітыкі італьянскага ўраду стала «жорсткая эканомія»: улады фактычна адмовіліся ад пільнавання падвышэння заробкаў адносна росту кошту жыцця, пачалі скарачэнне бюджэтных выдаткаў. Асабліва вострa паўстала пытанне будучыні дзяржаўнага сектару, у якім, напрыклад, у той час было засяроджана звыш 3/4 здабываючай прамысловасці, 70 % суднабудаўнічай прамысловасці, 2/3 электрамеханічнай галіны, амаль уся інфраструктура краіны. У адрозненні ад тэтчарысцкага варыянту антыкрызісных мерапрыемстваў італьянскі ўрад абмежаваўся толькі кропкавай прыватызацыяй і ліквідацыяй стратных дзяржаўных прадпрыемстваў. Што датычыцца стратэгічных для гаспадарчага арганізму краіны галінах, што ўваходзілі ў дзяржсектар, то там прадугледжвалася правядзенне тэхналагічнай рэканструкцыі і ўзмацненне навукаёмістых вытворчасцяў. Гэткім чынам і надалей дзяржаўны сектар захоўваў высокую ўдзельную вагу і лідарскія пазіцыі ў італьянскай эканоміцы.

Адносная памяркоўнасць антыкрызісных мерапрыемстваў у Італіі была ў значнай ступені звязаная з актыўнасцю рабочага руху і левых сіл, якія стаялі за ім. Напрыклад, у 1980 – 1982 гг. у Італіі ў забастоўках бралі ўдзел 42 млн. чалавек, г. зн. удвая больш, чым у ЗША, Вялікабрытаніі, Францыі, ФРГ і Японіі разам узятых! Тым не менш, на фоне значнага паляпшэння сусветнай кан'юнктуры ў сярэдзіне 1980-х гг. праведзеных пераўтварэнняў хапіла для таго, каб ў 1987 г. здзейсніць г. зв. «абгон» (італ. *il Sorpasso*) – апярэдзіць Вялікабрытанію і выйсці на 6-е месца ў свеце па аб'ёме ВНП (саступалі ЗША, СССР, Японіі, ФРГ і Францыі). Тады ж Італія здолела абыйсці Францыю па вытворчасці прамысловай прадукцыі. Асаблівасцю італьянскай эканомікі была адносная нешматлікасць буйных кампаній і параўнальна нязначная прысутнасць транснацыянальных карпарацый – па-ранейшаму істотна пераважалі дробныя і сярэднія кампаніі. На мяжы 1980-х – 1990-х гг. Італія становіцца развітай індустрыяльнай дзяржавай.

Як і ў іншых краінах Захаду, у 1970 – 1980-х гг. у Італіі актыўна адбывалася фарміраванне эканомікі постіндустрыяльнага грамадства. У шырокіх маштабах адбывалася абнаўленне тэхнічнай базы і тэхналогіі прамысловай вытворчасці: укараняліся камп'ютарныя сістэмы кіравання, выкарыстанне робатаў, абсталявання на базе мікраэлектронікі і г. д. У першую чаргу гэты працэс ахапіў Цэнтр і Паўночны Ўсход, якія раней саступалі самаму перадавому Паўночнаму Захаду. Хуткімі тэмпамі развівалася сфера паслуг. Значная доля дзяржаўнага бюджэту Італіі фарміравалася за кошт турыстычнай галіны. Напачатку 1980-х гг. краіну наведвала каля 30 млн. замежных турыстаў штогод і да канца дзесяцігоддзя гэтая лічба пастаянна расла. Дастаткова хуткімі тэмпамі ішло паляпшэнне ўзроўню жыцця італьянцаў, аднак, як і раней, назіраліся значныя рэгіянальныя дыс-

прапорцыі. Напрыклад, на 1986 г. аб'ём ВУП на душу насельніцтва ў Ламбардыі (цэнтр – г. Мілан) складаў каля 140 пунктаў, а Эміліі-Раманьі (Балонья) – амаль 125 (сярэдні паказчык па ЕЭС ўзяты за 100), а ў Кампаньі (Неапаль), Калабрыі і Базілікаце – толькі 60.

Палітычная барацьба ў Італіі станавілася даволі прадказальнай. На парламенцкіх выбарах 1972 г. хрысціянскія дэмакраты ў чарговы раз атрымалі перамогу (38 %), а другое і трэцяе месца занялі камуністы (27 %) і сацыялісты (10 %). Вельмі падобныя вынікі прынеслі і папярэднія выбары – у 1968 г. Найбольш важным зрухам стаў поспех партыі **Італьянскі сацыяльны рух-Нацыянальныя правыя сілы** (**ІСР-НПС**; новая назва неафашысцкай партыі), якая набрала звыш 9 % галасоў (амаль удвая болей,чым у 1968 г.). Аднак у 1974 г. па падазрэнні ў падрыхтоўцы дзяржаўнага перавароту былі распачатыя судовыя справы супраць шэрагу дзеячаў ІСР-НПС і звязаных з імі высокапастаўленых генералаў. Ужо на муніцыпальных выбарах 1975 г. неафашысты страцілі значную частку сваёй падтрымкі.

Падзенне асноўных эканамічных паказчыкаў, а потым і наступленне эканамічнага крызісу, натуральна, высоўвалі на пярэдні план палітычных дыскусій праблемы фінансавага аздараўлення і барацьбы з беспрацоўем. Аднак у першай палове 1970-х гг. на некаторы час паўстала яшчэ адно вастрэйшае пытанне. У 1974 г. набыў моц закон аб разводзе (італьянцы нарэшце атрымалі гэтае права). Градус канфрантацыі аказаўся настолькі высокім, што моцна нагадваў сітуацыю вакол пасляваеннага рэферэндуму адносна формы праўлення. Рэакцыйныя і кансерватыўныя сілы рашуча выступілі супраць гэтага новаўвядзення: Ватыкан, хрысціянскія дэмакраты і неафашысты дамагліся правядзення рэферэндуму па пытанні скасавання закону. Аднак 12 траўня 1974 г. большасць італьянцаў (59 %) выказалася за захаванне права на развод.

На фоне актывізацыі экстрэмісцкіх і рэакцыйных сіл, а таксама сусветнага эканамічнага крызісу актывізуюцца абнаўленчыя сілы ў ІКП. У сакавіку 1975 г. на XIV з'ездзе партыі па прапанове генеральнага сакратара ІКП Энрыка Брелінгуэра была ўхвалена ідэя **«гістарычнага кампрамісу»**, якая азначала прынцыповую магчымасць супрацоўніцтва не толькі з сацыялістамі, але і з хрысціянскімі дэмакратамі. Ужо на абласных і правінцыйных выбарах 1975 г. камуністы паказалі небывалы вынік: за іх прагаласавала без малога трэць выбаршчыкаў краіны. Камуністы перамаглі ў Рыме, Мілане, Турыне, Фларэнцыі і шэрагу іншых важнейшых гарадоў.

Ва ўмовах далейшай секулярызацыі грамадства, паслаблення ідэалагічнага супрацьстаяння і росквіту эпохі разрадкі міжнароднай напружанасці 1970-х гг. падтрымка хрысціянскіх дэмакратаў, наадварот, працягвала падаць. У гэтых новых абставінах паспяховы вопыт супрацоўніцтва ХДП з памяркоўнымі рабочымі партыямі і пераход ІКП на пазіцыі «еўракамунізму» ставілі

пытанне аб мэтазгоднасці адмовы ад маральна і практычна састарэлай тактыкі *pacta ab excludendum* (лат. «пакт аб выключэнні»), г. зн. кансенсусу шырокага спектру палітычных сіл Італіі адносна ізаляцыі камуністаў і магчымасці стварэння кааліцыйнага ўраду з іх удзелам.

Вынікі парламенцкіх выбараў 1976 г. сталі яшчэ адным довадам на карысць неабходнасці ўтварэння шырокай урадавай кааліцыі. На выбарах у Палату дэпутатаў ІКП атрымала 34,4 % галасоў. Упершыню за ўвесь пасляваенны перыяд камуністы і сацыялісты атрымалі большую падтрымку італьянцаў, чым хрысціянскія дэмакраты (38,8 %). Стала зразумела, што стварыць урад, які б не абапіраўся на падтрымку ІКП будзе вельмі праблематычна.

У выніку, быў створаны аднапартыйны ўрад ХДП на чале з Джуліа Андрэоці (1976 – 1979). Тым не менш хрысціянскія дэмакраты праводзілі палітыку **«нацыянальнай салідарнасці»**, г. зн. улічвалі патрабаванні парламенцкай большасці. У 1977 г. шэсць партый, у тым ліку і ІКП, падпісалі з урадам Дж. Андрэоці праграмнае пагадненне аб захадах па стабілізацыі эканомікі, барацьбе з тэрарызмам ды іншых самых надзённых праблемах краіны. Падобнае супрацоўніцтва дазволіла даволі паспяхова зладзіць з наступствамі сусветнага крызісу 1974 – 1975 гг. і ажыццявіць шэраг важных рэформ.

Нечаканы альянс хрысціянскіх дэмакратаў і левых быў неадназначна сустрэты грамадствам, і шчыра варожа – права- і леварадыкальнымі групоўкамі. У сакавіку 1978 г. быў выкрадзены левымі экстрэмістамі і потым забіты адзін з гарачых прыхільнікаў палітыкі «нацыянальнай салідарнасці» старшыня ХДС А. Мора. Рост гвалту і бесперапынныя палітычныя скандалы (гл. далей) прывялі да фактычнага краху курсу Дж. Адрэоці. У студзені 1979 г. камуністы перайшлі ў апазіцыю, што наблізіла правядзенне новых датэрміновых выбараў.

Парламенцкія выбары 1979 г. засведчылі пэўнае расчараванне вядучымі партыямі Італіі: ХДП страціла 0,4 %, а ІКП ажно 4 % галасоў. Камуністы адмовіліся ад тактыкі «гістарычнага кампрамісу» і прыняла новую формулу «дэмакратычнай альтэрнатывы», якая прадугледжвала стварэнне кааліцыі левых партый, здольнасць паспяхова канкурыраваць з хрысціянскімі дэмакратамі. Аднак, як паказала палітычнае жыццё, падобныя разлікі былі вельмі далёкімі ад рэчаіснасці. Гэта быў толькі пачатак заняпаду ІКП. Не самыя лепшыя часы перажывала і ХДП, хаця пасля выбараў 1979 г. яна па-ранейшаму ўзначальвала правячую кааліцыю. Пасля скандалу вакол масонскай ложы П-2 (гл. далей) складваецца вельмі характэрная для ўсіх 1980-х гг. **«пяціпартыйнасць»** (італ. *pentapartito*) у складзе хрысціянскіх дэмакратаў, сацыялістаў, сацыял-дэмакратаў, рэспубліканцаў і лібералаў.

Адноснае аслабленне хрысціянскіх дэмакратаў і камуністаў дазволіла упершыню выйсці з ценю Італьянскай сацыялістычнай партыі. Пад кіраўніцтвам новага лідара Беціна (Бенедэта) Краксі ІСП узяла курс на прыход да ўлады

і дамаглася поспеху на парламенцкіх выбарах 1983 г. Безумоўна, апярэдзіць ХДС (33 %) і ІКП (30 %) сацыялістам было нерэальна, але на фоне адчувальнага паражэння хрысціянскіх дэмакратаў (-5,5 %) нават набраныя імі 11 % галасоў выбаршчыкаў рабілі партыю асноўным партнёрам ХДП. Упершыню ў гісторыі Італіі прэм'ер-міністрам Італіі стаў сацыяліст – Б. Краксі (1983 – 1987).

Нягледзячы на прыналежнасць да левай партыі Б. Краксі абапіраўся на неаліберальныя рыначныя метады. Пачалася частковая нацыяналізацыя. Асобным накірункам эканамічнай палітыкі ўраду стала «жорсткая эканомія» – скарачаліся выдаткі на ахову здароўя, сацыяльнае забеспячэнне і народную асвету. Акрамя таго улады дамагліся абмежавання ўплыву каталіцкага касцёлу на школу і сямейнае заканадаўства. Важным дасягненнем ураду стаў пачатак больш энергічнай вайны супраць тэрарызму і мафіі: уводзіліся надзвычайныя захады, што пашыралі паўнамоцтвы паліцыі і судовых органаў (павальныя вобыскі, павелічэнне тэрмінаў папярэдняга зняволення ды інш.).

Нягледзячы на працяглы па італьянскіх мерках тэрмін знаходжання Б. Краксі на пасадзе прэм'ер-міністра, становішча яго ўраду нельга было назваць стабільным, галоўным чынам, з-за спрэчак хрысціянскіх-дэмакратаў і сацыялістаў. Пасля парламенцкіх выбараў 1987 г. амбіцыйны лідар сацыялістаў быў вымушаны саступіць высокую пасаду (у 1989 – 1991 гг. ён вяртае страчаны пост), хаця яго ІСП паказала найлепшы за ўсю пасляваенную гісторыю вынік – 14 % галасоў выбаршчыкаў. Выбары 1987 г. прадэманстравалі далейшае падзенне папулярнасці ІКП: яна набрала толькі 27 %. Не на шмат лепей выступіла і ХДП – 34 %. Затое ўпершыню праявілі сябе на нацыянальным узроўні італьянскія «зялёныя», якія сабралі амаль мільён галасоў італьянскіх выбаршчыкаў (2,5 %). Пяціпартыйны ўрад быў захаваны, аднак **«электаральная бура»** – рэзкая змена партыйных прыхільнасцяў італьянскіх выбаршчыкаў у 1980-я гг. з прычыны маштабных сацыяльна-эканамічных і светапоглядных зрухаў на стадыі пераходу краіны да постіндустрыяльнага грамадства – неўзабаве змяце гэтую палітычную канструкцыю, а потым напачатку 1990-х гг. і ўсю італьянскую пасляваенную партыйную сістэму, разам з сістэмаўтваральнымі партыямі – ХДС ды КПІ.

Поспехі забастовачнай барацьбы канца 1960-х гг., эканамічныя цяжкасці і рост беспрацоўя выклікалі актывізацыю правcovaрадыкальных сіл. Разгарнулі энергічную дзейнасць неафашысцкія арганізацыі і групоўкі. Значна павялічылася колькасць тэрарыстычных актаў з іх боку.

Мэтай «чорнага» тэрору стала стварэнне гэткай абстаноўкі ў краіне, пры якой быў бы магчымы дзяржаўны пераварот або, як мінімум, «навядзенне парадку» – г. зв. «курс напружанасці». На першых парах найбольш крывавымі вылазкамі неафашыстаў сталі выбух бомбы у 1969 г. у

будынку Сельскагаспадарчага банку ў Мілане на плошчы Фантана (16 чалавек забітых і каля 100 параненых) і выбух у цягніку каля Балонні ў 1974 г. (загінула 12 пасажыраў). У 1970 г. «Новы парадак», адна з баявых арганізацыяў неафашыстаў, пад кіраўніцтвам князя Ю. Баргезэ нават паспрабавала ажыццявіць дзяржаўны пераварот. Праўда, спроба захапіць міністэрства ўнутраных справаў скончылася фіяска.

На чале неафашысцкага руху заставалася ІСР/ІСР-НПС, колькасць членаў якой у першай палове 1970-х гг. узрасла да 400 тыс. чалавек. Сапраўднай масавай базай для партыі сталі жыхары бедных гарадскіх прадмесцяў, люмпен пралетарыят і, асабліва, маргінальныя слаі адсталага Поўдня. Партыя працягвала дастаткова паспяхова выступаць на выбарах ды імкнулася да стварэння рэспектабельнага іміджу («фашызм у двубортным пінжаку»).

Аднак з сярэдзіны 1970-х гг. «чорны» тэрор ультраправых стаў адыходзіць на другі план, саступаючы месца «чырвонаму» тэрору левых радыкалаў. Легальныя палітычныя структуры скрайне левых моцна саступалі ў папулярнасці арганізацыям скрайне правых. Ультралевы блок «Пралетарская дэмакратыя» атрымліваў на выбарах толькі парадку 1,5 %.

Па меры таго, як «пакаленне 1968 г. расчароўвалася ў сваіх утапічных планах пераўтварэння буржуазнага грамадства, частка левых актывістаў стала спаўзаць да тактыкі тэрору. Найбольш небяспечнымі леваэкстрэмісцкімі тэрарыстычнымі падпольнымі арганізацыямі сталі г. зв. **«чырвоныя брыгады»** (*Brigate Rosse*). Узніклі яны ў 1970 г. як непасрэдная рэакцыя на міланскі выбух на плошчы Фантана. Ідэалагічная база «чырвоных брыгад» вылучалася сваім эклектызмам: у яе праграме спалучаліся тэорыя марксізму-ленінізму, ідэі мааізму і культурнай рэвалюцыі, практыка гарадской герылы. Сваёй галоўнай мэтай яны лічылі стварэнне рэвалюцыйнай дзяржавы ў выніку ўзброенай барацьбы і разрыў з заходнімі дзяржавамі (у тым ліку выхад з блоку НАТО). Абсалютызацыя гвалту суправаджалася практычным і выкарыстаннем негвалтоўных метадаў – прапаганды, стварэння паўлегальных арганізацый на прадпрыемствах і ва ўніверсітэтах. Напрыканцы 1970-х гг. ахвярамі гэтых левых экстрэмістаў станавіліся палітыкі і суддзі, каталіцкія дзеячы, прадпрымальнікі і журналісты, паліцэйскія чыны. Найбольш гучным тэрарыстычным актам «чырвоных брыгад» (і ўсіх радыкальных тэрарыстычных груповак увогуле) стала выкраданне і забойства ў 1978 г. былога прэм’ер-міністра Альда Мора.

На мяжы 1970 – 1980-х гг. Італію захлынула новая хваля тэрарызму. Толькі за адзін 1980 г. адбылося каля 1200 тэрарыстычных актаў. Буйнейшы з іх – выбух на вакзале ў Балонні – пазбавіў жыцця 85 чалавек, а яшчэ звыш 200 былі параненыя. Аднак паступова бесчалавечнасць і, што важна, бессэнсоўнасць тэрору стала прывабліваць да правага і левага экстрэмізму ўсё менш і менш італьянцаў. Да сярэдзіны 1980-х гг. ён практычна знікае разам з пакаленнем радыкалаў, што яго спарадзіла.

У пасляваенныя дзесяцігоддзі адбываецца якасны скачок у італьянскіх мафіёзных структурах. Адыходзіў у нябыт маральны кодэкс мафіі, які хоць нейкім чынам абмяжоўваў гвалт. Сіцылійская («коза ностра»), неапалітанская («камора») і яшчэ больш жорсткая калабрыйская («ндрангета») галіны мафіі імкліва прасоўваліся на Поўнач краіны, усталёўваючы ўсё больш і больш шчыльныя повязі са светам бізнесу і палітыкі. Умацоўваліся міжнародныя кантакты арганізаванай злачыннасці.

Урадавая нестабільнасць, унутрыпартыйныя звады, узрастальны недавер да ўлад з боку значнай часткі насельніцтва не дазвалялі дзяржаве даць рады ўсёдазволенасці мафіёзных кланаў. Больш за тое, неад'емнай рысай палітычнага жыцця Італіі станавілася рознага роду скандалы. У 1978 г. па падазрэнні ў карупцыі (амерыканская карпарацыя «Локхід» заплаціла хабар за закупкі італьянскімі ваенна-паветранымі сіламі сваіх самалётаў) і нявыплаце падаткаў быў абвінавачаны прэзідэнт краіны, член ХДП Джавані Леонэ. Вялікі рэзананс атрымала справа масонскай ложы П-2 («Прапаганда-2»). Цэлы шэраг буйных – у тым ліку вышэйшых – дзяржаўных чыноўнікаў былі абвінавачаныя ў змове супраць рэспублікі. Дзейнасць П-2 трапляла пад дзеянне 18-га артыкула Канстытуцыі Італіі, якая забараняла «сакрэтныя арганізацыі, якія пераследуюць, хаця б ускосна, палітычныя мэты шляхам стварэння структуры вайсковага характару».

У 1970 – 1980-я гг. стрыжнявую ролю ў знешняй палітыцы Італіі па-ранейшаму адыгрываў атлантызм. Прычым, калі ў эпоху разрадкі італьянскія ўлады падкрэслівалі яго прынцыповую сумяшчальнасць з паслабленнем напружанасці ў міжнародных адносінах. Напрыканцы 1970-х – напачатку 1980-х гг. разуменне атлантызму стала больш традыцыйным. Італьянскі ўрад выказаў гатоўнасць размясціць на тэрыторыі краіны 112 крылатых ракет.

З выхадам міжнародных адносін на новы віток «халоднай вайны» і гонкі ўзбраенняў італьянская дыпламатыя стала праяўляць пэўны інтарэс да магчымасці больш актыўнага вайсковага супрацоўніцтва дзяржаў ЕЭС. Тым не менш, у той час аніякай рэальнай альтэрнатывы блоку НАТО не існавала.

Яшчэ адным прыярытэтным напрамкам знешняй палітыкі Італіі з'яўляўся актыўны ўдзел у еўрапейскай інтэграцыі. Сведчаннем узмацнення пазіцый краіны ў Еўропе і свеце стала яе імкненне не дапусціць у ЕЭС ніякіх «унутраных альянсаў», перш за ўсе ФРГ і Францыі. Для дасягнення гэтай складанай задачы Італія часта апелявала да Вялікабрытаніі як да «балансіру», але ў іншых выпадках, калі самі брытанцы праяўлялі гегеманісцкія схільнасці, інтрыгавала і супраць іх. Італія падтрымлівала ідэю пашырэння ЕЭС і разлічвала на стварэнне свайго роду ўнутранага «паўднёвага блоку» з новай удзельніцай «Агульнага рынку» – Іспаніяй. Вельмі эфектыўнай аказалася дзейнасць італьянскіх палітыкаў у спробах актывізацыі працэсу палітычнай інтэграцыі ў Еўропе. Італія была адным з ініцыятараў распрацоўкі і прыняцця «Адзінага еўрапейскага акту» (1986).

З надыходам эры разрадкі на новы этап выйшлі італьянска-савецкія адносіны. У 1972 г. СССР наведаў прэм’ер-міністр Італіі Дж. Андрэоці. Але узровень палітычных адносін паміж краінамі пэўны час адставаў і ад двухбаковага эканамічнага супрацоўніцтва і якасці ўзаемадзеяння СССР з Францыяй, ФРГ і ЗША. Сітуацыя стала змяняцца пасля дзяржаўнага візіту ў СССР прэзідэнта Італіі Дж. Леонэ. Адным з яго важнейшых вынікаў стала падпісанне Сумеснай савецка-італьянскай дэкларацыі. Нягледзячы на значныя змены міжнароднай абстаноўкі на мяжы 1970-х і 1980-х гг., італьянска-савецкія адносіны і надалей развіваліся даволі ўстойліва. З пачаткам перабудовы адбываецца іх актывізацыя, асабліва на ўзроўні двухбаковага эканамічнага супрацоўніцтва.

Значнае месца ў знешняй палітыцы Італіі у гэты перыяд стала займаць Афрыканскі, Азіяцкі і Лацінаамерыканскі рэгіёны, асабліва зона Міжземнаемор’я – сфера традыцыйных інтарэсаў дыпламатыі Рыму.

## Тэма 12. Італія ў 1990-я – 2010-я гг.

### Развіццё эканомікі Італіі ў 1990-я – 2000-я гг.

Невысокія тэмпы эканамічнага росту, характэрныя для Італіі ў 1980-я гг. аказаліся доўгатэрміновай тэндэнцыяй. На працягу 1990 – 2005 гг. рост ВНП краіны складаў толькі 1,4 % штогод. Па гэтаму паказчыку Італія адставала не толькі ад іншых буйнейшых эканомік кантыненту (у Іспаніі гэты паказчык склаў 2,9 %, Германіі – 2,6 %, Вялікабрытаніі – 2,4 %, Францыі – 1,9 %), але і ад іншых партнёраў па ЕС. Гэткім чынам на 2005 г. яе эканоміка ўжо складала толькі 80 % ад брытанскай. У асабліва цяжкім становішчы апынуліся дробныя, як правіла, сямейныя фірмы. Паглыбленне еўрапейскай інтэграцыі, асабліва ўвядзенне агульнай валюты – еўра, тым больш уздзеянне працэсаў глабалізацыі – наплыў азіяцкіх, найперш, кітайскіх тавараў шырокага спажывання – многія сектары малога бізнесу былі пастаўленыя на мяжу выжывання.

Тым не менш, у Італіі, як і іншых развітых капіталістычных краінах хутка фарміравалася індустрыяльная эканоміка. Новыя інфармацыйныя тэхналогіі актыўна ўкараняліся практычна ва ўсіх сферах грамадскай вытворчасці. Пашырэнне сферы выкарыстання высокіх тэхналогій было заснаванае як на іх вытворчасці ўнутры краіны, гэтак і на імпарце з іншых перадавых краін. Хаця аб’ём імпарту прыблізна ўдвая перавышаў экспарт сучаснай тэхнікі і абсталявання, на развіццё фундаментальных і прыкладных даследаванняў трацілася толькі каля 1,1 % ВУП – удвая меней, чым у сярэднім па ЕС.

Італія стала адным з прызнаных заходнееўрапейскіх лідараў у гэткіх галінах, як лёгкае сярэдняе машынабудаванне, электратэхніка, у тым ліку бытавая, будаўнічая і хімічная індустрыя, лёгкая і харчовая прамысло-

васць. Пры гэтым італьянская эканоміка напачатку 2000-х г. больш чым на 90 % складалася з драбнейшых, дробных і сярэдніх прадпрыемстваў, большая частка з якіх засяроджвалася ў сферы паслуг.

Структурныя пераўтварэнні ў эканоміцы ў 1990-я гг. праводзіліся пад знакам уступлення Італіі ў еўрапейскі валютны саюз. Іх мэтай было выкананне Маастрыхцкага дагавору і адаптацыя італьянскай гаспадаркі да патрабаванняў рынку XXI ст. У падмурку рэформ ляжала скарачэнне дзяржаўнага рэгулявання і лібералізацыя эканомікі у цэлым. Рэформы ажыццяўляліся па некалькім накірунках: прыватызацыя дзяржаўнай уласнасці, скарачэнне бюджэтнага дэфіцыту і дзяржаўнага доўгу, змяненне падатковай сістэмы і рэфармаванне рынку працы.

Прыватызацыя дзяржаўнай уласнасці набыла буйнамаштабны характар. Да канца 1990-х гг. у прыватныя рукі цалкам альбо часткова было перададзена больш за тры дзясяткі буйных прадпрыемстваў, у тым ліку гэткія гіганты як «Тэлеком», ЭНІ і ЭНЭЛ (адна з буйнейшых электраэнергетычных кампаній у свеце) ды інш. Таксама была акцыянаваная нацыянальная сетка чыгункі.

Атрыманыя ад прыватызацыі сродкі шлі, галоўным чынам, на пагашэнне дзяржаўнага доўгу, які на 1994 г. складаў 122 % ад ВНП. Зменшыць яго да 60 %, як тое патрабавалася, Італія ўсё роўна не здолела, але была дапушчаная ў «зону еўра» авансам. Больш паспяхова вырашалася праблема бюджэтнага дэфіцыту. І правыя і левыя сыходзіліся на непазбежнасці курсу жорсткай эканоміі, але апошнія настойвалі на неабходнасці максімальнага згладжвання яго сацыяльных наступстваў.

Рэфармаванне падатковай сферы было найперш накіравана на стварэнне спрыяльных умоў для інвестыцый. Знізіліся падаткі на карпарацыі. У 1995 г. пачалося рэфармаванне пенсійнай сістэмы. Рэформа мела на мэце перагляд квот унёскаў на карысць працадаўцаў. Больш жорсткімі сталі захады па барацьбе з ухіленнем ад выплаты падаткаў. Напрыканцы 1990-х гг., «на закаце» існавання італьянскай ліры, улады здолелі ўтаймаваць інфляцыю.

Працэс рэфармавання рынку працы паддаваўся рэфармаванню з вялікімі цяжкасцямі. Магутныя прафсаюзы, якія аб’ядноўвалі да 40 % асобаў наёмных прафесій, не жадалі ісці на сур’ёзныя саступкі. Тым не менш, на працягу 1990-х гг. прафсаюзы і прадпрымальнікі пры пасярэдніцтве дзяржавы здолелі дасягнуць некалькі важных кампрамісаў і забяспечыць прынцыповую грамадскую згоду.

З сярэдзіны 2000-х гг. тэмпы эканамічнага росту ў Італіі некалькі паскорыліся. Аднак, як і ў іншых развітых краінах, гэтае ажыўленне аказалася непрацяглым і змянілася крызісам 2008 – 2009 гг. За 15 крызісных месяцаў ВНП Італіі знізіўся на 6,8 %. Як і паўсюль, даволі моцна пацярпела

аўтамабілебудаўнічая галіна. ФІАТ нават абвясціў аб закрыцці шэрагу сваіх заводаў і часовым звальненні рабочых.

І сёння Італія з'яўляецца адной з найбольш эканамічна развітых краін свету, займаючы 7-е – 8-е месца па аб'ёме ВНП (на душу насельніцтва – толькі 23-е), валодаючы адным з буйнейшых залатых запасаў у свеце (вышэй толькі ЗША, ФРГ і Міжнародны валютны фонд). Краіна славіцца аўтамабілебудаўнічай галіной, прамысловым абсталяваннем, бытавой тэхнікай і высокай модай. Аграпрамысловы сектар вызначаецца сваёй высокай прадукцыйнасцю і канкурэнтаздольнасцю. Італія – сусветны лідар па вытворчасці віна. Вельмі прыбытковай галіной італьянскай эканомікі традыцыйна з'яўляецца турызм, які прыносіць ў дзяржаўную скарбніцу дзясяткі мільярдаў еўра. З больш як 40 млн. турыстаў Італія займае 4-е месца ў свеце (пасля Францыі, Іспаніі і ЗША).

Тым не менш, па-ранейшаму захоўваецца адчувальны разрыў паміж Поўначчу і Поўднем. Адной з няпростых праблем эканомікі Італіі застаецца аграмадны дзяржаўны доўг: у горшым становішчы знаходзілася толькі хранічна хворая эканоміка Грэцыі (Італьянскі выпадак нашмат менш крытычны паколькі дзяржава вінаватая айчынным суб'ектам гаспадарання). Акрамя таго, Італія прызнаная найбольш карумпаванай краінай Заходняй Еўропы, што таксама з'яўляецца значнай праблемай для эканамічнага развіцця. Па некаторых ацэнках італьянская арганізаваная злачыннасць кантралюе каля 9 % ВНП, прычым 1/3 прыпадае на калабрыйскую «ндрангету».

### Актывізацыя барацьбы з арганізаванай злачыннасцю. Кампаніі «Горад хабару» і «Чыстыя рукі»

Да пачатку 1990-х гг. карупцыя аблытала ўсю дзяржаўную сістэму Італіі і нават справакавала палітычны крызіс. Паколькі італьянскія палітычныя партыі валодаюць рэальнай уладай, прадпрымальнікі даўно ўзялі за норму купляць сабе абарону, фінансуючы палітыкаў. Паміж бізнесам і партыйнымі функцыянерамі ўтварыліся трывалыя карупцыйныя сувязі. У некаторых месцах палітыкі нават усталёўвалі таксу: напрыклад адна кампанія з Калабрыі штомесяц здавала на партыйныя патрэбы 4,5 % прыбытку, частка грошай заставалася ў мясцовым філіяле партыі, а астатняе накіроўвалася ў яе штаб-кватэру. Чым шчыльней станавіліся сувязі бізнесу і палітыкаў, тым больш магчымасцяў з'яўлялася ў нячыстых на руку прадпрымальнікаў: атрыманне дзяржаўных заказаў і важнай эканамічнай інфармацыі, звядзенне рахункаў з канкурэнтамі і г. д.

Падобная схема не была асаблівым сакрэтам для італьянскага грамадства. Але выкрыццё гэтых злачынных механізмаў у судзе як правіла сутыкалася з сур'ёзнымі праблемамі, а таму поспехі ў барацьбе з карупцыяй і арганізаванай злачыннасцю насілі толькі лакальны характар. Становішча рэзка змя-

нілася пасля арышту за атрыманне хабару на суму каля $5 тыс. непрыкметнага дырэктара міланскага пансіянату для састарэлых Марыа К'еза. З рахункаў затрыманага стала ясна, з якімі значнымі сумамі мае справу шараговы член Сацыялістычнай партыі. Следчыя пракуратуры Мілану на чале з Антоніа Дзі П'етра ініцыявалі ўзбуджэнне крымінальнай справы і потым разгарнулі сапраўдную вайну з крыміналам горада. Гэтак пачалася кампанія, што атрымала красамоўную назву **«Чыстыя рукі»** (італ. *Mani pulite*) (адносна барацьбы з карупцыяй у Мілане таксама выкарыстоўвалася назва **«Горад хабару»** (італ. *Tangentopoli*). Ад былога дырэктара ніці расследавання павялі ў іншыя вобласці і гарады Італіі, у тым ліку да буйных італьянскіх палітыкаў. Прэм'ер-міністр і лідар ІСП Б. Краксі паспяшаўся адхрысціцца ад злоўленага хабарніка, і тады абражаны М. К'еза пачаў «здаваць» сваіх калег па бруднай справе.

Вынікі кампаніі «Чыстыя рукі» скаланулі ўсю Італію. Выявіліся супрацьзаконныя дзеянні не толькі сацыялістаў, але таксама прадстаўнікоў самых розных палітычных сіл Італіі – хрысціянскіх дэмакратаў, сацыял-дэмакратаў, камуністаў ды інш. Агульныя страты, нанесеныя хабарнікамі дзяржаве, ацэньваліся ў $150 – 180 млн. Пад следствам апынулася каля 20 тыс. чалавек. Каб пазбегнуць абвінавачванняў звольніліся многія дзясяткі тысяч чыноўнікаў. Дасталася таксама і бізнесоўцам: у поле зроку праваахоўных органаў патрапілі высокапастаўленыя супрацоўнікі ФІАТ, Алівеці ды іншых карпарацый. Турэмныя тэрміны атрымалі звыш 500 палітыкаў. Бесстаронняя Феміда не спынілася нават перад гэткімі палітычнымі аўтарытэтамі як былы прэм'ер-міністр і пажыццёвы сенатар Дж. Андрэоці і сам дзеючы старшыня ўраду Б. Краксі. Адназму са шматгадовых лідараў ХДП высунулі абвінавачванні ў незаконным фінансаванні партыі, сувязях з мафіяй і нават заказным забойстве. Кіраўнік ІСП выйшаў у адстаўку, а потым, ратуючыся ад турмы (па двух абвінаваўчых прысудах ён быў асуджаны на 5 і 8 гадоў), з'ехаў з краіны і да скону быў вымушаны хавацца ў Тунісе.

Асуджаныя карупцыянеры атрымлівалі не толькі тэрміны, да іх ужывалі і канфіскацыю маёмасці. У экспрапрыяваных дамах размяшчалі дзяржаўныя ўстановы: бальніцы, суды, паліцэйскія ўчасткі. Грошы карупцыянераў накіроўвалі ў сацыяльную сферу і сельскую гаспадарку, што толькі ўзмацняла грамадскую падтрымку антыкарупцыйнай кампаніі.

Поспехі гэтай барацьбы былі абумоўлены наяўнасцю дэмакратычных механізмаў і канкурэнтнага асяроддзя, моцнай і незалежнай судовай уладай, свабоднымі СМІ. Зразумела і гэтымі рашучымі дзеяннямі раз і назаўжды выкараніць карупцыю і мафію было немагчыма. Тым не менш, «Горад хабару» і «Чыстыя рукі» абудзілі пасіўнае і збольшага цярпімае адносна хабарніцтва грамадства і запусціла механізм яго абнаўлення і ачышчэння.

### Перагрупоўка палітычных сіл. Стварэнне Партыі левых сіл. Ліквідацыя ХДП. Рэферэндум 1993 г. Далейшыя змены ў партыйна-палітычнай структуры. Усталяванне Другой рэспублікі. «Ліга Поўначы». Рух «Наперад, Італія». С. Берлусконі. Нацыянальная федэрацыя «зялёных»

У 1990-я гг. нестабільнасць і кантрастнасць грамадска-палітычнага жыцця Італіі ўзмацнілася. Вострыя палітычныя крызісы завяршаліся кампраміснымі вынікамі. Радыкалізм і непрымірымасць палітычных паводзін італьянцаў кантрасціравалі з цярпімасцю іх свядомасці.

Сур'ёзныя змены адбываліся на левым флангу: сацыялісты ўмацоўвалі свой уплыў, а вось папулярнасць камуністаў пайшла на спад. Ва ўмовах краху сацыялізму ў краінах Усходняй Еўропы кіраўніцтва КПІ выступіла з ініцыятывай пераўтварыць партыю ў абноўленую левую партыю. Лідар камуністаў Акіле Акета на надзвычайным ХІХ з'ездзе партыі (1990) падкрэсліваў: «*Мы жадаем зменаў не таму, што саромеемся свайго мінулага, а таму, што ўлічваючы змены ў свеце, імкнёмся адпавядаць працэсам, якія адбываюцца, і патрабаванням часу*». У лютым 1991 г. на ХХ з'ездзе партыі адбыўся раскол: большая частка камуністаў утварыла палітычную арганізацыю сацыял-дэмакратычнай арыентацыі – **Дэмакратычную партыю левых сіл (ДПЛ)**. «Цвёрдыя» камуністы (г. зв. «сталіністы»), якія засталіся ў меншасці сфарміравалі **Партыю камуністычнага адраджэння (ПКА)**.

Не гэткім хуткім, але ад гэтага не менш драматычным аказаўся сыход з італьянскай палітычнай арэны ІСП. Пачатак вайны з карупцыяй на першых парах амаль не адбіўся на выніках парламенцкіх выбараў (13,6 % у 1992 г.). Аднак пасля таго, як міланская пракуратура выйшла на Б. Краксі, справы сацыялістаў рэзка пагоршыліся. Паміж 1992 і 1993 гг. партыю пакінула большасць членаў, а тры дэпутаты-сацыялісты пад цяжарам пагрозы судовых разглядаў і абвінаваўчых прысудаў скончылі жыццё самагубствам. Парламенцкія выбары вынеслі ІСП прысуд італьянцаў: за яе прагаласавалі толькі 2,2 % выбаршчыкаў. Пасля двух гадоў агоніі ў лістападзе 1994 г. партыя з больш як 100-гадовай гісторыяй была распушчана (адноўлена ў 2007 – 2008 гг.). Не распалася, як іншыя левыя партыі, але таксама згубіла ўсялякі ўплыў і давер выбаршчыкаў Італьянская сацыял-дэмакратычная партыя.

Знікненне з палітычнай арэны КПІ, партыі, якая атрымлівала на парламенцкіх выбарах у сярэднім каля 29 % выбаршчыкаў не магла не адбіцца на стабільнасці і без таго не надта ўстойлівай партыйнай сістэме Італіі. Найперш пацярпела Хрысціянска-дэмакратычная партыя, што на працягу дзесяцігоддзяў пазіцыянавала сябе як адзіная сіла, здольная не дапусціць да ўлады небяспечных камуністаў. Неактуальнасць антыкамуністычнага складніку ідэалогіі ХДП дапаўнялася праблемамі ў сувязі з далейшай секулярызацыяй італь-

янскага грамадства. Карупцыйныя скандалы і непераканаўчае выступленне на парламенцкіх (1992) і мясцовых (1993) выбарах завяршылі крах партыі. У 1994 г. ХДП была перайменаваная ў **Італьянскую народную партыю (ІНП)**, якая неўзабаве распалася на цэлы шэраг арганізацый шырокай скіраванасці: ад гатовых супрацоўнічаць з ПДЛ да тых, што сфарміравалі новы правы цэнтр італьянскай палітыкі. У 1992 – 1994 гг. страцілі большасць членаў і выбаршчыкаў, а потым распаліся Ліберальная (адноўлена ў 2004 г.) і Рэспубліканская (хаця засталася аднайменная арганізацыя) партыі.

У ходзе антыкарупцыйных расследаванняў станавілася ясна, што адной з асноўных патэнцыйных крыніц злоўжыванняў была італьянская выбарчая сістэма, заснаваная на прынцыпах прапарцыйнага прадстаўніцтва. На парадак дня высоўвалася пытанне аб яго замене мажарытарным прынцыпам, які быў закліканы зрабіць народных абраннікаў больш адказнымі перад выбаршчыкамі, а не перад фарміраваўшымі выбарчыя спісы партыйнымі босамі і цянявымі аўтарытэтамі. Таксама перад дзяржавай і грамадствам Італіі стаяла задача кардынальнага абнаўлення партыйнай сістэмы краіны. Пераўтварэнні, якія адбыліся ў 1993 – 1994 гг. паклалі пачатак г. зв. **Другой рэспубліцы** ў Італіі.

18 красавіка 1993 г. быў праведзены агульнанацыянальны рэферэндум, на якім італьянцам прапанавалі выказацца адносна правядзення выбарчай рэформы і скасавання дзяржаўнага фінансавання партый. Усенароднае галасаванне прайшло пры дастаткова высокай актыўнасці выбаршчыкаў (77 %) і прынесла несумненны поспех прыхільнікам абнаўлення грамадска-палітычнай сістэмы краіны. 90 % італьянцаў, што ўзялі ўдзел у рэферэндуме адмовілі партыям у грошах падаткаплацельшчыкаў, а 83 % выказаліся за адмову ад прапарцыйнасці. Ужо на бліжэйшых парламенцкіх выбарах 75 % дэпутацкага корпусу павінна было абрацца па мажарытарнай сістэме, а астатнія 25 % па прапарцыйнай, прычым для адсеву самых дробных партый прадугледжвалася ўвядзенне г. зв. выбарчага парогу (4 %) (гэтая выбарчая сістэма дзейнічала да 2005 г.).

Палітычны вакуум, які ўтварыўся ў выніку карупцыйных скандалаў, краху «пяціпартыйнасці» і саміх палітычных партый, што адыгрывалі вядучую ролю ў італьянскай палітыцы ўсе пасляваенныя дзесяцігоддзі, стаў імкліва запаўняцца новымі нетрадыцыйнымі грамадскімі аб’яднаннямі.

Захаванне значных рэгіянальных дыспрапорцый сацыяльна-эканамічнага развіцця і моцны ўплыў мафіі на Поўдні краіны выклікалі да жыцця паўночнаітальянскі сепаратызм. «Ліга Поўначы за незалежнасць Паданіі» ці проста **«Ліга Поўначы»** (**ЛП**; заснавана ў 1989 г.) на чале з лідарам-папулістам Умбэрта Босі заклікала жыхароў Паўночнай Італіі адмовіцца ад утрымання гультаяватага і прасякнутага мафіёзнымі структурамі Поўдню і прызнавала гістарычную памылковасць аб’яднання ў адну дзяржаву настолькі разнародных тэрыторый. Нягледзячы на свае радыкальныя лозунгі і тое, што ў 1995 г.

партыя нават афіцыйна абвясціла незалежнасць «Паданіі» (значная частка Паўночнай Італіі прыпадае на даліну ракі По – італ. *Pianura Padana*), яна прытрымліваецца даволі ўзважанай тактыкі блакавання з іншымі партыямі правай часткі палітычнага спектру Італіі. Такімі, напрыклад, як постфашысцкі **Нацыянальны альянс (НА)**, створаны на базе распушчанай неафашысцкай партыі ІСР-НПС і пры ўдзеле кансерватыўных груповак хрысціянскіх дэмакратаў, лібералаў і рэспубліканцаў. Намаганнямі свайго лідара Джанфранка Фіні і яго паплечнікаў НА здолеў дыстанцыявацца ад фашысцкага мінулага і пераўтварыць партыю ў рэспектабельнага ўдзельніка палітычнай барацьбы і выбарчых кааліцый.

Галоўнай правацэнтрысцкай сілай Італіі стала ліберальна-кансерватыўная партыя **«Наперад, Італія» («Forza Italia»)**, заснаваная ў снежні 1993 г. адным з багацейшых грамадзян краіны медыямагнатам Сільвіа Берлусконі. Створаная за некалькі месяцаў на базе фанацкіх суполак футбольнага клубу «Мілан» (С. Берлусконі – яго гаспадар; «Форца Італія» – кліч футбольных заўзятараў), маладая партыя стала адным з найлепшых узораў перадавога палітычнага менеджменту і выкарыстання сучасных PR-тэхналогій. Неўзабаве яна пераўтворыцца ў адну з самых масавых і паспяховых партый Другой рэспублікі ў Італіі.

З канца 1980-х гг. пад уплывам нарастання экалагічных праблем і, асабліва аварыі на Чарнобыльскай АЭС, у Італіі адбываецца актывізацыя «зялёных». У 1990 г. дзве вядучыя экалагічныя партыі ўтварылі адзіную арганізацыю – **Нацыянальную федэрацыю «зялёных» (НФЗ)**.

Таксама з’яўляліся і палітычныя арганізацыі з моцнай італьянскай спецыфікай. Гэтак яшчэ на пачатковай хвалі антыкарупцыйнай барацьбы ў 1991 г. мэр Палерма – сталіцы аблытанай шчупальцамі мафіі Сіцыліі – Леанлука Арланда заснаваў **Рух за дэмакратыю – Сетка** (часцей проста **«Сетка»**). Партыя была павінна адрадзіць расхістаныя маральныя традыцыі італьянскай хрысціянскай дэмакратыі і павесці рашучую барацьбу з арганізаванай злачыннасцю.

### Палітычная барацьба ў Італіі ў 1990-я – 2000-я гг. Перадвыбарчыя альянсы. Вынікі парламенцкіх выбараў. Урады Р. Продзі і С. Берлусконі

Бурлівыя падзеі італьянскай палітыкі пачатку 1990-х гг. да непазнавальнасці змянілі нацыянальную палітычную арэну, прывялі да моцнага абнаўлення палітычных эліт, выклікалі значную карэкціроўку палітычнай ідэалогіі, стратэгіі і тактыкі палітычных партый. Усё гэта выпукла праявілася ўжо ў сакавіку 1994 г. – на першых парламенцкіх выбарах Другой рэспублікі.

Ва ўмовах пераважна мажарытарнай выбарчай сістэмы найбольш перспектыўнай тактыкай палітычнай барацьбы стала фарміраванне буйных вы-

барчых аб'яднанняў. Галоўная барацьба разгарнулася паміж трыма перадвыбарчымі блокамі: левацэнтрысцкім **«Альянсам прагрэсіўных сіл»** (ДПЛ, ПКА, «Сетка» і некаторыя іншыя партыі), цэнтрысцкім **«Пактам за Італію»** (ІНП і партыйная групоўка, згуртаваная вакол кандыдата на пасаду прэм'ер-міністра Марыя Сэны) і правацэнтрысцкім **«Полюсам свабоды»** (таксама называецца **«Альянс Свабоды»**; «Наперад, Італія», ЛП і НА).

Перамогу на выбарах у Палату дэпутатаў заваявалі правацэнтрысты, за якіх прагаласавала амаль палова італьянскіх выбаршчыкаў. Найбольшага поспеху дасягнула партыя «Наперад, Італія» (па дадзеных, за яе партыйны спіс быў паданы 21 % галасоў), а яе лідар С. Берлусконі стаў новым прэм'ер-міністрам (травень 1994 – студзень 1995 г.). «Альянс прагрэсіўных сіл» набраў на 5 млн. галасоў менш (ДПЛ заняла 2-е месца сярод партый – 20,4 %), а «Пакт за Італію» – на 12 млн. (ІНП, пераемніца слаўных традыцый ХДП, здабыла 11 % галасоў і паказала толькі 4-ты вынік сярод партыйных спісаў).

Абнаўленне палітычнай і партыйнай сістэм на першых парах было няздольнае вырашыць даўнюю праблему ўрадавай няўстойлівасці. Новыя ўлады аказаліся няздольнымі выканаць свае перадвыбарчыя абяцанні. Больш за тое, у мэтах скарачэння бюджэтных выдаткаў быў нанесены ўдар па пенсійнай сістэме. Гэта выклікала ўсеагульную забастоўку і шматмільённыя маніфестацыі пратэсту. С. Берлусконі быў вымушаны пайсці на саступкі, што яшчэ больш падарвала да яго давер.

Першы ўрад С. Берлусконі аказаўся зусім нядоўгім – «Ліга Поўначы» пакінула кааліцыю ужо праз сем месяцаў. Неўзабаве, пасля адстаўкі з пасады прэм'ер-міністра, медыямагнат у чарговы раз патрапіў у поле зроку праваахоўных органаў (першы раз яшчэ па справе масонскай ложы П-2) і паўстаў перад судом. Нягледзячы на сур'ёзныя абвінавачанні ў карупцыі і махінацыях з падаткамі і нават на тры абвінаваўчыя прысуды, С. Берлусконі дзякуючы вынаходлівасці сваіх адвакатаў і асаблівасцям судовай сістэмы Італіі здолеў пазбегнуць турмы. З таго часу яго бесперапынная барацьба з італьянскай Фемідай за свабоду, прычым у самым элементарным сэнсе гэтага слова – адна з найбольш каларытных асаблівасцяў грамадска-палітычнага жыцця краіны.

Новы ўрад пад кіраўніцтвам былога міністра фінансаў Ламберта Дзіні (1995 – 1996) абапіраўся на шырокі спектр партый (супраць яго выступалі толькі ПКА і ЛП), але ад гэтага ён рабіўся яшчэ менш трывалым. Пасля таго, як «Наперад, Італія» адмовіла яму ў падтрымцы, яго адстаўка стала толькі справай часу. Палітычны тупік, у якім зноў апынулася краіна, рабіў неабходным правядзенне датэрміновых выбараў.

Галоўная барацьба на выбарах 1996 г. разгарнулася паміж «Полюсам за свабоду» («Наперад, Італія», НА і Хрысціянска-Дэмакратычны цэнтр-

Аб’яднаныя хрысціянскія дэмакраты) і новым левацэнтрысцкім блокам **«Аліўкавае дрэва»** (ДПЛ, шэраг сацыял-дэмакратычных партый і НФЗ). Гэтым разам з нязначнай перавагай (не атрымалі абсалютнай большасці ні ў адной з палат) перамаглі левацэнтрысты, і на працягу наступных 5 гадоў краінай кіравалі іх урады: Рамана Продзі (1996 – 1998), Масіма Д'Алемы (1998 – 2000) і Джуліана Амата (2000 – 2001).

Раман Продзі, прафесар эканомікі, раней звязаны з хрысціянскай дэмакратыяй распачаў важныя сацыяльна-эканамічныя рэформы, працягнутыя паплечнікамі па «Аліўкаваму дрэву». За 1996 – 2001 гг. урад здолеў значна папоўніць дзяржаўную скарбніцу за кошт выручкі ад прыватызацыі прадпрыемстваў дзяржаўнага сектару. Стварэнне 1 млн. новых працоўных месцаў дазволіла скараціць беспрацоўе. Была скасаваная вайсковая павіннасць і ўводзілася кантрактная сістэма камплектавання ўзброеных сіл. Правячая кааліцыя ажыццявіла амністыю нелегальных эмігрантаў: усе іншаземцы, якія падавалі заявы аб легалізацыі, але не атрымалі яе ў папярэднія гады, атрымалі від на жыхарства (каля 250 тыс. чалавек). У 1998 г. вядучая партыя кааліцыі ПДЛ аб’ядналася з шэрагам дробных арганізацый, у выніку чаго была ўтворана новая сацыял-дэмакратычная партыя **«Левыя дэмакраты»**.

Ужо на муніцыпальных і рэгіянальных выбарах, што адбыліся ў 2000 г., пашыраны за кошт «Лігі Поўначы» правацэтрысцкі блок партый прадэманстраваў рашучасць і здольнасць вярнуць сабе ўладу ў краіне. Парламенцкія выбары 2001 г таксама засведчылі падзенне папулярнасці левацэнтрысцкай кааліцыі. «Аліўкавае дрэва» (Левыя дэмакраты ды іх саюзнікі) саступіла адносна няшмат галасоў правацэнтрысцкаму **«Дому свабоды»** («Наперад, Італія», НА, ЛП), але, тым не менш, дазволіла канкурэнтам заваяваць упэўненую большасць у абедзвюх палатах парламенту. Гэты поспех правацэнтрыстаў быў у значнай ступені дасягнуты дзякуючы партыі новага прэм’ер-міністра С. Берлусконі (2001 – 2006). «Наперад, Італія» у трэці раз запар першынствавала ў галасаванні за партыйныя спісы і гэтым разам набрала 29,5 % галасоў («Левыя дэмакраты» – 16,5 %).

Нягледзячы на пэўны поспех замацаванай у 1993 г. выбарчай сістэмы, частка палітычных сіл Італіі выступала за вяртанне да прапарцыйнасці. Правячая кааліцыя «Дому свабоды», разлічваючы на перавагі для сябе ад новага выбарчага закону, забяспечыла правядзенне рэформы выбарчага заканадаўства ў 2005 г. У адрозненне ад прапарцыйнай выбарчай сістэмы часоў Першай рэспублікі, новая, больш складаная, змяшчае шэраг механізмаў, якія закліканыя заахвочваць аб’яднанне партый у перадвыбарчыя блокі. Напрыклад, пераможная кааліцыя атрымлівае сама меней 55 % дэпутацкіх мандатаў у Палаце дэпутатаў.

У выніку напярэдадні новых парламенцкіх выбараў 2006 г. практычна ўсе палітычныя партыі Італіі падзяліліся на два канкурэнтныя блокі: правацэнтрысцкі «Дом свабодаў» («Наперад, Італія», НА, ЛН ды іншыя) і

левацэнтрысцкі **«Саюз»** («Аліўкавае дрэва», Партыя італьянскіх камуністаў ды інш.). Стракатасць блокавых шэрагаў была неверагоднай. Складвалася ўражанне, што іх лідары былі гатовыя хапаць усіх, хто падвернецца пад руку, каб здабыць перамогу. Гэтак на баку «Дому свабодаў» выступілі неафашысцкія Сацыяльная альтэрнатыва Аляксандры Мусаліні, унучкі дыктатара, і «Трохкаляровае полымя» Лукі Раманьёлі, які адмаўляў факт халакосту. Сярод кандыдатаў «Саюзу», у сваю чаргу, былі вельмі супярэчлівыя для Італіі асобы: апантаны анархіст і трансвестыт (дарэчы, першы падобны дэпутат Еўрапарламенту ў яго гісторыі).

«Дом свабодаў» у сваёй выбарчай праграме рабіў стаўку на пашырэнне рэгіянальнай аўтаноміі, падтрымку сямейных і дробных кампаній і экспарцёраў, скарачэнне падаткаў, абмежаванне іміграцыі, абароне заснаванай на шлюбе традыцыйнай сям'і, умацаванні сяброўскіх адносін з ЗША і пацвярджэнні адданасці ЕС. «Саюз», у сваю чаргу, настойваў на прыярытэтнасці рэфармавання прававой сістэмы Італіі і большай эфектыўнасці паліцыі, кантраляванай іміграцыі, прызнанні правоў пазашлюбных пар, паглыблення інтэграцыі ў межах ЕС, неадкладнага выведу італьянскіх войск з Іраку.

Выбары скончыліся мінімальнай перамогай левацэнтрыстаў 49,8 % (супраць 49,69 % у канкурэнтаў). Новым прэм'ер-міністрам Італіі ў другі раз стаў Р. Продзі (2006 – 2008). Нягледзячы на аб'яднанне ў 2007 г. дзвюх буйнейшых левацэнтрысцкіх партый «Левых дэмакратаў» і «Дэмакратыя – гэта свабода» у адзіную арганізацыю – Дэмакратычную партыю, – правячая кааліцыя аказалася нежыццяздольнай. У студзені 2008 г. Р. Продзі страціў вотум даверу ў Сенаце і сышоў у адстаўку.

На новых парламенцкіх выбарах 2008 г. перамогу атрымала кааліцыя ў складзе партыі **«Народ свабоды»** (была арганізаваная ў 2007 г. на базе двух вядучых правацэнтрыскіх сіл краіны – партый «Наперад, Італія» і «Нацыянальны альянс», але афіцыйна яе стварэнне было аформлена толькі ў 2009 г.), «Лігі Поўначы» і яе паўднёваітальянскага аналага «Рух за аўтаномію». У чарговы раз прэм'ер-міністрам Італіі стаў С. Берлусконі (2008).

### Знешняя палітыка Італіі ў 1990-я – 2010-я гг.

Заканчэнне «халоднай вайны» прывялі да актывізацыі знешнепалітычнага курсу Італіі. Галоўным знешнепалітычным прыярытэтам застаецца ўдзел у заходніх інтэграцыйных структурах – ЕС і НАТО. Італія паслядоўна выступае за паглыбленне еўрапейскай інтэграцыі. У другой палове 2003 г., калі краіна старшынствавала ў Еўрапейскім Саюзе, яе прыярытэтам было абвешчана забеспячэнне найхутчэйшага – яшчэ ў час яе старшынства – прыняцця Канстытуцыі ЕС. Хаця ў вызначаныя тэрміны дамагчыся гэтага не атрымалася, у 2005 г. італьянскі парламент стаў першым заканадаўчым сходам буйнейшых дзяржаў ЕС, што ратыфікаваў

Канстытуцыю. Італьянская дыпламатыя выступае за ўзмацненне знешнепалітычных пазіцый Еўрапейскага саюзу. Напрыклад, Італія прапаноўвае ў рамках рэформы Рады Бяспекі ААН вылучыць ЕС месца пастаяннага члена гэтай важнейшай міжнароднай структуры.

Італьянскія ўзброеныя сілы аказвалі значную падтрымку НАТО падчас аперацый Паўночнаатлантычнага альянсу ў Босніі, Косава і Албаніі. У 2003 г. 1000 італьянскіх альпійскіх стралкоў былі накіраваныя ў Афганістан. Даволі значны вайсковы кантынгент (каля 3 200), супрацоўнікі гуманітарных службаў ды іншых цывільных службоўцаў з Італіі быў разгорнуты ў Іраку. Напрыканцы 2006 г. урад Р. Продзі адклікаў вайскоўцаў дадому. Таксама Італія брала ўдзел у міратворчых місіях ААН у Самалі, Мазамбіку, Усходнім Ціморы, Ліване.

Поруч з традыцыйным інтэграцыйным вектарам у палітыцы Італіі ўзмацняецца тэндэнцыя да ўсталявання ўласнага ўплыву як незалежнага, самастойнага фактара ў іншых краінах і рэгіёнах, найперш – на Балканах і ў Міжземнамор'і. Асноўнай прыладай рэалізацыі італьянскіх інтарэсаў пры гэтым з'яўляюцца – апрача яе палітычнай вагі як уплывовага члена заходняй супольнасці – гандлёва-эканамічныя магчымасці, інвестыцыі, наяўнасць сродкаў для праграм дапамогі ў развіцці. Разам з тым, абгрунтавана выступаючы ў якасці «культурнай звышдзяржавы», Італія мае значныя рэсурсы для ўзмацнення сваіх пазіцый у іншых рэгіёнах і краінах, напрыклад у Лацінскай Амерыцы.

## Тэма 13. Іспанія ў 1945 – 1975 гг.

### Эканамічнае і палітычнае становішча Іспаніі пасля Другой сусветнай вайны. Пасляваенны ўздым антыфашысцкага руху. Праграма «лібералізацыі». «Хартыя іспанцаў». Рэферэндум 1947 г. і абвяшчэнне манархіі. Міжнародная ізаляцыя Іспаніі. Прымірэнне заходніх краін з франкісцкім рэжымам

Напрыканцы Другой сусветнай вайны франкісцкі рэжым апынуўся ў стане крызісу. У першыя пасляваенныя гады іспанская рэспубліканская эміграцыя цешыла надзею, што з перамогай над фашызмам у Еўропе будзе ліквідавана і дыктатура Ф. Франка. У 1945 – 1948 гг. за межамі краіны ажывілася дзейнасць палітычнай эміграцыі. У самой Іспаніі супраць франкізму разгарнуўся партызанскі рух, які галоўным чынам узначальвалі камуністы. Нягледзячы на гераізм левых рэспубліканцаў, гэтая барацьба, якая адбывалася ва ўмовах разрозненасці апазіцыйных франкізму сіл і знешняй ізаляцыі, была асуджаная на паражэнне. Рэжым абрушыў на партызан усю моц свайго рэпрэсіўнага апарату і неўзабаве здолеў вярнуць у краіну жалезны парадак.

Партызанская барацьба і ўздым забастовачнага руху сведчылі аб немалых праблемах франкісцкай улады. Пасля краху па выніках Другой сусветнай большасці еўрапейскіх дыктатарскіх рэжымаў Ф. Франка, каб захаваць сваю ўладу, прыходзілася быць асабліва асцярожным і вынаходлівым. Сутыкнуўшыся са знешнепалітычнай ізаляцыяй, дыктатар пайшоў на «лібералізацыю». 17 чэрвеня 1945 г. быў абнародаваны асноўны закон краіны – **«Хартыя іспанцаў»** (у той самы дзень была адчынена міжнародная канферэнцыя ў Сан-Францыска), якая канчаткова легалізавала існаваўшую сістэму ўлады. У дакуменце вызначаліся асноўныя правы і абавязкі грамадзян. Але зафіксаваныя «Хартыяй іспанцаў» правы на павагу асобы, на працу, свабоднае выказванне ідэй (калі яны не «замахваюцца на асноўныя прынцыпы дзяржавы»), свабоднае ўтварэнне асацыяцый (калі «яны праследуюць дазволеныя мэты») па сутнасці, не гарантаваліся, а дэмакратычныя свабоды маглі быць прыпыненыя ў любы час праз увядзенне надзвычайнага становішча, як на тэрыторыі ўсёй краіны, гэтак і ў асобных раёнах. У ліпені 1945 г. Ф. Франка правёў рэарганізацыю ўраду, выдаліўшы з яго найбольш ярых фалангістаў і ўзмацніўшы яго сацыяльнае апірышча за кошт манархістаў і католікаў. У тым ліку, з разлікам на паляпшэнне вонкавага іміджу краіны, было скасаванае традыцыйнае вітанне фалангістаў – фашысцкі салют, а нашэнне фалангісцкай уніформы стала неабавязковым. Акрамя таго, распускалася фалангісцкая міліцыя.

У 1947 г. быў нават праведзены рэферэндум, па выніках якога Ф. Франка выдаў **«Асноўны закон аб спадкаванні пасады галавы дзяржавы»**. Згодна якому за ім пажыццёва замацоўваліся тытулы «генералісімус узброеных сіл» і «Божай ласкай каўдыльё Іспаніі». Іспанія абвяшчалася «каталіцкай, сацыяльнай і прадстаўнічай дзяржавай», якое згодна з гістарычнай традыцыяй канстытуявалася як каралеўства. Будучы бездакорным манархістам, Ф. Франка не прэтэндаваў на занятце прастолу, але й не рабіў нічога, каб запоўніць вакантнае месца. Ён сам насіў мундзір генерал-капітана (званне, якое згодна традыцыі належала каралю) і меў за рэзідэнцыю каралеўскі палац Эль Парда, а яго партрэты ўпрыгожвалі большасць іспанскіх манет і паштовых марак.

Крызіс, у якім апынуўся франкісцкі рэжым, не прывёў Іспанію на шлях дэмакратычнага развіцця. Манархія без манарха, або каралеўства з незанятым прастолам, спалучала ў сабе рысы вайсковай дыктатуры, каталіцызму і манархічнай рэстаўрацыі. Прадугледжвалася стварэнне Вышэйшай каралеўскай рады, але толькі сам каўдыльё меў права прапанаваць годную, на яго думку, кандыдатуру на іспанскі трон. Гэткім чынам, уся паўната заканадаўчай, выканаўчай і судовай улады паводле прынятых законаў, па-ранейшаму знаходзілася ў руках Ф. Франка. Па-ранейшаму абапіраючыся на фашысцкую партыю «Іспанская фаланга», дыктатар таксама арыентаваўся на кансерватыўныя каталіцкія колы і манархістаў.

Сімвалам яднання іспанцаў, на думку Ф. Франка, павінна было стаць стварэнне велічнага мемарыялу ў памяць аб ахвярах грамадзянскай вайны у Даліне паўшых (ісп. *Valle de los Caídos*), куды былі перанесеныя і перапахаваныя рэшткі загінуўшых ў гады вайны франкістаў і рэспубліканцаў. Мемарыяльны комплекс быў адчынены ў 1959 г.

Тым не менш, за падноўленым фасадам захоўваўся ўсё той жа аўтарытарны рэжым, што склаўся пасля перамогі франкізму ў грамадзянскай вайне. Палітычныя партыі (КПІ, ІСРП, буржуазныя рэспубліканскія партыі) і прафсаюзныя арганізацыі левых сіл, што падтрымлівалі ў 1936 – 1939 гг. Народны фронт, былі забароненыя, а іх актывісты доўгія гады таміліся ў турмах. Жорстка падаўлялася не толькі іншадумства, але таксама нацыянальныя пачуцці народаў нацыянальных ускраін Іспаніі – баскаў, галісійцаў і каталонцаў. Іх аўтаномія часоў Народнага фронту была скасаваная, нацыянальнае пытанне абвяшчалася неіснуючым, а дзейнасць нацыяналістычных рухаў за аўтаномію кваліфікавалася як злачынства супраць іспанскай нацыі.

Да канца 1950 г. франкісцкі рэжым здолеў пераадолець палітычны крызіс, але эканамічнае становішча па-ранейшаму заставалася цяжкім. У 1950 г. узровень прамысловай і сельскагаспадарчай вытворчасці ўсё яшчэ саступаў адпаведным паказчыкам 1935 г. За гэты час цэны на тавары першай неабходнасці і паслугі выраслі ў 10 – 14 разоў. Спрабуючы збалансаваць бюджэт урад заахвочваў інфляцыю і падвышаў тарыфы. Складаная сацыяльна-эканамічная сітуацыя выклікала масавы забастовачны рух па ўсёй краіне.

Ход Другой сусветнай вайны і незваротны крах гітлераўскай Германіі і яе саюзнікаў ставілі Іспанію ў цяжкае знешнепалітычнае становішча. Прымаючы на сваёй тэрыторыі нацысцкіх злачынцаў, дазваляючы гітлераўцам пераводзіць у іспанскія банкі нарабаваныя багацці, яны разам з тым шукалі шляхі да ўсталявання добрых адносін з ЗША і Вялікабрытаніяй. Ф. Франка дазволіў амерыканцам выкарыстоўваць шэраг іспанскіх аэрадромаў, парваў дыпламатычныя адносіны, а потым абвясціў вайну Японіі. Ваенна-палітычнае паражэнне фашысцкіх дзяржаў прывяло Іспанію да ізаляцыі на міжнароднай арэне.

Нягледзячы на паспяховую кансалідацыю франкісцкага рэжыму, знешнепалітычнае становішча Іспаніі заставалася вельмі складаным. Патсдамская канферэнцыя пераможных дзяржаў асудзіла ўладу Ф. Франка як уладу, усталяваную пры дапамозе фашысцкіх дзяржаў. На гэтай падставе Іспаніі было адмоўлена ва ўступленні ў Арганізацыю Аб’яднаных Нацый. Спецыяльная рэзалюцыя Генеральнай Асамблеі ААН пазбавіла Іспанію права прыёму ў міжнародныя арганізацыі і заклікала дзяржавы-ўдзельніцы разарваць з ёю дыпламатычныя адносіны. Захад адмовіў ёй у дапамозе па лініі плану Маршала, а Савецкі Саюз «замарозіў» тую частку залатога запасу краіны, якую рэспубліканскі ўрад Народнага Фронту размясціў у Дзяржбанку СССР. У 1946 г. супраць Іспаніі

было ўведзена эмбарга (забарона на гандаль) і зачыненая мяжа з Францыяй. Захоўваліся стасункі толькі з суседняй аўтарытарнай Партугаліяй, Ірландыяй, некалькімі краінамі Лацінскай Амерыкі (напрыклад, з Аргенцінай, дзе тады кіраваў Хуан Перон), Азіі ды Арабскага Ўсходу.

### Іспанія ў 1950 – 1960-я гг. палітыка аўтаркіі. Сацыяльна-эканамічны крызіс у другой палове 1950-х гг. «План стабілізацыі». Эканамічны бум 1960-х гг. «Опус дэі». Нарастанне крызісу франкізму

Апынуўшыся ў міжнароднай ізаляцыі і будучы адарваным ад сусветных рынкаў, франкісцкі рэжым быў вымушаны праводзіць палітыку аўтаркіі. Пры гэтым дыктатура стала своеасаблівай прыладай аднаўлення сур'ёзна пацярпелай у гады грамадзянскай вайны эканомікі і яе паскоранага развіцця. Гэта датычылася як манапалістычнага, гэтак і традыцыйнага сектару эканомікі. Улады стымулявалі прыватнае прадпрымальніцтва і канцэнтрацыю вытворчасці, выкарыстоўвалі ільготнае падаткаабкладанне ў дачыненні буйнога капіталу.

Дзяржава актыўна ўмешвалася ў сельскую гаспадарку. Яна рэгулявала цэны на сельгаспрадукцыю, праводзіла ірыгацыйныя работы, рэгулявала адносіны паміж латыфундыстамі і арандатарамі, выступала пасярэднікам паміж вытворцамі збожжа і спажыўцамі і г. д. Тым не менш, галіна паранейшаму развівалася павольнымі тэмпамі, захоўваліся практычна тыя самыя праблемы, што і напачатку XX ст. – беззямелле і малазямелле асноўнай масы сялянства і тэхніка-эканамічная адсталасць.

Аднаўленчы перыяд быў скончаны напачатку 1950-х гг. У 1951 г. была скасаваная ўведзеная яшчэ ў час Другой сусветнай вайны карткавая сістэма на асноўныя прадукты харчавання. Назіраўся ўпэўнены эканамічны рост: у 1950-я гг. прамысловасць штогод прырастала на 9 %, а ВНП – на 4,5 %. Напрыканцы 1950-х гг. доля прамысловасці ў ВУП перавысіла долю сельскай гаспадаркі. Удзельная вага сучаснай цяжкой, хімічнай, электраэнергетычнай і некаторых іншых галін стала пераважаць над традыцыйнымі галінамі лёгкай і здабываючай індустрыі. Іспанская дзяржава брала актыўнейшы ўдзел у нацыянальнай эканоміцы. Буйнейшай дзяржаўна-манапалістычнай структурай стаў **Інстытут нацыянальнай прамысловасці**. Таксама значную ролю ў справе хуткага эканамічнага развіцця адыгрывалі: актыўнасць замежнага бізнесу, лішкавая, а таму танная працоўная сіла і выдатная сыравінная база (Іспанія – адна з багацейшых краін Еўропы па запасах карысных выкапняў).

Тым не менш ужо ў другой палове 1950-х гг. іспанская эканоміка выйшла на максімальны для сваёй аўтаркічнай мадэлі ўзровень, і паўстала неабходнасць у ажыццяўленні карэнных рэформ гаспадарчага механізму. У 1955 – 1956 гг. у краіне выбухнуў валютна-фінансавы крызіс, які скрайне адмоўна адбіўся на грашовым звароце і знешнім гандлі. Новая хваля ін-

фляцыі і рост дарагоўлі вялі да рэзкага падзення даходаў насельніцтва і выклікалі значны рост народнага незадавальнення. У 1959 г. пры ўдзеле амерыканскіх спецыялістаў быў прыняты **План стабілізацыі іспанскай эканомікі**. Прадугледжвалася аздараўленне фінансавай сістэмы Іспаніі, стварэнне больш спрыяльных умоў для замежных інвестараў.

Курс на стварэнне «адкрытай эканомікі» даволі хутка даў станоўчы эфект. Краіна ўступіла ў перыяд бурнага эканамічнага развіцця: з 1959 па 1973 гг. яна перажывала **«іспанскае дзіва»** (ісп. – *el millagro económico espanol* або проста *Desarollo,* літаральна «развіццё») і пераўтварылася ў індустрыяльна-аграрную дзяржаву. Па тэмпах эканамічнага росту ў гэты перыяд (каля 7 % у год) яна займала другое месца ў свеце, саступаючы толькі Японіі, і стала 9-ай эканомікай у свеце. Паскоранаму прамысловаму развіццю Іспаніі спрыяла выгодная для краіны кан'юнктура сусветнай гаспадаркі і канчатковае станаўленне механізму дзяржаўна-манапалістычнага рэгулявання. Важнымі крыніцамі для фінансавага забеспячэння абнаўлення Іспаніі стаў хуткі рост замежнага турызму (з 6,1 млн. у 1960 г. да 23 млн. чалавек у 1972 г.; даход ад турызму набліжаўся да $2 млрд.) і грошы іспанскіх працоўных эмігрантаў (у гэты час за мяжой стала працавала звыш 800 тыс. чалавек; усяго ў гэтыя гады за мяжой працавала звыш 3 млн. іспанцаў). Эканамічны рост на самой справе значна палепшыў матэрыяльнае становішча іспанцаў, чаму «іспанскае дзіва» найчасцей і лічыцца найбольш пазітыўным дасягненнем франкісцкай эпохі. Адным з сімвалаў *Desarollo* стаў першы даступны «народны аўтамабіль» SEAT-600 (зроблены па ліцэнзіі італьянскіх FIAT-600).

Тым не менш, Іспанія па-ранейшаму заставалася адной з найбольш адсталых краін Заходняй Еўропы (ззаду заставаліся толькі Партугалія, Грэцыя ды Ірландыя). У 1974 г. сярэднестатыстычны даход іспанца складаў толькі 79 % ад сярэдняга паказчыку па Заходняй Еўропе (даходы выраўняліся толькі праз 25 гадоў – у 1999 г.).

Ужо пасля паражэння дзяржаў «восі» у Другой сусветнай вайне Ф. Франка стаў дыстанцыявацца ад фашысцкай ідэалогіі, а фашысцкія ідэолагі сталі аддаляцца ад асноўных рычагоў дзяржаўнай улады. Напрыклад, у 1955 г. Іспанская фаланга налічвала ў сваіх шэрагах каля 350 тыс. чалавек, але яе прадстаўнікі займалі толькі каля 5 % важных дзяржаўных пасадаў у краіне. Месцы фалангістаў займаліся прадстаўнікамі ўпраўленчай і прадпрымальніцкай эліты блізкай да свецкай каталіцкай арганізацыі **«Опус дэі»** (*Opus Dei* – лат. «Божая справа»). Новая тэхнакратычная эліта, якая з 1957 г. стала займаць ключавыя пасады ва ўрадзе і сродках масавай інфармацыі, выкарыстоўвала запазычаныя з заходняга вопыту метады дзяржаўна-манапалістычнага рэгулявання (ГМР) і рэкамендацыі Міжнароднага валютнага фонду для будаўніцтва эфектыўнай «адкрытай эканомікі». Умацаванне франкізму, гэткім, чынам, павінна было

дасягацца не пустой фалангісцкай «траскатнёй», а за кошт мадэрнізацыі эканомікі і падвышэння жыццёвых стандартаў іспанцаў. Разам з вышэйшымі касцельнымі коламі і ўзброенымі сіламі «Опус дэі» стаў найважнейшым апірышчам рэжыму.

Эканамічная лібералізацыя падрыхтавала спрыяльную глебу для лібералізацыі палітычнай. Неабходнасць пэўнага абнаўлення прызнавалася і часткай правячых колаў. У 1966 г. былі прыняты закон аб друку, які азначаў скасаванне папярэдняй цэнзуры, і «Арганічны закон», што прадугледжваў частковыя выбары ў картэсы і ўсталяванне пасады прэм’ер-міністра. Аднак ужо ў 1967 – 1968 гг. праціўнікі перамен дамагліся аднаўлення цэнзуры, а ўсе «злачынствы» супраць рэжыму ізноў сталі разглядацца не ў грамадзянскіх судах, а ў спецыяльных трыбуналах грамадскага парадку. У студзені 1969 г. у сувязі з масавымі забастоўкамі і студэнцкімі беспарадкамі ў Іспаніі на тры месяцы ўводзілася надзвычайнае становішча. Тады ж быў прыняты закон, згодна якому «Нацыянальны рух» (фаланга) прызнаваўся адзінай палітычнай арганізацыяй Іспаніі і кіруючай сілай нацыі. У 1970 г. была адноўленая смяротная кара за «палітычныя злачынствы».

Аднак перамены настойліва дыктаваліся і вельмі сталым узростам Ф. Франка (нар. у 1892 г.). У 1969 г. каўдыльё нарэшце прызначыў сваім пераемнікам на пасадзе галавы дзяржавы Хуана Карласа дэ Бурбона, унука скінутага ў 1931 г. іспанскага караля Альфонса XIII. Частку сваіх практычна неабмежаваных паўнамоцтваў Ф. Франка перадаў свайму даўняму паплечніку – прэзідэнту ўраду контр-адміралу Луісу Карэра Бланка.

«Нафтавы шок» 1973 г. моцна ўдарыў па іспанскай эканоміцы і спыніў эпоху *Desarollo*. Беспрацоўе вырасла ў 1975 г. да 21 % ад эканамічна актыўнага насельніцтва. Па краіне пракацілася новая хваля забастовак (усё яшчэ супрацьзаконных). Сітуацыяй скарысталіся баявікі баскскай тэрарыстычнай арганізацыі ЭТА і ажыццявілі паспяховы замах на Л. Карэра Бланка (быў падарваны авіябомбай). Новы кіраўнік ураду – Карлас Арыяс Навара – спрабаваў паднавіць рэжым пры дапамозе асцярожных рэформ (закон аб палітычных асацыяцыях), але стаў заложнікам барацьбы двух урадавых груповак. Скрайне правыя, г. зв. **«бункер»**, выступалі за «закручванне гаек», а **«апертурысты»** (ад ісп. *apertura* – «адкрыццё») бачылі будучае Іспаніі ў паступовым пераходзе да дэмакратыі.

### Становішча насельніцтва. Антыфранкісцкі, рабочы, прафсаюзны рух. Антываенны рух, студэнцкія хваляванні, нацыянальныя рух ў Каталоніі, Галісіі, Басконіі. Кансалідацыя апазіцыі

Уражальныя эканамічныя зрухі абумовілі ломку і адміранне традыцыйнага стэрэатыпу паводзін, заснаванага на аграрным укладзе жыцця. Паступова выцяснялася традыцыйная сялянская культура з яе моцнай каталіцкай традыцыяй. Актыўнае развіццё замежнага турызму ды эміграцыя іспанскіх беспра-

цоўных у іншыя еўрапейскія краіны спрыяла распаўсюджванню сярод іспанцаў заходніх стандартаў жыцця, а таксама прынцыпаў і каштоўнасцей буржуазнай дэмакратыі. Гэтыя змены падрывалі сацыяльны падмурак франкісцкага рэжыму станоўча ўплывалі на рост рухаў, апазіцыйных існаваўшай уладзе.

Паражэнне ў грамадзянскай вайне і жорсткія рэпрэсіі моцна абяскровілі і дэмаралізавалі апазіцыю франкізму. Антыдэмакратычнае заканадаўства таксама тармазіла апазіцыйную дзейнасць. Тым не менш, на працягу 1950-х – першай паловы 1970-х гг. антыфранкісцкія выступленні набіралі моц. Апазіцыйныя ідэі пранікалі нават у традыцыйна прафранкісцкае асяроддзе – каталіцкія і манархічныя колы.

У каталіцкім асяроддзі аформіўся хрысціянска-дэмакратычны апазіцыйны рух, які складаўся з некалькіх партый і арганізацый памяркоўнага і левага кірункаў. Хрысціянскія дэмакраты падтрымлівалі ідэю пераходу ад дыктатуры да манархіі, заяўлялі аб неабходнасці пераходу да дэмакратыі і правядзення справядлівай сацыяльнай палітыкі, адстойваючы пры гэтым маральна-этычныя прынцыпы і традыцыі. Большасць манархістаў, аб’яднаных у шэрагу палітычных партый, выступалі за канстытуцыйную манархію, шматпартыйнасць, дэмакратычныя свабоды і эканамічны прагрэс.

Традыцыйна крытычна да франкізму была настроеная большасць іспанскай інтэлігенцыі, асабліва яе маладзейшая генерацыя, і студэнцтва. Іспанская моладзь, эмацыйна слаба звязаная з крывавымі падзеямі грамадзянскай вайны і франкісцкай ідэалогіяй, была закранутая нонканфармсцкімі абнаўленчымі ідэямі і лозунгамі канца 1960-х гг. і жадала жыць у новай, свабоднай краіне. Выступленні іспанскіх студэнтаў, безумоўна, не маглі дасягнуць накалу тых, што ўзарвалі стабільнасць галісцкай Францыі, але таксама расхіствалі трываласць рэжыму Ф. Франка. Масавыя выступленні працоўных паступова падрывалі адно з апірышчаў рэжыму – «вертыкальныя сіндыкаты», афіцыйныя прафсаюзныя арганізацыі прадпрымальнікаў і працоўных, куды ў прымусовым парадку ўваходзіла практычна ўсё эканамічна актыўнае насельніцтва краіны. З канца 1950-х гг. з’яўляюцца прафсаюзы новага тыпу, больш самастойныя «рабочыя камісіі», якія паступова заваёўваюць усё большы аўтарытэт і папулярнасць. Левы фланг апазіцыі франкізму складалі ўсё яшчэ нелегальныя палітычныя партыі рабочых – ІСРП, КПІ, а таксама анарха-сіндыкалісцкая Федэрацыя анархістаў Іберыі (ФАІ).

Нацыяналістычны рух каталонцаў і баскаў, аформлены ў адпаведныя партыі, выступаў за палітычную аўтаномію сваіх правінцый і ў абарону сваіх моў і нацыянальнай культуры, актыўна ўдзельнічаў у барацьбе супраць дыктатуры. Бескампраміснасць уладаў, што цвёрда стаялі на пазіцыях прызнання «адзінства іспанскай нацыі» (таксама нацыяналістычных па прыродзе), і рэпрэсіі падрывалі веру асобных арганізацый ды іх лідараў у мэтазгоднасць выкары-

стання мірных сродкаў змагання і падштурхоўвалі іх, асабліва баскскіх нацыяналістаў, да тэрарыстычных метадаў барацьбы. Рух за аўтаномію і нацыянальныя правы ў адносна адсталай Галісіі быў значна слабейшым, але і ён валодаў немалымі рэсурсамі і патэнцыялам.

У першай палове 1970-х гг. нягледзячы на сур'ёзныя ідэйныя і палітычныя адрозненні, існуючыя ў шэрагах апазіцыі, паступова прабівала сабе дарогу тэндэнцыя да адзінства ўсіх антыфранкісцкіх сіл краіны. У жніўні 1974 г. было абвешчана аб стварэнні Дэмакратычнай рады, куды разам з КПІ увайшлі прадстаўнікі рабочых камісій, Народная сацыялістычная партыя і ліберальна-манархічныя колы. Тады ж апазіцыйныя каталіцкія і цэнтрысцкія партыі, а таксама ІСРП стварылі Платформу дэмакратычнай згоды. У кастрычніку 1975 г. гэтыя арганізацыі дасягнулі пагаднення аб сумеснай барацьбе з дыктатурай. Упершыню з часу ўсталявання франкісцкага рэжыму апазіцыйныя сілы Іспаніі дамагліся згоды адносна шляхоў ліквідацыі рэжыму і будучага краіны.

20 лістапада 1975 г. каўдыльё Ф. Франка памёр. Іспанія апынулася на гістарычным раздарожжы.

### Знешняя палітыка Ф. Франка. Мадрыдскі пакт

З пачаткам «халоднай вайны» знешнепалітычнае становішча франкісцкай Іспаніі палепшылася. Заходнія дзяржавы былі зацікаўленыя ў выкарыстанні антыкамунізму рэжыма Ф. Франка і выгоднага геапалітычнага становішча яго краіны ў сваіх інтарэсах. Ужо на працягу 1949 г. ЗША, Францыя і Вялікабрытанія аднавілі дыпламатычныя адносіны з Іспаніяй. У 1950 г. Генеральная Асамблея ААН скасавала сваю рэзалюцыю 1946 г., тым самым даючы дазвол на прызнанне франкісцкай Іспаніі. Знешнепалітычная ізаляцыя краіны была прарваная. У 1953 г. былі падпісаныя іспана-амерыканскія двухбаковыя пагадненні аб абароне, эканамічнай дапамозе і садзейнічанні ў мэтах узаемнай бяспекі – г. зв. **Мадрыдскі пакт**. У выніку, на трох ваенна паветраных базах Іспаніі былі размешчаны амерыканскія стратэгічныя ядзерныя бамбардзіроўшчыкі з ядзернай зброяй, а на ваенна-марской базе – падводныя лодкі з ядзернымі ракетамі. Не з'яўляючыся членам НАТО, Іспанія стала важнейшым элементам сістэмы паўночнаатлантычнай салідарнасці. Вялікае значэнне для далейшага паляпшэння знешнепалітычнага становішча краіны стаў візіт амерыканскага прэзідэнта Д. Эйзенхаўэра ў Мадрыд (1959). У 1955 г. Іспанія стала членам ААН, а з 1958 г. стала супрацоўнічаць з Сусветным банкам. Важнае значэнне для Іспаніі мела падпісанне канкардату з Ватыканам (1953).

Напрыканцы 1960-х гг. гібралтарскае пытанне прывяло да абвастрэння іспана-брытанскіх адносінаў. З 1704 г., з часоў вайны за Іспанскую спадчыну, Гібралтар – самы паўднёвы ўскраек Пірэнейскага паўвострава плошчай каля 7 км$^2$ – знаходзіўся ў руках Вялікабрытаніі. Любыя прэтэнзіі Іспаніі на аднаў-

ленне суверэнітэту над стратэгічна важнай кропкай на выйсці з Міжземнага мора ў Атлантычны акіян натыкаліся на рашучы адпор брытанцаў. У 1967 г. у Гібралтары быў праведзены рэферэндум, на якім жыхары прагаласавалі за тое, каб і надалей заставацца падданымі Злучанага каралеўства. На знак прынцыповай нязгоды з гэтым рашэннем Іспанія зачыніла мяжу з Гібралтарам.

Прагматызм і агульнае аздараўленне абстаноўкі ў свеце дазволілі Іспаніі з канца 1960-х гг. развіваць гандлёвыя адносіны з сацыялістычнымі краінамі, яна падпісала з некаторымі з іх консульскія і гандлёвыя пагадненні. Нягледзячы на прыярытэтнасць іспана-амерыканскіх адносін, Іспанія захоўвала актыўныя гандлёвыя сувязі з сацыялістычнай Кубай. Для Ф. Франка кубінскі лідар Ф. Кастра найперш быў этнічным іспанцам і дыктатарам, а не камуністам. Не дзіва, што самыя сардэчныя адносіны ў Лацінскай Амерыцы франкісцкі рэжым падтрымліваў з дыктатарскімі рэжымамі – А. Стрэснэра ў Парагваі, А. Самосы ў Нікарагуа і А. Пінaчэта ў Чылі. У 1973 г. Іспанія ўсталявала дыпламатычныя адносіны з Кітайскай Народнай Рэспублікай і прызнала ГДР.

З сярэдзіны 1950-х гг. пад націскам нацыянальна-вызваленчых рухаў франкізм стаў праводзіць больш гнуткую палітыку ў сваё каланіяльнай імперыі. У 1956 г. Іспанія пагадзілася на ліквідацыю пратэктарату ў Паўночным Марока (за выключэннем гарадоў Сеўта і Мелілья, якія ёй належаць дагэтуль) і перадачу гэтай тэрыторыі незалежнаму Марока. А ў лістападзе 1975 г. Іспанія падпісала з Марока і Маўрытаніяй Мадрыдскія пагадненні па далейшым лёсе Іспанскай Сахары. Іспанцы пакідалі тэрыторыю сваёй былой калоніі, а вызваленыя землі падлягалі падзелу паміж дзвюма названымі афрыканскімі дзяржавамі.

## Тэма 14. Іспанія ў другой палове 1970-х – пачатку 2010-х гг.

### Ліквідацыя франкісцкага рэжыму. Пачатак пераходу да дэмакратыі. Усеагульныя парламенцкія выбары 1977 г. «Пакты Манклоа». Канстытуцыя 1978 г. Дзейнасць ураду А. Суарэса

20 лістапада 1975 г. памёр Ф. Франка. Ужо праз два дні 37-гадовы Хуан Карлас дэ Бурбон быў каранаваны, стаўшы Хуанам Карласам I і галавой дзяржавы. У вышэйшых колах палітычнай улады разгарнулася змаганне за палітычную спадчыну памерлага дыктатара. Галоўная барацьба разгортвалася паміж франкісцкім «бункерам», які імкнуўся захаваць статус-кво, з аднаго боку, і мадэрнізатарскімі групоўкамі лібералаў і тэхнакратаў, якія арыентаваліся на рэформы і еўрапейскую інтэграцыю, – з другога.

У ліпені 1976 г. прыхільнікі перамен атрымалі перамогу і магчымасць сфарміраваць урад. Новым прэм’ер-міністрам Іспаніі стаў вядомы адвакат і палітычны дзеяч генеральны сакратар Нацыянальнага руху (кі-

раўнік франкісцкай партыі) Адольфа Суарэс (1976 – 1981). Новы лідар, нягледзячы на сваю партыйную прыналежнасць, здолеў у дастаткова сціслыя тэрміны ліквідаваць асновы франкізму і забяспечыць пачатак усталявання норм і прынцыпаў буржуазнай дэмакратыі. Ужо ў ліпені 1976 г. была абвешчаная частковая амністыя палітычным зняволеным.

Прававой базай для пераходу да дэмакратыі стаў законапраект **«Аб палітычнай рэформе»**, прызнаваўшы, у прыватнасці, суверэнітэт народу і непахіснасць правоў чалавека. Гэтым дакументам прапаноўвалася ўсталяваць двухпалатныя картэсы, дэпутаты якіх абіраліся ўсеагульным, прамым і тайным галасаваннем (за выключэннем 20 % сенатараў, якія прызначаліся непасрэдна каралём). Картэсы надзяляліся правам уносіць змены ў «Асноўныя законы» перыяду Ф. Франка, альбо наогул скасоўваць іх. Франкісцкія картэсы ўхвалілі гэты законапраект, пасля чаго ён быў вынесены на агульнанацыянальны рэферэндум. 15 снежня 1976 г. законапраект быў падтрыманы падаўляючай большасцю ўдзельнікаў рэферэндуму (94,2 %) і набыў моц закону.

Вынікі рэферэндуму сталі па-сутнасці вотумам народнага даверу рэфарматарскаму курсу А. Суарэса. Выконваючы ўзятыя на сябе абавязкі, ўрад скасаваў сумна вядомыя Трыбуналы грамадскага парадку, даў амністыю новым катэгорыям палітычных вязняў. Акрамя таго, былі ўнесеныя змены ў выбарчую сістэму: замацоўвалася прапарцыйнае прадстаўніцтва на выбарах у заканадаўчыя органы ўлады. На базе папраўкі да Закона аб праве на фарміраванне палітычных асацыяцый былі легалізаваныя раней забароненыя палітычныя партыі, уключна з Іспанскай сацыялістычнай рабочай партыяй (ІСРП) і Камуністычнай партыяй Іспаніі (КПІ). Адначасова распускаўся Нацыянальны рух і пацвярджалася свабода на ўтварэнне незалежных прафсаюзных і прадпрымальніцкіх арганізацый.

Парламенцкія выбары, якія адбыліся ў чэрвені 1977 г. (першыя свабодныя выбары з 1936 г.), былі адзначаныя высокай актыўнасцю выбаршчыкаў (яўка склала 78 %) і палітычных партый (да ўдзелу былі дапушчаныя 156 партый). Яны прынеслі пераканаўчую перамогу цэнтрысцкай праўрадавай партыі **Саюз дэмакратычнага цэнтру (СДЦ)**, якая атрымала 34,7 %. Пасля дзесяцігоддзяў, праведзеных у падполлі і на эміграцыі, таксама выдатна выступілі сацыялісты, ўзначаленыя маладым, энергічным лідарам Філіпэ Гансалесам – 29,2 %. Іншыя партыі значна адсталі: камуністы набралі 9,3 %, а правакансерватыўны **Нацыянальны альянс (НА)** – галоўны спадкаемца «Нацыянальнага руху» – 8,2 %.

Мірнаму пераходу ад аўтарытарызму да дэмакратычнай мадэлі развіцця ў Іспаніі ў значнай ступені пасадзейнічалі г. зв. **«Пакты Манклоа»** (у літаратуры таксама выкарыстоўваецца назва «Пакт Манклоа»). 8 – 9 кастрычніка 1977 г. ва ўрадавай рэзідэнцыі Манклоа быў скліканы круглы стол прад-

стаўнікоў палітычных партый і прафсаюзаў для дасягнення кансенсусу па важнейшых пытаннях нацыянальнай палітыкі. Выпрацаваныя прапановы былі разгледжаны і дапоўнены ў спецыяльных камісіях картэсаў. 25 кастрычніка 1977 г. прадстаўнікі асноўных палітычных сіл Іспаніі (за выключэннем НА) падпісалі пагадненне, якое было прадстаўлена ў картэсы і хутка ўхвалена і аформлена ўрадам у выглядзе заканадаўчага акту. У палітычнай частцы дакументу прадугледжваліся: усталяванне парламенцкага кантролю над СМІ; перагляд крымінальнага і вайсковага кодэксаў у бок іх змякчэння; дэмакратызацыю закону аб грамадскім парадку і г. д.

«Пакты Манклоа» з'явіліся кампрамісам. Кожны з бакоў пагадзіўся на пэўныя саступкі дзеля дасягнення агульнай мэты – стабілізацыі рэжыму прадстаўнічай дэмакратыі, які нараджаўся. Іх падпісанне дазволіла стварыць атмасферу «цывілізаванага суіснавання» асноўных палітычных сіл краіны і неўзабаве замацаваць парламенцкую дэмакратыю заходнееўрапейскага тыпу.

Восенню 1978 г. завяршылася напружаная праца над праектам новай канстытуцыі краіны. 6 снежня 1978 г. ён быў вынесены на рэферэндум і атрымаў ухваленне большасці грамадзян. За новую канстытуцыю прагаласавала 15,7 млн. іспанцаў, што склала 87,7 % ад колькасці галасаваўшых і 58,9 % ад тых, хто меў права голасу. Напрыканцы снежня 1977 г. канстытуцыя была падпісана каралём і набыла моц.

**Канстытуцыя 1978 г.** вызначала форму кіравання іспанскай дзяржавы як парламенцкую манархію і абвяшчала Іспанію «сацыяльнай, прававой і дэмакратычнай дзяржавай, вышэйшымі каштоўнасцямі якой з'яўляюцца свабоды, справядлівасць, роўнасць і палітычны плюралізм». Кароль лічыцца галавой іспанскай дзяржавы і сімвалам яе еднасці, ён жа з'яўляецца галоўнакамандуючым. Яго палітычная ініцыятыва галоўным чынам абмяжоўваецца высоўваннем кандыдатуры Старшыні ўраду (прэм'ер-міністра). Картэсы (двухпалатны парламент) вырашае пытанні заканадаўства, бюджэту і спадкавання прастолу. Выканаўчая ўлада належыць ураду, яму падпарадкаваны ўвесь дзяржаўны апарат, у тым ліку органы бяспекі. Урад вызначае асноўныя накірункі ўнутранай і знешняй палітыкі, валодае правам заканадаўчай ініцыятывы і г. д.

Аб'ёмісты раздзел канстытуцыі прысвечаны правам і свабодам грамадзян. Усе іспанцы роўныя перад законам і кожны мае права на жыццё, асабістую свабоду і недатыкальнасць, на выбар месцажыхарства і свабоду перасоўвання, палітычныя свабоды, прамое выбарчае права з 18 гадоў і г. д. Акрамя таго, шэрагам сваіх палажэнняў канстытуцыя замацоўвала этнарэгіянальную асіметрычнасць уладкавання Іспаніі: прызнаваліся пэўныя перавагі г. зв. «гістарычных нацыянальнасцяў альбо правінцыяў» – Краіны Баскаў, Каталоніі і Галісіі. У адрозненне ад эпохі франкізму Канстытуцыя 1978 г. уключыла палажэнне аб адасабленні касцёлу ад дзяржавы.

Прыняцце канстытуцыі стала важнейшым крокам на шляху дэмакратызацыі краіны. Аднак прапісаныя дэмакратычныя прынцыпы шмат у чым разыходзіліся з постфранкісцкімі рэаліямі. Вырашыць мноства праблем, якія назапашваліся дзесяцігоддзямі адным махам было нерэальна. Востра паўстала пытанне практычнай перабудовы органаў улады і дзяржаўнага апарату. Станавілася ясна, што ўрад А. Суарэса і яго ўрадавая партыя СДЦ няздольныя даць новы імпульс рэфарматарскім пераўтварэнням. У гэткай абстаноўцы галава кабінету прыняў рашэнне аб правядзенні датэрміновых парламенцкіх і муніцыпальных выбараў.

Сакавіцкія парламенцкія выбары не выявілі істотных зрухаў у палітычных перавагах іспанцаў. СДЦ атрымаў 34,9 % галасоў, ІСРП – 30 %, а КПІ – 10,7 %. Здала пазіцыі правакансерватыўная кааліцыя «Дэмакратычная каардынацыя» (пераемніца НА) – толькі 5,9 %. Падобны расклад сіл быў зафіксаваны і на муніцыпальных выбарах. Гэткім чынам, дэмакратычная Канстытуцыя 1978 г., парламенцкія і муніцыпальныя выбары 1979 г. канчаткова пахавалі франкізм як палітычную сістэму.

Напрыканцы 1970-х гг. дасягнуты на базе «Пактаў Манклоа» палітычны кансенсус стаў пацiху губляць сваю сілу. Ва ўмовах захавання эканамічных цяжкасцяў паглыбляўся раскол паміж СДЦ і левымі партыямі. Выяўляліся ўзрастальныя рознагалоссі паміж палітычнымі плынямі цэнтрысцкага і правацэнтрысцкага кшталту. Нягледзячы на гэта, СДЦ і левым партыям удалося дасягнуць паразумення ў пытанні зацвярджэння картэсамі Аўтаномных статутаў Каталоніі і Краіны Баскаў (1979), якія пашырылі правы гэтых рэгіёнаў з моцнай этнакультурнай спецыфікай. Аднак далейшая палярызацыя палітычных сіл краіны і шэраг няўдач (напрыклад, правал законапраекту аб аўтаноміі ўніверсітэтаў) выканаўчай улады прывялі да адстаўкі А. Суарэса. У лютым 1981 г. новым старшынёй ураду стаў яшчэ адзін прадстаўнік СДЦ Леапольда Кальва Сатэла (1981 – 1982).

### Сацыяльна-эканамічнае развіццё краіны ў другой палове 1970-х – 2010-х гг. Значэнне «Пактаў Манклоа». Перабудова прамысловасці. Эканамічныя вынікі ўваходжання Іспаніі ў ЕЭС. Хуткі эканамічны рост пачатку XXI ст. і надыход крызісу

Сусветны эканамічны крызіс 1974 – 1975 гг. вельмі негатыўна адбіўся на іспанскай эканоміцы. Прычыны гэтага хаваліся ў арыентацыі прамысловасці Іспаніі на экспартныя галіны, рэзкім скарачэнні дзяржаўных інвестыцый у вытворчасць, хуткім росце заробкаў і г. д. Скрайне адмоўна для Іспаніі як нафтаімпартуючай краіны складвалася кан'юнктура на міжнародных энергетычных рынках. У другой палове 1970-х гг. сярэднегадавы рост ВУП складаў толькі 1,9 %, назіраўся рост цэн і паскарэнне інфляцыйных працэсаў. У перыяд з 1975 па 1985 гг. колькасць беспрацоўных у Іспаніі павялічылася на 1 млн. чалавек.

У краіне ўпалі тэмпы росту вытворчасці, у крытычным становішчы апынулася фінансавая сістэма. Імкліва павялічвалася знешняя запазычанасць: з $1,7 млрд. у 1974 г. да $27,4 млрд. у 1982 г. Яшчэ адной праблемай стала ўзмацненне дыспрапорцый у развіцці рэгіёнаў Іспаніі. У 1981 г. больш за палову ўсяго нацыянальнага даходу канцэнтравалася ў 8 (з 50) правінцый краіны, што займалі толькі 12 % яе тэрыторыі – у Мадрыдзе, Барселоне, Валенсіі, Аўеда і некаторых іншых. Даход на аднаго занятага ў найбольш эканамічна развітых правінцыях Іспаніі у 2 – 3 разы перавышаў менш развітыя.

Вялікае значэнне для адноснай стабілізацыі эканамічнага становішча краіны стала рэалізацыя рашэнняў, зафіксаваных ў «Пакце Манклоа». Левыя сілы пагадзіліся з абмежаваннем росту заробкаў, а правыя – з правядзеннем прагрэсіўнай падатковай рэформы. Былі ўзгоднены захады, якія дазвалялі кампаніям дастаткова свабодна звальняць сваіх рабочых. Тым самым, разбураўся «сацыяльны пакт» франкісцкіх часоў, калі рабочыя вымушана падтрымлівалі палітычны спакой наўзамен на гарантыі супраць звальнення. Са свайго боку, урад абавязваўся палепшыць дзяржаўную сістэму забеспячэння і ўвесці ў дзеянне прафсаюзныя правы і свабоды ў адпаведнасці са стандартамі Міжнароднай арганізацыі працы. Падпісанне «Пакту» дазволіла пазбегнуць калапсу іспанскай эканомікі на ключавым этапе пераходу ад аўтарытарызму да дэмакратыі і стварыць трывалую базу для антыкрызісных захадаў.

У 1982 г. з прыходам да ўлады ІСРП на чале з Ф. Гансалесам быў узяты курс на рэструктурызацыю прамысловасці, павелічэнне інвестыцый у прамысловасць, мадэрнізацыю рынкаў фінансаў і капіталу, прыватызацыю шэрагу дзяржаўных прадпрыемстваў і падрыхтоўку да ўступлення Іспаніі ў ЕЭС. У 1984 г. урад сацыялістаў прыняў нацыянальны план па электроніцы і інфарматыцы. Пры дапамозе амерыканскіх, заходнегерманскіх і японскіх тэхналогій іспанскія ўлады разлічвалі зрабіць якасны скачок на шляху навукова-тэхнічнай рэвалюцыі і зрабіць іспанскую прамысловую прадукцыю больш канкурэнтаздольнай на знешнім рынку. Перадавы вопыт і тэхналогіі японскіх кампаній меркавалася выкарыстаць для мадэрнізацыі адсталых суднабудавання і чорнай металургіі. З гэтай жа мэтай «Фольксвагену» быў прададзены кантрольны пакет акцый вядучай дзяржаўнай аўтамабілебудаўнічай кампаніі СЕАТ. Акрамя таго, ўрад сацыялістаў заахвочваў транснацыянальныя кампаніі (ТНК) ствараць на тэрыторыі Іспаніі свае прадпрыемствы-філіялы. У краіне пачалі дзейнічаць заводы «Джэнерал мотарс», «Нісан», «Соні» і многіх іншых сусветных галіновых лідараў. Да 1987 г. аб'ём прадукцыі ў большасці важнейшых галінах рэзка вырас, і каля 30 % занятых у найменш канкурэнтаздольных галінах прамысловасці (каля 250 тыс. чалавек) перайшлі ў ў іншыя галіны.

Развітанне з эпохай франкізму ў гаспадарчай вобласці азначала далейшую лібералізацыю і дэмакратызацыю іспанскай эканомікі. Аднак з 1989 па 1993 гг. прамысловасць Іспаніі аказалася ў стане дэпрэсіі, якая характарызавалася штогадовым зніжэннем прамысловай вытворчасці. На вельмі высокім узроўні, парадку 20 %, трымалася беспрацоўе. З 1994 г. пачынаецца новы індустрыяльны рывок. Гэтаму спрыяла падвышэнне ўнутранага і знешняга попыту на прадукцыю іспанскіх вытворцаў, зніжэнне курсу іспанскай песеты адносна амерыканскага долара і нямецкай маркі і некаторыя іншыя фактары. Важнае значэнне мела паляпшэнне агульнага клімату для прадпрымальніцкай дзейнасці. У прыватнасці ажыццяўляліся арганізацыйныя захады, накіраваныя на стымуляванне эфектыўнасці работы нацыянальнай прамысловасці і механізмаў кіравання ёй, актывізацыя працэсу прыватызацыі дзяржаўных прадпрыемстваў, правядзенне канверсіі і рэструктурызацыі абарончага сектару краіны. Да канца 1990-х гг. Іспанія дасягнула значных поспехаў і па асноўных макраэканамічных паказчыках, і па ўзроўні матэрыяльнага дабрабыту насельніцтва. Асабліва вялікі крок у эканамічным развіцці быў зроблены ў 1998 – 2007 гг., калі Іспанія ўдвая павялічыла аб'ём сваёй эканомікі, а яе ВУП перавысіў €1 трлн. У 2000 – 2007 гг. тэмпы росту іспанскага ВУП былі найбольшымі сярод усіх вядучых эканомік свету. Краіна без асаблівых цяжкасцяў адмовілася ад нацыянальнай валюты (песеты) і з 1 студзеня 2002 г. перайшла на еўра.

Эканамічны рывок, які зрабіла Іспанія быў вынікам спалучэння ўнутраных і знешніх фактараў росту. Да першых трэба, найперш, аднесці будаўнічы бум. На долю будаўнічай галіны прыпадала 15 – 17 % ВУП (у 3 – 4 разы болей, чым у іншых развітых краінах). Важным рэсурсам эканамічных поспехаў стаў наплыў таннай працоўнай сілы з-за мяжы – колькасць імігрантаў дасягнула 4 млн. чалавек, што ўжо складала каля 10 % насельніцтва краіны.

Іспанская эканоміка пераўтварылася ў сучасную постіндустрыяльную эканоміку са значнай перавагай у яе структуры сферы паслуг, дзе ствараецца 70 % ВУП і занята каля 72 % усёй працоўнай сілы Іспаніі. Важнейшым сегментам гэтай сферы стаў турыстычны бізнес. Нягледзячы на тое, што на працягу апошняга дзесяцігоддзя ўязны турызм у Іспанію стаў змяншацца (з 62 млн. у 1997 г. да 52 млн. у 2009 г.), ён па-ранейшаму прыносіць краіне вялікія грошы, напрыклад, у 2009 г. – $53 млрд.

Зразумела, што падобны паспяховы мадэрнізацыйны праект быў бы немагчымы без прыярытэтнага развіцця прамысловасці. Вялікага поспеху дасягнула, напрыклад, аўтамабілебудаванне. Па вытворчасці аўтамашын Іспанія ўвайшла ў першую еўрапейскую тройку і займала 7-е месца ў свеце (па 3 млн. штук у 2003 і 2004 гг.) Таксама выдатна спрацавала крэдытна-фінансавая сістэма Іспаніі з яе высокім узроўнем канцэнтрацыі капіталу, наяўнасцю буйных ашчадных кас і зусім нязначным замежным удзелам.

Да важнейшых знешніх фактараў эканамічнага росту у першую чаргу неабходна аднесці падключэнне да еўрапейскіх інтэграцыйных працэсаў. Далу-

чэнне да ЕЭС (1986) і актыўны ўдзел у будаўніцтве аб’яднанай Еўропы прынесла Іспаніі важкія фінансавыя і эканамічныя дывідэнды. Доўгія гады краіна заставалася галоўным атрымальнікам субсідый Супольнасцяў. У перыяд з 1987 – 2007 гг. іх сума склала €186 млрд. Важна і тое, што іспанцы здолелі рацыянальна распарадзіцца гэтымі сродкамі, у прыватнасці, зрабіўшы інвестыцыі ў стварэнне сучаснай транспартнай інфраструктуры.

Пры тым, што Іспанія бедная зямельнымі рэсурсамі – толькі 10 % яе плошчы займаюць зручныя, пладародныя землі – сельская гаспадарка займае асаблівае месца ў структуры іспанскай эканомікі. Яна дае 3,4 % ВУП краіны і ў ёй занята 4,2 % працаздольнага насельніцтва краіны (дадзеныя на 2009 г.; доля занятых у аграрным сектары ў 1960-х гг. складала каля 40 %). Традыцыйна вядучай галіной сельскай гаспадаркі з’яўлялася вырошчванне збожжавых культур. І сёння каля 20 % пасяўных плошчаў адведзена пад вытворчасць пшаніцы. Іспанія можа пахваліцца самай высокай урадлівасцю ў свеце ў вырошчванні рысу. З 1970-х гг. рэзка вырас аб’ём вытворчасці садавіны і фруктаў. Ужо ў 1992 г. аб’ём выращчаных пладоў перасягнуў у вагавым выражэнні ўраджай збожжа. Многія віды садавіны і гародніны вырошчваюцца на экспарт, галоўным чынам у краіны ЕС, і краіна атрымлівае вялікія прыбыткі ад гандлю гэтай прадукцыяй. Напрыклад, Іспанія займае 3-е месца ў свеце па вытворчасці віна, 4-е – па вырошчванні цытрусавых, а таксама забяспечвае значную частку сусветнай вытворчасці алівак і алею. Немалое значэнне для эканомікі краіны мае рыбалоўства. Іспаніі належыць адзін з буйнейшых у Еўропе рыбалоўны флот. Па здабычы і перапрацоўцы рыбы і марапрадуктаў Іспанія ўваходзіць у дваццатку сусветных лідараў.

Да 2008 г. эканоміка краіны лічылася адной з найбольш паспяховых і дынамічных сярод краін Еўрапейскага саюзу. Тым не менш, ужо да гэтага часу сталі выяўляцца праблемы, напрыклад, рост знешнегандлёвага дэфіцыту, аслабленне канкурэнтаздольнасці на сусветных рынках і высокі ўзровень інфляцыі. У 2008 г. эканамічны рост практычна спыніўся, а з пачатку 2009 г. Іспанія ўступіла ў паласу крызісу. Адбылося падзенне прамысловай вытворчасці (аўтамабіляў у 2009 г. выраблялася ўжо толькі 2,2 млн.). Высокага ўзроўню дасягнула беспрацоўе (звыш 20 % напачатку 2011 г.), вялікі дзяржаўны доўг (больш за 50 % ВУП) узмацніў галасы скептыкаў, якія прадракаюць Іспаніі дэфолт.

### Палітычнае жыццё Іспаніі ў 1980-я – 2000-я гг. Заняпад СДЦ. Палітыка урадаў ІСРП і Народнай партыі. Ф. Гансалес. Х. М. Аснар. Х. Л. Сапатэра

23 лютага 1981 г., калі ў картэсах ішло галасаванне па кандыдатуры новага прэм’ер-міністра, была зроблена спроба дзяржаўнага перавароту. У парламенцкі будынак уварвалася група змоўшчыкаў – грамадзянскіх гвардзейцаў на чале з падпалкоўнікам Антоніа Тэхера. Яны высунулі шэраг патрабаванняў, накіраваных на вяртанне краіны да старых франкісцкіх метадаў праўлення.

Адначасова ў бок Мадрыда высунулася танкавая калона путчыстаў. Аднак спроба вайсковага пераваротy правалілася. Кароль – галоўнакамандуючы ўзброенымі сіламі краіны, на спрыянне якога разлічваў А. Тэхера і яго паплечнікі – рэзка асудзіў путчыстаў. Змоўшчыкі былі арыштаваныя і асуджаныя. 27 лютага 1981 г. па ўсёй Іспаніі прайшлі масавыя маніфестацыі ў падтрымку канстытуцыі і дэмакратыі (на адной з іх дзеючы прэм’ер-міністр Хасэ Луіс Сапатэра ўпершыню сустрэў сваю будучую жонку). Як аказалася, гэта быў апошні выклік старой аджылай Іспаніі маладой іспанскай дэмакратыі. Хуан Карлас I яшчэ раз красамоўна засведчыў той факт, што з’яўляецца надзейным гарантам непахіснасці канстытуцыі і яе дэмакратычных прынцыпаў. Гэта таксама вельмі паспрыяла ўмацаванню яго асабістага аўтарытэту і значнаму росту даверу да манархіі як да інстытута ўлады.

Новым прэм’ер-міністрам быў абраны Леон Кальва Сатэла (1981 – 1982). Яго ўрад прыняў некалькі вельмі важных і своечасовых рашэнняў. Былі абвешчаныя надзвычайныя захады па барацьбе з тэрарызмам. У чэрвені 1981 г. картэсы прынялі закон аб разводзе (з улікам ментальнасці значнай часткі іспанцаў – вельмі рызыкоўны для ўраду крок). Пачаліся перамовы аб далучэнні Іспаніі да НАТО. Тым не менш, унутры СДЦ абвастрыліся рознагалоссі, што прывялі да фактычнага расколу партыі. Урад страціў парламенцкую большасць. На кастрычнік 1982 г. былі абвешчаныя датэрміновыя парламенцкія выбары.

Перамогу атрымала ІСРП, атрымаўшы рэкордныя 10 млн. галасоў выбаршчыкаў (спатрэбіцца 18 гадоў, каб перасягнуць гэты вынік). Гэта дазволіла ёй здабыць абсалютную большасць у Кангрэсе дэпутатаў (ніжняй палаце картэсаў) – у саюзе з Каталонскай сацыяльнай партыяй (дзейнічала толькі ў Каталоніі) яна заваявала 48 % і атрымала 202 месцы з 350.

Адна з найстарэйшых партый у краіне, ІСРП, заставалася масавай партыяй, але арыентавалася ўжо не толькі на рабочы клас, але таксама і на больш памяркоўных выбаршчыкаў. Адмовіўшыся ад ідэй навуковага камунізму, сацыялісты падкрэслівалі сваю прыхільнасць да каштоўнасцей буржуазнай дэмакратыі і сацыял-рэфармізму. Другое месца на выбарах заняў Народны альянс – 107 мандатаў. НА пачынаў, як неафранкісцкая партыя, але напачатку 1980-х гг. згуртаваўшы вакол сябе шэраг правых груповак, паступова пераўтварыўся ў буйнейшае палітычнае аб’яднанне правага кірунку. Поспех на выбарах дазволіў гэтай партыі замацавацца ў статусе вядучай апазіцыйнай сілы краіны. Новым прэм’ер-міністрам Іспаніі стаў лідар сацыял-дэмакратаў, юрыст па адукацыі, Філіпэ Гансалес (1982 – 1996), які сфарміраваў урад з памяркоўных сацыялістаў і тэхнакратаў.

Палітыка сацыялістаў у Іспаніі аказалася не зусім традыцыйнай для партый падобнай арыентацыі. Шэраг прынятых законаў прадугледжваў захады па

падвышэнні якасці жыцця мільёнаў іспанцаў, што было вельмі важна ва ўмовах эканамічных цяжкасцяў пачатку 1980-х гг. Гэтак, напрыклад, уводзіўся 40-гадзінны працоўны тыдзень, да 30 дзён павялічваліся аплатныя адпачынкі, падвышаліся дапамогі шматдзетным сем'ям, да 65 гадоў быў зніжаны пенсійны ўзрост, а медыцынскае абслугоўванне стала даступным практычна для ўсіх іспанцаў. Тым не менш, у краіне ажыццяўлялася прыватызацыя дзяржаўных прадпрыемстваў, урад выкарыстоўваў жорсткія манетарысцкія захады барацьбы з інфляцыяй, узмацняла барацьбу з фінансавымі махлярствамі, пільна сачыла за падатковай дысцыплінай.

Таксама сацыялісты ажыццявілі цэлы шэраг іншых рашучых пераўтварэнняў. Рэформа дзяржаўнага апарату скараціла колькасць дзяржаўных служачых. Быў узяты курс на рацыяналізацыю работы дзяржаўных структур, з мэтай пераўтварыць іх у прыладу сацыяльных рэформ і дэмакратызацыі краіны. Вайсковая рэформа зменшыла колькасць афіцэрскага корпусу, забяспечыла большыя магчымасці для кар'ернага росту ніжэйшых чыноў, прадугледжвала захады па прадухіленні магчымасці вайсковага перавароту. Была праведзена рэформа агульнаадукацыйнай школы, уведзена аўтаномія ўніверсітэтаў.

Трывалая сацыяльна база, эфектыўная сацыяльна-эканамічная палітыка, ўзважаны знешнепалітычны курс і абноўленая ідэалагічная база партыі дазволілі ІСРП і яе лідару Ф. Гансалесу надоўга замацавацца на іспанскім палітычным Алімпе. На парламенцкіх выбарах 1986, 1989 і 1993 сацыялісты захоўвалі парламенцкую большасць і права фарміраваць урад. Хаця перавага ІСРП над канкурэнтамі была ўжо не настолькі камфортнай. Напрыклад, на датэрміновых выбарах 1989 г. яна заваявала ў Кангрэсе дэпутатаў толькі 175 мандатаў (39,6 %) з 350 і мела большасць толькі за кошт таго, што 4 дэпутаты баскскай нацыяналістычнай партыі «Эры Батасуна» ніколі не бралі ўдзелу ў пасяджэннях. Напярэдадні гэтых выбараў на базе галоўнай апазіцыйнай партыі Народны альянс была створана правацэнтрысцкая **Народная партыя (НП)**, якую ўзначаліў малады і перспектыўны лідар Хасэ Марыя Аснар. На выбарах у Картэсы 1993 г. ІСРП атрымала ўжо толькі 159 месцаў (38,8 %) і страціла абсалютную большасць. Яе лідар Ф. Гансалес быў пераабраны прэм'ер-міністрам толькі за кошт падтрымкі баскскіх і каталонскіх нацыяналістаў. Затое моцны рывок да ўлады зрабіла Народная партыя – 141 мандат (34,8 %).

За 13 гадоў і 4 месяцы, што ІСРП знаходзілася пры ўладзе, было дапушчана нямала памылак і пралікаў. Напрыклад, у сярэдзіне 1990-х гг. беспрацоўе дасягнула 22 % (найгоршы паказчык па ЕС). Як бывае практычна з любой партыяй, што «заседзелася» пры ўладзе, яе члены неаднаразова аказваліся ў цэнтры карупцыйных скандалаў. За гэты час канчаткова афармілася моцная апазіцыя праўленню ІСРП ў асобе Народнай партыі.

У сакавіку 1996 г. на выбарах у Картэсы ІСРП пацярпела сакрушальнае паражэнне, набраўшы толькі 37,8 % галасоў выбаршчыкаў. Народная партыя заваявала 38,8 % галасоў (156 мандатаў – найменшая ўрадавая фракцыя ў гісторыі краіны) і яе старшыня Хасэ Марыя Аснар стаў новым прэм'ер-міністрам Іспаніі (1996 – 2004). Адметнасцю новага ўраду стала тое, што ён не абапіраўся на парламенцкую большасць (НА мела толькі на 15 мандатаў болей, чым ІСРП). Выбары таксама прадэманстравалі яўную тэндэнцыю да складвання сістэмы дамінавання дзвюх асноўных канкурэнтных сіл – правацэнтрысцкай НП і левацэнтрысцкай ІСРП.

Важнейшымі праблемамі новага ўраду сталі наданне новага імпульсу сацыяльна-эканамічнаму развіццю краіны і барацьба з сепаратызмам і тэрарызмам. Першая задача вырашалася даволі паспяхова. Але другая пераўтварылася ў бясконцы галаўны боль, пазбавіцца якога было немагчыма нават сумеснымі намаганнямі ўсіх палітычных партый – у іспанскім грамадстве існуе кансенсус адносна адзінага фронту барацьбы супраць тэрарыстаў (гл. далей).

Палітыка НП выявіла немалую пераемнасць адносна курсу папярэдніка. Была працягнутая лібералізацыя эканомікі. Пры фінансавай дапамозе ЕС былі палепшаныя асноўныя эканамічныя паказчыкі, зніжаны ўзровень беспрацоўя. У межах падатковай рэформы праводзілася зніжэнне падаткаў. Ажыццяўлялася лібералізацыя і прыватызацыя дзяржаўных прадпрыемстваў. Урад Х. М. Аснара здолеў забяспечыць сацыяльны мір у краіне, суцішыць забастовачны рух, стварыць умовы для хуткага эканамічнага росту і стабілізаваць палітычную абстаноўку.

Эканамічны і палітычны курс Народнай партыі быў падтрыманы іспанцамі на выбарах у Картэсы 2000 г. НП супрацьстаяла аб'яднаная апазіцыя сацыялістаў і камуністаў, якія перад выбарамі заключылі пакт аб адзінстве дзеянняў. Апрача таго, левыя мелі ўсе шанцы прыцягнуць на свой блок баскскіх і каталонскіх нацыяналістаў. Сацыялісты і камуністы выступілі з вельмі радыкальнымі прапановамі: увесці 35-гадзінны працоўны тыдзень, значна падвысіць мінімальны заробак, зраўняць мінімальную пенсію з мінімальным заробкам і г. д. НП парыравала гэтыя папулісцкія абяцанні тым, што іх выкананне будзе каштаваць бюджэту ледзьве не $20 млрд. і прывядзе краіну да фінансавага краху. Гэтым разам Х. М. Аснар атрымаў магчымасць стварыць урад большасці: яго партыя здабыла рэкордную падтрымку іспанцаў (10,3 млн. галасоў або 44,5 %) і атрымала 183 мандаты (у ІСРП засталося толькі 125 месцаў).

Чарговае паражэнне на выбарах выклікала ўнутрыпартыйны крызіс у ІСРП. Новым лідарам гэтай партыі стаў дастаткова малады палітык Хасэ Луіс Сапатэра (ён быў абраны ў парламент яшчэ ў 26-гадовым узросце, стаўшы самым маладым дэпутатам у гісторыі). Змены ў партыйным кіраўніцтве вывялі

партыю на шлях абнаўлення. Ідучы следам за Э. Блэрам («трэці шлях») і Г. Шродэрам («новы цэнтр»), Х. Л. Сапатэра прапанаваў нацыі больш цэнтрысцкія і ліберальныя ідэі, якія будаваліся вакол гэткіх паняццяў як прагматызм і эфектыўнасць, на базе прызнання безумоўнага імператыву ў сучасным грамадстве свабоднай рыначнай эканомікі, а не класічнага сацыялізму.

Упершыню за многія гады ў цэнтры перадвыбарчай барацьбы ў 2004 г. аказалася знешнепалітычная праблема – стаўленне да вайны ў Іраку. Нягледзячы на адназначна антываенную пазіцыю большасці іспанцаў, урад Х. М. Аснара далучыўся да праамерыканскай кааліцыі і паслаў на барацьбу з рэжымам С. Хусэйна іспанскі вайсковы кантынгент. Сацыялісты выступалі супраць удзелу ў несанкцыяванай ААН акцыі і рашуча патрабавалі вываду іспанскіх войск з Іраку.

Напярэдадні выбараў гэтая праблема паўстала ў поўны рост. 11 сакавіка 2004 г. адбыўся тэрарыстычны акт на некалькіх станцыях прыгарадных цягнікоў Мадрыду, які забраў жыцці 191 чалавека (яшчэ звыш 1800 чалавек былі параненыя). Мала хто сумняваўся, што гэта справа рук баскскіх тэрарыстаў. Пра гэта афіцыйна заявіў і прэм'ер-міністр. Калі стала ясна, што злачынства – справа рук Аль-Каіды, якая гэткім чынам адпомсціла Іспаніі за Ірак, узніклі сур'ёзныя падазрэнні ў тым, што заявы Х. М. Аснара і яго паплечнікаў маглі быць не памылкай, а наўмыснай хлуснёй, закліканай зняць ускосную адказнасць за трагедыю з правячай партыі.

Сацыялісты ўдала скарысталіся сваім шанцам. Яшчэ за тыдзень да галасавання аналітыкі абяцалі перамогу, няхай і не гэткую бліскучую, як у 2000 г., новаму лідару НП – Марыяна Рахою. Але ІСРП з лёгкасцю абышла свайго галоўнага канкурэнта – 43,4 % супраць 38,3 % галасоў. Хаця сацыялісты не атрымалі абсалютнай большасці ў Кангрэсе дэпутатаў (не хапіла 11 мандатаў), абранне Х. Л. Сапатэра (2004) на пасаду прэм’ер-міністра падтрымалі яшчэ 5 партый, а супраць выступіла толькі адна НП.

Новы ўрад сацыялістаў распачаў маштабныя пераўтварэнні ў сферы сацыяльнай палітыкі. Быў прыняты закон аб роўнасці паміж жанчынамі і мужчынамі, усталяваны спецыяльны суд для разгляду спраў, звязаных з гвалтам супраць жанчын і г. д. Паколькі мінімальны памер аплаты працы ў Іспаніі складаў толькі €460 у месяц (адзін з найменшых у ЕС), у 2004 г. урад прыняў рашэнне павялічыць яго да €600. З 2005 г. пачалося рэфармаванне сістэмы рэгіянальных аўтаномій, якое прадугледжвала далейшае пашырэнне іх правоў і паўнамоцтваў. Узаконьванне аднаполых шлюбаў, адмова ад выкладання Закона Божага ў школах і імкненне забяспечыць роўнасць рэлігій у сістэме дзяржаўнай адукацыі выклікала вялікія спрэчкі ў грамадстве і абвастрыла адносіны паміж правячай партыяй і каталіцкім касцёлам.

Вынікі выбараў у Картэсы 2008 г. на першы погляд зусім нязначна адрозніваліся ад вынікаў папярэдніх – 43,8 % галасоў набрала ІСРП і 39,9 % дасталася Народнай партыі. Х. Л. Сапатэра захаваў пасаду прэм'ер-міністра (упершыню ў іспанскай гісторыі ў яго новым урадзе жанчыны колькасна пераважалі над мужчынамі – 9 супраць 8). Аднак гэтым разам перавага дзвюх партыйлідараў над астатнімі была проста беспрэцэдэнтнай. З астатніх 11 партый, што ўзялі ўдзел у выбарах, прабіліся ў Кангрэс дэпутатаў толькі 8, і на іх долю засталося толькі 27 дэпутацкіх мандатаў! З гэтых 11 партый толькі дзве былі агульнаіспанскімі арганізацыямі, астатнія прадстаўлялі рэгіёны (Каталонію, Краіну Баскаў, Галісію, Канарскія астравы і г. д.), а таму маглі разлічваць толькі на абмежаваны, мясцовы поспех. Усё гэта было сведчаннем двухпартыйнасці ў Іспаніі.

Другі тэрмін прэм'ерства Х. Л. Сапатэра аказваецца надзвычай праблемным. Наступленне эканамічнага крызісу 2008 г. і далейшае пагаршэнне эканамічнай сітуацыі хутка выявілі няздольнасць ураду Х. Л. Сапатэра прапанаваць дзейсныя рэцэпты аздараўлення нацыянальнай эканомікі. Прапанаваныя сацыялістамі антыкрызісныя мерапрыемствы, напрыклад, рэформа рынку працы, выклікáлі рэзкую рэакцыю грамадства і прафсаюзаў і таксама падрывалі давер да дзеючай улады. Не дзіўна, што яшчэ больш чым за год да чарговых парламенцкіх выбараў Х. Л. Сапатэра адмовіўся ад барацьбы за захаванне крэсла старшыні ўраду.

Сур'ёзнасць грамадска-палітычнай сітуацыі, у якой Іспанія апынулася ў першай палове 2011 г., тлумачыцца тым, што і апазіцыйная Народная партыя, на думку многіх іспанцаў, не можа прапанаваць рэальную альтэрнатыву курсу ІСРП. Напярэдадні мясцовых выбараў 2011 г. вельмі моцна гучаць галасы тых, хто заклікае галасаваць супраць партый-гегемонаў, што сведчыць пра крызіс двухпартыйнасці і партый, якія яе ўвасабляюць.

**Нацыянальнае пытанне**

Прычыны міжэтнічнай канфліктагеннасці, якая захоўвалася на працягу XX ст., ідуць глыбока ў гісторыю. Яны выкліканы супраціўленнем розных этнічных груп зліццю ў адзіную нацыю, цэнтрам якой стала сярэднявечная Кастылія са сваёй мовай, культурай, адміністрацыяй і войскам. Таксама вастрыня нацыянальных праблем тлумачыцца тым, што ва ўмовах інтэрнацыяналізацыі матэрыяльных і духоўных каштоўнасцей, урбанізацыі, міграцыі значных людскіх мас, малыя народы паўстаюць перад пагрозай акультурацыі, страты мовы, традыцый і звычаяў. Імкненне баскаў, галісійцаў, каталонцаў да самазахавання натуральным чынам фарміравала вобраз гістарычнага ворага – іспанскага (кастыльскага) экспансіянізму.

У апошняй чвэрці XX – напачатку XXI стст. самай складанай праблемай міжэтнічных адносін у Іспаніі заставаўся баскскі сепаратызм і тэрарызм. Нягле-

дзячы на атрыманне Краінай Баскаў аўтаноміі, тут па-ранейшаму дзейнічае сепаратысцкі нацыяналістычны рух **ЭТА** (баск. – *Euskadi Ta Askatasuna*) – **«Краіна Баскаў і свабода»**. За больш як паўстагоддзя ўзброенай барацьбы баскаўтэрарыстаў ад іх рук загінула каля 2000 чалавек.

Падчас пераходнага перыяду ад франкісцкай дыктатуры да дэмакратыі новыя ўлады спрабавалі дамагчыся ад ЭТА спынення барацьбы, але сепаратысты адмовіліся скласці зброю наўзамен за прапанаваную амністыю. Напрыканцы 1980-х гг. новыя перамовы з ЭТА таксама не прынеслі аніякіх вынікаў.

У верасні 1998 г. падалося, што праблема баскскага тэрарызму як ніколі блізкая да свайго вырашэння: ЭТА абвясціла аб поўным і бестэрміновым спыненні сваёй тэрарыстычнай дзейнасці. Урад пайшоў, у сваю чаргу, на вызваленне шэрагу актывістаў руху. Перамір’е, аднак, працягвалася толькі 14 месяцаў. Напярэдадні парламенцкіх выбараў 2000 г. тэракты аднавіліся, зноў пралілася кроў. Урад быў вымушаны дзейнічаць яшчэ больш рашуча: у 2003 г. у краіне была забаронена дзейнасць палітычнага крыла ЭТА – партыі **«Эры Батасуна»** («Адзінства народу»; баск. – *Herri Batasuna*).

У чарговы раз ЭТА абвясціла «пастаяннае спыненне агню» ў 2006 г. У абмен на добраахвотную адмову ад узброенай барацьбы баявікі збіраліся дамагчыся ад уладаў амністыі некалькіх соцень баскскіх зняволеных, якія былі абвінавачаныя ў тэрарыстычнай дзейнасці, і легалізацыі сваёй партыі. У ліпені 2006 г. у Сан-Себасцьяне пачаліся першыя афіцыяльныя мірныя перамовы паміж правячай ІСРП і забароненай «Эры Батасуна». Перамовы не далі сур’ёзных вынікаў. Ізноў аднавіліся тэрарыстычныя акты. У 2008 г. па абвінавачанні ў сувязях з тэрарыстамі была забароненая яшчэ адна партыя – Баскскае нацыянальнае дзеянне.

У верасні 2010 г. ЭТА выступіла з заявай аб адмове ад узброенага змагання дзеля дасягнення незалежнасці і будзе прытрымлівацца толькі мірных сродкаў. Напачатку 2011 г. ЭТА яшчэ раз пацвердзіла сваё рашэнне. Іспанія і сама Краіна Баскаў з нецярплівасцю чакаюць канчатковай нармалізацыі абстаноўкі і дасягнення міжнацыянальнай згоды.

Не слабеюць нацыяналістычныя і сепаратысцкія настроі ў Каталоніі – самай багатай (даход насельніцтва на 25 % перавышае сярэднеіспанскі ўзровень) і густанаселенай правінцыі Іспаніі, якая карыстаецца шырэйшай аўтаноміяй, чым Краіна Баскаў. Лідарства ў каталонскім палітычным жыцці належыць нацыяналістычнай партыі **«Канвергенцыя і Саюз Каталоніі»**. Тым не менш, на фоне супрацьстаяння мадрыдскага ўраду з баскскімі непрымірымымі групоўкамі сітуацыя ў Каталоніі, а тым больш у яшчэ адной нацыянальнай правінцыі Галісіі, выглядае нашмат больш спакойнай і стабільнай.

## Знешняя палітыка Іспаніі ў другой палове 1970-х – 1980-х гг. і яе галоўныя прыярытэты. Уступленне ў НАТО і ЕЭС. Знешняя палітыка Іспаніі ў 1990-я – 2010-я гг. Разбурэнне нацыянальнага кансенсусу. «Дактрына Сапатэра»

Працэс дэмакратызацыі палітычнага рэжыму Іспаніі не прывёў да рэзкіх разваротаў у знешняй палітыцы. Дамінавалі пераемнасць і традыцыйнасць нацыянальных інтарэсаў. Тым не менш, не абышлося і без пэўнай карэкціроўкі знешнепалітычнага курсу. У меншай ступені яна закранула прыярытэтныя і падчас франкізму іспана-амерыканскія адносіны. У студзені 1976 г. Іспанія і ЗША заключылі двухбаковы Дагавор аб сяброўстве і супрацоўніцтве. Злучаныя Штаты па-ранейшаму заставаліся галоўным інвестарам у іспанскую эканоміку. Працягвалі функцыянаваць амерыканскія ваенныя базы. Заканчэнне эпохі разрадкі паставіла пытанне наконт перагляду нейтральнай знешнепалітычнай арыентацыі. Іспанія ўзяла курс на збліжэнне з Паўночнаатлантычным альянсам. Нягледзячы на шырокі размах антынатаўскага руху, напрыканцы 1981 г. Іспанія накіравала ў Брусель просьбу аб прыёме ў НАТО. З 1982 г. краіна стала паўнапраўным членам гэтага вайскова-палітычнага блоку. Іспанія пераўтвараецца ў «натаўскі авіяносец», які кантралюе Міжземнаморскі рэгіён.

У кантэксце дэмакратычных пераўтварэнняў у краіне набывае асаблівую важнасць новы канцэптуальны накірунак знешняй палітыкі Мадрыду – пільнаванне правоў чалавека. У 1976 г. Іспанія далучылася да Пакту аб грамадзянскіх і палітычных правах і Пакту аб эканамічных, сацыяльных і культурных правах (важнейшыя элементы Хельсінскіх пагадненняў). У 1977 г. Іспанія стала членам гэткай вельмі патрабавальнай у плане пільнавання правоў чалавека арганізацыі, як Рада Еўропы. Той жа 1977 г. стаў годам прарыву на «ўсходнім» накірунку: былі ўсталяваныя або аднoўленыя дыпламатычныя адносіны з СССР, Польшчай, Чэхаславакіяй, Венгрыяй, ГДР, Кампучыяй, Манголіяй і некаторымі іншымі «незаходнімі» краінамі.

Яшчэ адным прыярытэтам знешнепалітычнага курсу Іспаніі стала далучэнне да працэсу еўрапейскай інтэграцыі (вялікая зацікаўленасць у гэтым існавала і раней, аднак па прычыне прыроды іспанскага палітычнага рэжыму практычная рэалізацыя гэтага жадання выглядала толькі марай). Іспанія стала паўнапраўным членам «Агульнага рынку» ўжо ў 1986 г. З 1988 г. краіна пачала ўдзельнічаць у еўрапейскай абарончай структуры – Заходнееўрапейскім Саюзе (ЗЕС), стаўшы членам Групы ваеннага планавання ЗЕС.

Вялікае значэнне захоўваў і Лацінаамерыканскі напрамак – адносіны з краінамі рэгіёну ішлі каранямі ў далёкае мінулае і насілі сяброўскі, пастаянны ды інтэнсіўны характар у эканамічнай, навуковай і культурнай галінах. Іспанія ўступіла на правах назіральніка ў Арганізацыю амерыканскіх дзяржаў (ААД) і пачала ўдзельнічаць ў рабоце Эканамічнай камісіі ААН для Лацінскай Аме-

рыкі (ЭКЛА). Напрыканцы 1970-х – напачатку 1980-х гг. адбыліся візіты караля Хуана Карласа I ў цэлы шэраг дзяржаў Лацінскай Амерыкі. Не дзіўна, што і ў канфлікце Вялікабрытаніі і Аргенціны з-за Фалклендскіх астравоў Іспанія падтрымала лацінаамерыканцаў.

Сведчаннем росту міжнароднага аўтарытэту Іспаніі стала правядзенне на яе зямлі XXV Алімпійскіх гульняў у Барселоне (1992) і сусветнай выстаўкі «Экспа» ў Севільі (1992). У 1995 г. у іспанскай сталіцы адбыўся этапны Мадрыдскі саміт ЕС.

Падчас вайны ў Персідскім заліве ў зону ваенных дзеянняў быў накіраваны атрад іспанскіх ВМС, аднак пад ціскам грамадскай думкі ўрад Ф. Гансалеса не наважыўся выкарыстоўваць іх у баявых аперацыях. З 1995 г. Іспанія ўключылася ў стварэнне «сіл хуткага разгортвання» ЗЕС, яе механізаваная брыгада ўвайшла ў «еўракорпус», сілы якога праводзілі міратворчыя і гуманітарныя аперацыі, бралі ўдзел у ліквідацыі наступстваў стыхійных бедстваў. Іспанскі флот актыўна ўдзельнічаў у блакадзе адрыятычнага ўзбярэжжа Югаславіі (1999).

Нацыянальны кансенсус адносна пытанняў знешняй палітыкі, які склаўся ў постфранкісцкі перыяд і з'яўляўся адной з найбольш прынцыповых яе характарыстык, трываў да пачатку XXI ст. Знешнепалітычны курс Х. М. Аснара пачаў станавіцца прадметам вастрэйшых палітычных дэбатаў. Іспанская знешняя палітыка перамяшчалася ў сферу міжпартыйнай, вельмі часта бескампраміснай, барацьбы. Самая яркая ілюстрацыя гэтаму – спрэчкі вакол удзелу Іспаніі ў вайсковай аперацыі ЗША ды іх саюзнікаў супраць Ірака (2003).

Пасля вяртання да ўлады ІСРП у 2004 г. знешняя палітыка Іспаніі зведала значную карэкціроўку. Новы іспанскі лідар, Х. Л. Сапатэра, падкрэсліў важнасць вяртання да знешнепалітычнага курсу, які б быў забяспечаны цвёрдай падтрымкай большасці палітычных сіл Іспаніі і, што асабліва важна, падтрымкай іспанскай грамадскай думкі. Прыярытэтамі станавілася: арганізацыя вываду іспанскіх войск з Іраку; выпрацоўка палітыкі, якая дазволіла б змякчыць непажаданыя наступствы пашырэння Еўрасаюзу на Ўсход (яно пагражала скарачэннем выплат Мадрыду з фондаў ЕС); карэкціроўка двухбаковых адносін з ЗША.

У выніку рэалізацыі **«дактрыны Сапатэра»** Мадрыд адышоў ад прыярытэтнай арыентацыі на Вашынгтон, характэрнай для палітыкі ўраду Х. М. Аснара, і аднавіў у сваім статусе «еўрапеізм» як асноўны вектар іспанскай знешняй палітыкі. Урад сацыялістаў вывеў вайсковы кантынгент з Іраку і выступіў з маштабнай ініцыятывай «Альянс цывілізацый», якая ў плане практычнай палітыкі была альтэрнатывай сілавому курсу амерыканскага прэзідэнта Дж. Буша.

Адным з важнейшых прыярытэтаў знешняй палітыкі Іспаніі застаецца рэгіён Міжземнага мора. У 1995 – 2005 гг. у межах г. зв. «Барселонскага працэсу» краіна мела ўсе шанцы ўмацаваць сваё лідарства ў справе рэалізацыі міжземнаморскага праекту. Але фактычны правал Барселонскага саміту 2005 г. (большасць лідараў рэгіёну ў ім не ўдзельнічалі) паставіў крыж на амбіцыях Мадрыду. Неўзабаве дыпламатычную ініцыятыву ў рэгіёне перахапіў Парыж.

У апошнія паўтары дзесяцігоддзі Іспанія пераўтварылася ў трэцяга па значнасці экспарцёра капіталу ў свеце, саступаючы толькі ЗША і Францыі ($84 млрд. у 2007 г.). Адным з профільных накірункаў міжнароднай палітыкі на сучасным этапе становіцца пошук новых перспектыўных знешніх рынкаў. Адсюль вялікі інтарэс да краін-гігантаў: Бразіліі, Расіі, Індыі і Кітаю.

Бясспрэчным поспехам іспанскай дыпламатыі і сведчаннем яе міжнароднай вагі стаў удзел краіны ў самітах **«вялікай дваццаткі»**. Нягледзячы на высокія пазіцыі краіны ў эканамічнай іерархіі (13-я ў свеце і 5-я ў Еўропе), доўгі час на гэтых форумах яе інтарэсы прадстаўлялі «старэйшыя» партнёры па ЕС (Вялікабрытанія, Германія, Італія, Францыя). Прадстаўніцтва ў гэтым прэстыжным клубе дзяржаў дае магчымасць Іспаніі больш паспяхова адстойваць свае нацыянальныя эканамічныя інтарэсы на міжнароднай арэне.

Гэтак, стартаваўшы з вельмі нізкіх міжнародных пазіцый напачатку пераходу да дэмакратыі, Іспанія істотна пашырыла свой уплыў у міжнародных справах. Сама яе знешняя палітыка набывае рысы дыпламатычнай дзейнасці глабальнага ўзроўню і значэння.

## Тэма 15. Краіны Паўночнай Еўропы ў 1945 – 2010-я гг.

### Эканамічнае і палітычнае становішча краін рэгіёна пасля заканчэння Другой сусветнай вайны

Другая сусветная вайна нанесла параўнальна невялікія страты краінам Паўночнай Еўропы. Зусім не пацярпелі Ісландыя і Швецыя, прычым апошняя і ў акупацыйны перыяд, і пасля вызвалення аказвала суседзям, асабліва нарвежцам, эканамічную дапамогу. Людскія страты Даніі склалі каля 4,5 тыс., Нарвегіі – 10 тыс., а Фінляндыі – 83 тыс. чалавек. Прамыя разбурэнні закранулі толькі Нарвегію і Фінляндыю – вынік тактыкі «выпаленай зямлі» адступаўшых войск вермахту.

Увесь Паўночнаеўрапейскі рэгіён перажываў пасля вайны падобныя цяжкасці: інфляцыя, састарэласць абсталявання і жыллёвага фонду, недахоп прадметаў першай неабходнасці, беспрацоўе. З найбольшымі праблемамі сутыкнуліся Нарвегія і Фінляндыя, якую яшчэ чакала і выплата рэпарацый, з найменшымі – Швецыя.

У дзяржаўна-палітычных адносінах краіны рэгіёну ў цэлым захавалі даваенную арганізацыю. У Швецыі, Даніі і Нарвегіі захаваліся манархіі. Палітычная значнасць скандынаўскіх каралёў працягвала падаць. Хаця пасля падзей Другой сусветнай вайны асабісты аўтарытэт Хокана VII (Нарвегія) і Крысціяна X (Данія) істотна ўзрос: першы – на эміграцыі, а другі – ў акупіраванай краіне сталі сімваламі супраціўлення нацыстам. У Фінляндыі замацаваўся рэспубліканскі лад. Найбольш істотным зрухам стала з'яўленне на палітычнай карце свету новай суверэннай паўночнаеўрапейскай дзяржавы – Ісландыі. Ужо праз месяц пасля нямецкай акупацыі Даніі (1940) гэты стратэгічна важны востраў у паўночнай частцы Атлантыкі быў заняты сіламі брытанскага флоту. Повязі Ісландыі з Даніяй былі цалкам перарваныя, а тым часам скончыўся тэрмін дзеяння дацка-ісландскай уніі 1918 г. 17 чэрвеня 1944 г. Ісландыя набыла поўную незалежнасць і была абвешчаная рэспублікай.

Партыйная сістэма краін Паўночнай Еўропы зазнала мінімальныя змены ў параўнанні з даваенным перыядам. Пацярпелі паражэнне і зышлі з палітычнай арэны найбольш радыкальныя нацыяналістычныя партыі і рухі. Агульным унутрыпалітычным вынікам вайны для Паўночнай Еўропы, як і для ўсёй Заходняй Еўропы, быў зрух улева – значны рост уплыву камуністычных партыяў і уздым рабочага руху. Сацыял-дэмакратычныя і аграрныя партыі захавалі свой ранейшы ўплыў. У выніку у краінах рэгіёну былі праведзены прагрэсіўныя рэформы. Намецілася збліжэнне праграмных установак усіх вядучых палітычных сіл, што ў будучым прывяло да значнай пераемнасці дзяржаўнай палітыкі і, ў выніку, абумовіла стабільнасць паўночнаеўрапейскіх грамадстваў. У Даніі і Нарвегіі, дзе акупацыя спарадзіла дзясяткі тысяч калабарантаў, чакала яшчэ і выяўленне і пакаранне нацыстаў ды іх прыхвасняў.

**Адраджэнне эканомікі. Умацаванне дзяржаўнага ўрэгулявання. Структурныя змены ў эканоміцы ў 1950 – 1960-я гг. Асаблівасці сацыяльна-эканамічнага развіцця краін Паўночнай Еўропы. «Шведская мадэль». «Нафтавы шок». Уплыў сусветнага эканамічнага крызісу 1974 – 1975 гг.**

У красавіку 1948 г. Данія, Ісландыя, Нарвегія і Швецыя афіцыйна далучыліся да плану Маршала. Адначасова ўсе яны сталі членамі Арганізацыі еўрапейскага эканамічнага супрацоўніцтва (АЕЭС). Прычым першыя тры краіны атрымлівалі пераважна дармавую дапамогу, а больш забяспечаная Швецыя – крэдытную. Сумы амерыканскай дапамогі аказаліся немалымі: Данія атрымала $280 млн., Ісландыя – $35 млн., Нарвегія – $275 млн., а Швецыя – $110 млн. (іх залатыя запасы на 1949 г. складалі толькі адпаведна $32 млн., $51 млн., $170 млн. і $1 млн.) Дзякуючы плану Маршала краіны рэгіёну здолелі часткова абнавіць свой асноўны капітал у прамысловасці (асабліва Нарвегія) і сельскай

гаспадарцы (асабліва Данія). Умовы аказання дапамогі і сам удзел у АЕЭС садзейнічалі аднаўленню і развіццю эканамічных сувязяў краін рэгіёну паміж сабой ды іншымі заходнееўрапейскімі краінамі і ЗША.

Суседства Фінляндыі з СССР і драматычная гісторыя стасункаў з усходняй суседкай моцна абмежавалі свабоду выбару фінляндскага кіраўніцтва. Ад удзелу ў плане Маршала яму прыйшлося адмовіцца. Аднак у красавіку 1948 г. быў падпісаны савецка-фінляндскі **Дагавор аб сяброўстве, супрацоўніцтве і ўзаемадапамозе**. Ён быў закліканы пэўным чынам кампенсаваць Фінляндыі адмову ад амерыканскай дапамогі і зацікавіць яе ў развіцці «ўсходняга вектару» гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва. У 1950 г. паміж краінамі было заключана гандлёвае пагадненне на перыяд 1951 – 1955 гг. Фінляндыя атрымала магчымасць спрошчанага выхаду на аграмадны савецкі рынак са сваёй прамысловай прадукцыяй (напрыклад, новай для краіны металаапрацоўчай галіны), а акрамя таго на доўгатэрміновай базе забяспечвала сябе імпартам цэлага шэрагу жыццёва важных тавараў: збожжа, цукру, угнаенняў і паліва. Савецка-фінляндскае супрацоўніцтва стала адным з важнейшых фактараў далейшага поспеху эканамічнага развіцця краіны.

Да пачатку 1950-х гг. задачы аднаўлення народнай гаспадаркі і пераадолення пасляваенных эканамічных цяжкасцяў былі ў цэлым дасягнутыя. Былі скасаваныя захады прамой рэгламентацыі гаспадарчага жыцця. Эканамічнае становішча ўсіх краін Паўночнай Еўропы, акрамя Ісландыі, набыло стабільнасць.

На працягу 1950-х гг. у рэгіёне адбываюцца значныя структурныя зрухі: знізілася доля сельскай, лясной гаспадаркі і рыбалоўства ў нацыянальным прадукце; у прамысловасці ўзрастае вытворчасць сродкаў вытворчасці. Лідарскія пазіцыі ў эканоміцы і па тэмпах росту, і па ўзроўню тэхнічнай узброенасці захоўвалі экспартныя галіны. Менавіта ў гэты час набывае свой класічны выгляд, асабліва ў Швецыі і Нарвегіі, сістэма дзяржаўна-манапалістычнага капіталізму. Гаспадарчае рэгуляванне набыло пераважна ўскосны характар – праз падаткаабкладанне, крэдытную ды інвестыцыйную палітыку дзяржаўнай улады, а таксама пры дапамозе эканамічных праграм, неабавязковых, аднак, для прыватнага сектару. Прыватны сектар адыгрываў вырашальную ролю ў прамысловасці ўсіх краін Паўночнай Еўропы. Паскорыліся працэсы канцэнтрацыі вытворчасці і капіталу, а таксама іх інтэрнацыяналізацыя.

Дзяржаўны сектар эканомікі ў краінах рэгіёну меў нашмат меншы аб’ём, чым у Вялікабрытаніі, Італіі ці Францыі. Напрыклад, доля Швецыі ў выпуску прамысловай прадукцыі складала толькі 5 – 6 %. Аднак, як вынік высокага ўзроўню падаткаў, фактычная для нацыянальнага прадукту, што прысвойвалася і размяркоўвалася дзяржаўнай уладай, была ў Паўночнай Еўропе адной з самых высокіх у капіталістычным свеце.

У 1960-я гг. тэмпы прамысловага росту ў краінах рэгіёну перавышалі сярэднія паказчыкі па Заходняй Еўропе. Аб'ём прадукцыі апрацоўваючай прамысловасці, галоўнай галіны іх эканомікі, амаль падвоіўся. Па сярэдніх памерах гадавога ВНП на душу насельніцтва краіны ўжо апярэджвалі ўсе капіталістычныя краіны акрамя ЗША. Яны ўтрымлівалі вядучыя пазіцыі ў свеце па ўлове рыбы і марскіх перавозках. Больш сучаснай станавілася структура паўночнаеўрапейскай эканомкі. Удзельная вага сельскай гаспадаркі і рыбалоўства напрыканцы 1960-х гг. знізілася ў Швецыі, Нарвегіі і Даніі да 4 – 9 %, у Фінляндыя – да 15 %, Ісландыі – да 23 %.

Па меры далейшага сацыяльна-эканамічнага прагрэсу краін рэгіёну адыходзіла ў нябыт этнічная аднароднасць насельніцтва. Узмацняўся прыток замежных рабочых – галоўным чынам, югаславаў, грэкаў, туркаў ды італьянцаў. Напрыклад, напрыканцы 1960-х гг. з 8 млн. жыхароў Швецыі 600 тыс. мелі замежнае паходжанне, прычым 400 тыс. з іх яшчэ не атрымалі шведскага грамадзянства.

Эканамічнае развіццё **Нарвегіі** было найбольш раўнамерным і ўстойлівым у рэгіёне: праблемы інфляцыі, плацежнага балансу, замежнай запазычанасці адчуваліся тут найменш. Узровень капіталаўкладанняў у краіне – у сярэднім каля 35 % ВНП – быў адным з найвышэйшых у капіталістычным свеце. Вялікая ўвага ў краіне надавалася развіццю буйной прамысловасці. Раней,чым у іншых заходнееўрапейскіх краінах, у Нарвегіі сталі распрацоўвацца праграмы (4-гадовыя) развіцця эканомікі. Вельмі характэрнай была яе экспартная арыентаванасць – каля 48 % валавога прадукту на 1970 г. складаў экспарт тавараў і паслуг. У цэлым эканамічнае развіццё было найбольш раўнамерным і ўстойлівым, чым у іншых паўночнаеўрапейскіх краінах. Аднак менавіта ў Нарвегіі мацней за ўсё адчувалася залежнасць ад замежнага капіталу.

Асаблівасці развіцця эканомікі **Даніі**, а таксама яе цяжкасці вынікалі з пераважна аграрнага характару яе экспарту. У 1950-я гг. вываз сельгаспрадукцыі сутыкаўся з аграрным пратэкцыянізмам іншых заходнееўрапейскіх краін і адносна невысокімі коштамі на гэтыя прадукты. Гэта вяло да адмоўнага сальда знешняга гандлю Даніі і абумоўлівала запазычанасць дацкіх банкаў перад замежнымі крэдыторамі. З канца 1950-х гг. знешняя кан'юнктура для аграрнага сектару Даніі палепшылася. Акрамя таго, у сельскай гаспадарцы краіны адбыліся важныя зрухі: фермеры дасягнулі значнага росту вытворчасці пры скарачэнні на чвэрць працоўнай сілы. Лішнія рукі ўліліся ў гарадскую эканоміку. Прычым пераважнае развіццё атрымалі высокапрадукцыйныя галіны: суднабудаванне, вытворчасць халадзільнага абсталявання, харчовых канцэнтратаў, лекаў і г. д. Напачатку 1960-х гг. Данія ператварылася ў індустрыяльна-аграрную краіну. У першай палове 1960-х гг. рост дацкага ВНП нават апя-

рэджваў шведскія паказчыкі. За ўсё дзесяцігоддзе прамысловая вытворчасць падвоілася, а экспарт – патроіўся.

Эканоміка **Ісландыі** развівалася скрайне нераўнамерна. Няўстойлівасць яе гаспадарчага жыцця тлумачылася залежнасцю ад стыхійнага фактару – улову рыбы і сусветных коштаў на яе. У 1960-я гг. улады краіны паспрабавалі пераадолець гэткую аднабокасць эканомікі. Пры дапамозе буйных замежных інвестыцый паскорылася распрацоўка мясцовых гідраэнергарэсурсаў, а ў 1967 г. пачалося будаўніцтва алюмініевага заводу – фактычна першы крок да стварэння на востраве цяжкай прамысловасці. Да пачатку 1970-х гг. за кошт нізкай шчыльнасці насельніцтва Ісландыя нават увайшла ў лік найбольш развітых краін свету.

Значныя зрухі адбыліся ў эканоміцы **Фінляндыі**. Небывалага ўзроўню дасягнула нацыянальная індустрыя: у 1955 г. аб'ём прамысловай вытворчасці дасягнуў максімальнага ўзроўню ў гісторыі краіны. На першае месца на ўнутраным рынку сталі выходзіць машынабудаўнічая і суднабудаўнічая галіны. Па-ранейшаму важным фактарам эканамічнага развіцця з'яўляліся актыўныя гандлёва-эканамічныя адносіны з СССР. Да пачатку 1970-х гг. Фінляндыя апярэдзіла многія краіны Заходняй Еўропы і па тэмпах росту ВНП, і па тэмпах росту прамысловай вытворчасці.

На фоне паспяховага і збалансаванага эканамічнага развіцця паўночнаеўрапейскага рэгіёну асабліва вылучаліся поспехі Швецыі. У 1960-я гг. яе прамысловая вытворчасць расла на 8 % у год, на 7,5 % штогод павялічваўся шведскі экспарт. Напрыканцы 1960-х гг. спалучэнне хуткага эканамічнага росту з шырокай палітыкай рэформ на фоне адноснай сацыяльнай бесканфліктнасці ў грамадстве далі падставы замежным назіральнікам назваць сацыяльна-эканамічную сістэму, што склалася ў краіне **«шведскай мадэллю»**. Для яе быў характэрны змешаны характар эканомікі, якая спалучала рынычныя адносіны і дзяржаўнае рэгуляванне, пераважна прыватную ўласнасць у сферы вытворчасці і абагульненне спажывання. Гэткім чынам, дзяржава не ўмешваецца ў вытворчую дзейнасць прадпрыемства, але рэгулюе сацыяльныя выдаткі рыначнай эканомікі асаблівай сацыяльнай палітыкай на рынку працы.

Высокія падаткі, адлічэнні прадпрымальнікаў у пенсійны фонд дазвалялі дзяржаве ажыццяўляць гэткае размеркаванне матэрыяльных дабротаў, якое змяншала сацыяльную няроўнасць у грамадстве, яго палярызацыю. Значныя сродкі, што назапашваліся дзяржавай давалі магчымасць стварыць эфектыўную сістэму сацыяльнага забеспячэння, якая ахоплівала ўсе слаі насельніцтва безадносна класавай прыналежнасці і ўзроўню даходаў. Вельмі характэрным для гэтай мадэлі было размеркаванне бюджэтных выдаткаў. У 1950 – 1970-я гг. на патрэбы міністэрства аховы здароўя і сацыяльнага забеспячэння прыпадала больш за чвэрць дзяржаўнага бюджэту, міністэрства адукацыі – сёмая частка, а на міністэрства абароны – толькі дванаццатая частка.

Яшчэ адной адметнай рысай «шведскай мадэлі» з’яўлялася спецыфіка адносін паміж працай і капіталам на рынку працы. На працягу многіх дзесяцігоддзяў дзейнічала цэнтралізаваная сістэма перагавораў аб заключэнні калектыўных дагавораў у галіне заробкаў з удзелам магутных арганізацый прафсаюзаў і прадпрымальнікаў. Прычым, масавыя забастоўкі і звальненні дапускаюцца толькі ў перыяд перазаключэння калектыўных працоўных дагавораў і ладзяцца толькі пасля своечасовага папярэджання.

Таксама ў межах «шведскай мадэлі» дамінавала імкненне да забеспячэння поўнай занятасці і выроўнівання даходаў. Палітыка дзяржавы адносна беспрацоўных была адметная тым, што яна імкнулася фінансаваць не столькі вымушаны «прастой» беспрацоўнага, колькі яго перападрыхтоўку і вяртанне на новае працоўнае месца. Рабочыя атрымлівалі аднолькавы заробак за аднолькавую работу, незалежна ад прадпрыемства і галіны эканомікі, што дазваляла не допускаць падвышэння канкурэнтаздольнасці прадпрыемстваў за кошт эксплуатацыі працоўных. У падатковай палітыцы выроўніванне даходаў азначала, што розніца паміж канчатковымі даходамі розных катэгорый насельніцтва пасля выплаты падаткаў не павінна перавышаць суадносін 1:2.

У 1960 – 1970-я гг. «шведская мадэль» разглядалася многімі спецыялістамі як адзін з варыянтаў «трэцяга шляху». Аднак запавольванне тэмпаў эканамічнага росту, інфляцыя, неспрыяльныя дэмаграфічныя тэндэнцыі і рост папулярнасці неакансерватыўных ідэй паставілі шведскія ўлады перад складаным пытаннем: як гарантаваць непарушнасць сацыяльных заваёваў шведаў і пры гэтым захаваць канкурэнтаздольнасць Швецыі на сусветным рынку.

Ужо напачатку 1970-х гг. пачаўся эканамічны застой, а ў 1973 г. выбухнуў энергетычны крызіс. Упершыню за доўгі час адбылося падзенне прамысловай вытворчасці. Узрасло беспрацоўе і тэмпы інфляцыі, востра стаяла праблема плацежнага балансу. У 1974 – 1975 гг. Паўночная Еўропа зведала ўдар сусветнага эканамічнага крызісу. Аазісам стабільнасці некаторы час была толькі Нарвегія, дзе прамысловая вытворчасць не адчувала праблем да сярэдзіны 1970-х гг., а пра агульнае пагаршэнне эканамічнай сітуацыі ў краіне можна было казаць толькі з 1977 гг. Галоўным тлумачэннем гэтай адметнасці стаў пачатак распрацоўкі ў 1974 г. радовішчаў нафты на нарвежскім кантынентальным шэльфе.

### Палітычнае жыццё ў другой палове 1940-х – 1970-х гг.

У **Швецыі**, як і амаль паўсюдна ў Еўропе, напрыканцы вайны і ў першыя пасляваенныя гады адзначалася значнае палявенне. Пры гэтым тут гэта быў працяг ужо дастаткова ўстойлівай тэндэнцыі. **Сацыял-дэмакратычная рабочая партыя Швецыі (СДРПШ)** працягвала захоўваць бясспрэчнае пануючае становішча да сярэдзіны 1970-х гг. Шведская шматпартыйнасць па-ранейшаму рабіла праблематычнай задачу заваявання партыяй абсалютнай боль-

шасці галасоў выбаршчыкаў і, адпаведна, месцаў у ніжняй палаце парламенту. Гэтая высокая планка скарылася СДРПШ у гэты перыяд толькі аднойчы – у 1968 г. партыя набрала 50,1 % галасоў, затое ў сярэднім сацыял-дэмакраты набіралі каля 46 %.

Не дзіўна, што сацыял-дэмакраты ўпэўнена кантралявалі крэсла прэм'ер-міністра, а іх лідары абнаўлялі нацыянальныя рэкорды палітычнага доўгажыхарства. Следам за 18-гадовым прэм'ерствам А. Хансана пачалося беспрэцэдэнтна працяглае ўрадавае лідарства Таге Эрландэра (1946 – 1969), якога змяніў самы знакаміты палітык пасляваеннай Швецыі – Улаф Пальмэ (1969 – 1976). Сацыял-дэмакраты часам фарміравалі ўрад з **Партыяй цэнтру** (былая партыя аграрыяў – Сялянскі саюз), а ў рыксдагу яны маглі абаперціся яшчэ й на падтрымку камуністаў (з 1967 г. яны выступалі пад назвай **Левая партыя – Камуністы, ЛПК**).

Яшчэ напачатку 1950-х гг. было прынята рашэнне аб распрацоўцы новай канстытуцыі (у Швецыі традыцыйна яна складаецца з некалькіх канстытуцыйных актаў). Праца ў гэтым накірунку была скончана напрыканцы 1960-х гг. У 1969 г. пачалася парламенцкая рэформа, якая прадугледжвала пераход ад двухпалатнага да аднапалатнага рыксдагу. Яго дэпутаты абіраліся на 3-гадовы тэрмін усімі грамадзянамі, якія дасягнулі 19-гадовага ўзросту. Уводзіліся прамыя і строга прапарцыйныя выбары. Мінімальныя 12 % пададзеных галасоў у адной акрузе, альбо 4 % па ўсёй краіне станавіліся ўмовай доступу палітычнай партыі ў рыксдаг.

У 1974 г. была прынята, а з 1 студзеня 1975 г. набыла моц новая **Форма праўлення** – ключавы дакумент канстытуцыйнага характару дзяржавы. У ім падкрэслівалася, што «дзяржаўная ўлада ў Швецыі зыходзіць ад народу». Самым прынцыповым палажэннем стала тое, што ўжо не кароль, а старшыня рыксдагу, вырашае, хто будзе фарміраваць урад і прызначае прэм'ер-міністра. Пасяджэнні ўраду павінны адбывацца не пад фармальным старшынствам манарха, а прэм'ер-міністра. Згодна новай Форме праўлення манарх больш не з'яўляўся галоўнакамандуючым. Паступова яго функцыі былі цалкам зведзены да прадстаўнічых. Аднак нягледзячы на тое, што былыя палітычныя абавязкі караля ўскладваліся на іншыя інстытуты, ён захаваў статус галавы дзяржавы. Першым манархам Швецыі, які ўжо проста каралюе, а не кіруе стаў Карл XIV Густаў Бернадот (1973). Канстытуцыйная рэформа была завершаная напрыканцы 1970-х гг. Пасля ўнясення змен у Акт аб спадкаванні (1979 г.) жанчыны атрымлівалі аднолькавыя правы з мужчынамі на шведскі прастол (гэта азначае, што трон будзе спадкаваць цяпер крон-прынцэса Вікторыя, а не яе малодшы брат Карл Філіп).

У першай палове 1970-х гг. нарастанне сацыяльна-эканамічных праблем абумовіла аслабленне пазіцый правячай партыі. На выбарах у рыксдаг 1970 г.,

якія адбыліся датэрмінова ў сувязі з парламенцкай рэформай, СДРПШ страціла абсалютную большасць, але, дзякуючы падтрымцы ЛПК, захавала аднапартыйны ўрад. А ў 1973 г. на наступных выбарах згубіўшы яшчэ некалькі месцаў несацыялістычныя партыі зраўняліся па колькасці дэпутатаў з левымі – 175 на 175. Сацыял-дэмакратам і гэтым разам удалося застацца пры ўладзе, але цяпер ім прыходзілася шукаць кампраміс з больш шырокім колам палітычных сіл у рыксдагу. Для таго, каб у будучым пазбегнуць сітуацый, падобных на тую, што склалася ў 1973 г., колькасць дэпутатаў з наступных выбараў змяншалася з 350 да 349.

Сусветны энергетычны, а потым і агульны эканамічны крызіс сярэдзіны 1970-х гг. яшчэ больш паслабіў пазіцыі СДРПШ. У 1976 г. яна набрала рэкордна нізкія 42,7 % галасоў (горшы вынік за ўвесь пасляваенны час) і страціла ўладу. Скончыўся 44-гадовы перыяд сацыял-дэмакратычнага праўлення. Быў сфарміраваны кааліцыйны ўрад буржуазных партый у складзе **Умеранай кааліцыйнай партыі** (**УМП**; ліберальна-кансерватыўная), **Народнай партыі** (**НП**; ліберальная) і Партыі цэнтру, лідар якой, Турб’ёрн Фельдзін (1976 – 1982), стаў новым прэм’ер-міністрам.

Палітычнае жыццё **Нарвегіі** вызначалася некалькі меншай стабільнасцю. Аднак і тут дамінавалі сацыял-дэмакраты – **Нарвежская рабочая партыя (НРП)**. Да 1961 г. партыя захоўвала абсалютную большасць у аднапалатным сторцінгу пры гэтым стабільна атрымліваючы ад 41 % да 48,3 % галасоў. Найбольш яркім з нарвежскіх палітыкаў першых пасляваенных дзесяцігоддзяў быў лідар сацыял-дэмакратаў і галава трох урадаў Эйнар Герхардсен (1945 – 1949; 1955 – 1963; 1963 – 1965).

Напярэдадні парламенцкіх выбараў 1961 г. ад НРП адкалолася левая групоўка, якая патрабавала выхаду краіны з НАТО, і ўтварыла самастойную Сацыялістычную народную партыю. Набраных галасоў і заваяваных мандатаў акурат і не хапіла для захавання мінімальнай парламенцкай большасці за сацыял-дэмакратамі. НРП здолела захаваць аднапартыйны ўрад, але страціла свабоду палітычнага манеўру. Жадаючы вярнуць страчаную большасць, НРП імкнулася праводзіць папулярную палітыку: быў збольшага здзейснены пераход да роўнай аплаты працы паміж жанчынамі і мужчынамі, у перыяд 1961 – 1965 гг. былі на 60 % падвышаныя сацыяльныя выдаткі, усталяваны месячны аплатны адпачынак для рабочых і служачых.

Тым не менш, пасля чарговых парламенцкіх выбараў 1965 г. 30-гадовы перыяд праўлення НРП скончыўся. Буржуазныя партыі – **Кансерватыўная партыя (хёйрэ)**, **Ліберальная партыя (венстрэ)**, **Партыя цэнтру** (аграрная), **Хрысціянская народная партыя** (хрысціянскія дэмакраты) – здабылі нязначную большасць і атрымалі магчымасць стварыць кааліцыйны ўрад. Новым прэм’ер-міністрам стаў аграрый Пэр Бротэн (1965 – 1971).

Міжпартыйныя супярэчнасці ў краінах Паўночнай Еўропы ў пасляваенныя дзесяцігоддзі змякчаліся, узрастала пераемнасць у сферы ўнутранай палітыкі, а таму буржуазная кааліцыя працягнула многія рэформы сваіх папярэднікаў. У 1967 г. была ўведзена новая адзіная сістэма сацыяльнага забеспячэння (галоўнае яенаваўвядзенне – распаўсюджванне пенсійнага забеспячэння па выслузе гадоў на ўсіх грамадзян). З 1970 г. дзяржава стала выплачваць даПамогі на кожнае дзіця да 16 гадоў. Пры гэтым у інтарэсах буржуазных слаёў грамадства была праведзена падатковая рэформа.

Напрыканцы 1960-х гг. вастрэйшай праблемай нарвежскай палітыкі становіцца магчымы ўдзел краіны ў «Агульным рынку». Рознагалоссі ў правячай кааліцыі па гэтаму пытанню яшчэ не перашкодзілі правячым партыям адстаяць права на ўладу на парламенцкіх выбарах у 1969 г. Аднак ужо ў 1971 г. выбухнуў скандал. Прэм’ер-міністр – адкрыты праціўнік інтэграцыі – наўмысна раскрыў змест перамоў наконт уступлення краіны ў ЕЭС, чым справакаваў урадавы крызіс і распад буржуазнай кааліцыі.

Сацыял-дэмакраты вярнулі ўладу, але наступны прэм’ер-міністр, Тругве Братэлі (1971 – 1972), стаў ячшэ адной ахвярай інтэграцыйнай эпапеі Нарвегіі. НРП заняла актыўную праеўрапейскую пазіцыю, таму вынікі дарадчага рэферэндуму 1972 г. аб далучэнні да ЕЭС – 53,5 % нарвежскіх выбаршчыкаў Прагаласавала супраць – былі расцэненыя як страта даверу да правячай партыі. Урад НРП зышоў у адстаўку, а сама партыя перажыла чарговы раскол – яе пакінулі праціўнікі НАТО і «Агульнага рынку». Толькі чарговая перамога на парламенцкіх выбарах 1973 г. дазволіла Т. Братэлі (1973 – 1975) і НРП вярнуцца да ўлады.

Яшчэ меншым пастаянствам вызначалася ўнутрыпалітычнае жыццё **Даніі**. **Сацыял-дэмакратычная партыя Даніі (СДПД)** у першыя пасляваенныя дзесяцігоддзі нязменна фарміравала буйнейшую фракцыю ў парламенце, але часта адноснай большасці не хапала для перамогі над канкурэнтамі. Найбольшую сілу ўяўлялі **Ліберальная партыя** (**венстрэ**; аграрыі) і **Кансерватыўная партыя**. Урады як правіла былі не вельмі ўстойлівымі (за 1945 – 1975 гг. іх было 15) і часта – кааліцыйнымі (7).

Палітычнае жыццё першых пасляваенных гадоў у Даніі ўскладнялася вельмі няпростай акупацыйнай спадчынай. Большасць партый, нават сацыял-дэмакраты, аказаліся заплямленыя калабарацыяй з нацыстамі і страцілі давер часткі датчан. Нездарма на парламенцкіх выбарах 1945 г. СДПД атрымала амаль на 12 % меней, чым на выбарах 1943 г. (ладзіліся са згоды акупантаў), і ўпершыню з 1929 г. з-за няўдачы на выбарах страціла ўладу. Улада перайшла да венстрэ.

У 1947 г. СДПД адваявала ўладу, але з нарастаннем «халоднай вайны» пазіцыі буржуазных партый ізноў узмацніліся, і пасля выбараў 1950 г. да ўлады вярнулася венстрэ. Важнейшым вынікам непрацяглага перыяду іх праўлення стала прыняцце Канстытуцыі 1953 г. Згодна з новым асноўным законам ства-

раўся мадэрнізаваны парламент – аднапалатны фолькецінг, быў скасаваны каланіяльны статус Грэнландыі і зацверджана аўтаномія Фарэрскіх астравоў.

У перыяд з 1953 па 1968 г. сацыял-дэмакраты здолелі захоўваць пануючае становішча. На шасці парламенцкіх выбарах, што праходзілі ў гэты час, СДПД заваёўвала ад 38 да 42 %, а таму лідары сацыял-дэмакратаў атрымлівалі права фарміраваць аднапартыйны альбо кааліцыйны ўрад. Даўжэй за іншых гэта рабіў Енс Ота Краг – з 1962 па 1968 гг.

Абвастрэнне сацыял-эканамічных праблем напрыканцы 1960-х гг. паставілі СДПД ў цяжкае становішча. На выбарах 1968 г. сацыял-дэмакраты набралі толькі 34 % галасоў выбаршчыкаў і былі вымушаныя ненадоўга (да 1971 г.) выйсці ў апазіцыю. Да ўлады ўпершыню ў гісторыі краіны прыйшла трохпартыйная кааліцыя буржуазных партый (кансерватары, венстрэ і радыкалы – Дацкая сацыял-ліберальная партыя ці радыкальная венстрэ). Але ёй не ўдалося выправіць сітуацыю і ўлада вярнулася да сацыял-дэмакратаў.

Парламенцкія выбары 1973 г., што адбыліся ўжо пасля «нафтавага шоку» скончыліся катастрафічна не толькі для СДПД (25 %), але і для ўсіх традыцыйных лідараў дацкай палітыкі – сведчанне крызіснага стану партыйнай сістэмы краіны. Венстрэ, радыкалы і кансерватары набралі адпаведна 12 %, 11 % і 9 %. Чатыры мацнейшыя партыі разам здабылі толькі 57 % галасоў выбаршчыкаў (у 1958 г. яны мелі 89 %!). Венстрэ атрымала права сфарміраваць урад. Ён аказаўся самым эфемерным урадам меншасці ў дацкай гісторыі, бо абапіраўся на смехатворныя 22 дэпутацкія мандаты!

Другое месца на гэтых выбарах сенсацыйна заваявала створаная толькі ў 1972 г. **Партыя прагрэсу**. Арганізацыя, якая рашуча выступала з пазіцый эканамічнага лібералізму за радыкальнае скарачэнне падаткаў (у т. л. за поўнае скасаванне падаходнага падатку) і рэзкае скарачэнне ўрадавых выдаткаў, заваявала 15 % галасоў выбаршчыкаў. Крызіс дацкай «дзяржавы дабрабыту» і наступленне крызісу абяцалі гэтай партыі добрую будучыню.

Унутрыпалітычнае становішча **Фінляндыі** вызначалася значнай спецыфікай. Па-першае краіна пацярпела паражэнне ў вайне і магла разлічваць толькі на літасць пераможцы. Цяжкі лёс, калі гэтым пераможцам быў вялікі і небяспечны сусед – Савецкі Саюз на чале з І. В. Сталіным.

У адпаведнасці з Маскоўскім перамір’ем 1944 г. Фінляндыя патрапіла пад кантроль Саюзнай кантрольнай камісіі (СКК). Але на справе сітуацыю ў краіне кантралявала толькі Масква. Старшынёй СКК быў прызначаны генерал-палкоўнік А. А. Жданаў, які ў той час лічыўся «правай рукой» Сталіна. Акупацыйны орган дзейнічаў да 1947 г.

Кіраўніцтва Фінляндыі выдатна разумела, што, калі СССР захоча ўсталяваць на фінскай зямлі камуністычны рэжым, як гэта адбывалася ва Ўсходняй Еўропе, ці нават захапіць і далучыць краіну да Савецкага Саюзу, як гэта было з

Літвой, Латвіяй і Эстоніяй, то нічога супрацьпаставіць яму будзе немагчыма. Апошні сцэнарый не выглядаў фантастычна, нездарма ж з 1940 па 1956 гг. існавала ў СССР 16-я савецкая сацыялістычная рэспубліка – Карэла-Фінская. А таму пакуль існаваў Савецкі Саюз эліты Фінляндыі дзеля захавання суверэнітэту сваёй дзяржавы імкнуліся ва ўнутранай і знешняй палітыцы дзейнічаць настолькі асцярожна, каб не даць усходняму суседу аніводнай зачэпкі для агрэсіі. З часам у заходнегерманскай прэсе нават з'явіўся, а потым прыжыўся ў заходняй гістарыяграфіі тэрмін **«фінляндызацыя»**, якім пазначалася сітуацыя, пры якой больш слабая дзяржава вымушаная ісці на саступкі свайму больш моцнаму суседу для захавання нацыянальнага суверэнітэту. Абачлівая тактыка фінляндскага кіраўніцтва аказалася вельмі эфектыўнай і дазволіла маленькай дзяржаве не дапусціць страты незалежнасці і нават пераЖыць СССР.

Яшчэ адным спецыфічным момантам было тое, што ў адрозненне ад Швецыі, Нарвегіі і Даніі Фінляндыя з'яўляецца рэспублікай, улада ў якой належыць прэзідэнту з дастаткова шырокімі паўнамоцтвамі. З 1946 па 1956 гг. прэзідэнцкую пасаду займаў Юха Кусці Паасіківі, а з 1956 па 1982 гг. – Урха Калева Кеканен. Працягласць знаходжання пры ўладзе апошняга тлумачылася падвойнай зацікаўленасцю ў стабільнасці як саміх фінаў, гэтак і савецкага кіраўніцтва. Напрыклад, у 1973 г. прэзідэнцкі тэрмін У. К. Кеканена быў працягнуты на чатыры гады (на 1974 – 1978 гг.) спецыяльным парламенцкім законам. Другой прычынай палітычнага доўгажыхарства была сама сістэма абрання прэзідэнта. Да 1994 г. прэзідэнт Фінляндыі абіраўся не на прамых усенародных выбарах, а спецыяльнай калегіяй выбаршчыкаў. Выбар палітычных эліт заўжды вызначаецца большым кансерватызмам, чым выбар народу. Менавіта пад кіраўніцтвам гэтых лідараў была выпрацаваная асцярожная і прагматычная палітыка у дачыненні СССР – **«лінія Паасіківі – Кеканена»**.

Па-трэцяе, змякчэнне міжпартыйнага супрацьстаяння ва ўнутрыпалітычным жыцці Фінляндыі тлумачылася не толькі паслабленнем ідэалагічнай канфрантацыі паміж буйнейшымі палітычнымі сіламі, перадусім сацыял-дэмакратамі і буржуазнымі партыямі, але таксама кансенсусам адносна неабходнасці захавання прынцыповага адзінства фінляндскага грамадства і яго эліт перад савецкай пагрозай.

Гэта зусім не адмяняла сапраўднай палітычнай барацьбы. У перыяд з 1945 па 1975 гг. у Фінляндыі змяніўся 31 урад. У краіне існавала развітая шматпартыйная сістэма з шэрагам моцных і папулярных партый. Аднапартыйны ўрад меншасці ўдалося стварыць толькі тройчы, астатнія былі кааліцыйнымі. Найбольшым уплывам карысталася **Сацыял-дэмакратычная партыя Фінляндыі (СДПФ)**, якая на 10 выбарах пасляваеннага 30-годдзя ў сярэднім набірала 24,8 % галасоў выбаршчыкаў. Гэты вынік, аднак, на парадак саступаў даваенным паказчыкам партыі, калі яе электаральная падтрымка нават перася-

гала 40 %. Галоўная прычына адноснага аслаблення СДПФ тлумачылася тым, што 1944 г. на базе камуністычнай партыі, левых груповак самой СДПФ і шэрагу грамадска-палітычных арганізацый быў створаны **Дэмакратычны саюз народу Фінляндыі (ДСНФ)**. Больш левая (і больш прасавецкая) рабочая партыя адцягнула ў СДПФ нямала выбаршчыкаў і ў пасляваенныя дзесяцігоддзі ў сярэднім здабывала 20,5 % галасоў.

Галоўным несацыялістычным канкурэнтам СДПФ была партыя **Аграрны саюз** (**АС**; яе прадстаўніком, напрыклад, быў і У. К. Кеканен). У сярэднім на парламенцкіх выбарах яна набірала 21,1 %. Упэўнена выглядала на выбарах і ліберальна-кансерватыўная **Нацыянальная кааліцыйная партыя (НКП) –** 15,8 %. Стабільна выступала і **Шведская нацыянальная партыя (ШНП)**, што абапіралася на свой вельмі ўстойлівы электарат – шведскую меншасць (каля 10 %).

Палітычнае жыццё **Ісландыі** было дастаткова спакойным і прадказальным. **Партыя незалежнасці**, створаная ў 1929 г. у выніку зліцця Кансерватыўнай і Ліберальнай партый, не ведала паражэнняў на выбарах, атрымліваючы ад 36 % да 43 %. Праўда, і абсалютную большасць атрымаць ёй ніводнага разу не ўдалося. Таму час ад часу права на фарміраванне ўраду даставалася яе апанентам – **Прагрэсіўнай партыі** (тройчы) і **Сацыял-дэмакратычнай партыі Ісландыі** (двойчы).

### Краіны Паўночнай Еўропы на міжнароднай арэне ў другой палове 1940-х – 1970-х гг.

Знешнепалітычная арыентацыя паўночнаеўрапейскіх краін пасля Другой сусветнай вайны змянілася. Яны адмовіліся ад даваеннай палітыкі ізаляцыянізму. У 1945 – 1946 г. Данія, Ісландыя, Нарвегія і Швецыя ўступілі ў ААН і нават здолелі заваяваць моцныя пазіцыі ў арганізацыі. Нарвежац Тругве Лі (1946 – 1952) і швед Даг Хамаршэльд (1953 – 1961) былі першымі абранымі Генеральнымі сакратарамі ААН. Аднак падпісанне Статуту гэтай арганізацыі не азначала поўнага разрыву з палітыкай нейтралізму. Гэтыя краіны прэтэндавалі на ролю звязваючага звяна паміж Захадам і Ўсходам. У 1946 г. былі падоўжаныя або падпісаныя нанова гандлёвыя пагадненні з СССР.

З пачаткам «халоднай вайны» краіны Паўночнай Еўропы, як і іншыя краіны кантыненту, паўсталі перад выбарам. Данія, Ісландыя, Нарвегія і Швецыя далучыліся да плану Маршала. 4 красавіка 1949 г. Данія, Ісландыя і Нарвегія, з вопыту Другой сусветнай найбольш заклапочаныя праблемамі нацыянальнай бяспекі, сталі сузаснавальнікамі блоку НАТО. Швецыя захавала адданасць традыцыйнай палітыцы нейтралітэту.

Пасляваенная Фінляндыя знаходзілася ў прынцыпова іншым знешнепалітычным становішчы. Хаця фінляндскія ўлады заўжды падкрэслівалі, што вайна з СССР у 1941 – 1944 гг. гэта не ўдзел у Другой сусветнай, а

толькі «вайна-працяг» Зімовай вайны 1939 – 1940 гг., краіна патрапіла ў лік пераможаных краін. Да падпісання мірнага дагавору Фінляндыя была вельмі абмежаваная ў магчымасці падтрымліваць нармальныя дыпламатычныя адносіны і ўвогуле выступаць на міжнароднай арэне як суверэнная дзяржава. Пасля падпісання 10 лютага 1947 г. Парыжскага мірнага дагавору знешнепалітычныя пазіцыі краіны сталі наладжвацца, але не так хутка, як таго хацелася Хельсінкі.

Пачатак «халоднай вайны» паставіў Фінляндыю ў няпростае становішча: у яе не было выбару, акрамя падтрымання прыярытэтнасці савецка-фінляндскіх адносін. Падмурак пад іх доўгатэрміновы характар быў закладзены падпісаннем двухбаковага дагавору ў 1948 г. Частковае пераадоленне Фінляндыяй знешнепалітычных наступстваў Другой сусветнай вайны (няпоўнае, пакуль над краінай працягваў узвышацца магутны ўсходні сусед) адбылося ўжо ў першай палове 1950-х гг. У 1952 г. Хельсінкі атрымаў права прыняць XV летнія Алімпійскія гульні. Алімпіяда мелася прыехаць ў гэты горад яшчэ ў 1940 г., але гэтаму перашкодзіла вайна. Месца правядзення гэтага сусветнага спартыўнага форуму – сяброўская СССР краіна – стала немалаважным фактарам для магчымасці дэбюту савецкіх спартсменаў на алімпійскіх арэнах. У 1955 г. СССР вярнуў Фінляндыі спрэчную тэрыторыю Поркала-Уд. У тым жа годзе краіна стала паўнапраўным членам Арганізацыі Аб’яднаных Нацый.

З канца 1940-х гг. у Паўночнай Еўропе аднаўляецца тэндэнцыя да рэгіянальнай інтэграцыі. У 1949 г. грамадзяне 5 паўночнаеўрапейскіх краін атрымалі магчымасць бесперашкодна падарожнічаць па рэгіёне – былі скасаваны візы. У 1952 г. з ініцыятывы Даніі была створана **Паўночная рада –** кансультацыйная арганізацыя супрацоўніцтва дзяржаў Паўночнай Еўропы. У 1955 г. да Рады далучылася Фінляндыя (пры гэтым рабілася агаворка, што краіна не будзе ўдзельнічаць ў абмеркаванні ваенна-палітычных пытанняў, а таксама пытанняў, якія патрабуюць вызначэння пазіцый адносна супярэчнасцей паміж вялікімі дзяржавамі).

Паўночная Еўропа не засталася ў баку ад заходнееўрапейскіх інтэграцыйных працэсаў. З 1960 г. Данія, Нарвегія і Швецыя далучыліся да Еўрапейскай асацыяцыі свабоднага гандлю (у 1961 г. асацыяваным членам ЕАСГ стала Фінляндыя, а Ісландыя падключылася да Асацыяцыі ў 1970 г.). Аднак ужо напрыканцы 1960-х гг. на Поўначы Еўропы была зроблена спроба запусціць уласны інтэграцыйны праект. У 1968 г. была агучана ідэя арганізацыі паўночнаеўрапейскага эканамічнага супрацоўніцтва – **НОРДЭК**. Шэраг рознагалоссяў і, самае галоўнае, адмова ад удзелу ў праекце Фінляндыі (фактычна на непажаданасць ўдзелу краіны ў рэгіянальнай арганізацыі ўказаў Савецкі Саюз), а потым падача заяўкі на ўступленне ў «Агульны рынак» Даніі і Нарвегіі паставілі на гэтых планах крыж.

Напачатку 1970-х гг. у Паўночнай Еўропе ўзрастае зацікаўленасць у далучэнні да Еўрапейскіх супольнасцяў. Заяўкі Даніі і Нарвегіі на ўступленне ў «Агульны рынак» былі задаволеныя ў 1972 г. Аднак толькі датчане падтрымалі на рэферэндуме ініцыятыву ўраду – з 1973 г. Данія стала паўнапраўнай удзельніцай ЕЭС.

Пытанне аб далучэнні да заходнееўрапейскай інтэграцыі ўздымалася і ў Фінляндыі. Аднак падкрэслена халодная рэакцыя на гэта СССР і жорсткая крытыка праеўрапейскіх амбіцый буржуазных партый з боку камуністаў ды «іншых прагрэсіўных сіл» вымусілі ўрад абмежавацца падпісаннем пагаднення паміж Фінляндыяй і ЕЭС аб свабодным гандлі прамысловымі таварамі.

Імкненне фінляндскай дыпламатыі стаць звязваючым мостам паміж Захадам і Ўсходам было ўзнагароджана ў першай палове 1970-х гг. Хельсінкі мелі гонар прыняць у 1972 – 1973 гг. дэлегацыі практычна ўсіх еўрапейскіх дзяржаў, ЗША і Канады, якія распачалі шматбаковыя кансультацыі па падрыхтоўцы агульнаеўрапейскай нарады для выпрацоўкі захадаў па змяншэнні ваеннага супрацьстаяння. 30 ліпеня – 1 жніўня 1975 г. г. зв. «хельсінскі працэс» быў увенчаны канферэнцыяй у Хельсінкі, дзе быў прыняты Заключны акт Нарады па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе – галоўны міжнародны дакумент эпохі разрадкі.

### Эканамічнае развіццё краін Паўночнай Еўропы ў 1980-х – 2000-х гг. Станаўленне і развіццё постіндустрыяльнай эканомікі. Удзел у еўрапейскай інтэграцыі. Эканамічныя крызіс 2008 – 2009 гг.

Пасля пераадолення структурных крызісаў 1970-х – пачатку 1980-х гг. эканоміка краін Паўночнай Еўропы перажывала зніжэнне тэмпаў эканамічнага росту, паскорыліся інфляцыйныя працэсы, абвастрыліся бюджэтныя праблемы. Тым не менш, прырост ВУП усё роўна перавышаў сярэднееўрапейскі паказчык. У адрозненне ад астатняй Заходняй Еўропы па-ранейшаму на нізкім узроўні трымалася беспрацоўе.

Напачатку 1990-х гг. краіны рэгіёну зведалі эканамічны крызіс. Для Швецыі ён аказаўся самым балючым пасля дэпрэсіі пачатку 1930-х гг. У прамежак часу паміж 1990 і 1993 гг. ВВП Швецыі знізіўся на 5 %, а колькасць працоўных месцаў – на 10 %. Для экспартна-арыентаванай краіны сітуацыя ўскладнялася тым, што і ў свеце назіраўся эканамічны спад. У 1992 – 1993 гг. па Швецыі ўдарыў фінансавы крызіс.

Да гэтага часу шведская эканамічная мадэль забяспечвала ўстойлівае сацыяльна-эканамічнае развіццё краіны. Аднак новыя ўмовы сусветнага развіцця, паскарэнне працэсаў глабалізацыі міжнароднай канкурэнцыі спарадзілі напрыканцы XX ст. шэраг прынцыповых праблем: немагчымасць спалучэння поўнай занятасці насельніцтва і падтрымання стабільнасці цэн, захавання ў нязменным

выглядзе сацыяльных гарантый і г. д. Карэннае абнаўленне патрабавалася і ў святле ўступлення Швецыі ў постіндустрыяльную стадыю развіцця.

Сацыял-дэмакраты ў 1990-я гг. пайшлі на маштабную мадэрнізацыю краіны. У выніку сацыяльная палітыка дзяржавы пачынае губляць чыста пера-размеркавальны характар. Дзяржаўная манаполія ў сферы сацыяльных паслуг змянілася шматукладнасцю. Быў узяты курс на прыватызацыю дзяржаўнай уласнасці, развіццё прадпрымальніцкай ініцыятывы і канкурэнцыі, скарачэнне падатковага цяжару для вытворцаў. Прыярытэтнымі сталі: стварэнне развітой транспартнай ды інфармацыйнай інфраструктуры; пераўтварэнне сістэмы адукацыі для забеспячэння мэт постіндустрыяльнага інавацыйнага развіцця; стымуляванне навукова-тэхнічных распрацовак дзеля правядзенне бесперапыннай палітыкі мадэрнізацыі.

У выніку ўжо з канца 1993 г. Швецыя ўступае ў фазу росту: да 2000 г. яе ВВП штогод прырастала ў сярэднім на 3,2 %. Акрамя таго, назіралася павелічэнне аб’ёму экспарту, а значыць, і ўмацаванне канкурэнтаздольнасці нацыянальнай эканомікі. Быў наведзены парадак у дзяржаўных фінансах, палепшаны ўмовы прадпрымальніцкай і адукацыйнай дзейнасці, створаны магутныя галіны інфармацыйных тэхналогій і тэлекамунікацый.

Яшчэ горшым пачатак 1990-х гг. аказаўся для Фінляндыі. Пасля структурных крызісаў 1970-х – пачатку 1980- х гг. назіраўся значны рост грамадскіх выдаткаў. Ішлі яны не на інвестыцыі ў вытворчасць, а галоўным чынам на спажыванне, у тым ліку праз танныя крэдыты – на адукацыю, сацыяльныя патрэбы і г. д. Рэальная вытворчасць не паспявала за выдаткамі: яны ў 1980-я гг. удвая перавышалі рост ВНП. Вельмі прывабнымі становяцца біржавыя спекуляцыі – у краіне настае росквіт г. зв. «казіно-эканомікі».

Прычым, адбывалася ўсё гэта на фоне не самага спрыяльнага фону. У другой палове 1980-х гг. у СССР адбывалася імклівае падзенне тэмпаў вытворчасці, пагаршаўся дабрабыт савецкага насельніцтва, а значыць скарачаўся фінляндска-савецкі двухбаковы гандаль. У 1985 г. экспарт у СССР складаў 20 % сукупнага экспарту Фінляндыі, але ў 1988 г. – ужо 15 %, а ў 1991 г. – толькі 10 %. Гэта скрайне негатыўна ўплывала на фінляндскую эканоміку: быў парушаны знешнегандлёвы баланс, узрасла знешняя запазычанасць, пачалося скарачэнне прамысловай вытворчасці. Узрастальныя фінансавыя цяжкасці Фінляндыі пагаршаліся з-за значнага росту экспарту капіталу, які напрыканцы 1980-х гг. у чатыры разы перавышаў замежныя капіталаўкладанні ў фінскую эканоміку.

Дзяржава рабіла даўгі гэткімі тэмпамі, што неўзабаве яе фінансавых магчымасцяў аказалася недастаткова, каб утрымліваць дзяржаву «ўсеагульнага дабрабыту» паўночнаеўрапейскіх стандартаў. Напачатку 1990-х гг. «казіно-эканоміка» рухнула, пачаўся эканамічны спад. У 1991 г. ВНП ска-

раціўся на 6,5 %, а аб'ём прамысловай вытворчасці – нават на 10 %. Наступіў банкаўскі крызіс, па краіне пракацілася хваля банкруцтваў. Адбываецца рост беспрацоўя: у 1993 г. яно дасягнула паўмільённага рубяжу або 20 % працоўнай сілы краіны. Эканамічны спад у Фінляндыі працягваўся ўсю першую палову 1990-х гг.

Эканамічныя праблемы, з якімі напачатку 1990-х гг. сутыкнуліся Швецыя і Фінляндыя, а таксама глабальныя геапалітычныя зрухі мяжы 1980 –90-х гг. абумовілі новы рост іх зацікаўленасці ва ўдзеле ў еўрапейскай эканамічнай і палітычнай інтэграцыі. У 1995 г. гэтыя краіны далучыліся да ЕС. Нарвежцы у другі раз сказалі інтэграцыі «не». Удзел у ЕС у цэлым станоўча адбіўся на эканамічным развіцці краін-членаў з паўночнаеўрапейскага рэгіёну.

Пасля не надта ўдалага пачатку новага тысячагоддзя з 2004 па 2007 гг. эканоміка краін Паўночнай Еўропы стала ізноў развівацца хуткімі тэмпамі. У асабліва спрыяльных умовах апынулася Нарвегія. Высокія кошты на нафту сталі важнейшым стымулам для агульнага эканамічнага росту і выдатнай базай для далейшага росту дабрабыту яе насельніцтва. Хутка – ад 10 % да 13 % у год – рос шведскі экспарт. Дынамічнае развіццё дацкай эканомікі дазволіла да 2005 г. збіць беспрацоўе да ўзроўню ніжэй за 5 %, чаго не назіралася з сярэдзіны 1970-х гг. Не горшай была і сітуацыя ў эканоміцы Фінляндыі. Хуткімі тэмпамі павялічваўся экспарт (каля 5 % у год). Асабліва высокім попытам карысталася прадукцыя фінскай тэлекамунікацыйнай і электроннай галін. На гэтыя галіны на чале з кампаніяй *Nokia* прыпадала каля чвэрці ўсёй вартасці экспарту краіны.

Становішча рэзка пагоршылася восенню 2008 г. Эканамічны крызіс 2008 – 2009 гг. стаў для большасці краін рэгіёну нашмат горшым, чым структурны крызіс 1970-х – пачатку 1980-х гг. альбо спад пачатку 1990-х гг. Напрыклад, шведскі экспарт упаў у 2009 г. на 12,5 %, да небывалага ўзроўню (8 %) падскочыла беспрацоўе. У яшчэ горшым становішчы апынулася эканоміка Фінляндыі. У 2009 г. яе экспарт і прамысловая вытворчасць скараціліся адпаведна на 20 і 21 %, прычым скарачэнне экспарту аказалася самым буйным у еўразоне.

Аднак сапраўды катастрафічныя маштабы гэты эканамічны крызіс набывае ў Ісландыі. Да 2008 г. яна знаходзілася ў ліку самых эканамічна развітых дзяржаў свету. Нездарма ў 2007 г. Ісландыя была прызнаная ААН найлепшай краінай для жыцця ў свеце. Глабальнае значэнне набывае банкаўскі сектар краіны: толькі чатыры банкі гэтай краіны акумулявалі каля $140 млрд. (пры ВНП Ісландыі на 2007 г. на ўзроўні $7,5 млрд.) Аднак фінансавы крах трох буйнейшых ісландскіх банкаў паставіў Ісландыю на мяжу банкруцтва і закрануў усе сферы яе эканомікі. Адносна памераў эканомікі краіны гэты крызіс лічыцца адной з буйнейшых эканамічных катастроф у гісторыі. Не пераадолены

ён і да сённяшняга дня. Крызіс як ніколі раней востра паставіў пытанне пра самадастатковасць Ісландыі і яе эканомікі ў свеце, і ў ліпені 2009 г. урад краіны накіраваў заяўку на ўступленне ў ЕС.

У найменшай ступені сусветны эканамічны крызіс 2008 – 2009 гг. закрануў Нарвегію. Адбылося некаторая зніжэнне тэмпаў эканамічнага росту, а па выніках 2009 г. на 1,4 % скараціўся ВНП. Немалаважным фактарам, што абумовіў трываласць нарвежскай эканомікі стаў прыкметны рост экспарту нафты і газу, а таксама буйныя інвестыцыі ў гэты сектар. І хаця небывалага за апошнія 20 гадоў ўзроўню дасягнула беспрацоўе, яго нарвежскія лічбы – 3 – 3,5 % ад эканамічна актыўнага насельніцтва – і для рэгіёну, і тым больш для ўсяго кантыненту, выглядалі проста зайздросна.

Швецыя пацярпела ад эканамічнага крызісу мацней, чым многія іншыя краіны. Ізноў праявілася моцная залежнасць Швецыі ад знешніх рынкаў. Падзенне экспарту аказалася нават большым, чым напачатку 1990-х гг. і склала каля 12,5 %. У 2009 г. ВУП краіны знізілася на 5 %. Адбыўся небывалы рост беспрацоўя, якое да канца 2010 г. дасягнула 8,5 %. Тым не менш, ужо ў 2010 г. адбылося яўнае ажыўленне эканомікі. Яе рост за гэты год склаў каля 5 % – адзін з найлепшых паказчыкаў сярод заходнееўрапейскіх краін.

### Палітычнае жыццё краін Паўночнай Еўропы ў другой палове 1970-х – 2010-х гг.

Унутрыпалітычнае развіццё краін Паўночнай Еўропы ў апошняй чвэрці XX – пачатку XXI стагоддзя характарызавалася значнай пераемнасцю з папярэднім перыядам. Гэта датычылася і рэгіёну ў цэлым, і яго асобных дзяржаў. Па-ранейшаму дамінавалі нязначная палярызаванасць палітычных сіл, іх схільнасць да кампрамісаў; стабільнасць палітычных сістэм і адносная ўстойлівасць урадаў.

Аднак складванне і развіццё постіндустрыяльнага грамадства не маглі не абумовіць некаторых істотных зрухаў. Індустрыяльная эпоха з колькаснай перавагай рабочага класу ва ўмовах усеагульнага выбарчага права і дэмакратычнай палітычнай сістэмы стваралі ідэальныя ўмовы для палітычнага панавання сацыял-дэмакратычных партый. Змены сацыяльнай структуры насельніцтва, змяншэнне актуальнасці традыцыйных ідэалогій, рост экалагічнай свядомасці, наступленне эры інфармацыйных тэхналогій ды Інтэрнэту, актывізацыя міграцыйных працэсаў, інтэграцыя і глабалізацыя, а, галоўнае, агульнае паскарэнне тэмпаў гістарычнага развіцця абумоўліваюць значныя змены палітычных пераваг і прыхільнасцей насельніцтва краін Паўночнай Еўропы.

Напрыклад, сацыял-дэмакраты Швецыі, Даніі, Нарвегіі і па-ранейшаму ўтрымліваюць лідарскія пазіцыі ў палітычным жыцці сваіх краін, аднак апошнім часам пра дзесяцігоддзі бесперапыннага знаходжання пры ўладзе, як у папярэдні гістарычны адрэзак часу, яны могуць толькі марыць.

У **Швецыі** з 1976 г. адбываецца пастаяннае чаргаванне пры ўладзе СДРПШ і правацэнтрысцкіх кааліцый. Сацыял-дэмакраты мелі ўрады меншасці ў 1982 – 1991 і 1994 – 2006 гг. Першы з гэтых урадаў узначальваў адзін з найбольш яркіх палітыкаў Швецыі ўсяго пасляваеннага часу, выдатны дзеяч міжнароднага сацыялістычнага руху Улаф Пальмэ (1982 – 1986). Яго жыццё трагічна абарвалася ў 1986 г. у выніку тэрарыстычнага акту, здзейсненага дагэтуль дакладна не выяўленымі замежнымі сіламі. Гэтае палітычнае забойства стала ў мірнай і спакойнай Швецыі першым за амаль два стагоддзі (у далёкім 1792 г. змоўшчыкамі быў забіты кароль Густаў III).

Апаненты СДРПШ трымалі ўладу з 1976 па 1982 гг. (кааліцыя ПЦ-УКП-НКП і аднапартыйны ўрад меншасці НКП), з 1991 па 1994 гг. (УКП-ПЦ-НКП-ХДП). Апошнія два ўрады фарміруе гэтая ж чатырохпартыйная кааліцыя, што выступае пад назвай **«Альянс за Швецыю»**, на чале з дзеючым прэм'ер-міністрам гэтай краіны Фрэдрыкам Райнфельтам (2006).

Сярод новых палітычных сіл апошнім часам гучна заявіла аб сабе **Пірацкая партыя (ПП)** (заснавана ў 2006 г.), якая выступае супраць існуючага заканадаўства ў галіне інтэлектуальнай уласнасці, патэнтаў, копірайта і за няўдзел Швецыі ў міжнародных арганізацыях па абароне аўтарскіх правоў. Прычым, ПП не выступае супраць аўтарскіх правоў увогуле, а толькі хоча дазволіць неабмежаваны некамерцыйны абмен аб'ектамі аўтарскіх правоў, захоўваючы пры гэтым забарону на камерцыйны. Акрамя таго, партыя адстойвае прыватнасць ў сетцы Інтэрнэт і ў штодзённым жыцці. На выбарах 2009 г. у Еўрапарламент Пірацкая партыя здабыла 7,1 % галасоў шведскіх выбаршчыкаў і заваявала ганаровае 4-е месца! Поспех гэтай партыі выклікаў да жыцця цэлы шэраг падобных арганізацый па ўсёй Еўропе і за яе межамі. Неўзабаве ПП стала адной з сузаснавальніц «Пірацкага інтэрнацыяналу».

Чаргаванне пры ўладзе сацыял-дэмакратаў і правацэнтрысцкіх кааліцый таксама было характэрна і для **Нарвегіі**. Тут урадавая ратацыя здаралася часцей, чым у Швецыі. Нарвежская рабочая партыя (НРП) аказвалася ў апазіцыі 4 разы: у 1981 – 1986, 1989 – 1990, 1997 – 2000, 2001 – 2005 гг. Звяртае на сябе той факт, што найбольш паспяховым палітыкам гэтага перыяду стала жанчына, лідар сацыял-дэмакратаў Гру Харлем Брунтланд. Яна тройчы ўзначальвала ўрад – у 1981, 1986 – 1989 і 1990 – 1996 гг. Як і раней, галоўнымі канкурэнтамі на нацыянальнай палітычнай арэне заставаліся хёйрэ (кансерватары), венстрэ (лібералы) і хрысціянскія дэмакраты.

У 2005 г. да ўлады прыйшоў «чырвона-зялёны» кааліцыйны ўрад на чале з Енсам Столтэнбергам (2005) у складзе НРП, ПЦ (аграрыі) і Сацыялістычнай левай партыі. Яго адметнасць палягае ў тым, што ўпершыню з 1945 г. для атрымання ўлады НРП была вымушаная пайсці на стварэнне кааліцыі.

У **Даніі** пазіцыі сацыял-дэмакратаў аказаліся адносна слабейшымі. Таму ў гэтай краіне ўрадавая ратацыя як правіла адбывалася не паміж правацэнтрысцкімі кааліцыямі і СДПД, а паміж правацэнтрыстамі і левацэнтрысцкімі кааліцыямі на чале з сацыял-дэмакратамі. З 1975 па 1982 і з 1993 па 2001 гг. пасаду прэм’ер-міністра займалі лідары СДПД, з 1982 па 1993 гг. – кансерватар, а з 2001 г. – прадстаўнікі партыі венстрэ. З 1982 г., калі сацыял-дэмакратам пашчасціла ўтварыць аднапартыйны ўрад меншасці, усе дацкія ўрады – кааліцыйныя.

Спецыфіка палітычнай барацьбы ў **Фінляндыі** заключаецца ў тым, што акрамя парламенцкіх выбараў арэнай актыўнай палітычнай барацьбы з’яўляюцца прэзідэнцкія выбары. У 1982 г. скончылася фенаменальна працяглае для дэмакратычнай краіны 26-гадовае прэзідэнцтва У. К. Кеканена. Новым прэзідэнтам быў абраны сацыял-дэмакрат (упершыню ў гісторыі) Маўна Хенрык Койвіста (1982 – 1994).

Ужо з 1988 г. фіны пачалі адмаўляцца ад абрання галавы дзяржавы калегіяй выбаршчыкаў: да яе можна было звярнуцца толькі ў тым выпадку, калі ў першым туры ніводны з кандыдатаў не набіраў абсалютную большасць галасоў выбаршчыкаў (50 % + 1 голас). З 1994 г. сталі праводзіцца прамыя прэзідэнцкія выбары. Першым прэзідэнтам абраным гэтым самым дэмакратычным спосабам стаў выбітны прафесійны дыпламат з сусветнай вядомасцю, член СДПФ з 1993 г.(!) Марці Ахцісаары (1994 – 2000). У 2000 г. галавой рэспублікі быў абраны яшчэ адзін сацыял-дэмакрат – першая жанчына на пасадзе прэзідэнта Фінляндыі – Тар'я Халанен (2000).

Поўная перавага кандыдатаў ад сацыял-дэмакратычнай партыі на прэзідэнцкіх выбарах у Фінляндыі апошніх дзесяцігоддзяў зусім не сведчыць пра дамінаванне СДПФ на нацыянальнай палітычнай арэне. Толькі на парламенцкіх выбарах 1983 і 1995 гг. партыя набірала больш чвэрці галасоў выбаршчыкаў. У пачатку XXI ст. сацыял-дэмакраты страцілі нацыянальнае лідарства: у 2003 і 2007 гг. адносную большасць галасоў выбаршчыкаў атрымала Партыя цэнтру (адпаведна 24,7 і 23 %), а ў 2011 г. – Нацыянальна-кааліцыйная партыя (20,5 %).

Апошнія парламенцкія выбары прынеслі агульнаеўрапейскую сенсацыю. Першае і другое месца дасталася традыцыйным фаварытам – НКП і СДПФ (20,1 %). Але трэцяй стала маладая (заснавана ў 1995 г.) партыя **«Сапраўдныя фіны»** – 20,1 % і толькі на паўтысячы галасоў меней за сацыял-дэмакратаў (на папярэдніх выбарах было толькі 4 %). Падобны зыход стаў адказам амаль пятай часткі фінскіх выбаршчыкаў на пашырэнне ЕС і крах палітыкі мультыкультуралізму ў Заходняй Еўропе.

Гэтая нацыяналістычная і папулісцкая партыя крытычна ставіцца да ЕС і НАТО, паколькі лічыць, што фіны маюць усе магчымасці для таго,

каб не залежаць ад вонкавых уплываў і самастойна забяспечваць свой дабрабыт (пры гэтым не забяспечваючы чужы – дабрабыт жыхароў бедных краін Еўрасаюзу). «Сапраўдныя фіны» лічаць неабходным скараціць прыток мігрантаў у краіну і абмежаваць іміграцыю, а для дапушчаных у краіну прадугледжваецца паскораная адаптацыя праз пазбаўленне фінансавай падтрымкі на захаванне іх культуры.

Спакойнае і даволі прадказальнае палітычнае жыццё **Ісландыі** з больш як паўвекавым дамінаваннем Партыі незалежнасці скончылася ў 2009 г. у выніку разбуральнага сусветнага фінансавага крызісу 2008 – 2009 гг. Фінансавая і эканамічная катастрофа прывяла да ўнутрыпалітычнага крызісу і адстаўкі ўраду. Галоўныя палітычныя спрэчкі паміж асноўнымі палітычнымі сіламі зараз разгортваюцца вакол магчымасці і самой неабходнасці кампенсацыі Ісландыяй замежным укладчыкам грошай, якія яны страцілі ў выніку краху вядучых банкаў краіны. Ісландцы ўжо двойчы выказваліся супраць гэтага на рэферэндумах 2010 і 2011 гг.

Адметнай рысай грамадска-палітычнага жыцця краін Паўночнай Еўропы з'яўляецца актыўны ўдзел у ім жанчын. У Нарвегіі, Ісландыі і Фінляндыі Жанчыны ўжо ўзначальвалі ўрады, а ў апошняй у 2003 і з 2010 г. у прадстаўніц «слабага» полу – абедзве вышэйшыя пасады ў рэспубліцы – прэзідэнцкая і прэм'ер-міністра. Нямала жанчын уваходзіла і ўваходзіць ва ўрад, засядае ў парламентах. Па долі жанчын у дэпутацкім корпусе Швецыя, Данія, Нарвегія і Фінляндыя займаюць 4 першыя месцы ў свеце. Напрыклад, у рыксдагу 2002 г. абранныя жанчыны складалі 47 %, а ў фінляндскай эдускунце ўзору 2011 г. – 42,5 %.

### Знешняя палітыка і ўдзел у Еўрапейскай інтэграцыі

Геапалітычныя змены, што адбыліся на міжнароднай арэне ў сувязі з заканчэннем «халоднай вайны» і распадам Савецкага Саюзу, аб'яднанне Германіі і стварэнне новых незалежных дзяржаў стварылі прынцыпова новыя ўмовы для фарміравання знешняй палітыкі краін Паўночнай Еўропы.

Па-першае, у рэгіёне ўзрастае зацікаўленасць ва ўдзеле ў еўрапейскіх інтэграцыйных працэсах. У ліпені 1991 г. падала заяўку на ўдзел у Еўрапейскіх супольнасцях Швецыя, якая здаўна прытрымлівалася лініі на захаванне строгага нейтралітэту. Гэта паслужыла штуршком для Фінляндыі паследаваць прыкладу сваёй заходняй суседкі ў сакавіку 1992 г. Напрыканцы таго ж году паўторна звярнулася з просьбай аб далучэнні да Еўрапейскіх супольнасцяў Нарвегія. Заяўкі ўсіх гэтых краін былі задаволеныя ўлетку 1994 г. Аднак восеньскія рэферэндумы наконт далучэння да ЕС завяршыліся па-рознаму. Шведы і фіны падтрымалі еўраінтэграцыю сваіх краін, а вось нарвежцы ў другі раз выступілі супраць ініцыятывы свайго ўраду. З пачатку 1995 г. Швецыя і Фінляндыя сталі паўнапраўнымі членамі Еўрапейскага Саюзу. У 1996 г. не толькі тры краіны-ўдзельніцы ЕС (Данія, Швецыя, Фінляндыя), але таксама Ісландыя і Нарвегія далучыліся да Шэнгенскага пагаднення.

Аднак у цэлым Данія, Швецыя і Фінляндыя з пэўнай асцярожнасцю ставіліся да радыкальных інтэграцыйных праектаў ЕС. Напрыклад, толькі з другога разу датчане падтрымалі (1993) Дагавор аб стварэнні Еўрапейскага Саюзу. Акрамя таго, адна Фінляндыя наважылася ў 2002 г. перайсці на еўра. І калі сёння Данія не выключае сваю адмову ад дацкай кроны на карысць агульнай еўрапейскай валюты ў недалёкім будучым, то Швецыя ставіцца да ўвядзення еўра па-ранейшаму без энтузіязму. Галоўная прычына гэтага – еўраскептыцызм датчан і шведаў, якія вельмі заклапочаны магчымасцю страты праз адзіную валюту сваіх сацыяльных заваёў (у 2003 г. шведы прагаласавалі супраць еўра на рэферэндуме).

Па-другое, новыя геапалітычныя рэаліі канца XX ст. вымушалі паўночнаеўрапейскія ўрады па-новаму зірнуць на праблему падтрымання сваёй нацыянальнай бяспекі. Фінляндыя і Швецыя адмовіліся далучыцца да НАТО, але з 1994 г. бяруць удзел у праграме «Партнёрства дзеля міру», якую Паўночнаатлантычны альянс распрацаваў для еўрапейскіх дзяржаў і былых рэспублік СССР. Пасля тэрарыстычных атак 2001 г. ідэя інтэграцыі гэтых дзяржаў ў НАТО знаходзіць усё больш прыхільнікаў. Пэўны інтарэс на Поўначы Еўропы выклікала ўзаемадзеянне ў межах Заходнееўрапейскага саюзу (ЗЕС) – арганізацыі, створанай у 1948 г. для супрацоўніцтва ў сферы абароны і бяспекі. Данія, Фінляндыя і Швецыя атрымлівалі статус назіральнікаў у ЗЕС, а Ісландыя і Нарвегія – асацыяваных партнёраў. У ліпені 2011 г. гэтая арганізацыя спыніла сваё існаванне.

Акрамя таго, апошнім часам Швецыя імкнецца адыгрываць актыўную ролю ў Балтыйскім рэгіёне – зоне яе традыцыйных знешнепалітычных інтарэсаў з часоў сярэднявечча, асабліва ў дачыненні былых рэспублік СССР – Літвы, Латвіі, Эстоніі.

## Тэма 16. Краіны Паўднёвай і Паўднёва-заходняй Еўропы ў 1945 – 2010-я гг.

### Эканамічны стан Грэцыі і Партугаліі пасля Другой сусветнай вайны. Прычыны заняпаду народнай гаспадаркі Грэцыі, захавання эканамічнай адсталасці Партугаліі. Захаванне дыктатарскага рэжыму Салазара ў Партугаліі. Актывізацыя дэмакратычных і апазіцыйных сіл. Распад Руху дэмакратычнага адзінства. Стварэнне Нацыянальнага дэмакратычнага руху

Другая сусветная вайна скончылася для Грэцыі ў лістападзе 1944 г., калі апошнія нямецкія часткі пакінулі тэрыторыю краіны. У выніку ваенных дзеянняў ды італа-нямецкай акупацыі краіна панесла цяжкія матэрыяльныя і людскія страты. Каля 400 тыс. чалавек загінула, а амаль кожны пяты страціў дах над галавой. Быў нанесены магутнейшы ўдар па інфраструктуры краіны. Грэцыя пазбавілася 4/5 свайго аўтамабільнага парку і

суднаў гандлёвага флоту. Агульныя матэрыяльныя страты краіны склалі $8,2 млрд. Непасрэдным наступствам вайны і акупацыі з'явілася значнае падзенне вытворчасці ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі, гіперінфляцыя, дэфіцыт дзяржаўнага бюджэту, рост беспрацоўя і цэн.

У пасляваенныя гады Партугалія працягвала заставацца ў дваістым становішчы: як краіна каланізатар, з аднаго боку, і як краіна моцна залежная ад замежнага капіталу, – з другога. У адрозненне ад многіх іншых краін Партугалія ўступіла ў пасляваенны перыяд з вялікімі валютнымі рэзервамі, назапашанымі ёй падчас вайны дзякуючы пастаўкам стратэгічных матэрыялаў абедзвюм ваюючым кааліцыям і эксплуатацыі народаў яе калоній. Разам з тым Партугалія працягвалася заставацца адной з найбольш адсталых краін Еўропы, без чорнай металургіі і машынабудавання, з перавагай дробных і паўсаматужных прадпрыемстваў у горадзе, засіллем буйных латыфундыстаў і распыленасцю зямельных участкаў на поўначы краіны. Традыцыйныя праблемы і адсталасць краіны не знаходзілі вырашэння, бо для правячага салазараўскага рэжыму на першым месцы стаяла не мадэрнізацыя краіны і звязаныя з ёй рэформы, а самазахаванне.

Няўдзел Партугаліі ў Другой сусветнай вайне, як і ў выпадку з Іспаніяй, дазволіў існаваўшаму салазараўскаму рэжыму працягнуць сваё існаванне. Падобна да іспанскага дыктатара ўрад А. Салазара выступіў з ідэяй «арганічнай дэмакратыі» і «лібералізацыі» рэжыму, у прыватнасці паабяцаўшы легалізаваць апазіцыю і правесці іншыя дэмакратычныя пераўтварэнні. Восенню 1945 г. у перыяд выбараў у Нацыянальны сход, і ў лютым 1949 г., падчас прэзідэнцкіх выбараў, апазіцыя нават атрымала права высунуць сваіх кандыдатаў і некаторыя магчымасці для вядзення перадвыбарчай прапаганды.

Паколькі саступкі ўраду насілі яўна фармальны характар, створаны ў верасні 1945 г. апазіцыйны блок – **Рух дэмакратычнага адзінства (РДА)**, у які ўвайшлі камуністы, сацыялісты, рэспубліканцы, масоны ды іншыя апазіцыйныя арганізацыі, – адмовіўся ад удзелу ў выбарах. Блок разлічваў на хуткі крах «новай дзяржавы». У парламент патрапілі толькі кандыдаты ад прафашысцкага «Нацыянальнага саюзу». У 1949 г. адзіны альтэрнатыўны кандыдат на пасаду прэзідэнта быў вымушаны зняць сваю кандыдатуру. Імкнучыся задушыць дэмакратычныя сілы, ўрад у 1949 – 1951 гг. звярнулася да новых рэпрэсій супраць РДА і буржуазна-дэмакратычнай апазіцыі. У гэтых умовах найменш паслядоўныя праціўнікі рэжыму ў 1951 г. пакінулі блок, і ён быў пераўтвораны ў **Нацыянальны дэмакратычны рух (НДР)**. У краіне была зноў аднаўленая палітычная манаполія.

### Расстаноўка палітычных сіл у Грэцыі пасля Другой сусветнай вайны. Рэстаўрацыя манархіі. Грамадзянская вайна 1946 – 1949 гг.і яе наступствы

Поруч з вялікімі эканамічнымі цяжкасцямі пасляваенная Грэцыя сутыкнулася з цяжкім палітычным крызісам. Падчас Другой сусветнай вайны ў краіне адбылося значнае ўзмацненне пазіцый камуністаў. Менавіта яны ўзначальвалі нацыянальны рух Супраціўлення, дамінавалі ў **Нацыянальна-вызваленчым фронце (ЭАМ)** і ў вайсковай арганізацыі фронту – **Грэчаскай Народна-вызваленчай арміі (ЭЛАС)**. Грэчаскія патрыёты самастойна здолелі ўсталяваць кантроль над 75 % тэрыторыі краіны. Тым не менш, намаганнямі Вялікабрытаніі, якая традыцыйна разглядала Ўсходняе Міжземнамор'е як жыццёва важную сферу свайго ўплыву і не магла дапусціць усталявання ў Грэцыі ўлады камуністаў, у кааліцыйным урадзе нацыянальнага адзінства вядучыя пазіцыі занялі дзеячы лонданскага эміграцкага кабінету. Новае грэчаскае кіраўніцтва выступала за рэстаўрацыю манархіі і фактычна санкцыянавала антыкамуністычны тэрор і рэпрэсіі супраць апазіцыйных сіл. Для забеспячэння падтрымкі грэчаскіх улад напрыканцы 1944 г. у краіне высадзіліся брытанскія войскі.

Першыя пасляваенныя парламенцкія выбары, якія адбыліся ў сакавіку 1946 г., адбываліся ў няпростых умовах глыбокага расколу грэчаскага грамадства і жорсткай палітычнай канфрантацыі асноўных палітычных сіл. Усе левыя і большасць цэнтрысцкіх партый, пратэстуючы супраць недэмакратычных умоў, не пажадалі браць у іх удзел. Камуністы ў тых умовах ўвогуле не звязвалі свае надзеі з парламенцкім шляхам вырашэння праблем краіны і прынялі Рашэнне ўзняць узброенае паўстанне. Як вынік, зыход галасавання слаба адлюстроўваў расклад палітычных сіл: манархісты заваявалі 6/7 дэпутацкіх мандатаў.

Парламенцкія выбары 1946 г. сталі адпраўной кропкай для пачатку грамадзянскай вайны. Першыя ўзброеныя сутыкненні паміж левымі і манархістамі адбыліся ўжо ў дзень правядзення выбараў. У чэрвені 1946 г. ў Грэцыі было ўведзена надзвычайнае становішча. Правядзенне 1 верасня плебісцыту па пытанні формы праўлення і перамога манархістаў (іх падтрымалі 70 % выбаршчыкаў) прывялі да далейшай эскалацыі канфлікту. За дзень да вяртання ў Грэцыю караля Георга II левaрадыкальныя сілы абвясцілі стварэнне **Дэмакратычнай арміі Грэцыі (ДАГ)**. У снежні 1946 г. яны выступілі з маніфестам, у якім патрабавалі правядзення ўсеагульнай амністыі, вываду брытанскіх войск, правядзення дэмакратычных парламенцкіх выбараў і стварэння кааліцыйнага ўраду з удзелам усіх партый.

З канца 1946 г. варагуючыя бакі перайшлі да буйнамаштабных баявых аперацый. Важная роля ў грамадзянскай вайне належала вонкавым сілам. ДАГ абапіралася на дапамогу СССР і сацыялістычна арыентаваных

суседзяў (Албанію, Балгарыю, Югаславію). Грэчаскі ўрад знайшоў магутную падтрымку не толькі ў Вялікабрытаніі, але таксама ў Злучаных Штатаў. 12 сакавіка 1947 г. прэзідэнт Г. Трумэн заявіў, што Грэцыя з’яўляецца краінай, што знаходзіцца «пад непасрэднай камуністычнай пагрозай», і таму мае патрэбу ў амерыканскай дапамозе. 20 чэрвеня быў падпісаны грэка-амерыканскі дагавор, згодна палажэнням якога ЗША абавязваліся перадаць грэчаскаму ўраду зброю, ваенных дарадцаў, а таксама крэдыт на суму ў $300 млн.

Пачатак грамадзянскай вайны застаўся за сіламі ДАГ, але ўжо ўлетку 1947 г. іх асноўныя сілы былі разбіты, а ўцалелыя фарміраванні пакінулі тэрыторыю Грэцыі. Супраціўленне камуністаў працягвалася да кастрычніка 1949 г.,калі пра спыненне агню заявілі іх апошнія атрады.

Грамадзянская вайна 1946 – 1949 гг. мела для Грэцыі катастрафічныя наступствы. Будучы і так адсталай краінай, яна была адкінутая на некалькі дзесяцігоддзяў назад. 50 тыс. чалавек загінула, каля 100 тыс. камуністаў ды іх прыхільнікаў палічылі за лепшае пакінуць краіну. Камуністычная партыя апынулася пад забаронай, а пазіцыі левых і, шырэй, рэспубліканскіх сіл аказаліся падарванымі. Пры гэтым падтрымка пераможцаў з боку насельніцтва таксама паменшылася. Яшчэ некалькі дзесяцігоддзяў грамадзянская вайна заставалася незагойваючай ранай Грэцыі.

**Знешняя палітыка Грэцыі і Партугаліі ў другой палове 1940-х гг.**

Пераможнае заканчэнне Другой сусветнай вайны не прынесла для Грэцыі доўгачаканага спакою. Вельмі хутка яна пераўтвараецца ў поле новай – «халоднай вайны». Умяшанне ва ўнутраныя справы Грэцыі з боку вялікіх дзяржаў і нават яе яе суседзяў скончылася перамогай сіл Захаду. Агучаная 12 сакавіка 1947 г. «Дактрына Трумэна» паклала пачатка ваеннаму, эканамічнаму і палітычнаму дамінаванню ў краіне ЗША. Далучэнне да «Плану Маршала», у якім Грэцыя брала ўдзел у 1948 – 1951 гг. яшчэ больш замацавала празаходнюю арыентацыю краіны. У 1949 г. Грэцыя ўвайшла ў Еўрапейскую раду і ўзяла курс на далучэнне да блоку НАТО.

Заяўленая «лібералізацыя» рэжыму А. Салазара была ўдала выкарыстана для наладжвання адносін з краінамі Захаду, таксама зацікаўленых у выкарыстанні ў «халоднай вайне» геапалітычна надзвычай важнай тэрыторыі Партугаліі. У 1948 г. урад працягнуў прадастаўленае на час вайны ЗША і Вялікабрытаніі права карыстацца ваеннымі базамі на Азорскіх астравах. У верасні 1948 г. Партугалія далучылася да «Плану Маршала», а ў красавіку 1949 г. Партугалія стала сузаснавальніцай Паўночнаатлантычнага альянсу. Крыху пазней, напачатку 1951 г. у Лісабоне было падпісанае партугала-амерыканскае пагадненне аб узаемадапамозе ў справе падтрымання бяспекі.

### Грэцыя і Партугалія ў 1950 – пачатку 1970-х гг. Пачатак хуткага эканамічнага развіцця. Далучэнне Партугаліі да Еўрапейскай асацыяцыі свабоднага гандлю. Грэцыя і «Агульны рынак». Эканамічныя рэформы

Другая сусветная і грамадзянская войны ў Грэцыі паглыбілі яе сацыяльна-эканамічныя праблемы. Паступовая нармалізацыя палітычнай абстаноўкі ў краіне і амерыканская дапамога дазволілі пачаць даўно наспелыя рэформы. Да 1952 г. было завершана правядзенне аграрнай рэформы, у выніку якой зямлю атрымалі каля 150 тыс. сялян. З сярэдзіны 1950-х гг. у Грэцыі пачаліся пераўтварэнні, скіраваныя на структурныя змены ў эканоміцы. Асаблівае значэнне надавалася развіццю прамысловасці, энергетыкі, турызму. Пры гэтым быў зроблены акцэнт на прыцягненне амерыканскага і заходнееўрапейскага капіталу, пашырэнне эканамічных і палітычных сувязяў з Захадам. У ліпені 1961 г. Грэцыя ўступіла ў ЕЭС у якасці асацыяванага члена, што давала краіне пэўныя перавагі ў гандлі з «Агульным рынкам».

Немагчымасць дасягнення імгненнага эканамічнага поспеху і, асабліва, павольнае паляпшэнне дабрабыту грэкаў служылі істотным фактарам дэстабілізацыі ўнутрыпалітычнай абстаноўкі. Ваенны пераварот і ўсталяванне рэжыму «чорных палкоўнікаў» далі старт новым буйнамаштабным эканамічным пераўтварэнням. Дыктатарскаму рэжыму ўдалося за некалькі гадоў умацаваць нацыянальную валюту – драхму. Былі пашыраныя ільготы ў дачыненні замежнага капіталу. Прадстаўнікі гандлёвых фірм, якія дзейнічалі ў Грэцыі, былі вызвалены ад падаткаў.

Паляпшэнне інвестыцыйнага клімату і ўмацаванне нацыянальнай валюты дазволіла ўраду накіраваць значныя сродкі на развіццё найбольш важных галін: машынабудаванне, суднабудаванне, будаўніцтва і камунікацыі. Другім складнікам рэформ стала структурная перабудова аграрнага сектару. Урад спісаў сялянскія даўгі і ўсталяваў мінімальныя закупачныя цэны на прадукцыю сельскай гаспадаркі. Высокія мытныя пошліны абаранялі грэчаскіх сельгасвытворцаў ад замежнай канкурэнцыі. Яшчэ адным накірункам рэформ стала развіццё турызму, прызнанага прыярытэтнай галіной эканомікі. У 1968 – 1971 гг. быў прыняты шэраг законаў, якія стымулявалі турыстычны бізнес і ўдвая зніжалі падаткі з прыбытку турыстычных агенцтваў. У выніку за 1968 – 1974 гг. колькасць замежных турыстаў, што наведалі краіну павялічылася ў два разы.

Галоўным дасягненнем рэформ канца 1960-х – пачатку 1974 гг. стала пераўтварэнне Грэцыі з аграрна-індустрыяльнай ў індустрыяльна-аграрную краіну. З’явіліся новыя галіны вытворчасці: электратэхніка, вытворчасць сінтэтычных матэрыялаў і г. д. Грэчаскі флот выйшаў на 1-е месца ў свеце па колькасці суднаў ды іх танажу. Удвая вырас сярэдні даход на душу насельніцтва. Па тэмпах эканамічнага росту Грэцыя апынулася сярод еўрапейскіх лідараў.

Да сярэдзіны 1960-х гг. базавай эканамічнай мадэллю Партугаліі заставалася аўтаркія. Самаізаляцыя была магчымай, галоўным чынам, дзякуючы велізарным каланіяльным уладанням агульнай плошчай каля 2,1 млн. км$^2$ і насельніцтвам звыш 15 млн. чалавек (Ангола, Мазамбік, Гвінея-Бісаў і г. д.). Калоніі (з 1951 г. яны фармальна атрымалі статус «заморскіх правінцый») забяспечвалі краіну трацінай золатавалютных паступленняў, а таму ідэя захавання каланіяльнай імперыі была адным з цэнтральных кампанентаў афіцыйнай ідэалогіі рэжыму. У выніку з пачатку 1960-х гг. Партугалія аказалася ўцягнутай у каланіяльныя войны, якія паглыналі палову дзяржаўнага бюджэту і адцягвалі ад нармальнай дзейнасці ў народнай гаспадарцы краіны каля чвэрці мужчынскага насельніцтва. Для стабілізацыі эканамічнага становішча ўрад А. Салазара стаў ухваляць замежныя інвестыцыі і лібералізаваў правілы іх рэгулявання. У выніку за 1960-я гг. прыватны сектар партугальскай эканомікі атрымаў інвестыцый у 10 разоў болей,чым за ўвесь пасляваенны перыяд.

Паступовае «адкрыццё» свету партугальскай эканомікі аб'ектыўна не магло не парушаць стабільнасць гэтага адсталага і правінцыйнага грамадства. Узмацненне сацыяльных кантрастаў, павольны рост даходаў, павелічэнне падатковага цяжару і беспрацоўя прымушалі многіх партугальцаў шукаць лепшага жыцця на чужыне. У 1970 г. колькасць партугальскіх грамадзян, якія пастаянна жылі і працавалі за мяжой, вырасла да 1,5 млн. чалавек (усё насельніцтва Партугаліі складала 8,7 млн.).

### Палітычная барацьба ў Партугаліі і Грэцыі. Урады К. Караманліса і Г. Папандрэў. Перадумовы перавароту ў Грэцыі. Усталяванне ваеннай дыктатуры «чорных палкоўнікаў». Канстытуцыя 1968 г. Узмацненне жорсткасці салазараўскага рэжыму ў Партугаліі

Пасля заканчэння грамадзянскай вайны перамогу на парламенцкіх выбарах 1950 г. атрымалі цэнтрысты на чале з лідарам Ліберальнай партыі Сафоклісам Венізеласам. Яны ажыццявілі шэраг важных дэмакратычных пераўтварэнняў: была абвешчана амністыя, ліквідаваны створаны ў час апошняй вайны канцэнтрацыйны лагер. Новая канстытуцыя, прынятая ў 1952 г., аднак, накладала шэраг сур'ёзных абмежаванняў на базавыя правы чалавека і забараняла дзейнасць камуністычнай партыі.

Аднак ужо на наступных выбарах, у 1952 г., перамога дасталася кансерватыўна-манархічнай партыі **«Грэчаскі збор»** (з 1955 г. была перайменавана ў Нацыянальна-радыкальны саюз), што ўтрымлівала ўладу на працягу наступных 11 гадоў. Найбольш яркім (і супярэчлівым) лідарам гэтага перыяду стаў Канстанцінас Караманліс, які з кароткімі перапынкамі з 1955 па 1963 гг. займаў пасаду прэм'ер-міністра.

У 1963 г. правыя пацярпелі паражэнне на выбарах і да ўлады прыйшоў ліберальны Саюз цэнтру на чале з Георгіасам Папандрэў (1963 – 1965). Новы

урад выступаў за дэмакратызацыю грамадства, сацыяльную арыентацыю эканомікі і ўсталяванне палітычных і эканамічных кантактаў з сацыялістычнымі краінамі пры захаванні сяброўскіх адносін з Захадам. Ліберальны ўрад увёў бясплатнае навучанне ў сярэдніх школах, абвясціла амністыю палітычным зняволеным, ажыццявіў папулярную падатковую рэформу.

Прэм’ерства Г. Папандрэў аказалася нядоўгім. Кансерватыўныя колы на чале з каралём Канстанцінам II, незадаволеныя яго палітыкай, справакавалі раскол Саюзу цэнтру. Гэта пацягнула за сабой страту ўрадам парламенцкай большасці і яго адстаўку (1965). Паражэннем цэнтрысцкіх сіл скарысталіся правыя і камуністы. Палярызацыя палітычных сіл Грэцыі абумовіла пачатак вострага палітычнага крызісу. Найбольш выпуклай яго праявай стала хранічная нестабільнасць урадаў. За наступныя пяць гадоў пры ўладзе змянілася 5 кабінетаў.

Пасля новага вітку палітычнага супрацьстаяння і роспуску парламенту, не чакаючы новых выбараў стомленыя нестабільнасцю вайскоўцы склалі змову і ў ноч з 20 на 21 красавіка 1967 г. ажыццявілі дзяржаўны пераварот. Было ўведзена становішча аблогі, распускаліся палітычныя партыі і грамадскія арганізацыі, забараняліся сходы і забастоўкі. Усталяваны рэжым атрымаў назву дыктатуры **«чорных палкоўнікаў»**.

Напрыканцы 1967 г. Канстанцін II і яго прыхільнікі паспрабавалі правесці «контрпутч», але пацярпелі паражэнне. У выніку кароль разам з сямействам былі вымушаны эміграваць у Італію, а ў руках вайскоўцаў апынулася ўся паўната ўлады. Сваёй галоўнай задачай рэжым «чорных палкоўнікаў» абвясціў барацьбу з камуністычнай пагрозай: былі арыштаваныя і кінутыя ў турмы дзясяткі тысяч камуністаў. У арміі, паліцыі і дзяржаўных установах адбыліся масавыя чысткі. 29 верасня 1968 г. была прынятая новая канстытуцыя, што насіла непрыхавана аўтарытарны характар (грэчаская ваеншчына ўсклала на сябе значныя рэгулюючыя функцыі ў мэтах «падтрымання сацыяльнага і палітычнага парадку»). Пачалося правядзенне маштабных эканамічных пераўтварэнняў.

У 1972 г. адзін з лідараў путчыстаў, Георгіас Пападопулас, сканцэнтраваў у сваіх руках усю ўладу (заняў пасады рэгента, прэм’ер-міністра і шэраг міністэрскіх пастоў). У 1973 г. быў выдадзены закон аб скасаванні манархіі і абвяшчэнні Грэцыі рэспублікай, першым прэзідэнтам якой стаў сам Г. Пападопулас. З гэтага часу ён бярэ курс на г. зв. «кіраваную дэмакратыю». Было спынена становішча аблогі, праведзена амністыя, дазволена дзейнасць палітычных партый (за выключэннем камуністычнай). Неўзабаве быў створаны цывільны кабінет міністраў.

Аднак рост апазіцыйных выступленняў выявілі няздольнасць улады зладзіць з абстаноўкай і неэфектыўнасць самой мадэлі «кіраванай дэмакратыі». У выніку ў лістападзе 1973 г. адбываецца новы вайсковы пераварот. Усе раней-

шыя дэмакратычныя пераўтварэнні былі скасаваныя новай дыктатурай. Для ўмацавання сваёй легітымнасці ў вачах грэчаскага народу вайскоўцы пайшлі на буйнамаштабную знешнепалітычную авантуру, мэтай якой з'яўлялася далучэнне да Грэцыі Кіпру, атрымаўшага ў 1960 г. незалежнасць ад Вялікабрытаніі і пераважна заселенага грэкамі-кіпрыётамі.

Запланаваная акцыя правалілася, выклікаўшы раскол астраўной дзяржавы ды імклівы рост антыўрадавых выступленняў у самой Грэцыі. Страціўшы ўсялякую падтрымку, вайсковая хунта была вымушана перадаць уладу цывільнаму ўраду на чале з лібералам К. Караманлісам. Новае кіраўніцтва аднавіла дзеянне Канстытуцыі 1952 г. (за выключэннем палажэння аб форме праўлення, што азначала захаванне рэспубліканскага ўладкавання), ліквідавала канцэнтрацыйныя лагеры для палітычных вязняў, правяло чыстку дзяржаўнага апарату ад прыхільнікаў вайсковага рэжыму – г. зв. «дэхунтызацыю».

У **Партугаліі** ў першай палове 1960-х гг. адбыўся небывалы ў гісторыі «новай дзяржавы» рост выступленняў апазіцыйных сіл супраць правячага рэжыму. Масавыя антыўрадавыя акцыі пачыналі пагражаць стабільнасці дзяржавы. Напрыканцы 1963 г. быў арганізаваны Патрыятычны фронт нацыянальнага вызвалення, аб'яднаўшы практычна ўвесь спектр апазіцыйных сіл краіны – ад камуністаў да канстытуцыйных манархістаў, а ў наступным годзе быў створаны кіраўнічы орган фронту – Цэнтральная патрыятычная хунта. У адказ улады разгарнулі тэрор.

Аднак гістарычны час дыктатарскага рэжыму ў Партугаліі незваротна падыходзіў да заканчэння. Шматгадовы дыктатар старэў, а ў 1968 г. перажыў кровазліццё ў мозг і цалкам страціў працаздольнасць. Паўстала пытанне пра палітычнага пераемніка. Правячыя эліты вырашылі прызначыць прэм'ер-міністрам буйнога палітычнага дзеяча салазараўскай Партугаліі, правазнаўцу Марсэлу Каэтану. Новы кіраўнік быў вымушаны пайсці на нязначныя саступкі і рэформы зверху. Тым не менш, эканамічная і палітычная сістэма, а таксама карпаратыўная арганізацыя грамадства ў цэлым засталіся нязменнымі. Працягваў сваю дзейнасць разгалінаваны рэпрэсіўны апарат.

Пераемнасць палітычнага курсу А. Салазара ў перыяд 1968 – 1974 гг. і, асабліва, працяг каланіяльнай вайны спрыялі далейшаму росту апазіцыйных настрояў. Шырылася незадавальненне ўрадавай палітыкай ва ўзброеных сілах.

Восенню 1973 г. апазіцыйна настроеныя сярэднія і малодшыя афіцэры стварылі нелегальную арганізацыю «Рух капітанаў». У сакавіку 1974 г. ён пераўтварыўся ў **Рух узброеных сіл (РУС)**, які вырашыў узняць дзяржаўны пераварот. 25 красавіка 1974 г. апазіцыйныя вайскоўцы ўвайшлі ў Лісабон і менш чым за суткі практычна бяскроўна скінулі ўрад М. Каэтану. **«Рэвалюцыя гваздзікоў»** (устаўленая ў ствол кветка сімвалізавала ўсеагульную

падтрымку народам вайскоўцаў) перамагла. Афіцэры РУС стварылі Раду нацыянальнага выратавання на чале з генералам Антоніў дзі Спінолай, які неўзабаве быў абвешчаны часовым прэзідэнтам.

### Знешняя палітыка Грэцыі і Партугаліі ў 1950 – пачатку 1970-х гг. Грэка-амерыканскае пагадненне 1959 г. Уступленне Партугаліі ў ААН. Каланіяльная палітыка салазараўскага рэжыму. Крах партугальскай каланіяльнай імперыі

Пасля заканчэння грамадзянскай вайны Грэцыя цвёрда трымалася атлантычнага курсу. Прыярытэтнымі былі адносіны з ЗША і Вялікабрытаніяй. У 1952 г. Грэцыя далучылася да блоку НАТО, а ў 1953 г. урад падпісаў дагавор са Злучанымі Штатамі, паводле якога тэрыторыя, водныя і паветраныя шляхі Грэцыі ставіліся пад амерыканскі кантроль.

Пастулова Грэцыя пераўтваралася ў ваенную базу ЗША і НАТО, важнейшае апірышча амерыканскіх інтарэсаў на Балканах. У адпаведнасці з новым грэка-амерыканскім пагадненнем ад 6 траўня 1959 г. Злучаныя Штаты паставілі Грэцыі ракетную зброю. Грэчаскі ўрад таксама даў згоду на будаўніцтва на востраве Крыт вучэбнага ракетнага цэнтру НАТО. А ў наступным годзе было падпісана пагадненне з ФРГ аб размяшчэнні на грэчаскай зямлі заходнегерманскіх ваенных баз. У 1965 г. міністр абароны Грэцыі нават ініцыяваў пасылку грэчаскага кантынгенту ў В'етнам. З 1972 г. Злучаныя Штаты атрымалі магчымасць выкарыстоўваць парты Грэцыі для патрэб свайго 6-га флоту.

Другім важным накірункам знешняй палітыкі Грэцыі было збліжэнне з заходнееўрапейскімі дзяржавамі з далейшым далучэннем да «Агульнага рынку». У 1961 г. Грэцыя ўступіла ў ЕЭС у якасці асацыяванага члена (першая краіна, якая здолела атрымаць гэты статус). Што да адносін з паўднёвымі суседзямі – краінамі сацыялістычнага лагеру, то яны заставаліся напружанымі з гадоў грамадзянскай вайны. Толькі з сярэдзіны 1960-х гг. у іх стала назірацца пэўнае паляпшэнне. Напрыклад, у чэрвені 1964 г. было падпісана пагадненне з Балгарыяй, якое паклала канец узаемным тэрытарыяльным прэтэнзіям.

Няўдалая спроба інкарпарацыі Кіпру, здзейсненая грэчаскай ваеншчынай у 1974 г., спарадзіла сур'ёзную праблему. У адказ на дзеянні грэчаскага боку для абароны інтарэсаў турэцкай этнічнай меншасці Кіпру на гэты востраў быў накіраваны 36-тысячны экспедыцыйны корпус Турцыі. Неўзабаве ў зоне кампактнага пражывання туркаў-кіпрыётаў была абвешчана Турэцкая рэспубліка Паўночнага Кіпру (ТРПК). Да баявых дзеянняў паміж партнёрамі па НАТО справа не дайшла, але адбыўся палітычны падзел вострава на Рэспубліку Кіпр і ТРПК і быў пакладзены пачатак не вырашанаму і дагэтуль «кіпрскаму канфлікту» паміж Грэцыяй і Турцыяй. Пасля краху вайсковага рэжыму 14 жніўня 1974 г. Грэцыя абвясціла пра выхад з вайсковай арганізацыі НАТО і ліквідацыі шэрагу амерыканскіх баз на сваёй тэрыторыі.

**Партугалія** даўно не адыгрывала самастойнай ролі ў міжнароднапалітычным жыцці і галоўную ўвагу ў сваёй вонкавай дзейнасці надавала каланіяльным справам. У 1951 г. партугальскія калоніі сталі называцца «заморскімі тэрыторыямі», што дазваляла ўраду па чыста фармальнай прыкмеце адмаўляць абвінавачванні ў жорсткасці сваёй каланіяльнай палітыкі з боку міжнароднай супольнасці. У 1955 г. Партугалія была дапушчана ў ААН. Аднак спробы сацыялістычных і нейтральных краін сіламі гэтай міжнароднай арганізацыі правесці расследаванне злачынстваў партугальскіх каланізатараў і асудзіць іх блакіраваліся ЗША, Вялікабрытанія і Францыяй, зацікаўленымі ў захаванні шчыльных сувязяў з Партугаліяй.

Спыніць дэмагагічнымі сродкамі працэс дэкаланізацыі Афрыкі было немагчыма. Антыкаланіяльная барацьба нацыянальна-патрыятычных сіл успыхнула ў Анголе (1961), Гвінеі-Бісаў і астравах Зялёнага Мысу (1963), Мазамбіку (1964). Усё больш і больш варварскія спосабы і сродкі вядзення г. зв. Каланіяльнай вайны Партугаліі (1961 – 1974) і павелічэнне каланіяльных войскаў да 150 тыс. чалавек не маглі прынесці вырашальнага поспеху.

Урад М. Каэтану паспрабаваў у чарговы раз дэзарыентаваць міжнародную супольнасць і апраўдаць гвалт супраць народаў Гвінеі-Бісаў, Анголы і Мазамбіку, дэмагагічна абвясціўшы ў 1971 г. аб прадастаўленні партугальскім калоніям «палітычнай аўтаноміі» і «ганаровага тытулу» «дзяржавы». «Рэвалюцыя гваздзікоў» паставіла кропку ў гэтым бессэнсоўным процістаянні прагрэсіўнаму імкненню народаў Афрыкі да незалежнасці. У 1974 г. апошняя каланіяльная імперыя – партугальская – спыніла сваё існаванне. Новыя ўлады заключылі пагадненні аб прадастаўленні незалежнасці Гвінеі-Бісаў, Астравам Зялёнага Мысу, Мазамбіку, Анголе, астравам Сан-Тамэ і Прынсіпі.

### Эканамічнае развіццё, крызісы сярэдзіны 1970-х – пачатку 1980-х гг. Уступленне Грэцыі і Партугаліі ў ЕЭС. Сацыяльна-эканамічнае развіццё Грэцыі і Партугаліі ў 1980 – 2000-я гг.

У другой палове 1970-х гг. эканамічнае становішча **Грэцыі** пагоршылася. Аб'ектыўныя цяжкасці, звязаныя з сітуацыяй у сусветнай гаспадарцы ўскладняліся складанымі ўмовамі дэмакратычнай трансфармацыі ў грамадска-палітычнай сферы. У чэрвені 1975 г. Грэцыя звярнулася да ЕЭС з просьбай аб наданні ёй статусу паўнапраўнага члена арганізацыі. Эканамічныя праблемы, з якімі сутыкнуліся ў гэты час удзельнікі еўрапейскай інтэграцыі, значна пагоршылі перспектывы яе задавальнення. Але ў 1981 г. Грэцыя стала дзесятым членам ЕЭС.

Праўленне сацыялістаў мела для грэчаскай эканомікі супярэчлівыя вынікі. Стварэнне буйнога дзяржаўнага сектару, значнае павелічэнне выдаткаў на сацыяльныя патрэбы прывялі да паляпшэння ўзроўню жыцця і скарачэння беспрацоўя. Аднак высокай цаной гэтых поспехаў стала высокая інфляцыя, якая ў 1990 г. дасягнула 25 % узроўню. Нягледзячы на пэўныя дасягненні, да

пачатку 1990-х гг. Грэцыя працягвала заставацца адной з найменш развітых (разам з Партугаліяй) краін ЕЭС. Тут былі самыя нізкія даходы на душу насельніцтва і самы высокі ўзровень інфляцыі.

З сярэдзіны 1990-х гг. эканамічнае развіццё Грэцыі паскорылася. Гэтаму спрыяла і агульнае паляпшэнне сусветнай кан'юнктуры (яно, напрыклад, абумовіла значны рост уязнога турызму ў краіну), і рэалізацыя прадуманай макраэканамічнай палітыкі ўраду, скіраванай на выкананне крытэрыяў Маастрыхцкага пагаднення аб эканамічным і грашова-крэдытным саюзе. Гэта, у прыватнасці, дазволіла Грэцыі з пачатку 2002 г. увайсці ў зону еўра. Да пачатку 2000-х гг. рост грэчаскай эканомікі стабільна перавышаў 3 %. Важным фактарам захавання агульнай станоўчай дынамікі эканамічнага развіцця краіны стала падрыхтоўка да Алімпіяды-2004 у Афінах, якая забяспечыла значныя знешнія і ўнутраныя інвестыцыі.

Сусветны фінансавы крызіс 2008 – 2009 гг. моцна ўдарыў па Грэцыі. Яе страты склалі некалькі дзясяткаў мільярдаў еўра. Упалі заказы і вытворчасць, адбылося рэзкае падзенне прытоку турыстаў, што негатыўна адбілася на сферы паслуг. Фінансавыя цяжкасці не пакінулі ўладам выбару акрамя радыкальнага скарачэння бюджэтных выдаткаў. Нягледзячы на прынятыя ўрадам захады, Грэцыя па-ранейшаму адчувае ўзрастальныя праблемы з аплатай 350-мільярднага знешняга доўгу і стаіць перад пагрозай дэфолту. Зніжэнне матэрыяльнага дастатку насельніцтва выклікала абвастрэнне сацыяльна-палітычнай напружанасці.

Пераход да дэмакратыі адкрыў шырокія магчымасці для ажыццяўлення сапраўднай мадэрнізацыі эканомікі **Партугаліі**. Аднак стартавыя ўмовы для эканамічных пераўтварэнняў аказаліся не вельмі спрыяльнымі. Па-першае, істотна залежная ад замежных інвестыцый, Партугалія хутка аказалася ўцягнутай у вір сусветнага эканамічнага крызісу 1970-х – пачатку 1980-х гг. Па-другое, краіна скрайне балюча перажывала эканамічныя наступствы распаду сваёй каланіяльнай імперыі. Усё гэта суправаджалася аграмаднымі выдаткамі з-за працягу масавага ад'езду з краіны найбольш падрыхтаваных рабочых і энергічных прадпрымальнікаў, а таксама з-за неабходнасці ўладкавання на гістарычнай радзіме многіх тысяч ўцекачоў з былых заморскіх калоній Партугаліі.

Мелася нямала пралікаў і ў палітыцы кіраўніцтва краіны. Распачатая нацыяналізацыя не дала чаканага эканамічнага эфекту. Усе ўрады, у тым ліку сацыялістычныя, галоўнай сваёй задачай бачылі вырашэнне праблемы знешняга плацежнага балансу (скарачэнне знешняй запазычанасці), надаючы менш увагі гэткім унутраным праблемам, як беспрацоўе, інфляцыя і павольны эканамічны рост. У выніку на працягу першага дзесяцігоддзя пасля рэвалюцыі даход на душу насельніцтва нават упаў ніжэй дарэвалюцыйнага ўзроўню.

Другое дзесяцігоддзе пераходнага перыяду ўжо характарызавалася ўражальным ростам усіх паказчыкаў эканамічнага развіцця. Уступленне

краіны ў ЕС і заахвочвальная інвестыцыйная палітыка сацыял-дэмакратычнага ўраду прывялі напрыканцы 1980-х гг. да павелічэння аб'ёму замежных інвестыцый. Пасля ўступлення ў ЕС эканоміка Партугаліі становіцца больш дыверсіфікаванай і арыентаванай на паслугі. У перыяд 1986 – 1991 гг. прырост вытворчасці штогадова складаў ад 3 % да 5 %, ўзровень беспрацоўя скараціўся з 8 % да 4 %. Да пачатку 1990-х гг. уладам удалося збіць інфляцыю (з 9 – 14 % да 3 %), але ізноў абвастрылася праблема беспрацоўя. Краіна таксама пакутавала ад незбалансаванага гандлёвага балансу і цяжару знешняга доўгу. Тым не менш, калі ў 1973 г. ВУП на душу насельніцтва Партугаліі складаў 56,4 % ад сярэдняга ўзроўню па ЕС, то ў 1991 г. гэты паказчык нават знізіўся да 54,9 %.

У 1990-я гг. было прыватызавана шмат раней нацыяналізаваных прадпрыемстваў, лібералізаваныя гэткія важныя галіны як фінансы і тэлекамунікацыі. Рост ВУП Партугаліі нават перавышаў сярэднееўрапейскі, але ў 2001 – 2003 гг. запаволіўся. Паскарэнню эканамічнага развіцця, у тым ліку павышэнню прадукцыйнасці працы, перашкаджаў невысокі адукацыйны ўзровень і прафесійная падрыхтоўка партугальцаў, а гэта адмоўна адбівалася на канкурэнтаздольнасці партугальскай прадукцыі.

Са студзеня 2002 г. Партугалія адмовілася ад партугальскага эскуда і перайшла на еўра. Аднак агульнаеўрапейская валюта не здолела стымуляваць паскарэнне эканамічнага росту краіны. Партугалія працягвала адставаць ад партнёраў па ЕС. Калі ў 1999 г. ВУП на душу насельніцтва ў краіне складаў толькі 80 % ад сярэдняга ўзроўню па Еўрасаюзу, то ў 2007 г. – ужо крыху болей за 70 % (нават з улікам далучэння да ЕС бедных Румыніі і Балгарыі).

Сусветны фінансавы крызіс 2008 – 2009 гг. паўплываў на партугальскую эканоміку вельмі адмоўна. Галоўнай праблемай для яе стаў даўгавы крызіс. Дзяржаўны доўг краіны ў 2011 г. перавысіў €160 млрд., што склала 93 % валавога ўнутранага прадукту краіны. Партугалія апынулася на мяжы банкруцтва. Для барацьбы з крызісам партугальскія ўлады былі вымушаны пагадзіцца на атрыманне дапамогі Еўрасаюзу і МВФ. У траўні 2011 г. бакі дамовіліся пра вылучэнне Партугаліі трохгадовага крэдыту на агульную суму ў €78 млрд.

### Крах дыктатарскіх рэжымаў у Партугаліі і Грэцыі. Палітыка ўрадаў А. Папандрэў у Грэцыі і сацыял-дэмакратаў у Партугаліі. Перагляд Канстытуцыі 1976 г. у Партугаліі. Канстытуцыя 1989 г. Абвастрэнне палітычнай барацьбы ў Грэцыі ў канцы 1980-х гг.

З ліквідацыяй вайсковай хунты перад **Грэцыяй** адкрыліся шырокія перспектывы дэмакратычнага будаўніцтва. У лістападзе 1974 г. прайшлі першыя за апошняе дзесяцігоддзе парламенцкія выбары. Перамогу заваявала маладая партыя К. Караманліса **«Новая дэмакратыя»** (54,4 %). У снежні 1974 г. адбыўся плебісцыт, які канчаткова зняў пытанне наконт формы

праўлення ў Грэцыі. Без малога 70 % грэчаскіх выбаршчыкаў выказаліся на карысць рэспублікі. Згодна з вынікамі народнага волевыяўлення ў чэрвені 1975 г. ўсталёўвалася парламенцкая рэспубліка з узмоцненай прэзідэнцкай уладай. У мэтах недапушчэння новых вылазак путчыстаў грэчаская Феміда дала прававую ацэнку дзяржаўнаму перавароту 1967 г. Яго арганізатары былі асуджаныя на смяротную кару, замененую потым на пажыццёвае зняволенне.

Складаныя сацыяльна-эканамічныя ўмовы другой паловы 1970-х – пачатку 1980-х гг. паставілі грэчаскія ўлады ў вельмі цяжкае становішча. Папулярнасць «Новай дэмакратыі» стала незваротна падаць. У выніку на парламенцкіх выбарах 1981 г. перамога (48 % галасоў) дасталася створанай у 1974 г. левацэнтрыскай партыі **Усегрэчаскі сацыялістычны рух (ПАСОК)** на чале з Андрэасам Папандрэў (сын Г. Папандрэў і дачкі кіраўніка паўстанцаў на Ашмяншчыне ў 1863 г. Зыгмунта Мінейкі – Софіі).

Урад забяспечыў узмацненне дзяржаўнага кантролю за эканомікай ды імкнуўся пашырыць сацыяльную дапамогу малазабяспечаным слаям насельніцтва. Былі праведзеныя прагрэсіўныя рэформы сямейнага права і сістэмы аховы здароўя. На выбарах 1985 г. ПАСОК і А. Папандрэў пацвердзілі сваё палітычнае лідарства. Эканамічныя праблемы і ўнутрыпалітычныя скандалы каштавалі правячай партыі страты папулярнасці: у 1989 г. на выбарах перамагла правацэнтрысцкая «Новая дэмакратыя». Але ўжо на наступных выбарах А. Папандрэў узначаліў свой трэці ўрад (1993 – 1996). Адстаўка ў сувязі з рэзкім пагаршэннем здароўя, а потым і смерць аднаго з буйнейшых палітычных лідараў дэмакратычнай Грэцыі прынцыпова не змяніла расстаноўку палітычных сіл. Сацыялісты заставаліся пры ўладзе да 2004 г., калі да ўлады ізноў прыйшла «Новая дэмакратыя» на чале з пляменнікам і поўным цёзкам стваральніка гэтай партыі Канстанцінасам Караманлісам (для адрознення малодшага прадстаўніка палітычнай дынастыі завуць Костас).

Уздзеянне сусветнага фінансавага крызісу 2008 – 2009 гг., а да гэтага яшчэ й небывалыя лясныя пажары ў краіне (2007) не маглі не падарваць становішча правацэнтрыстаў і на парламенцкіх выбарах 2009 г. перамагла ПАСОК на чале з Георгіасам (Ёргасам) Папандрэў-малодшым (2009), сынам А. Папандрэў.

Пасля падзення дыктатуры **Партугалія** ўступіла ў пераходны перыяд, які можна ўмоўна падзяліць на два этапы. На першым з іх адбываўся пераход ад дыктатуры да дэмакратычнага праўлення, ішоў працэс утварэння палітычных партый, была прынята канстытуцыя, і створаны новыя органы ўлады. Ад непасрэднага кіравання краінай была адхілена алігархія.

У прыватнасці, было створана звыш двух дзясяткаў палітычных партый. Буйнейшымі з іх сталі **Партугальская сацыялістычная партыя (ПСП)**, **Сацыял-дэмакратычная партыя (СДП)**, **Партугальская камуністычная партыя (ПКП)** і **Сацыяльна-дэмакратычны цэнтр (СДЦ)**. Бескампрамісная

палітычная барацьба паміж левымі і правымі сіламі, спробы вайсковых пераваротаў патрабавалі аўтарытэтнага і кампраміснага лідара. У 1976 г. прэзідэнтам быў абраны папулярны генерал Рамалью Энеш. У тым жа годзе была прынята дэмакратычная канстытуцыя. Яе важнай асаблівасцю стала палажэнне пра пабудову сацыялізму. Але паступовая стабілізацыя грамадска-палітычнай сітуацыі ў краіне і ўзмацненне пазіцый цэнтрысцкіх сіл прывялі да выключэння гэтага артыкулу з новай канстытуцыі, прынятай у 1982 г. Важную ролю ў паспяховым заканчэнні першага этапу дэмакратычных трансфармацый у Партугаліі адыграў лідар сацыялістаў і двойчы прэм'ер-міністр Марыа Саарэш (1976 – 1978, 1983 – 1985).

Зместам другога этапу пераходнага перыяду стала канчатковае зацвярджэнне інстытутаў буржуазнай дэмакратыі. Важнейшай пераломнай кропкай стаў 1986 г., калі прэзідэнтам рэспублікі быў абраны М. Саарэш – першы цывільны дзеяч на гэтай пасадзе з 1926 г. Лідарства ў палітычным жыцці краіны пераходзіць да СДП, якая з 1985 па 1995 гг. кантралявала ўрад (прэм'ер-міністр – Анібал Каваку Сілва). У далейшым асноўная палітычная барацьба разгорталася паміж сацыялістамі і кааліцыяй СДП і права-цэнтрысцкім СДЦ, якія чаргаваліся пры ўладзе напрыканцы ХХ – напачатку ХХІ стст.

**Знешняя палітыка Грэцыі і Партугалія ў другой палове 1970-х – 2000-х гг.**

Пасля ліквідацыі вайсковага рэжыму і прыходу да ўлады левацэнтрысцкіх сіл на чале з А. Папандрэў асноўнай мэтай знешняй палітыкі **Грэцыі** абвяшчалася вызваленне краіны ад амерыканскай залежнасці. Урад абвясціў аб выхадзе краіны з вайсковай арганізацыі НАТО (гэта перадусім тлумачылася напружанымі адносінамі з яшчэ адным членам Альянсу – Турцыяй; рашэнне захоўвала сілу да 1980 г.) і выступіў з патрабаваннем ліквідацыі на грэчаскай тэрыторыі амерыканскіх вайсковых баз. У верасні 1983 г. грэка-амерыканскія спрэчкі скончыліся падпісаннем кампраміснага двухбаковага пагаднення, згодна якому базы захоўваліся на працягу яшчэ 5 гадоў. Пасля гэтага пытанне аб іх лёсе бакі дамаўляліся вырашыць канчаткова. Новыя ўлады Грэцыі былі настроеныя да амерыканскай прысутнасці больш лагодна, таму ў 1990 г. было падпісана другое пагадненне з ЗША, якое захоўвала вайсковыя базы на грэчаскай тэрыторыі. І ў далейшым адносіны Грэцыі з ЗША і НАТО захоўвалі вельмі шчыльны характар. Грэцыя па большасці пытанняў сучаснай міжнароднай палітыкі падтрымлівае паўночнаемерыканскую звышдзяржаву і бярэ ўдзел у большасці місій Паўночнаатлантычнага альянсу.

Галоўнымі знешнепалітычнымі праблемамі для Грэцыі на сучасным этапе застаюцца: кіпрская, эгейская, а таксама македонскае пытанне. Пасля расколу ў 1974 г. кіпрскай дзяржавы на дзве часткі міжнародная супольнасць, у тым ліку ААН, прызнала тэрыторыю Паўночнага Кіпру акупіраванай Турцыяй.

Грэцыя ад самога пачатку заняла падкрэслена цвёрдую пазіцыю па гэтаму пытанню. Вырашэнне далейшага лёсу вострава – падзельнае існаванне альбо ўз'яднанне – на працягу некалькіх дзесяцігоддзяў ускладняе адносіны Афін і Стамбула.

Але асноўны камень перапоны ў грэка-турэцкіх адносінах – эгейская спрэчка, што абвастрылася напачатку 1970 г. Дагэтуль неўрэгуляванымі застаюцца пытанні: дэлімітацыі тэрытарыяльных вод дзвюх краін, нацыянальнай паветранай прасторы, выкарыстання кантынентальнага шэльфу і ўзаемныя прэтэнзіі на незаселеныя маленькія астравы ў Эгейскім моры. Пры ўсёй традыцыйнай праблемнасці грэка-турэцкіх адносін апошнім часам намецілася тэндэнцыя да іх пацяплення. У 1999 г., напрыклад, Грэцыя адыграла важную ролю ў прадастаўленні Турцыі статусу кандыдату на ўступ у ЕС.

З пачатку 1990-х гг. асабліва востра стала праяўляцца македонскае пытанне. Новастворaная Рэспубліка Македонія (да верасня 1991 г. знаходзілася ў складзе Югаславіі) ў першыя гады суверэннага існавання вяла актыўную прапаганду стварэння незалежнай дзяржавы на землях гістарычнай Македоніі, а значыць фактычна высоўвала прэтэнзіі на часткі сербскай, балгарскай і грэчаскай тэрыторыі. З вялікай занепакоенасцю Грэцыя ставіцца да спробаў македонскіх гісторыкаў і асноўнай часткі палітычных сіл гэтай краіны паставіць пад сумненне грэчаскі характар старажытнай Македоніі і падкрэсліць гістарычную пераемнасць сучаснай Македонскай дзяржавы ад славутай дзяржавы антычнасці (шырокае выкарыстанне імя Аляксандра Македонскага, прысутнасць на македонскай банкноце архітэктурнага сімвала грэчаскага гораду Салонікі і г. д.). У выніку грэчаскі бок настаяў на зацвярджэнні для Македоніі афіцыйнай міжнароднай назвы – Былая Югаслаўская Рэспубліка Македонія – заблакіраваў уступленне гэтай краіны ў ЕС і НАТО.

Крушэнне фашысцкага рэжыму ў красавіку 1974 г. адчыніла перад **Партугаліяй** выхад на шырокую міжнародную арэну. І першым жа яе крокам на ёй стала прызнанне ў чэрвені таго ж году права на незалежнасць і самавызначэнне народаў былых партугальскіх калоній, на тэрыторыі якіх утварыліся самастойныя дзяржавы. Пасля ліквідацыі партугальскай каланіяльнай сістэмы ў Афрыцы былі ўсталяваны альбо аднаўлены адносіны з СССР, краінамі Ўсходняй Еўропы і многімі краінамі Афрыкі і Азіі.

Дэмакратызацыя Партугаліі дазволіла ўсур'ёз агучваць мэту далучэння да «Агульнага рынку». З пачатку 1986 г. краіна разам з суседняй Іспаніяй стала паўнапраўнай удзельніцай ЕЭС. У тым жа годзе Партугалія пакінула ЕАСТ. З часам Партугалія здолела набыць аўтарытэт у Еўрасаюзе. Адным з яго буйных дзеячаў стаў Жазэ Мануэл Барозу – з 2004 г. старшыня еўрапейскай камісіі (кіраўнік выканаўчага органу ўлады ЕС). У 2007 г. партугальскай сталіцы было даверана пачэснае права прыняць у сябе лёсавызначальны для ЕС форум, на якім адбылося падпісанне г. зв. Лісабонскага трактату.

Адным з важнейшых накірункаў знешняй палітыкі Партугаліі на сучасным этапе застаюцца яе адносіны з былымі калоніямі ў Афрыцы – Анголай, Мазамбікам, Гвінеяй-Бісаў, Каба-Вердэ (былыя Астравы Зялёнага Мысу), Сан-Тамэ і Прынсіпі. Разам з Бразіліяй і самой Грэцыяй гэтыя краіны ў 1996 г. ўвайшлі ў Садружнасць партугаламоўных краін.

## Тэма 17. Румынія ў 1945 – 2010-я гг.

### Падзеі 23 жніўня 1944 г. і пераход Румыніі на бок антыгітлераўскай кааліцыі. Утварэнне Народна-дэмакратычнага фронту і яго барацьба за ўладу. Кааліцыйны ўрад П. Грозы і яго палітыка. Восеньскі палітычны крызіс 1945 г. Становішча «гістарычных партый» і караля Міхая I. Парламенцкія выбары 1946 г. Мірны дагавор з Румыніяй

Пераможны для СССР зыход Яска-Кішынёўскай аперацыі, калі была нейтралізавана амаль 600-тысячная нямецка-румынская групоўка, даў магчымасць каралю Міхаю I і лідарам буржуазна-дэмакратычных партый разам з сіламі левай апазіцыі правесці зладжаную акцыю па ліквідацыі фашысцкага рэжыму.

23 жніўня 1944 г. падчас аўдыенцыі ў караля быў арыштаваны І. Антанэску, а пазней і іншыя ўплывовыя члены фашысцкага ўраду. У той жа дзень левая апазіцыя (камуністы, сацыял-дэмакраты і інш.) пачалі ўзброенае паўстанне супраць улады. У ноч на 24 жніўня Міхай I абвясціў аб выхадзе Румыніі з вайны на баку Германіі і аб далучэнні да антыгітлераўскай кааліцыі.

Неўзабаве пачаліся перамовы з СССР аб заключэнні перамір’я. 12 верасня 1944 г. у Маскоўскім пагадненні аб перамір’і Румынія абавязвалася выплаціць СССР рэпарацыі на суму $300 млн.

Пасля ліквідацыі рэжыму Антанеску пачынаецца павольнае ўзвышэнне **Камуністычнай партыі Румыніі (КПР)**. Нягледзячы на сваю малалікасць (каля тысячы чалавек) і слабую папулярнасць, – давалі аб сабе ведаць доўгія гады, праведзеныя ў падполлі, – дзякуючы непасрэднай і непрыхаванай падтрымцы Савецкай Арміі яна стала адной з найбольш уплывовых сіл у краіне.

Сумесна з Нацыянал-царанісцкай (НЦП), Нацыянал-ліберальнай (НЛП) і Сацыял-дэмакратычнай (СДП) партыямі КПР утварыла **Нацыянальна-дэмакратычны блок (НДБ)**. Разам з вайскоўцамі (у т. л. прэм’ер) прадстаўнікі НДБ сфарміравалі антыфашысцкі ўрад. Новая ўлада занялася ліквідацыяй наступстваў фашызму і ўсталяваннем буржуазна-дэмакратычных свабод. Было адноўлена дзеянне Канстытуцыі 1923 г.

Паколькі шчырае супрацоўніцтва «гістарычных партый» (НЦП і НЛП) і левых, асабліва камуністаў, якія спадзяваліся на ўсталяванне прынцыпова новага рэжыму, было ў перспектыве малаверагодным, рабочыя партыі ўзялі курс

на стварэнне самастойнай арганізацыі. 12 кастрычніка 1944 г. быў заснаваны **Народна-дэмакратычны фронт (НДФ)**. Для прыстойнасці туды запрасілі і цараністаў з лібераламі, але тыя, натуральна, адмовіліся.

НДФ абвінавачваў буржуазных міністраў і каралеўскую групоўку ў сабатажы рэалізацыі ўмоў перамір'я і 4 лістапада 1944 г. ва ультыматыўнай форме запатрабаваў ад Міхая I стварыць новы кааліцыйны ўрад. Пры масіраванай савецкай прысутнасці кароль проста не меў выбару і ў чарговым урадзе трэць партфеляў дасталася членам НДФ.

Камуністы ды іхныя саюзнікі працягнулі ціск на Міхая I. Ужо праз месяц яму прыйшлося прызначыць новага кіраўніка ўраду – генерала Нікалаэ Радэску, які за сваю антыгерманскую пазіцыю ў свой час нават высылаўся з краіны. Кароль спадзяваўся, што з падобным палітыкам СССР і яе пятая калона не будзе мець зачэпак для крытыкі. Але адносіны паміж буржуазнымі і прасавецкімі дзеячамі абвастраліся. Апошнія прама патрабавалі перадачы ім усёй паўнаты ўлады. Напрыканцы лютага 1945 г. Міхай I быў вымушаны адправіць і Н. Радэску ў адстаўку.

Гэтым разам (сакавік 1945 г.) Міхая прымусілі прызначыць прэм'ер-міністрам лідара партыі-ўдзельніцы НДФ – **Фронту земляробаў** – П. Грозу. Франтаўцы атрымалі і 12 з 17 міністэрскіх пасад. З «гістарычных партый» ва ўрад не ўключылі нікога – яны былі цалкам адхілены ад рэальных рычагоў кіравання дзяржавай.

Урад П. Грозы прыступіў да радыкальных рэформ. Згодна з палажэннямі аграрнай рэформы буйныя зямельныя ўладанні падлягалі канфіскацыі (П. Гроза некалі сам быў буйным памешчыкам, аднак па ўласнай волі напачатку 1930-х гг. адмовіўся ад сваіх уладанняў і стварыў левасялянскую партыю, за што атрымаў мянушку «Чырвоны буржуй»). Большая частка іх размяркоўвалася паміж малазямельнымі і беззямельнымі сялянамі, меншая дасталася дзяржаве. Ва ўласнасць дзяржавы таксама пераходзілі памешчыцкія машыны і інвентар. На гэтай аснове ствараліся машынна-пракатныя пункты.

У выніку гэтай рэформы была не проста выкаранена буйная зямельная ўласнасць – памешчыкі былі цалкам ліквідаваны як сацыяльны слой. Тым не менш, гэтая рэформа (напрыклад, з пункту гледжання колькасці раздадзеных зямель або эканамічнай мэтазгоднасці) нашмат саступала «буржуазнай» зямельнай рэформе 1918 – 1921 гг. Праблемы перанаселенасці вёскі, вельмі нізкай прадукцыйнасці сельскагаспадарчай працы, цераспалосіцы і драбнення надзелаў так і не былі вырашаны. Але, як і папярэдняя рэформа, яна здолела нейтралізаваць сялянства і аб'ектыўна паставіць яго на службу інтарэсам новых палітычных сіл, што прагнулі неабмежаванай улады.

Урад прыняў захады па дэмакратызацыі і рэарганізацыі сістэмы кіравання. Спецыфічная трактоўка левымі дэмакратыі вяла да таго, што разам з фа-

шысцкімі элементамі выдалялі з дзяржаўных органаў і проста апазіцыйна настроеных спецыялістаў. Паўсталі перад судом ваенныя злачынцы.

Урад П. Грозы рашуча змагаўся з любымі праявамі сабатажу і спекуляцыі і паступова ўводзіў дзяржаўны кантроль над вытворчасцю, размеркаваннем тавараў, цэнамі і заробкамі – на змену рыначным механізмам кіравання эканомікай сталі прыходзіць каманднa-адміністрацыйныя.

Яшчэ адразу апасля 6 сакавіка 1945 г., калі камуністы сваімі ўльтыматыўнымі патрабаваннямі дамагліся ад Міхая І стварэння выгоднага сабе ўраду на чале з П. Грозай, кіраўніцтва «гістарычных партый» выступіла з заявай аб яго непрадстаўнічым характары. ЗША і Вялікабрытанія на Патсдамскай канферэнцыі таксама пагражалі не прызнаць урад П. Грозы і сарваць падпісанне мірнага дагавору з Румыніяй, калі не адбудзецца яго рэарганізацыя.

Восенню 1945 г. кароль Міхай І паспрабаваў выкарыстаць факт непрызнання ўраду і падтрымку Захаду, каб адправіць кабінет П. Грозы ў адстаўку. Прэм’ер жа справядліва ўпэўнены ў падтрымцы Савецкага Саюза проста праігнараваў патрабаванне галавы дзяржавы. Пасля гэтага Міхай І з’ехаў у свой загарадны маёнтак і адмовіўся падпісваць дзяржаўныя дакументы (без гэтага яны былі несапраўднымі, але падобныя юрыдычныя тонкасці мала турбавалі камуністаў). Склалася пікантная сітуацыя: манарх баставаў у краіне, дзе панавалі камуністы.

Падтрымаць караля і павіншаваць яго з днём нараджэння ў Бухарэсце 8 лістапада сабраўся шматтысячны натоўп. Аднак камуністычныя атрады міліцыі і адмыслова створаная для абароны рэвалюцыі дывізія Уладзімірэску разагналі яго.

«Гістарычныя партыі» ніхто пакуль не збіраўся забараняць. Новыя гаспадары Румыніі, якія знаходзіліся пад надзейнай аховай савецкіх штыкоў і карысталіся з беднасці і даверлівасці значнай часткі румын, імкнуліся іх раскалоць і дыскрэдытаваць. Выкінутыя на ўзбочыну нацыянальнай палітыкі, партыйныя лідары нейтралізоўваліся у выніку рэпрэсій (самыя небяспечныя), асуджалі сябе на забыццё (самыя асцярожныя) або разам з паслядоўнікамі спяшаліся прымкнуць да пераможнага боку (самыя беспрынцыповыя). З прычыны засілля лаяльных Чырвонай Арміі і СССР партый, раздзёраў і аддаленасці ад рэальнай улады «гістарычныя партыі» гублялі падтрымку ў грамадстве, а наступленне на «эксплуататарскія класы» пазбаўляла іх трывалай сацыяльнай і матэрыяльнай базы.

Стаўленне савецкага кіраўніцтва і яго румынскіх падапечных да манархіі і Міхая І было адмоўным. Але роля караля ў ліквідацыі фашысцкага рэжыму і папулярнасць у народзе рабілі яго тэрміновае адхіленне ад улады небяспечным (у Маскве маладога манарха называлі «каралём-камсамольцам»). Ворагі манархіі чакалі зручнага моманту для дыскрэдытацыі Міхая І.

У снежні 1945 г. на Маскоўскай канферэнцыі міністраў замежных спраў Вялікай тройкі (СССР, Вялікабрытаніі і ЗША) была выпрацавана формула,

якая мелася выправіць рэпутацыю румынскага ўрада на міжнароднай арэне. У адпаведнасці з ёй два сапраўдных члена «гістарычных партый» (па аднаму з НЦП і НЛП), а не камуністычныя спачувальнікі, якія толькі фармальна заставаліся ў сваіх партыях, павінны былі увайсці ва ўрад. Пасля гэтага ЗША і Вялікабрытанія прызнавалі кабінет П. Грозы, які неўзабаве мусіў правесці свабодныя выбары, адкрытыя для ўсіх, у тым ліку апазіцыйных партый. Два новыя міністры, тым не менш, засталіся без партфеляў (без канкрэтных міністэрстваў, а значыць не мелі магчымасці распараджацца бюджэтнымі сродкамі) і папросту ігнараваліся калегамі, а іх партыі па-ранейшаму падвяргаліся нападкам.

Выбары ж былі адкладзены амаль на год і прайшлі толькі 19 лістапада 1946 г. Яны, як таго і трэба было чакаць, не былі адкрытымі і свабоднымі, а да старой румынскай традыцыі фальсіфікацыі выбарчых бюлетэняў камуністы дадалі свой асноўны агітацыйны метад – запужванне.

Перамог камуністычны **Блок дэмакратычных партый (БДП)**, які па афіцыйных звестках набраў каля 80 % галасоў. Сапраўдная апазіцыя – НЦП і НЛП – атрымала ў парламенце толькі 35 месцаў (з 414). Два іх міністры выйшлі ў адстаўку, а іх калегі-новаабраныя дэпутаты ў знак пратэсту супраць масавых парушэнняў у ходзе выбараў адмовіліся заняць свае парламенцкія крэслы.

Злучаныя Штаты і Вялікабрытанія выступілі з жорсткай крытыкай румынскіх улад, але не разарвалі з імі дыпламатычных адносін, а потым 10 лютага 1947 г. падпісалі з імі Мірны дагавор. Падобная непаслядоўнасць і мяккацеласць заходніх дэмакратый толькі развязала рукі камуністам (Сталін у сваёй грубаватай манеры выказваўся больш шчыра і паслядоўна: «*Свабодна абраны ўрад у любой з гэтых краін* (краін Цэнтральнай і Паўднёва-ўсходняй Еўропы, што аказаліся пад кантролем СССР – У.Ф.) *быў бы антысавецкім, а на гэта мы пайсці не можам*»).

### Палітычны крызіс у лістападзе 1947 г. Разгром буржуазных партый, ліквідацыя манархіі. Абвяшчэнне Румынскай народнай рэспублікі. Аб’яднанне камуністычнай і сацыял-дэмакратычнай партый у Румынскую рабочую партыю. Канстытуцыя 1948 г. і пераход да дыктатуры пралетарыяту. Будаўніцтва савецкай мадэлі сацыялізму. Палітычныя рэпрэсіі. Першая і другая пяцігодкі. Абвяшчэнне перамогі сацыялістычных вытворчых адносін

1947 г. быў вырашальным для лёсу Румыніі. Увесну 1947 г. па краіне пракацілася хваля запужвальных начных арыштаў апанентаў камуністаў. У ліпені пры спробе ўцячы за мяжу быў затрыманы цэлы шэраг лідараў НЦП. Іх абвінавацілі ў антырумынскай дзейнасці і на гэтай падставе забаранілі дзейнасць самой партыі. Восенню яе лідары Юліу Маніу і Іон Міхалаке паўсталі перад паказальным судом і былі асуджаны да пажыццёвага зняволення ў адзіночцы.

У лістападзе выбухнуў урадавы крызіс – з ураду былі выкінуты былыя лібералы на чале з Г. Татарэску. На іх месца прыйшлі т. зв. «маскалі» – камуністы, якія пасля доўгага выгнання прыехалі на радзіму з СССР. Камуністы з адданымі саюзнікамі цалкам апанавалі ўрадам.

А ў перадапошні дзень году, 30 снежня 1947 г., скончылася анамальнае караляванне Міхая І. Неўзабаве пасля вяртання з Вялікабрытаніі, дзе ён прысутнічаў на шлюбнай цырымоніі брытанскай прынцэсы Лізаветы (з 1952 г. яна – каралева Лізавета II) і абвясціў аб заручынах з прынцэсай Ганнай Бурбон-Пармскай, яго вымусілі выпрачыся пасаду. Манархія была ліквідавана. Напачатку 1948 г. былі распушчаны і канчаткова спынілі існаванне «гістарычныя партыі».

Цяпер Румынія дэ-факта стала рэспублікай. Юрыдычнае афармленне гэтага статусу адбылося амаль імгненна – яшчэ 30 снежня 1947 г., калі дэпутаты парламента адзінагалосна (апазіцыі там ужо і быць не магло) выказаліся за скасаванне манархіі і абвяшчэнне Румыніі народнай рэспублікай.

8 сакавіка 1948 г. прайшлі выбары ў Вялікі нацыянальны сход (ВНС), вышэйшы орган дзяржаўнай улады. Перамог **Фронт народнай дэмакратыі (ФНД)**, куды ўваходзілі **Румынская рабочая партыя** (**РРП**, утварылася на аб'яднаўчым сходзе КПР і СДП (люты 1948 г.)) і яе сатэліты. Выбары праходзілі пад дыктоўку камуністаў і завяршыліся прадказальна. Як паведамілі, 93 % выбаршчыкаў прагаласавала за ФНД.

13 красавіка 1948 г. ВНС прыняў першую Канстытуцыю **Румынскай Народнай Рэспублікі**. Дэкларэваліся дэмакратычныя правы і свабоды (цана падобных абяцанкаў была вядомая), а эксплуататарскія і варожыя элементы пазбаўляліся выбарчага права. Канстытуцыя канстатавала наяўнасць у эканоміцы Румыніі трох сектараў: дзяржаўнага, дробнатаварнага і прыватнакапіталістычнага. Разам з тым у Канстытуцыі ўказвалася, што дзяржава падтрымлівае толькі такое прыватнае прадпрымальніцтва, якое пастаўлена «на службы грамадству». У яго інтарэсах буйная прыватная ўласнасць можа быць перададзена дзяржаве. Нетры зямлі, воды, крыніцы энергіі, шляхі зносін, Нацыянальны банк станавіліся дзяржаўнай уласнасцю.

Палажэнні Канстытуцыі 1948 г. паслужылі прававой асновай для нацыяналізацыі, якая збольшага завяршылася ў чэрвені 1948 г. А ў 1949 г. на базе канфіскаванай у памешчыкаў і кулакоў зямлі пачалася калектывізацыя (да 1962 г.). У тым жа годзе пачынаецца эканамічнае планаванне. Прымаліся планы рознай працягласці, але, звычайна, пяцігадовыя. Усе планы давалі прыярытэт індустрыялізацыі з акцэнтам на развіццё цяжкой прамысловасці.

Адной з асаблівасцей унутрыпалітычнага становішча РРП у першыя пасляваенныя гады з'яўлялася адсутнасць трывалага кіруючага ядра і агульнапрызнанага лідара, які, напрыклад, быў для балгарскіх камуністаў

Г. Дзімітраў. Камуністычнае ядро РРП (пра сацыял-дэмакратычны «баласт» – гаворка асаблівая) складвалася на базе дзвюх груповак, адну з якіх прадстаўлялі камуністы, што знаходзіліся падчас вайны ў турмах або падполлі (напрыклад, Г. Георгіу-Дэж і Н. Чаўшэску), а іншую – тыя, хто знаходзіўся ў савецкай палітычнай эміграцыі – «маскалі».

У 1951 г. паміж Г. Георгіу-Дэжам і Ганнай Паўкер («маскалька») узніклі разыходжанні па некаторых пытаннях, у т. л. па праблеме калектывізацыі сельскай гаспадаркі. Хаця звычайна І. В. Сталін падтрымліваў усходнееўрапейскіх камуністаў, якія былі добра вядомыя па працы ў СССР, тут ён узяў бок Георгіу-Дэжа. Лёс Г. Паўкер і яе «каманды» быў прадвызначаны. «Антыўрадавая група Паўкер – Лýкі» была выкрыта, а «маскальскае» крыло разгромлена. Менавіта пад час гэтай чысткі здолеў высунуцца на высокія пазіцыі ў РРП Н. Чаўшэску. Неўзабаве ён стаў кандыдатам у члены Палітбюро і сакратаром ЦК РРП. З іншадумствам і ў краіне, і ў партыі было скончана.

Радыкальныя змены ва ўсіх сферах жыцця краіны знайшлі сваё ўвасабленне у новай Канстытуцыі, прынятай 27 верасня 1952 г. Канстытуцыя заканадаўча замацавала кіраўніцтва Румынскай рабочай партыі ва ўсіх сферах жыцця грамадства. Таксама ў ёй указвалася на вядучую ролю сацыялістычнага сектара ў эканоміцы краіны. На базе новага Асноўнага закону напрыканцы таго ж года прайшлі выбары ў ВНС. Як таго і трэба было чакаць, ФНД атрымаў 99 % галасоў.

У пасляваенны гады адбыліся значныя зрухі ў эканамічным становішчы Румыніі. З адсталай і аграрнай яна пераўтварылася ў індустрыяльна-аграрную краіну. Была створана, па сутнасці, новая матэрыяльна-тэхнічная база, ядром якой стала цяжкая індустрыя і ў першую чаргу такія галіны, як металургія, энергетыка, машынабудаванне, хімія. Ужо ў 1965 г. даваенны ўзровень вытворчасці быў перавышаны амаль у 10 разоў.

У вёсцы пасля завяршэння калектывізацыі былі створаны дзяржаўныя сельскагаспадарчыя прадпрыемствы і вытворчыя кааператывы, уводзілася комплексная механізацыя. Узрасла ураджайнасць. Тым не менш, калектыўная гаспадарка і тут не вытрымлівала канкурэнцыі з боку аднаасобнай гаспадаркі.

### Г. Георгіу-Дэж і «нацыянальная рэвалюцыя зверху». Дэкларацыя РРП па пытаннях міжнароднага камуністычнага руху 1964 г. Фарміраванне «асобага курсу» РКП і пачатак яго рэалізацыі. Пераход да ўлады групоўкі Н. Чаўшэску. Усталяванне дыктатуры клана Чаўшэску. Дзейнасць «Секурытатэ». Умацаванне «асаблівай» пазіцыі Румыніі ў сацыялістычным лагеры

Вядучыя румынскія палітыкі неадназначна паставіліся да крытыкі на ХХ з’ездзе КПСС культу асобы Сталіна. Г. Георгіу-Дэж непакоіўся, як бы ўсталя-

ванне больш дэмакратычных норм партыйнага жыцця, развіццё дэмакратызацыі румынскага грамадства і рэабілітацыя асуджаных не выклікала непажаданыя для яго наступствы. Румынскі правадыр пралетарыяту і яго каманда (у т. л. Н. Чаўшэску) засталіся верныя сталінізму. А тых партыйцаў, што спрабавалі выступіць з асуджэннем культу асобы ў Румыніі, чакала палітычная смерць.

Умацаванне Г. Георгіу-Дэжа у якасці галоўнага палітычнага кіраўніка у выніку прывяло да таго, што асноўным крытэрыям кадравай палітыкі стаў прынцып даўніх сувязяў па падполлі і асабістай адданасці правадыру. Гэта яшчэ больш узмацніла пазіцыі Н. Чаўшэску ў партыі.

З пачатку 1950-х гг. пачынаецца **«нацыянальная рэвалюцыя зверху»** – сярод кіраўніцтва РРП узмацняюцца нацыяналістычныя і нават антысеміцкія і шавіністычныя настроі. Гэта, напрыклад, праявілася ва ўнутрыпартыйных рэпрэсіях 1952 г.: сярод «маскалёў» было нямала яўрэяў. На гэтай глебе мацнее антысаветызм. Галоўным чынам гэта праяўлялася ў імкненні пазбавіцца ад сумесных савецка-румынскіх акцыянерных прадпрыемстваў, размешчаных на тэрыторыі краіны савецкіх войск, у незадаволенасці памерамі рэпарацыйных выплат, а таксама ў выказваннях на карысць аднаўлення традыцыйных сувязяў з краінамі Захаду (сацыяльна-эканамічны і грамадска-палітычны лад Румыніі гэтая дзіўная пазіцыя аніяк не закранала).

У перыяд 1958 – 1962 гг. адбываецца працэс кансалідацыі ядра нацыяналістычна настроеных дзеячаў у румынскім кіраўніцтве і фарміраванне **«асобага курсу» РРП**. Упершыню гэты курс знайшоў сваё адлюстраванне ў рашэннях лістападаўскага (1958 г.) пленума ЦК РРП, які ўхваліў палітыку фарсіраванай індустрыялізацыі краіны і рэзкага пашырэння яе эканамічных сувязяў з вядучымі капіталістычнымі краінамі. Падобная лінія была прынята пасля таго, як пры дапамозе СССР у Румыніі была створана дастаткова трывалая эканамічная база, канчаткова замацавалася пры ўладзе РРП, а савецкія войскі былі выведзены з яе тэрыторыі (восень 1958 г.).

Разам з пачаткам крытыкі савецкага кіраўніцтва лідары РРП разгарнулі шавіністычную ў сваёй агрэсіўнасці кампанію па ўсхваленні «тысячагадовых традыцый румынскага народа», барацьбы за нацыянальную незалежнасць ад пасяганняў Турцыі, Расіі, Аўстра-Венгрыі (румынская прапаганда дакучліва падводзіла да працягу гэтага ланцужку – СССР). Становішча этнічных меншасцей унутры краіны, асабліва венграў, моцна пагоршылася.

У красавіку 1964 г. кіраўніцтва РРП адкрыта выклала свой «асаблівы курс» у заяве пленума ЦК РРП «Аб пазіцыі РРП па пытаннях міжнароднага камуністычнага руху». Савецкі Саюз у рэзкай форме абвінавачваўся ва ўзмацненні ціску на Румынію і іншыя краіны сацыялістычнай садружнасці, ўмяшанні ва ўнутраныя справы Румыніі, у яе эксплуатацыі, пасяганні на тэрытарыяльную цэласнасць. Сувязі Румыніі з СССР сталі скарачац-

ца. Пачалася «дэрусіфікацыя» сістэмы народнай адукацыі. На Захадзе «Румынскае нацыянальнае адраджэнне», натуральна, віталі.

Аб цяжкой хваробе лідара румынскіх камуністаў Г. Георгіу-Дэжа было вядома яшчэ з 1961 г. Менавіта тады і пачалася барацьба за месца яго пераемніка. Н. Чаўшэску здолеў паспяхова выкарыстаць сваё становішча сакратара ЦК па арганізацыйных пытаннях для таго, каб расставіць сваіх прыхільнікаў у партыйным і дзяржаўным апараце, а потым заручыцца падтрымкай «старой гвардыі». Закулісная дзейнасць Н. Чаўшэску дазволіла яму пасля смерці Г. Георгіу-Дэжа (1965 г.) абрацца на сакавіцкім (1965 г.) пленуме ЦК РРП на пасаду першага сакратара партыі. У гісторыі Румыніі пачалася эпоха Нікалаэ Чаўшэску.

У сакавіку 1965 г. Н. Чаўшэску быў абраны на пасаду першага сакратара РРП. А ў ліпені 1965 г. адбыўся IX з’езд РРП. Румынская рабочая партыя была перайменавана ў **Румынскую камуністычную партыю (РКП)**.

Пасля з’езда пачалі ўзмацняцца палітычныя пазіцыі кіруючага ядра, што групавалася вакол Н. Чаўшэску. На ключавыя пасады ў партыі і дзяржаве прыйшлі асобы, блізкія да новага партыйнага лідара. Адначасова з гэтым намецілася тэндэнцыя да паслаблення пазіцый прадстаўнікоў старэйшага пакалення, якія карысталіся вялікай павагай і ўплывам пры Г. Георгіу-Дэжы.

У мэтах павышэння папулярнасці і аўтарытэта Н. Чаўшэску – яго стыль работы прапаганда супрацьпастаўляла нягодным метадам Дэжа – былі выкарыстаны, у прыватнасці, захады па рэабілітацыі раней пацярпелых ад рэпрэсій грамадзян. І калі ў 1961 г. Н. Чаўшэску у сваім шавіністычным запале заяўляў пра тое, што, ў адрозненне ад СССР і іншых краін сацыялістычнага лагеру, у Румыніі не было масавых рэпрэсій, то цяпер адказнасць за шматлікія беззаконні была ўскладзена выключна на Г. Георгіу-Дэжа і яго «старую гвардыю» (ды яшчэ на СССР). У 1967 – 1968 гг. значная частка прадстаўнікоў старога пакалення страціла свае высокія пасады.

Рэабілітацыя была частковай. Яна ўвогуле не закранула людзей, якія былі абвінавачаны ў прасавецкіх сімпатыях і г. зв. «патуранні каланіялісцкай палітыцы СССР». Гэта азначала б прызнанне неправамернасці той нацыяналістычнай палітычнай лініі, якой апантана працягваў трымацца першы сакратар.

На нацыянальнай канферэнцыі РКП (снежань 1967 г.) было прызнана мэтазгодным спалучэнне ў адных руках партыйных і дзяржаўных пасад. Ужо не сціпла «першы», а Генеральны сакратар ЦК РКП Чаўшэску быў абраны і старшынёй Дзяржаўнай Рады рэспублікі. Адначасова замацоўваўся прынцып падвойнага падпарадкавання мясцовых органаў дзяржаўнай адміністрацыі: першыя сакратары павятовых камітэтаў РКП станавіліся і старшынямі павятовых народных саветаў. Усе грамадскія арганізацыі былі аб’яднаны ў **Фронт сацыялістычнага адзінства** (пазней перйменаваны ў Фронт дэмакратыі і сацыялістычнага адзінства) на чале, ізноў жа, з Н. Чаўшэску.

Лінія Чаўшэску на паступовае забеспячэнне сабе выключнага становішча ў партыі і дзяржаве выпукла праявілася на X з'ездзе РКП (1969 г.). У Статут партыі была ўнесена змена, у адпаведнасці з якой Генеральны сакратар РКП абіраўся не пленумам ЦК, а непасрэдна з'ездам партыі. Тым самым падкрэслівалася яго непадсправаздачнасць не толькі Пастаяннаму прэзідыуму і Выканкаму, але й Цэнтральнаму Камітэту.

Адначасова з гэтым для ліквідацыі магчымай апазіцыі ў Палітбюро і Выканкаме Н. Чаўшэску правёў там чыстку сярод рэшткаў «старой гвардыі». Дваіх палітыкаў абвінавацілі ў амаральных паводзінах (таемная паліцыя – «Секурытатэ» здабыла фотаздымкі і гуказапісы, якія, нібыта, сведчылі аб іх маральным разлажэнні). Для забеспячэння лаяльнасці партыйцаў па загаду Н. Чаўшэску былі падрыхтаваныя тысячы дасье з «кампраматам».

Каб не дапусціць заняцця кім-небудзь апрача яго ўплывовага становішча ў партыі, Н. Чаўшэску высунуў прынцып ратацыі кадраў. Так, з 21 члена выканкама ЦК, абранага на X з'ездзе РКП, да наступнага з'езда практычна ніводны не застаўся на сваёй пасадзе. Ліквідаваўшы Пастаянны прэзідыум ЦК, Чаўшэску дамогся яшчэ большага зніжэння ролі і значэння іншых кіруючых дзеячаў РКП. Паступова усе партыйныя і дзяржаўныя інстытуты пераўтварыліся ў пакорлівыя і маўклівыя (калі толькі справа не даходзіла да славаслоўя на адрас Чаўшэску) прыдворныя рады, праца якіх зводзілася да фармальнага ўхвалення прапаноў і ўказанняў правадыра без іх сапраўднага глыбокага абмеркавання.

З мэтаю падаўлення незадавальнення сярод кіруючага звяна партыі Н. Чаўшэску праводзіў частыя чысткі, перастаноўкі, структурныя рэарганізацыі, накіраваныя на ўзмацненне цэнтралізацыі ўлады і амаль вайсковай дысцыпліны. Былі ўведзены ўсялякія прысягі на адданасць як па партыйнай, гэтак і па дзяржаўных лініях, прыняты шматлікія законы і адміністрацыйныя захады па забеспячэнні дзяржаўнай бяспекі, сакрэтнасці, абмежавання кантактаў з іншаземцамі. Да лагічнага завяршэння канцэнтрацыя ўсёй улады ў партыі і дзяржаве была даведзена Н. Чаўшэску ў 1974 г., калі ён быў абраны прэзідэнтам рэспублікі з сапраўды каралеўскімі паўнамоцтвамі.

Пачварныя формы набыў культ асобы Н. Чаўшэску, «самага ўлюбёнага сына румынскага народа», «дунайскага генія», «генія з геніяў» «бацькі румын» і г. д. Любыя мерапрыемствы звязваліся ўгодлівай прапагандай не з дзейнасцю народа, або партыі, а з асобай дыктатара. Чаўшэску нагэтулькі прызвычаіўся да славаслоўя і лісլівасці, што на пытанне амерыканскага карэспандэнта, як ён ставіцца да культу сваёй асобы, адказаў: «*У кожнай краіне ёсць дзеячы, якія сваімі справамі дзеля народа заслужылі ўсеагульную павагу!*».

У апошнія гады існавання рэжыму стаў квітнець і культ асобы яго жонкі – Алены Чаўшэску. Яе называлі «выбітным навукоўцам з сусветным

імем», «буйным дзеячам камуністычнага руху». На мітынгах і дэманстрацыях партрэтаў жонкі правадыра бывала столькі ж, колькі і «абразоў» самога Н. Чаўшэску.

Аб тым, наколькі чуйная была гэтая пара да сваёй «выключнасці» і не цярпела канкурэнцыі, гаворыць выпадак з румынскім касманаўтам Думітру Прунарыу. Пасля палёту ў космас (1981 г.) яму прысвоілі званне Героя Савецкага Саюза. Вымушаны быў паследаваць традыцыі, прынятай у краінах сацыялістычнай садружнасці, і Чаўшэску – Д. Прунарыу прысвоілі званне Героя Сацыялістычнай Рэспублікі Румыніі. Аднак паколькі дагэтуль у Румыніі быў толькі адзін герой (сам Чаўшэску), касманаўту «параілі» не афішаваць свае зоркі героя. А ў поўную няміласць Д. Прунарыу трапіў, калі, да жаху арганізатараў аднаго ўрачыстага сходу, у сваім выступленні запамятаў адзначыць выбітны ўнёсак у развіццё навукі Алены Чаўшэску, не аддзячыў яе за дапамогу касманаўтам. У выніку на яго надоўга забыліся, не ўзгадвалі ў друку, не давалі чарговае званне.

Захапіўшы ў свае рукі камандныя пасады ў партыі і дзяржаве, Чаўшэску болей давяраў і абапіраўся на сваіх блізкіх і далёкіх сваякоў. Яны занялі высокія пасты ў партыі, войску, МУС, прафсаюзах, маладзёжнай камуністычнай арганізацыі, дзяржплане, сродках інфармацыі.

Галоўным і адзіным дарадцам Чаўшэску была яго жонка. Чэрствая і малаадукаваная (4 класы і «па блату» экстэрнам інстытут), але надзвычай славалюбівая жанчына, узначаліла цэнтральны інстытут хімічных даследаванняў, а потым была абраная акадэмікам. Для гэтага, праўда, прыйшлося зрабіць прадугледжанае статутам таемнае галасаванне адкрытым.

У пераемнікі Н. Чаўшэску рыхтавалі яго малодшага сына Ніку, празванага ў народзе «прынцам». Распуснік, шырока вядомы сваімі скандальнымі гулянкамі, п’янымі оргіямі і дарожнымі здарэннямі, Ніку Чаўшэску стаў першым сакратаром ЦК Саюза камуністычнай моладзі, затым кандыдатам у члены Палітвыканкама ЦК і г. д.

На ключавых пасадах знаходзіліся браты Н. Чаўшэску – Іліе быў намеснікам міністра абароны і сакратара палітсавета арміі, Андруцэ-Нікалаэ – начальнікам вышэйшай школы МУС, Іон – першым намеснікам старшыні дзяржплану, Флора – рэдактарам аддзела вядучай газеты краіны «Скынтэйя» («Іскра»). Муж сястры дыктатара стаў сакратаром ЦК РКП, брат Алены – кіраўніком партыйнай арганізацыі Бухарэста.

Непераўзыйдзены дэмагог і крывадушнік Чаўшэску заклікаў народ берагчы народную ўласнасць, а сам меў 21 шыкоўны палац, 41 рэзідэнцыю, 20 паляўнічых домікаў і г. д. А ў швейцарскіх банках на яго рахунках ляжалі некалькі соцень мільёнаў долараў.

Для абароны свайго рэжыму Чаўшэску стварыў магутны апарат рэпрэсій і ўсеабдымнага кантролю за думкамі і паўсядзённымі дзеяннямі людзей. Усялякія праявы апазіцыйных настрояў, непажаданага вальнадумства душыліся ў зародку. Апарат дзяржбяспекі – **«Секурытатэ»** – павялічваўся з кожным годам, узрастала колькасць таемных агентаў і «стукачоў» ва ўстановах і на прадпрыемствах. Былі створаны цэнтры па праслухванні тэлефонных размоў, перлюстрацыі пошты. Вялася сочка за ўсімі членамі Палітвыканкама ЦК, іх жонкамі. Асаблівыя захады перасцярогі рабіліся для аховы дыктатара, яго жонкі ды іншых членаў клана.

Лінія на канфрантацыю з кіраўніцтвам іншых сацыялістычных дзяржаў і, асабліва, СССР была працягнута. У 1965 г. румынская дэлегацыя адмовілася ад удзелу ў нарадзе 19 камуністычных партый у Маскве і Карлаварскай нарадзе камуністычных і рабочых партый Еўропы (1967 г.), у 1968 г. румынская дэлегацыя дэманстратыўна пакінула кансультацыйную сустрэчу ў Будапешце.

Гуляючы на нацыянальных пачуццях румын, Чаўшэску заклікаў стварыць квітнеючую дзяржаву, незалежную на знешнепалітычнай арэне ад СССР і здольную абараніцца ад магчымага савецкага ўмяшання у свае ўнутраныя справы. Апошняе мела асабліва актуальны сэнс пасля чэхаславацкіх падзей 1968 г.

Нягледзячы на ўсталяванне таталітарнага, блізкага да сталінскага рэжыму, на Захадзе Н. Чаўшэску і Румынія знаходзілі станоўчыя ацэнкі. Дыктатару ладзілі пышныя прыёмы ў Лондане, Парыжы, Вашынгтоне (сустракаўся з Ніксанам, Фордам, Картэрам), там ён зарабіў рэпутацыю выдатнага палітыка. Румыніі даваліся вялікія крэдыты, а ЗША далі Румыніі статус найбольшага спрыяння.

Н. Чаўшэску марыў, каб Румынія стала цэнтрам сусветнай палітыкі. Асабіста сябе ён бачыў галоўнай постаццю і лідарам Руху недалучанасці. Ён спрабаваў выступаць пасярэднікам у канфліктах, імкнуўся лавіраваць паміж вялікімі дзяржавамі. Амаль за чвэрць стагоддзя пры ўладзе дыктатар зрабіў каля 250 візітаў у замежныя краіны і прыняў у Румыніі больш за 300 лідараў дзяржаў свету.

Але з пачаткам перабудовы папулярнасць Н. Чаўшэску на Захадзе катастрафічна ўпала. Адмаўленне ад рэформ (па словах дыктатара, яго краіна не мела ў гэтым патрэбы) прывяло да амаль поўнай палітычнай ізаляцыі рэжыму.

### Эканамічны і палітычны крызіс у Румыніі. Падзеі ў Брашаве (1987 г.). Дэмакратычная рэвалюцыя снежня 1989 г. Звяржэнне дыктатуры Н. Чаўшэску і прыход да ўлады Фронту нацыянальнага выратавання

У адрозненне ад іншых краін Цэнтральнай і Паўднёва-ўсходняй Еўропы, Румынія не пазбавілася ад папярэдняй сталінскай стратэгіі развіцця. Дадзеная арыентацыя праявілася і ў заданні і рэалізацыі пятай пяцігодкі (1971 – 1975). Быў узяты курс на рост тэмпаў эканамічнага развіцця ў параўнанні з эканомі-

кай іншых сацыялістычных краін амаль у два разы. У прыватнасці прадугледжвалася правядзенне фарсіраванай індустрыялізацыі. Праводзілася яна за кошт заходніх крэдытаў і, асабліва, за кошт стрымлівання росту жыццёвага ўзроўню насельніцтва. Гэта прыводзіла да незадавальнення працоўных, якое часта прымала і адкрытыя формы.

Былі і забастоўкі на шэрагу прадпрыемстваў, і беспарадкі ў шахцёрскіх пасёлках. Першае масавае рабочае выступленне ў сацыялістычнай Румыніі адбылося ў 1977 г. у г. Лупені. Каля 35 тыс. шахцёраў пратэставалі супраць павышэння пенсійнага ўзросту і скасавання пенсіі па інваліднасці. Уціхамірваць народ прыехаў сам Н. Чаўшэску. Пасля ўрэгулявання канфлікту (улада пайшла на пэўныя ўступкі) ад праследу «Секурытатэ» пацярпела каля 4000 чалавек.

Па асноўных паказчыках узроўню сацыяльнага і матэрыяльнага жыцця румыны займалі апошнія месцы ў Еўропе (звычайна апярэджваючы толькі Албанію). Пры гэтым партыя і яе правадыр спачатку заявілі аб перамозе сацыялізму, а потым – аб пачатку пабудовы развітога сацыялістычнага грамадства. У сельскай гаспадарцы было не менш праблем. Нягледзячы на тое, што аднаасобныя гаспадаркі захаваліся галоўным чынам толькі ў горных і не самых прыдатных раёнах і займалі каля 12 % ворыўнай зямлі, яны давалі 40 % гародніны, 50 % – садавіны, 48 % – мяса, 60 % – малака.

На працягу 1980-х гг. эканоміка краіны знаходзілася ў стане стагнацыі. Амбіцыйныя праграмы мадэрнізацыі і інтэнсіфікацыі вытворчасці, павышэння якасці і канкурэнтаздольнасці прадукцыі праваліліся. Пакутуючы на гігантаманію, Чаўшэску любымі сродкамі імкнуўся ўвесці Румынію ў лік перадавых індустрыяльных дзяржаў. Гэта прывяло да стварэння прамысловага патэнцыялу, які рэальна перавышаў фізічныя магчымасці краіны. Былі пабудаваныя многія нерэнтабельныя індустрыяльныя гіганты, не забяспечаныя рэсурсамі і сыравінай. Недагрузка вытворчых магутнасцей складала каля 30 %.

Дзякуючы вялікаму імпарту сучасных тэхналогій у 1970-х гг. Румынія па асартыментнай дыверсіфікацыі прадукцыі машынабудавання амаль дагнала Францыю, але машыны не вытрымлівалі аніякай канкурэнцыі. Для рэалізацыі пражэктаў свайго лідара Румынія імпартавала жалезную руду, кокс з Бразілія і Індыі, а потым і яшчэ з больш далёкай Аўстраліі. Але сабекошт прадукцыі рабіў саму вытворчасць стратнай.

Адчувальная залежнасць Румыніі ад заходніх рынкаў прывяла да таго, што напачатку 1980-х гг. знешняя запазычанасць Захаду дасягнула $10,2 млрд. Атрыманыя крэдыты выкарыстоўваліся абсалютна бяздарна, выплата па пазыках ажыццяўлялася шляхам скарачэння імпарту пры адначасовым павелічэнні экспарту (не куплялі (напрыклад, медыкаменты) і прадавалі за мяжу (напрыклад, прадукты харчавання), тое у чым мелі пільную патрэбу).

Нездавальняючая плацежаздольнасць краіны вымусіла ўлады ў 1983 г. цалкам адмовіцца ад замежных крэдытаў. У сакавіку 1989 г. Чаўшэску ўрачыста абвясціў, што знешняя запазычанасць пагашана датэрмінова і Румынія, такім чынам, «з'яўляецца адзінай краінай у свеце, якая цалкам сплаціла свой знешні доўг». Усяго замежным крэдыторам з 1975 – 1989 г. было выплачана каля $22 млрд., у тым ліку звыш $7 млрд. працэнтаў.

Пры гэтым жытло грамадзян амаль ніколі не ацяплялася, газ і гарачую ваду падавалі лічаныя гадзіны на дзень, вуліцы гарадоў начамі не асвятляліся, а магазіны з-за адсутнасці электрычнасці працавалі толькі ў светлы час сутак. Назіраліся вялікія перабоі ў забеспячэнні прадуктамі харчавання. Пакуль што маўклівае незадавальненне ў краіне рэжымам Н. Чаўшэску нарастала.

Цярпенне народу стала канчацца. Восенню 1987 г. адбыліся сур'ёзныя хваляванні сярод рабочых у Брашаве. Дайшло да таго, што рабочыя штурмам авалодалі будынкамі павятовага камітэта партыі і мэрыі. У ходзе падаўлення хваляванняў службамі бяспекі былі забітыя сем і арыштаваныя больш за дзвесце чалавек. Але гэты выбух незадавальнення народа не меў працягу і новых выступленняў прыйшлося чакаць каля двух гадоў.

Н. Чаўшэску ж не збіраўся «рушыць даўніны». «*Хутчэй Дунай пацячэ ў адваротны бок, чым адбудзецца «перабудова» ў Румыніі*», – заявіў ён у жніўні 1989 г. На XIV з'ездзе партыі румынскі лідар назваў перабудову «шкодніцтвам справе сацыялізму» і «пасобніцтвам імперыялізму». Пад час аднаго з выступленняў на з'ездзе зала 62 разы апладысментамі стоячы перарывала выступленне Н. Чаўшэску.

Штуршок Румынскай рэвалюцыі 1989 г. далі падзеі ў Цімішаары. Канфлікт паміж уладамі і кальвінісцкім святаром, венграм па нацыянальнасці, 16 снежня перарос у масавыя апазіцыйныя акцыі ў горадзе. 21 снежня 1989 г. у Бухарэсце па загаду Н. Чаўшэску быў скліканы 100-тысячны мітынг. Выступленне дыктатара народ сустракаў з непрыхаваным недаверам – ужо на восьмай хвіліне выступу з натоўпу раздаліся крыкі: «Цімішаара! Цімішаара!» А калі пачуліся гукі падобныя на выбух ці на страляніну, пачалася паніка. Раздаліся крыкі «Далоў тырана!», «Далоў камунізм!» Пад вечар у цэнтры Бухарэста з'явіліся сілы органаў дзяржбяспекі, армейскія аддзелы і танкі. Аднак аднавіць парадак і яны не здолелі. 22 снежня Н. Чаўшэску з жонкай пакінуў сталіцу на верталёце і схаваўся ў адной з рэзідэнцый. Армія стала пераходзіць на бок паўстаўшага народа.

Неўзабаве Н. Чаўшэску быў арыштаваны, а 25 снежня 1989 г. ваенны трыбунал – паспешліва закрытае судзілішча, арганізаванае былымі паплечнікамі дыктатара, прызнаў яго і яго жонку вінаватымі ў генацыдзе, узброеным выступленні супраць дзяржавы і народу, разбурэнні дзяржаўных інстытутаў падрыве дзяржаўнай эканомікі. Смяротны прысуд быў неадкладна выкананы.

**Складванне асноў новай дзяржаўнасці.**
**Цяжкасці на шляху рыначных рэформ і дэмакратызацыі.**
**Канстытуцыя 1991 г. Унутрыпалітычнае жыццё**
**і знешняя палітыка Румыніі ў 1990 – 2000-я гг.**

Напрыканцы 1989 г. камуністычны рэжым, які яшчэ зусім нядаўна выглядаў непахісным, пацярпеў поўны крах. Уладу ў дзяржаве ў свае рукі ўзяў **Фронт нацыянальнага выратавання (ФНВ)**, які першапачаткова аб'ядноўваў дысідэнтаў з партыйным мінулым і некаторых пазапартыйных апанентаў рэжыму. Неўзабаве ў пануючую арганізацыю ўліваецца нямала былых партыйных функцыянераў. Выконваючым абавязкі прэзідэнта быў абвешчаны былы буйны партыйны дзеяч (першы сакратар ЦК Саюзу камуністычнай моладзі і член ЦК), які потым страціў ласку дыктатара, Іон Іліеску, а прэм'ер-міністрам – 43-гадовы вучоны Петрэ Роман.

Рэвалюцыя 1989 г. ліквідавала манаполію камуністычнай партыі на ўладу. Адраджаюцца палітычныя партыі, існаваўшыя да ўсталявання камуністычнай дыктатуры. У снежні 1989 г. была створана **Хрысціянска-дэмакратычная нацыянал-цэраністкая партыя** (**ХДНЦП**; пераемніца Нацыянал-цэраністкай партыі) – першая афіцыйна зарэгістраваная партыя новай Румыніі. Былі адноўлены старэйшая палітычная партыя краіны (заснавана ў 1875 г.) **Нацыянал-ліберальная партыя (НЛП)** і **Румынская сацыял-дэмакратычная партыя (РСДП)**. Да траўня 1990 г. у краіне з'явілася яшчэ больш за 80 палітычных партый – ад скрайне левых да скрайне правых.

28 студзеня 1990 г. абвясціў пра сваё пераўтварэнне ў палітычную партыю і Фронт нацыянальнага выратавання. Але вядучыя палітычныя партыі выступілі з рашучым пратэстам, паколькі ФНВ сам пазіцыянаваў сябе як часовую ўладу, што была заклікана забяспечыць умовы для пачатку дэмакратычнай трансфармацыі палітычнага рэжыму ў Румыніі, і абяцаў не выстаўляць сваіх кандыдатаў на выбарах, якія будзе ладзіць. На думку апазіцыі, новы статус Фронту пры захаванні яго ўладных функцый прывядзе да стварэння новай партыі ўлады, новай палітычнай манаполіі і стане перашкодай для дэмакратычных працэсаў. На магчымасць падобнага сцэнарыю ўказвала і партыйнае мінулае лідараў ФНВ, напрыклад, І. Іліеску.

У сталіцы і некаторых іншых гарадах краіны пачаліся масавыя антыўрадавыя акцыі пратэсту пад лозунгамі «Нам не патрэбны неакамунізм» і «Учора Чаўшэску, сёння Іліеску». Маніфестанты патрабавалі забараніць былым членам РКП браць удзел у выбарах, вярнуць канфіскаваныя камуністычнымі ўладамі землі, дамы ды іншую маёмасць, расследаваць падзеі снежня 1989 г. І. Іліеску назваў удзельнікаў антыўрадавых акцый пратэсту *golani* – «хуліганамі», «жулікамі», «гультаямі». Гэтая абразлівая мянушка дала назву ўсім акцыям грамадзянскага непадпарадкавання – **«галаніяда»**.

ФНВ у адказ арганізоўваў праўрадавыя маніфестацыі рабочых і шахцёраў, узброеных дубінкамі, ламамі, арматурай – г. зв. «**мінерыяды»** (рум. *Mineriadă* ад *minerul* – шахцёр). Яны выкарыстоўваліся для «аднаўлення парадку» у гарадах, запужвання апанентаў, а ў дадатак да гэтага і для стварэння партыі іміджу сапраўдных абаронцаў інтарэсаў простага працоўнага люду. На падобных акцыях часта гучалі лозунгі накшталт «Смерць інтэлігенцыі» і выкарыстоўваліся агенты спецслужб, якія ладзілі правакацыі, а часам проста апускаліся да крыміналу (у 1994 г. двое былых афіцэраў былі асуджаныя за тое, што падчас мінерыяды ўчынілі пагром у доме аднаго з лідараў апазіцыі і злачынна завалодалі $100 тыс.).

Паколькі ў руках ФНВ знаходзіліся ўсе важнейшыя ўладныя рычагі, у тым ліку і большасць сродкаў масавай інфармацыі, а сама партыя асацыявалася часткай насельніцтва, не гатовага да рэзкага разрыву з сацыялістычным мінулым, з дарэвалюцыйнай Румыніяй, насельніцтва падтрымала яго на першых дэмакратычных выбарах у траўні 1990 г. Большая частка румынаў была моцна напужаная магчымасцю «капіталістычнай рэстаўрацыі», «вяртання буржуяў і памешчыкаў», «паляваннем на камуністаў» у выпадку прыходу да ўлады цэраністаў і лібералаў.

Першым усенароднаабраным прэзідэнтам Румыніі стаў І. Іліеску (1990 – 1996), які набраў больш за 85 % галасоў. На парламенцкіх выбарах яго партыя таксама перамагла: у Сенаце ФНВ заваявала 3/4 месцаў, Палаце дэпутатаў – 2/3. Прэм’ер-міністрам застаўся П. Роман. Другое і трэцяе месцы занялі **Дэмакратычны саюз венграў Румыніі (ДСВР)** (партыя ніколі не была зарэгістравана, ў традыцыйным сэнсе гэтага слова, але дзейнічае на законных падставах як арганізацыя, што рэпрэзентуе нацыянальную меншасць) і НЛП.

Далейшае пагаршэнне сацыяльна-эканамічнай сітуацыі, асабліва ва ўмовах пачатку канчатковага распаду сацыялістычнай садружнасці, патрабавала рашучых рыначных пераўтварэнняў. З ініцыятывы ўраду П. Романа былі прыняты больш за 100 законаў, у тым ліку закон пра пераўтварэнне дзяржаўных прадпрыемстваў у кампаніі, прыватызацыю дзяржаўных прадпрыемстваў, лібералізацыю цэн і тарыфаў, замежныя інвестыцыі, аграрную рэформу (была адноўлена прыватная ўласнасць на 82 % усёй плошчы сельскагаспадарчых угоддзяў) і г. д. Былі ўсталяваны трывалыя адносіны з міжнароднымі эканамічнымі і фінансавымі структурамі. Рыначныя рэформы выклікалі супраціўленне часткі насельніцтва. У верасні 1991 г. шахцёры ізноў вярнуліся ў Бухарэст – гэтым разам па ўласнай волі, каб запатрабаваць падвышэння заробкаў і паляпшэння ўмоў працы – і дабіліся адстаўкі ўраду.

Вялікія спадзяванні ўскладаліся на прыняцце новай дэмакратычнай канстытуцыі. У снежні 1991 г. яна была ўхвалена ў ходзе нацыянальнага рэферэндуму. Згодна з **Канстытуцыяй 1991 г.**, Румынія абвяшчалася ўнітарнай

дзяржавай з рэспубліканскай формай праўлення. Галавой дзяржавы з'яўляецца прэзідэнт, які абіраецца на 4 гады ўсенародным галасаваннем.

Ужо на базе новых канстытуцыйных патрабаванняў у верасні 1992 г. адбыліся новыя прэзідэнцкія і парламенцкія выбары. Прэзідэнтам быў перабраны І. Іліеску, але гэтым разам для перамогі яму спатрэбіўся 2-гі тур. Не аказалася дамінуючай сілы і на парламенцкіх выбарах. У сакавіку 1992 г. у ФНВ адбыўся раскол: **Дэмакратычны фронт нацыянальнага выратавання** (**ДФНВ**; з 1993 г. – **Сацыял-дэмакратычная партыя Румыніі**, **СДПР**) на чале з І. Іліеску пакінуў партыю, дзе засталіся больш схільныя да рэформаў палітыкі на чале з П. Раманам (пазней ФНВ атрымаў назву **Дэмакратычная партыя, ДП**). Перамога ДФНВ была адноснай – партыя набрала толькі 28 %. Другое месца заняў **Румынскі дэмакратычны саюз (РДС) –** выбарчы альянс ХДНЦП, НЛП і шэрагу іншых партый, якія выступалі супраць абсалютнага дамінавання «партыі былых камуністаў сярэдняга звяна» – ДФНВ. Яго лідар Эміль Канстанцінэску – у 2-м туры прэзідэнцкіх выбараў за яго галасавала больш за трэць выбаршчыкаў – пераўтвараецца ў найбольш яркага канкурэнта дзеючага прэзідэнта.

Новы ўрад ДФНВ на чале з Нікалаэ Вэкэрою, былым супрацоўнікам Дзяржплана эпохі Н. Чаўшэску, зрабіў некалькі сціплых захадаў па лібералізацыі рынку, распачаў праграму ваўчарнай прыватызацыі і паспрабаваў наладзіць адносіны з заходнімі структурамі (ЕЭС/ЕС і НАТО). Аднак сацыяльна-эканамічнае становішча працягвала пагаршацца. Напрыклад, у 1994 г. здарыўся самы гучны ў найноўшай гісторыі краіны фінансавы скандал: развалілася фінансавая піраміда «Карытас», куды многія мільёны даверлівых грамадзян (па некаторых ацэнках пацярпела кожная трэцяя румынская сям'я) ўклалі па розных ацэнках ад 1 млрд. да 5 млрд. долараў.

Адсутнасць пазітыўных зрухаў у эканоміцы, асабліва на фоне поспехаў большасці іншых дзяржаў рэгіёну – Чэхіі, Польшчы, Венгрыі, Славеніі, Славакіі, падрывалі давер да правячай партыі ды яе лідара. На прэзідэнцкіх і парламенцкіх выбарах да ўлады прыйшла апазіцыя. Новым прэзідэнтам быў абраны Э. Канстанцінэску, які ў 2-м туры ўзяў рэванш у І. Іліеску. На парламенцкіх выбарах перамогу атрымаў РДС (30 %), які разам з **Сацыял-дэмакратычным саюзам (СДС)** і ДСВР стварыў кааліцыйны ўрад. Прэм'ерская пасада дасталася аднаму з лідараў нацыянал-цэраністаў, мэру Бухарэста Віктару Чорбя.

Зыход выбараў 1996 г. стаў сведчаннем поспеху працэсу дэмакратызацыі Румыніі. Упершыню пасля падзення камунізму ў 1989 г. ФНВ/ДФНВ/СДПР была адпраўлена ў апазіцыю – улада ў краіне змянілася электаральным шляхам. Аднак посткамуністычная трансфармацыя ў эканамічнай сферы была яшчэ далёкая ад заканчэння. Новы ўрад правёў некалькі важных рынкавых пера-

ўтварэнняў, у тым ліку прапанаваў дастаткова жорсткую праграму эканамічнага аздараўлення – г. зв. «Кантракт з Румыніяй». Рэформы даваліся з вялікай цяжкасцю. Ажыццяўляць раздзяржаўленне прамысловасці і падтрымліваць сацыяльны спакой, неабходны для ўступлення ў НАТО, было вельмі цяжка. Карэнныя кадравыя змены ў міністэрствах выклікалі абвінавачванні на адрас ураду ў правядзенні «палітычных чыстак». Ва ўрадавай кааліцыі нараставалі рознагалоссі: памяркоўным правым з РДС было цяжка ўжывацца з левацэнтрысцкім СДС. Напрыканцы 1998 г. яны скончыліся ўрадавым крызісам і адстаўкай В. Чорбя.

Два наступныя ўрады кааліцыі спрабавалі працягнуць рыначныя рэформы, але спрэчкі ва ўрадзе (да старых рознагалоссяў дадалося ультыматыўнае патрабаванне ДСВР адкрыць дзяржаўны венгерскі ўніверсітэт), нарастанне шырокага грамадскага незадавальнення (здарылася новая «мінерыяда») і падтрымка ўрадам вайны НАТО супраць Югаславіі прывялі да канчатковага разладу былых саюзнікаў. Акрамя таго, напрыканцы 1999 г. стала ясна, што дажывае апошнія месяцы асноватворная сіла кааліцыі РДС. Тым не менш, нават абмежаваныя рыначныя пераўтварэнні далі эфект: на мяжы XX і XXI стст. у эканоміцы Румыніі нарэшце намеціліся пазітыўныя зрухі.

Прэзідэнцкія і парламенцкія выбары 2000 г. прынеслі нямала сюрпрызаў. Удала выступілі СДПР і ультранацыяналістычная **партыя «Вялікая Румынія»**, якая выступала з антывенгерскімі, антыцыганскімі ды антысеміцкімі лозунгамі, а таксама патрабавала вяртання да межаў 1940 г. На прэзідэнцкіх выбарах лідары гэтых партый – адпаведна І. Іліеску і Карнэліу Вадзім Тудар – выйшлі ў 2-гі тур, дзе перамог больш вопытны і аўтарытэтны палітык (67 % супраць 33 %). І. Іліеску (2000 – 2004) быў абраны прэзідэнтам Румыніі ў другі раз.

Пратэстны электарат расчараваны больш чым дзесяцігоддзям «рынку і свабоды» аддаў свае галасы «Вялікай Румыніі» і на парламенцкіх выбарах: партыя заняла другое месца (20 %) следам за СДПР (37 %). Ліберальна-дэмакратычныя сілы – НЛП і ДП – выступілі няўдала набраўшы толькі па 7 % галасоў, нямногім болей за партыю венгерскай меншасці. Новым прэм'ер-міністрам стаў былы камуніст і камсамольскі функцыянер Адрыян Нэстасе (2000 – 2004).

Нягледзячы на ўсплёск радыкалізму на выбарах 2000 г., наступныя чатыры гады аказаліся самымі спакойнымі і ў посткамуністычнай гісторыі Румыніі. Захоўвалася палітычная стабільнасць, наступіў працяглы эканамічны рост, знешняя палітыка набывае падкрэслена празаходнюю арыентацыю. Румынія ўступіла ў блок НАТО (2004), паспяхова скончыла перамовы аб уступленні ў ЕС, намечаным на 2007 – 2008 гг. (для гэтага прыйшлося пайсці на цэлы шэраг сур'ёзных рэформ), і аб зняцці перашкод для румынаў, якія падарожнічаюць па тэрыторыі краін Шэнгенскай зоны. Пры гэтым заставалася

нямала нявырашаных праблем: усё яшчэ 42 % эканамічна актыўнага насельніцтва працавала ў сельскагаспадарчым сектары (у Польшчы толькі 19 %), розныя сацыяльныя слаі па-рознаму адчувалі эфект ад эканамічнага росту – адсотак насельніцтва, якое пражывала ніжэй за узровень беднасці заставаўся вельмі высокім, асабліва ў аграрных раёнах. У 2003 г. былі прынятыя канстытуцыйныя папраўкі: прэзідэнцкі тэрмін павялічваўся да 5 гадоў.

Выбары 2004 г. для правячай партыі склаліся вельмі няўдала. На прэзідэнцкіх выбарах дастаткова папулярнага прэм'ер-міністра А. Нэстасэ ў 2-м туры на 1,5 % апярэдзіў лідар новага выбарчага **альянсу «Праўда і Справядлівасць»** (**ПС**; увайшлі НЛП і ДП) Траян Бэсэску (2004). На парламенцкіх выбарах перамога дасталася **блоку СДПР – РГП** (Румынская гуманістычная партыя; з 2005 г. выступае пад назвай Кансерватыўная партыя, КП), які набраў 37 % галасоў. Тым не менш, для фарміравання большасці гэтага было недастаткова. Пачаліся перагаворы пра стварэнне ўраду з удзелам СДПР, РГП, ДСВР і шэрагам дробных партый. Але нечакана галоўныя саюзнікі сацыял-дэмакратаў – РГП – далучылася да альянсу «Праўда і справядлівасць» і разам з ім і партыяй венгерскай меншасці стварылі іншы кааліцыйны ўрад. СДПР была вымушана зысці ў апазіцыю.

Нягледзячы на стабілізацыю румынскай эканомікі і далучэнне да ЕС (2007), палітычнае жыццё краіны заставалася не зусім стабільным. У красавіку 2007 г парламент узбудзіў імпічмент супраць Т. Басэску і прагаласаваў «за» (дзеючага прэзідэнта рашуча падтрымала толькі яго Дэмакратычная партыя). Яго паўнамоцтвы былі прыпынены, але паводле канстытуцыі канчатковы вердыкт у дачыненні лёсу прэзідэнта павінны быў вынесці народ на рэферэндуме. У траўні 2007 г. румыны прагаласавалі ў падтрымку Т. Басэску. А ў 2009 г. дзеючы прэзідэнт быў пераабраны на новы 5-гадовы тэрмін. Яго галоўнай задачай, як і важнейшай справай ураду, становіцца пераадоленне наступстваў сусветнага фінансавага крызісу 2008 – 2009 гг.

## Тэма 18. Венгрыя ў 1945 – 2010-я гг.

### Вызваленне Венгрыі ад фашысцкай акупацыі. Стварэнне Венгерскага нацыянальнага фронту незалежнасці і скліканне Часовага нацыянальнага сходу. Першыя агульнанацыянальныя выбары. Абвяшчэнне рэспублікі

У траўні 1944 г. быў створаны антыфашысцкі **Венгерскі фронт (ВФ)**, куды спачатку ўвайшлі Венгерская камуністычная партыя (ВКП), Сацыял-дэмакратычная партыя (СДП), Партыя дробных сельскіх гаспадароў (ПДСГ) і нават група легітымістаў (падтрымлівала вяртанне на венгер-

скі прастол дынастыі Габсбургаў), а восенню 1944 г. да іх далучылася і Нацыянальная сялянская партыя (НСП).

З набліжэннем непазбежнай развязкі вайны шматгадовы дыктатар Міклаш Хорці спрабаваў дамовіцца аб перамір'і з дзяржавамі антыгітлераўскай кааліцыі (не толькі з заходнімі саюзнікамі, але і з СССР), а напярэдадні ўступлення Савецкай Арміі на венгерскую зямлю (15 кастрычніка) нават абвясціў аб перамір'і. Важнейшае стратэгічнае значэнне Венгрыі для нацысцкай Германіі абумовіла рашучыя дзеянні Гітлера ў адказ: Хорці быў скінуты і ўсталяваны нацысцкі рэжым Ферэнца Салашы і яго Партыі скрыжаваных стрэлаў («ніла-шыстаў»). Тым не менш лёс вайны ўжо не выклікаў аніякіх сумненняў. У перыяд з кастрычніка 1944 г. па 4 красавіка 1945 г. уся тэрыторыя Венгрыі была вызвалена ад войск гітлераўцаў і іх венгерскіх памагатых і занята Савецкай Арміяй.

Удзел у вайне і гаспадаранне ў краіне гітлераўскіх акупантаў дорага абышліся народу Венгрыі. Вайна забрала жыцці каля 600 тыс. чалавек, прычым амаль палова з іх – ахвяры сярод мірнага насельніцтва.

2 снежня 1944 г. на вызваленай Савецкай Арміяй венгерскай тэрыторыі (г. Сегед) замест ВФ быў створаны **Венгерскі нацыянальны фронт незалежнасці (ВНФН)**, у які ўвайшлі ВКП, СДП, ПДСГ, НСП, Буржуазна-дэмакратычная партыя і прафсаюзы. Яго ўзначаліў лідар ПДСГ Золтан Цілдзі. Створаны 22 снежня Часовы нацыянальны сход (ЧНС) абвясціў вайну Германіі і забараніў фашысцкія арганізацыі. У кароткі тэрмін быў ліквідаваны стары фашысцкі дзяржаўны апарат. Новая ўлада прыступіла да правядзення прагрэсіўных дэмакратычных пераўтварэнняў. Пытанне формы праўлення пакуль не вырашалася – Венгрыя па-ранейшаму заставалася манархіяй. 20 студзеня 1945 г. Венгрыя падпісала перамір'е з дзяржавамі Антыгітлераўскай кааліцыі.

Першыя пасляваенныя выбары (муніцыпальныя) адбыліся ў Будапешце ў кастрычніку 1945 г. Перамогу на іх атрымала Партыя дробных сельскіх гаспадароў, якая набрала 50,5 % галасоў, выступаўшыя адзіным блокам камуністы і сацыял-дэмакраты – толькі 42,8 %.

4 лістапада 1945 г. у Венгрыі былі праведзены агульнанацыянальныя парламенцкія выбары (наступных дэмакратычных выбараў прыйшлося чакаць больш за 40 гадоў!). Нягледзячы на адкрытую савецкую дапамогу, ВКП здолела атрымаць толькі 17 % галасоў, нават менш за былых саюзнікаў на муніцыпальных выбарах сацыял-дэмакратаў (17,4 %). Перамогу пад лозунгам «Бог, Айчына і прыватная ўласнасць» ізноў святкавала ПДСГ – 57 %. Левых выратавала толькі тое, што яшчэ да выбараў партыі-ўдзельніцы ВНФН дамовіліся аб захаванні кааліцыйнага ўраду. На яго фарміраванне магутны ўплыў зрабіла Саюзніцкая Кантрольная Камісія (СКК) на чале з маршалам К. Я. Варашылавым, якая дазволіла пераможцам заняць палову месцаў у кабінеце міністраў,

але ключавыя пасады, напрыклад, пост міністра ўнутраных спраў, замацавала за камуністамі. Кіраўніком урада застаўся З. Цілдзі.

1 лютага 1946 г. было канчаткова вырашана пытанне формы праўлення – Венгрыя была абвешчана рэспублікай, а З. Цілдзі быў абраны яе прэзідэнтам. Вакантнае месца прэм'ер-міністра дасталася яго паплечніку па партыі Ферэнцу Надзю. З арганізацыяй новых органаў дзяржаўнай улады на базе народнага волевыяўлення пачынаецца працэс прызнання ўраду Венгрыі дзяржавамі Еўропы і ЗША.

Нягледзячы на захаванне фармальнага адзінства ў кааліцыі антыфашысцкіх сіл нараслі рознагалоссі. Выразнай праявай гэтай тэндэнцыі стала ўтварэнне ў сакавіку 1946 г. Левага блоку ў складзе ВКП, СДП, НКП і прафсаюзаў. Па меры нарастання супярэчнасцей у лагеры былых партнёраў па Антыгітлераўскай кааліцыі – заходніх дзяржаў і Савецкага Саюза – палітычная барацьба ў Венгрыі таксама абвастраецца.

### Першыя пасляваенныя сацыяльна-эканамічныя і палітычныя пераўтварэнні. Мірны дагавор з Венгрыяй. Узмацненне палітычнай барацьбы. Парламенцкія выбары 1947 г. Становішча канфесій у першыя пасляваенныя гады

За гады вайны Венгрыя страціла каля 40 % нацыянальнага багацця. Цалкам або часткова былі разбураны 90 % усіх фабрык і заводаў (восенню 1944 г. – летам 1945 г. савецкая ваенная адміністрацыя ў лік рэпарацый праводзіла дэмантаж абсталявання, вываз прадуктаў харчавання, маёмасці, вайсковай тэхнікі). Аб'ём прамысловай вытворчасці ў 1945 г. ледзьве дасягаў 35 % ад даваеннага ўзроўню. У выніку цяжкіх метэаралагічных умоў ураджай 1945 г. не дасягнуў і паловы ўзроўню даваенных гадоў.

Адной з найбольш вострых і застарэлых праблем Венгрыі заставалася адсталасць аграрнага сектару эканомікі (перанаселенасць вёскі, малазямелле і беззямелле асноўнай масы яе жыхароў і наяўнасць буйных памешчыцкіх уладанняў). Яшчэ да канчатковага разгрому нацыстаў у сакавіку 1945 г. кабінет міністраў пасля настойлівых патрабаванняў камуністаў зацвердзіў праект урадавага дэкрэта аб ліквідацыі буйнога землеўладання і надзялення сялян зямлёй. 5 верасня 1945 г. дэкрэт набыў статус закона. Аграрная рэформа прадугледжвала канфіскацыю зямель кіраўнікоў фашысцкіх арганізацый і ваенных злачынцаў, маёнткі буйнейшых землеўладальнікаў. Астатнія буйныя ўладанні (звыш вызначанага максімуму) пераходзілі ў рукі дзяржавы за пэўны выкуп. Атрыманыя землі перадаваліся сялянам ў прыватную ўласнасць. У прывілеяваным становішчы апынуліся актыўныя ўдзельнікі Супраціўлення, актыўныя змагары з нямецкімі акупантамі, для якіх усталёўваўся высокі максімальны памер зямельнага ўладання. У снежні 1945 г. быў прыняты закон аб нацыяналізацыі вугальнай прамысловасці.

Надзвычай сур'ёзна стаяла праблема інфляцыі. Са жніўня 1945 г. па ліпень 1946 г. сярэднемесячны тэмп росту цэн складаў 19 800 %. Нават сумна знакамітая германская інфляцыя 1922 – 1923 гг. была меншай у многія дзесяткі разоў. Апошняя дарэформенная банкнота мела вартасць адзін квадрыльён пенгё (адзінка з дваццаццю чатырма нулямі). У жніўні 1946 г. была ўведзена новая забяспечаная золатам валюта – форынт (на 1 форынт мянялі 400 000 квадрыльёнаў пенгё!).

Рэалізацыя іншых мерапрыемстваў пэўны час была немагчымая з-за дыяметральна супрацьлеглых уяўленняў вядучых палітычных сіл Венгрыі на перспектывы сацыяльна-эканамічнага і грамадска-палітычнага развіцця краіны. ПДСГ і буржуазныя партыі выступалі за захаванне капіталістычнай эканомікі і рынку, палітычнай дэмакратыі і парламентарызму, а камуністы з саюзнікамі патрабавалі складвання базы для пачатку пабудовы сацыялізму і ўсталявання ўлады працоўнага народу.

10 лютага 1947 г. Венгрыя падпісала **Парыжскі мірны дагавор**. У адпаведнасці з яго палажэннямі рашэнні Венскіх арбітражаў 1938 і 1940 гг. абвяшчаліся несапраўднымі. Дзяржаўныя межы Венгрыі з Аўстрыяй, Румыніяй і Югаславіяй вызначаліся па стану на 1 студзеня 1938 г. Акрамя таго, частка тэрыторыі ў раёне Браціславы перадавалася Чэхаславакіі. У палітычнай сферы прадугледжваўся роспуск фашысцкіх арганізацый, затрыманне і выдача суду асоб, якія здзейснілі ваенныя злачынствы і злачынствы супраць міру і чалавечнасці, абмежаванне ўзброеных сіл і ваеннай вытворчасці, аднаўленне грамадзянскіх свабод і дэмакратыі. Быў вызначаны аб'ём рэпарацый для СССР ($200 млн.), Чэхаславакіі і Югаславіі (па $100 млн.), прызнана права Савецкага Саюзу на ўсе германскія актывы ў Венгрыі (ад часткі кампенсацый СССР потым адмовіўся). СССР было дазволена пакінуць на венгерскай тэрыторыі свае ўзброеныя сілы. Знаходжанне Савецкай Арміі ў Венгрыі спачатку ўвязвалася з патрэбамі вонкавага кантролю над тэрыторыяй таксама занятай Аўстрыі, а з утварэннем у 1955 г. Арганізацыі Варшаўскага Дагавору тлумачылася саюзніцкімі адносінамі.

Нарастанне напружання ў адносінах паміж СССР і краінамі Захаду вяло да канчатковага размежавання іх сфер уплыву ў Еўропе. Пасля заключэння мірнага дагавору для Венгрыі прыйшла пара вырашальных падзей.

Сапраўдныя баталіі разгарнуліся ў венгерскім парламенце вакол прапанаванага камуністамі 3-гадовага эканамічнага плана. Ён прадугледжваў аднаўленне гаспадаркі на новай сацыяльна-эканамічнай базе, у падмурку якой ляжалі дзяржаўны і кааператыўны сектар. Інвестыцыі для эканамічнага прарыву камуністы збіраліся чэрпаць з даходаў дзяржаўнага сектара эканомікі і прагрэсіўнай падатковай сістэмы (безумоўна, вялікія спадзяванні ўскладаліся і на дапамогу СССР). На думку лідараў ПДСГ эканамічная мадэрнізацыя краіны

была магчыма толькі пры фінансавай падтрымцы заходніх дзяржаў. Вострая барацьба разгарнулася таксама вакол нацыяналізацыі банкаў, прапанаванай ВКП.

Вырашыць палітычную спрэчку на сваю карысць парламенцкімі сродкамі ВКП не магла, таму, выкарыстоўваючы кантроль над сілавымі органамі, савецкую падтрымку і іншыя рычагі дзяржаўнай улады, камуністы імкнуліся дыскрэдытаваць і аслабіць палітычных апанентаў. У лютым 1947 г. камуністы заявілі пра выкрыццё антырэспубліканскай змовы, мэтай якой, нібыта, з’яўлялася гвалтоўнае звяржэнне народна-дэмакратычнага ладу шляхам вайсковага путчу. Абвінавачанні ў гэтым цяжкім дзяржаўным злачынстве былі скіраваны і супраць цэлага шэрагу вядучых палітыкаў краіны, у тым ліку лідараў ПДСГ. Пачаліся арышты. Шытыя белымі ніткамі доказы вінаватасці не пераканалі парламент, які адмовіўся пазбавіць мандата недатыкальнасці генеральнага сакратара ПДСГ Бэлу Ковача. Тады 25 лютага 1947 г. яго як арганізатара тэрарыстычных груп (!), што ажыццяўлялі напады на савецкіх афіцэраў, арыштавалі акупацыйныя савецкія ўлады.

У траўні 1947 г. СССР зрабіў заяву аб тым, што на допытах Б. Ковача высветлілася вінаватасць у змове супраць рэспублікі самога Ф. Надзя, які ў той час знаходзіўся на адпачынку ў Швейцарыі. Аказваючы на прэм’ер-міністра псіхалагічны ціск – быў выкрадзены яго 4-гадовы сын, новыя гаспадары Венгрыі здолелі дамагчыся ад яго «добраахвотнай адстаўкі». Ф. Надзь быў вымушаны пражыць рэшту свайго жыцця на чужыне.

Следам пайшлі чысткі партый правячай кааліцыі – ПДСГ, СДП і НКП – ад правых элементаў. Фармальна быў захаваны шматпартыйны ўрад, прэм’ерскае крэсла засталося за новым лідарам ПДСГ Лаяшам Дзіньешам, але адзінай рэальнай сілай у ім аказаліся камуністы. Таксама была праведзена чыстка дзяржаўнага апарату ад «варожых элементаў».

У выніку быў паспяхова зацверджаны 3-гадовы план, а партыі Левага блоку паставілі ў парламенце пытанне аб адпаведнасці рэальнага ўплыву ПДСГ яе месцу і ролі ў органах дзяржаўнай улады ды ініцыявалі правядзенне новых парламенцкіх выбараў.

Афармленне новага раскладу палітычных сіл у Венгрыі, а дакладней усталяванне камуністычнай дыктатуры, магло адбыцца ўжо пасля парламенцкіх выбараў 31 жніўня 1947 г. Аднак, бясспрэчна, менш дэмакратычныя за папярэднія, гэтыя выбары аказаліся больш спаборніцкімі і свабоднымі ў параўнанні з выбарамі балканскіх суседак Венгрыі. Камуністы нягледзячы на запужванні на адрас праціўнікаў і падтасоўкі здолелі атрымаць толькі 22,3 % галасоў. Абяскроўленая рэпрэсіямі і расколамі ПДСГ набрала толькі 15,4 %. Немалую падтрымку знайшлі чатыры новыя партыі (склаліся на базе выгнаных з урадавых партый груповак), што прадстаўлялі сябе як апазіцыя ВНФН. Напрыклад, нацыянал-кансерватыўная Партыя венгерскай незалежнасці (ПВН)

атрымала 13,4 %, а больш цэнтрысцкая каталіцкая Дэмакратычная народная партыя (ДНП) – 16,4 %. Вынікі выбараў сведчылі пра тое, што і ў новых умовах народ яшчэ не быў запужаны, а камуністы не мелі істотнай падтрымкі грамадства і дэмакратычным шляхам усталяваць уладу былі няздольныя. Тым не менш партыі кааліцыі атрымалі каля 60 % галасоў і сфарміравалі новы ўрад.

На гэты час Венгрыя, як і пасляваенная Польшча, з этнанацыянальнага пункту гледжання стала амаль цалкам аднароднай краінай. Але ў адрозненне ад сваёй суседкі, яна была больш стракатай канфесійна. Дзве трэці насельніцтва складалі каталікі, чвэрць – кальвіністы і вельмі нязначную частку – лютэране і іўдзеі.

Каталіцкі касцёл у асобе кардынала Міндсенці выступаў з патрабаваннем рэстаўрацыі Габсбургаў і пратэставаў супраць пасляваеннай зямельнай рэформы (каталіцкі касцёл заставаўся буйным землеўладальнікам). Кальвінісцкае святарства, наадварот, падтрымала рэспубліку і вітала зямельную рэформу, як неабходны і нават запознены крок.

У сферы культуры і педагогікі абедзве царквы ўступілі ў пасляваенны перыяд усё яшчэ маючы шырокія грамадскія функцыі. Дзве трэці пачатковых школ, напрыклад, былі канфесійнымі, а выкладанне рэлігіі ў школе было абавязковым нават у дзяржаўных свецкіх школах. Першыя пасляваенныя ўрады занялі даволі асцярожную пазіцыю ў дачыненні рэлігіі. Пры ўдзеле дзяржавы аднаўляліся разбураныя і пашкоджаныя храмы. Але калі ў 1947 г. дзяржаўныя школы ўвялі новыя падручнікі па свецкіх дысцыплінах – гэтыя падручнікі былі ўзятыя на ўзбраенне і кальвінісцкімі школамі – кардынал Міндсенці забараніў іх выкарыстанне ў каталіцкіх школах. У чэрвені 1948 г. уся школьная сістэма была абвешчана свецкай (рэлігійнае навучанне пры гэтым захоўвалася), кардынал адлучыў ад царквы ўрадавых чыноўнікаў-каталікоў, якія падтрымалі гэты закон, і загадаў святарам-настаўнікам і манашкам зысці са школ. У канцы 1948 г. кааліцыйны ўрад навязаў кальвіністам і лютэранам пагадненне, згодна з якім духоўныя асобы абавязваліся падтрымліваць народна-дэмакратычны лад. Каталіцкі касцёл адказаў катэгарычнай адмовай. Хаця апазіцыя Міндсенці ўзрастальна камуністычнай ўладзе можа сёння падацца донкіхоцтвам, у вачах народу ён паўставаў героем-барацьбітом за справядлівасць.

### Пераход да дыктатуры пралетарыяту. Канстытуцыя 1949 г. Першая пяцігодка і яе вынікі. Усталяванне таталітарнага рэжыму ў Венгрыі. Культ асобы М. Ракашы. Палітычныя рэпрэсіі

Пазіцыі кааліцыйнага, але па факту камуністычнага ўраду ўзмацняюцца пасля ліквідацыі адкрыта апазіцыйных партый. Напрыклад, «за падман і падтасоўкі ў ходзе выбараў» дэпутацкіх мандатаў пазбавілі прадстаўнікоў ВПН. Пад лозунгам пераадолення расколу рабочага класу ў чэрвені 1948 г. адбылося зліццё ВКП і СДП. Новаўтвораная партыя атрымала назву – **Венгерская партыя працоўных (ВПП)**. Старшынёй партыі быў

абраны Арпад Сакашыч, а генеральным сакратаром Мацяш Ракашы. У ходзе перарэгістрацыі членаў партыі было выключана з яе шэрагаў 190 тыс. чалавек. Пасля чысткі ў НСП і ПДСГ на чале гэтых партый канчаткова сталі прыхільнікі пабудовы ў Венгрыі сацыялізму. Быў абвінавачаны ў шпіянажы на карысць імперыялістаў, здрадзе Венгерскай Рэспубліцы, валютных спекуляцыях (!) і асуджаны кардынал Міндсенці. Напачатку 1949 г., пасля вымушанай эміграцыі на Захад сваіх лідараў спыніла існаванне буйнейшая на той час апазіцыйная партыя – ДНП.

Працэс разбурэння сіл арганізаванай апазіцыі стаў вынікам мэтанакіраванай палітыкі камуністаў. М. Ракашы назваў яе **«тактыкай наразання салямі»**: ад апазіцыі «адразаўся» кавалак за кавалкам (яе левая частка праглыналася пракамуністычнай кааліцыяй, а правая – выдалялася з палітычнай арэны) да тых пор, пакуль не засталіся адны лаяльныя рэжыму палітыкі і арганізацыі.

Напрыканцы 1947 г. былі нацыяналізаваныя буйнейшыя банкі краіны, а таксама фабрыкі і заводы, якія належалі ім. Вясной 1948 г. былі нацыяналізаваны ўсе прамысловыя прадпрыемствы, дзе працавала звыш 100 чалавек. У руках дзяржавы апынулася 4/5 буйной і сярэдняй прамысловасці і 2/3 аб’ёму знешняга гандлю.

Гэткім чынам да сярэдзіны 1948 г. у цэлым ажыццяўляецца пераход да дыктатуры пралетарыяту і будаўніцтва сацыялізму савецкага тыпу ў Венгрыі. Новы рэжым абапіраўся на моцную падтрымку СССР, з якім яшчэ ў лютым 1948 г. быў падпісаны разлічаны на 20 гадоў дагавор аб сяброўстве, супрацоўніцтве і ўзаемнай дапамозе.

У лютым 1949 г. адбылася рэарганізацыя правячага блоку – Венгерскі нацыянальны фронт незалежнасці быў перайменаваны ў **Венгерскі народны фронт незалежнасці**. Па прапанове камуністаў былі абвешчаны новыя парламенцкія выбары. Іх вынікі не прынеслі нечаканасцяў: спіс ВНФН атрымаў амаль 96 %, а камуністы заваявалі ў Дзяржаўным сходзе (парламенце) – 71 % месцаў. Упершыню ў венгерскай гісторыі ў парламенце не было ніводнага памешчыка, банкіра ці прадстаўніка буйнога гандлю.

18 жніўня 1949 г. Дзяржаўны сход абвясціў **Канстытуцыю Венгерскай Народнай Рэспублікі (ВНР)**. Венгрыя абвяшчалася дзяржавай рабочых і працоўных сялян, улада ў якой належала народу. Вызначалася мэта – пабудова сацыялістычнага грамадства.

Пасля датэрміновага выканання 3-гадовага плана, а таксама ў сувязі з пачаткам вайны ў Карэі у 1951 г. былі зацверджаны новыя скрайне завышаныя паказчыкі 1-ай пяцігодкі (па некаторых пазіцыях яны былі павялічаныя ў некалькі разоў). Вялікімі намаганнямі і пры аграмаднай дапамозе СССР за гады пяцігодкі былі пабудаваны 65 новых прамысловых аб’ектаў, узніклі цэлыя но-

вія галіны прамысловасці, з’явіліся новыя дарогі, каналы і цэлыя гарады (напрыклад, Сталінвараш). Аднак эканамічныя праблемы ў сувязі з курсам на фарсіраванае стварэнне цяжкой прамысловасці і кааперавннем сельскай гаспадаркі толькі нарасталі: павялічваўся сабекошт прадукцыі, транспарт не даваў рады перавозкам, раслі цэны і зніжалася рэальная плата, падала сельскагаспадарчая вытворчасць, скарачаліся пасяўныя плошчы, узнік дэфіцыт прадуктаў харчавання. У Венгрыі складвалася ўсеабдымная адміністрацыйная сістэма кіравання эканомікай, настолькі магутная, што не ішла ні ў якое параўнанне з суседнімі – польскай альбо югаслаўскай.

Генеральны сакратар ВПП М. Ракашы быў прызнаным лідарам камуністаў. Ужо ў 27-гадовым узросце ён займаў адказныя пасады (у т. л. галоўнакамандуючага Чырвонай гвардыі) у венгерскім савецкім урадзе Бэлы Куна. Затым на эміграцыі ў Маскве М. Ракашы кіраваў замежным бюро ВКП. Па меры авалодання камуністамі ўсёй паўнатой улады ў краіне ён пераўтвараецца ў сапраўднага дыктатара. «Лепшы вучань Сталіна ў Венгрыі», як ён называў самога сябе, дзейнічаў у лепшых традыцыях настаўніка. Рэпрэсіі ладзіліся як супраць адкрытых палітычных праціўнікаў, гэтак і ўнутры партыі. Праводзілася інтэрніраванне (высяленне) людзей па сацыяльнай прыкмеце з гарадоў. Пазбавіўшыся антыкамуністычнай апазіцыі, М. Ракашы таксама жорстка расправіўся з цэлым шэрагам сваіх бліжэйшых паплечнікаў. Асабліва паказальны лёс аднаго з партыйных лідараў Ласла Райка, стваральніка **Ўпраўлення дзяржаўнай бяспекі (УДБ**, венгерскага аналагу савецкіх НКУС-МДБ-КДБ) і міністра замежных спраў. Ён быў абвінавачаны ў «цітаізму» і шпіянажы на карысць Югаславіі, а ў 1949 г. «паказальным» працэсам асуджаны на смяротную кару. У 1952 г. М. Ракашы таксама заняў пасаду прэм’ер-міністра, тым самым фармальна-юрыдычным чынам замацаваўшы дыктатарскія паўнамоцтвы. Культ асобы правадыра венгерскага пралетарыяту дасягнуў свайго росквіту.

Курс М. Ракашы ў сацыяльна-эканамічнай і грамадска-палітычнай сферах, які характарызаваўся выкарыстаннем сталінскіх метадаў дзяржаўнага і партыйнага кіравання, сляпым капіраваннем савецкага вопыту і ігнараваннем нацыянальных асаблівасцяў і традыцый, правядзеннем рэпрэсіўнай палітыкі ў дачыненні ўласнага народа непазбежна вялі да сістэмнага крызісу таталітарнага рэжыму ў Венгрыі.

### Групоўка І. Надзя. Палітычная барацьба ў 1954 – 1955 гг. Абвастрэнне палітычнай сітуацыі летам 1956 г. Падзеі кастрычніка - лістапада 1956 г., іх характар, асноўныя этапы і вынікі

Смерць Сталіна моцна паўплывала на венгерскую палітычную сітуацыю. У выніку ціску новага савецкага кіраўніцтва чэрвеньскі Пленум Цэнтральнага Кіраўніцтва (ЦК) ВПП 1953 г. раскрытыкаваў цвёрдага сталініста М. Ракашы і змясціў яго з прэм’ерскай пасады (пры гэтым ён здолеў

захаваць лідарства ў партыі, хаця ўжо на пасадзе не «генеральнага», а «першага сакратара»). Кіраўніком ураду становіцца Імрэ Надзь. Разам з паплечнікамі, праціўнікамі сталінскіх метадаў пабудовы сацыялізму, І. Надзь правёў амністыю, спыніў інтэрніраванне, адмовіўся ад будаўніцтва мноства буйных прамысловых аб’ектаў, а асноўныя капіталаўкладанні скіраваў на развіццё «родных» для краіны лёгкай і харчовай прамысловасці. Галоўнай мэтай стала павышэнне дабрабыту венграў за кошт тавараў народнага ўжытку. Быў паслаблены ціск на сельскую гаспадарку (у выніку каля паловы сялян выйшла з кааператываў), дробныя гарадскія вытворцы атрымалі магчымасць набыць ліцэнзію для занятку сваім промыслам, былі зніжаны цэны на прадукты і тарыфы для насельніцтва.

Згортванне індустрыялізацыі і кааперавання ў сельскай гаспадарцы выклікалі рэзкую крытыку І. Надзя з боку М. Ракашы і яго прыхільнікаў. Страта Р. М. Малянковым (таксама выступаў за прыярытэтнае развіццё лёгкай прамысловасці) пасады галавы ўраду ў СССР паклала пачатак рашучаму наступу на пазіцыі І. Надзя ў Венгрыі. Яго палітыку асудзілі і пазбавілі прэм’ерскага крэсла, пасад у ЦК і Палітбюро ВПП (т. зв. «сакавіцкі паварот» 1955 г.). У партыі і ва ўрадзе былыя пазіцыі аднавіў М. Ракашы.

«Сталінісцкі рэнесанс» аказаўся нядоўгім. Выкрыццё культу асобы Сталіна ў СССР і рост незадаволенасці венгерскага грамадства палітыкай венгерскіх сталіністаў вялі да імклівага падзення папулярнасці ВПП. У ліпені 1956 г. страціў партыйнае лідарства М. Ракашы. На вызваленую ім пасаду быў прызначаны былы міністр дзяржаўнай бяспекі Эрнё Гера (рус. – Эрнё Герё). Але яго нерашучасць і разгубленасць сведчылі аб надыходзе перамен. Актывізуецца ўнутрыпартыйная групоўка антысталіністаў, аб’яднаных вакол І. Надзя. Магчымасці для дзейнасці дэмакратычнага крыла правячай партыі ва ўмовах таталітарнага рэжыму былі абмежаваныя: публікацыя крытычных артыкулаў, дыскусіі, тлумачальная работа сярод насельніцтва. Мэтай групоўкі была дэмакратызацыя грамадска-палітычнага і сацыяльна-эканамічнага жыцця краіны, рэфармаванне і дэмакратызацыя сацыялістычнага ладу, абнаўленне ВПП і ўсяго камуністычнага руху.

Унутраныя сацыяльна-эканамічныя і палітычныя супярэчнасці, умяшанне ў венгерскія справы знешніх сіл (у т. л. падтрымка заходнімі спецслужбамі антыкамуністычных элементаў) вялі таталітарны рэжым да глыбокага крызісу. Трагічная развязка прыйшла восенню 1956 г. У савецкай гістарыяграфіі гэтыя падзеі атрымалі назву «Венгерскі мяцеж 1956 г.» (часам нават з азначэннем «фашысцкі»), а ў замежных крыніцах, асабліва венгерскіх – **«Венгерская рэвалюцыя 1956 г.»** ці «Венгерскае паўстанне 1956 г.». У айчыннай гістарычнай літаратуры таксама выкарыстоўваецца больш нейтральная назва – «Будапешцкая восень 1956 г.» (па аналогіі з «Пражскай вясной 1968 г.»).

Іскрай, з якой разгарэлася полымя стала дэманстрацыя ў Будапешце 23 кастрычніка 1956 г. Прадстаўнікі творчай інтэлігенцыі і студэнцкая моладзь, натхнёныя працэсам дэсталінізацыі ў суседняй Польшчы выступілі са стрыманымі патрабаваннямі да ўлады. Але па меры разрастання маштабаў акцыі за кошт прытоку шырокіх мас гараджан (сярод іх, безумоўна, былі і спецыяльна падрыхтаваныя праціўнікамі існаваўшага ладу людзі) сталі агучвацца ўсё больш і больш радыкальныя лозунгі.

Мірная дэманстрацыя скончылася штурмам Дома Радыё. У сутыкненнях паміж дэманстрантамі і аддзеламі УДБ пралілася кроў – былі забітыя і параненыя. Урадавыя сілы раскалоліся. На бок народа перайшлі частка сталічных вайскоўцаў. Начальнік гарадской паліцыі даў загад не ўмешвацца у дзеянні паўстанцаў, а потым выканаў іх патрабаванні (вызваленне вязняў). Кіраўніцтва ВПП прыняло рашэнне прызначыць прэм'ер-міністрам прыхільніка рэформ і папулярнага ў народзе Імрэ Надзя.

Не застаўся ў баку ад палітычнага канфлікту і Савецкі Саюз. На падставе рашэння Прэзідыума ЦК КПСС начальнік Генштаба маршал В. Д. Сакалоўскі позна вечарам 23 лістапада аддаў загад часткам савецкага вайсковага кантынгенту накіравацца ў Будапешт для аказання дапамогі венгерскім войскам «у аднаўленні парадку і забеспячэнні ўмоў для мірнай стваральнай працы». Раніцай 24 кастрычніка савецкія войскі (6000 ваеннаслужачых, 290 танкаў, 120 БТР і г. д.) ўступілі ў баі з паўстанцамі.

Нягледзячы на гэта, а таксама на прыезд у Будапешт членаў Прэзідыума ЦК КПСС А. І. Мікаяна і М. А. Суслава, старшыні КДБ І. А. Сярова, першапачаткова савецкі бок заняў чакальную пазіцыю. Адно з нешматлікіх выключэнняў – інцыдэнт на мітынгу ля будынку парламента, калі следам за гібеллю савецкага афіцэра і падпалам танка быў адкрыты агонь па маніфестантах. З абодвух бакоў загінуў 61 чалавек і 284 былі паранены.

28 кастрычніка І. Надзь асудзіў паўстанцаў, абвясціў аб спыненні агню і пачатку перамоў з СССР наконт вываду савецкіх войск з Венгрыі. Аднак, нягледзячы на адыход «рускіх» са сталіцы да месцаў дыслакацыі (29 – 30 кастрычніка), палітычнае становішча стала яшчэ больш напружаным. Урад цалкам страціў кантроль над сітуацыяй: краіна пагрузілася ў рэвалюцыйны хаос, бязладдзе і вулічны тэрор. Удзельнікі паўстання забівалі камуністаў, супрацоўнікаў УДБ і МУС (жорсткасць праціўнікаў камуністычнага рэжыму часам нагадвала самыя лютыя эксцэсы часоў Французскай рэвалюцыі XVIII ст.), абстрэльвалі савецкія ваенныя гарадкі.

30 кастрычніка ўрад І. Надзя абвясціў аб аднаўленні шматпартыйнай сістэмы і стварэнні кааліцыйнага ўраду з прадстаўнікоў ВПП, Незалежнай партыі сельскіх гаспадароў, НСП і адроджанай СДП. Венгерская партыя працоўных была распушчана, а замест яе створана **Венгерская сацыялістычная рабочая партыя (ВСРП)**. Яе лідарам стаў яшчэ адзін папулярны

камуніст, у нядаўнім мінулым таксама ахвяра рэпрэсій – Янаш Кадар. Было абвешчана аб правядзенні свабодных выбараў.

Бурныя падзеі ў Венгрыі супалі па часе з Суэцкім крызісам, а таму захаванне Венгрыі на савецкай палітычнай арбіце набывала асабліва прынцыповае значэнне ў блокавым процістаянні «халоднай вайны» (М. С. Хрушчоў сфармуляваў гэта наступным чынам: «Калі мы зыдзем з Венгрыі, гэта падбадзёрыць амерыканцаў, англічан і французаў. Яны зразумеюць нашу слабасць і будуць наступаць»).

Савецкае кіраўніцтва вырашыла стварыць для Венгрыі рабоча-сялянскі ўрад на чале з Я. Кадарам і правесці вайсковую аперацыю з мэтай ліквідацыі мяцяжу і звяржэння ўраду І. Надзя. План аперацыі – кодавая назва *«Вихрь»* – быў распрацаваны, а потым рэалізаваны пад непасрэдным кіраўніцтвам міністра абароны СССР Г. К. Жукава.

Тым часам, 1 лістапада 1956 г. венгерскі ўрад прыняў рашэнне аб выхадзе краіны з Арганізацыі Варшаўскага Дагавору і звярнуўся да ААН з просьбай аб абароне свайго нейтралітэту. Былі зроблены захады па абароне Будапешта ад «магчымага знешняга нападу».

Аперацыя *«Вихрь»* пачалася 4 лістапада 1956 г. У той жа дзень савецкімі войскамі былі захоплены важнейшыя аб'екты ў Будапешце. Супраціўленне аддзелаў рэгулярнай венгерскай арміі і цывільных венгерскіх паўстанцаў было адчайным, але малапаспяховым: цяжка было нешта супрацьпаставіць масіраваным артылерыйскім абстрэлам і танкам. 10 лістапада паўстанцы звярнуліся да свецкага камандавання з просьбай аб спыненні агню і склалі зброю.

Венгерскае паўстанне пацярпела паражэнне і спадзяванне значнай часткі насельніцтва Венгрыі на спыненне камуністычнага эксперымента і вызвалення з-пад савецкай апекі рухнулі. Актыўныя ўдзельнікі падзей зазналі рэпрэсіі. Імрэ Надзь па абвінавачанні ў дзяржаўнай здрадзе быў асуджаны на смяротную кару. Усяго пакарана смерцю было каля 350 чалавек, яшчэ 26 тыс. чалавек паўстала перад судом і 13 тыс. з іх зведала турэмнае зняволенне. З 23 кастрычніка, калі пралілася першая кроў, і да канца 1956 г. з венгерскага боку загінула 2625 чалавек і амаль 20 тыс. былі параненыя. З савецкага боку страты, па афіцыйных дадзеных, склалі 669 забітых, 51 прапаўшых без вестак і звыш 1,5 тыс. параненых.

### Стварэнне часовага ўрада на чале з Я. Кадарам, яго палітыка. Абвяшчэнне перамогі сацыялістычных вытворчых адносін у эканоміцы

Пасля канчатковага распаду ўраду І. Надзя 4 лістапада 1956 г. быў сфарміраваны падтрыманы Савецкім Саюзам рэвалюцыйны рабоча-сялянскі ўрад на чале з Я. Кадарам. Пасля паражэння Венгерскай рэвалюцыі рабіліся

энергічныя захады па аднаўленню сацыяльна-эканамічнай і палітычнай базы рэжыму народнай дэмакратыі.

Была адноўлена дзейнасць дзяржаўнага апарату і адміністратыўных органаў па ўсёй краіне. У правячай ВСРП прайшла чыстка шэрагаў. Асаблівая ўвага надавалася ўзброеным сілам. Ствараліся спецыяльныя рэгулярныя вайсковыя часткі па ахове грамадскага парадку ў краіне, а таксама добраахвотная ўзброеная рабочая ахова. Для разгляду спраў галоўных вінаватых падзей канца кастрычніка – пачатку лістапада былі арганізаваныя спецыяльныя ваенна-палявыя суды.

Разам з тым новае палітычнае кіраўніцтва партыі і дзяржавы не дапусціла разрастання рэпрэсій у духу перыяду лідарства М. Ракашы, а дзейнічала ў духу «хто не супраць нас, той з намі». Акрамя таго, яно заяўляла пра рашучасць ліквідаваць усе праявы сталінізму і дамагчыся больш збалансаванага развіцця Венгрыі.

Кансалідацыі рэжыму народнай дэмакратыі спрыяла амністыя асуджаных за ўдзел у падзеях 1956 г., распачатая ў 1961 г. (у 1963 г., праўда, гэты працэс завяршыўся). У 1966 г. быў прыняты новы, нашмат больш дэмакратычны закон аб выбарах. Замест ранейшай сістэмы, калі дэпутаты абіраліся спісамі па абласцях, уводзіліся індывідуальныя дэпутацкія (аднамандатныя) выбарчыя акругі. Прадугледжвалася магчымасць выбараў на альтэрнатыўнай аснове. Не дзіўна, што кадараўская ВНР была адзінай сацыялістычнай краінай, да якой Захад не меў асаблівых прэтэнзій па частцы правоў чалавека.

Новыя задачы сацыяльна-эканамічнага развіцця Венгрыі былі вызначаны VII з’ездам ВСРП (1959 г.). Курс на працяг сацыялістычнага будаўніцтва, узяты Я. Кадарам, прадугледжваў прыпыненне паскоранага развіцця цяжкой індустрыі. Прыярытэт надаваўся развіццю сельскагаспадарчай вытворчасці. На вёсцы пачалося аднаўленне вытворчых кааператываў, якія ў час паўстання амаль паўсюдна спынілі сваё існаванне. У перыяд з канца 1959 г. і да пачатку 1962 г. сацыялістычнае каапераванне сельскай гаспадаркі было скончана. Прычым улады імкнуліся пазбягаць прымусу, а заахвочвалі сялян умацаваннем матэрыяльна-эканамічнай базы кааператываў, іх ільготным крэдытаваннем, адмовай ад практыкі абавязковых дзяржаўных паставак і г. д.

Пасля заканчэння каапеоравання сельскай гаспадаркі ў Венгрыі канчаткова ўсталявалася панаванне сацыялістычных вытворчых адносін: сацыялістычны сектар эканомікі даваў 96 % нацыянальнага даходу, 98 % прамысловай прадукцыі, сельгаскааператывы і дзяржгасы апрацоўвалі 96 % усёй ворыўнай зямлі. У выніку на VIII з’ездзе ВСРП (1962 г.) было абве-

шчана аб пабудове асновы сацыялізму і пераходзе краіны да будаўніцтва развітога сацыялістычнага грамадства.

### Эканамічнае развіццё ВНР у канцы 1960-х – першай палове 1970-х гг. Гаспадарчая рэформа і яе вынікі. Пагаршэнне ўнутраных і знешніх умоў развіцця венгерскай эканомікі ў другой палове 1970-х гг. Змены ў палітычным жыцці ВНР у 1970-я гг.

Група венгерскіх эканамістаў на чале з Рэжа Н'ершам (рус. – Режё Ньерш) выступіла за рэфармаванне эканомікі краіны шляхам яе абмежаванай лібералізацыі. Рашэнне аб пачатку эканамічнай рэформы было канчаткова вырашана ў 1966 – 1967 гг. Прадугледжвалася спыненне дырэктыўнага планавання (абавязковага для выканання), пашырэнне самастойнасці прадпрыемстваў, у распараджэнні якіх цяпер пакідаліся значныя сродкі, заахвочвалася іх спаборніцтва на рынку, рэфармаванне сістэмы цэн. У перыяд падрыхтоўкі рэформы прапанавалася паступовае стварэнне рынку не толькі тавараў, але таксама нават рынку капіталаў і працоўнай сілы. З 1 студзеня 1968 г. пачалася рэалізацыя рэформы.

Паколькі ў гэты час СССР таксама перажываў эканамічнае абнаўленне («касыгінская рэформа»), савецкае кіраўніцтва спакойна паставілася да венгерскага эксперыменту. Аднак пасля падзей «Пражскай вясны» 1968 г. прыхільнікам эканамічнай лібералізацыі прыйшлося нямала змагацца і з савецкімі, і з венгерскімі кансерватарамі абараняючы неабходнасць распачатых пераўтварэнняў. Яны настойвалі на тым, што сацыялізм – таксама грамадства таварнай вытворчасці, а таму не можа адвольна абмяжоўваць дзеянне закона вартасці.

Цэнтралізаванае матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне збольшага саступіла месца гуртавому гандлю. Планаванне набывала індыкатыўны характар, г. зн. урад толькі вызначаў асноўныя прапорцыі ў народнай гаспадарцы і задаваў тэмпы росту жыццёвага ўзроўню, а прадпрыемствы атрымалі магчымасць самастойна прымаць рашэнні адносна структуры і аб'ёмаў выпуску прадукцыі (нешта падобнае было і ў некаторых заходніх краінах з даўнімі дырыжысцкімі традыцыямі, напрыклад, у Францыі). У мэтах росту даходнасці вытворчасці і павышэння прадукцыйнасці працы ствараліся разнастайныя матэрыяльныя стымулы. Многія прадпрыемствы атрымалі адносную свабоду ўсталявання цэн на сваю прадукцыю (у вобласці рознічных цэн падобная свабода засталася мінімальнай). У сельскагаспадарчым сектары поруч з дамінаваўшымі буйнымі кааператыўнымі гаспадаркамі з'яўляецца дробная вытворчасць. На хвалі палітыкі разрадкі пашыраюцца эканамічныя адносіны з краінамі Захаду. З 1972 г. стала магчымым нават стварэнне сумесных прадпрыемстваў з удзелам заходняга бізнесу.

З пачатку 1970-х гг. на базе ўстойлівага росту дабрабыту насельніцтва у Венгрыі пачаў складвацца т. зв. **«гуляшны сацыялізм»** (г. зн. «сыты» сацыялізм; гуляш – венгерская нацыянальная страва). Паколькі венгерская эканоміка

была пераарыентаваная з назапашвання, на павелічэнне спажывання, у Венгрыі здолелі ліквідаваць перадумовы для вельмі характэрнай для савецкай эканамічнай мадэлі з'явы – дэфіцыту. Нездарма на Захадзе рэжым Я. Кадара характарызавалі як «самы шчаслівы шлюб у лагеры» (тут «шлюб» – адносіны паміж уладай і народам, а «лагер» – сацыялістычны блок). Рэформы далі моцны штуршок для стабільнага эканамічнага росту на наступныя 6 – 8 гадоў. У перыяд з 1968 па 1975 гг. ВУП Венгрыі павялічваўся на 5,4 % у год.

Поспехі рэформ не маглі зняць немалыя ўнутраныя супярэчнасці палітыкі Я. Кадара. Сярод унутраных праблем адной з важнейшых была палавінчатая, дзяржаўна-рынычная, сістэма цэнаўтварэння. З пачаткам у сярэдзіне 1970-х гг. сусветнага энергетычнага крызісу рэзка падскочыла цана на нафту. Гэта ўзняло сабекошт прадукцыі, а гэта ў сваю чаргу выклікала яшчэ большыя выдаткі дзяржавы на выроўніванне цэн. Рэформы сталі прабуксоўваць, а палітыкі, якія стаялі за імі, страцілі камандныя пазіцыі (як, напрыклад, Р. Ньерш). Сталі прыкметна падаць тэмпы эканамічнага росту. За 1976 – 1982 гг. ВУП павялічваўся толькі на 2,6 % у год. Дзяржава спрабавала змякчыць фінансавыя праблемы за кошт замежных займаў, але ўжо ў 1977 г. знешняя запазычанасць Венгрыі стала выглядаць застрашальнай. Напрыканцы 1970-х гг. сістэма цэнаўтварэння зазнала далейшую лібералізацыю.

У 1972 г. былі прынятыя папраўкі да Канстытуцыі ВНР 1949 г. У новай рэдакцыі Асноўнага закону было запісана, што Венгрыя стала сацыялістычнай дзяржавай, у якой уся ўлада належыць народу, а марксісцка-ленінская партыя з'яўляецца вядучай сілай грамадства.

### Пачатак сістэмнага крызісу ў сярэдзіне 1980-х гг. Пачатак радыкальных рэформ у грамадстве. Пераход да шматпартыйнасці. Надзвычайны з'езд ВСРП (кастрычнік 1989 г.) і стварэнне Венгерскай сацыялістычнай партыі. Абвяшчэнне Венгерскай Рэспублікі. Перамога «аксамітнай рэвалюцыі» ў Венгрыі

Далейшая карэкціроўка эканамічнага курсу была працягнутая і на рубяжы 1970 – 1980-х гг. Паколькі праца ў сельскіх падсобных гаспадарках і сферы ценявога рынку ахоплівала, па некаторых падліках, да 3/4 эканамічна актыўнага насельніцтва краіны, пачалася легалізацыя прыватнага сектару. З 1982 г. прыватныя прадпрыемствы атрымалі права працаваць амаль паўсюль за выключэннем шэрагу «недатыкальных» сфер (банкаўская дзейнасць і горназдабыча). У перыяд з 1981 па 1984 гг. Венгрыя здолела скараціць знешнюю запазычанасць.

Аднак на сярэдзіну 1980-х гг. практычна ўсе ўнутраныя рэсурсы адносна ліберальнай эканомікі «рэальнага сацыялізму» у Венгрыі былі вычарпаныя (як адзначаў адказны за эканоміку сакратар ЦК ВСРП Міклаш Немет: «За выключэннем 1956 г., наша пасляваенная эканамічная гісторыя не ведала настолькі цяжкіх гадоў, як 1985 – 1986…»). Сярэднегадавыя тэмпы росту ВУП

у 1983 – 1989 гг. знізіліся да 1,2 %. Працягвала ўзрастаць знешняя запазычанасць: з 1984 па 1990 гг. яна патроілася.

Пытанне выжывання краіны і пачатак гарбачоўскіх пераўтварэнняў падштурхнулі да новага этапу эканамічных рэформ. Праходзіць радыкальная трансфармацыя ўсёй эканамічнай сістэмы ў бок рынку. У 1988 г. па лепшых заходніх узорах была праведзена падатковая рэформа. З'явіўся закон аб банкруцтве, прыняты адносна ліберальны закон аб замежных інвестыцыях. Прадпрыемствы атрымалі права знешнегандлёвай дзейнасці, а дэвальвацыя форынта зрабіла венгерскую прадукцыю больш канкурэнтаздольнай. Напрыканцы 1980-х гг. дробныя прыватныя гаспадаркі давалі каля 10 % усяго нацыянальнага даходу.

Нягледзячы на маштабныя пераўтварэнні ў кадараўскай Венгрыі, заставаліся і зусім не закранутыя рэформамі сферы. Ужо з 1972 г. з'явілася магчымасць ствараць сумесныя прадпрыемствы, а з 1987 г. – акцыянерныя таварыствы і таварыствы з абмежаванай адказнасцю. Аднак пра прыватызацыю гаворка доўгі час нават не заходзіла – уласнасць на ўсіх асноўных прадпрыемствах краіны заставалася дзяржаўнай. Першыя праграмы прыватызацыі былі агучаныя вельмі позна – толькі ў 1989 – 1990 гг. Заставалася адноснай самастойнасць прадпрыемстваў у сферы цэнаўтварэння, выкарыстання рэсурсаў, размеркаванні атрыманага даходу. Прызначэнне на кіруючыя пасады ў народнай гаспадарцы па-ранейшаму заставалася выключнай прэрагатывай партыі і дзяржавы.

Па меры нарастання крызісу сістэмы «гуляшнага сацыялізму» ў Венгрыі, узмацнялася размежаванне ўнутры ВСРП. У 1985 – 1989 гг. сапернічалі тры групоўкі: цвёрдыя сацыялісты на чале з самім Я. Кадарам, камуністы-рэфарматары на чале з Караям Гросам і рэфарматары-сацыялісты, лідарамі якіх былі Рэжа Ньерш і Імрэ Пожгаі.

Пачынаецца згуртаванне апазіцыйных сіл. У 1987 г. пераважна сіламі творчай інтэлігенцыі быў створаны **Венгерскі дэмакратычны форум (ВДФ)**. У 1988 г. рух аформіўся ў аднайменную нацыянал-кансерватыўную палітычную партыю. У тым жа годзе група маладых юрыстаў стварыла радыкальна-ліберальны, антыкамуністычны **Альянс маладых дэмакратаў (АМД** альбо **«Фідэс»)**, а прадстаўнікі сталічнай інтэлігенцыі – **Саюз свабодных дэмакратаў (ССД)**. Як правапераемніца ПДСГ была адноўлена **Незалежная партыя дробных гаспадароў (НПДГ)**.

У траўні 1989 г. пакінуў пасаду старшыні партыі Я. Кадар і яго месца заняў прыхільнік самых глыбокіх пераўтварэнняў Р. Ньерш. 18 верасня 1989 г. на перамовах у рамках «круглага стала» паміж правячай ВСРП і апазіцыяй было прынята рашэнне аб увядзенні ў Венгрыі шматпартыйнай сістэмы. А роўна праз месяц (18 кастрычніка) фармальна камуністычны парламент прыняў каля 100 канстытуцыйных паправак, якія забяспечвалі пераход да парла-

менцкай дэмакратыі. На сваім XIV з’ездзе (каб падкрэсліць разрыў з мінулым ён нават называўся проста «З’езд 89») ВСРП адмовілася ад ідэалогіі марксізму-ленінізму і перайшла на пазіцыі сацыял-дэмакратыі і атрымала новую назву **Венгерская сацыялістычная партыя (ВСП)**.

23 кастрычніка 1989 г. (сімвалічна, што для гэтага быў абраны дзень чарговай гадавіны пачатку рэвалюцыі 1956 г.) краіна змяніла сваю афіцыйную назву і стала **Венгерскай Рэспублікай** – свабоднай, дэмакратычнай, прававой дзяржавай. «Аксамітная рэвалюцыя», мірная і бяскроўная, канчаткова перамагла.

## Заканчэнне складвання асноў новай дзяржаўнасці пасля парламенцкіх выбараў 1990 г. Сацыяльна-эканамічныя рэформы, унутрыпалітычнае жыццё і знешняя палітыка Венгрыі ў 1990 – 2010-я гг.

Першыя шматпартыйныя дэмакратычныя выбары, што адбыліся ў сакавіку 1990 г. прывялі да перамогі апазіцыйных сіл. З 386 месцаў у Дзяржаўным сходзе ВСП атрымала толькі 33. ВДФ заваяваў 165, ліберальны ССД – 92, НПДГ – 43, ХДНП – 21 дэпутацкі мандат. ВДФ, НДПГ і ХДНП стварылі кааліцыйны ўрад на чале з Ёжафам Анталам (1990 – 1993).

Кааліцыйны ўрад за першыя гады праўлення ажыццявіў прыватызацыю каля чвэрці дзяржаўнай маёмасці, паскорыў прыцягненне замежнага капіталу ў Венгрыю. Аднак захоўваліся эканамічныя цяжкасці: працягваўся спад вытворчасці і рост беспрацоўя, узрастаў дэфіцыт бюджэту. У 1991 г. урад правёў дэвальвацыю венгерскага форынту і атрымаў крэдыт ад МВФ. У чэрвені 1991 г. з краіны былі выведзены апошнія савецкія войскі, а ў снежні таго ж году было падпісана пагадненне аб асацыяваным членстве Венгрыі ў Еўрапейскай Супольнасці.

Сацыяльныя наступствы рэформ, невысокая кампетэнтнасць першага постсацыялістычнага ўраду і пэўная настальгія па былой сацыяльнай абароненасці прывялі да таго, што на выбарах 1994 г. значная частка насельніцтва (45 %) прагаласавала за ВСП. Адраджэнне папулярнасці сацыялістаў тлумачылася і значным абнаўленнем праграмна-ідэалагічнай базы партыі.

Нягледзячы на атрыманне абсалютнай большасці дэпутацкіх мандатаў (54 %) ВСП уступіла ў кааліцыю з ССД. Падобны крок быў невыпадковым, тым самым сацыялісты жадалі запэўніць сваіх праціўнікаў і немалую частку грамадства ў сваёй адданасці палітыцы дэмакратызацыі і рыначных рэформ. Акрамя таго, кааліцыя атрымлівала большасць у 2/3, неабходную для ўнясення змен у важнейшыя законы і канстытуцыю краіны. Новы ўрад на чале з Дзюлай Хорнам (1994 – 1998) ажыццяўляў жорсткую рыначную праграму рэформ (абмежаванне даходаў, скарачэнне працоўных месцаў у дзяржаўным сектары эканомікі, падвышэнне камунальных плацяжоў і г. д.) і пачаў падрыхтоўку да ўступлення Венгрыі ў НАТО і ЕС. Дзякуючы рэформам ураду Дз. Хорна, краі-

на выйшла ў лідары рынакчных рэформ сярод краін Усходняй і Цэнтральнай Еўропы. У 1997 г. Венгрыя была запрошана ў Паўночнаатлантычны альянс.

Аднак незадаволенасць насельніцтва толькі нарастала: за 1990 – 1995 гг. узровень жыцця ўпаў на 40 % і працягваў скарачацца. Не дзіўна, што на парламенцкіх выбарах перамога дасталася правацэнтрысцкаму блоку апазіцыйных партый на чале з **Венгерскім грамадзянскім саюзам** (**«Фідэс»**; створаны на базе АМД у 1995 г.). Новы прэм'ер-міністр Венгрыі, 35-гадовы Віктар Орбан працягнуў рынкачныя рэформы сваіх папярэднікаў. Пры гэтым, эканамічныя дасягненні краіны дазволілі вярнуць некаторыя сацыяльныя заваёвы насельніцтва: была скасавана плата за навучанне ва ўніверсітэце, адноўлены універсальныя ільготы для маладых маці. У перыяд прэм'ерства В. Орбана Венгрыя, разам з Польшчай і Чэхіяй, у 1999 г. была афіцыйна прынятая ў НАТО (на рэферэндуме далучэнне да Альянсу падтрымалі 85 % узяўшых удзел у галасаванні выбаршчыкаў).

Аднак на парламенцкіх выбарах 2002 г. правячыя партыі ізноў пацярпелі паражэнне. З нязначнай большасцю дэпутацкіх мандатаў першынствавала кааліцыя ВСП-ССД. Дастаткова стабільная эканамічная сітуацыя ў краіне, далучэнне да ЕС (у 2004 г. яго падтрымала 2/3 удзельнікаў усенароднага галасавання) дазволілі дзеючаму ўраду ўпершыню ў навейшай гісторыі дэмакратычнай Венгрыі здабыць у 2006 г. права на яшчэ адзін тэрмін праўлення.

Тым не менш, ужо праз некалькі месяцаў пасля выбараў кааліцыя і яе прэм'ер-міністр Ферэнц Дзюрчань (2004 – 2009) апынулася ў цэнтры грандыёзнага скандалу. Прэсе сталі вядомыя выказаныя ў прыватнай абстаноўцы словы кіраўніка кабінету міністраў, у якіх ён фактычна распісаўся ў некампетэнтнасці свайго ўраду: эканамічная палітыка Венгрыі, па яго словах, была «самай тупой у Еўропе», для ўтрымання сітуацыі пад кантролем «мы хлусілі – раніцамі, вечарамі і начамі» і г. д. У выніку ў цэнтры Будапешта адбыліся шматтысячныя антыўрадавыя акцыі пратэсту – найбуйнейшыя з часоў восеньскіх падзей 1956 г., а мясцовыя выбары скончыліся трыумфам апазіцыйнай партыі «Фідэс». Тым не менш, кааліцыйнаму ўраду ўдалося захаваць уладу.

З пачаткам сусветнага фінансавага крызісу 2008 – 2009 гг. спатрэбілася неадкладная вонкавая фінансавая дапамога ў памеры $25 млрд. Рэзка знізіліся ўсе асноўныя эканамічныя паказчыкі краіны, упаў дабрабыт насельніцтва. Як вынік, на парламенцкіх выбарах 2010 г. перамаглі «Фідэс» і ХДНП, разам заваяваўшыя звыш 2/3 дэпутацкіх мандатаў. В. Орбан вярнуў сабе прэм'ерскі пост.

Яшчэ адным важным вынікам крызісу стаў нечаканы поспех ультраправай нацыяналістычнай партыі **«За лепшую Венгрыю» («Ёбік»** – таксама, як і назва «Фідэс», акронім першапачатковай назвы партыі). Яна актыўна ўжывае антыцыганскую, антысеміцкую і антыімігранцкую рыторыку. Ваенізаванае крыло партыі –

«Венгерская гвардыя» (афіцыйна забаронена ў 2009 г.) – выкарыстоўвае элементы ўніформы і сімволіку, што нагадваюць адпаведныя атрыбуты венгерскіх нацыстаў часоў другой сусветнай – нілашыстаў.

Эканамічныя і палітычныя наступствы апошняга фінансавага крызісу пакуль канчаткова не пераадоленыя і Венгрыя, разам з Партугаліяй і Грэцыяй, застаюцца найбольш праблемнымі эканомікамі ЕС.

## Тэма 19. Усходняя Германія і ГДР у 1945 – 1990 гг.

### Асаблівасці эканамічнага і палітычнага становішча Ўсходняй Германіі пасля вайны. СВАГ і яе дзейнасць. Стварэнне партыйна-палітычнай сістэмы Ўсходняй Германіі

Згодна з рашэннямі Ялцінскай канферэнцыі, потым пацверджанымі ў Патсдаме, тэрыторыя Германіі падзялялася на чатыры зоны акупацыі. СССР атрымліваў пад свой кантроль 40 % плошчы, 30 % насельніцтва і 33 % вытворчага патэнцыялу краіны.

6 чэрвеня 1945 г. на занятай савецкімі войскамі тэрыторыі Германіі (да захаду лініі Одэр-Нэйсе) пастановай СНК СССР была арганізавана **Савецкая ваенная адміністрацыя ў Германіі (СВАГ)** на чале з Г. К. Жукавым (неўзабаве яго замяніў В. Д. Васілеўскі). Камандуючыя арміямі былі прызначаны начальнікамі ваеннай адміністрацыі зямель (па месцы дыслакацыі армій). Нацысты выдаляліся з адміністрацыйных і гаспадарчых устаноў, ствараліся новыя органы ўлады. Г. К. Жукаў разгледзеў і зацвердзіў кандыдатуры прэзідэнтаў і віцэ-прэзідэнтаў зямель. Таксама пад кіраўніцтвам СВАГ былі падрыхтаваны мясцовыя і зямельныя выбары.

Справа аднаўлення эканомікі Ўсходняй Германіі выглядала нашмат цяжэйшай, чым у Заходняй Германіі. На Ўсходнім фронце Другой сусветнай вайны вяліся больш жорсткія баі, што выклікалі моцныя разбурэнні, на Захадзе засталася значная доля радовішчаў карысных выкапняў і прадпрыемстваў цяжкой прамысловасці. У параўнанні з Заходняй Германіяй, большым цяжарам на Ўсходнюю Германію леглі рэпарацыйныя выплаты на карысць СССР (як казаў першы кіраўнік СВАГ: «*Нам трэба хутка вывезці ўсё, што трэба ў кошт пакрыцця выдаткаў вайны*» пакуль немцы «*прыгаломшаныя фіналам вайны*»).

Першыя палітычныя партыі ў савецкай акупацыйнай зоне – Камуністычная партыя Германіі і Сацыял-дэмакратычная партыя Германіі былі легалізаваныя яшчэ ў чэрвені 1945 г. Савецкія акупацыйныя ўлады ўскладалі галоўныя спадзяванні камуністаў, асабліва на тых, хто добра зарэкамендаваў сябе працай у міжнародных камуністычных органах у Савецкім Саюзе. 21 красавіка 1946 г.

КПГ і СДПГ аб’ядналіся на базе марксісцка-ленінскай ідэалогіі у **Сацыялістычную адзіную партыю Германіі (САПГ)**. Узначалілі партыю адразу двое – Вільгельм Пік і Ота Гротэволь, былыя лідары КПГ і СДПГ, адпаведна. Пры гэтым значная частка СДПГ, асабліва заходнегерманскія сацыял-дэмакраты, выступіла супраць аб’яднання і заявіла аб намеры працягнуць самастойную дзейнасць пад старой назвай. Раскол арганізаванага рабочага руху стаў адным з першых крокаў да падзелу краіны. На тэрыторыі акупацыйных зон заходніх дзяржаў дзейнасць любых палітычных партый была яшчэ забаронена, таму САПГ стала дзейнічаць толькі ў савецкай акупацыйнай зоне.

На працягу 1945 – 1948 гг. былі створаныя чатыры іншыя партыі: **Хрысціянска-дэмакратычны саюз (ХДС)**, **Ліберальна-дэмакратычная партыя Германіі (ЛДПГ)**, **Нацыянальна-дэмакратычная партыя Германіі (НДПГ)** і **Дэмакратычная сялянская партыя Германіі (ДСПГ)**. Дзве апошнія партыі былі мэтанакіравана створаны намаганнямі САПГ для пашырэння сацыяльнай базы рэжыму – у першым выпадку за кошт былых членаў НСДАП і вермахту, а ў другім – за кошт сялянства. Нягледзячы на поўнае дамінаванне ў палітычным жыцці САПГ, фармальная шматпартыйнасць існавала ў ГДР столькі, колькі існавала сама ўсходнегерманская сацыялістычная дзяржава.

### Сацыяльна-эканамічныя і палітычныя пераўтварэнні ў другой палове 1940-х гг. Пытанне аб адзінстве Германіі. Абвяшчэнне ГДР. Канстытуцыя 1949 г. Пераход да «дыктатуры пралетарыяту»

У верасні 1945 г. па ініцыятыве кіраўніцтва зямель і правінцый (паколькі органы ўлады зацвярджаліся СВАГ, там панавалі цалкам лаяльныя да СССР сілы) пачалося правядзенне аграрнай рэформы. Як і ў астатніх краінах Цэнтральнай і Паўднёва-ўсходняй Еўропы, падлягалі канфіскацыі зямельныя уладанні нацыстаў і ваенных злачынцаў з усёй сельскагаспадарчай маёмасцю. Тое самае датычылася буйных зямельных уладанняў звыш 100 га. 2/3 атрыманай у выніку рэформы зямлі перадалі за невялікую плату беззямельным і малазямельным сялянам (атрымальнікамі сталі каля паўмільёны чалавек), а астатняе пайшло на стварэнне т. зв. «народных маёнткаў», навукова-даследчых інстытутаў і г. д. Правядзенне рэформы спрашчала тое, што большая частка буйных землеўласнікаў яшчэ да гэтага з’ехала ў Заходнюю Германію.

Хаця палітыка дэкартэлізацыі прадугледжвала толькі драбненне нямецкіх манаполій, СВАГ пайшла нашмат далей гэтага, пераўтварыўшы дэкартэлізацыю ў нацыяналізацыю. У кастрычніку 1945 г. СВАГ наклала секвестр на ўсю маёмасць, якая належала гітлераўскай дзяржаве, ваенным злачынцам, актыўным нацыстам, а таксама манаполіям, што ўдзельнічалі ў развязванні вайны. Большасць секвестраваных прадпрыемстваў СВАГ перадаў усходнегерманскай адміністрацыі, астатнія былі вывезены ў СССР у кошт рэпарацый. Летам 1946 г. у

савецкай акупацыйнай зоне быў праведзены рэферэндум, на базе рашэнняў якога быў прыняты закон «Аб передачы прадпрыемстваў нацысцкіх злачынцаў народу». Да пачатку 1948 г., калі гэтыя мерапрыемствы былі завершаны, у грамадскую ўласнасць перайшлі звыш 9 тыс. прамысловых прадпрыемстваў. Яны заклалі аснову для дзяржаўнага сектару эканомікі. Гэткім чынам, у савецкай акупацыйнай зоне пад выглядам дэкартэлізацыі была нацыяналізавана большасць буйных прадпрыемстваў, банкаў і страхавых таварыстваў. Таксама была праведзена школьная рэформа. Школа адасаблялася ад царквы, уводзілася ўсеагульнае абавязковае і бясплатнае навучанне. Больш даступнай рабілася вышэйшая школа.

Задача пабудовы дэмакратычнай міралюбівай Германіі была непарыўна звязана з пытаннем яе нацыянальнага адзінства. Са спаўзаннем свету да «халоднай вайны» магчымасць знаходжання былымі саюзнікамі па антыгітлераўскай кааліцыі нейкай палітычнай «агульнай роўніцы» для Германіі ўжо напачатку 1947 г. стала выглядаць нерэальнай. Нежаданне СССР адмовіцца ад аграмадных рэпарацыйных выплат, абвяшчэнне Злучанымі Штатамі дактрыны Трумэна, featnаскіраваныя эканамічныя рэформы саюзнікаў у сваіх акупацыйных зонах і г. д. толькі паглыблялі праблему.

Масавыя форумы лаяльных да Савецкага Саюзу сіл, што ладзіліся ва Ўсходняй Германіі (1-шы, 2-гі і 3-ці Нямецкія народныя кангрэсы, 1947 – 1949 гг.), былі няздольныя сваімі лозунгамі і маніфестамі прадухіліць раскол краіны. Акрамя таго, у той час, калі яшчэ і сталінскае палітычнае кіраўніцтва канчаткова не вырашыла, якой быць Германіі, асобныя лідары САПГ зрабілі стаўку на раскол краіны – «*лепей чвэрць Германіі кантраляваць цалкам, чым усю Германію на чвэрць*» (К. Адэнаўэр, у сваю чаргу, любіў паўтараць словы ліберальнага германскага гісторыка К. Ротэка: «*Лепей свабода без адзінства, чым адзінства без свабоды*»).

Вясной – летам 1949 г. працэс выхаду дзвюх частак Германіі на адрозныя палітычныя арбіты стаў непазбежным. Следам за прыняццем у Заходняй Германіі Асноўнага закону, 3-ці Нямецкі народны кангрэс прыняў праект Канстытуцыі Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі (ГДР). У яе падмурак была закладзеная сталінская Канстытуцыя СССР 1936 г. Праз 5 месяцаў, 7 кастрычніка 1949 г., адбылося абвяшчэнне ГДР, якое завяршыла раскол Германіі.

Тады ж набыла моц **Канстытуцыя 1949 г.**, якая абвяшчала, што ва Ўсходняй Германіі ствараецца «дзяржава дыктатуры пралетарыяту», дэкларавала прынцыпы народаўладдзя, дэмакратычнай арганізацыі дзяржавы, яе антыфашысцкі характар. Прызнавалася права ўласнасці з магчымасцю яго абмежавання дзеля грамадскай карысці.

Неўзабаве О. Гротэволь быў абраны прэм’ер-міністрам новай дзяржавы, а В. Пік – яе прэзідэнтам. З канчатковым афармленнем дзяржаўна-

палітычнай структуры ГДР, СВАГ перадаў яе кіраўніцтву ўсе свае адміністрацыйныя функцыі. Пры гэтым замест СВАГ стваралася Савецкая кантрольная камісія (СКК), якая захоўвала некаторыя рычагі ўплыву на сітуацыю ў краіне. 15 кастрычніка 1949 г. былі ўсталяваны дыпламатычныя адносіны паміж ГДР і СССР.

**Курс на будаўніцтва сацыялізму савецкай мадэлі.**
**Падзеі чэрвеня - ліпеня 1953 г., іх прычыны, характар і вынікі**

З абвяшчэннем ГДР пачынаецца канчатковая арыентацыя на савецкую сталінскую сацыяльна-эканамічную і грамадска-палітычную мадэль. Праграма пасляваеннага аднаўлення і развіцця эканомікі была, напрыклад, увасоблена ў двухгадовым плане, разлічаным на 1949 – 1950 гг. Асаблівая ўвага надавалася базавым для цяжкай індустрыі галінам – вуглездабычы, энергетыцы і машынабудаванню. Згодна афіцыйным дадзеным, пастаўленыя задачы былі датэрмінова выкананыя і прамысловая вытворчасць краіны дасягнула ўзроўню 1936 г. Нацыянальны даход за перыяд з 1946 па 1950 гг. вырас больш чым удвая.

У ліпені 1950 г. яшчэ больш высокія і, аб’ектыўна, нерэальныя задачы былі вызначаны на 1-ю пяцігодку (1951 – 1955) III з’ездам САПГ. Неспрыяльныя ўмовы (дэфіцыт энергарэсурсаў і сыравіны, рэпарацыі і дэмантажы абсталявання), завышаныя планы, у першую чаргу ў цяжкой прамысловасці, шматлікія бюракратычныя перашкоды, аднабаковы знешні гандаль (з сацыялістычнымі краінамі) і палітычныя праблемы хутка сарвалі выкананне плану.

Перад выбарамі 1950 г. у Народную палату (парламент) палітычныя партыі і масавыя арганізацыі краіны (напрыклад, Саюз свабоднай нямецкай моладзі, Аб’яднанне свабодных нямецкіх прафсаюзаў) аб’ядналіся ў **Нацыянальны фронт дэмакратычнай Германіі (НФДГ)**, палітычную структуру, якая пры фармальным захаванні шматпартыйнасці і шырокім прадстаўніцтве таксама фармальна грамадскіх аб’яднанняў, забяспечвала поўны кантроль САПГ.

Цалкам у духу савецкага першаўзору, на III з’ездзе САПГ была ўсталявана пасада генеральнага сакратара партыі. Таксама невыпадковым было абранне на яе найбольш цвёрдага германскага сталініста Вальтэра Ульбрыхта, які бачыў неабходным распаўсюдзіць партыйна-дзяржаўны кантроль на ўсе бакі грамадскага жыцця краіны.

У лютым 1950 г., як і ў іншых «братэрскіх краінах», па савецкім ўзоры было створана **Міністэрства дзяржаўнай бяспекі – штазі** (ням. – *Ministerium für **Sta**at**ssi**cherheit, Stasi).* Пачынаецца жорсткае змаганне са шпіёнамі і падрыўнымі элементамі, што служаць сілам імперыялізму, ідэалагічнымі ворагамі – трацкістамі і цітаістамі (у часы «халоднай вайны» разам з КДБ і ЦРУ штазі лічылася адной з мацнейшых спецслужбаў у

свеце. Напрыканцы 1980-х гг. прыкладна кожны 50-ты грамадзянін ГДР супрацоўнічаў з міністэрствам).

Раскол Германіі і стварэнне ФРГ і ГДР паклалі пачатак своеасабліваму спаборніцтву паміж гэтымі дзяржавамі. На яго ход самы непасрэдны ўплыў імкнуліся аказваць супердзяржавы – ЗША і СССР. У 1950 г. Савецкі Саюз удвая скараціў рэпарацыйныя выплаты, актывізаваў пастаўкі ГДР сыравіны і тэхнікі.

У 1952 г. 2-я канферэнцыя САПГ паставіла перад партыяй, дзяржавай і грамадствам задачу пабудовы сацыялізму. Гэта азначала фарсіраванне калектывізацыі сельскай гаспадаркі, правядзенне абмежавальных захадаў супраць дробных і сярэдніх уласнікаў, масавую нацыяналізацыю прадпрыемстваў. Для змагання з варожымі сацыялістычнаму шляху элементамі прадугледжвалася ўзмацненне ролі паліцыі і сіл дзяржаўнай бяспекі. Каб хутчэй сцерці з памяці ўсходніх немцаў «стараролжымныя» рэаліі, у 1952 г. пачалася адміністратыўная рэформа. Замест расфармаваных 5 «гістарычных» зямель – Саксоніі, Анхальт-Саксоніі, Цюрынгіі, Брандэнбурга і Мекленбурга – ствараліся 14 штучных акруг.

Энтузіязм, з якім усходнегерманскія рабочыя віталі першыя рэформы САПГ, хутка змяніліся незадаволенасцю і адкрытым пратэстам. Стрымліванне даходаў, ураўняльныя тэндэнцыі пры матэрыяльным ацэньванні працы, невыгодныя вынікі параўнання свайго матэрыяльнага становішча з тым, што было да вайны або з тым, што мелі рабочыя ў ФРГ, дэфіцыт прадуктаў харчавання і спажывецкіх тавараў, нарастанне палітычных і антыцаркоўных рэпрэсій выклікалі незадаволенасць грамадзян ГДР. Смерць Сталіна і аслабленне савецкага акупацыйнага кантролю (была расфарміравана СКК і замест яе ўведзена пасада Вярхоўнага камісара) выклікалі масавыя ўцёкі ўсходніх немцаў на Захад. Моцнае абурэнне ў грамадстве выклікала красавіцкае павышэнне цэн.

Разумеючы небяспеку сацыяльнага выбуху ў ГДР і працягваючы курс на лібералізацыю сваёй палітыкі, міністэрства ўнутраных спраў СССР накіравала кіраўніцтву ГДР мемарандум з патрабаваннем спыніць фарсіраваную індустрыялізацыю і паслабіць рэпрэсіі. Усходнегерманскія лідары былі нават выкліканы ў Маскву, дзе прызналі свае памылкі. Па прыездзе дадому яны абвясцілі «Новы курс», скіраваны на паляпшэнне забеспячэння насельніцтва. Аднак запланаванае ўладамі ГДР павышэнне норм выпрацоўкі на вытворчасці засталося ў недатыкальнасці. Калі напачатку чэрвеня рабочыя атрымалі заробак і знайшлі вылічэнні за недапрацоўку, цярпенне рабочых лопнула.

16 чэрвеня 1953 г. ў Берліне пачалася забастоўка, якая на наступны дзень – 17 чэрвеня – перарасла ва ўсеагульную. На сярэдзіну дня ў цэнтры горада сабралася каля 150 тыс. чалавек. Лозунгі казалі пра рашучы настрой маніфестантаў: «*Далоў урад! Далоў Народную Паліцыю!*», «*Мы не хочам быць рабамі, хочам быць вольнымі!*», «*Бародка, пуза і акуляры – гэта не воля народа*» (асабісты

выпад супраць В. Ульбрыхта). Акцыя набыла гвалтоўны характар. Натоўп граміў паліцэйскія ўчасткі, будынкі партыйных і дзяржаўных органаў. Знішчаліся сімвалы дзяржаўнай улады. Горад быў фактычна захоплены народам. Партыйнае кіраўніцтва было вымушана ўцякаць пад абарону савецкіх войск у сталічнае прадмесце Карлхорст. Народныя выступленні перакінуліся і на некаторыя іншыя гарады краіны – Лейпцыг, Гале і г. д.

Рэжым выратавала толькі выкарыстанне савецкіх войск. У ходзе падаўлення паўстання загінула да 300 чалавек. В. Ульбрыхт не толькі здолеў утрымацца пры ўладзе, але таксама выкарыстаў момант для расправы з унутрыпартыйнай апазіцыяй.

Тым не менш, галоўным вынікам падзей лета 1953 г. стала значная карэкціроўка палітычнага курсу САПГ. Пры савецкай дапамозе ўлады здолелі забяспечыць падвышэнне дабрабыту насельніцтва, адмовіцца ад «перагібаў» у каапераванні сельскай гаспадаркі, палепшылі існаванне прыватнікаў у сферы дробнай і сярэдняй вытворчасці і гандлю. У 1954 г. СССР цалкам адмовіўся ад спагнання з ГДР рэпарацыйных выплат. Гэтак была закладзеная база пад стварэнне паспяховай і канкурэнтаздольнай па мерках савецкага лагера ўсходнегерманскай сацыяльна-эканамічнай мадэлі.

У 1958 г. былі скасаваныя прадуктовыя карткі. Да канца 1950-х гг. ГДР выйшла на 5-е месца ў Еўропе па ўзроўню прамысловага развіцця і стала пераўтварацца ў г. зв. «вітрыну сацыялізму». Тым не менш, задача «дагнаць і перагнаць ФРГ» была далёкая ад вырашэння: спажыванне ГДР складала 25 % заходнегерманскага, а вытворчасць – 30 %.

### Заява аб перамозе сацыялістычных вытворчых адносін, іх асаблівасці. Гаспадарчая рэформа ў ГДР 1960-х гг. і яе вынікі. Асноўныя напрамкі эканамічнага развіцця ГДР у 1970-я гг. Супярэчнасці эканамічнага развіцця ГДР ў 1980-я гг.

VI з’езд САПГ, які адбыўся ў 1963 г., абвясціў аб пачатку этапа сацыялістычнага развіцця ГДР. У тым жа 1963 г. пачынаецца ажыццяўленне эканамічнай рэформы па стварэнню ў краіне мадэлі «сацыялістычнага рынку» – **Новай эканамічнай сістэмы (НЭС)**. Скарачаліся дзяржаўныя датацыі на прамысловую прадукцыю, прадпрыемствы пераводзіліся на гаспадарчы разлік, пашыралася іх вытворчая самастойнасць. ГДР становіцца мадэллю для прамысловых эксперыментаў сацыялістычных краін, асабліва Савецкага Саюзу.

Асноўнай адметнасцю працэсу пабудовы сацыялізму ў ГДР стала прыцягненне да вырашэння задач пераходнага перыяду сярэдняй і дробнай буржуазіі. Ажно да лета 1972 г. у краіне працягвала існаваць значная колькасць дробных і сярэдніх прыватных прадпрыемстваў у прамысловасці, на транспарце, у гандлі. Пры гэтым дзяржава няўхільна абмяжоўвала сферу

дзейнасці прыватнакапіталістычных структур, паступова трансфармуючы іх у паўдзяржаўныя і дзяржаўныя прадпрыемствы. Рэформа дазволіла эканоміцы ГДР дасягнуць значных поспехаў, а таксама забяспечыць усходніх немцаў дастаткова высокім дабрабытам. Новая **Канстытуцыя 1968 г.**, абвясціла ГДР «сацыялістычнай дзяржавай нямецкай нацыі» і афіцыйна замацавала палітычнае дамінаванне САПГ (арт. 1).

Пасля адстаўкі В. Ульбрыхта і абрання першым сакратаром ЦК САПГ Эрыха Хонэкера (1971 г.) адбываецца пэўная змена сацыяльна-эканамічнага курсу. Важнейшай задачай партыі і ўраду абвяшчалася «падвышэнне матэрыяльнага і культурнага ўзроўню жыцця народу», а неабходнасць карэннай мадэрнізацыі эканомікі была адсунутая на другі план. Новы лідар у большай ступені, чым яго папярэднік, арыентаваўся на савецкую мадэль эканамічнага развіцця.

Аднак за фасаднай часткай «вітрыны сацыялізму» хаваліся немалыя праблемы. Станоўчы эфект эканамічных рэформ 1960-х гг. не мог быць вечным. З сярэдзіны 1970-х гг. эканамічная сітуацыя ў ГДР стала пагаршацца. Павелічэнне выдаткаў на сацыяльную сферу, у прыватнасці дарагую жыллёвую праграму, знізіла аб'ём інвестыцый у развіццё і абнаўленне састарэлага абсталявання, знос якога ў прамысловасці складаў 50 %, а ў сельскай гаспадарцы – 65 %. Узрастальнае тэхналагічнае адставанне, нізкі ўзровень прадукцыйнасці працы (ад трэці да паловы ад заходнегерманскага), нерацыянальнае выкарыстанне замежных крэдытаў (ішлі не на інвестыцыі ці набыццё новых тэхналогій, а на імпарт сыравіны, прадуктаў харчавання і тавараў шырокага попыту для насельніцтва) падрывалі асновы ўсходнегерманскай сацыяльна-эканамічнай мадэлі.

Нягледзячы на глыбінныя праблемы, да пачатку 1980-х гг. ГДР стала высокаразвітай індустрыяльнай краінай з інтэнсіўнай сельскай гаспадаркай. Па аб'ёме выпуску прамысловай прадукцыі ГДР выйшла на 6-е месца ў Еўропе і 10-е ў свеце. Яе вядучыя галіны прамысловасці, непасрэдна закранутыя навукова-тэхнічнай рэвалюцыяй (машынабудаванне, металаапрацоўка, хімічная прамысловасць, электратэхніка і электроніка, оптыка, прыборабудаванне, лёгкая прамысловасць) з'яўляліся ўзорнымі для ўсяго сацыялістычнага лагеру.

Вельмі высокім па ўсходнееўрапейскіх стандартах быў і ўзровень жыцця насельніцтва ГДР. Аднак, як хутка выявілася, яно проста жыло не па сродках. Калі напачатку 1970-х гг. знешняя запазычанасць ГДР складала 3,5 млрд. марак, то на 1989 г. – ўжо пераваліла за 30-мільярдны рубеж. На фоне далейшай арыентацыі насельніцтва ГДР на заходнія спажывецкія стандарты шанцаў на паспяховае задавальненне яго ўзрастальных патрэб, а значыць і на захаванне ўласнай улады, у САПГ практычна не засталося.

**Умацаванне міжнароднага становішча ГДР. Дагавор з СССР 1955 г. Уваходжанне ГДР у АВД. Стварэнне мяжы з Заходнім Берлінам. Нармалізацыя адносін паміж ГДР і ФРГ. Дагавор 1972 г.**

Як і ФРГ, ГДР пасля свайго ўтварэння не валодала магчымасцю праводзіць самастойную знешнюю палітыку. Да чэрвеня 1953 г. яна знаходзілася ў кампетэнцыі вайсковага органу – Савецкай кантрольнай камісіі, а пасля падзей 17 ліпеня перайшла пад кантроль цывільнай інстытуцыі – Вярхоўнага камісара СССР.

Пасля канчатковага правалу спроб не дапусціць падзелу Германіі, а потым – уступлення ФРГ у НАТО, адбываецца канчатковая інтэграцыя Ўсходняй Германіі ў савецкі блок. У сакавіку 1954 г. Савецкі ўрад заявіў пра скасаванне акупацыйнага рэжыму ва Ўсходняй Германіі. У траўні 1955 г. ГДР уступіла ў Арганізацыю Варшаўскага Дагавора. У верасні таго ж года яна падпісала Дагавор з СССР: Савецкі Саюз прызнаў яе «поўны» суверэнітэт. Напачатку 1956 г. адбылося стварэнне Нацыянальнай народнай арміі колькасцю ў 120 тыс. чалавек. Размяшчэнне савецкіх войск у ГДР было аформлена на базе спецыяльнага дагавору, а не па праву пераможцы.

Ва ўмовах абвастрэння знешнепалітычнай сітуацыі вакол германскага пытання напачатку 1960-х гг. і масавага зыходу кваліфікаваных кадраў з ГДР у Заходні Берлін у ноч з 13 на 14 жніўня 1961 г. пачынаецца ўзвядзенне сістэмы загараджальных збудаванняў паміж ГДР і Заходнім Берлінам – сумна вядомая «Берлінская сцяна», сімвал «халоднай вайны» ў Еўропе.

Нягледзячы на заходнегерманскую дактрыну Хальштэйна да 1970 г., ГДР здолела ўсталяваць дыпламатычныя адносіны з шэрагам дзяржаў Азіі, Афрыкі і Амерыкі (Егіпет, Інданезія, Куба). Напачатку 1970-х гг. ва ўмовах разрадкі міжнароднай напружанасці пачынаецца паступовая нармалізацыя адносін паміж дзвюма германскімі дзяржавамі. У чэрвені 1973 г. набывае моц Дагавор аб асновах адносін паміж ГДР і ФРГ, заключаны ў снежні 1972 г. У верасні 1973 г. ГДР стала паўнапраўным членам ААН ды іншых міжнародных арганізацый. У лістападзе таго ж году ГДР афіцыйна прызнала ФРГ і ўсталявала з ёй дыпламатычныя адносіны.

Кіраўніцтва ГДР было занепакоена тым, што нармалізацыя адносін з ФРГ адчыняла новыя магчымасці для ўплыву Захаду на ўсходнегерманскіх грамадзян. У сярэдзіне 1970-х гг. ім была сфармулявана і ўзята на ўзбраенне тэарэтычнае палажэнне аб існаванні дзвюх нацый – **«канцэпцыя двухнацыянальнасці нямецкага народу»** – сацыялістычнай і капіталістычнай, у якіх было агульнае мінулае, ёсць рознае цяперашняе і няма агульнай будучыні. Выключалася ўсялякая магчымасць германскага аб’яднання. З **Канстытуцыі ГДР 1974 г.** было прыбрана паняцце «адзіная германская нацыя», як і любая згадка пра аднаўленне адзінства Германіі як мэты дзяржаўнай палітыкі.

У далейшым міжгерманскія адносіны сталі грунтавацца на чыста прагматычных падыходах з абодвух бакоў. ГДР была зацікаўленая ў заходнегерманскіх крэдытах, а ФРГ імкнулася актывізаваць кантакты грамадзян дзвюх краін і гуманітарнае супрацоўніцтва паміж імі. Узаемныя саступкі дазвалялі падтрымліваць дастаткова высокі ўзровень міждзяржаўных адносін. Гэта ўжо ў сярэднетэрміновай перспектыве падрывала ідэалагічную базу афіцыйнай палітыкі ГДР ў германскім пытанні, арыентаванай на **«адгароджванне»** (ням. – *Abgrenzung*) ад іншай германскай дзяржавы і стала самазабойчым для рэжыму ГДР.

### Адносіны да перабудовы ў СССР. Палітычны крызіс восені 1989 г. Актывізацыя апазіцыйных сіл. Стварэнне новых палітычных партый і рухаў. Пытанне аб аб'яднанні Германіі. Сакавіцкія выбары 1990 г., падрыхтоўка да аб'яднання Германіі

Дастаткова паспяховы ўсходнегерманскі рэжым мог яшчэ доўга цешыцца адсутнасцю любых масавых выступленняў немцаў. Прыход да ўлады М. С. Гарбачова кардынальна змяніў сітуацыю. Пераўтварэнні ў СССР і найбольш прагрэсіўных краінах Усходняй Еўропы падрабязна асвятляліся тэлебачаннем ФРГ, шырока даступным усходнім немцам. Пачалося стварэнне першых незалежных партый. Але, нягледзячы на гатоўнасць грамадства на самыя карэнныя змены, кансерватыўная вярхушка ГДР на чале з Э. Хонэкерам разглядала любыя сацыяльна-эканамічныя і палітычныя рэформы як здачу сацыялістычных заваёў. Наадварот, найбольш актыўных крытыкаў рэжыму чакала выгнанне з краіны.

Пасля таго, як 9 верасня 1989 г. Венгрыя цалкам адчыніла свае межы для грамадзян ГДР, праз яе і Аўстрыю ў ФРГ перабралася каля 25 тыс. усходніх немцаў. Звычайнай з'явай сталі дэманстрацыі праціўнікаў рэжыму. Паказальна, як узрастала іх масавасць: 25 верасня ў Лейпцыгу на вуліцы выйшла толькі 5 тыс. чалавек, праз тыдзень – 20 тыс., а 6 кастрычніка – ужо 70 тыс. пад лозунгам «Мы – адзін народ».

Аграмадны ўплыў на лёс Германіі рабіла пазіцыя савецкага лідара. М. С. Гарбачоў, які прыбыў на святкаванне 40-х угодкаў утварэння ГДР, на ўрачыстым паседжанні ў Палацы Рэспублікі папярэдзіў кіраўніцтва ГДР і САПГ, што «*жыццё яго пакарае, калі яно будзе спазняцца*». Унутрыпартыйная апазіцыя на чале з Эганам Крэнцам выкарыстала сітуацыю і павяла наступленне на кансерватараў. 18 кастрычніка 1989 г. галава ГДР і САПГ Э. Хонэкер падаў у адстаўку. Э. Крэнц стаў новым генеральным сакратаром САПГ, старшынёй народнай палаты ГДР і Нацыянальнай рады абароны.

Аднак на выпраўленне памылак мінулага новаму рэфармісцкаму кіраўніцтву было адпушчана занадта мала гістарычнага часу. Народ звязваў сваё будучае і спадзяванне на лепшае жыццё не з САПГ і ГДР. Сімвалам краху сацыялістычнага эксперыменту ў ГДР і, шырэй, ва ўсім сацыялістычным лагеры стала падзенне 9 лістапада 1989 г. Берлінскай сцяны.

У снежні 1989 г. САПГ страціла манаполію на палітычную ўладу – з канстытуцыі быў выключаны адпаведны артыкул. На кіруючыя пазіцыі ў партыі выйшлі прыхільнікі яшчэ больш радыкальных пераўтварэнняў. САПГ была перайменавана ў **Партыю дэмакратычнага сацыялізму (ПДС)**, а яе старшынёй (пасада генеральнага сакратара і Палітбюро ўвогуле скасоўваліся) быў абраны дэмакрат Грэгар Гізі.

З лістапада 1989 г. узнікаюць грамадзянскія рухі – «Новы форум», «Дэмакратычны прарыў» і інш. Як правіла, пры падтрымцы заходнегерманскіх партнёраў арганізуюцца новыя палітычныя партыі: Сацыял-дэмакратычная партыя Германіі (пры ўдзеле аднайменнай партыі), Нямецкі сацыяльны саюз (ННС; арыентаваўся на баварскую ХСС). Даўно існаваўшыя ў краіне партыі – ХДС, ЛДПГ, НДПГ і НСПГ выйшлі з блоку з камуністамі.

Адзіным лозунгам апазіцыі на выбарах, што прайшлі 18 сакавіка 1990 г., стала аб'яднанне дзвюх германскіх дзяржаў. Перамаглі блок **«Альянс за Германію»**, які набраў 48,14 % (ХДС – 40,9 %, НСС – 6,32 %, «Дэмакратычны прарыў» – 0,92 %), і СДПГ – 21,8 %. ПДС чакала фіяска – толькі 16,4 %. Па выніках выбараў была створана вялікая дэмакратычная кааліцыя, лідарства ў якой належала «Альянсу за Германію» і СДПГ. Новаабраная Народная палата аднагалосна прагаласавала за скасаванне прэамбулы да канстытуцыі ГДР, дзе гаварылася аб «сацыялістычнай дзяржаве рабочых і сялян». Урад было даручана ўзначаліць Лотару дэ Мезьеру, лідару ХДС. Падчас перамоў наконт фарміравання ўраду было прынята ключавое рашэнне аб уступленні ГДР у склад ФРГ.

Пасля заключэння Дагавора аб эканамічным, валютным і сацыяльным саюзе ГДР і ФРГ (травень) і прызначэння на 2 снежня 1990 г. агульнагерманскіх парламенцкіх выбараў 12 верасня 1990 г. быў падпісаны «Дагавор аб канчатковым урэгуляванні у дачыненні Германіі». З кастрычніка 1990 г. «Дагавор аб аб'яднанні Германіі» набывае моц, і ГДР спыніла сваё існаванне.

## Тэма 20. Албанія ў 1945 – 2010-я гг.

### Вызваленне краіны. Сацыяльна-эканамічныя і палітычныя пераўтварэнні ў другой палове 1940-х гг.

Яшчэ да пачатку Другой сусветнай вайны ў красавіку 1939 г. манархічная Албанія была захоплена італьянскімі войскамі і як пратэктарат уключана ў склад Італьянскай імперыі. Нягледзячы на страту суверэнітэту, ў гады вайны краіна нават здолела прырасці суседнімі тэрыторыямі: ад Югаславіі ёй дасталася Косава, а ад Грэцыі – заходняя частка Македоніі. У час італьянскай, а потым германскай акупацыі ў Албаніі складваецца некалькі арганізацый супра-

ціўлення. Буйнейшымі з іх былі **Рух нацыянальнага вызвалення (РНВ)**, створаны албанскімі камуністамі па югаслаўскім ўзоры (заснаванне ў лістападзе 1941 г. Албанскай камуністычнай партыі (КПА) таксама прайшло пры актыўнай дапамозе югаславаў), і **Нацыянальны Фронт (НФ)** – рэспубліканскі, нацыяналістычны і антыкамуністычны рух, які аб'яднаў многіх дзеячаў даакупацыйнай апазіцыі. Важнай асаблівасцю апошняга было імкненне пры агульнай арыентацыі на дзяржавы антыгітлераўскай кааліцыі захаваць далучаныя акупантамі тэрыторыі.

Паміж РНВ і НФ, тэарэтычна саюзнікамі ў вызваленчай барацьбе, пастаянна ўзнікалі ідэалагічныя і ваеннна-стратэгічныя супярэчнасці. З падзеннем рэжыму Б. Мусаліні і выхадам Італіі з вайны канфлікт паміж гэтымі сіламі дасягнуў апагею. Пакінутая італьянцамі зброя стала выкарыстоўвацца для братазабойчай барацьбы.

У Албанію былі ўведзены сілы Вермахту, але столькі, колькі было дастаткова для кантролю над найбольш важнымі гарадамі краіны і марскім узбярэжжам. Германія яшчэ раз пацвердзіла правы Албаніі на далучаныя тэрыторыі. Новыя палітычныя абставіны, і асабліва абяцанні нацыстаў, спакусілі НФ на калабарацыю. РНВ, нават нягледзячы на поўнае разуменне непазбежнасці страты новых албанскіх зямель у выніку перамогі антыгітлераўскай апазіцыі заняў супрацьлеглую пазіцыю. Пры моцнай дапамозе югаслаўскіх партызан Ёсіпа Броз Ціта і карыстаючыся вялікай падтрымкай сярод мясцовага насельніцтва РНВ пераўтварыўся ў найбольш магутную ваенна-палітычную сілу ў Албаніі.

На двух з'ездах КПА (травень і кастрычнік 1944 г.) РНВ быў абвешчаны Часовым урадам. Неўзабаве ён паставіў пад свой кантроль большую частку краіны. Калі нацысты ў лістападзе 1944 г. распачалі эвакуацыю, яго сілы здолелі заняць і Тырану. Амбіцыйны партызанскі ўрад пераўтварыўся ў сапраўднага носьбіта дзяржаўнай улады. У 1945 г. РНВ быў перайменаваны ў **Дэмакратычны Фронт Албаніі (ДФА)**.

Пасля вызвалення краіны 29 лістапада 1944 г. пачынаецца фарміраванне народна-дэмакратычнага рэжыму і глыбокія эканамічныя пераўтварэнні. У студзені 1945 г. урад ДФА прымае дэкрэт аб увядзенні падатку на прыбыткі, атрыманыя ў гады вайны. Гэты акт насіў непрыхавана канфіскацыйны характар і адчувальна ўдарыў па мясцовай буржуазіі, а таксама прывёў да нацыяналізацыі германскіх і італьянскіх актываў, прамысловасці і транспартнай сістэмы. У жніўні 1945 г. быў прыняты закон аб аграрнай рэформе. Зямля, экспрапрыіраваная ў памешчыкаў (беяў), кулакоў (ага) і манастыроў перадавалася сялянам. Гэта, а таксама шэраг дэкрэтаў, якімі былі скасаваныя сельскагаспадарчыя пазыкі, на 3/4 зменшана зямельная рэнта, нацыяналізаваныя водныя рэсурсы, забяспечылі камуністам падтрымку вёскі. Напачатку 1947 г. быў цал-

кам ліквідаваны прыватны сектар у прамысловасці, а напрыканцы года – завершана нацыяналізацыя банкаў.

Цяпер камуністам яшчэ не хапала толькі міжнароднага, у тым ліку амерыканскага і брытанскага, прызнання. Для гэтага трэба было арганізаваць, сама меней, парламенцкія выбары. 2 снежня 1945 г. яны адбыліся. Народ выявіў немалую актыўнасць – прагаласавала 89,8 % патэнцыйных выбаршчыкаў: 93,2 % галасоў атрымаў безальтэрнатыўны партыйны спіс Дэмакратычнага Фронту, дзе запраўлялі камуністы. 11 студзеня 1946 г. Заканадаўчы сход ліквідаваў манархію, дэтранізаваў апошняга караля Зогу I і абвясціў Албанію **Народнай Рэспублікай**. 14 сакавіка таго ж года была прынята Канстытуцыя – поўная копія тагачаснай югаслаўскай толькі без яе федэралізму.

Першыя эканамічныя і палітычныя змены ў Албаніі не выклікалі вялікага аптымізму на Захадзе. Адтуль сталі дапускацца ўцечкі інфармацыі аб гатоўнасці задаволіць спадзяванні Грэцыі на анексію Паўднёвай Албаніі, т. зв. Паўночны Эпір. Савецкі Саюз у траўні 1946 г. адмовіўся прыняць высокапастаўленую албанскую ўрадавую дэлегацыю. Адзіным акенцам у свет для Албаніі заставалася Югаславія. Гэтыя краіны звязвала не толькі двухбаковае пагадненне, заключанае ў ліпені 1946 г. Югаслаўскія камуністы прадстаўлялі сваіх албанскіх таварышаў на ўстаноўчым з’ездзе Камінфарма (верасень 1947 г.). Не дзіўна і тое, што яны наваднілі адміністрацыйны апарат і албанскае войска. Інвестыцыі, пазыкі, фінансавыя мерапрыемствы і мытныя правілы Югаславіі фактычна прывялі да эканамічнай інкарпарацыі Албаніі. Албана-югаслаўскія дачыненні сталі да смешнага падобныя на нядаўнія албана-італьянскія адносіны часоў пратэктарату.

Тым не менш, групоўка на чале з Кочы Дзодзэ (сакратар ЦК партыі і міністр унутраных спраў), куды ўваходзілі пераважна выхадцы з рабочага асяродку, не адчувалі аніякай заклапочанасці з нагоды гэтай залежнасці і нават былі гатовы на ўключэнне Албаніі ў склад Югаславіі на правах сёмай рэспублікі.

На іншых пазіцыях стаялі камуністы-прыхільнікі Энвера Ходжы і Сейфулы Малешовы (галоўным чынам інтэлігенцыя). Яны выступалі за больш самастойную ўнутраную палітыку і больш дыверсіфікаваны знешнепалітычны курс. Узімку 1945 – 1946 гг. К. Дзодзэ ўдалося ліквідаваць С. Малешову і падабрацца да самога Э. Ходжы. Апошняга выратавала пагаршэнне савецка-югаслаўскіх адносін, а потым іх разрыў.

Першым намёкам на змену палітычнай абстаноўкі стаў санкцыяваны Сталінам дзяржаўны візіт Э. Ходжы ў Сафію (снежань 1947 г.), дзе былі ўсталяваны дыпламатычныя адносіны і падпісана двухбаковае пагадненне. Югаславія была надзвычай незадаволена падобнай самастойнасцю Албаніі, але нічога зрабіць ужо не здолела. 28 чэрвеня 1948 г. Сталін (фармальна Камінфарм) асудзіў Ціта, а ўжо праз тры дні Ходжа дэнансаваў усе экана-

мічныя пагадненні з Югаславіяй як несумяшчальныя з дзяржаўным суверэнітэтам сваёй краіны і загадаў югаслаўскім спецыялістам у 48 гадзін пакінуць Албанію.

Савецкі Саюз і некалькі яго сатэлітаў шчодра адплацілі Э. Ходжы за яго антыюгаслаўскі дэмарш грашыма, абсталяваннем і ваеннай тэхнікай. Узаемазвязаныя савецка-югаслаўскія і албана-югаслаўскія рознагалоссі выклікалі чыстку ў **Албанскай партыі працы** (**АПП** – так з верасня 1948 г. стала называцца КПА). К. Дзодзэ і яго таварышы па працітаўскай групоўцы былі пазбаўлены сваіх пасад, выключаны з партыі і, нарэшце, прысуджаны да смерці за дзяржаўную здраду і расстраляныя. Антыцітаўскія чысткі прывялі да ліквідацыі 14 членаў ЦК (з 31) і 32 дэпутатаў парламента (са 109). Усяго ў выніку рэпрэсій АПП страціла каля 25 % членаў. У адрозненне ад многіх ахвяр камуністычных чыстак у іншых краінах Цэнтральнай і Паўднёва-ўсходняй Еўропы, К. Дзодзэ і яго паплечнікі у камуністычнай Албаніі так і не былі рэабілітаваныя. «Югаслаўская» Канстытуцыя Албаніі 1946 г. была заменена на іншую, створаную па савецкім узоры – Канстытуцыю 1950 г. Новы Асноўны закон уключыў палажэнні аб будаўніцтве асноў сацыялізму.

Такім чынам, падтрымка Савецкага Саюзу не толькі дазволіла Э. Ходжы расправіцца з унутранай апазіцыяй, але й таксама прыдбаць для сваёй краіны магутнага і далёкага патрона замест блізкай і вельмі пагрозлівай Югаславіі. Сталін у сваю чаргу набываў для Савецкага Саюза ваенна-марскую базу ў Міжземнамор’і (порт Влёра) і забяспечваў амаль поўную ізаляцыю Югаславіі ад краін народнай дэмакратыі.

У лютым 1949 г. Албанію прынялі ў Савет Эканамічнай Узаемадапамогі, ў траўні 1955 г. яна стала сузаснавальніцай Арганізацыі Варшаўскага Дагавору.

### Асноўныя напрамкі сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны ў 1950-я гг. Пераход да «новага курсу» албанскага кіраўніцтва. Пераарыентацыя на Кітай

Напрыканцы 1940-х – першай палове 1950-х гг. Э Ходжа пераняў базавыя сацыяльна-эканамічныя, палітычныя і культурна-ідэалагічныя інстытуты і праграмы сталінізму. Летам 1949 г. Народны сход (парламент) зацвердзіў 2-гадовы план развіцця эканомікі, у якім быў вызначаны курс на сацыялістычную індустрыялізацыю Албаніі. Хаця ён быў выкананы толькі на 80 %, аб’ём валавой прадукцыі у 4 разы перавысіў узровень 1938 г. Пры дапамозе СССР былі пабудаваны некалькі буйных прадпрыемстваў, ГЭС, мадэрнізаваны нафтапромыслы. За гады першай пяцігодкі былі пабудаваны яшчэ каля 150 новых прамысловых прадпрыемстваў.

Пры гэтым спроб фарсіраванай калектывізацыі сельскай гаспадаркі не рабілася, таму сацыялістычны сектар у 1950 г. даваў толькі 6 % агульнага

аб'ёму сельгаспрадукцыі. Але ў 1955 г. быў узяты курс на паскарэнне тэмпаў кааперавання сельскай гаспадаркі. Планам другой пяцігодкі (1956 – 1960) было намечана завяршэнне калектывізацыі і дасягненне поўнага забеспячэння патрэб насельніцтва ў хлебе за кошт уласнай вытворчасці. У 1960 г. сацыялістычны сектар даваў ужо 80 % сельгаспрадукцыі.

У адрозненне ад большасці іншых народаў Цэнтральнай і Паўднёва-Усходняй Еўропы албанцы станоўча ацэньвалі савецкі ўплыў, бо бачылі ў СССР свайго абаронцу супраць Грэцыі і Югаславіі, а таксама крыніцу эканамічнай мадэрнізацыі. Таму імкненне Хрушчова ў сярэдзіне 1950-х гг. замірыцца з Ціта і асуджэнне ім сталінізму выклікалі ў Албаніі, асабліва ў вышэйшых эшалонах улады, непрыхаванае раздражненне. Тым не менш, у духу савецкай палітычнай моды ў 1954 г. албанскі правадыр Э. Ходжа саступіў пасаду прэм'ер-міністра вайскоўцу Мехмету Шэху, а III з'езд АПП асудзіў культ асобы.

Далейшыя падзеі не на жарт занепакоілі албанцаў. У траўні 1960 г., напрыклад, М. С. Хрушчоў заявіў лідару грэчаскай апазіцыі Сафоклісу Венізеласу аб магчымасці прадастаўлення грэчаскай меншасці ў Паўднёвай Албаніі аўтаноміі. Потым былі моцна скарочаны пастаўкі ў краіну савецкага збожжа, адкліканы спецыялісты, адтэрмінавана выдзяленне крэдытаў.

Албанскія лідары адказалі смелым ідэалагічнымі выпадамі ў бок СССР. Хрушчоў, у сваю чаргу, паспрабаваў выкарыстоўваючы ваенна-марскі флот Албаніі і незадаволеных Э. Ходжай чыноўнікаў з АПП, ажыццявіць у ліпені 1960 г. дзяржаўны пераварот. Апасля яго правалу савецкі лідар абрынуўся на Албанію са знішчальнай крытыкай на XXI з'ездзе КПСС (кастрычнік 1961 г.), называючы Э. Ходжу і яго паплечнікаў «прадажнымі Іудамі», яшчэ больш небяспечнымі за адкрытых ворагаў, і прадказваючы ім хуткую палітычную смерць. Савецкая эканамічная дапамога Албаніі цалкам спынілася. Але гэтая спроба пакараць Ходжу аказалася нагэтулькі ж марнай, як і ранейшая спроба Сталіна змясціць Ціта, хаця Мікіта Сяргеевіч пайшоў яшчэ далей свайго папярэдніка і ў снежні 1961 г. разарваў з Албаніяй адносіны. У 1962 г. Албанія пакінула СЭУ, што адразу адмоўна адбілася на гандлёвым балансе і эканамічнай сітуацыі.

IV з'езд АПП (люты 1962 г.) канстатаваў факт пабудовы эканамічнай базы сацыялізму ў Албаніі і паставіў задачу пабудовы поўнага сацыялістычнага грамадства. Тады ж быў падтрыманы ўнутры- і знешнепалітычны курс КНР. У кантэксце пагаршэння кітайска-савецкіх дачыненняў мааісцкі Кітай натуральна заняў вакантнае месца патрона Албаніі, аказваючы ёй маштабную ідэалагічную, палітычную, тэхнічную і эканамічную дапамогу. Неўзабаве дзеля таго, каб ачысціць албанскае грамадства ад несацыялістычных тэндэнцый, скараціць бюракратычны апарат і абараніць партыю ад рэвізіяніcцкай дэгенерацыі, на албанскую глебу былі перанесены многія элементы кітайскай культурнай рэвалюцыі. Аднак у адрозненне ад першакрыніцы, албанская версія культурнай рэвалюцыі

ніколі не выходзіла з пад кантролю партыі і не набыла гэтулькі разбуральнага характару. На працягу большай часткі 1960-х гг. Кітай і Албанія захоўвалі поўны кансенсус адносна прыроды імперыялізму, «рэвізіяніскай дэгенерацыі» савецкага кіраўніцтва і падманлівасці мірнага суіснавання розных грамадска-палітычных сістэм, свяшчэннасці класавай барацьбы, рэвалюцыйнай ваяўнічасці і дыктатуры пралетарыяту, крытэрыяў сапраўднага камунізму. КНР стала аказваць Албаніі фінансавую і кадравую дапамогу, якая раней забяспечвалася СССР.

Пад прыкрыццем вайскова і ідэалагічна магутнага, але аддаленага Кітаю, рэжым Э. Ходжы стаў разглядаць Савецкі Саюз, а не Грэцыю або Югаславію, у якасці галоўнай пагрозы краіне і самому сабе. Гэтае меркаванне неаднаразова знаходзіла пацверджанне ў сярэдзіне 1960-х гг. Па-першае, змяшчэнне з пасады кіраўніка спецслужб Югаславіі Аляксандра Ранкавіча змякчыла палітыку Бялграду ў дачыненні сваёй албанскай меншасці і дазволіла яму паспытаць магчымасці замірэння з Тыранай. Па-другое, грэчаская хунта «чорных палкоўнікаў», што захапіла ў Афінах уладу ў красавіку 1967 г. аказалася куды менш ваяўнічай па пытанню прыналежнасці Паўднёвай Албаніі, чым іх манархічныя папярэднікі. Па-трэцяе, жнівеньскае 1968 г. ўварванне Савецкага Саюзу і яго сатэлітаў у Чэхаславакію адкрыла падобную перспектыву і для Албаніі. Для таго, каб не даць магчымасці Брэжневу выкарыстаць тую ж казуістыку, што і пры скіданні Аляксандра Дубчака ў Чэхаславакіі, Э. Ходжа заявіў аб выхадзе сваёй краіны з АВД (верасень1968 г.). Гэтае рашэнне і жаданне парваць усялякія кантакты з СССР былі падмацаваны абменам вайсковых і партыйных дэлегацый з Кітаем.

Цяпер рэжым Ходжы пачаў рыхтаваць свой народ да магчымага ўварвання Савецкага Саюза. Меркавалася, што агрэсія можа скіроўвацца праз Балгарыю ці Адрыятычнае ўзбярэжжа, таму Албанія нават звярнулася да Румыніі і Югаславіі з просьбай дапамагчы ёй у выпадку эскалацыі канфлікту. Абвастрала перадваенны псіхоз і тое, што Кітай, на думку албанскага кіраўніцтва, праявіў сваю вайсковую слабасць у памежных сутыкненнях з СССР у 1969 г.

**Пагаршэнне эканамічнага становішча ў 1960-я гг. Цяжкасці эканамічнага развіцця 1970-х гг., іх прычыны. Пагаршэнне адносін з Кітаем і спыненне ім дапамогі Албаніі. Самаізаляцыя Албаніі**

Дайшло да таго, што ўсё часцей гучала думка аб неабходнасці ўмацавання сувязяў з Захадам – адзінай магутнай процівагай СССР. Падрыхтоўчым крокам стала ўсталяванне поўнамаштабных дыпламатычных кантактаў з Югаславіяй і Грэцыяй (да таго іх увогуле не было!) у 1971 г. Пасля гэтага да 1975 г. гандлёвы зварот Албаніі з Югаславіяй і Захадам павялічыўся ў 4 разы, а з сярэдзіны 1970-х гг. на заходнія краіны ўжо прыпадала каля 1/3 яе знешняга гандлю. Дыпламатычныя кантакты з заходнімі дэмакратыямі таксама актывізаваліся. На працягу 1970-х гг. колькасць міжнародных партнёраў Албаніі павялічылася з 42 да 94, з паўсотняй краін падтрымліваліся эканамічныя сувязі.

Праўда, дыпламатычны прагрэс Албаніі у 1970-х гг. быў азмрочаны сваркай з Кітаем. Пакуль Кітайская Народная Рэспубліка не была прадстаўлена ў ААН (да 1971 г. яе месца там займаў Тайвань), яна была зацікаўленая ў выкарыстанні Албаніі як рупару на міжнароднай арэне і была гатовая шчодра плаціць за гэта. Потым інтарэс да далёкай маленькай краіны стаў прадказальна падаць. У самой Албаніі паступовa стала нарастаць недаўменне палітыкай Мао Цзэдуна (візіт амерыканскага прэзідэнта Р. Ніксана ў Кітай у 1972 г. і г. д.). Пасля смерці «вялікага стырніка» і пачатку рэформ Дэн Сяапіна (1978 г.) ад былой любові не засталося і следу. Але за 17 гадоў супрацоўніцтва з КНР краіна атрымала $1,4 млрд. Такім чынам, Албанія, доўгі час прывязаная да адной з моцных дзяржаў – да Італіі ў міжваенны перыяд, Германіі ў гады вайны, потым да Югаславіі, СССР і Кітаю – нарэшце магла цешыцца небывалай свабодай палітычнага манеўру.

У эканоміцы змены міжнароднага становішча Албаніі прымусілі дэклараваць пераход да палітыкі разліку на ўласныя сілы. На гэтым шляху былі дасягнуты пэўныя поспехі. Так напрыклад, да пачатку 1980-х гг. Албанія магла цалкам забяспечыць свае патрэбы ў збожжы, нафце, электрычнасці і асноўных прадуктах хімічнай прамысловасці. Вельмі багатая прыроднымі выкапнямі, Албанія ўласнымі сіламі перапрацоўвала большую частку здабытых мінералаў. Быў створаны параўнальна шырокі індустрыяльны сектар. Але дасягаліся гэтыя вынікі выключна за кошт неймаверных фінансавых, матэрыяльных і людскіх высілкаў. Дастаткова сказаць, што часам праца зацягвалася да 14 – 16 гадзін, а звышурочная праца часта ўвогуле не аплачвалася. На фоне астатняй Еўропы краіна заставалася жабраком – яе ВУП на душу насельніцтва ў 1986 г. складаў толькі $930.

### Таталітарны ўнутрыпалітычны курс Э. Ходжы. Канстытуцыя 1976 г.

Ва ўнутранай палітыцы аніякіх сур’ёзных змен не адбывалася дзесяцігоддзямі. Э. Ходжа не дапускаў і мінімальных хістанняў і вёў Албанію далей на еўрапейскую перыферыю – эканамічную, палітычную і культурную.

Пасля ліквідацыі палітычных канкурэнтаў напрыканцы 1940-х гг. і пазбаўлення ад пагрозы прасавецкіх пераваротаў у 1960 г. Э. Ходжа мог адчуваць сябе ў поўнай бяспецы ажно да сярэдзіны 1970-х гг.

Затым адна за другой адбыліся яшчэ тры чысткі партыйнага і дзяржаўнага апарату. Увесну 1973 г. яго першы палітычны выпад быў арганізаваны супраць трох сяброў ЦК, адказных за культуру, адукацыю, прапаганду і працу з моладдзю. Ім ставілася ў віну тое, што ў кіраванні гэтымі важнымі накірункамі яны паслабілі партыйны кантроль і дысцыпліну. Усе трое былі публічна зняважаны і вызвалены са сваіх пасад без права займацца ў будучым кіруючай працай, а фактычна, вымушаны былі доўгі час выконваць некваліфікаваную і малапрэстыжную працу. Затым у сярэдзіне 1974 г. было абезгалоўлена вышэй-

шае кіраўніцтва албанскай арміі. Яно было таксама абвінавачана ў спробе абмежаваць партыйны кантроль праз змяншэнне паўнамоцтваў палітычных камісараў. Ветэран партыі – міністр абароны краіны (адначасова член Палітбюро), начальнік штабу і галава Палітычнага упраўлення арміі былі таемна асуджаны і пакараныя смерцю. Праз год прыйшла чарга тых, хто займаўся эканамічным планаваннем і кіраваннем. Іх абвінавацілі ў тым, што рэкамендацыі адносна большай цэнтралізацыі кіравання эканомікай і звязаныя з гэтым эканамічныя складанасці краіны ставілі перад сабой мэту дыскрэдытаваць албанскае кіраўніцтва ў вачах уласнага народа і падарваць уладу яго Правадыра. На працягу траўня – ліпеня 1975 г. яны таксама былі пакараны.

Упэўненасці ва ўласнай недатыкальнасці Э. Ходжы хапіла толькі на наступныя шэсць гадоў. У 1981 г. ён абрынуўся на свайго даўняга паплечніка і, як меркавалася, палітычнага спадкаемцу Мехмета Шэху. Той быў разжалаваны і напрыканцы года скончыў жыццё самагубствам. . Следам за гэтым рэпрэсіі ўдарылі па сям'і Шэху, многіх міністрах Кабінету, слынных партыйных і вайсковых чыноўніках. У новыя фаварыты выйшаў Раміз Алія.

У 1976 г. быў прыняты новы асноўны закон краіны. **Канстытуцыя 1976 г.** абвяшчала **Албанію Народнай Сацыялістычнай рэспублікай (НСРА)**, што стала прызнаннем пабудовы «асноў сацыялізму». Яна замацоўвала ў краіне дыктатуру пралетарыяту, аднапартыйную сістэму (АПП абвяшчалася «вядучай палітычнай сілай дзяржавы і грамадства»), развіццё рэвалюцыі, мэта якой заключалася ў забеспячэнні канчатковай перамогі «сацыялістычнага шляху над капіталістычным шляхам». Шэраг артыкулаў канстытуцыі нават дапускалі абмежаванне палітычных свабод, калі гэта супярэчыла вызначанаму парадку.

Э. Ходжа спалучаў кровапусканні ў дачыненні сваёй эліты з неаслабным уціскам простага народу. У грамадстве цяжка было заўважыць хаця б мінімальныя прыкметы дэсталінізацыі. Албанія стала адзінай краінай у Еўропе, якая не падпісала Заключны акт НБСЕ (Э. Ходжа назваў Хельсінскія пагадненні «фарсам, разыграным дзвюма звышдзяржавамі ў мэтах забяспечыць і ўзаконіць свае зоны ўплыву ў Еўропе».). Галоўным чынам, гэта адбылося з-за нежадання ўскладаць на сябе любыя абавязкі па пільнаванню правоў чалавека. Албанія была абвешчана першай атэістычнай дзяржавай (1967 г.). Гэта знайшло сваё ўвасабленне ў крымiналізацыі рэлігіі і вылілася ў масавыя пераследаванні вернікаў (і хрысціян, і мусульман). Як казаў Э. Ходжа: «*У албанцаў няма ідалаў і багоў, але ёсць ідэалы – гэта імя і справа Маркса, Энгельса, Леніна і Сталіна*».

Рэжым Э. Ходжы не шкадаваў сродкаў на абалваньванне ўласнага насельніцтва і марныя спробы абдурыць еўрапейскіх суседзяў. Асобны артыкул бюджэтных выдаткаў складала камуністычная прапаганда: «Радыё Тырана» лічылася адной з самых магутных радыёстанцый кантыненту і вяла трансляцыі па 70 гадзін у суткі на 22 мовах свету.

Значныя грошы ішлі таксама на ўтрыманне войска (48 тыс. чалавек) і службу дзяржбяспекі (8 тыс.). Па ўсёй краіне будавалася і рэгулярна паднаўлялася процьма доўгатэрміновых агнявых кропак і бункераў (600 тыс. на 3 млн. чалавек насельніцтва!), якія і сёння надаюць албанскім краявідам непаўторны нацыянальны каларыт.

### Змены ў кіраўніцтве краіны ў сярэдзіне 1980-х гг. Пашырэнне эканамічных сувязей з заходнімі краінамі. Абвастрэнне Косаўскай праблемы

11 красавіка 1985 г. Э. Ходжа памёр (нар. у 1908 г.). Ён заставаўся на пасадзе кіраўніка дзяржавы ажно 41 год – больш сярод камуністычных лідараў пратрымацца на палітычным Алімпе ўдалося толькі паўночнакарэйскаму лідару Кім Ір Сену. Як гэта і прадугледжвалася, яго пераемнікам стаў Раміз Алія, яшчэ адзін ветэран-партыец (нар. у 1925 г.).

Напачатку 1980-х гг. перад албанскім кіраўніцтвам паўстала найвастрэйшая праблема. Увесну 1981 г. у вобласці Косава (Сербская рэспубліка), сумежнай з Албаніяй, пачаліся сутычкі на этнічнай глебе паміж косаўскімі албанцамі (касаварамі) і мясцовымі сербамі. 2 мільёны албанцаў Югаславіі (у самой Албаніі – пражывала толькі 2,7 млн.) былі ўпэўненыя ў тым, што іх палітычна прыгнятаюць, эканамічна эксплуатуюць і, акрамя таго, спрабуюць асіміляваць. Яны патрабавалі надання Косаву статусу рэспублікі СФРЮ. Але сваёй гістарычнай калыскай Косава лічылі і сербы, і таму, каб не нанесці ім кроўную абразу, задаволіць падобныя патрабаванні Бялград не мог.

Бацькі Р. Аліі паходзілі з Косава, адкуль вымушаны былі з’ехаць адразу апасля Балканскіх войнаў 1912 і 1913 гг. Таму няма нічога дзіўнага ў тым, што Р. Алія выказваў куды большую заклапочанасць лёсам косаўскіх албанцаў (касавараў), чым яго настаўнік. Аднак, як і раней, Албанія ўстрымлівалася ад актыўнай пазіцыі ў нарастаючым косаўскім канфлікце, а сам Алія імкнуўся прадэманстраваць поўную пераемнасць палітычнага курсу Э. Ходжы. Албанскае кіраўніцтва падкрэслівала, што не мае тэрытарыяльных прэтэнзій да Югаславіі, што любая палітычная дэстабілізацыя СФРЮ будзе вельмі непажаданай і будзе толькі служыць своекарыслівым савецкім інтарэсам. Але і гэтая павышаная асцярожнасць не выратавала Албанію ад абвінавачванняў у інспірацыі касавараў.

Не зазнала істотных змен знешняя палітыка і знешнеэканамічная дзейнасць дзяржавы. Да канца 1980-х гг. Албанія мела дыпламатычныя адносіны ўжо з 110 краінамі свету. Адной з галоўных прычын гэтага поспеху сталі яе значныя сыравінныя багацці – вялікія запасы храмітаў (у 1990 г. першае месца па здабычы у Еўропе), нікелю, цудоўныя магчымасці для развіцця гідраэнергетыкі. Падобныя рэсурсы былі, натуральна вельмі, прыцягальнымі для многіх краін незалежна ад іх прыналежнасці да аднаго з

варагуючых ідэалагічных лагераў. Германія нават ахвяравала 6 млн. марак грашовай дапамогі. Праўда, прыняўшы гэты дарунак, албанскія камуністы зусім заплюшчылі вочы на патрабаванне сваёй Канстытуцыі 1976 г., якая забараняла браць крэдыты і дапамогу ад «буржуазных і рэвізіяніcцкіх дзяржаў».

Што датычыцца ідэалагічных падстаў дзейнасці новага албанскага лідара, хутка стала відавочным яго куды меншая прывязанасць да састарэлых догмаў. Палітыка Р. Аліі стала больш улічваць найбольш надзённыя інтарэсы народа. Значна часцей сталі праяўляцца нацыяналістычныя памкненні. Аднак, гэтыя новыя павевы далёка не заўсёды маглі ажыццяўляцца з-за актыўнай неасталініcцкай пазіцыі ўдавы Э. Ходжы – Нэджміе, якую падтрымалі некаторыя кансерватыўныя члены албанскага Палітбюро.

**Абвастрэнне эканамічнага і палітычнага крызісу ў канцы 1980-х гг. Змены ва ўнутранай і знешняй палітыцы. Выйсце са стану ізаляцыі. Паступовы пераход да дэмакратызацыі палітычнага жыцця. Прыняцце закона аб стварэнні палітычных партый і арганізацый**

Тым часам у камуністычнай Еўропе задзьмулі новыя ветры. Да ўлады ў СССР прыйшоў М. С. Гарбачоў і распачаў перабудову. Алія заявіў, што палітычныя працэсы ў Савецкім Саюзе не маюць нічога агульнага з Албаніяй. Яна ніколі не ўпадала ў рэвізіяніcцкія адхіленні ад ленінска-сталінскага курсу, а таму ўжо па азначэнню перабудоўваць няма чаго. Нягледзячы на сваю мудрасць з пункту гледжання рыторыкі, падобная пазіцыя уваходзіла ў супярэчнасць з бягучым палітычным курсам самога новага албанскага лідара – фактычна, перабудова была распачата.

Р. Алія відавочна карыстаўся нашмат большай падтрымкай насельніцтва і, акрамя таго, меў нашмат большую легітымнасць, чым асноўная маса падобных усходнеўрапейскіх лідараў. Яго краіна, як дарэчы і Югаславія, дамаглася вызвалення самастойна, а не была вызваленая чужой Чырвонай Арміяй, рэжым так званай народнай дэмакратыі не быў прынесены чужынцамі, а быў узрошчаны на нацыянальнай глебе сваімі ідэолагамі, хаця й не без удзелу замежных «селекцыянераў». Тым не менш, ён не мог адмовіць той факт, што нармальнаму развіццю краіны замінае звышцэнтралізацыя, невераготная неэфектыўнасць, усепранікальная карупцыя і парушэнне асноватворных правоў чалавека. Да рашучых дзеянняў Р. Алію падштурхоўвалі і падзеі ў суседняй Югаславіі, дзе напрыканцы 1980-х гг. улады на чале са Слабаданам Мілошавічам перайшлі да рэпрэсіўнай палітыкі ў дачыненні касавараў. Для пастаноўкі косаўскай праблемы на еўрапейскай і сусветнай арэнах неабходна было надаць албанскаму рэжыму больш дэмакратычны арэол, а тутэйшаму сацыялізму – чалавечы твар.

Ужо да пачатку 1990 г. Р. Аліі ўдалося пераканаць свой ЦК у неабходнасці дазволіць адкрытыя сходы партыйных арганізацый, канкурэнтныя выба-

ры партыйных чыноўнікаў і пашырэнне ролі рабочых у кіраванні на прадпрыемствах. Нарэшце, былі ўсталяваныя абмежаванні на тэрмін знаходжання на партыйных і дзяржаўных пасадах. Калгасы атрымалі дазвол рэалізоўваць сваю прадукцыю па свабодных рынкачных цэнах, сяляне – на павелічэнне ўдвая сваіх індывідуальных надзелаў і атрыманне ў прыватную ўласнасць птушкі і жывёлы (да таго на сваім падвор'і сяляне не маглі мець і курыцы), рамеснікі і рознічныя гандляры – права распачаць свой прыватны бізнес. У красавіку 1990 г. чарговая сесія ЦК у заканадаўчым парадку пашырыла правы сваіх грамадзян – цяпер яны маглі больш свабодна выязджаць за мяжу, вальней вызнаваць рэлігію. Для забеспячэння законнасці было адноўлена скасаванае ў 1966 г. Міністэрства юстыцыі. Важна адзначыць тое, што гэтыя рэформы правялі яшчэ да таго, як зусім слабая албанская апазіцыя паспела сфармуляваць свае палітычныя патрабаванні.

Але працэс рэфармавання не быў гладкім, вакол яго таемна і ўголас вяліся вастрэйшыя спрэчкі. Сілы тайнай паліцыі (*Sigurimi*) працягвалі тварыць беззаконні, а таму многія албанскія апазіцыянеры скарысталі палітычныя і ідэалагічныя паслабленні і пахаваліся па амбасадах і місіях заходніх краін у Албаніі. Р. Алія назваў іх «злачынцамі» і «палітычнымі валацугамі», якія пагражаюць натуральнаму бегу рэформ, але ў чэрвені і ліпенні 1990 г. даў ім дазвол на бесперашкодны выезд з краіны. «Літасць» албанскага лідара не здолела згладзіць скрайне адмоўную рэакцыю дэмакратычнага сусветнага супольніцтва. Яму ўрэшце рэшт прыйшлося пайсці на далейшыя саступкі.

У жніўні 1990 г. Алія паабяцаў адасобіць партыю ад дзяржавы, павялічыць паўнамоцтвы абраных органаў улады, паслабіць партыйны кантроль над грамадскімі арганізацыямі і пры рэкрутаванні на вядучыя пасады у сферах эканомікі і дзяржаўнага кіравання зыходзіць не з ідэалагічнай лаяльнасці кандыдатаў, а з іх прафесійных якасцяў. У снежні 1990 г. былі легалізаваныя альтэрнатыўныя палітычныя партыі, камуністы адмовіліся ад кантролю над многімі грамадскімі арганізацыямі (прафсаюзамі, маладзёжным рухам, ветэранскімі арганізацыямі і г. д.).

Дарэчы, апошні здабытак дэмакратычнай грамадскасці стаў магчымым у вялікай ступені дзякуючы актыўнасці студэнтаў Тыранскага ўніверсітэту. Р. Алія выкарыстаў бесперапынныя студэнцкія выступленні ў якасці галоўнага доваду супраць кансерватыўнай ультрасталінісцкай часткі албанскага Палітбюро. Амаль адначасова пацярпела палітычны крах Н. Ходжа. Яе змясцілі з пасады старшыні Дэмакратычнага Фронту – галоўнай масавай арганізацыі краіны.

З назваў усіх дзяржаўных арганізацый і ўстаноў было знята імя Сталіна. Тым не менш, палітыка апошняга і яго албанскага аднадумцы пакуль так і не атрымала лагічнага асуджэння афіцыйнага кіраўніцтва.

Тым часам пачалі гуртавацца сілы апазіцыі. Па чарзе з'яўляюцца дэмакратычная, рэспубліканская, экалагічная, аграрная, сацыял-дэмакратычная партыі і **Партыя нацыянальнай еднасці**. Агульнапрызнаным лідарам апазіцыі стаў вядомы кардыёлаг Салі Берыша, кіраўнік Дэмакратычнай партыі, а яго патэнцыйным канкурэнтам – пісьменнік Ісмаіл Кадарэ, які з кастрычніка 1990 г. знаходзіўся на эміграцыі ў Францыі.

Уладам пакуль што ўдавалася захоўваць поўны кантроль над сітуацыяй у сталіцы, але ў некаторых правінцыйных гарадах краіны стыхійныя масавыя дэманстрацыі пачалі набываць небяспечныя для рэжыму маштабы. Для падаўлення беспарадкаў нават прыйшлося выкарыстоўваць аддзелы Sigurimi і войск. Некалькім тысячам грамадзян удалося прарваць дзяржаўную мяжу і ўцячы ў суседнюю Грэцыю.

20 лютага 1991 г. беспарадкі дасягнулі Тыраны. Шматтысячны натоўп, што сабраўся на адной з плошчаў горада, дабраўся да шматметровай мармуровай статуі Энвера Ходжы і скінуў яе з пастаменту. У сталіцу была ўведзена армія, пачаліся сутычкі вайскоўцаў з цывільнымі. На вуліцах загінула 12 чалавек.

Палітычны тупік, у якім апынулася краіна, і ўзрастальныя эканамічныя праблемы, якія не было калі і каму вырашаць, выклікалі т. зв. «марскі зыход». З лютага 1991 г. тысячы албанцаў на лодках, баркасах, плытах і нават самых прымітыўных плавальных прыстасаваннях спрабуюць праз Адрыятыку перабрацца ў Італію. Гэты «зыход» цягнуўся амаль цэлы год і, як аказалася, гэта была не апошняя яго хваля.

### Першыя шматпартыйныя выбары, стварэнне кааліцыйнага ўрада

Вось у такой складанай абстаноўцы 31 сакавіка 1991 г. адбыліся датэрміновыя выбары ў Нацыянальны сход. Гэта былі першыя шматпартыйныя выбары з 1923 г. і народ прадэманстраваў вельмі высокую выбарчую актыўнасць. Камуністы (Албанская партыя працы, АПП) атрымалі поўную перамогу на вёсцы, у правінцыйных гарадах поспех аказаўся меншым, а ў сталіцы, ўвогуле, адносным. Усяго ім дасталася 56,17 % галасоў (або 169 мандатаў з 250), а іх галоўным канкурэнтам з Дэмакратычнай партыі (ДП) – 38,17 % (75 мандатаў). Яшчэ 5 месцаў атрымала партыя грэчаскай меншасці з Паўднёвай Албаніі і апошняе – Арганізацыя ветэранаў Другой сусветнай вайны, шчыльна звязаная з АПП. Камуністы атрымалі права сфарміраваць аднапартыйны ўрад.

29 красавіка 1991 г. новы парламент зацвердзіў **Канстытуцыю Рэспублікі Албанія**. Паводле яе краіна стала парламенцкай рэспублікай на чале з прэзідэнтам. 1 траўня 1991 г. новы парламент абраў галавой дзяржавы (тэрмінам на 5 гадоў) Р. Алію. Пры гэтым яго прымусілі развітацца з усімі сваімі партыйнымі і іншымі дзяржаўнымі пасадамі (Згодна з

6-ым артыкулам новай канстытуцыі партыі – а па-сутнасці былая партыя-гегемон – адасабляліся да дзяржавы, іх дзейнасць забаранялася ў вайсковых частках, ва ўстановах, міністэрствах, пракуратуры і г. д.).

Пачатак развалу эканомікі (інфляцыя дасягала 250 % у месяц, хутка расло беспрацоўе), масавы забастовачны рух, таямнічая смерць чатырох дзеячаў Дэмакратычнай партыі ў красавіку 1991 г. і шырокараспаўсюджаныя падазрэнні ў далучанасці да яе албанскіх спецслужб наблізілі вастрэйшы парламенцкі крызіс. 11 чэрвеня 1991 г. быў створаны кааліцыйны ўрад «нацыянальнай стабільнасці» («нацыянальнага выратавання»), дзе былая правячая партыя здолела захаваць толькі палову міністэрскіх пасад. Практычна адначасова са стварэннем новага ўраду адбываўся з’езд АПП, на якім партыя ў чарговы раз была перайменавана і стала называцца **Сацыялістычная партыя Албаніі (СПА)**.

### Эканамічнае і палітычнае развіццё Албаніі ў 1990-х – 2010-х гг.

Але прымірэнне правячых колаў і апазіцыі аказалася падманлівым. Краіна заставалася падзеленай на два лагеры. Няўхільна пагаршалася эканамічнае становішча: зніжаліся аб’ёмы прамысловай і сельскагаспадарчай вытворчасці, расла армія беспрацоўных, адбывалася далейшае зніжэнне дабрабыту жыхароў, дагэтуль самога, што ні ёсць, сціплага ў Еўропе, несупынна падала працоўная дысцыпліна.

Гэты ўрад пратрываў толькі да снежня 1991 г. Дэмакраты пакінулі яго ўказваючы на тое, што новаспечаныя сацыялісты блакіруюць падрыхтоўку і рэалізацыю патрэбных пераўтварэнняў. Няўстойлівасць унутрыпалітычнай і эканамічнай сітуацыі прывяла да змены яшчэ двух урадаў. Для таго, каб пазбегнуць блізкага паралюшу ўлады, на 22 сакавіка 1992 г. былі прызначаныя новыя выбары.

На гэты раз С. Берыша зрабіў стаўку на агітацыю сярод вясковага насельніцтва. Татальная дэкалектывізацыя, праведзеная ў 1991 – напачатку 1992 гг., выбіла ў камуністаў глебу з-пад ног. Дэмакраты заваявалі парламенцкую большасць – 92 месцы са 140, а сацыялістам дасталася толькі 38. Нягледзячы на тое, што зыход выбараў аніяк не закранаў пазіцыяў Р. Аліі як прэзідэнта, ён палічыў за лепшае добраахвотна зысці ў адстаўку (красавік 1992 г.). Так экс-камуністы арганізавана і годна перайшлі ў гэтулькі нязвыклае для сябе становішча апазіцыі. Прэзідэнтам Албаніі быў абраны С. Берыша (1992 – 1997).

Пяцігадовае кіраванне Дэмакратычнай партыі характарызавалася закладваннем палітычна-прававога падмурку дзяржавы з пераходнай эканомікай. Аднак з канструктыўнага пункту гледжання гэты перыяд можна лічыць часам страчаных магчымасцей. Ужо ў першыя два гады вытворчасць упала на

60 %, цэны ўзраслі ў 10 – 15 разоў пры росце заробкаў толькі ў 4 – 5 разоў. Да 1997 г. ВУП на душу насельніцтва ўпаў да $360, а беспрацоўе наблізілася да 40 % самадзейнага насельніцтва. Эканамічная эміграцыя пераваліла за паўмільёны чалавек. Каля паловы насельніцтва, што засталося ў краіне, жыло ў галечы. На парламенцкіх выбарах 1996 г. Дэмакратычная партыя перамагла толькі дзякуючы масавым падтасоўкам вынікаў галасавання. У дадатак да гэтага крах фінансавых «пірамід» (яны былі ўзгадаваныя небескарыслівай пазблажлівасцю улад) абакраў албанцаў на суму ад $1,2 да 2 млрд.(!); пагарэла 70 % сем'яў. Краіну ізноў адкінула назад у пачатак 1990-х гг., што выклікала масавыя хваляванні. У многіх гарадах для навядзення парадку ўладам прыйшлося задзейнічаць міліцыю і ствараць атрады ўзброеных добраахвотнікаў. У краіну у межах аперацыі «Альба» былі ўведзены паліцэйскія сілы Італіі і яшчэ шэрагу дзяржаў. Іх задачай было падтрыманне парадку і ахова гуманітарных грузаў, што накіроўваліся ў Албанію.

Веснавы крызіс 1997 г. выклікаў правядзенне датэрміновых парламенцкіх выбараў (чэрвень – ліпень). Сацыялістычная партыя, якая у саюзе з іншымі левацэнтрысцкімі сіламі (Аграрная, Сацыял-дэмакратычная партыі, Дэмакратычны альянс, Саюз за правы чалавека) атрымала болей за 2/3 месцаў у парламенце сфарміравала пяціпартыйны кааліцыйны ўрад. Дэмакратычная партыя здолела заваяваць толькі 25 са 156 дэпутацкіх мандатаў і надоўга зышла ў апазіцыю. У 2000 г. сацыялісты перамаглі і на мясцовых выбарах.

Тым часам у 1999 г. рэзка абвастраецца сітуацыя ў югаслаўскім аўтаномным краі Косава, дзе пераважна пражывалі албанцы-касавары. Пачатак баявых дзеянняў выклікаў сапраўдны зыход адтуль дзясяткаў тысяч чалавек мірнага насельніцтва, якія, натуральна, скіраваліся ў Албанію. Гэта выклікала г. зв. «бежанскі крызіс» 1999 г. Ён стаў яшчэ адным моцным ударам па, і без таго вельмі слабай, албанскай эканоміцы і пагражаў гуманітарнай катастрофай. Міжнароднай супольнасці ізноў прыйшлося прыходзіць на дапамогу маленькай беднай дзяржаве.

Вельмі павольна пераадольваліся не толькі сацыяльна-эканамічныя праблемы, але і складаная палітычная камуністычная спадчына. Парламенцкія выбары 2001 г. хаця й былі прызнаныя міжнароднай супольнасцю суправаджаліся цэлай серыяй скандалаў і вымусілі другі па папулярнасці пасля сацыялістаў «Саюз за перамогу» (у гэтую кааліцыю ўваходзіла і Дэмакратычная партыя) байкатаваць паседжанні парламенту на працягу паўгода. Толькі ў 2005 г. Дэмакратычная партыя на чале правацэнтрысцкай пяціпартыйнай кааліцыі вярнула сабе ўладу, а яе лідар С. Берыша (2005) заняў пасаду прэм'ер-міністра. У 2009 г. была дасягнута адна з важнейшых мэт правячай партыі – Албанія была прынята ў блок НАТО.

З пачатку 2000-х гг. даволі стабільна развіваецца эканоміка Албаніі. Краіна валодае багатымі запасамі карысных выкапняў, у тым ліку радовішчамі прыроднага газу і нафты, баксітаў, жалезнай і меднай руд. Краіна не толькі стала забяспечваць сябе ўласнымі энергарэсурсамі, але і пачала экспартаваць іх. Тым не менш, у аграрным сектары па-ранейшаму занята большая частка эканамічна актыўнага насельніцтва – 58 % (самы высокі паказчык у Еўропе), сельская гаспадарка дае 21 % ВУП Албаніі. Вельмі нізкім застаецца ўзровень дабрабыту албанцаў. У 2010 г. ВУП на душу насельніцтва складаў толькі 26 % ад сярэдняга па ЕС узроўню.

## Тэма 21. ЗША ў 1945 – пачатку 1990-х гг.

### Сацыяльна-эканамічныя і палітычныя вынікі Другой сусветнай вайны для ЗША

У параўнанні з іншымі краінамі ЗША падчас Другой сусветнай вайны панеслі нязначныя людскія і матэрыяльныя страты: загінулі альбо прапалі без вестак каля 300 тыс. чалавек. Больш за тое, вайна стала фактарам, які спрыяў прыкметнаму росту амерыканскай эканомікі. За гады вайны вытворчыя магутнасці ЗША павялічыліся ўдвая, а экспарт – у пяць разоў. Злучаныя Штаты выйшлі з вайны самай магутнай эканамічнай і ваенна-палітычнай дзяржавай свету. У 1948 г. доля ЗША ў вытворчасці капіталістычнага свету складала 54,6 %, а залаты запас – 53,3 % сусветнага. Напрыканцы вайны Злучаныя Штаты валодалі самай шматлікай і магутнай арміяй ва ўсім капіталістычным свеце, а да 1949 г. яшчэ й карысталася манаполіяй на атамную зброю. Не дзіўна, што Злучаныя Штаты абвясцілі сябе абаронцамі інтарэсаў «свабоднага свету», да якога залічваліся ўсе капіталістычныя краіны.

### Барацьба тэндэнцый ва ўнутрыпалітычным жыцці. Узмацненне пазіцый правых і кансерватыўных сіл. Выбары 1948 г. «Справядлівы курс» Г. Трумэна. Закон Тафта – Хартлі. Прычыны зруху ўправа, наступленне рэакцыі. Макартызм

У пасляваенны перыяд у эканамічнай і сацыяльнай сферах працягваліся рэформы, пачатыя ў межах праграмы «Новага курсу» прэзідэнтам Ф. Д. Рузвельтам. У 1944 – 1946 гг. была прынятая цэлая серыя законаў, закліканых аблегчыць становішча ваеннаслужачых, якія падлягалі дэмабілізацыі, а таксама бяднейшай часткі насельніцтва. Да гэтых законаў, у прыватнасці адносіцца г. зв. «салдацкі біль», які прадугледжваў значныя ільготы ветэранам вайны; закон аб занятасці, што меў на мэце скарачэнне беспрацоўя; акты аб падвышэнні пенсій і дапамог. Нездарма Гары Трумэн (1945 – 1953), які стаў

прэзідэнтам ЗША пасля смерці Ф. Д. Рузвельта 12 красавіка 1945 г., назваў сваю палітыку **«справядлівым курсам»** (англ. – *Fair Deal*).

Разам з тым у адрозненне ад большасці краін Еўропы, дзе пасляваенная сітуацыя характарызавалася паваротам у настроях шырокіх мас насельніцтва ўлева, у ЗША адбывалася наступленне правых і кансерватыўных сіл. Гэта, у прыватнасці, знайшло сваё адлюстраванне ў спробах перагледзець сацыяльнае заканадаўства 1930-х гг. Найбольш яркай праявай тых змен, якія адбыліся ў пазіцыях амерыканскіх заканадаўцаў, з'явілася прыняцце ў 1947 г. антырабочага па сваёй сутнасці **закона Тафта – Хартлі** (названы па прозвішчах яго ініцыятараў у Кангрэсе). Галоўная яго мэта палягала ў тым, каб абмяжоўваць і кантраляваць дзейнасць прафсаюзаў. Закон, у прыватнасці забараняў забастоўкі дзяржаўных служачых і ўсе забастоўкі палітычнай скіраванасці, байкоты і пікеты. Урад атрымліваў права прыпыняць легальныя забастоўкі і стачкі на 80 дзён.

Адной з прыкметных праяў павароту ўправа з'явілася нагнятанне ў грамадскай думцы антысавецкіх і антыкамуністычных настрояў. У 1947 г. пачаліся г. зв. «праверкі лаяльнасці» дзяржаўных служачых, якія па сутнасці вyліліся ў кампанію чысткі дзяржаўнага апарату ад іншадумцаў і недабранадзейных, да якіх адносілі ўсіх, хто падазраваўся ў сімпатыях да камунізму і СССР. У студзені 1949 г. распачаўся судовы працэс супраць кіраўніцтва малалікай Камуністычнай партыі ЗША, абвінавачанага ў нелаяльнасці амерыканскаму ўраду і ледзьве не ў шпіянажы на карысць Савецкага Саюзу. У выніку працэсу, які цягнуўся каля дзевяці месяцаў, адзінаццаць чалавек нацыянальнага камітэту кампартыі былі асуджаны да штрафаў і турэмнага зняволення.

Але найбольш завершаныя і скрайнія формы правакансерватыўны паварот набывае ў 1950 – 1953 гг. ў **макартызму**. Гэтак была названая шырокамаштабная антыкамуністычная і антысавецкая кампанія на чале з сенатарам Джозэфам Макарці. Гэтая кампанія, цалкам справядліва названая «паляваннем на вядзьмарак», была заснаваная на нагнятанні боязяў адносна змоў, якія, нібыта, выношвае супраць ЗША сусветны камунізм на чале з СССР. У прыватнасці, перыяд праўлення прэзідэнта-рэфарматара Ф. Д. Рузвельта быў названы «дваццаццю гадамі здрады». Супраць дзяржаўных чыноўнікаў высокага рангу прадстаўнікоў творчай інтэлігенцыі (напрыклад, Чарлі Чапліна), выбітных навукоўцаў і грамадскіх дзеячаў высоўваліся абсурдныя абвінавачванні, а некаторыя з іх нават паўсталі перад судом. Былі прынятыя законы супраць г. зв. «падрыўных элементаў» ды імігрантаў. Гэтак закон аб кантролі над камуністамі прадугледжваў штогадовую рэгістрацыю ў міністэрстве юстыцыі членаў камуністычнай партыі як «замежных агентаў».

Аднак неўзабаве правячыя колы Злучаных Штатаў пераканаліся ў шкоднасці для прэстыжу краіны макартысцкай істэрыі ды дзейнасці яе ідэ-

олагаў. У 1954 г. Сенат быў вымушаны прыцягнуць Дж. Макарці да адказнасці за абразу вышэйшага заканадаўчага органа краіны і незаконную трату дзяржаўных сродкаў, выдаткаваных на «барацьбу з камунізмам». Сенатару быў абвешчаны імпічмент (палітычнае асуджэнне) і ён быў вымушаны назаўжды пакінуць палітычную арэну.

## Роля ЗША ў міжнародных адносінах. Пачатак «халоднай вайны». План Маршала. Дактрына Трумэна. Стварэнне НАТА. Палітыка ЗША ў Лацінскай Амерыцы

Асабліва яўна правы паварот у курсе пасляваенных адміністрацый Злучаных Штатаў праявіўся ў сферы знешняй палітыкі. Ужо напрыканцы вайны сталі нарастаць супярэчнасці паміж саюзнікамі па антыгітлераўскай кааліцыі. З яе заканчэннем яны набылі прынцыповы характар: спачатку прывялі да развалу антыгітлераўскай кааліцыі, а потым да развязвання «халоднай вайны». Ініцыятыва ў гэтым пытанні належала ЗША. «Халодная вайна» і народжаныя ёю знешнепалітычныя дактрыны, гэткія, як палітыка «з пазіцыі сілы», «балансаванне на мяжы вайны» ды інш. прывялі да ўзрастання міжнароднай напружанасці і пагрозы новай сусветнай вайны.

Замацаваўшы эканамічнае першынство і павялічыўшы ваенны патэнцыял краіны, кіруючыя колы ЗША імкнуліся выкарыстаць свой аграмадны уплыў для стабілізацыі сусветнай сістэмы капіталізму і ўсталявання амерыканскай гегемоніі ў пасляваенным свеце. Спробы рэалізацыі гэтых глабальных планаў наткнуліся на супраціўленне Савецкага Саюзу, міжнародныя пазіцыі якога пасля вайны таксама значна ўзмацніліся. Савецкае кіраўніцтва спрабавала ажыццявіць свае ўласныя глабальныя планы. Гэткім чынам на міжнароднай арэне ўзнікла супрацьстаянне дзвюх супердзяржаў.

З гэтай прычыны выпрацоўка пасляваеннага курса адносна СССР стала адной з цэнтральных задач знешняй палітыкі ЗША. У кіруючых колах краіны ўсё больш браў верх непрымірымы антысавецкі курс. З асаблівай сілай гэта праявілася ў сакавіку 1946 г., калі ў місурыйскім мястэчку Фултан у прысутнасці амерыканскага прэзідэнта Г. Трумэна Ўінстан Чэрчыль зрабіў прамову, у якой абвінаваціў СССР ва ўсталяванні «жалезнай заслоны» і заклікаў усе сілы заходняй дэмакратыі разгарнуць барацьбу супраць «сусветнага камунізму». З мэтай аказання ціску на Савецкі Саюз, прыхільнікі жорсткага курсу выкарыстоўвалі тагачасную манаполію ЗША на валоданне ядзернай зброяй.

У 1947 г. была распрацавана стратэгічная лінія знешняй палітыкі ЗША, разлічаная на аслабленне Савецкага Саюзу. Для гэтага была высунута «**дактрына стрымлівання**» (англ. *Containment*), прапанаваная супрацоўнікам дзяржаўнага дэпартаменту Джорджам Кэнанам. Галоўным элементам палітыкі Злучаных Штатаў адносна СССР павінна было стаць «працяглае, цярплівае, але цвёрдае і пільнае стрымліванне рускіх экспансіянісцкіх тэндэнцый».

Канкрэтным увасабленнем гэтага знешнепалітычнага курсу стала **дактрына Трумэна**, абвешчаная прэзідэнтам 12 сакавіка 1947 г. Заявіўшы пра неабходнасць аказання неадкладнай дапамогі Грэцыі і Турцыі ў барацьбе супраць «камуністычнай пагрозы», Злучаныя Штаты абвясцілі галоўнай задачай сваёй знешняй палітыкі ўсямерную абарону дэмакратычных інстытутаў «свабоднага свету» супраць любых замахаў на яго фундаментальныя асновы.

У сваю чаргу гэтая знешнепалітычная дэкларацыя знайшла сваё практычнае ўвасабленне ў плане эканамічнай дапамогі еўрапейскім краінам, з якой у чэрвені 1947 г. выступіў дзяржаўны сакратар ЗША Джордж Маршал. Пры дапамозе **плана Маршала** Злучаныя Штаты імкнуліся паспрыяць аднаўленню разбуранай вайной эканомікі еўрапейскіх краін з мэтай умацавання ў іх капіталістычных устояў, падрыву ўзрастальнага ўплыву СССР і зацвярджэнню ўласнай палітычнай гегемоніі.

Праграму эканамічнай дапамогі правячыя колы ЗША імкнуліся дапоўніць заключэннем ваенна-палітычных саюзаў. Першым крокам у гэтым накірунку стала падпісанне ў верасні 1947 г. Міжамерыканскага дагавору аб узаемнай бяспецы альбо **«пакту Рыў-дэ-Жанэйру»**, выкарыстанага Злучанымі Штатамі для далейшага ўзмацнення свайго ўплыву ў краінах Лацінскай Амерыкі. 4 красавіка 1949 г. дзяржаўны сакратар ЗША Дзін Ачэсан і прадстаўнікі шэрагу краін Заходняй Еўропы падпісалі пагадненне аб стварэнні **Арганізацыі Паўночнаатлантычнага дагавору (НАТО).** Фактычна, галоўнай мэтай НАТО станавілася «сумесная абарона свабоднага свету» ад «камуністычнай агрэсіі».

### Зрухі ў эканамічным развіцці краіны ў 1950 – 1960-я гг. Уздзеянне НТР

На мяжы 1940 – 1950-х гг. прамысловы ўздым, перарваны ўвосень 1948 г. эканамічным крызісам, ізноў аднавіўся. Маштабы ўздыму рэзка павялічыліся ў гады вайны ў Карэі і ў сувязі з ростам вайсковых выдаткаў і бурным развіццём вайсковай прамысловасці. У 1952 г. агульны аб’ём амерыканскай прамысловай прадукцыі перавысіў найвышэйшы ўзровень, дасягнуты ў гады Другой сусветнай вайны. Да канца 1950-х гг. індэкс агульнага аб’ёму прадукцыі ЗША перавысіў яго даваенны ўзровень утрая.

Абстаноўка прамысловага ўздыму, характэрная для ЗША на працягу амаль усяго перыяду 1940 – 1950-х гг., была вынікам аграмаднага падвышэння эканамічнага патэнцыялу гэтай краіны за гады Другой сусветнай. Эканамічнае першынство ЗША давала ім нямала важных пераваг у сферы міжнародных фінансава-эканамічных адносін. Нашмат больш высокі ўзровень тэхнічнага і тэхналагічнага аснашчэння прамысловасці, звязаны з першымі поспехамі працэсаў аўтаматызацыі і камп’ютэрызацыі вытворчасці, забяспечыў значнае падвышэнне ўзроўню эканамічнага развіцця ЗША. У 1950-я гг. у Злучаных

Штатах раней, чым у другіх высокаразвітых індустрыяльных краінах, з'явіліся першыя прыкметы навукова-тэхнічнай рэвалюцыі. Ужо напрыканцы 1950-х гг. у ЗША дзейнічала больш за 2 тыс. электронна-вылічальных машын.

Усе гэтыя зрухі ў эканамічным развіцці ЗША пасля Другой сусветнай вайны мелі важныя сацыяльныя наступствы. Навукова-тэхнічны прагрэс значна павысіў узровень кваліфікацыі працоўнай сілы, вёў да ўзнікнення прынцыпова новых катэгорый кваліфікаваных рабочых (праграмісты, аператары, наладчыкі аўтаматычных паточных ліній і г. д.). У сувязі з паскораным развіццём сферы паслуг, хутка расла колькасць сярэдніх слаёў насельніцтва.

У Злучаных Штатах назіраўся незвычайны хуткі рост колькасці насельніцтва. За кошт вельмі значнага павелічэння нараджальнасці, «бэйбібуму», ды іміграцыі колькасць насельніцтва ЗША вырасла з 1940 па 1960 г. з 132 млн. да 178 млн. чалавек, г. зн. на 35 %. На мяжы 1940 – 1950-х гг. пачалося масавае перасяленне прадстаўнікоў сярэдняга класу і часткі кваліфікаваных рабочых з гарадоў у прыгарады.

На працягу 1950-х гг. істотна ўзняўся жыццёвы ўзровень значнай часткі насельніцтва ЗША. Сярэдні ўзровень пагадзіннай аплаты працы вырас за дзесяцігоддзе з $1,4 да $2,2. У большасці галін быў уведзены 5-дзённы працоўны тыдзень. Індустрыялізацыя сельскай гаспадаркі падвысіла ўзровень тэхніка-тэхналагічнай аснашчанасці ферм. Да канца 1950-х гг. каля 80 % ферм былі электрыфікаваны. Хутка расла колькасць сямей, якія мелі аўтамабілі і навейшую эканамічную бытавую тэхніку.

Тым не менш, сацыяльна-эканамічнае развіццё Злучаны Штатаў гэтага перыяду вызначалася немалой супярэчлівасцю. Далёка не ўсім сацыяльным групам амерыканскага грамадства былі даступны магчымасці падвышэння матэрыяльнага ўзроўню нават ва ўмовах спрыяльнай эканамічнай кан'юнктуры. Каля 40 млн. амерыканцаў, г. зн. каля чвэрці насельніцтва, знаходзіліся ў нашмат горшым становішчы. Гэта былі масы некваліфікаваных рабочых, жыхары афрыканскіх гета буйных гарадоў, дробныя фермеры, якія выцясняліся з сельгасвытворчасці ды іншыя малазабяспечаныя слаі насельніцтва. Праблема беднасці і ў гэты перыяд заставалася адной з першачарговых праблем ЗША.

### Унутраная палітыка рэспубліканскай адміністрацыі Д. Эйзенхаўэра. «Кансерватыўная згода». Пераход да буржуазнага рэфармізму дэмакратычных адміністрацый Дж. Ф. Кенэдзі і Л. Б. Джонсана, іх палітыка. Партыйна-палітычная барацьба ў 1960-я гг.

На прэзідэнцкіх выбарах 1952 г. першую з 1932 г. перамогу атрымаў прадстаўнік рэспубліканскай партыі. Новым прэзідэнтам ЗША стаў папулярны генерал, падчас Другой сусветнай вайны камандуючы амерыканскімі войскамі ў Еўропе Дуайт Эйзенхаўэр (1953 – 1961). Перамога рэспубліканскай партыі

стала не толькі вынікам «правага павароту» ва ўнутранай палітыцы ЗША. Рэспубліканскі кандыдат абяцаў пакласці канец скрайне непапулярнай сярод шырокіх слаёў насельніцтва карэйскай вайне.

Першыя крокі адміністрацыі Д. Эйзенхаўэра былі скіраваны на абмежаванне дзяржаўнага ўмяшання ў справы прыватнага прадпрымальніцтва. Быў скасаваны ўведзены ў гады карэйскай вайны кантроль над цэнамі і заробкамі, федэральны ўрад адмовіўся ад рэгулявання газавых радовішчаў і нафтаносных раёнаў марскога шэльфу. У сферы аграрнай палітыкі быў узяты курс на хутчэйшае выцясненне з вытворчасці неэфектыўнага дробнага фермерства.

Тым не менш, напачатку 1950-х гг. ідэі дзяржаўнага рэгулявання эканомікі, асноўныя праграмы «Новага курсу» настолькі трывала ўвайшлі ў жыццё амерыканскага грамадства, што магчымасць іх выкарыстання сталі прызнаваць не толькі дэмакраты, але таксама і прадстаўнікі ўмерана-кансерватыўнага крыла рэспубліканцаў. Адміністрацыя Д. Эйзенхаўэра не адмаўлялася ад дзяржаўнага ўмяшання ў эканоміку, асабліва ў перыяды пагаршэння эканамічнай кан’юнктуры. Яна працягвала распачатае напрыканцы 1940-х гг. масавае будаўніцтва жылля і шашэйных дарог, пачало рэканструкцыю воднага шляху па рацэ Св. Лаўрэнція. Было створана новае федэральнае агенцтва – міністэрства аховы здароўя, адукацыі і сацыяльных паслуг.

Значную ролю ў фарміраванні ўнутрыпалітычнага курсу адміністрацыі Д. Эйзенхаўэра адыгралі дэмакраты, асабліва пасля таго, як на выбарах 1954 г. яны вярнулі сабе большасць у абедзвюх палатах Кангрэсу.

Узаемадзеянне рэспубліканскай адміністрацыі з дэмакратычнай большасцю Кангрэсу было аблегчана паправеннем неаліберальнай дактрыны дэмакратаў. У адрозненне ад 1930-х гг., лідары дэмакратаў 1950-х гг. лічылі неабходным дасягненне пазітыўнага супрацоўніцтва паміж дзяржавай і буйным капіталам як «дзвюма краевугольнымі камянямі дэмакратычнага капіталізму». У выніку і рэспубліканцы, і дэмакраты апынуліся на адзінай этатысцкай платформе, адрозніваючыся паміж сабой толькі маштабамі і метадамі дзяржаўнага рэгулявання. На гэтай базе і ўсталяваўся кансенсус паміж дзвюма традыцыйнымі палітычнымі партыямі ЗША – **«кансерватыўная згода»**.

Важным этапам у пасляваеннай гісторыі ЗША стала перамога на прэзідэнцкіх выбарах 1960 г. кандыдата ад дэмакратычнай партыі Джона Фіцджаральда Кенэдзі (1961 – 1963), які апярэдзіў рэспубліканца Рычарда Ніксана. 43-гадовы прэзідэнт стаў не толькі адным з самых маладых кіраўнікоў амерыканскай дзяржавы, але й першым каталіком ды ірландцам па паходжанні, які здолеў дасягнуць вяршыні палітычнага Алімпу Злучаных Штатаў.

Працягваючы традыцыю сваіх дэмакратычных папярэднікаў, В. Вільсана і Ф. Д. Рузвельта, Дж. Ф. Кенэдзі высунуў рэфармісцкую праграму, якая атры-

мала назву **«новых рубяжоў»** (англ. *New Frontier*). Будучы выхадцам з вельмі багатай сям'і, а таксама высокаадукаваным прадстаўніком інтэлектуальнай і палітычнай эліты, Дж. Ф. Кенэдзі добра ўсведамляў неабходнасць пастаяннага ўдасканальвання палітыкі дзяржавы для паляпшэння становішча шырокіх слаёў насельніцтва і тым самым забеспячэння іх адданасці ідэалам і рыначнай эканомікі, і палітычнай дэмакратыі.

Адміністрацыя Дж. Ф. Кенэдзі прыняла і рэалізавала цэлую серыю захадаў па стабілізацыі эканомікі і пашырэнню праграм па сацыяльнай дапамозе. У прыватнасці, яна забараніла падвышэнне цэн у асобных галінах, напрыклад электратэхнічнай і сталеліцейнай. Былі распрацаваны праграмы дапамогі заняпалым раёнам (найперш, вуглездабывальным), перакваліфікацыі і пераабучэння рабочых новым прафесіям, ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых.

Важнейшым дасягненнем гэтай дэмакратычнай адміністрацыі з'яўлялася тое, што ў працяг прынятых яшчэ пры рэспубліканцах рашэннях і законаў (гл. далей) яна ўнесла ў Кангрэс законапраект, накіраваны супраць дыскрымінацыі прадстаўнікоў каляровага насельніцтва ў грамадскіх месцах і пры найме на працу. Прычым, федэральныя ўлады атрымлівалі права адмаўляць у падтрымцы мясцовым праграмам тых штатаў, дзе захоўвалася расавая сегрэгацыя.

Пазітыўныя зрухі ва ўнутранай і знешняй палітыцы (гл. далей) былі падтрыманы большасцю насельніцтва краіны. Але ў другой палове 1963 г. апазіцыя курсу адміністрацыі Дж. Ф. Кенэдзі з боку найбольш кансерватыўных сіл дасягнула свайго апагею. Нарастанне напружанасці ў вышэйшых колах палітычнай улады ЗША прывяло да трагічнай развязкі. 22 лістапада 1963 г. падчас паездкі ў Тэхас у сувязі з хуткім пачаткам чарговай перадвыбарчай кампаніі Дж. Ф. Кенэдзі быў смяротна паранены. Усе абставіны гэтага палітычнага забойства і, тым больш выканаўцы і заказчыкі злачынства, па-ранейшаму застаюцца невысветленымі, а матэрыялы справы – засакрэчанымі.

Прэзідэнтам ЗША стаў віцэ-прэзідэнт Ліндан Джонсан (1963 – 1969), менш чым праз год абраны на прэзідэнцкіх выбарах (яму супрацьстаяў прадстаўнік скране правых колаў рэспубліканскай партыі Бары Голдуотэр). Працягваючы курс свайго папярэдніка, Л. Джонсан абвясціў праграму **«Вялікага грамадства»** (англ. *Great Society*), у межах якой быў распрацаваны і рэалізаваны цэлы комплекс рэформ. Гэта стала новым этапам у развіцці ідэалогіі неалібералізму, разлічаным на тое, каб палепшыць жыццё мільёнаў белых і чорных беднякоў і ўключыць іх у створаную дзяржаўную сістэму сацыяльнай абароны.

У 1963, 1965 і 1969 гг. былі прыняты новыя законы аб грамадзянскіх правах, закліканыя пакласці канец найбольш відавочным фактам дыскрыміна-

цыі афраамерыканцаў ў галіне адукацыі і найму на працу. У 1964 г. Кангрэс прыняў XXIV папраўку да Канстытуцыі, якая ўводзіла забарону на абмежаванні выбарчых правоў на падставе нявыплаты падатку. Тым самым федэральны ўрад клаў канец палітыцы шэрагу штатаў, якія імкнуліся не дапусціць на выбарчыя ўчасткі беднае насельніцтва, значную частку якога складалі афраамерыканцы ды іміграны.

У межах «Вялікага грамадства» ажыццяўлялася таксама праграма барацьбы з беднасцю. Была істотна пашырана сацыяльная дапамога немаёмасным слаям насельніцтва. Аднак ва ўмовах вайны ў В'етнаме, маштабы якой ўсё больш і больш разрасталіся, адміністрацыя Л. Джонсана была вымушана скараціць альбо згарнуць некаторыя найбольш дарагія сацыяльныя праграмы.

**Рабочы і дэмакратычны рух у ЗША. Праблемы роўнасці правоў расавых і этнічных меншасцяў.**
**Рух сацыяльнага пратэсту. Студэнцкі рух. «Новыя левыя»**

Вельмі яскрава «кансерватыўная згода» рэспубліканцаў і дэмакратаў праявілася ў дачыненні да рабочага руху. Напачатку 1950-х гг., у перыяд Макартызму, ён знаходзіўся ў вельмі цяжкім становішчы. Гэта прымусіла вядучыя прафсаюзныя арганізацыі – Амерыканскую федэрацыю працы (АФП) і Кангрэс вытворчых прафсаюзаў (КВП) – адкінуць шматгадовыя спрэчкі і пайсці на аб'яднанне. У 1955 г. быў створаны адзіны прафсаюзны цэнтр ЗША – **Амерыканская федэрацыя працы-Кангрэс вытворчых прафсаюзаў (АФП-КВП)**, які аб'яднаў у сваіх шэрагах звыш 15 млн. чалавек. Тым не менш, прафсаюзы па-ранейшаму заставаліся пад уладай нязменнай прафсаюзнай бюракратыі, былі прасякнутыя карупцыяй і нават часам сувязямі з мафіёзнымі групоўкамі.

Антыдэмакратычная абстаноўка ў прафсаюзным руху свядома выкарыстоўвалася правячымі элітамі для далейшага ўзмацнення кантролю над прафсаюзамі. Новы антыпрафсаюзны закон Лэндрама – Грыфіна (1959), прыняты супольнымі намаганнямі і рэспубліканцаў, і дэмакратаў паставіў пад жорсткі кантроль выбары і функцыянаванне ўсіх службовых асоб прафсаюзаў і забараніў дзейнасць камуністаў у прафсаюзным руху.

У справе абароны грамадзянскіх правоў негрыцянскага насельніцтва ў 1950-я гг. намеціліся пазітыўныя зрухі. Важную ролю ў гэтым адыграла пастанова Вярхоўнага суда ЗША пра неканстытуцыйнасць сегрэгіраванага (адасобленага) навучання ў школах, прынятая ў траўні 1954 г. Насуперак актыўнаму супраціўленню расістаў узнялася моцная хваля негрыцянскага руху. Асноўнай яго формай сталі масавыя негвалтоўныя дзеянні барацьбітоў супраць расавай сегрэгацыі ў штатах Поўдню. У снежні 1955 г. у Мантгомеры, адміністрацыйным цэнтры штату Алабама, пачалася масавая кампанія афраамерыканцаў супраць расавай сегрэгацыі на гарадскім транспарце, якая працягвалася на працягу цэлага году.

Тактыка байкоту сегрэгіраванага аўтатранспарту, які ўзначаліў малады негрыцянскі святар Марцін Лютэр Кінг, была настолькі эфектыўнай, што прывяла да забароны гэтай формы расавай сегрэгацыі. Вялікага размаху дасягнула і барацьба супраць сегрэгацыі ў школьным навучанні і на выбарах у федэральныя і мясцовыя органы ўлады.

Пад уплывам масавага негрыцянскага руху ў 1957 і 1960 гг. Кангрэс ЗША прыняў першыя законы адносна аховы грамадзянскіх правоў афраамерыканцаў падчас выбарчай кампаній. Аднак і гэтыя, і папярэднія законы не былі дасканалымі, асабліва ў частцы забеспячэння правоў негрыцянскага насельніцтва, а таму не былі ў стане вырашыць гэтую складаную праблему.

З пачатку 1960 г. акцыі негвалтоўных дзеянняў набылі масавы характар. У якасці прылад барацьбы за свае правы афраамерыканцы разгарнулі масавыя маршы (напрыклад, марш на Вашынгтон 1963 г.) і паходы, сядзячыя дэманстрацыі, наведвалі кавярні, рэстараны ды іншыя публічныя месцы «толькі для белых». Менавіта гэтыя масавыя выступленні прымусілі кіраўнікоў краіны прыняць шэраг законаў аб грамадзянскіх правах афраамерыканцаў, а лідар апошніх – М. Л. Кінг атрымаў сваёй дзейнасцю міжнароднае прызнанне. «За дзейнасць на карысць раўнапраўя цемнаскурых» ён быў узнагароджаны Нобелеўскай прэміяй міру за 1964 г.

Далёка не ўсе афраамерыканцы былі гатовы, падобна М. Л. Кінгу, узброіцца хрысціянскай цярплівасцю і дамагацца справядлівасці негвалтоўнымі метадамі і сродкамі. У сярэдзіне 1960-х гг. у негрыцянскім руху вылучыліся радыкальныя групоўкі, якія выступалі з метадамі гвалтоўнай барацьбы за свае правы. Гэта, у прыватнасці, праявілася ў вулічных масавых сутыкненнях, што выбухнулі ў 1965 г. у Лос-Анджэлесе. Пра іх маштаб выдатна сведчыць тое, што для ўціхамірвання іх ўдзельнікаў спатрэбілася 10 тыс. нацыянальных гвардзейцаў і паліцэйскіх. Узнікла арганізацыя **«Чорныя пантэры»**, якая абвясціла сваёй мэтай «узброеную расавую вайну для звяржэння капіталістычнай сістэмы».

Расісцкія колы таксама не сядзелі склаўшы рукі. 4 красавіка 1968 г. ад кулі падасланага імі забойцы загінуў М. Л. Кінг. Пахаванне славутага лідара руху за грамадзянскія правы, у якім узялі ўдзел 150 тыс. чалавек, пераўтварыліся ў палітычную дэманстрацыю пратэсту супраць беззаконняў у дачыненні афраамерыканскага насельніцтва.

У 1960-я гг. масавы характар набыў студэнцкі рух. Галоўнае месца ў яго праграмных установках набылі лозунгі барацьбы супраць сацыяльнай несправядлівасці, беднасці, расавай дыскрымінацыі, культу грошай і духу нажывы, вайны ў В'етнаме і г. д. Узнікалі студэнцкія арганізацыі, якія ставілі сваёй задачай каардынацыю дзейнасці і выступленняў студэнтаў розных рэгіёнаў і ўніверсітэцкіх цэнтраў.

Найбольш прыкметную ролю сярод іх адыграла аб'яднанне **«Студэнты за дэмакратычнае грамадства»**. Складовай часткай гэтага руху сталі г. зв. **«новыя левыя»**. Яны выступалі з лозунгамі замены існуючай у Злучаных Штатах грамадска-палітычнай сістэмы на пачатках сацыяльнай справядлівасці і роўнасці, ліквідацыі расавай дыскрымінацыі, павагі правоў нацыянальных, канфесійных ды іншых меншасцяў, удасканалення сістэмы адукацыі і г. д. У адрозненне ад традыцыйных левых, якія згодна з ідэямі марксізму, у якасці галоўнай рухаючай сілы пераўтварэнняў разглядалі рабочы клас, яны бачылі гэткую сілу ў інтэлігенцыі і студэнцтве.

Шырокія маштабы набыў рух супраць вайны ў В'етнаме. Па ўсёй краіне разгарнуліся маршы і дэманстрацыі, кампаніі ўхілення ад прызыву ў армію і спалення прызыўных картак. Найбольш яркай праявай гэтага руху стала аблога Пентагона (ваеннага ведамства ЗША) ў 1967 г. Яна працягвалася некалькі сутак, і ў ёй ўзяло ўдзел каля 300 тыс. чалавек. Адным важнейшых вынікаў дзейнасці антываеннага руху стала згода адміністрацыі Л. Джонсана распачаць мірныя перагаворы з кіраўніцтвам Дэмакратычнай Рэспублікі В'етнам і рашэнне дзеючага прэзідэнта не ісці на прэзідэнцкія выбары 1968 г.

### Знешняя палітыка ЗША ў 1950 – 1960-я гг. Вайна ў Карэі. Адносіны ЗША з краінамі Еўропы. Карыбскі крызіс. ЗША і краіны «трэцяга свету». «Саюз дзеля прагрэсу», «Корпус міру». Вайна ў В'етнаме

Знешнепалітычны курс рэспубліканскай адміністрацыі зазнаў у 1950-я гг. істотную эвалюцыю. Нягледзячы на актыўную ролю ва ўрэгуляванні карэйскага канфлікту, новая ўлада пайшла па шляху радыкалізацыі кіруючых знешнепалітычных дактрын ЗША. Адкінуўшы дактрыну «стрымлівання камунізму», якая, на думку рэспубліканцаў, асуджала амерыканскую палітыку на пасіўнасць, Д. Эйзенхаўэр і дзяржаўны сакратар Джон Фостэр Далес абвясцілі, што яны абяруць курс на «вызваленне» ад камунізму народаў, што знаходзяцца пад «савецкім панаваннем». Дактрына **«вызвалення»** была неўзабаве дапоўненая тэзісам аб **«масіраванай адплаце»**. У студзені 1954 г. у прамове Дж. Ф. Далеса было заяўлена, што ў любой крытычнай сітуацыі Злучаныя Штаты адгэтуль будуць па ўласнаму разуменню звяртацца да «застрашальнай сілы масіраванай адплаты».

Тым не менш, практычная рэалізацыя падобных ідэй незваротна прывяла б да ўсеагульнай ядзернай вайны. Таму фактычна адміністрацыя Д. Эйзенхаўэра вярнулася да палітыкі «стрымлівання камунізму». Яна аказвала дапамогу Францыі ў вайне супраць народаў Індакітаю. Пасля правалу гэтых намаганняў Злучаныя Штаты пайшлі на стварэнне **СЕАТО** (англ. *South-East Asia Treaty Organization, SEATO*) – вайсковага блоку дзяржаў Паўднёва-ўсходняй Азіі і раёнаў Ціхага акіяну. Летам 1954 г. пры дапамозе ЗША была падаўлена рэвалюцыя ў Гватэмале.

Тым не менш, у сярэдзіне 1950-х гг. з'яўляюцца першыя прыкметы паслаблення міжнароднай напружанасці. Асаблівую папулярнасць набыла ідэя склікання нарады на вышэйшым узроўні. У ліпені 1954 г. у Жэневе адбылася сустрэча кіраўнікоў урадаў СССР, ЗША, Вялікабрытаніі і Францыі. Хаця гэтая нарада не прывяла да вырашэння якіх-небудзь канкрэтных праблем сусветнай палітыкі, «дух» Жэневы аказаў заспакойваючае ўздзеянне на ўвесь свет і спрыяў нармалізацыі міжнароднай абстаноўкі.

У другой палове 1950-х гг. адбылося некаторае паляпшэнне амерыкана-савецкіх адносін. Вялікую ролю ў пераадоленні многіх антысавецкіх забабонаў адыграў афіцыйны візіт М. С. Хрушчова ў ЗША ў верасні 1959 г. Напрыканцы 1950-х гг. было падпісанае савецка-амерыканскае пагадненне аб рэгулярных абменах у галіне навукі, культуры і адукацыі.

Аднак вялікія дзяржавы па-ранейшаму імкнуліся да рэалізацыі сваіх глабальных знешнепалітычных мэт, а таму сутыкненні іх інтарэсаў працягваліся. Што ў першую чаргу праявілася падчас «будапешцкай восені» 1956 г. Нягледзячы на паляпшэнне савецка-амерыканскіх адносін, працягваліся разведвальныя палёты амерыканскіх ваенных самалётаў над тэрыторыяй СССР. У траўні 1960 г. адзін з іх быў збіты савецкай ракетай. У выніку гэтага інцыдэнту была сарваная нарада на вышэйшым узроўні ў Парыжы і візіт амерыканскага прэзідэнта ў Савецкі Саюз.

У знешняй палітыцы адміністрацыі Дж. Ф. Кенэдзі праявіліся вельмі супярэчлівыя тэндэнцыі. Галоўныя намаганні па-ранейшаму былі накіраваны на супрацьстаянне Савецкаму Саюзу. Галоўнай арэнай гэтай барацьбы ў 1961 – 1962 гг. стала Куба. У красавіку 1961 г. на амерыканскіх караблях і пад прыкрыццем амерыканскай авіяцыі на кубінскай тэрыторыі, у заліве Качынас, быў высаджаны дэсант кубінскіх эмігрантаў. Пасля правалу гэтай спробы ўзброенай інтэрвенцыі супраць кубінскай рэвалюцыі ўлады ЗША працягвалі варожую палітыку супраць сваёй астраўной суседкі. Гэта падштурхнула ўрад СССР на скрайне рызыкоўны і небяспечны крок: у верасні 1962 г. ён пачаў таемнае размяшчэнне на кубе ядзерных ракет сярэдняй дальнасці. Калі гэта стала вядома амерыканскай адміністрацыі, 22 кастрычніка 1962 г. яна абвясціла ваенна-марскую блакаду Кубы. Гэтак пачаўся **Карыбскі крызіс**. На працягу некалькіх дзён існавала рэальная пагроза сусветнай ядзернай вайны. І толькі ўзаемная стрыманасць, праяўленая ў гэты небяспечны момант кіраўнікамі дзвюх вялікіх дзяржаў, дазволіла дасягнуць кампрамісу. Пасля Карыбскага крызісу 1962 г. дзяржаўныя дзеячы ЗША імкнуліся не даводзіць амерыкана-савецкія адносіны да гэткай небяспечнай кропкі. Больш таго, у сваёй прамове ў Амерыканскім універсітэце ў Вашынгтоне 10 чэрвеня 1963 г. прэзідэнт заявіў, што важнейшыя міжнародныя праблемы трэба вырашаць не ваеннымі, а мірнымі сродкамі, і што Злучаныя Штаты гатовыя «весці мірнае спаборніцтва з любой іншай сістэмай на

зямным шары». Акрамя таго, у 1963 г. адміністрацыя Дж. Ф. Кенэдзі падпісала Маскоўскі дагавор аб забароне ядзерных выпрабаванняў у атмасферы, пад вадой і ў паветры («у трох асяроддзях»).

У сваёй палітыцы ў дачыненні Лацінскай Амерыкі адміністрацыя Дж. Ф. Кенэдзі ўзяла курс на ажыццяўленне абвешчанай у 1961 г. праграмы дапамогі краінам рэгёну ў межах праграмы **«Саюз дзеля прагрэсу»**. Буйныя фінансавыя сродкі, асігнаваныя Злучанымі Штатамі, дазволілі гэтым краінам пачаць ажыццяўленне важных сацыяльна-эканамічных пераўтварэнняў з мэтай ўмацавання пазіцый ліберальна-рэфармісцкіх колаў мясцовай буржуазіі і паслаблення ўплыву кубінскай рэвалюцыі. Акрамя таго, у 1961 г. быў створаны г. зв. **«Корпус міру»** – арганізацыя добраахвотнікаў, якія выявілі жаданне працаваць у адсталых краінах у галіне эканомікі, адукацыі, аховы здароўя і г. д. Абедзве праграмы мелі сваёй галоўнай мэтай далейшае ўзмацненне ўплыву ЗША на міжнароднай арэне праз паляпшэнне амерыканскага іміджу ў свеце.

Гэтыя пазітыўныя зрухі, аднак, былі ў хуткім часе практычна перакрэсленыя **вайной у В’етнаме (1965 – 1973)**. Актыўнае ўмяшанне ЗША ў падзеі ў Паўднёва-ўсходняй Азіі пачалося з моманту краху французскага каланіяльнага панавання ў Індакітаі. Ужо пры Дж. Ф. Кенэдзі ў Паўднёвы В’етнам былі накіраваны 16 тыс. амерыканскіх салдат і афіцэраў. Летам 1964 г. быў зроблены новы крок у гэтым накірунку. На падставе аднабаковай інтэрпрэтацыі характару падзей у Танкінскім заліве, дзе адбыўся інцыдэнт паміж амерыканскімі эсмінцамі і тарпеднымі катэрамі камуністычнага Паўночнага В’етнаму, Белы дом (назва рэзідэнцыі прэзідэнта) дабіўся прыняцця Кангрэсам рэзалюцыі, якая давала прэзідэнту паўнамоцтвы на выкарыстанне ўзброеных сіл для «спынення камуністычнай агрэсіі» у Паўднёва-ўсходняй Азіі.

Пакуль ішла перадвыбарчая кампанія 1964 г. Л. Джонсан неаднаразова паўтараў, што ён не мае намеру пасылаць амерыканскія войскі ў Індакітай. Але пасля перамогі на выбарах пачалася рэалізацыя ваенных планаў, якія таемна распрацоўваліся ў ЗША. У лютым 1965 г. прэзідэнт загадаў пачаць масіраваныя бамбардзіроўкі Паўночнага В’етнаму, а потым накіраваў у Паўднёвы В’етнам першую партыю амерыканскіх войск. Ужо праз тры гады ў В’етнаме дзейнічала 550-тысячная амерыканская армія. Нягледзячы на беспрэцэдэнтную магутнасць амерыканцы не здолелі перамагчы в’етнамскі народ і, у рэшце рэшт, былі вымушаныя прызнаць сваё паражэнне.

### Змены ў эканамічным становішчы краіны на мяжы 1960 – 1970-х гг. Сусветны эканамічны крызіс 1974 – 1975 гг. у ЗША і яго наступствы. Энергетычная праблема. Крызіс 1980 – 1981 гг. «Рэйганоміка» і яе вынікі

На мяжы 1960 – 70-х гг. адбылося сур’ёзнае пагаршэнне эканамічнай кан’юнктуры. У другой палове 1969 г. у ЗША пачаўся чарговы спад дзела-

вой актыўнасці. Праўда, як і ў 1950-я гг., новае падзенне прамысловай вытворчасці аказалася параўнальна невялікім – каля 8 %. Затое яно стала куды больш працяглым. Толькі вясной 1972 г. эканоміка ЗША ўступіла ў фазу ўздыму. Падзенне вытворчасці закранула як традыцыйныя, гэтак і новыя, народжаныя НТР галіны. Яшчэ больш важнай асаблівасцю 1969 – 1971 гг. было тое, што ўпершыню ў гісторыі цыклічных крызісаў перавытворчасці скарачэнне аб'ёму прамысловай прадукцыі суправаджалася не зніжэннем, а далейшым падвышэннем узроўню цэн. Упершыню ўзнік феномен «**стагфляцыі**», г. зн. спалучэння стагнацыі вытворчасці ды інфляцыі, што стварала больш цяжкія ўмовы для пераадолення крызісу. Дэпрэсіўны стан эканомікі вымусіў адміністрацыю Р. Ніксана звярнуцца да надзвычайных захадаў, што атрымалі назву «новай эканамічнай палітыкі».

Сітуацыя ў амерыканскай эканоміцы рэзка абвастрылася ў сувязі з сусветным энергетычным крызісам 1973 г. Паколькі 1/3 нафты, якая спажывалася ЗША, імпартавалася з арабскіх краін, гэта балюча ўдарыла па іх эканоміцы.

Эканамічны крызіс 1974 – 1975 гг. у ЗША праявіўся ў больш вострай форме, чым у іншых буйных эканоміках капіталістычнага свету, але па сваіх паказчыках саступаў Вялікай дэпрэсіі 1929 – 1933 гг. У адрозненне ад мінулых эканамічных спадаў пасляваеннага перыяду, ён характарызаваўся значным спадам прамысловай вытворчасці: вясной 1975 г. ён дасягнуў 15 %. Павольна ішло аднаўленне эканомікі: дакрызісны ўзровень вытворчасці быў дасягнуты толькі да канца 1976 г. Наступіўшы пасля гэтага прамысловы ўздым быў адносна кароткім, і ўжо напрыканцы 1979 г. намеціліся першыя прыкметы новага эканамічнага спаду. У цэлым за 1970-я гг. тэмпы эканамічнага росту ў ЗША скараціліся у параўнанні з папярэднім дзесяцігоддзем прыкладна ўдвая. Злучаныя Штаты, як і іншыя капіталістычныя краіны, выйшлі з фазы бурнага эканамічнага росту і сутыкнуліся з цэлым шэрагам новых праблем.

У ходзе крызісу 1974 – 1975 гг. з яшчэ большай сілай праявіўся ўплыў стагфляцыі, з якім амерыканская эканоміка ўпершыню сутыкнулася ва ўмовах спаду 1969 – 1971 гг. Падзенне вытворчасці і рост беспрацоўя ізноў суправаджалася значным узмацненнем тэмпаў інфляцыі. Гэта рэзка зніжала эфектыўнасць кейнсіянскіх метадаў крэдытна-фінансавага рэгуляванне эканомікі.

Крызіс выявіў залежнасць краіны ад імпарту і знешнегандлёвай эканамічнай кан'юнктуры ў цэлым. За гады крызісу абвастрылася саперніцтва развітых капіталістычных краін на сусветным рынку, прычым у шэрагу важнейшых галін ЗША страціла першынство на карысць ФРГ і Японіі. Павелічэнне сусветных цэн на нафту прывяло да ўтварэння аграмаднага дэфіцыту гандлёвага балансу, што, ў сваю чаргу, спрыяла паслабленню пазіцый долара на сусветных валютных рынках.

Лічачы адным з прыярытэтных накірункаў эканамічнай палітыкі вырашэнне энергетычнай праблемы, адміністрацыя Дж. Картэра прапанавала энергетычную праграму. Яна ўключала ў сябе павелічэнне вытворчасці нафты і вугалю ў саміх Злучаных Штатах; стварэнне ў краіне буйных стратэгічных запасаў нафты; увядзенне захадаў па эканоміі нафты ў прамысловасці і быту; садзейнічанне дзяржавы распрацоўке і вытворчасці новых відаў паліва, крыніц энергіі і г. д. Аднак ні пачатак рэалізацыі гэтай праграмы, ні іншыя падобныя захады былі няздольныя вырашыць галоўныя эканамічныя праблемы. Запавольванне тэмпаў эканамічнага росту прывяло да таго, што ў 1980 г. узровень ВНП на душу насельніцтва ЗША быў ніжэйшым, чым у ФРГ, Вялікабрытаніі і Францыі і ўжо толькі на 15 % перавышаў японскі.

Разам з пагаршэннем эканамічнай кан’юнктуры стала змяняцца сацыяльна-псіхалагічная абстаноўка ў краіне, узрастала расчараванне насельніцтва ў выніках палітыкі дзяржаўнага рэгулявання. Зніжэнне тэмпаў эканамічнага росту, бюджэтны дэфіцыт, рост кошту жыцця, узмацненне падатковага цяжару, – усе гэтыя, характэрныя для 1970-х гг., тэндэнцыі сталі ўспрымацца грамадскай думкай як непазбежны вынік дзяржаўнага рэгулявання. Не толькі ў колах буйнога бізнесу, але і ў сярэдніх слаях насельніцтва сталі ўзмацняцца настроі на карысць абмежавання маштабаў умяшання дзяржавы ў эканоміку, часцей сталі гучаць галасы тых, хто пратэставаў супраць марнатраўства федэральнага ўраду, неправамерных прэтэнзій сацыяльных утрыманцаў за кошт мас падаткаплацельшчыкаў.

Паварот да неакансерватыўнай палітыкі адбыўся толькі напачатку 1980-х гг. з прыходам у Белы дом рэспубліканскай адміністрацыі прэзідэнта Рональда Рэйгана (1981 – 1989). Гэтая палітыка атрымала назву **«рэйганоміка»**.

Праграма аздараўлення амерыканскай эканомікі ўключала наступныя палажэнні: скарачэнне падаткаў на карпарацыі і асабістых падаходных падаткаў; абмежаванне росту ўрадавых выдаткаў за кошт скарачэння сацыяльных праграм; дэрэгуляванне прадпрымальніцкай дзейнасці; правядзенне жорсткай крэдытна-грашовай палітыкі, скіраванай на пераадоленне інфляцыі.

Ажыццяўленне праграмы адміністрацыі Р. Рэйгана сутыкнулася з сур’ёзнымі цяжкасцямі. У 1980 – 1982 гг. эканоміку краіны ахапіў новы крызіс, які адбіўся на становішчы бізнесу ў многіх выпадках мацней, чым крызіс сярэдзіны 1970-х гг. На працягу 1982 г. бяздзейнічалі 30 % вытворчых магутнасцей у апрацоўваючай прамысловасці. Рэзка пагоршылася становішча ў аўтамабілебудаванні, жыллёвым будаўніцтве, галінах, што выраблялі тавары шырокага спажывання. Беспрацоўе складала каля 10 % працоўнай сілы.

Скарачэнне выдаткаў стала першым крокам эканамічнай палітыкі Р. Рэйгана. Кангрэсам быў прыняты закон аб зніжэнні падаходных падаткаў на 25 % на працягу трох гадоў, а таксама аб скарачэнні федэральных выдаткаў на

сацыяльныя патрэбы. Меркавалася, што у выпадку скарачэння падаткаў павялічацца інвестыцыі ў вытворчасць, што створыць новыя працоўныя месцы, павялічыць нацыянальны прадукт і, як вынік, урад атрымае вялікі падатковы даход, нягледзячы на зніжэнне ставак падаткаабкладання.

У галіне сацыяльнай палітыкі была высунута праграма «новага федэралізму». У адпаведнасці з ёй падзяляліся функцыі федэральных, штатавых і мясцовых органаў улады ў забеспячэнні матэрыяльнай падтрымкі бяднейшай часткі насельніцтва. Асноўная адказнасць за ажыццяўленне дабрачынных праграм ускладалася на ўрады штатаў.

Да канца першага тэрміну праўлення адміністрацыі Р. Рэйгана інфляцыя ўпала да 4 %, а беспрацоўе скарацілася да 8 %. Разам з тым зніжэнне падаткаў пакуль не прывяло да чаканага росту інвестыцый у вытворчасць. Карціна аздараўлення азмрочвалася таксама і ростам дэфіцыту дзяржаўнага бюджэту, галоўным чынам за кошт павелічэння выдаткаў на ваенныя мэты.

Асноўныя прыярытэты сацыяльна-эканамічнай палітыкі першага тэрміну прэзідэнцтва Р. Рэйгана засталіся нязменнымі і на другі тэрмін. У адпаведнасці з падатковым законам 1986 г. максімальны асабісты падаходны падатак быў зніжаны з 50 % да 28 %, а падатак на прыбытак карпарацый – з 46 % да 34 %. Закон увогуле вызваліў 6 млн. грамадзян з нізкімі падаткамі ад выплаты федэральных падаткаў. Гэтая падатковая палітыка гэтым разам рэальна стымулявала інвестыцыйную актыўнасць і дала магчымасць палепшыць сваё становішча «сярэдняму класу».

У 1983 г. у ЗША пачаўся сямігадовы гаспадарчы ўздым, які праходзіў ва ўмовах глыбокай структурнай перабудовы эканомікі, звязанай з новым этапам навукова-тэхнічнай рэвалюцыі. Значныя інвестыцыі ў тэхніку апрацоўкі інфармацыі (ЭВМ, абсталяванне сувязі, кантрольна-вымяральныя і навуковыя прыборы) узрасталі штогод у сярэднім на 13 %.

У выніку ўздыму 1983 – 1989 гг. рэальны аб'ём ВНП і прадукцыя прамысловай вытворчасці ў 1989 г. перавысілі іх перадкрызісныя максімальныя ўзроўні 1979 г. амаль на 28 %. Аб'ём асабістага спажывання сярэдняга амерыканца на 1/3 перавысіў узровень 1979 г. Спажывецкі попыт сведчыў пра рост даходаў насельніцтва і з'явіўся стымулам гаспадарчага ўздыму. Амерыканская эканоміка здолела стварыць звыш 17 млн. новых працоўных месцаў, галоўным чынам у галіне сферы паслуг. Беспрацоўе трымалася на ўзроўні 5 % – самым нізкім пасля 1973 г.

Галоўнымі фактарамі эканамічнага ўздыму 1983 – 1989 гг. сталі наступныя: заканчэнне структурнай перабудовы эканомікі, што стварыла ўмовы для паскарэння абнаўлення і пашырэння асноўнага капіталу; устойлівы рост рэальнага аб'ёму асабістага спажывання; стабілізацыя курсу долара на параўнальна

нізкім узроўні адносна іншых валют, што дазволіла прыцягнуць у амерыканскую эканоміку аграмадныя фінансавыя рэсурсы іншых краін.

Разам з тым у 1980-я гг. назіраліся і негатыўныя тэндэнцыі сацыяльна-эканамічнага развіцця. У выніку «рэйганомікі» замацаваўся буйны дэфіцыт дзяржаўнага бюджэту. Калі ў 1960-х гг. ВНП на душу насельніцтва ў ЗША быў найбольшым у свеце, то ў 1987 г. амерыканскі паказчык быў толькі 11-ым. Пачасовы заробак амерыканскіх рабочых на трэць саступаў узроўню аплаты працы калег са Швецыі і ФРГ.

Ужо напрыканцы 1980-х гг., пасля працяглага ўздыму, эканоміка ЗША ўступіла ў перыяд рэзкага запавольвання тэмпаў росту. Дэпрэсіўны стан амерыканскай эканомікі ў 1989 – 1992 гг. тлумачыўся не толькі цыклічнымі фактарамі, але таксама нецыклічнымі працэсамі – праблемамі ў крэдытна-фінансавай сферы і скарачэннем дзяржаўных ваенных закупак. Асабліва востра стаяла пытанне дэфіцыту дзяржаўнага бюджэту і ўзрастальная дзяржаўная запазычанасць – Злучаныя Штаты пераўтварыліся ў буйнейшага даўжніка ў свеце.

### Праблемы ўнутранай палітыкі краіны ў 1970 - 1980-я гг. Крызіс неалібералізму. Уздым кансерватыўных настрояў. «Уотэргейцкая справа». Прэзідэнцкія выбары 1980 г. Унутрыпалітычны курс рэспубліканцаў

Прыход да ўлады Рычарда Ніксана (1969 – 1974) можна назваць пачаткам рэспубліканскага цыклу ў палітычнай гісторыі Злучаных Штатаў. За выключэннем чатырохгадовага знаходжання на прэзідэнцкай пасадзе дэмакрата Дж. Картэра (1977 – 1981) на працягу пяці тэрмінаў з шасці ў 1969 – 1993 гг. высокую пасаду ў Белым доме займалі прэзідэнты рэспубліканцы.

Унутраная палітыка рэспубліканскай адміністрацыі Р. Ніксана была накіраваная галоўным чынам на пераадоленне праблем эканомікі. Новы прэзідэнт адразу ж узяў курс на паслабленне рэгулюючых функцый дзяржавы. Ва ўмовах пастаяннага пагаршэння яе асноўных паказчыкаў ужо ў жніўні 1971 г. прэзідэнт абвясціў «новую эканамічную палітыку», якая перадусім прадугледжвала замарожванне цэн і заробкаў, скарачэнне шэрагу сацыяльных праграм, напрыклад па барацьбе з беднасцю, падтрымцы сістэмы адукацыі ды інш. Тым не менш, урад не мог адмовіцца ад ужо замацаваных сацыяльных стандартаў. Р. Ніксан быў вымушаны адмовіцца не толькі ад застарэлых дактрын «цвёрдага індывідуалізму», але і ад неакансерватыўных поглядаў у іх эйзенхаўэраўскім варыянце. Сацыяльная філасофія рэспубліканцаў стала мадэрнізавацца, запазычваючы з арсеналу неалібералізму неакейнсіянскія прынцыпы. Таму да сярэдзіны 1970-х гг. ідэйна-палітычныя дактрыны рэспубліканскай і дэмакратычнай партый у пэўнай ступені зблізіліся.

Пад лозунгам «закон і парадак» былі прынятыя жорсткія захады супраць удзельнікаў антываеннага і студэнцкага рухаў. Свайго піку яны дасягнулі ў

траўні 1970 г., калі супраць студэнтаў Кенцкага ўніверсітэту была ўжытая зброя, у выніку чаго ад паліцэйскіх куляў загінула чацвёра студэнтаў.

Аднак у найбольшай ступені прэзідэнцтва Р. Ніксана было азмрочана скандалам, які выбухнуў неўзабаве пасля прэзідэнцкіх выбараў 1972 г. (дзеючы прэзідэнт атрымаў пераканаўчую перамогу над дэмакратам Джорджам Макговернам). Падчас расследавання парушэнняў законнасці, якія былі выяўлены журналістамі шэрагу вядучых газет ЗША, сталі вядомыя факты пранікнення карупцыі ў вышэйшыя эшалоны ўлады і злоўжывання ўладай высокімі службовымі асобамі. У прыватнасці, было высветлена, што падчас выбарчай кампаніі прадстаўнікі рэспубліканцаў ажыццявілі спробу ўзлому і выкрадання дакументаў у штаб-кватэры дэмакратычнай партыі, якая размяшчалася ў вашынгтонскім гатэлі «Уотэргейт».

**«Уотэргейцкая справа»** атрымала шырокі розгалас. У выніку скандальных выкрыццяў Р. Ніксан пад пагрозай імпічменту (палітычнага асуджэння і адхілення ад пасады з магчымасцю далейшага судовага пераследавання) 9 жніўня 1974 г. быў вымушаны добраахвотна падаць у адстаўку. Новым прэзідэнтам стаў нядаўна прызначаны віцэ-прэзідэнтам Джэральд Форд (1974 – 1977). Папярэдні намеснік Р. Ніксана – Спіра Агню – страціў сваю пасаду таксама з-за гэтага скандалу.

У 1976 г. Злучаныя Штаты шырока адзначалі 200-годдзе са дня абвяшчэння незалежнасці. У гэтым жа годзе адбыліся чарговыя прэзідэнцкія выбары, у якіх кандыдат ад дэмакратычнай партыі Джэймс (Джымі) Картэр (1977 – 1981), які ў сваёй праграме абяцаў пакласці канец карупцыі, скараціць вайсковыя выдаткі, палепшыць сістэмы адукацыі і аховы здароўя, скараціць беспрацоўе і г. д., атрымаў перамогу над дзеючым прэзідэнтам Дж. Фордам.

Нягледзячы на амбіцыйныя планы прэзідэнта-дэмакрата ў сацыяльна-эканамічнай сферы і знешняй палітыцы, рэальныя поспехі адміністрацыі да 1980 г. аказаліся зусім недастатковымі для пераабрання. З усіх бакоў на Дж. Картэра абрынуліся шмат у чым справядлівыя абвінавачванні ў слабасці, некампетэнтнасці, няздольнасці даць рады колькі-небудзь складаным ўнутраным і знешнепалітычным праблемам. На чарговых прэзідэнцкіх выбарах ён пацярпеў паражэнне ад кандыдата рэспубліканскай партыі, былога галівудскага актора і нават былога старшыні прафсаюзу галівудскіх кінаактораў, экс-губернатара Каліфорніі Рональда Рэйгана (1981 – 1989). Перавага добра вядомага і многімі любімага актора і дзяржаўнага дзеяча, надзеленага абаяннем і ўзброенага наватарскімі эканамічнымі ідэямі і кідкімі лозунгамі («*Спад – гэта калі ваш сусед губляе працу, крызіс – калі працу губляеце вы, а выздараўленне эканомікі – калі губляе працу Джымі Картэр*») была яўнай.

Сацыяльна-эканамічная праграма адміністрацыі Р. Рэйгана выклікала спачатку моцнае незадавальненне той часткі амерыканскага грамадства, якая ў

найбольшай ступені цярпела ад згортвання сацыяльных праграм. Напрыклад, у верасні 1981 г. адбыўся паўмільённы паход беспрацоўных ды іншых груп маламаёмаснага насельніцтва на Вашынгтон. Але хваля пратэсту не набыла ў ЗША масавага характару, як, напрыклад, гэта здарылася ў Вялікабрытаніі. Антырэйганаўскія настроі сталі яшчэ больш паслабляцца пасля таго, як у 1983 г. з'явіліся першыя прыкметы паляпшэння эканамічнай кан'юнктуры.

Р. Рэйгану ўдалося пераадолець эканамічны спад і вывесці эканоміку краіны на шлях эканамічнага росту. Гэта, а таксама жорсткая антысавецкая лінія і некаторыя іншыя фактары дазволілі яму быць пераабраным на пасаду прэзідэнта ў 1984 г. Перамога Р. Рэйгана была проста бліскучай: за яго прагаласавалі 54 млн. выбаршчыкаў, што забяспечыла яму 525 галасоў калегіі выбаршчыкаў. Кандыдат дэмакратаў – экс-віцэ-прэзідэнт (1977 – 1981) і сенатар ад штату Мінесота Уолтэр Мандэйл – атрымаў толькі 37 млн. галасоў і перамог толькі ў сваім родным штаце і сталічнай акрузе Калумбія (усяго толькі 13 галасоў калегіі выбаршчыкаў). Не дапамагло яму (магчыма нават зашкодзіла) і тое, што ў пары з ім як кандыдат на пасаду віцэ-прэзідэнта ўпершыню ў амерыканскай гісторыі выступала жанчына – Джэральдзін Ферара. І ў наступныя некалькі гадоў пазіцыі рэспубліканцаў выглядалі вельмі трывала (выключэнне складала Палата прадстаўнікоў, дзе дэмакраты захоўвалі большасць з 1954 па 1992 гг.).

Кандыдатам рэспубліканскай партыі на прэзідэнцкіх выбарах 1988 г. быў выстаўлены Джордж Буш (старэйшы), які ў дзвюх адміністрацыях Р. Рэйгана займаў пасаду віцэ-прэзідэнта. Унутры- і знешнепалітычныя поспехі рэспубліканцаў стварылі выдатную базу для чарговай перамогі. Дж. Буш (1989 – 1993) упэўнена апярэдзіў свайго саперніка – дэмакрата Майкла Дукакіса, губернатара штату Масачусетс.

### Знешняя палітыка ЗША ў 1970 – 1980-я гг. Заканчэнне вайны ў В'етнаме. Савецка-амерыканскі дыялог. ЗША і агульнаеўрапейскі працэс. «Новая стратэгічная ініцыятыва» Р. Рэйгана. Нармалізацыя савецка-амерыканскіх адносін у другой палове 1980-х гг. ЗША і рэгіянальныя канфлікты. Удзел ЗША у вайне ў Персідскім заліве

У першай палове 1970-х гг. адбыліся істотныя зрухі ў знешняй палітыцы ЗША. Важнейшай задачай адміністрацыі Р. Ніксана стала пытанне наконт вайны ў В'етнаме. Першапачаткова новы прэзідэнт выступіў за **«в'етнамізацыю»** вайны: Злучаныя Штаты працягвалі аказваць шчодрую падтрымку паўднёвав'етнамскаму рэжыму, але на яго ж меркавалася ўскласці асноўную адказнасць за вядзенне баявых дзеянняў. Удзел амерыканскіх узброеных сіл планавалася паступова згарнуць.

Аднак даволі хутка адміністрацыя Р. Ніксана пераканалася ў бесперспектыўнасці пошуку вайсковага вырашэння канфлікту і пайшла на перага-

воры. У студзені 1973 г. было падпісана пагадненне аб спыненні вайны, а ў красавіку 1975 г. апошнія амерыканскія войскі пакінулі тэрыторыю В'етнама. У 1975 – 1976 гг. адбылося канчатковае аб'яднанне в'етнамскай дзяржавы.

Пры прэзідэнце Р. Ніксане адбыліся пазітыўныя змены ў савецка-амерыканскіх адносінах, якія зрабілі важны ўнёсак у разрадку міжнароднай напружанасці. У 1970 г. набыў моц падпісаны яшчэ ў 1968 г. Дагавор аб нераспаўсюджванні ядзернай зброі. Асабліва важнае значэнне меў візіт амерыканскага прэзідэнта ў Маскву і падпісанне паміж ЗША і СССР дзесяці пагадненняў («Асновы ўзаемаадносін», Дагавор аб проціракетнай абароне (ПРО), Часовае пагадненне аб замарожванні наступальнай стратэгічнай зброі ды інш.). У дадатак да іх у 1973 г. былі падпісаны пагадненні аб прадухіленне ядзернай вайны і пра далейшае скарачэнне проціракетнай абароны.

Гэтыя і наступныя дамоўленасці спрыялі значнаму паслабленню напружанасці як у амерыкана-савецкіх адносінах, гэтак і ў свеце ў цэлым. Паказчыкам гэтых пазітыўных зрухаў з'явіўся, у прыватнасці, савецка-амерыканскі касмічны эксперымент 15 – 25 ліпеня 1975 г., у ходзе якога была здзейсненая стыкоўка ў космасе караблёў двух краін – савецкага «Саюза» і амерыканскага «Апалона». Паляпшэнне двубаковых адносін спрыяла паспяховаму правядзенню летам 1975 г. у Хельсінкі Заключнай нарады па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе і агульнаму паляпшэнню знешнепалітычнага клімату на гэтым кантыненце.

Прэзідэнт-дэмакрат Дж. Картэр прыйшоў да перамогі выкарыстоўваючы лозунгі працягу і пашырэння разрадкі міжнароднай напружанасці, барацьбы за абарону правоў і свабод чалавека ва ўсіх краінах, незалежна ад пануючых там сацыяльна-палітычных парадкаў.

Сапраўды, да знешнепалітычных поспехаў адміністрацыі Дж. Картэра трэба аднесці падпісанне ў 1979 г. падчас сустрэчы кіраўнікоў ЗША і СССР новага амерыкана-савецкага **Дагавору аб абмежаванні стратэгічных узбраенняў (АСУ-2)**. Хаця Сенат Злучаных Штатаў і не ратыфікаваў гэтае пагадненне, абодва бакі па ўзаемнай згодзе ў духу эпохі разрадкі пільнаваліся яго асноўнымі палажэннямі.

У цэлым пазітыўна можна ацаніць і Кэмп-Дэвідскае (па назве загарадай рэзідэнцыі амерыканскіх прэзідэнтаў) сепаратнае пагадненне, якое было заключана пры пасрэдніцтве ЗША Ізраілем і Егіптам у верасні 1978 г. Яно па-сутнасці вывела Егіпет з адзінага блоку арабскіх дзяржаў, што вялі барацьбу супраць Ізраіля, і дазволіла некалькі зняць напружанне і пагрозу новай буйнамаштабнай вайны на Блізкім Усходзе. У 2002 г. за гэтае пагадненне і пазнейшую міжнародную дзейнасць Дж. Картэр атрымаў Нобелеў-

скую прэмію міру. Таксама амерыканская адміністрацыя была вымушана пайсці на падпісанне з Панамай пагаднення пра вяртанне гэтай краіне ў 2000 г. Панамскага каналу, праўда, абставіўшы яго шэрагам выгодных для Вашынгтона ўмоў.

Аднак у той жа самы час Злучаныя Штаты атрымалі адзін з мацнейшых udараў па сваёй знешняй палітыцы і прэстыжу. Неўзабаве пасля пачатку Ісламскай рэвалюцыі ў Іране ў 1979 г. іранскія студэнты ўзялі ў заложнікі амерыканскіх дыпламатаў у Тэгеране. Бясслаўныя спробы перагаворных і сілавых спосабаў іх вызвалення прадэманстравалі свету бяссілле амерыканскай адміністрацыі Дж. Картэра вырашаць знешнепалітычныя вузлы супярэчнасцяў тонкімі і нестандартнымі сродкамі. Заложнікі былі вызвалены праз 5 хвілін пасля прыняцця прысягі новым прэзідэнтам Р. Рэйганам.

Ужо з канца 1979 г. адбыўся паварот да новага этапу «халоднай вайны» і новага вітка «гонкі ўзбраенняў». Кіраўніцтвам НАТО на Брусельскай сустрэчы ў снежні 1979 г. па настаянні Вашынгтону было прынятае рашэнне пра размяшчэнне ў Заходняй Еўропе, пачынаючы з 1983 г., ракет сярэдняга радыусу дзеяння.

Напачатку 1980-х гг. адбываецца новае абвастрэнне міжнароднай напружанасці. Немалы ўнёсак у гэта зрабіла адміністрацыя Р. Рэйгана, якая пачала масіраваную кампанію супраць СССР, малюючы яго ў сваёй прапагандзе як «імперыю зла» і абвяшчаючы **«крыжовы паход супраць камунізму»**. Р. Рэйган абвясціў сваёй мэтай выматаць праціўніка і аслабіць эканамічна, навязаўшы яму нястрымную гонку ўзбраенняў.

Вайсковыя выдаткі ЗША за 1980-я гг. узраслі больш як удвая і дасягнулі астранамічнай сумы ў $291 млрд. Пры ім была разгорнутая вельмі дарагая ваенна-даследчая праграма **«Стратэгічная абарончая ініцыятыва» (САІ)**, атрымаўшая неафіцыйную назву «зорныя войны». Яна прадугледжвала стварэнне буйнамаштабнай сістэмы проціракетнай абароны з элементамі касмічнага базіравання. На яе рэалізацыю былі выдаткаваныя многія мільярды долараў, але практыка паказала нерэалістычнасць, а часам нават шчырую фантастычнасць распрацаваных планаў.

Другі тэрмін прэзідэнцтва Р. Рэйгана азнаменаваўся чарговым паваротам знешнепалітычнай стратэгіі правячых колаў ЗША ў бок рэалізму і паляпшэння адносін з СССР. Гэтаму спрыяў цэлы комплекс фактараў, а асабліва прыход да ўлады ў 1985 г. новага савецкага кіраўніцтва на чале з М. С. Гарбачовым. Немалаважнае значэнне таксама мела ўсведамленне самімі правячымі коламі ЗША бесперспектыўнасці стратэгіі нарошчвання гонкі ўзбраенняў і пагібельнасці ўстановак на атрыманне перамогі ў ядзернай вайне.

Важнейшай падзеяй на шляху паслаблення напружанасці ў амерыкана-савецкіх адносінах стала сустрэча ў вярхах кіраўнікоў ЗША і СССР у Рэйк'явіку (Ісландыя) у кастрычніку 1986 г. Нягледзячы на істотныя супярэчнасці практычна па ўсіх важнейшых пытаннях, была дасягнута прынцыповая згода (не зафіксаваная пісьмова) па пытаннях як стратэгічных узбраенняў, гэтак і ракет сярэдняй дальнасці.

Значнай падзеяй на шляху паляпшэння двухбаковых пагадненняў стаў візіт у снежні 1987 г. М. С. Гарбачова ў ЗША. У ходзе візіту кіраўнікі дзвюх краін падпісалі **Дагавор аб ліквідацыі ракет сярэдняй і малой дальнасці (РСМД)**, які прадугледжваў дэмантаж усіх ракет гэтых класаў, размешчаных у краінах Заходняй Еўропы і заходніх раёнах СССР.

Пры наступным прэзідэнце Злучаных Штатаў, Дж. Бушы-старэйшым, гэтая пазітыўная тэндэнцыя была паспяхова працягнутая, і на міжнароднай арэне адбыліся падзеі грандыёзнага маштабу. Скончылася «халодная вайна», распаліся Савецкі Саюз і сацыялістычная садружнасць, было адноўлена адзінства Германіі, пачаліся прамыя перамовы Ізраіля з арабскімі краінамі і г. д.

Дж. Буш-старэйшы праводзіў палітыку далейшага паслаблення напружанасці ў свеце. Яго першая сустрэча с лідарам СССР прайшла ў снежні 1989 г. Практычна ў поўным аб'ёме была прынята амерыканская праграма развіцця амерыкана-савецкіх адносін. У ходзе наступных сустрэч з кіраўніцтвам СССР, а потым – Расіі, была ўрэгуляваная на карысць ЗША большасць спрэчных пытанняў, што азмрочвалі двухбаковыя адносіны паміж краінамі. Пры актыўным удзеле амерыканскай дыпламатыі адбылося аднаўленне дзяржаўнага адзінства Германіі.

Напачатку 1990-х гг. адміністрацыя Дж. Буша абвясціла задачу ўсталявання **«новага сусветнага парадку»** з улікам новай геапалітычнай рэальнасці. У 1990 г. ЗША арганізавала кааліцыю заходніх дзяржаў (яна была падтрымана і савецкім кіраўніцтвам) супраць Іраку, які напаў на Кувейт, і здолелі атрымаць даволі лёгкую перамогу.

Таксама развівалася супрацоўніцтва краін Заходняга паўшар'я. З 1990 г. уступіла ў практычную фазу «агульнаамерыканская ініцыятыва» – сістэма захадаў, што спрыялі пашырэнню гандлю ды інвесціравання ў эканоміку амерыканскіх дзяржаў шляхам узаемазаліку даўгоў і скасавання мытных збораў краінамі-ўдзельніцамі пагадненняў. Паспяхова прайшлі перагаворы паміж ЗША, Канадай і Мексікай **Паўночнаамерыканскага пагаднення аб свабодным гандлі** (**НАФТА**; *North American Free Trade Agreement, NAFTA*).

## Тэма 22. ЗША ў 1992 – 2000-х гг.

### Вынікі прэзідэнцкіх выбараў 1992 г. Б. Клінтан. Сацыяльна-эканамічная палітыка дэмакратычнай адміністрацыі і яе дасягненні. Прэзідэнцкі крызіс 1998 – 1999 гг. Узрастанне значнасці знешнепалітычных фактараў у вырашэнні ўнутраных праблем амерыканскага грамадства

Для ўдзелу ў прэзідэнцкіх выбарах 1992 г. рэспубліканцы цалкам чакана высунулі кандыдатуру дзеючага прэзідэнта Дж. Буша (старэйшага). У цэнтр сваёй перадвыбарчай кампаніі яны паспрабавалі паставіць цвёрды знешнепалітычны курс апошніх гадоў, які, на іх думку, забяспечыў перамогу Амерыкі ў «халоднай вайне» і пераўтварэнне Злучаных Штатаў у бясспрэчнага лідара ў сістэме міжнародных адносін канца XX ст.

Аднак пры ўсёй папулярнасці знешняй палітыкі рэспубліканскіх адміністрацый, асноўная ўвага выбаршчыкаў была накіравана на сацыяльна-эканамічнае становішча краіны, дзе поспехі правячай партыі былі не гэткімі ўражальнымі. Працягваўся рост бюджэтнага дэфіцыту, дзяржаўны доўг вырас да астранамічнай сумы ў $4 трлн. Не былі вырашаны многія сацыяльныя праблемы. Асабліва вострай заставалася праблема дарагоўлі медыцынскага абслугоўвання: каля 40 млн. амерыканцаў (15 % насельніцтва) былі пазбаўленыя магчымасці атрымліваць кваліфікаваную медыцынскую дапамогу. Патрабавала тэрміновага вырашэння і праблема рэфармавання ўсёй сістэмы дзяржаўнай дапамогі. Абяцанне Дж. Буша забяспечыць большае ўмяшанне федэральных улад у рашэнне сацыяльна-эканамічных праблем краіны выклікалі незадаволенасць правых рэспубліканцаў, якія бачылі ў гэтым перадвыбарчым абяцанні адступленне ад кансерватыўна-індывідуалістычнага курсу 1980-х гг.

Дэмакратычная партыя высунула ў 1992 г. сваім кандыдатам у прэзідэнты маладога палітыка губернатара штата Арканзас Уільяма (Біла) Клінтана. Падтрымліваючы знешнепалітычны курс рэспубліканскіх адміністрацый, дэмакраты зрабілі акцэнт на крытыцы сваіх палітычных супернікаў за іх няздольнасць вырашаць самыя надзённыя сацыяльныя праблемы, што стаяць перад краінай. Актывізацыя сацыяльнай палітыкі федэральнага ўраду ў духу рэфармісцкіх традыцый Рузвельта – Кенэдзі ў перадвыбарчай праграме Б. Клінтана спалучалася з заявамі пра неабходнасць жорсткай фінансавай палітыкі, пераадолення бюджэтнага дэфіцыту, барацьбы са злачыннасцю. У выніку Дэмакратычная партыя здолела істотна змяніць сваё аблічча ў вачах амерыканскіх выбаршчыкаў – зрабіцца больш «цэнтрысцкай». Адным з важных лозунгаў Б. Клінтана сталі заклікі забяспечыць росквіт амерыканскай эканомікі і дасягненне ўнутранай стабільнасці для забеспячэння лідарскіх пазіцый ЗША на міжнароднай арэне.

На прэзідэнцкіх выбарах 1992 г. выступіў і трэці, незалежны кандыдат – буйны тэхаскі бізнесмен Рос Пера. Яго кампанія стала адлюстраваннем масавага незадавальнення амерыканцаў бюджэтным дэфіцытам, ростам падаткаў, павелічэннем дзяржаўнага доўгу.

Вынікі выбараў прадэманстравалі яўную перавагу кандыдата ад Дэмакратычнай партыі: Б. Клінтан атрымаў 44,9 млн. галасоў і 370 выбаршчыкаў. За Дж. Буша прагаласавалі 39,1 млн. амерыканцаў, што дало яму толькі 168 выбаршчыкаў. Вельмі ўдала для незалежнага кандыдата выступіў Р. Пера. Ён заваяваў 19,7 млн. галасоў або 18,9 % – найлепшы вынік для трэцяга кандыдата з 1912 г. Хаця незалежны кандыдат не перамог ні ў адным штаце, ён адыграў важную ролю ў выбарчай барацьбе, адабраўшы нямала галасоў у рэспубліканцаў і тым самым паспрыяўшы перамозе дэмакратаў. Поспех Дэмакратычнай партыі быў падмацаваны на выбарах у абедзве палаты Кангрэсу, дзе яна таксама атрымала перамогу.

У першыя ж месяцы сваёй дзейнасці адміністрацыя Б. Клінтана (1993 – 2001) распрацавала некалькі праектаў буйных сацыяльных рэформ. Найбольш важным сярод іх быў план увядзення **сістэмы ўсеагульнага медыцынскага страхавання**, унесены на разгляд Кангрэсу ў верасні 1993 г. На працягу наступных 5 гадоў меркавалася забяспечыць кожнага грамадзяніна краіны ўніверсальнай карткай медыцынскага страхавання, якая б адкрывала яму доступ да стандартнага пакету паслуг аховы здароўя (амбулаторнае і стацыянарнае лячэнне, набыццё неабходных лекаў). Фінансаванне ўсеагульнага медыцынскага страхавання планавалася забяспечыць галоўным чынам за кошт федэральных падаткаў.

Абмеркаванне праекту карэннага пераўтварэння сістэмы медыцынскага абслугоўвання выклікала жорсткую палітычную барацьбу ў краіне. Апазіцыя новаму білю (Амерыканская медыцынская асацыяцыя, Рэспубліканская партыя) аказалася настолькі моцнай, што правячая адміністрацыя не здолела правесці яго нават праз камісіі абедзвюх палат Кангрэсу.

Не менш вострую дыскусію выклікаў і план рэформы **сістэмы дзяржаўнай дапамогі**, прапанаваны таксама ў 1993 г. У адпаведнасці з ім усе атрымальнікі дапамогі па беднасці атрымлівалі магчымасць на працягу двух гадоў за кошт федэральнага ўраду падвысіць свой адукацыйны ўзровень і прайсці навучанне ці перакваліфікацыю ў той ці іншай прафесіі. Нягледзячы на тое, што большасць амерыканцаў падтрымалі план рэформы, скрайне адмоўная рэакцыя кансерватыўных сіл і аграмадны бюджэтны дэфіцыт вымусілі Б. Клінтана адмовіцца ад спроб правесці свой праект праз Кангрэс.

Замест гэтага правячая адміністрацыя скіравала асноўныя намаганні на скарачэнне, а ў перспектыве – і на пераадоленне дэфіцыту бюджэту. З гэтай мэтай пачалося правядзенне новай падатковай рэформы. У адрознен-

не ад рэйганаўскай рэформы 1986 г., стаўкі падаходнага падатку і падатку на даходы карпарацый былі павялічаны.

Дэмакратычная адміністрацыя сур'ёзна ўзялася за барацьбу са злачыннасцю. Новы закон, прыняты Кангрэсам ў 1993 г., значна ўзмацніў пакаранні за цяжкія злачынствы, узмацніў кантроль за продажам агнястрэльнай зброі ды істотна павялічыў колькасць супрацоўнікаў праваахоўных органаў.

Ацэнка першых вынікаў дзейнасці адміністрацыі Б. Клінтана была зроблена ўжо ў 1994 г. на прамежкавых выбарах у Кангрэс. Нясдольнасць дэмакратаў ажыццявіць свае два асноўныя праекты (увядзенне ўсеагульнага медыцынскага страхавання і рэформа сістэмы дзяржаўнай дапамогі) выклікала сур'ёзнае незадавальненне менш заможнай часткі насельніцтва. Сярэдні клас выказваў занепакоенасць у сувязі з намерамі правячай адміністрацыі пайсці на рэзкае павелічэнне федэральных выдаткаў і, тым самым, ускласці дадатковы цяжар на іх плечы. Яшчэ больш рэзка планы дэмакратаў ацэньвалі высокадаходныя групы насельніцтва.

Перадвыбарчая праграма рэспубліканцаў з абяцаннем скарачэння падаткаў і сацыяльных выдаткаў, дасягнення збалансаванага бюджэту спадабалася амерыканскім выбаршчыкам куды больш: Рэспубліканская партыя зноў заваявала большасць у абедзвюх палатах Кангрэсу, прычым, значна ўзмацніліся пазіцыі ультракансерватыўнага крыла партыі – яго лідар Ньют Гінгрыч стаў спікерам Палаты прадстаўнікоў.

Гэтае паражэнне яшчэ больш ускладніла становішча правячай адміністрацыі. У 1995 г. рэспубліканская большасць у Кангрэсе дабілася абмежавання праграм сацыяльнай дапамогі, а ў наступным прыняла закон пра ўсталяванне пяцігадовага тэрміну выдачы дапамог і абавязковасць працоўнай дзейнасці для іх саіскальнікаў. Спрэчкі вакол бюджэту прывялі да г. зв. «вялікай бюджэтнай вайны» 1995 – 1996 гг.

Набліжэнне новых прэзідэнцкіх выбараў выклікала далейшую карэкціроўку палітычных пазіцый дэмакратычнай адміністрацыі. Прэзідэнт выступіў у падтрымку патрабавання рэспубліканцаў дамагчыся збалансаванага бюджэту да 2002 г. Б. Клінтан гаварыў пра неабходнасць змены прыярытэтаў дзяржаўнага рэгулявання: яно павінна было скіроўвацца не на павелічэнне памераў дапамогі бедным, а, найперш, на заахвочванне іх працоўных намаганняў. Станоўчым фонам для дэмакратаў павінна было стаць паляпшэнне сусветнай эканамічнай кан'юнктуры. З 1993 г. ЗША ўступілі ў чарговы перыяд прамысловага ўздыму, зніжэння ўзроўню беспрацоўя і, што асабліва важна, значнага зніжэння бюджэтнага дэфіцыту – за 1993 – 1996 гг. ён знізіўся амаль з $255 да $107 млрд. г. зн. у 2,5 разы.

У выніку прэзідэнцкія выбары 1996 г. прынеслі Б. Клінтану яшчэ больш пераканаўчую перамогу, чым чатырма гадамі раней. Дзеючы прэзі-

дэнт набраў 47,4 млн. галасоў (379 выбаршчыкаў), супраць 39,2 млн. галасоў (159 выбаршчыкаў) у яго галоўнага канкурэнта – лідара ўмеранага крыла Рэспубліканскай партыі сенатара Роберта (Боба) Доўла. Р. Перо гэтым разам выступіў нашмат менш удала, набраўшы ў 2,5 разы меней галасоў. Як гэта не аднойчы бывала, у другі раз выбаршчыкі вырашылі не падтрымліваць «непрахаднога» кандыдата.

Пасля выбараў 1996 г. адміністрацыя Б. Клінтана з яшчэ большай паслядоўнасцю працягнула курс на сур’ёзную эвалюцыю Дэмакратычнай партыі, пошукі найбольш аптымальнага варыянту **«трэцяга шляху»**, вольнага і ад эксцэсаў ліберальнага рэфармізму 1960 – 1970-х гг., і ад скрайнасцяў ультракансерватыўнага рэйганізму 1980-х гг. Важнейшай задачай у гэтых пошуках, на думку прэзідэнта, павінна было стаць знаходжанне найлепшага спалучэння больш абмежаванага, але дастаткова эфектыўнага дзяржаўнага рэгулявання з адказнай фінансавай палітыкай, заснаванай на падтрыманні збалансаванага бюджэту.

Перарастанне хуткага эканамічнага росту ў сапраўдны бум забяспечыла выдатныя ўмовы для стварэння на базе навейшай электроннай тэхнікі разгалінаванай інфармацыйнай інфраструктуры, характэрнай для сучаснай стадыі постіндустрыяльнага (інфармацыйнага) грамадства. Паскарэнне тэмпаў эканамічнага развіцця прывяло да стварэння мільёнаў новых працоўных месцаў і, як вынік, скарачэння да 4,5 – 5 % ўзроўню беспрацоўя, падтрымання на нізкім двухадсоткавым узроўні інфляцыі, падвышэння канкурэнтаздольнасці амерыканскай эканомікі і ўзмацнення пазіцый ЗША ў сусветным гандлі. У 1997 г. у Злучаных Штатах быў прыняты амаль збалансаваны бюджэт (дэфіцыт складаў толькі $22 млрд.). У наступным годзе даходы федэральнага бюджэту Злучаных Штатаў перавысілі яго выдатковую частку на $70 млрд., а 1999 г. прафіцыт павялічыўся да $120(!) млрд.

Ліквідацыя бюджэтнага дэфіцыту стала магчымай ў тым ліку за кошт скарачэння ваенных выдаткаў. У 1998 г. яны склалі толькі 16 % федэральнага бюджэту – утрая меней, чым было асігнавана на забеспячэнне сацыяльных праграм. Адмовіўшыся на час ад ажыццяўлення найбольш дарагіх сацыяльных рэформ і, перадусім, ад спробы ўвядзення сістэмы ўсеагульнага медыцынскага страхавання, дэмакратычная адміністрацыя не толькі не дапусціла скарачэння федэральных сацыяльных выдаткаў, але па цэламу шэрагу накірункаў пайшла на іх значнае павелічэнне. Напрыклад, было праведзена чарговае падвышэнне мінімальных пагадзінных ставак заробкаў, працягвалася ажыццяўленне асноўных праграм сацыяльнай дапамогі. Важнае месца ў планах адміністрацыі займала падтрымка адукацыі і навукі. Федэральны бюджэт пры Б. Клінтане узяў на сябе больш за трэць усіх выдаткаў на навуку, у тым ліку больш за палову – на фундаментальныя даследаванні.

Напярэдадні новых прамежкавых выбараў 1998 г. бясспрэчныя дасягненні дэмакратычнай адміністрацыі паставілі рэспубліканцаў у вельмі цяжкую сітуацыю: знайсці прынцыповую альтэрнатыву курсу Б. Клінтана было практычна немагчыма. На іх шчасце нагоду для моцнай крытыкі даў сам прэзідэнт.

Напачатку 1998 г. у прэсе з'явілася інфармацыя пра «неслужбовыя адносіны» паміж Б. Клінтанам і супрацоўніцай Белага Дому 22-гадовай Монікай Лявінскі – **«скандал Клінтан – Лявінскі»**. Гэтая непрыгожая гісторыя была раздзьмутая да памераў грандыёзнага палітычнага скандалу. Прэзідэнт аспрэчыў усе абвінавачанні на свой адрас, а яго жонка Хілары публічна падтрымала мужа, заявіўшы, што выпады супраць яго – палітычная змова несумленных канкурэнтаў. Пачаўся судовы працэс, на якім нанова выплыла яшчэ некалькі падобных скандальных эпізодаў. У рэшце рэшт высветлілася, што прэзідэнт хлусіў падчас судовага працэсу, а ён сам (яго прадстаўнікі), магчыма, аказвалі ціск на сведкаў.

Зручная сітуацыя для таго, каб замацаваць перавагу ў Кангрэсе на прамежкавых выбарах, не была выкарыстана рэспубліканцамі. У Палаце прадстаўнікоў яны нават страцілі некалькі месцаў. Правалілася і спроба адправіць Б. Клінтана ў адстаўку.

Дэпутаты рэспубліканцы, якія мелі большасць у абедзвюх палатах Кангрэса, атрымалі магчымасць узбуджэння супраць Б. Клінтана працэдуры імпічменту. У лістападзе 1998 г. па гэтым пытанні пачаліся слуханні ў Кангрэсе. Палата прадстаўнікоў высунула абвінавачанні дзеючаму прэзідэнту па двух пунктах: хлусня на судзе прысяжных і чыненне перашкод ў адпраўленні правасуддзя. Тым не менш, напачатку 1999 г. Сенат, якому Канстытуцыя ЗША даручае ў гэтым выпадку выступаць у ролі спецыяльнай судовай інстанцыі, большасцю галасоў адхіліў абодва абвінавачанні, палічыўшы, што яны не з'яўляцца дастаткова сур'ёзнымі, каб змясціць Б. Клінтана з яго высокай пасады. Немалое значэнне для вынясенне гэткага вердыкту мелі «пакаянная прамова» прэзідэнта і амерыканская грамадская думка, якая ў цэлым з паразуменнем паставілася да «прыгодаў» свайго лідара і па сутнасці прызнала факт празмернай палітызацыі асобных старонак яго асабістага жыцця Рэспубліканскай партыяй (Вярхоўны Суд штата Арканзас, аднак, пазбавіў Б. Клінтана адвакацкай ліцэнзіі за ілжэсведчанне).

З пункту гледжання будучых прэзідэнцкіх выбараў падрыў маральнага аўтарытэту лідара дэмакратаў мог мець куды больш сур'ёзныя наступствы і для ўсёй партыі, і для яе новага кандыдата. У выніку, для мінімізацыі негатыўнага ўплыву «скандалу Клінтан – Лявінскі» правячая адміністрацыя сур'ёзна актывізавала сваю дзейнасць. У 1999 г. была агучаная амбіцыйная праграма шырокіх сацыяльных рэформ, разлічаных на пра-

цяглы перыяд. Яна была заклікана замацаваць за дэмакратамі імідж партыі, што стаіць на варце агульнанародных інтарэсаў.

У 1999 г. падобны ж разлік ляжаў і ў падмурку планаў і дзеянняў правячай адміністрацыі ў сферы знешняй палітыкі. У першую чаргу гэта праявілася падчас ваенна-сілавога ўмяшання ЗША ва ўнутрыюгаслаўскі (касаўскі) канфлікт і некаторых іншых кроках дзеля ўмацавання глабальнага лідарства ЗША (гл. далей). Рэспубліканцы ставіліся да гэткага празмернага актывізму Злучаных Штатаў на міжнароднай арэне дастаткова скептычна. Яны абвінавачвалі Б. Клінтана ў тым, што той дбае ў першую чаргу не пра забеспячэнне нацыянальных інтарэсаў, а пра вырашэнне сваіх персанальных праблем. Упершыню за доўгі час пытанні амерыканскай знешняй палітыкі аказаліся ў цэнтры вострых дыскусій вядучых палітычных партый краіны.

**Прэзідэнцкія выбары 2000 г. Дж. Буш-малодшы і яго палітычная праграма. Падзеі 11 верасня 2001 г. Барацьба супраць міжнароднага тэрарызму. Інтэрвенцыя супраць Іраку і падзенне папулярнасці прэзідэнта**

Сфармуляваныя ў 1999 г. Б. Клінтанам прыярытэты амерыканскай ўнутранай і знешняй палітыкі леглі ў падмурак выбарчай праграмы кандыдата ад Дэмакратычнай партыі на прэзідэнцкіх выбарах 2000 г., віцэ-прэзідэнта ЗША Альберта (Ала) Гора. Дэмакраты заяўлялі пра сваю рашучасць працягнуць рух па «трэцяму шляху», некалькі абмяжоўваючы маштабы дзяржаўнага ўмяшання, але падвышаючы яго эфектыўнасць.

Рэспубліканцы падтрымалі кандыдатуру прадстаўніка ўмерана-кансерватыўнага крыла партыі, губернатара Тэхасу Джорджа Буша-малодшага, сына 41-га прэзідэнта ЗША Джорджа Буша (1989 – 1993). У адрозненне ад традыцыйнага для рэспубліканскіх дзеячаў негатыўнага стаўлення да дзяржаўнага рэгулявання эканомікі і сацыяльных адносін, перадвыбарчая платформа Дж. Буша-малодшага прызнала неабходнасць актыўных дзеянняў дзяржавы ў сацыяльна-эканамічнай сферы. Кандыдат-рэспубліканец абвясціў лозунг **«спагаднага кансерватызму»**: «*Я перакананы, што кансерватыўная ідэалогія – гэта філасофія спагады... Кансерватызм – скарачаць падаткі; спагада – даваць людзям болей грошай на выдаткі. Кансерватызм – настойваць на мясцовым кантролі над школамі, высокіх стандартах і выніках адукацыі; спагада – дамагацца, каб кожнае дзіця навучылася чытаць, і ніхто не адстаў...*».

Праграмныя палажэнні двух вядучых кандыдатаў аказаліся вельмі падобнымі, што рабіла выбар паміж канкурэнтамі няпростай задачай для выбаршчыкаў. Гэта пацвердзіла і галасаванне 7 лістапада 2000 г. Канкурэнты паказалі практычна аднолькавыя вынікі. У многіх штатах перавага

аднаго кандыдата над другім была зусім нязначнай (перамога ў штаце прыносіць кандыдату усе галасы выбаршчыкаў гэтага штату).

У Фларыдзе перавага Дж. Буша-малодшага аказалася настолькі мізэрнай, што па існуючых там правілах нават спатрэбіўся пералік галасоў. Правядзенне паўторнай працэдуры ў гэтым штаце ўскладнялася тым, што з-за шматлікіх памылак у афармленні бюлетэняў пералік было вырашана праводзіць не аўтаматычна, а ўручную. Вызначэнне пераможцы расцягнулася на некалькі тыдняў. У канчатковым выніку кандыдат-рэспубліканец набраў на 500 галасоў болей (з 6млн. грамадзян штату, якія мелі права голасу), атрымаў 25 выбаршчыкаў ад Фларыды і агульную перамогу на выбарах у краіне.

Дж. Буш-малодшы выйграў выбары ў 30 штатах і заручыўся падтрымкай 271 выбаршчыка, а А. Гор – у 20 штатах і сталічнай акрузе Калумбія, што дало яму толькі 266 выбаршчыкаў. Аднак агульная колькасць пададзеных па краіне галасоў за А. Гора аказалася большай на 550 тыс. (0,5 %) галасоў. Атрымалася (ужо ў чацвёрты раз у амерыканскай гісторыі), што прэзідэнтам быў абраны не самы папулярны сярод выбаршчыкаў кандыдат. У Злучаных Штатах загаварылі пра неабходнасць пераходу да больш сучаснай, простай і дэмакратычнай сістэмы выбараў прэзідэнта. Некаторыя апаненты Дж. Буша-малодшага нават заяўлялі аб яго нелегітымнасці, звяртаючы ўвагу на парушэнні ў працэсе выбараў і падліку галасоў у Фларыдзе, а таксама ўвязваючы гэтыя парушэнні з магчымым уплывам дзеючага губернатара гэтага штату – Джона (Джэба) Буша – малодшага брата абранага прэзідэнта.

Неадназначнасць, нават скандальнасць, прэзідэнцкіх выбараў і не надта ўдалы зыход выбараў у Кангрэс (рэспубліканцы страцілі большасць у Сенаце) абяцалі новаму амерыканскаму лідару вельмі няпростае прэзідэнцтва. У першых жа сваіх выступах Дж. Буш-малодшы (2001 – 2009) абвясціў, што галоўнымі прыярытэтамі свайго ўнутрыпалітычнага курсу ён лічыць гэткія праблемы, як выплата аграмаднага дзяржаўнага доўгу, скарачэнне непамерных федэральных выдаткаў і зніжэнне празмерна высокіх падаткаў.

**11 верасня 2001 г.** ісламскія фундаменталісты накіравалі захопленыя грамадзянскія самалёты на Сусветны гандлёвы цэнтр у Нью-Йорку і будынак Пентагону ў Вашынгтоне. Адказнасць за гэты тэрарыстычны акт узяла арганізацыя «Аль-Каіда». Амерыканская нацыя знаходзілася ў шоку і разгубленасці: аказалася, што магутнейшая дзяржава свету безабаронная супраць арганізаванага тэрору. Гэтыя трагічныя падзеі высунулі на першы план ў палітыцы рэспубліканскай адміністрацыі барацьбу супраць міжнароднага тэрарызму. Адміністрацыя Дж. Буша-малодшага адказала на гэты варварскі акт цэлым шэрагам жорсткіх заяў і рашучых крокаў. Напачатку кастрычніка была распачата контртэрарыстычная аперацыя ў Афганістане.

Напрыканцы кастрычніка 2001 г. Кангрэс прыняў г. зв. **«Патрыятычны акт»**, федэральны закон, які даў ураду і паліцыі шырокія магчымасці для нагляду за грамадзянамі. У прыватнасці, Федэральнае Бюро Расследаванняў (ФБР) атрымлівала большыя правы для падслухоўвання ды электроннага сачэння. У далейшым гэта прывяло да шматлікіх арыштаў падазроных іншаземцаў, якія потым утрымліваліся ў зняволенні без прад'яўлення афіцыйных абвінавачанняў. Крытыкі адміністрацыі і нават незаангажаваныя назіральнікі ў Злучаных Штатах і за іх межамі расцанілі «Патрыятычны акт» як парушэнне 4-й папраўкі да канстытуцыі. У 2002 г. з ініцыятывы Дж. Буша-малодшага адбылася буйнейшая за паўстагоддзя рэарганізацыя Адміністрацыі ЗША – створана новае Міністэрства (дэпартамент) Нацыянальнай Бяспекі.

Першая рэакцыя грамадства на дзеянні рэспубліканскай адміністрацыі была цалкам пазітыўнай. Напрыклад, напрыканцы верасня 2001 г. Дж. Буш-малодшы усталяваў абсалютны рэкорд папулярнасці сярод амерыканскіх прэзідэнтаў – згодна з апытаннямі ў краіне, праведзеных сусветна вядомай сацыялагічнай службай Гэлапа, яго дзейнасць ухвалялі 94 % амерыканцаў.

Важнае месца ва ўнутрыпалітычнай праграме рэспубліканскай адміністрацыі адводзілася школьнай рэформе. Аграмадныя дзяржаўныя выдаткі на гэтую сферу (напачатку 2000-х у межах 39 праграм выдаткоўвалася каля $120 млрд.) не давалі адпаведных вынікаў. Па словах самога прэзідэнта, да чацвёртага класа многія амерыканскія школьнікі не маглі навучыцца добра чытаць. Праведзены ў 2001 г. праз Кангрэс закон (англ. *No Child Left Behind Act;* прыкладны пераклад – «Клопат і ўвага кожнаму дзіцяці») быў заклікаў забяспечыць усталяванне высокіх, але дыферэнцыяваных адукацыйных стандартаў у навучальных установах, якія жадалі разлічваць на грошы з федэральнага бюджэту.

У сваёй эканамічнай палітыцы Дж. Буш-малодшы, як і ў знешняй палітыцы, дэманстраваў жорсткасць і бескампраміснасць. Спасылаючыся на неабходнасць даць штуршок амерыканскай эканоміцы пасля непрацяглай рэцэсіі 2001 г., у 2001 і 2003 гг. ён правёў праз Кангрэс праграму скарачэння падаткаў. На фоне значнага павелічэння выдаткаў федэральнага ўраду (за час прэзідэнцтва Дж. Буша-малодшага яны выраслі на 70 %; немалая іх частка пайшла на ваенныя патрэбы) гэта прывяло да рэзкага росту дэфіцыту федэральнага бюджэту.

І адукацыйная, і падатковая рэформа, і некаторыя іншыя рашэнні рэспубліканскай адміністрацыі (напрыклад, адмова ратыфікаваць Кіёцкі пратакол, скіраваны на абмежаванне забруджвання навакольнага асяроддзя) выклікалі нямала крытыкі з боку амерыканскіх палітыкаў і грамад-

ства. Аднак найбольш супярэчлівым з іх было ўварванне ЗША ў Ірак на падставе дадзеных разведкі, як аказалася сфальсіфікаваных, пра наяўнасць у С. Хусэйна зброі масавага паражэння.

Нягледзячы на вострую крытыку апанентаў і пратэсты часткі насельніцтва супраць ваяўнічай знешняй палітыкі дзеючай адміністрацыі, Дж. Буш-малодшы з лёгкасцю выйграў намінацыю кандыдатам ад Рэспубліканскай партыі для ўдзелу ў **прэзідэнцкіх выбарах 2004 г.** Яго канкурэнтам ад Дэмакратычнай партыі стаў сенатар ад Масачусетса Джон Кэры.

Тэма Ірака стала адной з асноўных у ходзе выбарчай кампаніі 2004 г.: дзеючы прэзідэнт і яго каманда настойвалі на неабходнасці працягу вайны ў Іраку і жорсткай барацьбы з сіламі сусветнага тэрарызму, у той час як яго канкурэнт спрабаваў набраць палітычныя ачкі на моцных антываенных пачуццях амерыканцаў. Дж. Буш-малодшы акцэнтаваў неабходнасць падтрымання традыцыйных маральных каштоўнасцей Амерыкі. На думку Дж. Кэры большай увагі заслугоўвалі эканамічныя праблемы, асабліва барацьба з беспрацоўем, і рэформа сістэмы аховы здароўя.

Амерыканцы аддалі перавагу лідару рэспубліканцаў. Дж. Буш-малодшы выйграў у 31 штаце і заручыўся падтрымкай 286 выбаршчыкаў. Акрамя таго, дзеючы прэзідэнт здолеў заваяваць большасць – 50,7 % – галасоў амерыканцаў, што ўзялі ўдзел у выбарах. Папярэднім прэзідэнтам, які мог пахваліцца гэткім высокім узроўнем электаральнай падтрымкі, быў яго бацька – Дж. Буш-старэйшы на выбарах 1988 г. Больш за тое, рэспубліканцы не толькі захавалі за сабой Белы Дом, але таксама заваявалі большасць у абедзвюх палатах Кангрэсу – апошні раз падобнага поспеху яны дасягнулі ў 1928 г.

У перыяд дзейнасці другой адміністрацыі Дж. Буша-малодшага асноўныя накірункі ўнутранай (і знешняй) палітыкі не зазналі значных змен. Але ўжо да канца 2005 г. адбылося значнае зніжэнне папулярнасці дзеючага прэзідэнта, што галоўным чынам было звязана з палітыкай ЗША у Іраку. Новым ударам па іміджы прэзідэнта стала паводка ў Новым Арлеане ў выніку ўрагану Катрына (жнівень – верасень 2005 г.), калі затопленымі аказаліся каля 80 % горада. Стыхійнае бедства прынесла аграмадныя матэрыяльныя страты, некалькі соцень чалавек загінулі. Рэспубліканская адміністрацыя была абвінавачана ў тым, што не прыняла неабходных захадаў для своечасовай эвакуацыі горада, і некаторых іншых пралiках. Таму няма нічога дзіўнага ў тым, што на прамежкавых выбарах, якія адбыліся ў лістападзе 2006 г., Рэспубліканская партыя пацярпела паражэнне і страціла кантроль над абедзвюма палатамі Кангрэсу. Падпарадкоўваючыся іх ціску, Дж. Буш-малодшы быў вымушаны адправіць у адстаўку свайго самага непапулярнага міністра – галаву Пентагона (міністра абароны) Дональда Рамсфельда.

**Прэзідэнцкія выбары 2008 г. Б. Абама**
**і палітыка яго адміністрацыі**

Пазіцыі рэспубліканцаў яшчэ больш ускладніліся пасля пачатку іпатэчнага (2007), а потым і фінансавага (2008) крызісаў. Сур’ёзнае пагаршэнне эканамічнай сітуацыі ў краіне разам з дарагімі і малапаспяховымі ваеннымі акцыямі адміністрацыі Дж. Буша-малодшага на Блізкім Усходзе (Афганістан, Ірак), наадварот, стваралі для Дэмакратычнай партыі цудоўныя перспектывы на прэзідэнцкіх выбарах 2008 г.

Кандыдатам ад дэмакратаў быў намінаваны сенатар ад штату Ілінойс – толькі 5-ты сенатар-афраамерыканец у гісторыі краіны – Барак Абама (яго галоўным сапернікам была экс-першая лэдзі Хілары Клінтан). Б. Абама выступаў за хуткае заканчэнне Іракскай вайны, энергетычную незалежнасць краіны і ўсеагульную сістэму аховы здароўя. Важнай асаблівасцю кампаніі дэмакратычнага кандыдата было тое, што ён стаў першым кандыдатам у прэзідэнты, які адмовіўся ад дзяржаўнага фінансавання. Прывабныя лозунгі («Перамены, у якія мы можам паверыць» і «Да, мы можам»), а таксама прадуманая PR-кампанія ў сродках масавай інфармацыі, асабліва ў сетцы Інтэрнэт, дазволіла Б. Абаму і яго выбарчаму штабу сабраць на выбарчыя патрэбы прыватныя ахвяраванні на суму каля шасцісот мільёнаў долараў. Яго галоўным канкурэнтам з’яўляўся кандыдат ад Рэспубліканскай партыі, патомны афіцэр і ветэран В’етнамскай вайны (быў збіты над Ханоем і правёў у палоне 5,5 гадоў) сенатар ад Арызоны Джон Маккейн. У цэнтры перадвыбарчых дыскусій апынулася ўзрастальнае пагаршэнне эканамічнай абстаноўкі ў краіне. Найбольш рашучыя антыкрызісныя захады прапаноўваў кандыдат-дэмакрат.

Амерыканцы выступілі ў падтрымку перамен і абнаўлення. Амаль 70 млн. чалавек (52,9 %) прагаласавалі за Б. Абаму, што прынесла яму 365 галасоў выбаршчыкаў (у Дж. Маккейна – толькі 173). Гэткім чынам Б. Абама (2009) стаў першым афраамерыканцам, абраным прэзідэнтам ЗША, а яго напарнік Джон Байдэн – першым віцэ-прэзідэнтам каталіком. Поспех Дэмакратычнай партыі на прэзідэнцкіх выбарах быў падмацаваны перамогай на выбарах у Кангрэс: дэмакраты ўмацавалі сваю большасць у абедзвюх палатах.

Першыя крокі новай прэзідэнцкай адміністрацыі былі накіраваныя на пераадоленне фінансава-эканамічнага крызісу і аднаўленне пазіцый амерыканскай эканомікі на міжнароднай арэне. Ужо ў лютым 2009 г. прэзідэнт падпісаў г. зв. **«Акт аднаўлення»** (*Recovery Act*), які прадугледжваў выдатканне $787 млрд. на забеспячэнне падатковых стымулаў, павелічэнне дапамог па беспрацоўю ды іншых сацыяльных выплат, рост асігнаванняў на адукацыю і ахову здароўя, паляпшэнне інфраструктуры, у тым ліку на энергетычны сектар.

Адным з важнейшых пунктаў унутрыпалітычнай праграмы Б. Абамы стала рэформа сістэмы аховы здароўя. Праблема, якую напачатку 1990-х гг. спрабаваў вырашыць Б. Клінтан, не толькі не страчвала сваёй актуальнасці, але нават абвастралася. У ЗША адсутнічае бясплатная медыцына і за паслугі ўрача плацяць страхавыя кампаніі. Кошт медыцынскай страхоўкі ў год складае каля $3 тыс., што па кішэні далёка не ўсім амерыканцам. У выніку па дадзеных на 2008 г. без медыцынскай страхоўкі абыходзілася 47 млн. амерыканцаў – прыкладна шостая частка насельніцтва краіны.

Рэформа, з аднаго боку, была павінна абмежаваць свавольства страхавых кампаній, з другога, – даць больш бяспекі і стабільнасці тым, у каго ёсць медыцынская страхоўка, а таксама даць страхоўку тым, у каго яе няма. На ажыццяўленне паэтапнага рэфармавання галіны за дзесяць гадоў дэмакратычная адміністрацыя збіралася патраціць парадку $900 млрд. У 2009 г. адпаведны праект быў праведзены праз Кангрэс, а напачатку 2010 г. набыў сілу закону.

Будучы ад самага пачатку гарачым праціўнікам Іракскай вайны, Б. Абама абнародаваў план вываду войск ЗША з Іраку. Асноўныя злучэнні павінны былі пакінуць краіну напрыканцы жніўня 2010 г., але каля 50 тыс. амерыканскіх вайскоўцаў засталіся для аказання дапамогі іракскім уладам. 1 верасня 2010 г. віцэ-прэзідэнт Дж. Байдэн абвясціў пра афіцыйнае заканчэнне аперацыі «Іракская свабода» і пра пачатак новай небаявой аперацыі амерыканскай арміі.

Адным з галоўных абяцанняў перад выбарамі і першых рашэнняў Б. Абамы на пасадзе прэзідэнта (было зроблена ўжо на другі дзень знаходжання ў Белым Доме) стала распараджэнне пра закрыццё турмы для асабліва небяспечных злачынцаў на ваеннай базе ЗША ў Гуантанама (Куба). У гады дзейнасці адміністрацыі Дж. Буша гэтая турма здабыла ў свеце змрочную славу з-за шматлікіх фактаў выкарыстання катаванняў і бесчалавечных адносін у дачыненні вязняў, галоўным чынам падазраваных у тэрарызме. Да канца 2009 г. турма была павінна спыніць сваё існаванне.

Нягледзячы на велізарныя федэральныя выдаткі, эканамічная сітуацыя ў краіне паляпшалася вельмі павольна. Тэмпы эканамічнага росту былі Невысокімі, а бюджэтны дэфіцыт пастаянна павялічваўся. Доля беспрацоўных ад колькасці эканамічна актыўнага насельніцтва працягвала расці і ў 2010 г. трымалася на высокім ўзроўні – звыш 9,5 %. Рашэнне прэзідэнта пра закрыццё турмы ў Гуантанама з-за супрацьдзеяння кангрэсменаў таксама не было выканана (у краіне ўзрастала колькасць праціўнікаў пераводу на тэрыторыю ЗША вязняў, якія падазраваліся ў тэрарыстычнай дзейнасці).

Гэтыя і некаторыя іншыя праблемы, з якімі сутыкнулася адміністрацыя Б. Абамы, не маглі не адбіцца на ўзроўні папулярнасці Дэмакратычнай партыі.

Гэта яскрава падкрэслілі вынікі прамежкавых выбараў у Кангрэс 2010 г. Дэмакраты здолелі захаваць нязначную большасць у Сенаце, але страцілі 63 мандаты ў Палаце прадстаўнікоў і саступілі там першынство рэспубліканцам.

У снежні 2010 г. адміністрацыя Б. Абамы выканала яшчэ адно важнае абяцанне сваім выбаршчыкам. Быў падпісаны закон, які скасоўваў акт 1993 г. пра забарону службы ва ўзброеных сілах ЗША адкрытых прыхільнікаў аднаполай любові (прынцып «Не запытвай, не кажы» – англ. *Don't ask, don't tell*); яшчэ раней закон 1993 г. быў прызнаны антыканстытуцыйным.

У красавіку 2011 г. Б. Абама заявіў пра жаданне ўдзельнічаць ў прэзідэнцкіх выбарах 2012 г. і афіцыйна распачаў новую прэзідэнцкую кампанію.

### Амерыканская дыпламатыя ва ўмовах канчатковага распаду біпалярнай сістэмы. ЗША і НАТО. Удзел ЗША ў вайсковых аперацыях у Югаславіі, Афганістане, Іраку. Знешняя палітыка адміністрацыі Б. Абамы

У сферы знешняй палітыкі адміністрацыя Б. Клінтана працягвала курс на ўмацаванне лідарства ЗША ў вырашэнні міжнародных праблем. З распадам біпалярнай сістэмы міжнародных адносін і пераўтварэннем Злучаных Штатаў у адзіную звышдзяржаву ідэя глабальнай адказнасці ЗША за стан спраў у свеце стала асновай знешнепалітычнага менталітэту амерыканскіх палітыкаў.

Рэзкае ўзрастанне прэтэнзій ЗША на ролю міжнароднага арбітра значна ўзмацніла выкарыстанне метадаў дыктату ў канкрэтных знешнепалітычных аперацыях. З асаблівай сілай гэта праявілася ў новай канцэпцыі рэгулявання рэгіянальных канфліктаў, якая стала ўжывацца адміністрацыяй Б. Клінтана. Яе сутнасць складалася ў тым, што ад удзелу ў традыцыйных аперацыях па падтрыманні міру і пільнаванні ўжо дасягнутых пагадненняў пад эгідай і сіламі міратворчых кантынгентаў ААН амерыканская дыпламатыя стала пераходзіць да аперацый па **«прымушэнню да міру»** варагуючых бакоў. Гэтыя аперацыі ладзіліся з ініцыятывы ЗША сіламі ваенна-палітычнага блоку НАТО без удзелу ААН, а часам і ў абыход яе рашэнняў.

Упершыню гэтыя новыя метады былі выкарыстаны Злучанымі Штатамі ў 1994 – 1995 гг., калі адміністрацыя Б. Клінтана дамаглася ўмяшання ўзброеных сіл НАТО ва ўнутрыюгаслаўскі канфлікт з мэтай навязвання варагуючым бакам выгодных для ЗША ўмоў урэгулявання этнаканфесійнага канфлікту ў Босніі. Падобны ж характар насіла чарговае ўмяшанне Злучаных Штатаў у супярэчнасці на Балканах у 1999 г. Яно прывяло да адкрытых ваенных дзеянняў сіл НАТО на чале з ЗША супраць Югаславіі (Касаўскі канфлікт).

Выпрабаванні ў 1998 г. ядзернай зброі Індыяй і Пакістанам, ракет сярэдняй дальнасці Іранам і Паўночнай Карэяй вымусілі прэзідэнта перагледзець сваё стаўленне да проціракетнай абароны. У 1999 г. Б. Клінтан абвясціў пра павелічэнне ваенных выдаткаў і пачатак рэалізацыі пла-

наў стварэння нацыянальнай сістэмы ПРА. Дзеля ўмацавання амерыканскіх пазіцый у свеце і нацыянальнай бяспекі ЗША рашуча выступала за далейшае пашырэнне НАТО на Ўсход.

Важнейшай задачай знешняй палітыкі адміністрацыі Б. Клінтана сталі таксама намаганні па падтрыманні эканамічнага першынства ЗША, якое ў 1970 – 1980-я гг. стала падрывацца ўзрастальнай канкурэнцыяй з боку Еўрапейскіх супольнасцяў і краін Азіяцка-Ціхаакіянскага рэгіёну. Для падвышэння канкурэнтаздольнасці амерыканскай эканомікі ЗША пайшлі на паглыбленне і дзяржаўна-прававое афармленне паўночнаамерыканскай інтэграцыі. У лістападзе 1993 г. Кангрэс ратыфікаваў пагадненне з Канадай і Мексікай пра стварэнне Паўночнаамерыканскай асацыяцыі свабоднага гандлю (НАФТА). У 1994 г. з ініцыятывы амерыканскага прэзідэнта было прынята рашэнне пра стварэнне Зоны свабоднага гандлю Амерык (ФТАА; англ. Free Trade Area of the Americas, FTAA).

Падчас перадвыбарчай кампаніі Дж. Буш-малодшы акцэнтаваў увагу на неабходнасці ўмацавання эканамічных і палітычных сувязяў з краінамі Лацінскай Амерыкі, асабліва з Мексікай, абмежавання ўцягвання ЗША у лакальныя канфлікты, у тым ліку з мэтай «экспарту дэмакратыі». Ён настойваў на стварэнні нацыянальнаю сістэмы ПРА і выступаў у падтрымку ўступлення Кітаю ў Сусветную гандлёвую арганізацыю (на яго думку, свабодны гандаль павінны быў падштурхнуць дэмакратычныя працэсы ў гэтай краіне).

Падзеі 11 верасня 2001 г. унеслі сур’ёзныя карэктывы ў знешнепалітычныя прыярытэты адміністрацыі Дж. Буша-малодшага. 20 верасня ў сваім звароце да Кангрэса і амерыканскага народу прэзідэнт афіцыйна абвясціў **вайну тэрарызму**: «*Наша вайна з тэрарызмам пачынаецца з «Аль-Каіды», але гэтым не скончыцца. Яна не скончыцца пакуль кожная тэрарыстычная група ў свеце не будзе знойдзена, спынена і пераможана*».

У кастрычніку ЗША і Вялікабрытанія разам з сіламі афганскага Паўночнага Альянсу распачалі ваенную аперацыю ў Афганістане. Яе мэтай стала знішчэнне тэрарыстычнай сеткі «Аль-Каіды», ліквідацыі рэжыму талібаў, што служыў важнейшым апірышчам для тэрарыстаў, і стварэнне жыццяздольнай дэмакратычнай афганскай дзяржавы. Створаная Злучанымі Штатамі контртэрарыстычная кааліцыя, таксама прадугледжвала абмен разведвальнымі данымі, замарожванне фінансавых актываў тэрарыстычных арганізацый і г. д. Напрыканцы 2001 г. Дж. Буш-малодшы абвясціў пра існаванне **«Восі Зла»** – краін, якія нясуць пагрозу існаванню «свабоднага свету» – Ірак, Іран і Паўночная Карэя.

Дзеля апраўдання аперацыі ў Афганістане адміністрацыя Дж. Буша-малодшага заяўляла, што мае права засцерагчы сябе ад краін, якія даюць прытулак ці дапамогу тэрарыстычным групам. Крыху пазней у г. зв. **«Дак-**

**трыну Буша»** былі ўключаныя дадатковыя элементы, у тым ліку вельмі спрэчная палітыка прэвентыўнай вайны, якая палягала ў тым, што Злучаным Штатам трэба змяшчаць рэжымы ў краінах, што ўяўляюць патэнцыйную ці меркаваную пагрозу для бяспекі ЗША.

Менавіта зыходзячы з гэтай логікі ў сакавіку 2003 г. Злучаныя Штаты распачалі вайну супраць іракскага рэжыму С. Хусэйна, абвінавачанага ў фінансаванні тэрарыстычных арганізацый і аднаўленні распрацоўкі зброі масавага паражэння. Хуткае скіданне С. Хусэйна не прынесла міру і спакою ў Ірак. Абвастрэнне сацыяльна-эканамічных, палітычных і міжканфесійных супярэчнасцей, пачатак партызанскай вайны і бясконцыя тэрарыстычныя акты, што абрынуліся на іракскі народ следам за ўварваннем сіл кааліцыі на чале з ЗША, прынеслі ад 400 тыс. да 1 млн. ахвяр сярод іракцаў. Злучаным Штатам гэтая вайна каштавала многія сотні мільярдаў долараў і прывяла да рэзкага пагаршэння іх аўтарытэту ў свеце, асабліва, у мусульманскага і арабскага Ўсходу.

Як і яго папярэднік, Б. Клінтан, Дж. Буш-малодшы пільна сачыў за падзеямі ў маладых краінах – былых рэспубліках СССР. ЗША падтрымлівалі дэмакратычныя працэсы ў Грузіі і Ўкраіне («кветкавыя рэвалюцыі»). А вось адносіны з Расіяй заставаліся дастаткова халоднымі, як з прычыны далейшага распаўсюджвання НАТО на Ўсход і планаў разгортвання амерыканскай ПРА ў Еўропе, гэтак і з-за скрайне негатыўнай рэакцыі Вашынгтона на дзеянні Расіі падчас расійска-грузінскай вайны 2008 г.

Важнае значэнне набыло аднаўленне адміністрацыяй Дж. Буша-малодшага шчыльных адносін з Індыяй, перажываўшых крызіс пасля правядзення ў 1998 г. гэтай краінай выпрабаванняў уласнай ядзернай зброі. Вялікая зацікаўленасць Вашынгтону ў падтрымцы Дэлі барацьбы з тэрарызмам і візіт амерыканскага прэзідэнта ў Індыю (2006) прывялі да заключэння ў 2008 г. двухбаковага пагаднення па супрацоўніцтву ў сферы выкарыстання мірнай атамнай энергіі.

Адміністрацыя Б. Абамы атрымала ў спадчыну ад рэспубліканцаў не толькі ахопленую крызісам краіну, але й цэлы комплекс праблем у сферы знешняй палітыкі. Парушэнне норм міжнароднага права, знешнія інтэрвенцыі, падзел дзяржаў на сяброўскія і варожыя («Вось Зла») няўхільна вялі да падзення аўтарытэту Злучаных Штатаў у свеце.

Адным з першых знешнепалітычных рашэнняў новай прэзідэнцкай адміністрацыі стала абяцанне скончыць на працягу наступных 18 месяцаў ваенныя аперацыі ў Іраку (31 жніўня 2010 г. Б. Абама заявіў пра заканчэнне амерыканскай ваеннай місіі ў гэтай краіне). Ужо ў лютым і сакавіку 2009 г. віцэ-прэзідэнт Дж. Байдэн і дзяржаўны сакратар Хілары Клінтан пад час сваіх за-

межных візітаў абвясцілі пра пачатак «новай эры» ў стасунках паміж ЗША, з аднаго боку, і Еўропай («Прарыў») і Расіяй («Перазагрузка»), з другога.

Знакавым для дэманстрацыі гатоўнасці шукаць паразуменне з арабскім светам стала рашэнне Б. Абамы даць сваё першае інтэрв'ю ў якасці прэзідэнта арабскамоўнаму каналу навінаў «Аль-Арабія». Некалькі пазней амерыканскі прэзідэнт выступіў з дастаткова прымірэнчым зваротам да народа і ўраду Ірану. Іранскае кіраўніцтва адрэагавала на яго ў традыцыйна антыамерыканскім ключы. Пасля прэзідэнцкіх выбараў 2009 г. у Іране і жорсткіх урадавых акцый супраць апазіцыі амерыканская адміністрацыя зноў выступіла з крытыкай Тэгерану. Нежаданне іранскага кіраўніцтва наладзіць поўнамаштабнае супрацоўніцтва з міжнароднай супольнасцю ў ядзернай сферы – на Захадзе гэта выклікае падазрэнні наконт распрацоўкі ў Іране ядзернай зброі – абумоўлівае асаблівую напружанасць амерыкана-іранскіх адносін на сучасным этапе. У чэрвені 2009 г. у прамове ў Каірскім універсітэце Б. Абама заклікаў да «новага пачатку» ў адносінах паміж ісламскім мірам і Злучанымі Штатамі і выказаў імкненне садзейнічаць мірнаму ўрэгуляванню араба-ізраільскага канфлікту.

У кастрычніку 2009 г. Б. Абама атрымаў Нобелеўскую прэмію міру з фармулёўкай «за экстраардынарныя намаганні ва ўмацаванні міжнароднай дыпламатыі і супрацоўніцтва паміж людзьмі». Гэтая высокая ацэнка першых дыпламатычных крокаў новай амерыканскай адміністрацыі выглядала як выдача шчодрага авансу – для некаторых палітыкаў і назіральнікаў неапраўданым авансам – новаму прэзідэнту ЗША. Тым не менш, пасля знешняй палітыкі ў духу «дактрыны Буша», знешнепалітычны курс Б. Абамы не мог не выклікаць у свеце сама меней стрыманы аптымізм.

У красавіку 2010 г. у Празе Б. Абама і расійскі прэзідэнт Дз. А. Мядзведзеў падпісалі двухбаковы дагавор паміж ЗША і Расіяй адносна далейшага ўзаемнага скарачэння (с кожнага боку прыкладна на 1/3) арсеналаў разгорнутых стратэгічных ядзерных узбраенняў – **СНУ-3**. Падпісанне гэтага новага пагаднення павінна было паслужыць умацаванню даверу паміж дзвюма дзяржавамі і палепшыць атмасферу міжнародных адносін у цэлым.

Важнай асаблівасцю блізкаўсходняй палітыкі ЗША падчас першых галоў дзейнасці адміністрацыі Б. Абамы стала адмаўленне ад адназначнай і безагаворачнай падтрымкі Ізраілю ў пытаннях урэгулявання складаных праблем рэгіянальнай палітыкі. У сакавіку 2010 г. Злучаныя Штаты адкрыта выказаліся супраць планаў працягу будаўніцтва ізраільскіх паселішчаў на спрэчных тэрыторыях у ваколіцах Усходняга Іерусаліму. А ў траўні 2011 г. Б. Абама выступіў за тое, каб межы будучай палесцінскай дзяржавы былі заснаваныя на базе існаваўшых да араба-ізраільскай вайны 1967 г., г. зн. за адмаўленне Ізраілю ад захопленых тэрыторый – сектара Газа, заходняга берага ракі Іардан і Ўсходняга Іерусаліму.

## Тэма 23. Міжнародныя адносіны ў другой палове XX – пачатку XXI стст.

### Асноўныя вынікі Другой сусветнай вайны. Дыпламатычнае замацаванне вынікаў вайны. Стварэнне ААН. Мірныя дагаворы з Італіяй, Румыніяй, Венгрыяй, Балгарыяй, Фінляндыяй. Праблема мірных дагавораў з Германіяй, Аўстрыяй, Японіяй. Стварэнне Ялцінска-Патсдамскай сістэмы міжнародных адносін

Другая сусветная вайна была самай цяжкай і крывавай вайной у гісторыі чалавецтва. Падчас вайны загінула каля 60 млн. чалавек. Дзясяткі мільёнаў людзей былі параненыя, сталі інвалідамі. Вайна спустошыла цэлыя краіны, ператварыла ў разваліны гарады і вёскі, зрабіла ўцекачамі мільёны людзей.

Галоўны вынік другой сусветнай вайны – перамога над фашызмам. Фашысцкія і мілітарысцкія дзяржавы-агрэсары – Германія, Італія і Японія ды іх саюзнікі былі разгромлены. Іх эканоміка, палітыка, ідэалогія пацярпелі крах, узброеныя сілы капітулявалі, тэрыторыі былі акупіраваны войскамі антыгітлераўскай кааліцыі.

Адным з важнейшых вынікаў вайны быў пераход цэлага шэрагу краін на шлях некапіталістычнага развіцця. Пасля вызвалення ад акупантаў у шэрагу краін Усходняй і Паўднёва-ўсходняй Еўропы, атрымаўшых назву краін «народнай дэмакратыі», былі створаны ўрады з удзелам і пад кіраўніцтвам камуністаў, якія прыступілі да ажыццяўлення антыфашысцкіх, дэмакратычных, а потым і сацыялістычных пераўтварэнняў. Аналагічныя пераўтварэнні праводзіліся ва Ўсходняй Германіі ў Паўночнай Карэі, акупіраваных савецкімі войскамі. У Кітаі пасля разгрому Японіі і перамогі ў грамадзянскай вайне 1945 – 1949 гг. да ўлады прыйшлі камуністы. 1 кастрычніка 1949 г. была ўсталяваная Кітайская Народная Рэспубліка (КНР). Утварылася цэлая супольнасць народна-дэмакратычных і сацыялістычных краін.

Яшчэ адзін значны вынік Другой сусветнай вайны – пачатка распаду каланіяльнай сістэмы. Вызваленчыя мэты і антыфашысцкі характар вайны, паражэнні каланіяльных дзяржаў у вайне з Японіяй, а потым разгром фашысцкіх агрэсараў і японскіх мілітарыстаў спрыялі бурнаму ўздыму нацыянальна-вызваленчага руху.

У выніку Другой сусветнай вайны рэзка змяніліся суадносіны сіл на міжнароднай арэне. Германія, Італія і Японія, якія да вайны належалі да вялікіх дзяржаў, пацярпеўшы паражэнне, на час ператварыліся ў залежныя краіны, акупіраваныя іншаземнымі войскамі. Іх эканоміка была разбураная вайной, і яны на працягу шэрагу гадоў не маглі спаборнічаць са сваімі ранейшымі канкурэнтамі.

Адзінай буйной дзяржавай, якая выйшла з вайны значна ўзмоцненай ва ўсіх адносінах, былі Злучаныя Штаты. Толькі яны валодалі ядзернай зброяй. ЗША ператварыліся ў гіганцкую «звышдзяржаву», лідара капіталістычнага свету, што прэтэндаваў на сусветную гегемонію.

Другой «звышдзяржавай» стаў СССР. Нягледзячы на аграмадныя ахвяры і разбурэнні, сваім вырашальным унёскам у перамогу над нацысцкай Германіяй Савецкі Саюз у небывалай ступені ўзмацніў сваю магутнасць, уплыў і прэстыж. Узброеныя сілы СССР знаходзіліся ў многіх краінах Цэнтральнай і Паўднёва-ўсходняй Еўропы ва Ўсходняй Германіі, Паўночнай Карэі.

Асноўныя накірункі пасляваеннага мірнага ўрэгулявання былі намечаны падчас вайны вядучымі дзяржавамі антыфашысцкай кааліцыі. На канферэнцыі кіраўнікоў СССР, ЗША і Вялікабрытаніі ў Тэгеране, Ялце і Патсдаме, а таксама на нарадзе кіраўнікоў ЗША, Вялікабрытаніі і Кітаю ў Каіры былі ўзгоднены пытанні пра тэрытарыяльныя змены, адносіны да пераможаных фашысцкіх дзяржаў і пакаранні ваенных злачынцаў, стварэнне спецыяльнай міжнароднай арганізацыі для падтрымання міжнароднага міру і бяспекі.

Саюзныя дзяржавы вырашылі акупіраваць Германію, Італію і Японію з мэтай выкаранення нацызму, фашызму і мілітарызму. Яны пастанавілі аддаць галоўных ваенных злачынцаў суду Міжнароднага трыбуналу. Тэрытарыяльныя захопы Германіі, Італіі, Японіі ды іх саюзнікаў, здзейсненыя ў 1930-я гг. і перыяд Другой сусветнай, анулявалiся. СССР, ЗША і Вялікабрытанія заявілі, што неабходна аднавіць незалежнасць Аўстрыі і Чэхаславакіі, вярнуць Паўночную Трансільванію Румыніі. Чэхаславакія была вымушана даць згоду на перадачу Савецкаму Саюзу Закарпацкай Ўкраіны, дзе пераважала ўкраінскае (русінскае) насельніцтва.

Мяжу паміж Германіяй і Польшчай саюзнікі дамовіліся правесці па лініі рэк Одэр і Нэйсэ. Усходняя мяжа Польшчы павінна была праходзіць па мяжы з Заходняй Украінай і Заходняй Беларуссю, уздоўж лініі Кэрзана. Горад Кёнігсберг і прылеглыя да яго раёны Ўсходняй Прусіі перадаваліся Савецкаму Саюзу. Мільёны немцаў і венграў, якія пражывалі на тэрыторыях, адышоўшых да Польшчы, Чэхаславакіі і СССР, падлягалі высяленню з ранейшых месцаў пражывання і выезд на сваю гістарычную радзіму. Германія і яе саюзнікі павінны былі заплаціць рэпарацыі краінам, што сталі ахвярамі фашысцкай агрэсіі.

Вялікабрытанія, ЗША і СССР вырашылі вызваліць з-пад улады Японіі ўсе тэрыторыі, якія яна захапіла пры дапамозе сілы і абмежаваць японскі суверэнітэт чатырма галоўнымі японскімі астравамі. Карэі была абяцаная незалежнасць. Маньчжурыя (Паўночна-ўсходні Кітай), востраў Тайвань ды іншыя Кітайскія астравы, захопленыя Японіяй, прапаноўвалася вярнуць Кітаю. Савецкаму Саюзу вяртаўся Паўднёвы Сахалін і перадаваліся Курыльскія астравы, якія да 1855 г. належалі Расіі.

На канферэнцыі ў Ялце і наступных нарадах прадстаўнікоў СССР, ЗША і Вялікабрытаніі было дасягнута пагадненне аб размежавальнай лініі паміж савецкімі і амерыкана-брытанскімі войскамі, якія дзейнічалі ў Еўропе. Аналагічная размежавальная лінія была намечаная і ў Карэі. Паўночную Карэю (да

поўначы ад 38-й паралелі) вызвалялі савецкія войскі, Паўднёвую Карэю – амерыканскія. Першапачаткова гэтае размежаванне задумвалася як часовае, але неўзабаве пераўтварылася ў фактычную мяжу, што аддзяляла савецкую і амерыкана-брытанскую сферы ўплыву.

Важнай падзеяй міжнароднага жыцця першых пасляваенных гадоў было стварэнне **Арганізацыі Аб'яднаных Нацый (ААН)**, галоўнай задачай з'яўлялася падтрыманне міжнароднага міру і бяспекі, развіццё супрацоўніцтва паміж народамі і дзяржавамі.

Па папярэдняй дамоўленасці паміж СССР, ЗША і Вялікабрытаніяй, дасягнутай на канферэнцыі лідараў трох вялікіх дзяржаў у Ялце, у красавіку 1945 г. у Сан-Францыска пачала сваю работу Ўстаноўчая канферэнцыя ААН. На яе былі запрошаны дзяржавы, што абвясцілі вайну Германіі ды іншым краінам фашысцкага блоку. Канферэнцыя прыняла Статут ААН, зафіксаваўшы важнейшыя прынцыпы міжнароднага права: развіццё сяброўскіх адносін паміж нацыямі на базе раўнапраўя і самавызначэння народаў, неўмяшання ва ўнутраныя справы іншых дзяржаў, вырашэнне міжнародных спрэчак мірнымі сродкамі, устрыманне ад пагрозы выкарыстання сілы. У Статуце пазначалася, што міжнароднае супрацоўніцтва павінна ажыццяўляцца ў духу «павагі да правоў чалавека і асноўных свабодаў для ўсіх, без адрознення расы, полу, мовы і рэлігіі».

Згодна Статуту ААН, кіруючым органам ААН з'яўляецца **Генеральная Асамблея** і **Рада Бяспекі**. Генеральная асамблея, г. зн. сход усіх членаў ААН, дзе кожная краіна мае адзін голас, перыядычна збіраецца на сесіі, якія разглядаюць агульныя прынцыпы міжнароднага супрацоўніцтва і праблемы, звязаныя з падтрыманнем міжнароднага міру і бяспекі. Рашэнні Генеральнай Асамблеі носяць не абавязковы, а рэкамендацыйны характар, але валодаюць высокім міжнародным аўтарытэтам. Рада Бяспекі, на які ўскладзена галоўная адказнасць за падтрыманне міжнароднага міру і бяспекі, прымае рашэнні, абавязковыя для членаў ААН. Рада Бяспекі складаецца з пастаянных і непастаянных членаў. Пастаяннымі членамі з'яўляюцца пяць вялікіх дзяржаў: СССР, Вялікабрытанія, Злучаныя Штаты, Францыя і Кітай. Непастаянныя члены (першапачаткова шэсць, а з 1963 г. – дзесяць краін) абіраюцца Генеральнай Асамблеяй тэрмінам на два гады. Рашэнні Рады Бяспекі сапраўдныя толькі пры ўмове аднагалосся ўсіх яго пастаянных членаў (кожная з пяці вялікіх дзяржаў валодае правам вета).

У межах ААН дзейнічае цэлы шэраг іншых структур, у тым ліку міжнародныя спецыялізаваныя арганізацыі. Адной з найбольш паважаных і вядомых з іх з'яўляецца Арганізацыя Аб'яднаных Нацый па пытаннях адукацыі, навукі і культуры (ЮНЕСКО).

У 1945 г. членамі ААН стала 51 дзяржава – удзельнікі канферэнцыі ў Сан-Францыска. Краіны фашысцкага блоку спачатку не дапускаліся ў ААН. Дзень, калі Статут ААН набыў сілу – 24 кастрычніка 1945 г. – штогод адзначаецца як Дзень ААН.

Адным з самых неадкладных пытанняў пасляваеннага ўрэгулявання было заключэнні міжнародных дагавораў. Паколькі Германія не мела ўраду, дзяржавы-пераможцы вырашылі ў першую чаргу заключыць мірныя дагаворы з еўрапейскімі саюзнікамі Германіі – Італіяй, Румыніяй, Венгрыяй, Балгарыяй і Фінляндыяй.

Праекты гэтых дагавораў, падрыхтаваныя міністрамі замежных спраў СССР, ЗША, Вялікабрытаніі, Францыі і Кітаю былі вынесены на абмеркаванне **Парыжскай мірнай канферэнцыі**, якая працавала летам і восенню 1946 г. У працэсе падрыхтоўкі дагавораў, як і падчас работы Парыжскай канферэнцыі, выявіліся сур’ёзныя супярэчнасці паміж СССР, ЗША і Вялікабрытаніяй. Урад СССР падтрымлівала створаныя пры яго ўдзеле ўрады Румыніі, Венгрыі і Балгарыі, а ЗША і Вялікабрытанія патрабавалі іх карэннай рэарганізацыі. Савецкі Саюз дамагаўся перадачы яму ў якасці падапечнай тэрыторыі Трыпалітаніі (Лівіі), а таксама прадастаўлення яму базы для гандлёвага і ваеннага флоту ў адной з былых італьянскіх калоній у Міжземнамор’і. У канчатковым выніку названыя патрабаванні вялікіх заходніх дзяржаў і СССР былі адкінутыя. 10 лютага 1947 г. ў Парыжы адбылося падпісанне мірных дагавораў з Італіяй, Румыніяй, Венгрыяй, Балгарыяй і Фінляндыяй.

Тэрытарыяльныя палажэнні мірных дагавораў ліквідавалі набыткі, зробленыя раней фашысцкімі агрэсарамі. Італія прызнала суверэнітэт Албаніі ды Эфіопіі. Акупіраваныя Італіяй Дадэканезскія астравы вярталіся Грэцыі. Славянскія землі, за выключэннем Трыесту перадаваліся Югаславіі. Трыест з прылеглай да яго невялікай вобласцю быў абвешчаны «вольнай тэрыторыяй». Італія пазбавілася сваіх калоній у Афрыцы. У адпаведнасці з умовамі перамір’я з Румыніяй і Венгрыяй мірныя дагаворы замацавалі вяртанне Румыніі часткі Трансільваніі. Фінляндыя вярнула СССР вобласць Петсама (Печанга), перададзеную ёй Савецкай дзяржавай у 1920 г. і аддала Савецкаму Саюзу ў арэнду на 50 гадоў тэрыторыю Поркала-Уд на паўночным узбярэжжы Фінскага заліву (недалёка ад Хельсінкі) для стварэння там савецкай ваенна-марской базы.

Палітычныя палажэнні мірных дагавораў абавязвалі Італію, Венгрыю, Румынію, Балгарыю і Фінляндыю забяспечыць сваім грамадзянам асноўныя дэмакратычныя правы і свабоды, забаранялі адраджэнне і дзейнасць фашысцкіх арганізацый, прадугледжвалі прыцягненне да суду ваенных злачынцаў. Гэтым краінам дазвалялася мець для мэтаў абароны абмежаваную колькасць узброеных сіл, але забаранялася вырабляць атамную зброю ды іншую зброю масавага знішчэння. Эканамічныя раздзелы дагавораў прадугледжвалі выплату рэпарацый ахвярам агрэсіі: Савецкаму Саюзу, Албаніі, Грэцыі, Югаславіі, Чэхаславакіі ды Эфіопіі.

На Ялцінскай і Патсдамскай канферэнцыях СССР, ЗША і Вялікабрытанія дамовіліся пра тое, што тэрыторыя Германіі зазнае працяглую акупа-

цыю. Паколькі Аўстрыя ў 1938 – 1945 гг. уваходзіла ў склад Трэцяга Рэйху, яна была таксама акупіраваная. Падобна да Германіі, Аўстрыя была падзелена на чатыры акупацыйныя зоны. Вярхоўную ўладу ажыццяўляла Саюзніцкая рада, якая складалася з прадстаўнікоў СССР, ЗША, Вялікабрытаніі і Францыі. У кастрычніку 1945 г. у Аўстрыі адбыліся выбары і сфарміраваны ўрады, але акупацыйны рэжым захоўваўся, таму што Савецкі Саюз адмаўляўся заключаць мірны дагавор з Аўстрыяй, пакуль не будзе падпісаны мірны дагавор з Германіяй. Неўзабаве паміж саюзнікамі сталі нарастаць супярэчнасці. Германія аказалася, па сутнасці, падзеленай надвое і дагавор з ёю так ніколі і не быў заключаны. З Аўстрыяй дагавор быў падпісаны ўжо пасля смерці І. В. Сталіна – у 1955 г.

Японія, у адрозненне ад Германіі і Аўстрыі, не мела розных зон акупацыі. Яе тэрыторыя аказалася пад кантролем толькі амерыканскай акупацыйнай адміністрацыі і войск. Праект мірнага дагавору з Японіяй ЗША падрыхтавалі толькі да 1951 г. У адпаведнасці з ім Японія павінна была адмовіцца ад прэтэнзій на Карэю, Тайвань і Пескадорскія астравы, ад астравоў у Ціхім акіяне, якімі яна кіравала па мандату Лігі Нацый, ад усіх правоў і прэтэнзій у Кітаі і Антарктыцы, а таксама ад прэтэнзій на Паўднёвы Сахалін і частку Курыльскіх астравоў (Хабамаі, Кунашыр, Шыкатан, Ітуруп). Некалькі астравоў заставаліся пад кіраваннем Злучаных Штатаў (толькі на мяжы 1960 – 1970-х гг. яны былі паэтапна вернутыя Японіі пры ўмове захавання там амерыканскіх ваенных баз). Рэпарацыйныя выплаты на Японію не накладаліся.

Для падпісання мірнага дагавору з Японіяй была склікана **міжнародная канферэнцыя ў Сан-Францыска** (4 – 8 лістапада 1951 г.). Да ўдзелу ў ёй не быў запрошаны камуністычны Кітай, з якім ЗША разарвалі дыпламатычныя адносіны. У знак пратэсту супраць несправядлівага рашэння пытання аб рэпарацыях адмовіліся ад удзелу ў канферэнцыі Індыя і Бірма. Ужо ў ходзе яе работы з крытыкай тэксту пагаднення выступіў Савецкі Саюз, падтрыманы прадстаўнікамі Польшчы і Чэхаславакіі. У выніку усе гэтыя краіны так і не падпісалі мірны дагавор. Расія, правапераемніца СССР, дагэтуль не мае з Японіяй мірнага дагавору. З-за гэтага засталася адкрытай праблема прыналежнасці Курыльскіх астравоў, на якія Японія неўзабаве стала прэтэндаваць.

Такім чынам, па заканчэнні Другой сусветнай вайны склалася новая сістэма міжнародных адносін. Паколькі яе асноўныя прынцыпы былі сфармуляваны яшчэ на канферэнцыях саюзнікаў у 1945 г., гэтая сістэма атрымала назву **Ялцінска-Патсдамскай**. Асновай сусветнай палітыкі былі абвешчаны прынцыпы калектыўнай дыпламатыі і нацыянальнага суверэнітэту, адмова ад блокавага супрацьстаяння і выкарыстання вайны як сродку палітыкі, прыярытэт прававога ўрэгулявання міжнародных канфліктаў. У адрозненне ад Версальска-Вашынгтонскай сістэмы большае значэнне надавалася праву народаў на

дэмакратычнае развіццё, абароне чалавецтва ад пагрозы тыранічных рэжымаў, канструктыўнаму супрацоўніцтву ўсіх краін і народаў у самых розных сферах жыцця. Аднак усе гэтыя прынцыпы знайшлі цалкам адрозную трактоўку ў інтэрпрэтацыі савецкай і амерыканскай прапаганды. Палітычны курс дзвюх «звышдзяржаў» аказаўся скіраваны найперш на пашырэнне і ўмацаванне ўласных сфер уплыву ў пасляваенным свеце, экспарт сваёй ідэалогіі, а, часцяком, і прамое ваенна-палітычнае ўмяшанне ў «трэція краіны». Ялцінска-Патсдамская сістэма міжнародных адносін набывала ўзрастальна яўны біпалярны характар.

### Адыход ад палітыкі саюзніцкіх адносін. Ядзерны ваенна-палітычны фактар. Пачатак «халоднай вайны». «Дактрына Трумэна», «план Маршала». Стварэнне Заходняга Саюза і НАТО. Раскол Германіі. Вайна ў Карэі. Абвастрэнне ваенна-блокавага супрацьстаяння. Утварэнне АВД. Аслабленне міжнароднай напружанасці. Працяг гонкі ўзбраенняў. Суэцкі крызіс

У абстаноўцы пасляваенных узрушэнняў, народна-дэмакратычных і нацыянальна-вызваленчых рэвалюцый сталі хутка нарастаць супярэчнасці паміж заходнімі дзяржавамі на чале з ЗША і згуртаванымі вакол СССР народна-дэмакратычнымі дзяржавамі. Паступова сфарміраваліся два ідэалагічныя і ваенна-палітычныя блокі. Надышоў перыяд рэзкага абвастрэння міжнародных адносін – «халодная вайна».

Адным з першых прапагандысцкіх актаў «халоднай вайны» стала прамова У. Чэрчыля, зробленая 5 сакавіка 1946 г. у Фултане (ЗША). У гэтай прамове, загадзя ўзгодненай з Г. Трумэнам, былы брытанскі прэм’ер сказаў, што Савецкі Саюз падзяліў Еўропу «жалезнай заслонай», усталяваў у сваёй сферы ўплыву таталітарны кантроль і жадае «бязмежнага распаўсюджвання сваёй сілы і сваіх дактрын». У. Чэрчыль заклікаў стрымліваць экспансіяністцкія тэндэнцыі СССР.

За гэтым пачалася прапагандысцкая кампанія і ў краінах Захаду, і на Ўсходзе. Амерыканскі ўрад абвясціў сваёй афіцыйнай дактрынай «стрымліванне камунізму» і стаў звяртацца да «атамнай дыпламатыі», г. зн. пагрозы выкарыстання атамнай зброі. Ужо напрыканцы 1945 г. Г. Трумэн зацвердзіў сакрэтны план на выпадак ваенных дзеянняў з СССР, які намеціў удар атамнымі бомбамі па 20 савецкіх гарадах.

У адказ савецкае кіраўніцтва разгарнула палітычную і прапагандысцкую кампанію супраць англа-амерыканскіх «падпальшчыкаў вайны». ЗША абвінавачваліся ў тым, што, нібыта, імкнуцца «пераўтварыць увесь свет у калонію амерыканскіх імперыялістаў, звесці суверэнныя народы да становішча рабоў», усталяваць «зверскі фашызм не толькі ў сябе дома, але і ў іншых краінах». Баючыся атамнага нападу Савецкі Саюз фарсіраваў работы па стварэнні ўласнай ядзернай зброі і ў жніўні 1949 г. правёў пер-

шае яго выпрабаванне. У 1952 г. ЗША завалодалі яшчэ больш магутнай ядзернай зброяй. У лістападзе 1952 г. яны выпрабавалі на атоле Бікіні ў Ціхім акіяне тэрмаядзерныя прылады. Менш чым праз год падобную смертаносную зброю меў ужо і Савецкі Саюз.

Страціўшы манаполію на атамную і тэрмаядзерную зброю, Злучаныя Штаты напачатку захоўвалі перавагу ў сродках яе дастаўкі. У 1953 г. у ЗША былі сканструяваны міжкантынентальныя стратэгічныя бамбавікі, а ў 1955 г. – міжкантынентальныя балістычныя ракеты, здольныя даставіць ядзерную зброю ў любую кропку зямнога шару. Неўзабаве СССР ліквідаваў і гэтую перавагу. Летам 1957 г. пад кіраўніцтвам С. П. Каралёва адбылося выпрабаванне першай савецкай міжкантынентальнай балістычнай ракеты. Стартуючы з тэрыторыі СССР, яна магла дасягнуць асноўных гарадоў ЗША праз 20 – 30 хвілін. Стварэнне савецкай ракетна-ядзернай зброі не спыніла гонку ўзбраенняў. Канфрантацыя па лініі Захад – Усход працягвалася і ўзмацнялася.

Поруч з «атамнай дыпламатыяй» важнай часткай амерыканскай дактрыны «стрымлівання камунізму» з'яўлялася эканамічная і ваенная дапамога іншым капіталістычным краінам. Першым крокам у гэтым накірунку стала **дактрына Трумэна** (1947). Спасылаючыся на просьбы, атрыманыя ад урадаў Грэцыі і Турцыі, Г. Трумэн абвясціў аб вылучэнні гэтым краінам ваеннай і эканамічнай дапамогі для барацьбы з камунізмам у памеры $400 млн. У Грэцыю і Турцыю «пасылалася» амерыканскае ўзбраенне і ваенныя дарадцы, там ствараліся амерыканскія ваенныя базы.

Дактрына Трумэна датычылася не толькі Грэцыі і Турцыі. Па сутнасці яна насіла сусветны характар. У ёй прама ўказвалася, што палітыка Злучаных Штатаў павінна складацца ў падтрымцы ўсіх народаў, якія змагаюцца супраць камунізму. У адпаведнасці з гэтым прынцыпам ЗША падтрымлівалі кітайскі ўрад Чан Кайшы, а таксама аказвалі пастаянную эканамічную і ваенную падтрымку ўладам Паўднёвай Карэі.

Асаблівую ўвагу правячыя колы Злучаных Штатаў надавалі краінам Заходняй Еўропы, дзе на іх думку ў выніку вайны і пасляваеннага крызісу ўзнікла «пагроза камунізму». Амерыканскі ўрад распрацаваў спецыяльны план дапамогі краінам Еўропы, які быў агалошаны ў выступленні дзяржаўнага сакратара ЗША Дж. Маршала 5 чэрвеня 1947 г. Да **плана Маршала** далучыліся 16 краін – Аўстрыя, Бельгія, Вялікабрытанія, Грэцыя, Данія, Італія, Люксембург, Нідэрланды, Ісландыя, Ірландыя, Нарвегія, Партугалія, Турцыя, Францыя, Швейцарыя і Швецыя. У 1949 г. да гэтага плану далучылася Заходняя Германія.

Савецкі ўрад угледзеў у плане Маршала «план закабалення Еўропы», які мае на мэце «рэстаўрыраваць уладу капіталізму у краінах новай дэмакратыі», замацаваць імперыялізм і фашызм, падрыхтаваць новую імперыя-

лістычную вайну. Зыходзячы з гэткім меркаванняў СССР адмовіўся ўдзельнічаць у плане Маршала, нават не абмяркоўваючы канкрэтных умоў. Пад націскам СССР амерыканскую дапамогу адкінулі ўсё краіны народнай дэмакратыі, а таксама Фінляндыя.

У працэсе «халоднай вайны» паступова сфарміраваліся дзве ваенна-палітычныя кааліцыі на чале адпаведна з СССР і ЗША. Еўрапейскія краіны народнай дэмакратыі (за выключэннем Югаславіі) былі звязаныя з Савецкім Саюзам дагаворамі аб сяброўстве, супрацоўніцтве і ўзаемадапамозе. Падобныя пагадненні былі потым падпісаныя СССР з Карэйскай Народна-Дэмакратычнай Рэспублікай (КНДР) і Кітайскай Народнай Рэспублікай.

Паралельна з гэтым адбудоўваўся блок заходніх дзяржаў. У 1947 г. дзяржавы амерыканскага кантыненту (усе акрамя Канады) заключылі Міжамерыканскі дагавор аб узаемадапамозе. Дагавор прадугледжваў сумесныя дзеянні амерыканскіх дзяржаў у выпадку ўзброенага нападзення на адно з іх. Створаная ў 1948 г. пастаянная Арганізацыя амерыканскіх дзяржаў, дзе ЗША адыгрывалі вядучую ролю, канчаткова аформіла саюз дзяржаў амерыканскага кантыненту.

У Еўропе галоўнымі ініцыятарамі фарміравання адасобленых ваенна-палітычных блокаў былі Вялікабрытанія і Францыя. 4 сакавіка 1947 г. у Дзюнкерку (Францыя) яны падпісалі дагавор аб узаемадапамозе. Фармальна ён быў скіраваны супраць магчымасці новай агрэсіі з боку Германіі, а фактычна ўяўляў сабой пагадненне дзвюх буйнейшых дзяржаў Заходняй Еўропы з мэтай абароны ўласных інтарэсаў. У 1948 г. да Англіі і Вялікабрытаніі далучыліся Бельгія, Нідэрланды і Люксембург. Яны ўтварылі **Заходні Саюз**, члены якога абавязваліся аказваць адзін аднаму дапамогу ў выпадку агрэсіі ў Еўропе. Гэтак узнікла ваенна-палітычная групоўка заходнееўрапейскіх дзяржаў, шчыльна звязаных са Злучанымі Штатамі.

Канфрантацыя двух варагуючых блокаў прывяла да карэнных змен іх стаўлення да былых варожых дзяржаў. ЗША і Вялікабрытанія ўзялі курс на аднаўленне эканамічнага і ваеннага патэнцыялу Заходняй Германіі, што фактычна з’яўлялася спробай перагляду Патсдамскіх пагадненняў.

У 1946 г. ЗША і Вялікабрытанія аб’ядналі свае зоны акупацыі ў г. зв. Бізонію. У 1948 г. да іх далучылася французская зона – утварылася Трызоніія. Акупацыйныя ўлады ў заходніх зонах паступова перадавалі функцыі кіравання ў рукі нямецкай адміністрацыі на чале з прадстаўнікамі буржуазных партый. У 1948 г. на нарадзе ў Лондане ўрады ЗША, Вялікабрытаніі, Францыі, Бельгіі, Галандыі і Люксембурга канчаткова вырашылі стварыць на тэрыторыі Трызоніі асобную дзяржаву. Важным крокам да гэтага стала сепаратная грашовая рэформа, якую ЗША, Вялікабрытанія і Францыя правялі ў Трызоніі. У канчатковым выніку ўсё гэта скончылася савецкай блакадай Заходняга Берліну. «Берлінскі крызіс» скрайне абвастрыў адносіны паміж Савецкім Саюзам і заходнімі дзяржавамі.

У жніўні 1949 г. адбыліся выбары ў парламент Заходняй Германіі. У верасні 1949 г. сабраўшыся на сваю першую сесію, парламент абвясціў пра стварэнне новай германскай дзяржавы – Федэратыўная Рэспубліка Германіі. Пасля гэтага ў савецкай зоне акупацыі пачалося фарміраванне ўсходнегерманскай дзяржавы. 7 кастрычніка 1949 г. была заснаваная Германская Дэмакратычная Рэспубліка. На нямецкай зямлі ўзніклі дзве германскія дзяржавы з розным грамадскім і палітычным ладам.

У 1949 г. пад кіраўніцтвам ЗША быў створаны буйнейшы ваенна-палітычны блок, які ўпершыню аб'яднаў усе вядучыя краіны Заходняй Еўропы і Паўночнай Амерыкі. 4 красавіка 1949 г. у сталіцы ЗША Вашынгтоне 12 дзяржаў, у тым ліку ЗША, Канада, Вялікабрытанія, Францыя, Італія, Бельгія, Нідэрланды, Люксембург, Данія, Ісландыя, Нарвегія і Партугалія падпісалі Паўночнаатлантычны дагавор аб узаемнай абароне, стварыўшы **Арганізацыю Паўночнаатлантычнага дагавору** (**НАТО**; англ. *North Atlantic Treaty Organization*). Краіны-ўдзельніцы абавязваліся аказваць адзін аднаму дапамогу ў выпадку ўзброенага нападу. У адрозненне ад звычайных дагавораў аб узаемнай дапамозе Паўночнаатлантычны альянс меў спецыяльную інтэграваную ваенную арганізацыю, пастаянныя ўзброеныя сілы і аб'яднанае камандаванне, на чале якога стаяў амерыканскі генерал. Фактычна НАТО быў скіраваны супраць СССР і яго саюзнікаў.

Пасля стварэння Паўночнаатлантычнага пакту міжнародная напружанасць яшчэ больш узмацнілася. Напачатку 1950-х гг. «халодная вайна» вылілася ў лакальны ўзброены канфлікт паміж сацыялістычнымі і капіталістычнымі дзяржавамі.

25 чэрвеня 1950 г. войскі Карэйскай Народна-Дэмакратычнай Рэспублікі (КНДР) з маўклівай згоды СССР і КНР пачалі наступленне супраць Паўднёвай Карэі з мэтай аб'яднаць усю Карэю пад уладай камуністаў. Гэтак пачалася **Карэйская вайна (1950 – 1953)**. Каб апраўдаць свае дзеянні, урад КНДР заявіў, што Паўночная Карэя стала ахвярай нападу з боку паўднёвай суседкі і была вымушаная абараняцца. Савецкі Саюз і Кітай, еўрапейскія краіны народнай дэмакратыі і кампартыі ўсяго свету падтрымалі гэтую прапагандысцкую версію, а ўрад ЗША абвінаваціў КНДР і накіраваў у Карэю свае ўзброеныя сілы, якія ўзялі ўдзел у баявых дзеяннях на баку Паўднёвай Карэі. Да амерыканскіх войск далучыліся, праўда, у нязначнай колькасці, войскі яшчэ 14 дзяржаў, у тым ліку Вялікабрытаніі Францыі і Канады. Амерыканскія дыпламаты правялі ў ААН рэзалюцыю, якая асуджала КНДР як агрэсара і абвяшчала войскі ЗША ды іх саюзнікаў, што дзейнічалі ў Карэі, войскамі ААН.

Вайна цягнулася больш за тры гады. Спачатку Народная армія КНДР усталявала кантроль над 90 % тэрыторыі Паўднёвай Карэі, але амерыканскае камандаванне высадзіла на заходнім узбярэжжы Карэйскага паўвострава буйны дэсант, які нанёс цяжкае паражэнне паўночнакарэйскай арміі. Да кастрыч-

ніка 1950 г. войскі Злучаных Штатаў занялі значную частку КНДР, захапілі яе сталіцу Пхеньян і нават наблізіліся да межаў Кітаю. Тады на дапамогу КНДР прыйшлі савецкія лётчыкі і вайсковыя часткі КНР, якія афіцыйна дзейнічалі ў якасці добраахвотнікаў. Разам з карэйскай Народнай арміяй добраахвотнікі адкінулі сваіх праціўнікаў да межаў КНДР.

Камандуючы амерыканскімі войскамі ў Карэі генерал Макартур нават прапанаваў пусціць у ход атамную бомбу, але ўрад ЗША адкінуў яго прапанову і адхіліў Макартура ад камандавання. Летам 1951 г. пачаліся перагаворы. Праз два гады, 27 ліпеня 1953 г., яны скончыліся падпісаннем перамір'я. Сілы ваюючых бакоў засталіся на лініі фронту, якая знаходзілася ў раёнах, блізкіх да 38-й паралелі, гэта значыць амаль на тых жа самым пазіцыях, на якіх пачалася вайна. Раскол Карэі тым самым быў замацаваны.

Падчас вайны ў Карэі і пасля яе заканчэння ЗША дапоўнілі сістэму ваенна-палітычных блокаў новымі рэгіянальнымі пактамі з дзяржавамі Азіі і Ціхага акіяну. У 1951 г. ЗША заключылі «дагавор бяспекі» з Аўстраліяй і Новай Зеландыяй (дагавор **АНЗЮС**). Потым яны прыступілі да арганізацыі шматбаковага блоку – Арганізацыі дагавору для Паўднёва-ўсходняй Азіі (**СЕАТО**). Дагавор СЕАТО, падпісаны ў 1954 г. ЗША, Вялікабрытаніяй, Францыяй, Пакістанам, Тайландам, Філіпінамі, Аўстраліяй і Новай Зеландыяй павінен быў адыграць на Далёкім Усходзе і Ціхім акіяне гэткую ж ролю, як Паўночнаатлантычны альянс на Захадзе. У 1955 г. у Багдадзе быў падпісаны **Багдадскі пакт**. У яго ўвайшлі Турцыя, Ірак, Пакістан, Іран і Вялікабрытанія. Злучаныя Штаты з саюзнікамі абкружылі СССР ды іншыя сацыялістычныя краіны сістэмай ваенных баз дзеля нанясення магчымых баявых удараў сваёй авіяцыі.

Пасля смерці І. В. Сталіна новае савецкае кіраўніцтва зрабіла шэраг буйных крокаў па змякчэнні міжнароднай напружанасці. Спачатку савецкі ўрад дамовіўся са Злучанымі Штатамі пра падпісанне перамір'я ў Карэі. У ліпені 1954 г. у Жэневе на нарадзе міністраў замежных спраў СССР, ЗША, Вялікабрытаніі, Францыі, КНР і Дэмакратычнай Рэспублікі В'етнам (ДРВ) былі падпісаны пагадненні пра спыненне каланіяльнай вайны ў В'етнаме. Тэрыторыя гэтай краіны часова была падзеленая дэмаркацыйнай лініяй уздоўж 17-й паралелі: на поўначы ад гэтай лініі павінны былі засяродзіцца войскі ДРВ, на поўдзень – войскі паўднёвав'етнамскага ўраду. Неўзабаве гэтая часовая размежавальная лінія надоўга пераўтварылася ў мяжу паміж ДРВ і Паўднёвым В'етнамам. У адпаведнасці з Жэнеўскімі пагадненнямі Францыя канчаткова прызнала незалежнасць краін Індакітайскага паўвострава – і вывела адтуль свае войскі.

Пачатак рэмілітарызацыі Заходняй Германіі і яе ўступленне ў блок НАТО выклікала адпаведную рэакцыю СССР і яго саюзнікаў. 14 траўня 1955 г. Албанія, Балгарыя, Венгрыя, ГДР, Польшча, Румынія, Савецкі Саюз і Чэхаславакія на Варшаўскай нарадзе еўрапейскіх дзяржаў па забеспя-

чэнні міру і бяспекі ў Еўропе падпісалі Варшаўскі дагавор (Дагавор аб сяброўстве, супрацоўніцтве і ўзаемнай дапамозе). Тым самым было аформлена стварэнне ваеннага саюзу еўрапейскіх сацыялістычных дзяржаў пры вядучай ролі СССР – **Арганізацыя Варшаўскага Дагавору (АВД)**.

Тым не менш, у ліпені 1955 г. таксама ў Жэневе адбылася першая нарада кіраўнікоў урадаў ЗША, СССР, Вялікабрытаніі і Францыі. На ім абмяркоўваліся праблемы скарачэння ўзбраенняў, забароны атамнай зброі, а таксама праблемы еўрапейскай бяспекі і аб’яднання Германіі. Хаця пагадненняў па гэтых пытаннях не было дасягнута, нарада спрыяла аслабленню міжнароднай напружанасці.

Дзякуючы больш гнуткай палітыцы СССР, удалося вырашыць некаторыя застарэлыя праблемы. У студзені 1955 г. Савецкі Саюз апублікаваў заяву пра афіцыйнае спыненне стану вайны з Германіяй, а ў верасні гэтага году ўсталяваў дыпламатычныя адносіны з ФРГ і вызваліў нямецкіх ваеннапалонных і ваенных злачынцаў, якія яшчэ заставаліся ў Савецкім Саюзе.

У траўні 1955 г. урады СССР, ЗША, Вялікабрытанія і Францыя падпісалі з Аўстрыяй Дзяржаўны дагавор аб заканчэнні акупацыі і аднаўленні незалежнай і дэмакратычнай Аўстрыі. Дагавор забараняў аншлюс і абавязваў аўстрыйскі ўрад не дапускаць фашысцкай і мілітарысцкай дзейнасці на тэрыторыі краіны. Пасля таго, як Дзяржаўны дагавор набыў моц і акупацыйныя войскі пакінулі Аўстрыю, аўстрыйскі парламент прыняў канстытуцыйны закон аб пастаянным нейтралітэце.

У 1956 г. у Маскве была падпісана савецка-японская дэкларацыя, якая паклала канец афіцыйнаму стану вайны паміж Японіяй і СССР і прывяла да аднаўлення дыпламатычных адносін паміж гэтымі дзвюма краінамі. СССР падтрымала просьбу Японіі аб прыняцці яе ў ААН, пагадзіўся вызваліць усіх японскіх грамадзян, асуджаных у СССР, і рэпатрыіраваць іх у Японію. Савецкі ўрад абяцаў перадаць Японіі два з чатырох паўднёвакурыльскіх астравоў – Хабамаі і Шыкатан – пры ўмове падпісання мірнага дагавору і вываду амерыканскіх войск з Японіі. Калі ў 1960 г. Японія заключыла з ЗША дагавор аб узаемным супрацоўніцтве і бяспецы, урад СССР адмовіўся ад свайго абяцання. Мірны дагавор так і не быў заключаны.

Новую арыентацыю савецкай знешняй палітыкі пацвердзіў і афіцыйна замацаваў ХХ з’езд КПСС (люты 1956 г.). Асноўным зместам знешняй палітыкі СССР быў абвешчаны курс на прадухіленне вайны і мірнае суіснаванне дзяржаў з рознымі грамадска-палітычнымі сістэмамі. Неўзабаве гэтая дэкларацыя стала напаўняцца канкрэтным зместам. Яўнай праявай гэтага курсу сталі шматлікія афіцыйныя візіты савецкіх кіраўнікоў, у тым ліку ў Вялікабрытанію, Аўстрыю, Кітай, Індыю, ЗША. Разам з тым Савецкі Саюз працягваў супрацьстаяць капіталістычнаму Захаду і ўдзельнічаць у гонцы ўзбраенняў.

Зніжэнне градусу супрацьстаяння «звышдзяржаў» не спыніла гонку ўзбраенняў. У 1952 г. было паспяхова праведзена першае выпрабаванне вадароднай бомбы, але ўжо праз год тэрмаядзерная зброя з’явілася і ў Савецкім Саюзе. За першую палову 1950-х гг. амерыканцам удалося павялічыць колькасць стратэгічных бамбавікоў у тры разы, але 4 кастрычніка 1957 г. СССР запусціў свой першы штучны спадарожнік Зямлі, прадэманстраваўшы наяўнасць у яго на ўзбраенні міжкантынентальных балістычных ракет. У Злучаных Штатах у гэтыя гады ішлі работы па стварэнні падобных наступальных ракет.

Нягледзячы на некаторае аслабленне напружанасці, на працягу 1950-х гг. у міжнародных адносінах не раз узнікалі вострыя крызісы, што павялічвалі пагрозу вайны. У ліпені 1956 г. Егіпет ажыццявіў нацыяналізацыю кампаніі Суэцкага каналу, у якой дамінаваў франка-брытанскі капітал, абяцаючы выплаціць кампенсацыю і гарантаваць праход судоў усіх краін. Гэта выклікала **Суэцкі крызіс**.

Нацыяналізацыя выклікала бурную рэакцыю Францыі і Вялікабрытаніі, за якой паследавала франка-брытана-ізраільскую агрэсія супраць Егіпту. Злучаныя Штаты, зацікаўленыя найперш ва ўмацаванні ўласных пазіцый у рэгіёне адмовіліся падтрымаць гэтую авантурную акцыю сваіх саюзнікаў. Затое кіраўніцтва Савецкага Саюзу рашуча запатрабавала неадкладнага спынення ваенных дзеянняў, пагражаючы ў адваротным выпадку накіраваць у Егіпет сваіх добраахвотнікаў і не выключаючы магчымасці выкарыстання ракетна-ядзернай зброі. Папярэджанні зрабілі сваю справу: брытанскія і французскія войскі пакінулі зону каналу у снежні 1956 г., а ў сакавіку 1957 г. скончыўся вывад з егіпецкай тэрыторыі ізраільскіх войск. Суэцкі крызіс сур’ёзна падарваў пазіцыі старых каланіяльных дзяржаў – Вялікабрытаніі і Францыі – і стымуляваў новыя поспехі вызваленчага руху. Таксама крызіс паспрыяў далейшай актывізацыі амерыканскай дыпламатыі ў арабскім свеце.

### Асноўныя тэндэнцыі ў міжнароднай палітыцы ў канцы 1950-х – напачатку 1970-х гг. Ядзерна-стратэгічны парытэт. Узрастанне ролі краін «трэцяга свету». Рух недалучэння. Рэгіянальныя канфлікты. Карыбскі крызіс. Вайна ў В’етнаме. Дагавор пра забарону выпрабаванняў у трох асяроддзях (1963 г.). Дагавор пра нераспаўсюджанне ядзернай зброі (1968 г.). Першыя тэндэнцыі глабальнай разрадкі

Напрыканцы 1950-х – 1960-я гг. на міжнароднай арэне працягвалася супрацьстаянне дзвюх ядзерных звышдзяржаў – ЗША і СССР і ваенна палітычных блокаў, якія яны ўзначальвалі – НАТО і АВД. Свет заставаўся біпалярным (двухполюсным), захоўваўся стан «халоднай вайны». Абодва бакі спаборнічалі ў гонцы ўзбраенняў, перш за ўсё ракетна-ядзернай зброі, змагаліся за сферы ўплыву ў розных частках Зямнога шару. Пастаянна ўзнікалі канфліктныя сітуацыі, лакальныя войны, якія спараджалі пагрозу прамога ўзброенага сутыкнення дзвюх ядзерных звышдзяржаў.

Пагроза ўзаемнага знішчэння і агульнапланетарнай катастрофы стала відавочнай напрыканцы 1950-х гг. Ядзерная вайна не мела б пераможцаў і была бессэнсоўная, нават нягледзячы на значную перавагу ЗША над СССР. Такая катастрафічная раўнавага стала перашкодай для развязвання сусветнай вайны. Гэта з'явілася базай адноснай стабільнасці біпалярнага свету.

Яшчэ адным фактарам стабільнасці з'яўлялася негалосная ўзаемная згода не парушаць лінію размежавання ў Еўропе і ўстрымлівацца ад прамога ўмяшання ў падзеі ў краінах і рэгіёнах, што знаходзіліся па той бок ад гэтай лініі. Барацьба за пашырэнне і пераразмеркаванне сфер уплыву перамясцілася на былую каланіяльную перыферыю – у развіццёвыя краіны Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі. Рост уплыву Савецкага Саюзу ў гэтай зоне выклікаў занепакоенасць і супрацьдзеянне ЗША ды іх саюзнікаў. Але і тут справа абмежавалася лакальнымі канфліктамі і абодва бакі пазбегнулі прамога ўзброенага сутыкнення адзін з адным.

Стабільнасць біпалярнага свету тым не менш заставалася вельмі крохкай. Часам мір аказваўся на мяжы ядзернага сутыкнення, як гэта мела месца падчас Карыбскага крызісу 1962 г. Да 1970-х гг. Савецкі Саюз дасягнуў прыкладнага ваенна-стратэгічнага парытэту з ЗША. Да гэтага часу з абодвух бакоў быў назапашаны гіганцкі ракетна-ядзерны патэнцыял. На мяжы 1960 – 1970-х гг. у міжнародным жыцці намеціўся пераход ад канфрантацыі да разрадкі. Гэты пераход праявіўся ў актывізацыі перагавораў паміж дзяржавамі і дасягненні ўзаемапрымальных пагадненняў, найперш па пытаннях бяспекі і супрацоўніцтва ў Еўропе і раззбраенні.

Напрыканцы 1950-х – першай палове 1970-х гг. у асноўным скончылася ліквідацыя каланіяльнай сістэмы. Толькі ў 1960 г., вядомым як «год Афрыкі», на гэтым кантыненце ўзнікла 17 новых дзяржаў. У снежні 1960 г. Генеральная Асамблея ААН прыняла рэзалюцыю аб дэкаланізацыі, якая вітала неабарачальныя змены і патрабавала неадкладнага прадстаўлення незалежнасці ўсім астатнім калоніям. Усяго за другую палову 1950-х – 1960-я гг. у Афрыцы з'явілася 37 новых дзяржаў. Партугальскія ўладанні (Ангола, Мазамбік, Гвінея-Бісаў, астравы Зялёнага Мысу, астравы Сан-Тамэ і Прынсіпі), у якіх у 1960-я гг. разгарнулася ўзброеная барацьба за незалежнасць, здабылі суверэнітэт некалькі пазней, у 1975 г. Ва ўсім свеце за перыяд з 1956 па 1973 гг. на месцы былых калоній з'явілася 57 новых дзяржаў.

Заваёва палітычнай незалежнасці былымі калоніямі і залежнымі тэрыторыямі з'явілася важнай перамогай нацыянальна-вызваленчага руху. Аднак многія яго задачы засталіся невырашанымі. Дадаліся новыя складаныя праблемы. Адмовіўшыся ад адкрытых форм каланіяльнага панавання, развітыя капіталістычныя дзяржавы здолелі захаваць краіны Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі ў арбіце свайго ўплыву, выкарыстоўваючы іх эканамічную залежнасць і нераўнапраўнае становішча ў сусветнай капіталістычнай гаспадарцы.

Новыя незалежныя краіны адрозніваліся па ўзроўні і тэмпах сацыяльна-эканамічнага развіцця, расстаноўцы грамадска-палітычных сіл. Дыферэнцыяцыя ў іх асяроддзі толькі ўзмацнялася. Шэраг краін – Індыя, Турцыя, Пакістан, Паўднёвая Карэя і некаторыя іншыя – дасягнулі прыкметнага прагрэсу ў капіталістычным развіцці. У многіх дзяржавах па ранейшаму пераважалі патрыярхальныя і дакапіталістычныя адносіны і практычна адсутнічалі прамысловасць і класы буржуазнага грамадства (краіны Трапічнай Афрыкі, Непал, Афганістан ды інш.). Напрыканцы 1950-х – напачатку 1960-х гг. з'явілася група дзяржаў «сацыялістычнай арыентацыі» – Алжыр, Егіпет, Лівія, Самалі, Сірыя і г. д.

Ліквідацыя каланіяльнай сістэмы і ўзрастальна адчувальнае ўварванне ў сферу сусветнай палітыкі дзясяткаў маладых дзяржаў з'явіліся знамянальнымі фактарамі міжнароднага жыцця канца 1950-х – першай паловы 1970-х гг. Развіццёвыя краіны Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі сталі атаясамліваць сябе з паняццем **«трэці свет»**, маючы на ўвазе агульныя рысы і задачы развіцця, якія адрознівалі іх і ад «першага свету» – высокаразвітых капіталістычных краін, і «другога свету» – сацыялістычных дзяржаў. Яны прэтэндавалі на сваё месца ў міжнароднай супольнасці. Пры ўсёй стракатасці і неаднароднасці гэтую шматлікую групу краін аб'ядноўвалі агульная зацікаўленасць у супрацьдзеянні імперыялізму і расізму, імкненне да ліквідацыі нераўнапраўных эканамічных адносін з высокаразвітымі капіталістычнымі дзяржавамі, патрэба ў знешнепалітычным супрацоўніцтве з мэтай узмацнення сваіх пазіцый у міжнародным жыцці.

На гэтай базе большасць развіццёвых краін аб'ядналася ў **Рух недалучанасці**. Зараджэнне і выпрацоўка яго прынцыпаў былі звязаныя з дзейнасцю гэткіх выбітных дзяржаўных дзеячаў, як прэм'ер-міністр Індыі Джавахарлал Нэру, прэзідэнт Егіпту Гамаль Абдэль Насэр і прэзідэнт Югаславіі Ёсіп Броз Ціта. Па іх ініцыятыве ў верасні 1961 г. у Бялградзе адбылася I канферэнцыя кіраўнікоў дзяржаў і ўрадаў 25 недалучаных краін. Рух недалучанасці не меў афіцыйнай праграмы і строгай арганізацыйнай структуры. Галоўнымі прынцыпамі Руху былі абвешчаныя недалучэнне да ваенных блокаў, у якіх удзельнічалі вялікія дзяржавы (адсюль і назва Руху), падтрымка барацьбы за нацыянальную незалежнасць, знешняя палітыка ў духу мірнага суіснавання ўсіх дзяржаў.

На працягу ўсяго перыяду канца 1950-х – першай паловы 1970-х гг. у вялікай зоне свету, што ўключала тэрыторыі краін Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі, успыхвалі рэгіянальныя канфлікты і войны. З гэтымі канфліктамі ў той ці іншай ступені аказаліся звязаныя інтарэсы глабальнага змагання абодвух блокаў, барацьба вядучых дзяржаў свету за пашырэнне зоны свайго ўплыву. Падобныя канфлікты хавалі ў сабе небяспеку іх разрастання ў буйнамаштабныя войны з уцягненнем у іх сусветных дзяржаў.

Самым вострым і небяспечным крызісам аказаўся **Карыбскі крызіс** 1962 г., звязаны з размяшчэннем на «Востраве свабоды» савецкай ракетна-ядзернай

зброі (гл. раздзел «ЗША ў 1945 – пачатку 1990-х гг.») Пасля некалькіх трывожных дзён і начэй 28 кастрычніка 1962 г. была дасягнута дамоўленасць паміж Дж. Ф. Кенэдзі і М. С. Хрушчовым. Савецкі Саюз пагадзіўся вывезці ракеты з Кубы, а ЗША зняць «блакаду» і даць абавязацельства паважаць недатыкальнасць межаў Кубы. Акрамя таго, Злучаныя Штаты адмовіліся ад размяшчэння сваіх ракет у Турцыі ля межаў СССР. Мірнае вырашэнне Карыбскага крызісу з улікам узаемных інтарэсаў зняло аграмадную небяспеку і стварыла важны прэцэдэнт у пошуках шляхоў да разрадкі міжнароднай напружанасці.

У 1960-я гг. абвастрылася абстаноўка ў Індакітаі. Пасля паражэння Францыі і заключэння Жэнеўскіх пагадненняў ЗША імкнулася не дапусціць перамогі вызваленчага руху ў Паўднёвым В'етнаме і аб'яднання яго з ДРВ. Паўднёвы В'етнам быў абвешчаны Рэспублікай В'етнам (РВ) са сталіцай у Сайгоне. Прадугледжаныя Жэнеўскімі пагадненнямі ўсеагульныя выбары і аб'яднанне В'етнаму не адбылося.

У ПВ разгарнулася барацьба пракамуністычных сіл супраць сайгонскага рэжыму. Яны атрымлівалі падмацаванні з ДРВ. Напачатку 1960-х гг. ЗША ўзмацнілі дапамогу Паўднёваму В'етнаму, а з 1965 г. перайшлі да актыўнага ваеннага ўмяшання ва ўнутрыв'етнамскі канфлікт, у тым ліку пачалі сістэматычныя масіраваныя бамбардзіроўкі тэрыторыі ДРВ. Злучаныя Штаты імкнуліся ўцягнуць у **В'етнамскую вайну (1965 – 1973)** сваіх саюзнікаў, яны здолелі дамагчыся адпраўкі ва В'етнам толькі невялікіх вайсковых падраздзяленняў Тайланда, Паўднёвай Карэі, Аўстраліі, Новай Зеландыі і на кароткі час Філіпін і ФРГ. Вялікабрытанія і Японія выказалі салідарнасць з ЗША, але не ўзялі непасрэднага ўдзелу ў вайне. Францыя, хаця і не адразу, асудзіла агрэсію, як і нейтральныя дзяржавы Еўропы, напрыклад, Швецыя. У ходзе вайны значную падтрымку ДРВ тэхнікай, ваеннымі спецыялістамі, рыштункам і рознымі відамі забеспячэння аказвалі СССР і КНР.

В'етнамскі народ на поўначы і на поўдні аказаў дастойнае супраціўленне. Карныя экспедыцыі са спаленнем паселішчаў і знішчэннем іх жыхароў, выкарыстанне ядахімікатаў (яны знішчалі расліннасць, дзе хаваліся в'етнамскія паўстанцы) і напалму (загушчаны бензін для падпальвання расліннасці, жывой сілы і тэхнікі праціўніка) выклікалі рашучы пратэст не толькі ў свеце, але і ў саміх Злучаных Штатах.

Вясной 1968 г. прэзідэнт Л. Джонсан заявіў пра згоду ЗША на перагаворы з ДРВ. Яны пачаліся ў студзеня 1969 г. Нягледзячы на няпросты характар гэтых перагавораў і працяг узброенай барацьбы (у тым ліку аднаўленне амерыканскіх бамбардзіровак ДРВ) 27 студзеня 1973 г. ў Парыжы было нарэшце падпісана пагадненне пра спыненне баявых дзеянняў у В'етнаме і вывад войск ЗША з яго тэрыторыі. Прадугледжвалася мірнае ўз'яднанне В'етнаму на базе ўсеагульных выбараў. Парыжскае пагадненне азначала паражэнне ЗША ў вайне. За 9 гадоў

вайны амерыканцы выдаткавалі $141 млрд., страцілі больш за 56 тыс. забітымі і 300 тыс. параненымі салдат і афіцэраў.

З 1958 г. паміж буйнейшымі ядзернымі дзяржавамі – СССР, ЗША і Вялікабрытаніяй – вяліся перагаворы пра забарону ядзерных выпрабаванняў. 5 жніўня 1963 г. быў падпісаны **Маскоўскі дагавор** трох дзяржаў пра забарону выпрабаванняў ядзернай зброі ў трох сферах: у атмасферы, космасе і пад вадой. Падземныя выпрабаванні пакуль не забараняліся, але бакі дамаўляліся ў далейшым працягваць перагаворы з мэтай іх забароны. Францыя і Кітай не далучыліся да дагавору і некаторы час яшчэ працягвалі ядзерныя выпрабаванні ў атмасферы.

Маскоўскі дагавор 1963 г. стаў першым буйным міжнародным пагадненнем па абмежаванні гонкі ўзбраенняў. Ён значна зменшыў небяспечнае для жыцця ўздзеянне ядзерных выпрабаванняў на атмасферу.

У 1965 г. пачалося абмеркаванне праекту **дагавора пра нераспаўсюджванне ядзернай зброі**. Падрыхтаваны дагавор забараняў вытворчасць і набыццё ядзернай зброі неядзернымі краінамі, перадачу ім гэтай зброі, яго кампанентаў і адпаведнай тэхналогіі. Дагавор быў ухвалены Генеральнай Асамблеяй ААН і з 1 ліпеня 1968 г. адкрыты для падпісання. Да яго далучылася каля 100 дзяржаў і ў 1970 г. было абвешчана, што ён набыў моц.

### Падрыхтоўка і вынікі НБСЕ. Узрастанне ролі глабальных праблем у міжнародных адносінах. Савецка-амерыканскі ядзерны дыялог. Дагаворы АСУ-1 і ПРА. Нарады і пагадненні па скарачэнні звычайных узбраенняў. Прагрэс у ліквідаванні неядзернай зброі масавага паражэння. Абвастрэнне канфрантацыі ў канцы 1970-х – першай палове 1980-х гг. Перабудова ў СССР як фактар пачатку дэмантажу «халоднай вайны»

У сакавіку 1969 г. краіны Варшаўскага дагавору прапанавалі прыступіць да практычнай падрыхтоўкі агульнаеўрапейскай нарады з удзелам усіх дзяржаў кантыненту, а таксама ЗША і Канады. Урад Фінляндыі прапанаваў арганізаваць нараду ў Хельсінкі. За ўдзел у калектыўных дзеяннях па забеспячэнні міру і бяспекі ў Еўропе выказаўся і новы ўрад ФРГ на чале з В. Брантам, які прыйшоў да ўлады ў 1969 г. У 1970 – 1973 гг. была падпісана серыя дагавораў паміж ФРГ, з аднаго боку, і СССР, Польшчай, Чэхаславакіяй і ГДР – з другога. Гэтымі дагаворамі была прызнаная непарушнасць пасляваенных межаў у Еўропе і суверэнітэт ГДР. У верасні 1971 г. было заключана чатырохбаковае пагадненне СССР, ЗША, Вялікабрытаніі і Францыі па Заходнім Берліне. Яно пацвердзіла, што Заходні Берлін не з’яўляецца часткай ФРГ, мае ўласнае самакіраванне і не можа кіравацца ўладамі ФРГ. Пры пільнаванні гэтых норм Заходні Берлін мае права развіваць сувязі і супрацоўніцтва з ФРГ.

Візіт Р. Ніксана ў СССР у траўні 1972 г. – першы візіт амерыканскага прэзідэнта ў Маскву, а потым візіт у адказ савецкага кіраўніка Л. І. Брэжнева ў ЗША ў чэрвені 1972 г. прывялі да прыкметнага паляпшэння савецка-амерыканскіх адносін і шэрагу дамоўленасцяў паміж краінамі.

Усе гэтыя падзеі стварылі спрыяльныя ўмовы для агульнаеўрапейскага дыялогу. У лістападзе 1972 г. у Хельсінкі пачаліся папярэднія шматбаковыя кансультацыі, у ходзе якіх былі ўзгоднены парадак дня і парадак работы **Нарады па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе (НБСЕ)**. Прапаноўвалася правесці Нараду ў тры этапы. Рашэнні павінны былі прымацца на базе кансенсусу (адзінагалосна). Першы этап Нарады адбыўся ў ліпені 1973 г. у Хельсінкі на ўзроўні міністраў замежных спраў 33 еўрапейскіх дзяржаў, а таксама ЗША і Канады. На ім дзяржавы вызначылі свае пазіцыі па сутнасці. З верасня 1973 г. па ліпень 1975 г. у Жэневе адбыўся другі этап Нарады, у працэсе якога дэлегацыі сумесна абмяркоўвалі тэкст будучага выніковага дакументу, які павінны былі падпісаць на заключным 3-ім этапе кіраўнікамі дзяржаў і ўрадаў.

Работа на нарадзе вялася у трох камісіях: па пытаннях бяспекі, эканамічных, гуманітарных. Працягласць другога этапу тлумачылася складанасцю выпрацоўкі агульнай пазіцыі па ўсіх пытаннях 35 удзельнікамі Нарады. У канчатковым выніку гэта ўдалося і адкрыла шлях да паспяховага заканчэння агульнаеўрапейскага «хельсінскага» працэсу.

Яго кульмінацыяй стала падпісанне ў Хельсінкі 1 жніўня 1975 г. кіраўнікамі 33 еўрапейскіх дзяржаў, ЗША і Канады дакументу вялікай гістарычнай значнасці – **Заключнага акту**. У ім змяшчалася міжнародна-прававое прызнанне палітычных і тэрытарыяльных змен у Еўропе, што адбыліся ў выніку Другой сусветнай вайны і пасляваеннага развіцця. Заключны акт абвясціў 10 прынцыпаў узаемаадносін дзяржаў, якія ўяўлялі сабой звод міжнародна-прававых норм, дапаўняючых у шэрагу пунктаў Статут ААН. Да іх ліку адносілася: суверэнная роўнасць, павага правоў, уласцівых суверэнітэту; невыкарыстанне сілы альбо пагрозы сілай; непарушнасць межаў; павага тэрытарыяльнай цэласці дзяржаў; мірнае ўрэгуляванне спрэчак; неўмяшанне ва ўнутраныя справы; павага правоў чалавека і асноўных свабод, у тым ліку свабоду думкі, сумлення, рэлігіі і перакананняў; раўнапраўе і права народаў распараджацца сваім лёсам; супрацоўніцтва паміж дзяржавамі; добрасумленнае пільнаванне абавязацельстваў па міжнародным праве.

У дадатак да гэтых палажэнняў быў прыняты Выніковы дакумент па захадах умацавання даверу і некаторых аспектах бяспекі і раззбраення. У ім прадугледжваліся папярэднія апавяшчэнні пра буйныя ваенныя манеўры, абмен назіральнікамі на ваенных вучэннях, візіты ваенных дэлегацый.

Палітыка разрадкі цалкам адпавядала духу эпохі. У 1970-я гг. былі адзначаныя ўзрастальным значэннем глабальных праблем у міжнародных адносінах.

Да іх ліку адносіліся сыравінная ды энергетычная праблема, барацьба з голадам і хваробамі, даследаванне космасу, сусветнага акіяну ды яго рэсурсаў, пераадоленне эканамічнай і навукова-тэхнічнай адсталасці развіццёвых краін, экалагічныя праблемы ды інш. Для вырашэння гэтых праблем патрабаваліся агульныя намаганні і адзінства чалавецтва, а не балансаванне на мяжы ядзернай вайны.

Тэндэнцыя да разрадкі міжнародных адносін напачатку 1970-х гг. прывялі да новых, якасна важных зрухаў у абмежаванні гонкі ядзерных узбраенняў. У траўні 1972 г. у Маскве Р. Ніксан і Л. І. Брэжнеў падпісалі першае **Часовае пагадненне пра некаторыя захады ў галіне абмежавання стратэгічных узбраенняў (АСУ-1)**, згодна якому абодва бакі абавязваліся на працягу бліжэйшых 5 гадоў не павялічваць наяўную колькасць пускавых установак міжкантынентальных балістычных ракет (МБР) наземнага базіравання. Акрамя таго, былі ўсталяваны межы колькасці пускавых установак на падводных лодках і колькасці саміх падводных лодак.

У той жа дзень быў падпісаны **Дагавор пра абмежаванне сістэм процiракетнай абароны (ПРА)**. Кожны бок абавязваўся мець не болей дзвюх сістэм ПРА (вакол сталіцы і ў раёне засяроджання пускавых установак МБР). Пазней, у ліпені 1974 г. па дадатковаму пратаколу да гэтага Дагавору, дазвалялася мець толькі адну такую сістэму ПРА (альбо вакол сталіцы, альбо ў раёне пускавых установак МБР).

Гэтыя пагадненні мелі прынцыповае значэнне ў справе стрымлівання гонкі ракетна-ядзерных ўзбраенняў. Упершыню была прызнаная непатрэбнасць нарошчвання ядзернага патэнцыялу. Роўная ўзаемная неабароненасць пры наяўнасці існуючай ПРА пры захаванні магчымасці ўдару ў адказ станавіліся свайго роду гарантыяй ад спакусы той ці іншай звышдзяржавы выкарыстаць ядзерную наступальную зброю, спадзеючыся на ўласную недатыкальнасць.

Тады ж у траўні 1972 г. амерыканскі і савецкі лідары падпісалі дакумент **«Асновы ўзаемаадносін паміж СССР і ЗША»**. У ім бакі абавязваліся зрабіць усё магчымае для прадухілення ядзернай вайны і ваенных канфліктаў. У чэрвені 1973 г. у Вашынгтоне падчас візіту Л. І. Брэжнева ў ЗША было падпісанае **Пагадненне паміж ЗША і СССР пра прадухіленне ядзернай вайны**. Была дасягнута дамоўленасць распрацаваць далейшыя захады па абмежаванні стратэгічных узбраенняў.

У Вашынгтоне было дамоўлена адносна ўдзелу ў перагаворах пра скарачэнне ўзброеных сіл і ўзбраенняў у Цэнтральнай Еўропе (г. зн. у зоне непасрэднага ваеннага супрацьстаяння НАТО і АВД). Гэтыя перагаворы пачаліся ў Вене ў кастрычніку 1973 г. з удзелам дэлегацый ЗША, Вялікабрытаніі, Канады, ФРГ, СССР, ГДР, Польшчы і шэрагу іншых краін. Яны выявілі і агульнае імкненне ўмацаваць сістэму бяспекі ў Еўропе, і, адначасова, глыбокі ўзаемны недавер. Удзельнікам перагавораў не ўдалося ўзгадніць агульны прынцып узбраення –

заходнія краіны прапаноўвалі выраўніваць узровень узбраенняў па кожнаму асобнаму віду, а дзяржавы АВД адстойвалі на агульным скарачэнні ўзбраенняў на пэўны адсотак (гэта б дазволіла захаваць перавагу сацыялістычнага блоку па звычайных наступальных узбраеннях).

На сустрэчы Л. І. Брэжнева з новым прэзідэнтам ЗША Дж. Фордам, якая адбылася ў лістападзе 1974 г., была дасягнута важная дамоўленасць пра пачатак распрацоўкі новага дагавору пра абмежаванне стратэгічных наступальных узбраенняў (**АСУ-2**). Нягледзячы на значныя цяжкасці, гэтае пагадненне было падпісанае ў 1979 г. ў Жэневе. Яно абмежавала для абодвух бакоў колькасць ядзерных боегаловак і сродкаў іх дастаўкі.

Аднак супрацьлеглыя тэндэнцыі не зніклі. Звышдзяржавам па-ранейшаму бракавала ўзаемнага даверу. Іх вузкакарыслівыя бягучыя інтарэсы працягвалі дамінаваць над доўгачасовымі прыярытэтамі развіцця чалавецтва ў цэлым. Акрамя таго, адыход ад канфрантацыі не суправаджаўся належным развіццём гандлёва-эканамічных, навукова-тэхнічных і культурных сувязяў. Шматлікія факты парушэння правоў чалавека ў Савецкім Саюзе абумовілі негатыўную пазіцыю ЗША ў пытанні пра прадастаўленне яму рэжыму найбольшага спрыяння ў гандлі.

Старт вяртанню да канфрантацыі ў міжнародных адносінах на рубяжы 1970-х – 1980-х гг. быў дадзены ўводам савецкіх войск у Афганістан у снежні 1979 г. Рэакцыя Захаду на афганскую вайну была жорсткай і дэманстратыўнай. Алімпійскія гульні ў Маскве 1980 г. былі байкатаваныя ЗША ды іх саюзнікамі. Амерыканскі Сенат адмовіўся ратыфікаваць дагавор АСУ-2, а размяшчэнне навейшых ядзерных узбраенняў НАТО ў Заходняй Еўропе стала непазбежным.

З прыходам на пост прэзідэнта ЗША Р. Рэйгана пачаўся апошні і надзвычай напружаны перыяд «халоднай вайны». Была распрацавана новая ваенная дактрына, арыентаваная на дасягненне канчатковай перамогі ў «халоднай вайне». Меркавалася, што амерыканская знешнепалітычная стратэгія павінна будавацца з пазіцыі сілы і з выкарыстаннем усіх магчымых спосабаў ціску на праціўніка: жорсткіх дыпламатычных дэмаршаў накшталт байкоту маскоўскай Алімпіяды, «кіраваных канфліктаў» і г. д. Вялікае значэнне надавалася ўмацаванню ваеннай магутнасці і ваенна-прамысловага комплексу. Пры адмове ад амерыканскага варыянту раззбраення, СССР павінен быў уцягнуцца ў гэткую гонку ўзбраення, якую б ніколі не здолеў выйграць.

Новая амерыканская адміністрацыя прыняла буйнамаштабную праграму гонкі ўзбраенняў, якая ўключала вытворчасць нейтроннай зброі, новых балістычных ракет і крылатых ракет на падводных лодках, распрацоўку самалёта-невідзімкі «Стэлс» і бамбавіка Б-1, а таксама падводных лодак з сістэмай «Трайдэнт». Летам 1982 г. паследавала адмова ЗША ад удзелу ў перагаворах па

пытаннях забароны ядзерных выпрабаванняў. Тады ж Злучаныя Штаты выйшлі з дагавору 1974 г. пра абмежаванне падземных выпрабаванняў ядзернай зброі. У 1981 – 1982 гг. імі былі ўведзены новыя абмежаванні на гандаль з СССР. Нарэшце, у 1983 г. Злучаныя Штаты прынялі рашэнне пра пачатак распрацоўкі новага віду ўзбраенняў з элементамі касмічнага базіравання, якое атрымала назву **«стратэгічнай абарончай ініцыятывы» (САІ).**

У 1983 г. урады Вялікабрытаніі, ФРГ ды Італіі далі згоду на размяшчэнне на сваё тэрыторыі амерыканскіх ракет. Гэткім чынам, у рэчышча новай ваеннай стратэгіі і палітыкі ЗША ўцягвалася і Заходняя Еўропа. Аднак тут усё ж не адбылося поўнага разрыву са спадчынай перыяду разрадкі. Захавалася структура і механізм Хельсінскага працэсу. Краіны Заходняй Еўропы не пайшлі за ЗША ў галіне гандлёва-эканамічных санкцый.

Паварот да ўзаемапаразумення ў савецка-амерыканскіх адносінах стаў магчымы ў выніку **перабудовы ў СССР**, якая пачалася ў 1985 г. Новае савецкае палітычнае кіраўніцтва высунула ў якасці асноватворнай лініі сваёй дзейнасці прынцыпы новага палітычнага мыслення. У сферы міжнародных адносін гэта азначала адмаўленне ад ідэі класавага супрацьборства дзвюх сістэм, разуменне прыярытэту агульначалавечых каштоўнасцяў, акцэнт на палітычныя, а не ваенныя метады гарантавання нацыянальнай бяспекі. Перамены ў СССР далі новы імпульс развіццю савецка-амерыканскага дыялогу, у тым ліку і на вышэйшым узроўні. Пачынаючы з 1985 г., генеральны сакратар ЦК КПСС М. С. Гарбачоў і прэзідэнт ЗША Р. Рэйган сустракаліся штогод.

Савецкі Саюз высунуў цэласны пакет узаемазвязаных прапаноў, якія ахоплівалі стратэгічныя ядзерныя ўзбраенні, ракеты сярэдняга радыусу дзеяння, сістэмы проціракетнай абароны і праграму «зорных войнаў» (САІ). На сустрэчы ў Рэйк'явіку ў кастрычніку 1986 г. бакі наблізіліся да пагаднення, але яно не было падпісанае з прычыны адмовы ЗША спыніць распрацоўку праграмы САІ. Стала ясна, што пытанне пра скарачэнне ядзерных узбраенняў трэба вырашаць не разам, а па асобных відах. У 1987 г. на вашынгтонскай сустрэчы на вышэйшым узроўні быў падпісаны **Дагавор аб ліквідацыі ракет меншай і сярэдняй дальнасці (РСМД)**. Гаворка ішла толькі пра 4 % ядзернага патэнцыялу «звышдзяржаў», але гэта былі ўзбраенні, што ўяўлялі аграмадную небяспеку для СССР і еўрапейскіх саюзнікаў ЗША. Гістарычнасць гэтага пагаднення палягала ў тым, што размова ў ім ішла не проста пра абмежаванне гонкі ўзбраенняў, а пра скарачэнне ядзерных узбраенняў ды іх знішчэнне.

Змена адміністрацыі ў Вашынгтоне ў выніку выбараў 1988 г. не змяніла агульнай скіраванасці развіцця савецка-амерыканскіх адносін. Падчас мальтыйскага саміту 1989 г. Дж. Буш і М. С. Гарбачоў дамовіліся пра распрацоўку савецка-амерыканскага дагавору пра 50-адсоткавае скарачэнне стратэгічных наступальных узбраенняў, шматбаковага пагаднення пра скарачэнне звычайных

узбраенняў у Еўропе, двухбаковага пагаднення пра радыкальнае скарачэнне арсеналаў хімічнай зброі і г. д. У ліпені 1991 г. у Маскве адбылося падпісанне дагавору пра скарачэнне прыкладна на адну трэць стратэгічных наступальных узбраенняў абедзвюх краін.

Новы клімат у міжнародных адносінах аказаў уплыў і на агульнаеўрапейскі працэс. У сакавіку 1989 г. у Вене пачаліся перагаворы 23 дзяржаў-удзельнікаў НАТО і АВД па звычайных узбраеннях на еўрапейскай тэрыторыі ад Атлантыкі да Уралу. Там быў распрацаваны Дагавор пра абмежаванне ўзброеных сіл у Еўропе, падпісаны ў Парыжы ў лістападзе 1990 г. Упершыню за 15 гадоў пасля Хельсінкі ў французскую сталіцы з'ехаліся кіраўнікі дзяржаў і ўрадаў 32 еўрапейскіх дзяржаў, ЗША і Канады. Гэтая падзея адчыніла новую старонку ў агульнаеўрапейскім працэсе. Выніковы дакумент пацвердзіў адданасць дзяржаў-удзельніц Нарады 10-ці прынцыпам Хельсінскага Заключнага акту.

### Міжнародныя адносіны ў 1990-я – 2000-я гг. Аб'яднанне Германіі. Распад СССР і «сацыялістычнай садружнасці». Заканчэнне «халоднай вайны». Новая геапалітычная сітуацыя. Прасоўванне НАТО на Усход. Рэгіянальныя канфлікты. Праблема міжнароднага тэрарызму ды ісламскага фундаменталізму. Будучае сусветнай палітыкі ў XXI ст.

На мяжы 1980-х – 1990-х гг. у міжнародных адносінах адбыліся глыбокія змены. Дэмакратычныя рэвалюцыі ў краінах Цэнтральнай і Паўднёва-ўсходняй Еўропы, аб'яднанне Германіі – усё гэта прадвызначыла новую расстаноўку палітычных сіл, новую палітычную атмасферу ў Еўропе.

Аграмадныя знешнепалітычныя наступствы мела **аб'яднанне Германіі**, якая стала буйнейшай дзяржавай на еўрапейскім кантыненце. Аб'яднанне адбывалася ў адпаведнасці з шэрагам дакументаў, падпісаных як паміж дзвюма германскімі дзяржавамі, гэтак і паміж імі з аднаго боку, і чатырма дзяржавамі-пераможцамі – з іншага. (гл. раздзел «ФРГ у 1990 – 2000-х гг.»). У іх, апрача іншага, абвяшчалася непарушнасць еўрапейскіх межаў, што склаліся ў яе выніку, забарона на валоданне Германіяй сродкамі масавага знішчэння, вызначалася колькасць бундэсверу, фармулявалася рашэнне пра часовае захаванне ва ўсходняй частцы Германіі ўзброеных сіл СССР (да 1994 г.). Гэткім чынам, аб'яднанне Германіі стала буйной міжнароднай падзеяй, якая падвяла рысу пад вынікамі Другой сусветнай вайны, адкрыла новы перыяд у пасляваеннай гісторыі Германіі і Еўропы.

Распад АВД і СЭУ адкрыў магчымасць для пераадолення расколу Еўропы і набыцця ёю іншага палітычнага аблічча. Пачалася перабудова стасункаў краін Цэнтральнай і Паўднёва-ўсходняй Еўропы з Савецкім Саюзам, краінамі Захаду, іншымі дзяржавамі. Развал сусветнай сістэмы сацыялізму азначаў спыненне ідэйна-палітычнай і ваеннай канфрантацыі паміж

Усходам і Захадам. «Халодная вайна» засталася ў мінулым. Пачалося фарміраванне новага сусветнага парадку.

Змянілася палітычная карта свету. У Еўропе з'явілася паўтары дзясяткі новых незалежных дзяржаў, што ўтварыліся ў выніку распаду СССР, Югаславіі і Чэхаславакіі. Адбыўся передзел сфер геапалітычнага ўплыву. Расія страціла кантроль над краінамі Цэнтральнай і Паўднёва-ўсходняй Еўропы, якім раней валодаў СССР. Яе войскі пакінулі тэрыторыі гэтых краін. Расія захавала ракетна-ядзерную зброю, але абаронная магутнасць ды эканамічны патэнцыял аслаблі. Яна страціла становішча «звышдзяржавы».

Адзінай «звышдзяржавай» засталіся Злучаныя Штаты. Яны замацавалі свой статус лідара заходняга свету. ЗША актыўна карысталіся ўсімі перавагамі свайго высокага статусу. Дэкларуючы адданасць калектыўным намаганням пры вырашэнні міжнародных канфліктаў, яны жорстка дыктавалі свае ўмовы, дамагаючыся прыняцця выгодных для сябе рашэнняў, заяўляючы пра свае нацыянальныя інтарэсы ў розных кутках планеты.

Фарміраванне новага сусветнага парадку суправаджалася зменамі ў адносінах паміж заходнімі дзяржавамі. У гады «халоднай вайны» іх базавым прынцыпам была неабходнасць супрацьстаяння «савецкай пагрозе». Пасля развалу сусветнай сістэмы сацыялізму гэтая небяспека знікла. Перыяд змагання ваенных блокаў скончыўся. Аднак НАТО не была распушчана. Яе галоўнай задачай стала падтрыманне тых суадносінаў сіл, якія склаліся ў свеце, на карысць Захаду і забеспячэнне на гэтай базе стабільнасці на еўрапейскім ды іншых кантынентах.

Усе краіны-члены НАТО пацвердзілі сваю адданасць блоку. Яны лічылі ўмацаванне Паўночнаатлантычнага альянсу самым надзейным сродкам падтрымання бяспекі і стабільнасці. Паміж краінамі НАТО складвалася «новае партнёрства», заснаванае на шырокай агульнасці доўгатэрміновых інтарэсаў у ваенна-палітычнай сферы.

У 1990-я гг. істотна знізіўся ўзровень ваенна-палітычнай канфрантацыі. Аднак ядзерная зброя захоўвала ролю стрымліваючага фактару. Дзяржавы, якія валодалі ім падпісалі шэраг пагадненняў пра ўзаемнае ненацэльванне стратэгічных ядзерных сіл. Былі ўведзеныя маратарыі на правядзенне падземных ядзерных выпрабаванняў: Расіяй – у 1991 г., Францыяй – у 1992 г. (аднавіла ў 1995 – 1997 гг.), Кітаем – у 1996 г. Восенню 1996 г. быў адкрыты для падпісання Дагавор пра ўсеабдымную абарону ядзерных выпрабаванняў. Да гэтага часу яго падпісалі каля 180 дзяржаў і каля 140 з іх ратыфікавалі гэтае пагадненне.

У адрозненне ад краін Поўначы, якія зніжалі ўзровень сваёй узброенасці, краіны Поўдню актыўна нарошчвалі свой ваенны патэнцыял, рабілі масіраваныя закупкі зброі, стваралі ўласныя ваенна-прамысловыя комплексы. Пашыраўся «клуб» ядзерных дзяржаў. Пра наяўнасць атамных боепрыпасаў і сродкаў

іх дастаўкі адкрыта заявілі Індыя (першае выпрабаванне было праведзена яшчэ ў 1974 г.) і Пакістан. У 1998 г. яны ўзарвалі пад зямлёй па 5 атамных прыстасаванняў. Дастаткова значныя ядзерныя сілы знаходзяцца ў распараджэнні Ізраіля. Невялікі ядзерны арсенал быў у Паўднёва-Афрыканскай Рэспубліке. Аднак гэтая краіна добраахвотна адмовілася ад смертаноснай зброі, знішчыўшы пасля краху рэжыму апартэіду (сярэдзіна 1990-х гг.) ўсе шэсць сваіх ядзерных зарадаў. А ў 2006 г. да «клубу» ядзерных дзяржаў далучылася КНДР. На Захадзе існуюць падазрэнні адносна наяўнасці сваёй ядзернай праграмы ў Іране.

Заканчэнне «халоднай вайны» і развал сацыялістычнага блоку парушыў баланс, на якім была заснаваная блокавая мадэль бяспекі ў Еўропе. Галоўнай праблемай стала стварэнне новай сістэмы бяспекі. З 1 студзеня 1995 г. НБСЕ была перайменаваная ў Арганізацыю па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе (АБСЕ). Скончыўся працэс пераўтварэння Нарады ў арганізацыю, якая дзейнічала на пастаяннай аснове. Яе кіруючым органам стала Рада міністраў якая складалася з міністраў замежных спраў дзяржаў-членаў. Яны збіраліся штогод для абмеркавання праблем уладкавання новай Еўропы.

Галоўнай сярод іх заставалася роля АБСЕ ў забеспячэнні стабільнасці на кантыненце, папярэджанні і ўрэгуляванні спрэчак у рэгіёне. Аднак рэальных захадаў для выканання гэтай функцыі ў 1990-я гг. выпрацавана не было. Аўтарытэт АБСЕ аказаўся падарваны адсутнасцю эфектыўных сродкаў уздзеяння на «парушальнікаў парадку», а таксама няўдалымі сродкамі прадухілення шэрагу канфліктаў, найперш, – у Югаславіі.

Новая сістэма бяспекі стала фарміравацца не на базе раўнапраўнага супрацоўніцтва былых праціўнікаў у «халоднай вайне», а шляхам кансалідацыі і пашырэння заходніх ваенна-палітычных і эканамічных інстытутаў. ЗША і вядучыя еўрапейскія дзяржавы ўзялі курс на пашырэнне НАТО і яе пераўтварэнне ў пануючую структуру ў Еўропе. Яны паставілі мэтай зрабіць Паўночнаатлантычны альянс падмуркам новай сістэмы еўрапейскай бяспекі.

Гэткі падыход адпавядаў памкненням многіх краін Цэнтральнай і Паўднёва-ўсходняй Еўропы, Балтыі і некаторых дзяржаў Садружнасці Незалежных Дзяржаў (СНД). Пасля таго, як летам 1991 г. была распушчаная АВД, пачалася паэтапная інтэграцыя краін Цэнтральна і Паўднёва-ўсходняй Еўропы ў ваеннапалітычныя і эканамічныя структуры Захаду.

У студзені 1994 г. сесія НАТО ў Бруселі прыняла праграму «Партнёрства дзеля міру», да якой адразу далучыліся больш за 20 дзяржаў Еўропы і Азіі, у тым ліку і Беларусь. У траўні таго ж году былыя члены АВД (Польшча, Чэхія, Славакія, Венгрыя, Румынія і Балгарыя) і краіны Балтыі падпісалі ў Люксембургу пагадненне пра прадастаўленне ім статусу «асацыяваных партнёраў» Заходнееўрапейскага саюзу. Напрыканцы 1994 г. краіны Паўночнаатлантычнага альянсу прынялі прынцыповае рашэнне пра **пашырэнне НАТО на Ўсход**.

Праблема пашырэння НАТО на Ўсход выклікала занепакоенасць Расіі, якая бачыць у гэтым пагрозу стабільнасці на кантыненце і ўласнай бяспецы. Тым не менш, у ліпені 1997 г. краіны НАТО вызначылі паслядоўнасць прыёму новых членаў. Пра сваё жаданне ўступіць у гэты блок заявілі 12 дзяржаў. Першымі ў сакавіку 1999 г. былі прынятыя Венгрыя, Чэхія і Польшча. Наступнымі на чарзе аказаліся Балгарыя, Латвія, Літва, Румынія, Славакія, Славенія і Эстонія, якія далучыліся да НАТО ў сакавіку 2004 г. Апошнімі краінамі прынятымі ў блок сталі Албанія і Харватыя (2009).

У апошняе дзесяцігоддзе XX – напачатку XXI стст. павялічылася колькасць рэгіянальных канфліктаў. Гэта патрабавала актывізацыі ААН у прадухіленні і ўрэгуляванні спрэчак і войнаў. Як паказала практыка, дамагчыся гэтага атрымлівалася далёка не заўжды. Падобна да АБСЕ на еўрапейскім кантыненце, ААН таксама не здолела стаць падмуркам для забеспячэння міру і стабільнасці ў свеце.

Напачатку 1990-х гг. войскі Аб’яднаных Нацый былі ўпершыню выкарыстаныя не для размежавання ваюючых бакоў, а для падаўлення ваеннага канфлікту. У жніўні 1990 г. іракскі дыктатар Саддам Хусэйн ажыццявіў агрэсію супраць суседняга Кувейту, заяўляючы пра гістарычную прыналежнасць тэрыторыі гэтай багатай нафтай краіны Іраку. Кувейт звярнуўся па дапамогу да сусветнай супольнасці.

**Канфлікт у зоне Персідскага заліву** выклікаў заклапочанасць ў свеце. Рада Бяспекі ААН прыняла шэраг рэзалюцый, у якіх асудзіла акт грубай агрэсіі, запатрабавала вываду войск і ўсталявала гандлёва-эканамічную блакаду Ірака. У раён канфлікту былі ўведзены войскі краін НАТО і некаторых арабскіх дзяржаў. Паколькі гэтыя захады не далі вынікаў, Рада Бяспекі прыняла рашэнне пра выкарыстанне ўзброенай сілы для выцяснення захопнікаў з акупіраванай тэрыторыі. Упершыню за час існавання ААН Савецкі Саюз і Злучаныя Штаты аказаліся салідарныя ў ацэнцы рэгіянальнага канфлікту і ў вызначэнні захадаў па яго вырашэнні. У студзені 1991 г. пачалася аперацыя «Бура ў пустыні». Ажыццяўлялася яна ў асноўным падраздзяленнямі ЗША. Іракская армія была разгромленая, а Кувейт вызвалены. Аднак ачаг напружанасці ў рэгіёне захаваўся. С. Хусэйн і далей адмаўляўся ад супрацоўніцтва са структурамі ААН ды іншымі міжнароднымі арганізацыямі, правакуючы новыя абвастрэнні адносінаў з Захадам. У выніку ў 1998 г. ваенна-паветраныя сілы ЗША і Вялікабрытаніі ажыццявілі бамбардзіроўкі фартыфікацыйныя збудаванні і прэзідэнцкія палацы ў Іраку.

Непасрэдны ўплыў на фарміраванне новага сусветнага парадку ў 1990-я гг. аказала вайна на Балканах. Гэта быў самы буйны канфлікт у Еўропе пасля Другой сусветнай вайны. У яго аснове ляжаў цэлы комплекс супярэчнасцяў этнічнага, рэлігійнага, тэрытарыяльнага і палітычнага характару. На іх накладваліся інтарэсы буйных дзяржаў і гістарычна абумоўленыя сімпатыі тым ці ін-

шым народам югаслаўскай федэрацыі. На мяжы 1980-х – 1990-х гг. усе гэтыя супярэчнасці рэзка абвастрыліся. Рэспублікі былой Сацыялістычнай Федэратыўнай Рэспублікі Югаславія абвясцілі сваю незалежнасць і адзіная дзяржава развалілася. Спрабуючы захаваць адзінства краіны, улады Белграда выкарысталі сілу: спачатку ў Славеніі і Харватыі, а потым у Босніі і Герцагавіне, дзе **югаслаўскі этнанацыянальны канфлікт** дасягнуў свайго апагею.

Падзеі на Балканах высунуліся на першае месца ў міжнародным жыцці. Для пошуку шляхоў урэгулявання канфлікту была створана Кантактная група ў складзе Вялікабрытаніі, ЗША, Італіі, Расіі і Францыі. З мэтай абароны грамадзян у Боснію былі накіраваныя «блакітныя каскі» ААН. Супраць Югаславіі былі ўведзеныя міжнародныя санкцыі, а па пазіцыях яе войск і ваенным аб’ектам сталі нанасіцца авіяўдары амерыканскіх, брытанскіх і французскіх сіл. У 1995 г. мірныя перагаворы, якія адбываліся ў Дэйтане (ЗША), скончыліся заключэннем шэрагу пагадненняў. Яны канчаткова аформілі распад югаслаўскай дзяржавы. На тэрыторыі фармальна адзінай Босніі і Герцагавіны былі створаны сербская рэспубліка і мусульманска-харвацкая федэрацыя. Войскі ААН замяняліся падраздзяленнямі НАТО. Мір у Босніі падтрымліваўся дзякуючы прысутнасці міратворчага кантынгенту.

На мяжы стагоддзяў на Балканах разгарэлася новая вайна. У 1998 г.у сербскім аўтаномным краі Косава, дзе большую частку насельніцтва складалі албанцы-касавары, прайшлі прэзідэнцкія і парламенцкія выбары. Іх вынікі не былі прызнаныя Бялградам. Неўзабаве паміж падпольнай Арміяй вызвалення Косава (АОК) і рэгулярнай югаслаўскай арміяй пачаліся адкрытыя і буйнамаштабныя баявыя дзеянні. **Косаўскі крызіс** перайшоў у ваенную стадыю. Перагаворы паміж канфліктуючымі бакамі з удзелам інстытутаў міжнароднай супольнасці ў Рамбуйе пад Парыжам (люты 1999 г.) скончыліся правалам. Віну за гэта краіны НАТО ўсклалі на Югаславію і яе лідара Слабадана Мілошавіча.

У ноч на 25 сакавіка 1999 г. авіяцыя НАТО стала бамбіць югаслаўскія ваенныя аб’екты. Упершыню ў гісторыі Паўночнаатлантычны блок нанёс удар па суверэннай дзяржаве без санкцыі Савета Бяспекі ААН. Гэта было грубым парушэннем Статута ААН і Статута самой НАТО. Налёты на Югаславію працягваліся 78 сутак. Па афіцыйных дадзеных Бялграду, у выніку бамбардзіроўкі былі разбураныя каля тысячы ваенных і грамадзянскіх аб’ектаў, у тым ліку заводы, электрастанцыі і масты, загінулі 2 тыс. мірных жыхароў, 7 тыс. былі параненыя. У выніку этнічнага канфлікту і ваеннай акцыі НАТО колькасць уцекачоў з краю склала некалькі сот тысяч чалавек (спачатку ўцякалі албанцы, потым – сербы, цыганы, яўрэі).

Апынуўшыся пад жорсткім палітычным і ваенным ціскам, перад пагрозай гуманітарнай катастрофы ўнутры краіны югаслаўскае кіраўніцтва было вымушана пайсці на пагадненне з НАТО. Важную ролю ў гэтым адыграла і пасрэд-

ніцтва расійскай дыпламатыі. Сербскія войскі былі выведзены з Косава. Тэрыторыя краю была перададзеная пад кантроль НАТО. У 2008 г. была абвешчана незалежнасць Косава, але многія дзяржавы Еўропы і свету яе не прызналі, у тым ліку Іспанія, Румынія, Грэцыя, Расія, Кітай.

Сімвалічна, што менавіта на фоне падзей косаўскага крызісу ў красавіку 1999 г. на Вашынгтонскім саміце НАТО была прынятая новая стратэгічная канцэпцыя Альянсу. У прыватнасці, у ёй пазначаліся новыя глабальныя пагрозы як ў еўраатлантычным рэгіёне, гэтак і за яго межамі. У супрацьдзеянне ім НАТО не абмяжоўвала свае дзеянні, ажно да выкарыстання ядзернай зброі альбо правядзення ваенных аперацый без санкцыі ААН. Сферай адказнасці абвяшчаліся практычна ўсе рэгіёны свету. Тым самым НАТО пераўтварыўся ў глабальную ваенна-палітычную арганізацыю, якая дзейнічае незалежна ад ААН.

На пачатку XXI ст. з’явіліся новыя супярэчнасці і пагрозы, якія збольшага звязаны з глабальным цывілізацыйным канфліктам па лініі Поўнач-Поўдзень – паміж перадавымі развітымі дзяржавамі і беднымі развіццёвымі дзяржавамі свету. Адной з яго праяў стаў **міжнародны тэрарызм ды ісламскі фундаменталізм**: не маючы іншых дзейсных сродкаў змагання з заходнім светам на чале са Злучанымі Штатамі, асобныя плыні радыкальнага ісламу перайшлі да гвалтоўнага супрацьстаяння з ім.

11 верасня 2001 г. ісламскія фундаменталісты ажыццявілі тэрарыстычныя акты супраць ЗША. Гэтыя варварскія атакі (пазней вылазкі тэрарыстаў адбываліся на прасторах ад вострава Балі на Ціхім акіяне да Масквы) азначалі выклік усяму цывілізаванаму свету і прывялі да абвастрэння міжнародна-палітычнай сітуацыі ў свеце і нават узброеныя канфлікты.

Следам за тэрактам 11 верасня прыйшоў неадкладны адказ ЗША ды іх саюзнікаў. Ужо на наступны дзень Джордж Буш-малодшы абвясціў пра немінучую акцыю адплаты. Неўзабаве стаў вядомы і праціўнік – ісламісцкая арганізацыя «Аль-Каіда» і яе лідар Усама бен Ладэн, які хаваўся на тэрыторыі Афганістана. Для ліквідацыі «тэрарыста № 1» ужо 7 кастрычніка 2001 г. са згоды Рады Бяспекі ААН у гэтай краіне была распачата антытэрарыстычная аперацыя НАТО **«Нязломная свабода»** (англ. *Enduring Freedom*). У выніку высадкі амерыканцаў ды іх саюзнікаў па Міжнародных сілах садзейнічання бяспецы (на розных этапах у іх склад уваходзілі вайсковыя фарміраванні без малога паўсотні дзяржаў) улада ў Афганістане перайшла да праамерыканскага часовага ўраду на чале з Хамідам Карзаям. Аднак у самім Афганістане замірэнне не наступіла. На тэрыторыі краіны працягваюць заставацца войскі кааліцыі, а ісламісцкія сілы перайшлі да выпрабаванай тактыкі грамадзянскай вайны і актаў тэрору супраць міжнародных сіл, афіцыйнага ўраду і мірнага насельніцтва.

Яшчэ да афіцыйнага заканчэння актыўнай фазы аперацыі ў Афганістане амерыканскае кіраўніцтва заявіла пра сваё імкненне працягнуць антытэрарыстычную вайну. Былі названыя краіны («Вось Зла»), якія ўяўляюць патэнцыйную пагрозу – Паўночная Карэя, Ірак ды Іран. Наступнай мэтай амерыканскай знешняй палітыкі стала зварожэнне іракскага дыктатара з падкрэслена антыамерыканскай пазіцыяй і рыторыкай С. Хусэйна.

Афіцыйнай нагодай для развязвання вайны супраць Іраку стала абнародаванне дадзеных разведкі, якія быццам бы сведчылі пра наяўнасць у Ірака зброі масавага паражэння (з часам выявілася не толькі беспадстаўнасць гэтых абвінавачванняў, але нават наўмыснае скажэнне рэальных фактаў з боку амерыканскага і брытанскага кіраўніцтва). У сакавіку 2003 г. амерыкана-брытанская кааліцыя распачала аперацыю **«Шок і трапятанне»** (англ. *Shock and Awe*) па захопу Іраку. Даволі хуткая ваенная перамога над вялікай і, як лічылася да вайны, моцнай іракскай арміяй, а таксама арышт, асуджэнне і пакаранне С. Хусэйна не прынесла ЗША ды іх саюзнікам агульнай палітычнай перамогі ў Іраку. Па-ранейшаму гэтая краіна вельмі далёкая ад стабільнасці і з'яўляецца полем актыўнай дзейнасці фундаменталісцкіх, антыамерыканскіх і антызаходніх груповак.

Гэткім чынам, аперацыі ЗША ды іх саюзнікаў не толькі не вырашылі ўсяго комплексу задач, што стаялі перад кааліцыяй ў Афганістане ды Іраку, але паспрыялі далейшай дэстабілізацыі сітуацыі ў блізкаўсходнім рэгіёне і свеце, узмацнілі напружанасць у адносінах паміж Захадам, з аднаго боку, і арабскага і мусульманскага ўсходу, з другога. Далейшыя падзеі паказалі, што пагрозы з боку міжнароднага тэрарызму ды ісламскага фундаменталізму зняць падобнымі метадамі і сродкамі прынцыпова немагчыма.

На сучасным этапе адной з важнейшых тэндэнцый з'яўляецца паступовае змяшчэнне цэнтру сусветнай палітыкі ў Азію. Беспрэцэдэнтны эканамічны прагрэс і неверагодныя чалавечыя рэсурсы робяць Індыю і Кітай, да таго ж ядзерныя дзяржавы, патэнцыйнымі лідарамі сярэдзіны XXI ст. З іншага боку, у свеце назіраецца падзенне папулярнасці ЗША і рост антыамерыканізму, што рана ці позна прывядзе да падзення ўплыву заакіянскай «звышдзяржавы». Астатнія патэнцыйныя геапалітычныя полюсы – Расія і Еўрасаюз (у 1990-я гг. яшчэ і Германія з Японіяй) – па розных прычынах так і не здолелі даказаць правамернасць сваіх глабальных амбіцый.

Аднапалярны свет, дзе дамінуюць Злучаныя Штаты, набліжаецца да заканчэння свайго існавання. У новай сітуацыі шматполюсная міжнародная сістэма, пры ўсёй яе няўстойлівасці і ўразлівасці, не мае альтэрнатыў. Залогам яе фарміравання можа стаць толькі паслядоўнае імкненне дзяржаў свету шукаць кампраміс паміж нацыянальнымі інтарэсамі і агульнымі задачамі па забеспячэнні міру і бяспекі.

# ТЭМАТЫКА СЕМІНАРСКІХ ЗАНЯТКАЎ

## 6 семестр

**Тэма 1. Сацыяльна-эканамічнае развіццё краін Еўропы і Паўночнай Амерыкі ў другой палове XX - пачатку XXI стст. (2 гадзіны):**

1. Аднаўленне эканомікі пасля Другой сусветнай вайны.
2. Асаблівасці развіцця дзяржаўна-манапалістычнага капіталізму ў 1950 – 1960-я гг.
3. Структурныя крызісы 1970-х – пачатку 1980-х гг.
4. Галоўныя дасягненні і праблемы эканамічнага развіцця ў сярэдзіне 1990-х – пачатку 2000-х гг.

*Літаратура:*

1. Ван дер Вее, Г. История мировой экономики. 1945 – 1990 / Г. Ван дер Вее. – М., 1994.
2. Джонсон, П. Современность. Мир с 20-х – по 90-е гг. / П. Джонсон. – М., 1995.
3. Дынкин, А. А. Новый этап НТР: экономическое содержание и механизм реализации в капиталистическом хозяйстве / А. А. Дынкин. – М., 1991.
4. История мировой экономики. Хозяйственные реформы 1920 – 1990-х гг. – М., 1995.
5. Поляк, Г. Б. История мировой экономики / Г. Б. Поляк. – М., 1999.

**Тэма 2. Еўрапейская інтэграцыя ў другой палове XX – пачатку XXI стст. (4 гадзіны):**

1. Агульны рынак і яго дзейнасць у 1950 – 1980-я гг.
2. Трансфармацыя ЕЭС у Еўрапейскі Саюз.
3. Еўрапейскі Саюз на сучасным этапе: праблемы і перспектывы еўрапейскай інтэграцыі.

*Літаратура:*

1. Арах, М. Европейский Союз: Видение политического объединения / М. Арах. – М., 1998.
2. Борко, Ю. А. От европейской идеи к единой Европе / Ю. А. Борко. – М., 2003.
3. Варивончик, И. В. Новейшая история стран Европы и США (1945 – 2008 гг.) / И. В. Варивончик. – Минск, 2008.
4. Европейский Союз: прошлое, настоящее,будущее. Документы Европейского Союза: в 5 т. – М., 1994 – 1999.
5. Зуев, В. Н. Англия и Общий рынок / В. Н. Зуев. – М., 1988.
6. История Европейской интеграции. 1945 – 1994 / Под ред. А. С. Намазовой, Б. Эмерсона. – М., 1995.
7. Маастрихтский договор: трудности ратификации, поиски решений, перспективы / Под ред. Ю. А. Борко. – М., 1994.
8. Основы права Европейского Союза / Под ред. С. Ю.Кашкина. – М., 1997.
9. Лебедев, А. А. Очерки британской внешней политики (60 – 80-е гг.) / А. А. Лебедев. – М., 1988.
10. Шилов, В. С. Внешняя политика и партии во Франции (1969 – 1981) / В. С. Шилов. – М., 1994.

**Тэма 3. Вялікабрытанія ў 1970 - 1980-я гг. (2 гадзіны):**

1. Сацыяльна-эканамічнае развіццё Вялікабрытаніі.
2. Унутрыпалітычнае жыццё краіны.
3. Знешняя палітыка Вялікабрытаніі.

*Літаратура:*
1. Васильев, К. История Великобритании / К. Васильев. – М., 2004.
2. Науменков, О. А. Из истории внутренней политики консервативной партии Великобритании / О. А. Науменков. – Саратов, 1989.
3. Согрин, В. В. Британский либерализм: этапы разви / В. В. Согрин // Новая и новейшая история. – 1996. – № 4.
4. Полякова, Е. Ю. Северная Ирландия: истоки конфликта / Е. Ю. Полякова // Новая и новейшая история. – 1990. – № 4.
5. Попов, В. И. Маргарет Тэтчер: человек и политик / В. И. Попов. – М., 1991.
6. Риддел, П. Десятилетие Тэтчер: как изменилась Великобритания в 80-е годы / П. Риддел. – М., 1990.

**Тэма 4. Францыя ў 1945 – 1970-я гг. (4 гадзіны):**

1. Сацыяльна-эканамічнае развіццё Францыі.
2. Унутрыпалітычнае жыццё краіны.
3. Распад каланіяльнай імперыі і знешняя палітыка Францыі.

*Літаратура:*
1. Арзаканян, М. Ц. Де Голль и голлисты на пути к власти / М. Ц. Арзаканян. – М. 1990.
2. Арзаканян, М. Ц. Политическая история Франции / М. Ц. Арзаканян. – М., 2003.
3. Борисов, Ю. В. Де Голль и США: 40 – 60-е годы XX века / Ю. В. Борисов // Новая и новейшая история. – 2008. – № 1.
4. Жискар д'Эстэн, В. Власть и жизнь / В. Жискар д'Эстэн. – М., 1990.
5. Кирей, Н. И. Алжир и Франция / Н. И. Кирей. – М., 1973.
6. Коломийцев, В. Ф. Франсуа Миттеран: политик и человек / В. Ф. Коломийцев // Новая и новейшая история. – 1999. – № 1.
7. Колоков, И. А. Внешняя политика V Республики. 1959 – 1972. / И. А. Колоков. – М., 1976.
8. Молчанов, В. Н. Четвертая республика / В. Н. Молчанов. – М., 1963.
9. Молчанов, В. Н. Генерал де Голль / В. Н. Молчанов. – М., 1988.
10. Нарочницкая, Е. А. Франция в блоковой системе Европы / Е. А. Нарочницкая. – М., 1993.
11. Сироткин, В. Г. История Франции: Пятая Республика / В. Г. Сироткин. – М., 1989.
12. Смирнов, В. П. Новейшая история Франции. 1918 – 1975 / В. П. Смирнов. – М., 1979.
13. Черкасов, П. П. Распад колониальной системы: кризис французской колониальной политики в 1939 – 1985 / П. П. Черкасов. – М., 1985.

**Тэма 5. Заходняя Германія і ФРГ ў 1945 – 1980-я гг. (4 гадзіны):**

1. Сацыяльна-эканамічнае развіццё Заходняй Германіі і ФРГ.
2. Унутрыпалітычнае жыццё краіны.
3. Знешняя палітыка ФРГ.

*Літаратура:*
1. Гутник, В. П. Послевоенная конверсия в германской экономике / В. П. Гутник // Общество и экономика. – 1994. – № 1.
2. Гутник, В. П. Социальное рыночное хозяйство: опыт Германии / В. П. Гутник // Общество и экономика. – 1997. – № 1-2.
3. Зарицкий, Б. Е. Людвиг Эрхард. Секреты «экономического чуда» / Б. Е. Зарицкий. – М., 1997.
4. История Германии: учеб. пособие: в 3 т. / Под общ. ред. Б. Бонвеча, Ю. В. Галактионова. М., 2008. – Т. 2: От создания Германской империи до начала XXI века.

5. История Германии: учеб. пособие: в 3 т. / Под общ. ред. Б. Бонвеча, Ю. В. Галактионова. М., 2008. – Т. 3: Документы и материалы.

6. История мировой экономики. Хозяйственные реформы 1920 – 1990-х гг. / Под ред. А. Н. Марковой. – М., 1995.

7. Миллер, С., Краткая история СДПГ / С. Миллер, Х. Поттхофф. – М., 1999.

8. Наринский, М. М. Берлинский кризис 1948 – 1949 гг. / М. М. Наринский // Новая и новейшая история. – 1995. – № 3.

9. Погорлецкий, А. И. Экономика и политика Германии в XX веке / А. И. Погорлецкий. – Спб., 2001.

10. Семиряга, М. И. Как мы управляли Германией / М. И. Семиряга. – М., 1995.

11. Эрхард, Л. Благосостояние для всех / Л. Эрхард; пер. с нем. – М., 1991.

**Тэма 6. Краіны Цэнтральнай і Паўднёва-Ўсходняй Еўропы ў 1945 – 1980-я гг. (2 гадзіны):**

1. Усталяванне камуністычных рэжымаў у краінах рэгіёну.
2. Асаблівасці эканамічнага і палітычнага ладу Албаніі, Венгрыі, ГДР і Румыніі.
3. Падзенне камуністычных рэжымаў.

*Літаратура:*

1. Вахрамеев, А. В., Страны Восточной Европы: времена кардинальных перемен / А. В. Вахрамеев, М. А. Деробина, А. А. Язькова. – М., 1990.

2. Волокитина, Т. В. Восточная Европа – от начала второй мировой войны до современности / Т. В. Волокитина, В. В. Марьина, Ю. С. Новопашнин // Новая и новейшая история. – 1996. – № 6.

3. Восточноевропейский социализм: становление режима, попытки его модификации, причины поражения. – М., 1992.

4. История Румынии / И. Болован, И.-А.Поп (координаторы) [и др.] – М., 2005.

5. История стран Центральной и Юго-Восточной Европы XX века / Под ред. А. В. Фадеева.. – М., 1997.

6. Контлер, Л. История Венгрии. Тысячелетие в центре Европы / Л. Контлер. – М., 2002.

7. Краткая история Венгрии / Отв. ред. Т. М. Исламов. – М. 1991.

8. Краткая история Румынии / Отв. ред. В. Н. Виноградов. – М., 1987.

9. Кузьмин, И. Н. Крушения ГДР: История. Последствия. / И. Н. Кузьмин. – М., 1996.

10. Мусатов, В. Л. Горбачевская перестройка и режим Чаушеску / В. Л. Мусатов. // Новая и новейшая история. – 2010. – № 3.

11. Хайек, Ф. А. Пагубная самонадеянность. Ошибки социализма / Ф. А. Хайек; под ред. У. У. Бартли; пер. с англ. – М., 1992.

12. Центрально-Восточная Европа и Россия: проблемы трансформации // Новая и новейшая история. – 1998. – № 3.

13. Центрально-Восточная Европа во второй половине XX в.: в 3 т. / Отв. ред. И.И. Орлик. – М., 2000 – 2004. – Т. 1–3.

**Тэма 7. ЗША ў 1945 – пачатку 1990-х гг. (4 гадзіны):**

1. Сацыяльна-эканамічныя і палітычныя вынікі Другой сусветнай вайны для ЗША.
2. Рух за грамадзянскія правы ў ЗША. М. Л. Кінг.
3. «Рэйганоміка», яе сутнасць і вынікі.
4. Знешняя палітыка ЗША ў 1945 – 1980-я гг.

*Літаратура:*

1. Американские президенты: 41 портрет от Д. Вашингтона до Б. Клинтона / Под ред. Ю. Хайдекинга. – Ростов н/Д, 1997.

2. Иванов, Р. Ф. Дуайт Эйзенхауэр / Р. Ф. Иванов. – М., 1983.

3. Иванян, Э. А. Белый дом. Президенты и политика / Э. А. Иванян. – М., 1979.
4. Иванян, Э. А. Рональд Рейган – хроника жизни и времени / Э. А. Иванян. – М., 1991.
5. История США: в 4 т. / Отв. ред. В. Л. Мальков. – М., 1987. – Т. 4.
6. Лан, В. И. США в военные и послевоенные годы / В. И. Лан. – М., 1978.
7. Рейган, Р. Откровенно говоря. Избранные речи / Р. Рейган. – М., 1990.
8. Сивачев, Н. В. Новейшая история США / Н. В. Сивачев, Е. Ф. Язьков. – М., 1980.
9. Согрин, В. В. История США / В. В. Согрин. – СПб., 2003.
10. Фурсенко А.А. Президенты и политика США, 70-е годы. П., 1989.
11. Шлезингер А. Циклы американской истории. М., 1992.

**Тэма 8. Міжнародныя адносіны ў другой палове XX – пачатку XXI стст. (4 гадзіны):**

1. Ялцінская і Патсдамская канферэнцыі. Фарміраванне асноў новага сусветнага парадку.
2. Палітычныя, эканамічныя, ідэалагічныя перадумовы «халоднай вайны».
3. Фармаванне контураў двухполюснага свету і пачатак глабальнага супрацьстаяння (1947 – 1955).
4. Берлінскі і Карыбскі крызіс, іх вынікі.
5. Савецка-амерыканскі міжнародны дыялог і разрадка міжнароднай напружанасці ў 1970-я гг. Хельсінскі працэс.
6. Міжнародныя адносіны на сучасным этапы: супярэчнасці, праблемы, перспектывы.

*Літаратура:*

1. Берге, И. В. Историческое недоразумение? «Холодная война» 1917 – 1990 / И. В. Берге. – М., 1996.
2. Висков, С. И. Союзники и германский вопрос. 1945 – 1949 гг. / С. И. Висков. – М., 1990.
3. XX век: Основные проблемы и тенденции международных отношений. – М., 1992.
4. Дубинин, Ю. В. Тернистый путь к Хельсинки, 1975 г. / Ю. В. Дубинин // Новая и новейшая история. – 1994. – № 4/5.
5. История дипломатии: в 5 т. / Отв. ред. В. П. Потемкин. – М., 1965 – 1975. – Т. 3–5.
6. Киссинджер, Г. Дипломатия / Г. Киссинджер. – М., 1997.
7. Кольвокоресси, П. Мировая политика после 1945 года / П. Кольвокоресси. – М., 2000.
8. Корниенко, Г. М. «Холодная война»: истоки, причины и последствия. Осмысление истории / Г. М. Корниенко. – М., 1996.
9. «Круглый стол» в ИВН РАН: «Феномен «холодной войны» в международных отношениях XX века: итоги и перспективы исследования» // Новая и новейшая история. – 2006. – № 6.
10. Наринский, М. М. История международных отношений. 1945 – 1975 / М. М. Наринский. – М., 2004.
11. Современные международные отношения / Под ред. А. В. Торкунова. – М., 2000.
12. 30 лет Карибского кризиса 1962 г. (1962 – 1992) // Международная жизнь. – 1992. – Спецвыпуск.
13. Филлитов, А. М. «Холодная война». Историографические дискуссии на Западе / А. Филлитов. – М., 1991.
14. Хантингтон, С. Столкновение цивилизаций / С. Хантингтон. – М., 2003.
15. Чубарьян, А. О. Новая история «холодной войны» / А. О. Чубарьян // Новая и новейшая история. – 1997. – № 6.

ЗМЕСТ


Лекцыйны курс ... 3
Раздзел II. Гісторыя навейшага часу, 1945 – 2010-х гг. ... 3
Тэма 1. Сацыяльна-эканаічнае развіццё краін Еўропы
і Паўночнай Амерыкі ў другой палове XX – пачатку XXI стст. ... 3
Тэма 2. Палітычнае развіццё краін Еўропы і Паўночнай Амерыкі
ў другой палове XX – пачатку XXI стст. ... 17
Тэма 3. Еўрапейская інтэграцыя ў другой палове XX – пачатку XXI стст. ... 28
Тэма 4. Вялікабрытанія ў 1945 – 1960-я гг. ... 35
Тэма 5. Вялікабрытанія ў 1970-я – 1980-я гг. ... 48
Тэма 6. Вялікабрытанія ў 1990-я – 2010-я гг. ... 59
Тэма 7. Францыя ў 1945 – 1970-я гг. ... 70
Тэма 8. Францыя ў 1980-я – 2010-я гг. ... 92
Тэма 9. Заходняя Германія і ФРГ ў 1945 – 1980-я гг. ... 108
Тэма 10. ФРГ ў ў 1990-я – 2010-я гг. ... 132
Тэма 11. Італія ў 1945 – 1980-я гг. ... 145
Тэма 12. Італія ў 1990-я – 2010-я гг. ... 163
Тэма 13. Іспанія ў 1945 – 1975 гг. ... 173
Тэма 14. Іспанія ў другой палове 1970-х – пачатку 2010-х гг. ... 181
Тэма 15. Краіны Паўночнай Еўропы ў 1945 – 2010-я гг. ... 196
Тэма 16. Краіны Паўднёвай і Паўднёва-заходняй Еўропы ў 1945 – 2010-я гг. ... 216
Тэма 17. Румынія ў 1945 – 2010-я гг. ... 231
Тэма 18. Венгрыя ў 1945 – 2010-я гг. ... 248
Тэма 19. Усходняя Германія і ГДР ў 1945 – 1990-я гг. ... 265
Тэма 20. Албанія ў 1945 – 2010-я гг. ... 274
Тэма 21. ЗША ў 1945 – пачатку 1990-х гг. ... 288
Тэма 22. ЗША ў 1992 – 2000-х гг. ... 309
Тэма 23. Міжнародныя адносіны ў другой палове XX – пачатку XXI стст. ... 324
Тэматыка семінарскіх заняткаў ... 351

*Вучэбнае выданне*

ФІЛІПЕНКА Уладзімір Сяргеевіч

# ГІСТОРЫЯ НАВЕЙШАГА ЧАСУ

Вучэбна-метадычны комплекс
для студэнтаў спецыяльнасці 1-21 03 01 «Гісторыя»
гісторыка-філалагічнага факультэта

У дзвюх частках

Частка 2

Рэдактар *І. М. Бязборшчая*
Дызайн вокладкі *Л. І. Вайдашэвіч*

---

Падпісана да друку 15.03.12. Фармат 60×84 1/16. Бумага афсетная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 20,65. Улік.-выд. арк. 23,83. Тыраж 50 экз. Заказ 301.

---

Выдавецтва і паліграфічнае выкананне:
установа адукацыі «Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт».

ЛВ № 02330/0548568 от 26.06.2009 ЛП № 02330/0494256 от 27.05.2009

Вул. Блахіна, 29, 211440, г. Наваполацк.